ARCHE Зьмест № 1'05

1. Зьмест / Уводзіны
2. Аляксандар Батура. Тры памаранчавыя высновы.
3. Міхась Тычына. Эра каментароў.
4. Віталь Сіліцкі. Імперыя альбо лідэр?
5. Дзьмітры Падбярэскі. Кніга жыцьця і сьмерці.
6. Пётра Рудкоўскі. Панская Польшча і бяспанская Беларусь.
7. Даніла Жукоўскі. Асаблівасці каланіяльнае сацыялізацыі.
8. Вольф Рубінчык. Балота ці трагедыя?
9. Эндру Ўілсан. Як урэшце стаць нацыяналістам?
10. Імануіл Валерстайн. Выбары 2004 года ў ЗША.
11. Славой Жыжак. Над вясёлкай.
12. Зьбігнеў Бжазінскі. Глябальнае дамінаваньне ці сусьветнае лідэрства?
13. Робэрт Каган. Пра рай і ўладу.
14. Фрэнсіс Фукуяма. Момант неакансерватызму.
15. Чарльз Краўтхамер. У абарону дэмакратычнага рэалізму.
16. Наял Фэргюсан. Сьвет перад абліччам безуладзьдзя.
17. Іян Бурума. Ісламская дэмакратыя для Іраку?
18. Сяргей Дубавец. Праект Беларусь.
19. Алесь Аркуш. Маё Жодзіна.
20. Аксана Бязлепкіна. Амбітная літаратура.
21. Кірыла Пазьняк. Амбіцыі ў беларускай палітыцы – нясьціпласьць розуму?.
22. Віктар Леаненя. Герадотава мора.
23. Сяргей Шыдлоўскі. Полацкія амбіцыі.
24. Альбіна Семянчук. Расія, камунізм і свет.
25. «Народ бяз нас, як бараны расьсеяныя». Гутарка з Алесем Пушкіным.
26. Андрэй Хадановіч. З цыклу «Неба над Бэрлінам».
27. Юрась Барысевіч. Сусьвет Слова.
28. Міленка Ергавіч
29. Уладзімер Ракіцкі. Накіды алавіком з блякноту для маляваньня.
30. Вітальд Вірпша. Сьмецьце.
31. Даніла Жукоўскі. Плакат, праткнуты дзідай.

32. Дзмітрый Плакс. Эстэтыка ў чатыры хады.

Мінулыя [illegible]ізм

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 1 (35) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

1[image]-[image]2005

аналітыка • эсэістыка • крытыка • літаратура • палеміка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

АЛЯКСАНДАР БАТУРА Тры памаранчавыя высновы

КРЫТЫКА

МІХАСЬ ТЫЧЫНА Эра камэнтароў
ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Імпэрыя альбо лідэр
ДЗЬМІТРЫ ПАДБЯРЭСКІ Кніга жыцьця і сьмерці
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Панская Польшча і бяспанская Беларусь
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Асаблівасьці каляніяльнае сацыялізацыі
ВОЛЬФ РУБІНЧЫК Балота ці трагедыя

АНАЛІТЫКА

ЭНДРУ ЎІЛСАН Як урэшце стаць нацыяналістам
ІМАНУІЛ ВАЛЕРСТАЙН Выбары 2004 году ў ЗША
СЛАВОЙ ЖЫЖАК Над вясёлкай. Лібэральнае Ватэрлоо
ЗЬБІГНЕЎ БЖАЗІНСКІ Глябальнае дамінаваньне ці сусьветнае лідэрства
РОБЭРТ КАГАН Пра рай і ўладу
ФРЭНСЫС ФУКУЯМА Момант нэакансэрватызму
ЧАРЛЬЗ КРАЎТХАМЭР У абарону дэмакратычнага рэалізму
НАЯЛ ФЭРГЮСАН Сьвет перад абліччам безуладзьдзя

ЭСЭІСТЫКА

ІЯН БУРУМА Ісламская дэмакратыя для Іраку
СЯРГЕЙ ДУБАВЕЦ Праект Беларусь
АЛЕСЬ АРКУШ Маё Жодзіна
АКСАНА БЯЗЬЛЕПКІНА Амбітная літаратура
КІРЫЛА ПАЗЬНЯК Амбіцыі ў беларускай палітыцы – нясьціпласьць розуму
ВІКТАР ЛЕАНЕНЯ Герадотава мора
СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ Полацкія амбіцыі
АЛЬБІНА СЕМЯНЧУК Расія, камунізм і сьвет
«Народ бяз нас, як бараны расьсеяныя». Гутарка з **АЛЕСЕМ ПУШКІНЫМ**

ЛІТАРАТУРА

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ З цыклу «Неба над Бэрлінам»
ЮРАСЬ БАРЫСЕВІЧ Сусьвет Слова
МІЛЕНКА ЕРГАВІЧ Асаг. Гурбэт
УЛАДЗІМЕР РАКІЦКІ Накіды алавіком з блякноту для маляваньня
ВІТАЛЬД ВІРПША Сьмецьце

ПАЛЕМІКА

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Плякат, праткнуты дзідай

РЭЦЭНЗІІ

ДЗЬМІТРЫЙ ПЛАКС Эстэтыка ў чатыры хады

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/01/11
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

крытыка

[image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

АЛЯКСАНДАР БАТУРА

палітычны аналітык. Яго апошні аналіз у «ARCHE» называўся «Ці ёсьць у Беларусі нацыянальныя інтарэсы?»

Аляксандар Батура
Тры памаранчавыя высновы

Пітэр Урвін, які ў 1980-я гады працаваў паслом Вялікай Брытаніі ў сацыялістычнай Вугоршчыне, 28 лістапада 2004 году напісаў у брытанскай газэце «Independent»: «…мы павінны (у дачыненьні да Ўкраіны) узяць пад увагу

патрэбы
міжнароднай
стабільнасьці,
стабільнасьці,
якая
забясьпечвае
павагу да
інтарэсаў
апанэнта ў
такой самай
ступені, як і
да інтарэсаў
уласных».
Што мела на
ўвазе Ягонае
Высокаправасхадзіцельства
пад
стабільнасьцю
і каго – пад
апанэнтам?
А вось каго.
«Ці хочам
мы дабіцца
сутыкненьня
Эўразьвязу з
варожасьцю
Расеі,
варожасьцю,
выкліканай
тым, што мы
лазім па яе
падворках?»
Якім чынам?
Імкнучыся
забясьпечыць
сумленны
падлік
галасоў на
ўкраінскіх
выбарах.

15 гадоў таму падобныя рэчы мы чулі ад тых самых, у прынцыпе, саветолягаў наконт тадышніх савецкіх сатэлітаў з Цэнтральнай Эўропы. Замест Вугоршчыны, Чэхіі і Польшчы цяпер гаворка ідзе пра Ўкраіну, Беларусь, Малдову. Новыя краіны Эўразьвязу таксама некалі «пагражалі міжнароднай стабільнасьці», як цяпер – Украіна.
У перамогу ўкраінскай рэвалюцыі мала хто верыў. Кантроль Расеі над Украінай лічылі неўнікнёнай рэальнасьцю. Але – сталася! Пасьля трыюмфальнага для Віктара Юшчанкі 26 сьнежня застаецца правесьці аналіз і зрабіць высновы.

ВЫСНОВА
ПЕРШАЯ:
РЭВАЛЮЦЫЮ
НЕМАГЧЫМА
ПРАДКАЗАЦЬ

Сёньня, аглядаючыся назад, можна прааналізаваць сытуацыю і сказаць: «тое і тое было прычынай рэвалюцыі». Але як можна было прадказаць рэвалюцыю? Як вызначыць, што на самай справе думаюць людзі, як яны бачаць палітычную сытуацыю, ці гатовыя яны да актыўнага дзеяньня, і галоўнае, як доўга яны гатовыя актыўна дзейнічаць?
Існавалі пэўныя арганізацыі (напрыклад, «Пара»), здольныя вывесьці на вуліцы некалькі тысяч чалавек. Было вядома, што выбары прызначаны на лістапад, калі становіцца холадна. Было вядома таксама, што ніякія гранты не прымусяць людзей стаяць на плошчы тыдзень на марозе. Як аніякія гранты (50–100 баксаў за адзін «трып» з Данецку ў Кіеў на камфартабэльных цягніках і самалётах) не прымусілі людзей ехаць у Кіеў бараніць кандыдата, які прайграў.
Асабліва складана прадказваць палітычныя паводзіны ў выбарных аўтакратыях постсавецкага тыпу, да «мяккага» варыянту якіх належала і Ўкраіна. Вонкава грамадзяне могуць падтрымліваць існуючы палітычны і эканамічны стан, але што яны кажуць на сваіх кухнях? Вонкавы выраз сваіх поглядаў (грамадзкая думка) адрозьніваецца ад поглядаў сапраўдных, не абавязкова выражаных вонкава (прыватная думка). Нават у заходніх дэмакратыях дзьве гэтыя думкі не супадаюць. Калі грамадзкая думка лічыць, што падтрымліваць радыкальна правыя партыі палітычна некарэктна і амаральна, ніводны

чалавек не прызнаецца, што на мінулых выбарах ён галасаваў за Лё Пэна і Нацыянальны фронт. Але ягонае прыватнае меркаваньне – што Лё Пэн палітык, здольны абараніць інтарэсы гэтага грамадзяніна. Калі ў Беларусі 1990-х было кепскім тонам прызнавацца, што ты падтрымліваеш Лукашэнку (хоць яго і падтрымлівала большасьць), то ў Беларусі 2004-га сытуацыя зьмянілася да наадварот: у той час як большасьць яго прыватна не падтрымлівае (на кухнях), то на людзях – так. Калі ты ў Рыме, паводзь сябе як рымлянін.
Грамадзкая думка неабходная для ўтрыманьня палітычнай улады, для функцыянаваньня яе інстытутаў. Прыватная думка неабходная для палітычнай стабільнасьці. Калі большасьць грамадзянаў прыватна не падтрымліваюць палітыка і толькі чакаюць спрыяльнага моманту, каб выказаць свае прыватныя погляды, то такая сыстэма ня можа лічыцца стабільнай. Асабліва калі гэта немагчыма зрабіць праз выбары. Цікавыя рэчы адбываюцца, калі раптам, як здавалася, паслухмяная маса мяняе свае погляды і «рэгіструе» свае прыватныя думкі праз паўмільённую дэманстрацыю. Пры гэтым гаворка ідзе не пра перавод дзесяці працэнтаў з прыватнай у грамадзкую думку, часьцей за ўсё адбываецца эфэкт «сьнежнага камяка». Ува Ўсходняй Нямеччыне падчас «аксамітнай рэвалюцыі» спачатку пратэставала некалькі соцень, пасьля некалькі тысяч, пасьля некалькі дзясяткаў тысяч, а потым на вуліцы выйшла амаль уся Ўсходняя Нямеччына. Выратаваць рэжым было запозна – нямецкія герантакраты зьдзіўлена ўбачылі, што ўся Ўсходняя Нямеччына на «кухнях» была супраць іхнага рэжыму.
Нешта падобнае адбылося трохі пазьней у Сэрбіі, Грузіі, цяпер – ва Ўкраіне. Немагчыма спрагназаваць, ці пойдуць людзі «рэгістраваць» свае прыватныя прэфэрэнцыі «публічна». Гэтага ня можа прадбачыць ані апазыцыя, ані рэжым. Колькі ні аналізаваў Кучма падзеяў у Грузіі ці Сэрбіі, карцінка з Майдану Незалежнасьці сталася для яго шокам. Таксама немагчыма спрагназаваць, што ёсьць той апошняй кропляй, якая перапаўняе келіх людзкога цярпеньня. Чаму акцыя «Ўкраіна бяз Кучмы» тры гады таму зьбірала дваццаць тысячаў чалавек, а ў лістападзе 2004-га выйшла ў 10 разоў болей?
Пільная жонка Януковіча праславілася тым, што разгледзела на Майдане амэрыканскія валёнкі і наколатыя апэльсыны. А што ж на самой справе змусіла ўкраінцаў выйсьці на вуліцы і

стаяць на марозе? Чаму раптам Вышэйшы Суд, які «не заўважыў аніякіх парушэньняў» пасьля першага туру, раптам заўважыў іх пасьля другога?
Каб уявіць, як можа выглядаць прыватная думка, збудуем простую мадэль. Уявім сабе, што жыве 10 выбарцаў (Любамір, Барыс, Вова, Галя, Дзіма, Алена, Алесь, Зіна, Іван, Каця). Некаторыя зь іх – незадаволеныя сытуацыяй (Любамір, Барыс), некаторыя задаволеныя (Алесь, Зіна, Іван, Каця), ёсьць такія, хто незадаволены, але гэтага не паказваюць (Вова, Галя), нарэшце, ёсьць і такія, якія пойдуць за большасьцю (Дзіма, Алена). Перад выбарамі, здаецца, болей тых, хто разам з Кучмам–Януковічам. Але ці ўсе яны застануцца зь Януковічам да канца, ці ўсе яны прыватна задаволеныя такім кандыдатам? Для кожнага чалавека існуе нейкі *парог*, пераступіўшы які, ён можа сказаць, што на самай справе думае, іншымі словамі, перавесьці свае прыватныя думкі з узроўню кухні на грамадзкі ўзровень. Гэткім парогам можа быць пэўная колькасьць людзей, якія думаюць, як і ён. Калі на дэманстрацыю ідзе пяць тысяч, Вова, хоць і падтрымлівае гэтую дэманстрацыю, застанецца дома, бо ў яго парог вышэйшы за гэтыя пяць тысяч. Апазыцыянэр Любамір пойдзе на дэманстрацыю ў любым разе, у яго ніякага парогу зусім няма, яму так усё абрыдла, што ён пойдзе, нават калі ў дэманстрацыі будзе ўдзельнічаць толькі тысяча чалавек. А Вова пойдзе, толькі калі народу будзе шмат – 50, 100, а можа 200 тысяч. Калі ж будзе больш за 200 тысяч, дык пойдзе і Галя, якой ня вельмі добра, але і ня вельмі дрэнна, а калі 500 тысяч, то можа і Дзіма далучыцца, хоць ён дагэтуль рабіў на тэлевізіі выкрываўчыя сюжэты пра апазыцыю. Але ў яго ў шафе ёсьць памаранчавы капялюш; бо ён таксама ў душы яшчэ які апазыцыянэр. Але як уся гэтая маса можа прыйсьці ў рух і якія ў кожнага парогі?
Возьмем нашых дзесяць украінцаў. Лічба пасьля імя азначае парог, пасьля якога чалавек далучаецца да апазыцыі. Першы, Любамір, мае 0 – ён апазыцыянэр-дысыдэнт, ён у любым разе ходзіць на дэманстрацыі, яго ўсе і так ведаюць, зь ім вітаецца АМАП. Барыс таксама мае 0, ён таксама пераканаы прыхільнік апазыцыі. А вось Вова, хоць яму і не падабаецца ўлада, мае стабільную працу і баіцца яе страціць. Вова далучыцца да дэманстрантаў, толькі калі іх будзе як мінімум 30 %. Але іх усяго 20 %, таму ён сядзіць на кухні і скардзіцца жонцы.

У цэлым наша Ўкраіна выглядае так:
Любамір (0), Барыс (0), Вова (30), Галя (30), Дзіма (40), Алена (50), Алесь (70), Зіна (90), Іван (100), Каця (100).
Любамір і Барыс апазыцыянэры, баба Зіна, дзед Іван і дырэктарка школы Каця падтрымліваюць рэжым, а ўсе пасярэдзіне – гэта людзі, чыя «хата скраю», яны чакаюць, што будзе адбывацца. Хоць работнік прыватнага сэктару Вова надзвычай блізкі да апазыцыі, апазыцыі не стае 10 %, каб ён да яе далучыўся. Але раптам нешта адбываецца. Магчыма, Вова глядзеў тэлебачаньне і там Януковіч абазваў яго «казлом». Магчыма, пасьля першага туру выбараў Вова ўбачыў, што ўладзе перамагчы не ўдалося, і што такіх праціўнікаў улады, як ён, намнога больш, чым яму здавалася. Магчыма, прыйшоў дырэктар і, абазваўшы «казлом», змушаў Вову галасаваць за Януковіча. Хто ведае. І Вова плюнуў, надзеў памаранчавую куртку і далучыўся да апазыцыі. Цяпер апазыцыі стала больш – 30 % (Любамір, Барыс, Вова). У Галі быў парог 30 %, пасьля таго як Вова далучыўся, Галя таксама набіла кішэні аранжыкамі і пайшла на Майдан. Цяпер апазыцыі ўжо 40 %. Якраз 40 % было патрэбна нерашучаму Дзіму, пасьля далучэньня якога іх стала 50 %, што было патрэбна Алене, якая трымае нос на ветры і глядзіць, за каго большасьць. Дык мо і Алесю выйсьці? Даміно пасыпалася, і пасьля некалькіх дзён апазыцыя трымае паўмільённы мітынг на Майдане і бачыць, што яе большасьць. Ніхто ўжо нічога не баіцца, Януковіч у шоку – супраць яго 60 %, калі ён думаў, што толькі 20 %! Лёгка можа быць, што судзьдзі Вярхоўнага Суду, які пасьля першага туру выбараў не заўважыў аніякіх парушэньняў, але раптам заўважыў іх пасьля другога туру, – гэта Алены ці Алесі. Заўважце, што Зіна, Іван і Каця па-ранейшаму падтрымліваюць Януковіча, нягледзячы на тое, колькі ў яго апанэнтаў. Зіна, Іван і Каця любяць Януковіча, жывуць на ўсходзе Ўкраіны, ён ім падняў заробкі і пэнсіі, а апазыцыі яны не давяраюць. Зрэшты, хвіліну таму яны самі ператварыліся ў апазыцыю. Якая іронія лёсу.
Нейкая такая ланцуговая рэакцыя адбылася ва Ўкраіне. Рэвалюцыя не забрала ў Януковіча ягонай электаральнай базы, і ён атрымаў у трэцім туры выбараў свае 44 % галасоў. Менавіта факт, што Зіна, Іван і Каця засталіся паплечнікамі Януковіча, дарма што іх цяпер меншасьць, можа растлумачыць,

чаму Юшчанка пайшоў на канстытуцыйную рэформу і зьбіў тэмп рэвалюцыі. У гэтым асноўнае адрозьненьне ўкраінскай сытуацыі ад сэрбскай ці грузінскай, бо там, калі «сьнежны камяк» пакаціўся, на тым баку нікога не засталося, усе далучыліся да апазыцыі. Іншымі словамі, у апошніх трох-чатырох асобаў у Грузіі і Сэрбіі парогі былі ў 70 % – і яны пасьпяшаліся далучыцца да большасьці, калі ўбачылі, што супраць іх – большасьць. А Юшчанку трэба будзе яшчэ аб'ядноўваць і прымірaць краіну пасьля перамогі.

Як кажа Юлія Цімашэнка:

Чыноўнікі сталі іншымі – міліцыянты, салдаты, афіцэры прыходзілі на плошчу і прысягалі на вернасьць народу. У Вярхоўнай Радзе распачаліся працэсы, пра якія да таго ніхто нават ня мроіў. Калі палітыкі, якія былі даверанымі асобамі Януковіча, захацелі перайсьці да Юшчанкі. А калі Вярхоўны Суд, на аб'ектыўнасьць якога сёй-той ужо даўно перастаў спадзявацца, – зрабіўся іншым і выйшаў на ўзровень вяршэнства права, ухваліў унікальнае рашэньне пра непрызнаньне вынікаў выбараў – гэта было проста неверагодным.

Аднак сытуацыя магла б разьвівацца інакш, калі б парог актывізацыі шэрагу выбарцаў быў, скажам: 0, 0, 30, 50, 50, 50, 50, 80, 100, 100. Пры такой раскладцы нават пасьля далучэньня трэцяга чалавека камяк прыпыніўся б, бо чацьвертаму трэба было б 50 %, каб прызнацца, што ён пра ўсё гэта думае на самай справе. Або сытуацыя магла б быць такой: 0, 30, 30, 30, 30, 40, 40, 50, 80, 100. Нягледзячы на тое, што 80 % «пакаціла» б да апазыцыі, сыстэма захавала б стабільнасьць, бо для далучэньня да апазыцыі другому ў шэрагу патрэбны штуршок у выглядзе актыўнасьці трыццаці працэнтаў атачэньня, а такога ніколі ня будзе, калі толькі эканоміка раптам ня лясьнецца. Пры гэтай апошняй сытуацыі ўсе незадаволеныя, усе глядзяць адзін на аднаго, але ніхто ня робіць першага кроку, бо не хапае крытычнае масы. Магчыма, такая сытуацыя існуе цяпер у Беларусі, калі ўсё вельмі стабільна і ўсе ківаюць адзін на аднаго. А магчыма, сытуацыя нагадвае ўкраінскую, калі трэба толькі пальцам пхнуць. Гэтага аніякае апытаньне грамадзкай думкі ня вызначыць, гэта можна будзе акрэсьліць эмпірычна толькі пастфактум.

ВЫСНОВА ДРУГАЯ:

ЭЎРОПА ЗМУШАНАЯ ЎКЛЮЧЫЦЦА

Многім заходнеэўрапейцам, асабліва «левага толку», сытых па горла ірацкай авантурай Злучаных Штатаў, Амэрыка здаецца цяпер галоўнай пагрозай для Эўропы. Што б ні рабіла Амэрыка – гэта зло. Згодна з такой лёгікай, калі Амэрыка некага падтрымлівае, то, паводле аналітыкаў «Guardian» і «Independent», гэта a priori нешта падазронае і кепскае. Калі Амэрыка супраць постсавецкіх «супэрпрэзыдэнтаў», то «Guardian» за іх, а мільёны ўкраінцаў «пагражаюць эўрапейскай бясьпецы і стабільнасьці».

Параўнайце першую рэакцыю Эўразьвязу і Амэрыкі на падзеі ўва Ўкраіне. Колін Паўэл кажа, што найважнейшае для Амэрыкі – каб галасы ўкраінцаў былі сумленна падлічаныя, каб народ меў магчымасьць выбраць сваю ўладу. Першай рэакцыяй Хаўера Саланы было, цытую: «Перш за ўсё мы павінны забясьпечыць стабільнасьць і тэрытарыяльную цэласнасьць Украіны…». І толькі пасьля ён пачынае гаварыць пра выбарчыя фальсыфікацыі і сумленны падлік галасоў. Прыярытэты відавочныя.

Парадаксальна – украінская рэвалюцыя адбываецца пры пэўнай дапамозе амэрыканскіх рэсурсаў, але ідэалягічным рухавіком рэвалюцыі зьяўляецца арыентацыя на эўрапейскія ідэалы. Украінцы мараць пра заможнае жыцьцё, эфэктыўную і абмежаваную ўладу і... сяброўства ў Эўразьвязе! Украінцы праводзяць паралелі з польскай «Салідарнасьцю» і падзеямі 1989 году. Украінцы хочуць, каб Эўразьвяз быў актыўным удзельнікам працэсу дэмакратызацыі іхнай краіны. І неістотна, хоча Эўразьвяз быць дэмакратызатарам, ці не. Ён аказваецца дэмакратызатарам міжволі. Аднак калі Эўразьвяз мае намер быць сапраўдным гульцом на сусьветнай арэне, а не загародкай ад імігрантаў, ён павінен паказаць, як ён мае будаваць альтэрнатыўныя Амэрыцы міжнародныя праекты. Інтэграцыю былых савецкіх сатэлітаў у Эўразьвяз можна разглядаць і як альтэрнатыўны амэрыканскаму працэс дэмакратызацыі і эканамічнай глябалізацыі. Эўропа крытыкуе Амэрыку за яе актыўную замежную палітыку, асабліва на Блізкім Усходзе, прапануючы ўзамен больш «мяккія варыянты» паступовай

дэмакратызацыі. Калі ласка, трымайце Ўкраіну. Хоча Эўропа ці не, яна цяпер змушаная ўключыцца ў працэс нацыятварэньня ва Ўкраіне, прыкладам, у якасьці альтэрнатывы амэрыканскаму праекту пад назвай Ірак. Ва Ўкраіне гэта будзе лягчэй. Не вытрымлівае крытыкі аргумэнт, што Эўропе спачатку трэба ператравіць новых усходнеэўрапейскіх чальцоў, перш чым разглядаць новыя кандыдатуры на далучэньне. Што там ператраўляць, там і так усё нармальна. Ніякіх праблемаў новая хваля пашырэньня не прынесла – ні нашэсьця імігрантаў, ні эканамічнага крызісу. Вось калі нічога не рабіць з Украінай, чакайце і нашэсьця імігрантаў, і эканамічных стратаў. Галяндзкі палітык Валькенстайн у сваёй кніжцы «The Limits of Europe» з трымценьнем у голасе засьцерагае: калі ж калі мы зараз прымем Турцыю, то ў нас ня будзе падставаў, каб не прыняць пасьля і Ўкраіну. Ай-яй-яй! У лістападзе Ўкраіна сама сябе прыняла.

ВЫСНОВА
ТРЭЦЯЯ:
РАСЕЯ
БОЛЬШ
НАМ НЕ
СУДЗЬДЗЯ

Дэзінтэграцыя Ўкраіны – гэта міт, створаны Кучмам, каб падштурхнуць украінцаў прыняць правілы яго гульні, зьбіць тэмп рэвалюцыі і правесьці канстытуцыйную рэформу. Нешта ўдалося, нешта не, гэта стане відавочна трохі пазьней, бо шмат чаго адбываецца за замкнёнымі дзьвярамі. Міт Усходу-Захаду падхапілі расейскія і заходнія мэдыі. Але Ўкраіна дзеліцца не на Захад і Ўсход, а на тых людзей, якія імкнуцца да зьменаў, і тых, якія зьменаў баяцца, іншымі словамі, на тых, якія пагражаюць «стабільнасьці», і тых, якія да яе імкнуцца. З другога боку, Усход (нармальныя пацаны) сапраўды падтрымлівае Януковіча, а Захад (бандэраўцы) і Цэнтар (казлы, якія зажэрліся) – Юшчанку. Пэўны падзел існуе – гэта факт, але ён не такі «цьвёрды», каб гаварыць пра нейкую дэзінтэграцыю. Яднае ўкраінцаў Захаду і Ўсходу больш, чым разьядноўвае. Усход галасаваў за Януковіча, бо не меў альтэрнатывы, ня бачыў яе ў СМІ, а за «фашыстаў» і «бандэраўцаў» галасаваць не хацеў. Некаторыя беларусы таксама лічаць, што ў Беларусі

людзям жывецца лепей, як у Польшчы, але ці будуць яны так лічыць, калі на БТ пакажуць іншую карцінку ці, тым больш, выпіўшы кавы ў Кракаве? Цяжка сказаць, колькі зь іх перадумае, але частка перадумае напэўна , праўда, можа, дзеля гэтага спатрэбіцца іх звазіць яшчэ і ў Познань. Тое самае на ўсходзе Ўкраіны.
Толькі лянівы не пісаў наконт пазыцыі Расеі і Захаду ва Ўкраіне. Расея наракае, што супраць прарасейскага кандыдата былі выкарыстаны «брудныя» тэхналёгіі, што ўсё было праплачана амэрыканцамі, што іх «бок» (Януковіч) удзельнічаў у выбарах, а іх апанэнты рыхтаваліся да рэвалюцыі, і рэвалюцыі «не дали вовремя в морду». Маскоўскія паліттэхнолягі чамусьці забываюцца, што заходняя падтрымка Юшчанкі не ішла ў параўнаньне з падтрымкай Януковіча Расеяй і алігархічнымі кланамі. У абсалютных лічбах на кампанію Януковіча было вытрачана у пяць разоў больш грошай, чым на кампанію Юшчанкі. І калі ва Ўкраіне не было інстытуцыяналізавана фінансаваньне палітыкі і палітычныя праекты не маглі падтрымлівацца легальнымі спосабамі, дык толькі таму, што менавіта такая сытуацыя былы выгадная кучмістам. Нарэшце, я не заўважыў Буша на трыбуне разам зь Юшчанкам. У адрозьненьне ад Пуціна зь Януковічам. Асабліва цынічнымі выглядаюць закіды, што апазыцыя парушыла канстытуцыйны працэс і выбарчае заканадаўства Ўкраіны. І гэта кажуць людзі, якія скралі галасы людзей і пляваць хацелі на законы!
Украіна, да якой у Расеі ставіліся як да меншага брата, хахлоў, радзімы сала, паказала, што яна на парадак абагнала Расею паводле разьвіцьця палітыкі і грамадзянскай супольнасьці. Расея не разумее, што, пакуль яна не навядзе парадку ў сябе, ёй вельмі складана будзе нешта прапанаваць за мяжой, акрамя трубы.
Пуцін увязаўся ў авантуру, ад якой рэпутацыя Расеі папросту абвалілася. Паводле псыхалягічных наступстваў, падзеі 2004 году ва Ўкраіне можна параўнаць з падзеямі 1989 году ва Ўсходняй Эўропе.
А што з усяго гэтага Беларусі? Яна, нарэшце, эмансыпавалася. Зараз Расеі ня будуць баяцца ані Лукашэнка, ані апазыцыя. Вядома, наіўна было б сьцьвярджаць, што Расея больш ня будзе адыгрываць ніякай ролі ў беларускай палітыцы. Але ў Беларусі адбылася пэўная рэвалюцыя ў мазгах: пераацэнка

магчымасьцяў Расеі ў галовах палітычных актораў. Калі раньні Лукашэнка глядзеў, як «бюракратычная вэртыкальная машына» гарызантальна рэагуе на выказваньні ці дзеяньні прэзыдэнта Расеі, калі раней апазыцыя «езьдзіла дамаўляцца ў Расею», цяпер гэта ўжо не абавязкова. Што б ні адбывалася цяпер, гэта будзе ўнутранай справай Беларусі.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25

[image]

Мінулы (1'2000)

[image]
ARCHE Пачатак № 1 (35) - 2005
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image]2005
Пачатак • Навіны • Форум • Пошук • Аўтары • Цалкам • Іншае

асаблівага задавальнення: «Іншая справа – дакументалістыка, мемуары».
Тэксты класікаў таксама – чытаеш-гартаеш. Як навукоўца, выкладчык, лектар. Як асоба, якая марна стукаецца ў браму вечнасці, у гэтым працэсе аніяк не задзейнічаны. Куды з большай цікаўнасцю спыняешся на зносках, каментарыях, варыянтах. Не таму што напоўніўся семантычным жыццём тэксту, а таму што адчуваеш яго сэнсавую закрытасць і ўласную недаспеласць. Рыхтуешся да ўзыходжання, якое можа стацца насамрэч падзеннем у падрыхтаваную лёсам пастку, у лепшым выпадку, безнадзейным кружэннем у семіярусным лабірынце Саламона.
Класіка, асабліва аддаленая па часе, патрабуе паглыбленай трактоўкі і сур'ёзнай інтэрпрэтацыйнай працэдуры. Найбольш наглядна гэта праяўляецца ў перакладчыцкай справе, калі многія рэаліі даўняй эпохі, іншай культурнай сітуацыі, адзнакі нацыянальнай самабытнасці проста немагчыма данесці да замежнага чытача. Уладзімір Набокаў адчуў гэта і ўсвядоміў, калі пераклаў на ангельскую мову раман у вершах Аляксандра Пушкіна «Яўген Анегін». Ягоны гістарычна-літаратурны каментар разоў у шэсць большы за асноўны тэкст. Зрэшты, увесь неабдымны корпус літаратуразнаўчых даследаванняў уяўляе сабой суцэльны Каментар.
Цяжэй у гэтым дачыненні беларускаму навукоўцу: шматлікія падрабязнасці і знакі непаўторнай атмасферы нават нядаўняе пары начыста змыла «чужая хваля», якая з тупым пастаянствам накочваецца на нашу зямлю з захаду на ўсход і з усходу на захад. Як гэта бывае, якіх разумовых высілкаў патрабуе, лёгка пераканацца, знаёмячыся, скажам, з летапісам жыцця і творчасці Янкі Купалы, насычаным невядомымі фактамі, дакументамі, цытатамі з замежных публікацый пра паэта (напісаным Янкам Саламевічам), з каментарамі да збораў твораў нашых класікаў, якія рэдка калі займаюць чвэрць тому, у той час, як у нашых суседзяў паўтому, а то і больш. Сабраныя ў асобныя зборнікі ўспаміны сучаснікаў пра «залатую пяцёрку» родапачынальнікаў нашай новай літаратуры – усяго толькі тандэтныя нататкі. На гэтым фоне літаратурныя запісы Максіма Лужаніна «Колас расказвае пра сябе» выглядаюць не горш, чым Экерманаўскія «Размовы з Гётэ».
Аператыўнасць, з якою сабрана і выдадзена кніга ўспамінаў

«Наш Быкаў» (укладальнік Генадзь Бураўкін), заслугоўвае ўхвалы. Сапраўды, «ніхто так не зможа расказаць пра Васіля Быкава-чалавека, сябра, суразмоўцу, бяседніка, жартаўніка, спагадніка (да гэтага пераліку варта дадаць – аналітыка, філосафа, прарока, вобраз якога ва ўспамінах не-не ды і заяўляе аб сабе. – **Аўт.**), як тыя, каго пры жыцці адарыў ён сваім даверам, з кім разам прайшоў тыя ці іншыя вёрсты свайго зямнога шляху».

Праўда, узнікае пытанне, каго можна лічыць сябрам «Вялікага Беларуса», як назваў яго Раман Лубкіўскі. Чые ўспаміны вартыя даверу? Таго, хто ведаў Быкава блізка шмат гадоў і прызвычаіўся да ягонага вобразу настолькі, што амаль не заўважаў зменаў, ці таго, хто меў усяго некалькі сустрэч, але заўважыў нешта вельмі значнае, уласна «быкаўскае» ў Быкаву? У кнізе ёсць спробы абазначыць кола сяброў. На думку Валянціна Блакіта, гэта наведнікі кавярні «Сівыя коні» (так жартам называлі «ладную ўтульную сталоўку» ў кватэры Генадзя Бураўкіна), а таксама «гасціннай і ўтульнай хаты» самога Васіля Уладзіміравіча (далей ідзе досыць шчыльны пералік імёнаў і прозвішчаў). Часам ва ўспамінах удакладняецца ступень сяброўскіх дачыненняў з Быкавым. Уладзімір Някляеў з уласцівай яму душэўнай адкрытасцю і нават расхінутасцю адразу абсякае ўсякую магчымасць домыслаў: «Я не быў з Васілём Уладзіміравічам у блізкім сяброўстве». Акрамя зразумелых адрозненняў ва ўзросце, характары і тэмпераменце, ёсць у яго і такая агаворка: «...яго надта шчыльна атуляла, апекавала сяброўскае кола. Як з тых, хто сапраўды быў сябрам, так і з тых, хто ў сябры набіваўся. Іншым разам ён нават здаваўся мне нібыта прыватызаваным». Працэс «прыватызацыі», як можна здагадацца, працягваецца і будзе працягвацца далей: «наш» – «не наш», «свой» – «чужы». Стваральна-разбуральная праца часу жахлівая па сваіх наступствах. Таму ў любым разе лепш паспяшацца, чым адкладваць на пазней. Васіль Быкаў, у якога стасункі з часам былі асабліва напружаныя: ён марудна запрагаў, але ехаў шпарка, урэшце ўласнае жыццё трансфармаваў у вялікі і – гэта варта падкрэсліць – надзіва завершаны твор. Ён паспеў напісаць уласныя ўспаміны. Добра вядома, як упарта адмаўляў ён заўсёды, і яшчэ гады за тры да свайго скону, усялякую гаворку пра сваю асобу. У час саспеў і паспеў. А вось Якуб

Колас не паспеў, хаця выказваў напрыканцы жыцця мару напісаць не аўтабіяграфічны раман, а проста аўтабіяграфію, у якой хацеў назваць усё і ўсіх сваімі імёнамі: братоў Луцкевічаў – Луцкевічамі, а не паланізаванымі Ліскоўскімі, Стафанам і Ясем, Аляксандра Уласава – Уласавым, а не абразлівым Уласюком. Паспеў Алесь Адамовіч («Vixi»), паспеў Васіль Быкаў («Доўгая дарога дадому»). Абодва («Яны вартыя былі адзін аднаго, Быкаў з Адамовічам») разглядалі жыццё як творчасць, а творчасць як жыццё, і стваралі яго штодня, ажно да скону. Менавіта таму Быкаў казаў тым, «каго пры жыцці адарыў сваім даверам»: «З майго вопыту… жыць – як посвіст міны сачыць, каб ад асколкаў зратавацца. Ніколі не бывае зарана, а бывае толькі запозна». Сказанае, як відаць, прадуманае, узважанае, бо паўтараецца не раз і датычыцца, напрыклад, такога балючага пытання, як аб'ектыўны, нерэтушаваны вобраз беларусаў (Раман Лубкіўскі ў сувязі з гэтым згадвае словы Томаса Венцлавы: найвялікшы патрыятызм у тым, каб ваяваць з комплексамі сваёй нацыі). Адсюль жорсткая фармулёўка, якая датычыцца будучыні Беларусі і ўражвае сваёй катэгарычнасцю: «…беларусам з іх скамунізаванай свядомасцю спатрэбіцца шмат часу, каб выйсці з духоўнай няволі. І шлях да свабоды будзе цяжэйшым. Нам цудаў чакаць не выпадае. Мы доўга збіраліся і, як заўсёды, спазніліся…» (словы В. Быкава, паводле згадак Уладзіміра Халіпа); «…гістарычны шанс стаць еўрапейскай краінай Беларусь страціла незваротна», «двойчы да прапаноў сваіх гісторыя не вяртаецца» (словы В. Быкава ў пераказе У.Някляева), «напэўна, анёл справядлівасці заўсёды спазняецца» (гэтыя словы В. Быкава запомніў Дзмітро Паўлычка).

Кантэкст жыцця і творчасці Васіля Быкава, які старанна рэстаўруюць ягоныя сучаснікі, мае на мэце не толькі бясконцую, з пераменным поспехам, энергастратную вайну пісьменніка з некрафільскімі рэжымамі, але і вайну за самога Быкава. Гэта выявілася ў назве кнігі «**Наш** Быкаў». Хаця магло быць і афектыўнае: «Быкаў **наш**!». Створаны кантэкст нагадвае поле пасля бітвы, на якім – у прыкметна аслабленым варыянце, заднім чыслом – дагульваюцца адкладзеныя на вечнае потым партыі, больш падобныя да партый, якія гуляе сам з сабою Гуга Плудэк, персанаж п'есы Вацлава Гаўла (імя, як вядома, невыпадковае ў згаданым кантэксце).

Магчыма, таму аўтары ўспамінаў, сябры Васіля Уладзіміравіча, так ахвотна згадваюць лёсавызначальныя, семантычна значныя моманты нашай гісторыі, калі Быкаў-літаратар саступаў месца Быкаву-дзеячу, нацыянальнаму і дзяржаўнаму, байцу, які ідзе ў бой, пад кулі адкрыта, рызыкуе, бо – дадзела, бо – «калі не ён, дык хто яшчэ». Гэта Быкаў – прамоўца, палеміст, камікадзэ – часу паўлегендарнага V з'езду СП БССР, «калі звалілі з трону Броўку». Гэта Быкаў, які кіраваў Устаноўчай канферэнцыяй «Мартыралогу Беларусі», на якой адначасова быў створаны і Аргкамітэт Беларускага Народнага Фронту, і, бачачы, што карабель ляціць на рыфы, узяў на сябе стырно і выратаваў сітуацыю... Аднак лепш працытаваць відавочцу і ўдзельніка падзей, самага актыўнага і самага зацікаўленага, а менавіта Зянона Пазьняка:

Колькі я раней назіраў за Быкавым, ён нават у вельмі вострых дачыненьнях у час грамадзкіх сутыкненьняў, спрэчак ды канфліктаў маўчаў, як камень. Пазыцыю меў, але ніколі ня кідаўся ў петушыную бойку.

І тут раптам ня вытрымаў Быкаў. Ён устаў у гневе, хутка і рашуча. Выгляд ягоны быў пагрозьлівы. (У мяне мільганула нават бязглуздая думка, што ён зараз пагоніць Бузука.) Але Быкаў рэзка крутануў да сябе мікрафон з-пад роту цэкіста і сказаў тое, што трэба, у поўнай цішыні, якая запанавала пры ягоным выступе.

Пасьля кароткага і моцнага выступу Быкава Бузук неяк зьвяў і неўзабаве здаўся.

Такі Быкаў, Быкаў у паваротныя, сапраўды гістарычныя моманты, «в минуты страсти роковой», калі вырашаецца занадта многае ў лёсе нацыі, несумненна, прыцягвае ўвагу і аўтараў кнігі, і яе чытачоў. Магчыма, таму згаданыя эпізоды нашай нядаўняй, але такой насычанай жарсцямі гісторыі ў кнізе ўспамінаў узноўлены ў падрабязнасцях не раз і не два. У агульнай ацэнцы галоўнага героя гэтых падзей усе сыходзяцца, бо ўсе ўдзячныя лёсу, што былі відавочцамі і ўдзельнікамі «масоўкі».

Чытача, аднак, прываблівае не «наш» і не «ваш», тым больш не «мой», а – сам **Быкаў**. Дзе ён – «Вася, Васілёк, Васіль» (загаловак да ўспамінаў Валянціны Быкавай, сястры Васіля Уладзіміравіча). Няхай сабе і ў моцна суб'ектывізаваным варыянце глыбока асабістага ўспрымання нацыянальнага генія.

Так, генія. Неспазнавальнага паводле вызначэння, геніяльнага – на свой лад – і ў дробязях. Хаця ва ўспамінах сустракаюцца і іншыя «высокія» вызначэнні: апостал, волат, гонар і сумленне нацыі, магутны талент, вялікі чалавек, баец, «легенда», «гарант, што Беларусь Жыве», прарок, «сумны прарок», «чалавек-крэмень, чалавек-маналіт, чалавек цвёрдага сэрца і халоднага розуму», «чорнарабочы літаратуры», «прыклад сапраўднага беларуса», «надзвычайны чалавек», «настаўнік і сябра», «у ім адразу і гуру, каб навучыў, і суддзя, каб рассудзіў, і прарок, які б наперад сказаў, і правадыр, які б павёў наперад... і дарадца...». І нарэшце як апафеоз – самае трапнае (цікава, што ўбачанае здалёк): Вялікі Беларус.

З моманту, калі пачаліся ўспаміны, свабодны самарух пісьменніка і яго тэкстаў у часе і прасторы завяршаецца, і пачынаецца «прымусовая інтэрпрэтацыйная працэдура», «адсочванне ўсіх спантанных сэнсавыяўленняў», «дэталёвае даследаванне феномена» (калі ўжыць энцыклапедычнае тлумачэнне паняцця «каментар»). У індывідуальнай памяці – то ўчэпістай на дэталі, то дастаткова агульнай – адсочваецца мноства жыццёвых праяў асобы Быкава, якія і пры яго жыцці, а тым больш пасля яго скону, успрымаюцца як сэнсоўныя, знакавыя, семіятычныя. Сёй-той, не хаваючыся за недарэчныя ў гэтай сітуацыі агаворкі і не прэтэндуючы асабліва на адкрыццё, называе эпізоды быкаўскага жыццяпісу, у якіх выявіўся «паралелаграм грамадскіх сіл і тэндэнцый» і сканцэнтравалася «раўнадзеючая гісторыі» (Фрыдрых Энгельс). Сёй-той задавальняецца апісаннем мілых падрабязнасцяў, у якіх не адчуваецца высокага напружання быкаўскага існавання ў свеце, якое не дазволіла пісьменніку «паляжаць на траўцы», пажыць у «вежы са слановай косці» («Калі б была такая магчымасьць, – пісаў В. Быкаў, – дык ідэал для мяне як пісьменьніка, – гэта вежа са слановае косьці. Я там бы выдатна жыў. На жаль, так не атрымліваецца. Гэта немагчыма ў наш час»). А ці ёсць ён наагул, гэты шчаслівы час, калі «писатель пописывает, а читатель почитывает»?

У большасці выпадкаў аўтары ўспамінаў застаюцца ў палоне быкаўскага прыцягнення, у полі яго духоўнага ўздзеяння. «Калі неабходна было самавызначацца, – успамінаў Валянцін Тарас, – заняць ясную грамадзянскую пазіцыю, арыенцірам маім стаў Васіль. І яшчэ Алесь Адамовіч. Там, дзе яны, – там і маё месца».

Гэтыя дакладныя, няхай сабе і пафасныя, як урачыстая клятва над прахам блізкага сябра, словы маглі б паўтарыць вельмі і вельмі многія прыхільнікі таленту Быкава. Рэальную магчымасць перасекчы межы гэтага «поля Быкава» стварае «яснасць позірку» (у экзістэнцыялісцкім разуменні), «цвярозасць думкі» (з пункту погляду сучаснага прагматызму), «касмічная непачцівасць» (Бертран Расел). Гэта здараецца тады, калі свядома не прымаецца ў разлік «выпадковасць дыскурсу», калі за ўсім бачыцца нешта большае: глыбіня, вышыня, вечнасць. Гэтае трымценне «саломінкі на павуцінцы», за якой адчуваецца блізкая прысутнасць «усёй горычы свету» (Кузьма Чорны), музыка ўсеяных зоркамі нябёсаў чуецца чамусьці найчасцей ва ўспамінах, аўтары якіх імкнуцца рацыянальна асэнсаваць феномен Быкава.

А жыццяпіс Васіля Быкава, як дасканала агранены дыямент, літаральна зіхаціць знакамі. «Бог паслаў Васіля, Уладзіміравага сына, на зямлю крывіцкую, каб бараніць яе, мацаваць веру люду крывіцкага ў сваю наканаваную наступнасьць» (Рыгор Барадулін). Праўда, «барадулінскі» пафас і «біблейская» ўзнёсласць тут жа ўдакладняюцца, зазямляюцца, арэчаўляюцца «быкаўскім» сарказмам: «...Бог водзіць рукою лёсу. Але ўсё ня ў нашую карысьць. А, можа, так і трэба...» І зноў Рыгор Барадулін: «Апостал нацыі мысьліў касьмічна-заземлена. Нябёсы паслалі яго на зямлю, Звышні сьцярог яго». А далей згадваецца эпізод з часоў вайны, калі асабіст, размахваючы пісталетам, гразіўся расстраляць Быкава: «Празь якія дзьве гадзіны асабісту адарвала абедзьве рукі». У Валянціна Блакіта – свой аргумент на карысць думкі, што «Бог жыў у яго душы»: «З ім іншы раз рабіліся незразумелыя, сапраўды нейкія містычныя рэчы... амаль заўсёды, едучы за рулём на Вушачы ці з Вушач, ля Бараўлян з ягонай машынай нешта ўдаралася – ці матор пойдзе ўразнос, бы нейкая нячыстая сіла раптам пасялілася ў карбюратары, ці наадварот – глухне і ні з месца. Варта адбуксіраваць з кіламетр – і ўсё ў парадку. Ён меркаваў, што ля Бараўлян нешта мусіць з ім здарыцца...»

Сапраўды, знакаў бяды ажно занадта ў жыцці Быкава. Уладзімір Яварыўскі, разважаючы над загадкамі яго лёсу, «быў змушаны зьвярнуцца да высокіх знакаў-сымбаляў, бо само жыцьцё Васіля Быкава было пранізана дзівоснай, а часам і жудаснай сымболікай». Гэтая вера ў боскую наканаванасць

такая моцная, што Уладзімір Някляеў, прыродны фаталіст, у дні, калі спраўдзілася быкаўскае прадчуванне, што будзе рабіцца вакол яго труны, раптам паспакайнеў, «упэўнены, што ўсё будзе добра: Быкава пахавае Бог». Знакамі боскай увагі поўнілася гераічная эпапея народнага развітання, апісаная так падрабязна, што здаецца, можна лёгка ўзнавіць храналогію падзей пагадзінна, а ў асобныя моманты і пахвілінна. Барыс Кіт, даведаўшыся, «як Беларусь разьвітвалася са сваім вялікім сынам, пераканаўся, што Радзіма наша сапраўды выхаваная на творах Быкава і ня збочыць са шляху цывілізаваных краін Эўропы, Шляху Васіля Быкава...».

Валянцін Аскоцкі засведчыў ад свайго ўласнага імя і ад імя расійскіх пісьменнікаў «скрушнае, горкае пачуццё агульнай незаменнай страты: усім нам, і беларусам, і рускім трэба будзе навучыцца жыць без Васіля (Быкава)». Па сутнасці, гэта азначае – ведаць, па магчымасці, як мага больш пра пісьменніка – ідэал, да якога імкнуцца ўсе даследчыкі, а ўслед за імі і шматлікія прыхільнікі таленту вялікага чалавека. Васіль Быкаў, як ніхто, багата зрабіў для таго, каб пашырыць «сектар свабоды». Гэтага глытка свабоды хапіла яго пакаленню, яго нашчадкам, каб «людзьмі звацца». «Прынцып каментару» (Мішэль Фуко) у гэтых адносінах стварае надзвычайную магчымасць «семантычнай навізны», якая адкрывае сэнсавыя глыбіні быкаўскіх тэкстаў, загадкі самога жыцця і лёсу пісьменніка, развенчвае асобныя міфы і стварае грунт пад новую міфалогію (а як без яе!).

P. S. Да размовы пра «выпадковасць дыскурсу» і «знакавыя сістэмы» як пацвярджэнне іх крэатыўнага патэнцыялу, напэўна, мае непасрэдныя адносіны такая згадка. Некалі Аляксандр Салжаніцын у кнізе ўспамінаў «Бадалася цялятка з дубам» спрабаваў на свой лад рэабілітаваць «простых людзей», якія стваралі калялітаратурнае асяроддзе, і разважаў пра ролю жанчын, літсупрацоўніц, выдавецкіх рэдактарак у ягоным уласным лёсе.

Пра тое, што Васілю Быкаву адзін час даводзілася вельмі цяжка чыста матэрыяльна, сведчаць многія. Лявон Баршчэўскі, напрыклад, згадвае, як аднойчы «фронтаўцы» падвозілі колькі мяхоў з бульбай. Згадвае ён і пра адмысловыя стасункі Быкава з Гуманітарным ліцэем. Дык вось, недзе позняй восенню 1997 году Васіль Уладзіміравіч наведаў ліцэістаў і на працягу

паўтары гадзіны адказваў на пытанні нашых навучэнцаў. Ён сядзеў за журнальным столікам на невысокай сцэне перад запоўненай дзецьмі залай, і я са свайго першага раду бачыў, як няўтульна ён сябе адчуваў, хаця меў шматгадовы вопыт падобных сустрэч, пакуль не зразумеў прычыну. Ён хаваў пад стул, на якім сядзеў, ногі ў старэнькіх чаравіках. І такою нястачаю і нэндзаю павеяла на мяне гэтая сцэна (у нас і Максім Танк, і Пімен Панчанка, былі часы, літаральна галадалі, жывучы на сваю жабрацкую пенсію, пад якую ўраўнялі ўсіх, народных, заслужаных, Герояў, ветэранаў), што я не ўтрымаўся і распавёў пра ўсё сваёй падчарцы Ганне Кісліцынай, літаратурнаму крытыку. Яна, натура па-жаночы эмацыйная і непасрэдная, у сваю чаргу, пры нагодзе распісала гэтую сцэну Тамары Залатухінай, былой супрацоўніцы «Литературной газеты» ў Маскве, якая шмат зрабіла ў свой час для прапаганды беларускай літаратуры. Тамара Фёдараўна паведаміла пра бядотнае становішча сям'і Быкавых Расійскаму ПЭН-цэнтру... і скончылася ўсё тым, што Фінскі ПЭН-цэнтр прапанаваў Васілю Уладзіміравічу Быкаву сваю дапамогу. Здаецца, так гэта было. Размова ідзе пра «непрадбачаную выпадковасць», пра «адкрытую множнасць», пра «выяўленне іманентнага патэнцыялу семантычнай самаарганізацыі дыскурсіўнага асяроддзя» як асаблівасці эры каментароў.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

крытыка [image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image]	[image]	[image]	**ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ**
		Віталь Сіліцкі Імперыя альбо лідэр?	стыпэндыят «Reagan-Fascell Democracy Fellow»
		Выданне, якое аглядаецца ў артыкуле:	вашынгтонскага Нацыянальнага фонду ў падтрымку дэмакратыі.

Zbigniew Brzezinski. *The Choice: Global Domination or Global Leadership*. – New York: Basic Books, 2004.

Заканчэнне халоднай вайны пакінула шмат каго ў Амерыцы перад пытаннем, а ці патрэбна іх краіне наогул замежная палітыка? Ці засталіся ў свеце пагрозы і выклікі, якія робяць мэтазгодным яе чынны ўдзел у міжнародных зносінах? Сапраўды, пачатак дзевяностых гадоў характарызаваўся імклівым ростам заклікаў да ізаляцыянізму ў замежнай палітыцы Амерыкі. Адсутнасць пагрозы глабальнага знішчэння і абвешчаны пэўнымі інтэлектуальнымі коламі канец гісторыі рабілі, у вачах шмат каго, занадта вялікую прысутнасць у свеце і надзвычай высокія выдаткі на замежную дапамогу немэтазгоднымі і бессэнсоўнымі. Глабальныя змены, што прывялі да калапсу камуністычнай сістэмы і ў далейшым ім правакаваліся, падаліся некаторым занадта далёкасяжнымі. Як вынік, прэзідэнт Буш-старэйшы ў жніўні 1991 г. ледзь не на каленях прасіў украінскую Вярхоўную Раду не аддзяляцца ад

СССР. У той жа час, тады яшчэ кандыдат у прэзідэнты ЗША Біл Клінтан атакаваў Буша-старэйшага менавіта за яго занадта высокую ангажаванасць у сусветную палітыку і абыякавасць да палітыкі ўнутранай. Нарэшце, з публікацыяй у 1994 г. кнігі Сэмюэла Гантынгтана «Сутыкненне цывілізацый», ізаляцыянізм набыў ідэалагічнае апраўданне згодна прымаўцы, аналаг якой можна знайсці літаральна ў кожнай мове свету: у чужой бажніцы свечкі не папраўляй. Потым здарыўся генацыд у Руандзе, этнічныя чысткі ў Босніі і Косаве, міжнародны тэрарызм пачаў падымаць галаву як пагроза, параўнальная сваімі разбуральнымі наступствамі з супрацьстаяннем антаганістычных сусветных сістэм. Нарэшце, пасля 11 верасня 2001 г. стала канчаткова зразумела, што ідэалогія ізаляцыянізму будуецца на ілюзіі, што свет усё яшчэ застаецца такім, якім ён быў створаны вестфальскай дамовай XVII ст.: ён складаецца з суверэнных дзяржаў, якія, у сваю чаргу, ёсць канчатковай крыніцай стабільнасці альбо хаосу, вайны альбо міру, супрацоўніцтва альбо канфрантацыі. Насамрэч свет аказаўся нашмат больш узаемазвязаны, чым здавалася нават самым выбітным пратаганістам глабалізацыі. Нацыянальныя межы могуць спыніць перамяшчэнне людзей (і войскаў, танкаў, ракетаў), але не ідэй, якія сеюць дабро альбо зло. Нацыянальная (альбо транснацыянальная) бяспека не можа будавацца на традыцыйных прынцыпах ваеннай моцы альбо балансу сілаў у той момант, калі за кошт некалькіх квіткоў на самалёт можна набыць чатыры саманаводныя ракеты, што наносяць страты сусветнай эканоміцы ў памеры сотняў мільярдаў долараў. Нацыянальная бяспека не абмяжоўваецца бяспекай унутры нацыянальных межаў у той час, калі тэрарыстычнае сеціва інтэрнацыянальнае настолькі ж, наколькі разгалінаваная і паўсюдная прысутнасць самой Амерыкі ў свеце. Змаганне з тэрарызмам праз традыцыйную вайну паміж дзяржавамі можа мець эфект не большы, чым стральба з кулямёта па прусаках. Глабалізаваны свет вызначаецца не толькі глабальнасцю пагроз, але і іх дэцэнтралізацыяй і персаніфікацыяй на ўзроўні, які часам не мае нічога агульнага з узроўнем дзяржавы. Што ёсць мэтай і асновай замежнай палітыкі ў падобным свеце, што ёсць ключом да бяспекі і стабільнасці ў ім? Якую ролю ў новым сусветным парадку павінны адыгрываць Злучаныя Штаты, адзіная дзяржава са

статусам, вызначаным згодна стандартам халоднай вайны як звышдзяржава?
Традыцыйна, заходняе палітычнае мысленне наконт міжнародных адносін будуецца на падставе дзвюх тэорый. Першая – рэалізм – вызнае дзяржаву як асноўны суб'ект дачыненняў у свеце і бачыць ключ да стабільнасці ў балансе сілаў. З пункту гледжання рэалістаў, дзяржавы паводзяць сябе незалежна ад іх унутранага палітычнага ладу (усім патрэбная моц і ўплыў), таму ідэалогіі не месца ў сусветнай палітыцы. Такі пункт гледжання ў сучасным амерыканскім мысленні часцяком вызначаецца як «ніксанізм» – паводле прозвішча былога прэзідэнта, што дасягнуў паслаблення напружанасці ў адносінах з СССР і адначасова выкарыстаў ангажаванне з Кітаем як сродак балансавання савецкай пагрозы, нягледзячы на такія ж фундаментальныя ідэалагічныя разыходжанні з Паднябеснай, што існавалі і ў дачыненнях з савецкай імперыяй. Другая тэорыя вызначаецца як лібералізм і грунтуецца на веры ў тое, што дзяржава трымае ў свеце першынство ў залежнасці ад таго, якім чынам яна існуе ўнутры самой сябе. Згодна з гэтым, мір і стабільнасць залежаць ад пашырэння свабоды і дэмакратыі. Зноў жа паводле імя былога прэзідэнта ЗША, найболей вядомага ў якасці пратаганіста гэтай замежнапалітычнай лініі, гэтая тэорыя вядомая як «вільсанізм». Аднак, ці ёсць «ніксанізм» і «вільсанізм» адказамі на выклікі сённяшняга дня? З аднаго боку, ці можна шукаць адказ на пытанні глабальнай бяспекі ў балансе сілаў між дзяржавамі (і гэтак абмяжоўваць сваю свабоду манеўра вызнаннем суверэннасці) ва ўмовах, калі дзяржавы не кантралююць сілы зла? З іншага боку, ці патрэбныя сёння старыя стратэгічныя альянсы (такія, напрыклад, як еўраатлантычная супольнасць заходніх дэмакратый), асабліва калі яны звязваюць рукі ў барацьбе з сусветным злом? Ці не прыйшоў час больш гнуткіх, тымчасовых кааліцый па інтарэсах? У дачыненні да пытання дэмакратыі – ці павінна наяўнасць альбо адсутнасць дэмакратыі вызначаць замежную палітыку і партнёраў у барацьбе з сусветнымі пагрозамі, а з іншага боку, ці павінен дэмакратычны гегемон абмяжоўваць сябе клопатам аб падтрыманні стратэгічнага балансу ва ўмовах, калі некаторыя дыктатуры відавочна хаўруснічаюць з тэрарызмам?
Дамінантная на сённяшні дзень у амерыканскай палітыцы

неакансерватыўная плынь шукае адказы ў своеасаблівым сімбіёзе рэалізму і лібералізму, у формуле, вызначанай кансерватыўным аналітыкам Чарльзам Краўтхамерам як «дэмакратычны рэалізм». З аднаго боку, моц ёсць асноўным фактарам у замежнай палітыцы і вызначальным у супрацьстаянні пагрозам XXI ст. З іншага боку, дэмакратыя павінна насаджацца там, дзе дыктатура пагражае амерыканскай бяспецы. Паводле гэтай логікі, Амерыка як адзіны сусветны гегемон мае права дзейнічаць самастойна (ліквідуючы пагрозы «папераджальнымі» дзеяннямі) і не зважаць на суверэннасць і думку хаўруснікаў альбо міжнародныя інстытуты, такія, як ААН. У той жа час яна павінна насаджаць дэмакратыю ў Іраку і Палестыне, але не ў Пакістане альбо Расіі, якія збольшага супрацоўнічаюць у «барацьбе супраць тэрарызму». Замежная палітыка адміністрацыі Буша-малодшага вызначаецца менавіта гэтай логікай, найперш, аднабаковасці (зыходзячы з амерыканскай гегемоніі ў свеце) і «выбарачнага вільсанізму» (прамоцыі дэмакратыі там, дзе гэта неабходна для забеспячэння амерыканскіх інтарэсаў).

Збігнеў Бжазінскі звяртаецца да праблемы паводзін Злучаных Штатаў у свеце ў кантэксце самага глыбокага крызісу заходняга альянсу з пачатку халоднай вайны, што справакавала вайна ў Іраку. Бжазінскі, колішні дарадца прэзідэнта Джымі Картэра па нацыянальнай бяспецы, адыграў выключную ролю ў выпрацоўцы замежнапалітычнай стратэгіі, што паклала канец халоднай вайне і выкарыстоўвала сумесь сілавой гульні на «сусветнай шахматной дошцы» (назва яго іншай кнігі) ды вільсанаўскага лібералізму. З аднаго боку – гульня на аслабленне савецкай імперыі (Бжазінскі часцяком сцвярджае, што менавіта замежнапалітычныя манеўры, рэкамендаваныя ім, завабілі СССР у Афганістан). З іншага – актыўнае прапагандаванне «маральнай» дамінанты ў барацьбе з савецкай імперыяй (менавіта пры Картэру ЗША пачалі адыходзіць ад падтрымкі «сваіх сучыных сыноў» і ўзялі на ўзбраенне тэму барацьбы за правы чалавека як сродак замежнай палітыкі: пабочным эфектам стала аслабленне і калапс колішніх праамерыканскіх дыктатур на ўсім свеце). Адзін з самых каларытных гульцоў халоднай вайны (і, пэўна, найбольш выбітны мысляр Амерыкі ў дэмакратычным лагеры) кідае

выклік адміністрацыі Джорджа Буша-малодшага і заклікае да фундаментальнага перагляду падставовага бачання свету неакансерватыўнымі дэмарэалістамі.
На думку Бжазінскага, Амерыка сапраўды застаецца адзінай глабальнай звышдзяржавай, якая мае рэсурсы і магчымасці абараніць сябе і свет ад сусветных пагроз. Для яго відавочна, што бяспека адной, нават самай моцнай дзяржавы, недасягальная без бяспекі ўсіх, што прыводзіць да высновы аб неабходнасці падтрымання інтэрнацыяналізму замежнай палітыкі ЗША. Ва ўмовах, калі пагрозы сапраўды глабальныя, нацыянальная суверэннасць не можа блакаваць высілкі ў барацьбе, напрыклад, з міжнародным тэрарызмам альбо супраць распаўсюджвання ядзернай зброі. У той жа час, скамплікаванасць і ўзаемазалежнасць свету ва ўмовах глабалізацыі робіць аднабаковасць у замежнай палітыцы небяспечнай як для Амерыкі, так, па азначэнні, і для астатняга свету.
Альтэрнатывай аднабаковасці з'яўляюцца, па-першае, цярплівыя і доўгатэрміновыя высілкі дзеля замірэння найбольш нестабільных рэгіёнаў у свеце. Напрыклад, Бжазінскі заклікае да больш збалансаванага падыходу да вырашэння ізраільска-палестынскага канфлікту, заклікае, каб Захад не прымаў ані адзін з бакоў (г. зн. Ізраіль) як свайго запраграмаванага фаварыта. Па-другое, гэта паслядоўныя высілкі дзеля ангажавання прыхільных партнёраў у справе стрымлівання і, калі магчыма, ліквідацыі пагроз. Па-трэцяе, гэта прызнанне глабалізацыі не толькі як магчымасці ўзбагачэння, але і як феномена, што мае маральнае вымярэнне. Бжазінскі кажа аб неабходнасці выкарыстання таго, што іншыя аналітыкі, напрыклад, Джозэф Ні, называюць мяккай сілай – г. зн. сілы прыкладу, прывабнасці і спачування. Узмацненне мяккай сілы Захаду наўпрост залежыць ад таго, наколькі прыхільны ён да такіх праблем у свеце, як абарона правоў чалавека і барацьба супраць галечы (што ні ў якім разе не павінна ахвяравацца ў інтарэсах барацьбы з тэрарызмам). Па-чацвёртае, гэта распаўсюджванне ўнутры самой Амерыкі палітычнай культуры, што вызнае комплексную прыроду сусветнай узаемазалежнасці.
Што абмяжоўвае аднабаковасць амерыканскай замежнай палітыкі? На думку Бжазінскага, гэта перадусім натуральныя абмежаванні магчымасцяў самой звышдзяржавы. Нават яна не

мае рэсурсаў і здольнасцяў, каб «расцягнуцца» на ўсім свеце і ліквідаваць усе глабальныя пагрозы. Безумоўна, Амерыка здольная зліквідаваць ядзерны патэнцыял Ірана ці нават Паўночнай Карэі, аднак толькі падтрымка міжнароднай супольнасці дазволіць мінімізаваць чалавечыя і фінансавыя страты ў раззбраенні гэтых краін. Яна можа акупаваць Ірак, дапамагчы Ізраілю кантраляваць увесь сектар Газа і Заходні бераг ракі Іардан альбо стрымаць егіпецкіх ці палесцінскіх тэрарыстаў. Але аднабаковыя дзеянні Злучаных Штатаў успрымаюцца ў рэгіёне як праява амерыканскага імперыялізму. Вайна з тэрарызмам, паводле словаў Бжазінскага, можа хутка перайсці ў вайну цывілізацый, якая толькі пашырыць глабальныя пагрозы. Нарэшце, ва ўмовах аднабаковасці замежнай палітыкі ЗША, як гэта ні парадаксальна, менавіта набыццё зброі масавага знішчэння можа стаць адпаведнай гарантыяй для «краін-ізгояў», каб абараніць сябе ад запалохвання з яе боку (паводле аднаго анекдота, ЗША напалі на Ірак толькі пасля таго, як інспектары высветлілі, што ў Іраку сапраўды няма зброі масавага знішчэння).
Бжазінскі таксама рашуча адхіляе пункт гледжання некаторых амерыканскіх неакансерватараў, што Амерыка мусіць ахвяраваць сваімі традыцыйнымі (і на сённяшні дзень незгаворлівымі) партнёрамі ў Еўропе і знайсці новых паплечнікаў сярод іншых краін, якія найбольш зацікаўленыя ў барацьбе з тэрарызмам і нераспаўсюджваннем ядзернай зброі – хутчэй за ўсё, з Ізраілем, Расіяй, Турцыяй, Кітаем і Індыяй. Ніводная з гэтых краін не мае адпаведных рэсурсаў і магчымасцяў, каб весці барацьбу з сённяшнімі сусветнымі пагрозамі. Амаль усе яны пакутуюць ад унутраных канфліктаў, што робіць іх здольнасць да глабальнага дзеяння яшчэ больш абмежаванай, а ўмяшальніцтва ў справы іншых краін не менш супярэчлівым і патэнцыйна правакуючым небяспечную контррэакцыю, чым умяшальніцтва саміх Злучаных Штатаў. Некаторыя з іх паміжсобку з'яўляюцца стратэгічнымі канкурэнтамі за ўплыў і доступ да рэсурсаў (напрыклад, Кітай і Расія, Кітай і Індыя). Іншы шэраг супярэчнасцяў існуе паміж імі і іншымі, сталымі партнёрамі ЗША (напрыклад, Індыя і Пакістан). Да таго ж, некаторыя з гэтых краін з энтузіязмам супрацоўнічаюць з ЗША ў барацьбе з тэрарызмам менавіта таму, што, паводле іх разлікаў, апошняя прывядзе да

аслаблення Амерыкі. У рэцэнзаванай кнізе, аднак, Бжазінскі паўстае як выразны прыхільнік вільсанізму, ідэалістычнай замежнай палітыкі, заснаванай на ліберальных каштоўнасцях, шматбаковасці і дэмакратычным лідэрстве, а не гегемоніі Злучаных Штатаў.

Чаму традыцыйны альянс не страціў сваёй актуальнасці? Таму што адмова ад яго паставіла б пад пагрозу амерыканскае маральнае лідэрства ў свеце. Амерыканская гегемонія, сцвярджае Бжазінскі, прымаецца значнай часткай свету да той ступені, у якой Амерыка выступае як сусветны дэмакратычны лідэр. Хаатычныя часовыя хаўрусы з дыктатурамі разбураць найкаштоўнейшы элемент амерыканскай «мяккай сілы» ў свеце. Больш за тое, такія тэрміновыя хаўрусы прывядуць да таго, што ЗША будуць вымушаныя згаджацца з прыватнымі вызначэннямі «барацьбы з тэрарызмам» іх аўтарытарных паплечнікаў (і згаджацца, напрыклад, з генацыдам у Чачні альбо рэпрэсіямі ў Тыбеце), чым выкліча яшчэ большыя абвінавачванні ў амаральнасці і, як вынік, супраціў яе замежнапалітычным высілкам. Па-другое, разбурэнне традыцыйнага альянсу з боку ЗША выкліча адпаведную рэакцыю з боку тых самых еўрапейцаў, што прывядзе да большай антаганізацыі ўзаемаадносін і невыкарыстання існуючых шанцаў супрацоўніцтва. Па-трэцяе, гэта непазбежна прывядзе да геапалітычнай канкурэнцыі ЗША і Еўропы ў такіх рэгіёнах, як Блізкі Усход ці Лацінская Амерыка; у выніку пазіцыі як Амерыкі, так і Еўропы будуць аслабленыя. Па-чацвёртае, адсутнасць палітычнай падтрымкі з боку аб'яднанай Еўропы дае дадатковую прастору для манеўра менавіта тым сілам, з якімі ЗША вядуць барацьбу (гэта ўжо відавочна ў дачыненні да Ірана альбо ізраільска-палестынскага канфлікту). Па-пятае, дарма што Еўропа з некаторых прычын вымушана гуляць другім нумарам у вайсковых пытаннях, яе патэнцыял несувымерна большы, чым патэнцыял самых значных амерыканскіх патэнцыйных тактычных хаўруснікаў (прывядзём адзін прыклад у пацвярджэнне: адміністрацыя Буша дэкларуе як поспех тое, што ЗША злавілі альбо нейтралізавалі прыкладна тры чвэрці баевікоў і лідэраў «Аль-Каіды»; прыкладна дзве траціны поспеху залежала ад падзелу разведвальнай інфармацыі паміж хаўруснікамі). Нарэшце, як вызначае Бжазінскі, «кангламераты (тактычныя хаўрусы. –

Аўт.) не маюць гістарычнага бачання. Яны маюць толькі адчувальныя на дотык кароткатаэрміновыя інтарэсы», і як вынік, не могуць служыць падставай для будучага, што не абмежавана сённяшнім стратэгічным парадкам дня. Такім чынам, мацаванне еўраатлантычнага альянсу ёсць неабходнай стратэгічнай задачай ЗША, у тым ліку і ў плане мінімізавання тэрарыстычных альбо ядзерных пагроз сучаснасці. У гэтым сэнсе наўмысная тактычная гульня, накіраваная на падзел Еўропы (у чым Бжазінскі падазрае адміністрацыю Буша-малодшага гэтаксама, як большасць еўрапейскіх інтэлектуалаў і полісімэйкераў), адкідаецца як стратэгічна небяспечная.
У адрозненне ад дэмарэалістаў, якія бачаць галоўны выклік будучыні ў замірэнні і рэарганізацыі Блізкага Усходу, Бжазінскі бачыць задачу Захаду больш шырока, вызначаючы яе як стабілізацыю «глабальных Балканаў» (Блізкі Усход і Цэнтральная Азія). Гэтая стабілізацыя немагчымая без перавызначэння ролі Расіі ў міжнароднай супольнасці. Такім чынам, выклікі, што засталіся ў спадчыну з часоў халоднай вайны, дасюль актуальныя.
Аргументы Бжазінскага паказваюць вялікую розніцу паміж падыходамі лібералаў і дэмарэалістаў у пытанні, якое наўпрост тычыцца Беларусі і, у больш шырокім кантэксце, усяго ўсходнееўрапейскага рэгіёну: прамоцыі і пашырэння дэмакратыі. Бжазінскі відавочна зыходзіць з таго, што ліберальны шматбаковы свет будзе больш трывалым і магчымым, калі яго дэмакратычная сарцавіна пашырыцца. Зыходзячы са сфармуляванага ім геапалітычнага парадку дня і свайго бачання свету, ён бачыць асноўны напрамак пашырэння ў глыбіню Усходняй Еўропы і, па магчымасці, у Расію. Логіка дэмарэалізму вызначаецца ўспрыманнем амерыканскай перавагі як дадзенасці, і таму не бачыць неабходнасці ў распаўсюджванні дэмакратычнага ядра як такога, а заклікае да непасрэднай рэканструкцыі тых дзяржаў і грамадстваў, дзе гэта, на іх думку, найбольш адпавядае амерыканскім інтарэсам. У дэмарэалістычным парадку дня пашырэнне дэмакратыі, такім чынам, перш за ўсё тычыцца Ірака, Палестыны, магчыма, Егіпта і Іарданіі, а не Расіі, Беларусі ці Украіны. Даволі цікава, але палітычны крызіс і аранжавая рэвалюцыя на Украіне шмат у чым праходзілі пад уплывам менавіта гэтага бачання. Паводзіны Расіі падчас выбарчых і

вулічных падзей ва Украіне былі шмат у чым прадыктаваныя разуменнем таго, што дадзены рэгіён знаходзіцца ў яе зоне ўплыву і што нібыта гэтыя зоны ўплыву былі размеркаваныя падчас згоды Расіі далучыцца да антытэрарыстычнай кааліцыі. Калі Захад быў вымушаны ўмяшацца (пад уплывам тых краін новай Еўропы, якія, нягледзячы на свой выразны антыамерыканізм, больш прыхільныя да бачання Усходняй Еўропы, выказанага Бжазінскім), Пуцін быў відавочна разгублены і пачаў выказваць пярэчанні, якія выдавалі яго ўспрыманне свету, што склалася пасля 11 верасня 2001 г. (літаральна, ён пытаўся ўслых, чаму Захад умешваецца ў справы Афганістана і Ірака, а ён не можа ва ўкраінскія справы). Што тычыцца Расіі, то Бжазінскі ніколі не падзяляў аптымістычных прагнозаў наконт яе «пераходу на бок Захаду» ў сусветнай геапалітычнай гульні, якая пачалася 11 верасня 2001 г. Расія, адзначае ён, успрыняла новую рэчаіснасць (перш за ўсё імклівае пранікненне ЗША на постсавецкую прастору) «з пачуццём унутранай пагарды, хаця і са значным рэалізмам». Крокі Расіі на збліжэнне з Захадам былі прадыктаваныя перадусім геапалітычнымі разлікамі, такімі, як усведамленне ўзмацнення Кітая (гэтаксама як і паўзучай кітайскай каланізацыі поўдня Сібіры) і рост ісламскага фундаменталізму ды тэрарыстычных пагроз па перыметры яе паўднёвых межаў. У доўгатэрміновай перспектыве тэрытарыяльная цэласнасць Расіі застаецца пад пагрозай. Як рэаліст Бжазінскі пералічвае чыннікі, якія аб'ектыўна павінны зрабіць ангажаванне Расіі і Захаду непазбежнымі. Акрамя бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, гэта таксама пытанні эканамічнага развіцця (ён мяркуе, што развіццё Сібіры можа стаць для Захаду новым Кландайкам, а для Расіі – шанцам для канчатковай кансалідацыі свайго кантролю над рэгіёнам і імклівага яго развіцця як лакаматыва ўсёй расійскай эканомікі). У той жа час, Захад можа наўмысна дапамагчы кансалідаваць толькі «постімперскую, больш дэмакратычную Расію», з чаго вынікае, што ангажаванне Расіі і Захаду абмежавана ўнутранай палітычнай дынамікай самой Расіі. «Еўропа павінна асабліва сачыць, каб яе новае стратэгічнае партнёрства з Расіяй не дало Крамлю новых крыніц палітычнага ціску на блізкае замежжа». Уключэнне Расіі ў якасці нармальнай, звычайнай еўрапейскай дзяржавы ў трансатлантычную супольнасць, на думку

Бжазінскага, ёсць ключом да стабілізацыі «глабальных Балканаў».
Аднак ці рэалістычнае такое бачанне шматбаковага свету, які застаецца, паводле вызначэння нашых дамаслых геапалітыкаў, аднапалярным? Напрыклад, выклікае вялікія сумненні, што глабальны парадак дня, прапанаваны Бжазінскім, задаволіць усіх удзельнікаў шматбаковых адносін. Так, тэза аб тым, што стабілізацыя «глабальных Балканаў» залежыць ад адносін Захаду з Расіяй, адразу ж выкліча спрэчкі. Напрыклад, французская і нямецкая пазіцыі адносна таго, што «Расію нельга антаганізаваць», фактычна незалежна ад яе паводзін на міжнароднай арэне, шырока вядомыя. У адрозненне ад сітуацыі халоднай вайны, кошт нязгоды са Злучанымі Штатамі для яе хаўруснікаў цяпер значна заніжаны. Супольнай глабальнай пагрозы больш не існуе, а несупрацоўніцтва ў барацьбе з глабальным тэрарызмам можа бачыцца, асабліва пасля іспанскіх тэрактаў, як гарантыя, а не пагроза бяспецы.
Да таго ж незразумела, якім чынам новая шматбаковасць будзе структурызаваная. Цікава, але пры ўсіх закліках да шматбаковасці, Бжазінскі згадвае ААН толькі адзін раз у сваёй кнізе (і толькі ў прадмове). Такім чынам, ён міжволі пацвярджае адзін з асноўных аргументаў крытыкаў «вільсанізму»: старая сістэма «калектыўнага сусветнага ўраду» састарэла. Насамрэч, у вільсанаўскім падыходзе закладзена відавочная супярэчнасць. З аднаго боку, ён заклікае да пашырэння дэмакратыі як гарантыі міру і стабільнасці. З другога, ён усё яшчэ ўскладае надзеі на інстытуты, якія не толькі не пасуюць для ажыццяўлення гэтай мэты, але, наадварот, з'яўляюцца сродкам легітымізацыі тыранічных рэжымаў. Зазначым, што вайна ў Іраку была далёка не першым выпадкам, калі не спрацавала сістэма ААН. Варта нагадаць, што падчас крызісу ў Косаве тыя самыя еўрапейскія дзяржавы, якія потым крытыкавалі ЗША за аднабаковасць у Іраку, самі далучыліся да баявых дзеянняў у складзе NATO без рэзалюцыі Рады Бяспекі ААН.
Але ці можна разбурыць ААН без наступстваў (калі шэраг дзяржаў, якія прынята называць ізгоямі, проста вырашаць, што яны больш не звязаныя аніякімі нормамі добрага тону ў міжнародных адносінах)? Акрамя таго, што можа стаць новым

падмуркам шматбаковасці? На Захадзе цяпер вельмі модныя размовы аб стварэнні «супольнасці дэмакратый» як новага інструмента міжнародных адносін. Гэтая ідэя, аднак, адразу ж была сустрэтая ў штыхі тымі, хто ўбачыў у ёй новы інструмент амерыканскай гегемоніі ў свеце. У той жа час, ідэя супольнасці дэмакратый разумеецца па-рознаму ў залежнасці ад старых поглядаў на прыроду міжнародных адносін. Для лібералаў – гэта аб'яднанне дэмакратый заходняга паўшар'я, Еўропы і трэцяга свету, у якім важную ролю будуць адыгрываць перыферыйныя ў сэнсе падзелу сілы і ўплыву краіны. Для рэалістаў і дэмарэалістаў – гэта перш за ўсё аб'яднанне прыхільных ЗША дзяржаў: Англіі, Італіі, «Новай Еўропы» і хаўруснікаў у трэцім свеце. Дык чым павінна быць супольнасць дэмакратый – крэпасцю, што бароніць бяспеку яе сяброў, ці інструментам пашырэння сябе самой у глабальным памеры? У любым разе, якая б формула альянсу дэмакратый не была выведзеная, ён, хутчэй за ўсё, будзе ўспрымацца вялікай колькасцю гульцоў на міжнароднай арэне як працяг амерыканскай альбо заходняй гегемоніі. Палітыку ж у адносінах да Расіі, Кітая альбо таго ж арабскага свету давядзецца вызначаць у атмасферы падазронасці і, у значнай ступені, варожасці. Тады ў заходняга свету застаецца небагата альтэрнатыў. Адна – згадзіцца на працяг усё меней адэкватнай сістэмы, заснаванай на ААН. Другая – прымірыцца з тым, што кансэнсус і кампраміс нельга расцягнуць па ўсім свеце. Ідылія глабальнай шматбаковасці можа быць пастаўлена пад сумнеў і яшчэ адным чыннікам, пра які, дарэчы, шмат гаворыць сам Бжазінскі. Падтрыманне альянсу дэмакратый вымагае ўліку адной важнай акалічнасці. Дыктатуры могуць будаваць свае альянсы на кансэнсусе ўладных эліт. Дэмакратыі, у доўгатэрміновай перспектыве, патрабуюць таксама кансэнсусу грамадстваў (наступствы тэрарыстычнай атакі ў Мадрыдзе 11 сакавіка 2004 г. і выхад Іспаніі з вайсковай кааліцыі ў Іраку яскрава гэта дэманструюць). Амерыка, натуральны лідэр альянсу дэмакратый, сутыкаецца з тым, што яе мультырасавы, мультыэтнічны склад мае важныя доўгатэрміновыя наступствы. У мінулым і ў сучасным неабходнасць заваявання галасоў меншасцяў рабіла і робіць важны ўплыў на амерыканскую замежную палітыку. Іспанская мова ўжо фактычна стала другой мовай ЗША, і палітычны ўплыў пераважна

мексіканскага насельніцтва вызначальны ў справе адносін унутры заходняга паўшар'я. Прасунутая габрэйская эліта такім жа чынам уплывае на палітыку што да Блізкага Усходу. Моцныя ўсходнееўрапейскія меншасці шмат вызначаюць у палітыцы пашырэння NATO і г. д. З іншага боку, шматлікае мусульманскае насельніцтва ў еўрапейскіх краінах шмат у чым вызначае і іх замежную палітыку, а значыць, і супярэчнасці з тымі ж Злучанымі Штатамі. Пры такім стане рэчаў замежная палітыка можа быць лёгка прыватызавана кааліцыяй найбольш галасістых і ўплывовых меншасцяў. Аднак, пазначым тут, прычына крызісу шматбаковасці ўжо не з'яўляецца цалкам віной ЗША. Напрыклад, падтрымка Францыяй Палестыны, часцяком незалежна ад таго, якім чынам сябе паводзіць яе кіраўніцтва і ці спрыяе яно ліквідацыі тэрарыстычных пагроз са свайго боку, пры пэўным жаданні можа быць вызначана настолькі ж амаральнай і аднабаковай, як і палітыка ЗША: за тым выключэннем, што палітычныя і вайсковыя рэсурсы Францыі нашмат меншыя.

Калі цяжкасць прыняцця рашэнняў у шматбаковым альянсе дэмакратычных дзяржаў не зводзіцца да аднаго памкнення ЗША да сусветнай гегемоніі любым коштам, спакуса аднабаковасці непераадольная. Урэшце, вайна ў Іраку магла сапраўды быць стратэгічнай памылкай (аўтар, дарэчы, прытрымліваецца гэтага пункту гледжання). Ініцыятыва дэмакратызаваць Блізкі Усход выглядае ў лепшым выпадку як фантазія, у горшым – як слаба прыкрытая спроба пашырэння гегемоніі, а не дэмакратыі. Аднак іншыя пагрозы могуць быць зусім рэальнымі. Адна з іх, напрыклад, – ядзерная праграма Ірана, з якім заходні свет можа не зладзіць менавіта праз уплыў антыамерыканізму, узбуджанага іракскай вайной. Нарэшце, Злучаныя Штаты могуць падтрымліваць шматбаковасць і прытрымлівацца гегемоніі і дэмакратычнага лідэрства ў адносінах са сваімі паплечнікамі. Аднак гэта азначае, што ЗША не будуць успрымацца як імперыя па-за трансатлантычным альянсам (альбо новай супольнасцю дэмакратый). Ваенныя аперацыі ў Косаве і Афганістане ўспрымаліся ў свеце перадусім як амерыканскія войны, дарма што і Нямеччына, і Францыя, і, у другім выпадку, Расія былі ў складзе кааліцыі. Праз гэта, аднак, прэстыж ЗША не ўзняўся ані ў той самай Расіі, ані ў ісламскім свеце. Вялікі сатана застаецца

вялікім сатаном незалежна ад таго, колькі ядуць круасанаў альбо выпіваюць бардо дзе-небудзь на Сярэднім Захадзе.
У любым разе, шматбаковасць як аснова сусветнай палітыкі выглядае ўсё меней і меней рэальнай альтэрнатывай. Лібералізм і шматбаковасць могуць застацца падмуркам адносін паміж заходнімі дэмакратыямі. У дачыненнях Захаду з буйнымі дзяржавамі Еўразіі гульня з балансаваннем сілаў (пабудова варункаў, пры якіх ані Кітай, ані Расія не стануць занадта дамінантнымі), хутчэй за ўсё, працягнецца. У дачыненнях жа з трэцім светам, асабліва з Блізкім Усходам, аднабаковасць дзеянняў можа стаць непазбежнай незалежна ад таго, ці будзе знаходзіцца ў Белым доме Буш-малодшы. Так ці інакш, замежная палітыка ЗША і надалей будзе вызначацца сумессю гегемоніі і лідэрства, рэалізму і вільсанізму акурат таму, што поўная гегемонія недасяжная, а рамантычны падыход сутыкаецца з больш сумным палатном зусім нерамантычнага свету.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

крытыка [image]2005

"да Зьместу"

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Дзьмітры Падбярэскі Кніга жыцьця і сьмерці

Нота судьбы. Владимир Мулявин. / Редактор-составитель Л. Крушинская. – Минск: Мастацкая літаратура, 2004.

ДЗЬМІТРЫ ПАДБЯРЭСКІ суаўтар першага ў Беларусі «Тлумачальнага слоўніка тэрміналёгіі папулярнай музыкі», сябра Саюзу пісьменьнікаў, аўтар раману «Саксафон Чынгісхана». Вядзе праграму «Па-за тактам» на беларускай службе радыё «Свабода».

Рэцэнзаваць, разьбіраць па старонках падобныя кнігі – задача вельмі няпростая і адказная. Можна нават сказаць, гэта ніяк не прасьцей, чым прыдумаць такую кнігу і ўвасобіць яе, давесьці да чытача. І рэч тут не ў асобе чалавека, якому прысьвечана гэтая кніга, не ў ступені даступнасьці матэрыялу, не ўва ўзроўні аўтараў. На першы плян выходзіць цалкам іншы чыньнік, але менавіта ён і вызначае ў выніку посьпех ці правал выданьня. А чыньнік гэты наўпрост залежыць ад вельмі істотнага фактару, а менавіта: ад таго, наколькі складальнікі кнігі здолеюць абысьці надзвычай прывабны шанец

міталягізаваць, прыўкрасіць, узьвялічыць чалавека, якому прысьвячаецца кніга, наколькі сутнасьць ягонай асобы здолее ўва ўспамінах блізкіх яму «ў тым жыцьці» людзей пазьбегнуць абранзавеньня. Наколькі, нарэшце, гаворка па сутнасьці справы здолее калі не пераўзысьці, дык хоць бы ўраўнаважыць дзяжурныя справаздачы тых, хто мае імя, але ня мае чаго сказаць. Інакш кажучы, посьпех такога выданьня цалкам залежыць ад абранага жанру, бо партрэт можа быць парадны, а можа быць пісаны няхай нават ад шчырага сэрца, але без разьліку на тое, што ён некалі зойме ганаровае месца ў пастаяннай экспазыцыі нейкага вельмі прэстыжнага музэю. Першае ўражаньне ад знаёмства з кнігай «Нота судьбы», прысьвечанай памяці знакамітага музыканта Ўладзімера Мулявіна, было такое: дзякаваць Богу, магло атрымацца і горш. Бо існавала цалкам рэальная небясьпека, улічваючы той афіцыёзны «звон», зь якім была абвешчана праграма ўшанаваньня памяці музыканта, што выданьне гэтае можа набыць выгляд стандартнай мэмарыяльнай дошкі, за якой ня будзе, па сутнасьці, амаль нічога, што магло б расказаць нешта новае пра чалавека рэальнага – з усімі ягонымі плюсамі і мінусамі, што мы атрымаем у выніку амаль кананічны вобраз асобы, якая ніколі не памылялася і заўсёды дакладна ведала, што трэба рабіць сёньня, заўтра, празь месяц, у наступнай пяцігодцы.

Уладзімер Мулявін ніколі такім ня быў. Ён наагул вельмі шмат патаемнага, зьвязанага найперш з творчасьцю, трымаў пры сабе і надзвычай неахвотна дзяліўся задумкамі зь іншымі, нават з даволі блізкімі яму людзьмі. Досыць уважліва прагледзець ягоныя інтэрвію, асабліва зь першых гадоў існаваньня ансамблю «Песьняры», каб заўважыць, што шмат дзе ён паўтараецца, а часам увогуле гаворыць адно й тое ж. Не таму, што яму не было чаго сказаць. Можа, баяўся сурочыць. Але хутчэй за ўсё, ён лічыў за лепшае казаць пра тое, што ўжо ёсьць, а вось развагі адносна «плянаў на будучыню» ён пакідаў іншым, больш гаваркім, і тым, хто за ўласныя словы не лічыў за патрэбнае адказваць.

Сама кніга складаецца з чатырох разьдзелаў: «Чалавек», «Мэнэстрэль. Музыка. Пясьняр», «Беларусь – Мулявін – сьвет» і «Легенда – вялікая праўда». Адкрываецца кніга словамі Аляксандра Лукашэнкі – афіцыйным тэкстам, які мог быць

адрасаваны ня толькі памерламу музыканту, але, бадай, памяці любога знакавага творцы. Дзякаваць Богу, тэкст гэты невялікі, але ён не адзіны з тых, што пазначаны настроем «дзяжурнасьці». На жаль, складальніца кнігі ці то не захацела, ці, хутчэй, проста ня здолела з цалкам зразумелых прычынаў абысьціся бяз тэкстаў ад людзей зь імем ці з пасадай, якім канкрэтна, па сутнасьці справы, сказаць амаль не было чаго. Цалкам дзяжурным тэкстам выглядае выступ мітрапаліта Менскага і Слуцкага, патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. Царква і папулярная музыка? Суседзтва з галіны фантастыкі. Але ж як безь яго?! Імкненьне прыцягнуць у лік аўтараў кнігі вядомых дзеячаў музычнага мастацтва ці знакамітасьцяў зь іншых галінаў не заўсёды было апраўдана. Як паказвае кніга, многія зь іх змаглі сказаць толькі пару агульных, расплывістых словаў. Гэта датычыць найперш артыкулаў Аляксандра Разэнбаўма, Мікалая Баскава. Непаразуменьнем варта лічыць «карацельку» ўдзельніка вядомай польскай групы «Czerwone Gitary» Ежы Скшыпчака, сэнс якой можна зьвесьці да аднаго: так, маўляў, чуў нешта такое, але што, дзе, калі?..

Дарэчы, многія з аўтараў разьдзелу «Чалавек» ледзьве не адкрыта прызнаюцца, што іх сустрэчы з Мулявіным насілі цалкам выпадковы, гастрольны характар. Мо з прычыны, што яны ведалі кіраўніка «Песьняроў» адно павярхоўна і, напэўна, аніколі сур'ёзна ня ўдумваліся ў тое, што прапанаваў ансамбаль аўдыторыі, іх словы прызнаньня і выглядаюць такімі дзяжурнымі і цалкам неабавязковымі.

Больш за тое: давайце па вялікім рахунку задумаемся. Хто такія, напрыклад, Мікалай Гнацюк ці Алег Газманаў, каб выказвацца на тэму Мулявіна? Маштабы, прабачце, несувымерныя. Гэтыя й падобныя да іх людзі, чые дасягненьні ў эстраднай творчасьці тлумачацца часам даволі далёкімі ад мастацтва рэчамі, на маю думку, лепш бы прамаўчалі, бо словы іхнія практычна нічога дадаць да вобразу Ўладзімера Мулявіна не маглі.

А часам сярод гэтых прызнаньняў можна сустрэць і сапраўдныя «пэрліны». З павагай стаўлюся да той ролі, якую адыграў музыкант з Украіны Ян Табачнік у разьвіцьці жанру. Але ягоныя словы «Благодаря Мулявину мир познал душу белорусского народа» – гэта ўсё з той жа опэры на тэму

ўзьнясеньня да нябёсаў таго, хто аб гэтым ніколі і нікога не прасіў. Такое мог бы сказаць іншы ўкраінец – Юры Рыбчынскі, – паэтычна абыграўшы надзвычай сьмелую сэнтэнцыю. Але Рыбчынскаму месца ў кнізе не знайшлося... Затое іншы паэт – Міхаіл Шэлехаў – даў сабе разгарнуцца аж да таго, што месцамі чытаць ягоны тэкст было неяк няёмка. Тут столькі «выспренности», столькі проста чужой як паэзіі, так і мулявінскай прозе патэтыкі, што замест цудоўных (збольшага) здымкаў, якія прыкметна ўзбагачаюць кнігу, міжволі бачыш перад сабой ператвораны ў сьвятыню абраз.

Куды больш зьмястоўны і больш чалавечны па духу разьдзел «Мэнэстрэль. Музыкант. Пясьняр» (хоць пры чым тут мэнэстрэль?). Яго аўтары – людзі, якія непасрэдна супрацоўнічалі з Уладзімерам Мулявіным у розныя пэрыяды ягонага жыцьця. Ім сапраўды ёсьць што сказаць. Валянцін Тарас, Валянціна Гаявая, Людміла Ісупава, Алег Моўчан, Рафік Рагімаў, Валянцін Бадзьяраў, Уладзімер Ткачэнка, Валянціна Бартлава і Галіна Крываблоцкая ды іншыя, хто дапамагаў «Песьнярам» у творчай кар'еры. Іх успаміны прыносяць шмат каштоўных і малавядомых дэталяў, па-свойму раскрываючы «кухню» ансамблю і ягонага лідэра. Цалкам слушна ў гэты разьдзел уключаны фрагмэнты раней надрукаваных у пэрыёдыцы ўспамінаў былога «песьняра» Ўладзімера Нікалаева, а таксама вытрымкі з асабістых дзёньнікаў піяніста «Песьняроў» Ігара Паліводы.

Вось на іх варта спыніцца асобна. Рэч у тым, што зьмест гэтых напісаных шчыра, рэзка і па-майстэрску дзёньнікаў трапіў у Сеціва. У тэкстах дзёньніка многія, у тым ліку й «Песьняры», паказаны (канечне – з уласных пазыцыяў!) часам у ня надта прыгожых дэкарацыях. Для кнігі фрагмэнты дзёньнікаў былі абраны збольшага альбо станоўчага характару, альбо зь мінімальнай дозай едкай Паліводавай іроніі. І, канечне ж, далёка ня ўсё з напісанага. Ня трапілі ў кнігу наступныя, напрыклад, фрагмэнты:

Был стройный хор. Но время враг:
Осталось в хоре двое.
Но реет, вьется гордый флаг –
Плевать на остальное!

И вот четыре тыщи ватт

Врубают больше мочи для
И эти двое так вопят,
Что нету больше мочи, б…,
Что нету больше мочи, б…!

Это и есть
сегодняшние
«Песняры».
Куда же все
девалось?
Ответ
прост: «Рыба
гниет с
головы».
Провинциальное
бескультурье,
безграмотность
не смогли
справиться с
большой
популярностью.
Все утонуло
в самом
себе, увязло
в
собственном
болоте.
Могучая
мания
величия
сожрала
разум и
теперь
принялась за
рассудок.
Культуру
заменяет
хитрость,
граничащая с
подлостью,
и ум,

который,
кстати, все
реже
утруждает
себя работой
во благо и
потому все
чаще
подводит…

Ко мне лично «Рыбья Голова» отнюдь не пылает любовью. Но пока бережет, как собственные жабры. Второго отделения в концерте сейчас практически нет, но стремится сделать его сильнее первого Голове невыгодно: невыразительный сброд дается контрастом к программе по Янке Купале – солидной композиции великого усталого классика, мыслящего в унисон с классиком белорусской литературы о судьбах мира… (16.06.1983)

«Песняры» – маленькая действующая модель всего нашего общества Развитого Социализма. Налицо вся гамма признаков: и болезненная страсть к лычкам, плакатам, юбилеям и медалям, и всеобщее пьянство, и тотальное безделье, и циничное подгребание под себя верхушкой общих ценностей (материальных благ – при полном отсутствии моральных), и непомерно раздутый административный аппарат, и откровенное хамство с враньем, возведенные в норму, – и прочее, прочее. Перестройка? Только два пути: дергаться или самоликвидироваться. Tertium non datur. (23.04.1989)

Зразумела, што падобныя тэксты ня надта пасуюць да выданьня, накіраванага, усё ж, хочам мы таго ці не, на ўмацаваньне легенды. Але, думаецца, калі і ўключаць у кнігу выказваньні з асабістых дзёньнікаў, якія датычаць «Песьняроў», дык варта было рабіць гэта цалкам, без купюраў і выразаньня з думкай пра тое, што казаць няёмка, а што – ёмка.

І не адзін Ігар Палівода быў варты атрымаць магчымасьць для выступу. Складаньне кнігі адбывалася ў тыя часы, калі ансамбаль «Белорусские Песняры», складзены з музыкантаў, якія пайшлі ад Мулявіна ў 1999 годзе, быў яшчэ ў нямілаьці ў беларускіх уладаў. Трэба думаць, менавіта з гэтай прычыны ў кнізе не знайшлося месца для Ўладзіслава Місевіча, які

пачынаў «Песняроў» разам з Мулявіным, а таксама Валер'я Дайнэкі, Ігара Пені, Алега Аверына, якім ёсьць што сказаць. Гусі не хацелася дражніць? Цалкам верагодна. Але калі зважаць толькі на гусі, дык улетку й да рэчкі купацца ня пройдзеш. Ці, скажам, Барыс Бернштэйн, які мне даслаў колькі частак уласных успамінаў, напісаных з гумарам, бездакорным літаратурным стылем. Ён, як можна зразумець, не лічыў аддадзеныя «Песьнярам» гады найлепшым пэрыядам уласнай творчасьці, але ягоныя нататкі маюць надзвычай пазнавальны характар і, зноў жа, паказваюць «кухню» калектыву зь нечаканага ракурсу.

Могуць спытацца: а чаму ў гэтай кнізе няма артыкула аднаго з вэтэранаў ансамблю Леаніда Барткевіча? Прычына больш чым празаічная. Леанід Барткевіч быў запрошаны ў аўтарскі калектыў, які вызначаў канцэпцыю і зьмест кнігі, але... Падпісаны ягоным імем опус пад назвай «Вольга і «Песьняры» ўбачыў сьвет раней за «Ноту судьбы». Дастаткова ўважліва прачытаць успаміны вядучага некалі саліста ансамблю, каб упэўніцца, што ў іх паўтараецца сёе-тое з таго, што было раней напісана і выдадзена тым жа Ўладзімерам Мікалаевым, памерлым ужо песьняром Валер'ем Яшкіным, маскоўскім журналістам Анатолем Вейцэнфельдам і нават калегам па творчай групе Барысом Крэпакам. Пасьля таго, як, па сутнасьці, грандыёзны плягіят раскрыўся, ад паслуг Барткевіча творчы калектыў адмовіўся...

Трэці разьдзел кнігі я часткова ўжо закрануў. Тут найбольшую каштоўнасьць маюць успаміны Леаніда Бароўскага, які наведаў разам зь «Песьнярамі» Злучаныя Штаты падчас першай выправы калектыву за акіян, ды словы ўдзельнікаў грузінскага ансамблю «Орэра», зь якімі, у адрозьненьне ад многіх іншых артыстаў эстрады, Мулявіна і «Песьняроў» зьвязвала шчырае сяброўства. А больш пра гэты разьдзел і сказаць амаль няма чаго.

Нарэшце, чацьвёртая частка кнігі называецца «Легенда – вялікая праўда». Назва, як мне падаецца, не зусім удалая, бо зьмест гэтага разьдзелу, ня надта вялікага, затое багатага паводле матэрыялу, складаюць артыкулы ў асноўным дасьледчага характару. Гэта перадрук напісанага яшчэ ў 1978 г. грунтоўнага артыкула Валер'я Яшкіна «Песьняры», досьлед галоўнага рэдактара расейскага месячніка «Звукорежиссер»

Анатоля Вейцэнфельда «Песьняры»: спроба спасьціжэньня фэномэну», артыкул Валянціны Антаневіч «З «геннай памяці» народу», у якім яна аналізуе – прычым ці не ўпершыню ў беларускім музыказнаўстве! – узаемадачыненьні «Песьняроў» і песеннага фальклёру. Расчароўвае артыкул Альбіны Скарабагатчанкі «Нам засталася спадчына», у якім акцэнт зроблены не на аналіз, а чамусьці на падрабязны пералік зробленага У.Мулявіным і «Песьнярамі». А хацелася б усё ж аналізу, тым больш, што пры жыцьці дзелавога, прафэсійнага аналізу ўласнай творчасьці У.Мулявіну чуць амаль не даводзілася. Прынамсі, на радзіме...

Надзвычай каштоўным уяўляецца мне заключны фрагмэнт кнігі, у якім Барыс Крэпак сабраў у адно падрабязнае апісаньне ледзь ня кожнага году жыцьця і творчасьці Ўладзімера Мулявіна. У сусьветнай літаратуры гэта ня ёсьць нечым незвычайным: дастаткова прыгадаць кнігу, у якой усе крокі ўдзельнікаў ансамблю «Beatles» расьпісаны ледзь не па днях. Але ў Беларусі такога не было. Спадар Крэпак зрабіў вельмі важную рэч, сабраўшы ў адно інфармацыю з самых розных крыніцаў, часам – інфармацыю цалкам новую і нечаканую. Напрыклад, «Беларуская энцыкляпэдыя» сьцьвярджала, што Ўладзімер Мулявін мае сярэднюю спэцыяльную адукацыю. Ажно не! Як вынікае з падрыхтаванага Б.Крэпакам тэксту, будучая зорка савецкай і беларускай эстрады была адлічана з 2 курсу музычнай вучэльні ў Сьвярдлоўску зь вельмі папулярнай тады прычыны – «нізкапаклонства перад заходняй музыкай». Цяжка ўявіць, што было б і з самім Мулявіным, і зь «Песьнярамі», калі б ня тое «нізкапаклонства»...

«Нота судьбы» стала першым зь ліку айчынных мэмарыяльных выданьняў у гонар славутых сучасьнікаў. І калі ўлічыць ідэалягічныя абставіны, што суправаджалі яе падрыхтоўку, дык яна атрымалася неблагой. Прынамсі, яна дазваляе чытачу самому зрабіць высновы адносна таго, хто на яе старонках выказаўся шчыра, а хто проста зрабіў справаздачу. Нота ад гэтага ня надта пацярпела, але тое, што яна магла быць больш чыстая і выразная, – бясспрэчна.

Кніга «Нота судьбы», як сказаў мне дырэктар «Мастацкай літаратуры» Ўладзіслаў Мачульскі, распачала своеасаблівую сэрыю выданьняў «Жыцьцё знакамітасьцяў», бо ўсьлед за кнігай, прысьвечанай Уладзімеру Мулявіну, была выдадзена на

гэтым жа годным друкарскім узроўні кніга, прысьвечаная Міхаілу Пташуку. І шкада будзе, калі трэцяй ці чацьвёртай выйдзе кніга, прысьвечаная якому з палітыкаў. Мо лепш Быкаў, Караткевіч, Адамовіч?

[image]

[image]

№ 1 (35) - 2005

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

крытыка [image]2005

"да Зьместу"

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ПЁТРА РУДКОЎСКІ ОП

Пётра Рудкоўскі Панская Польшча і бяспанская Беларусь

каталіцкі філёзаф. Стала друкуецца ў «ARCHE»

Кнігі, разгледжаныя ў артыкуле:

Problemy świadomości narodowej ludności polskiej na Białorusi. Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы первой Международной научной конференции. – Гродно: Общественное объединение «Союз поляков на Беларуси», 2003.
Problemy świadomości narodowej ludności polskiej na Białorusi. Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы второй Международной научной конференции. – Гродно: Общественное объединение «Союз поляков на Беларуси», 2004.
Tematy polsko-białoruskie. Historia, literatura, edukacja. – Olsztyn: Borussia, 2003.
Польшча для беларусаў нешта большае, чым сусед. У гістарычным і культурным плане Беларусь і Польшча – гэта сіямскія блізняты. І ўсё ж паміж польскім і беларускім масівам

існуе пэўная асіметрыя: і за Рэчы Паспалітай, і падчас вызвольнага руху ў XIX ст. польская стыхія значна пераважала над беларускай, а ўплыў польскай культуры на беларускую быў (і ёсць) большы, чымся ўплыў беларускай на польскую. Палякі могуць стварыць гістарычную нарацыю, у якой Беларусь нават не будзе згадвацца, тым часам як беларусам было б надта цяжка, нават немагчыма расказаць сваю гісторыю без згадвання Польшчы. Гістарычныя нарацыі нярэдка абвастраюць праблему тоеснасці: у некаторых польскіх тэкстах Беларусь выглядае як крайне несамастойная істота, як эмбрыён ва ўлонні Маткі-Польшчы, культурна (і нават матэрыяльна) залежны ад яе. Беларусы ж спрабуюць «адудзячыць» тым, што, напрыклад, прыватызуюць найвялікшых польскіх герояў – Тадэвуша Касцюшку, Адама Міцкевіча і інш. І адны, і другія нярэдка робяцца ахвярамі ўласных комплексаў: беларусы – комплексу непаўнавартасці, а палякі – комплексу «звышвартасці». Падчас абмеркавання праблемы дзвюх тоеснасцяў – польскай і беларускай – неаднойчы давядзецца выявіць тыя ці іншыя комплексы. А комплексы – як кажа Карл Г. Юнг – гэта агромністая крыніца энергіі, якая марнуецца да тых часоў, пакуль яны не будуць пераасэнсаваныя. Таму ў гэтым артыкуле будуць прадстаўлены і спробы вызвалення «беларуска-польскай энергіі», г. зн. пераасэнсавання і пераадолення ўсякіх комплексаў.

ЧАСТКА ПЕРШАЯ
ПАЛОНІЯ Ў БЕЛАРУСКІМ ПАЛОНЕ

Спачатку
агледзім і
абмяркуем
рэфераты,
прысвечаныя
«праблемам
нацыянальнай
свядомасці»
палякаў на
Беларусі.
Яны былі
прачытаны

падчас
дзвюх
міжнародных
навуковых
канферэнцый,
першая з
якіх
адбылася ў
лістападзе
2001 г., а
другая – у
лістападзе
2003-га ў
Горадні.
Канферэнцыі
былі
«міжнароднымі»,
а дакладней
–
«двухнароднымі»:
сярод
рэферэнтаў
былі толькі
грамадзяне
Польшчы і
Беларусі. Да
таго ж гэтыя
канферэнцыі
былі даволі
«аднароднымі»,
бо панавала
пэўная
артадоксія ў
інтэрпрэтацыі
гістарычных
з’яваў і ў
дыягностыцы
сучаснасці.
Мовай
канферэнцый

была ў асноўным польская, але 12 рэфератаў было прачытана па-беларуску, а 5 – па-расейску. Рэфераты былі апублікаваныя ў дзвюх кнігах, якія выйшлі ў 2003 і 2004 гг. накладам у 2000 асобнікаў пад рэдакцыяй Эўгеніуша Скрабоцкага пры падтрымцы Сенату Польшчы і фонду «Pomoc Polakom na Wschodzie».

Кнігі – асабліва першая – дрэнна падрыхтаваныя, карэктар не падбаў як след. Многія польскамоўныя тэксты з'явіліся «ў цэлай красе», з мноствам стылістычных ды пунктуацыйных памылак, што аж прыкра робіцца за польскую мову – настолькі яна там пакалечаная. У звязку з гэтым кніга цяжка чытаецца, а перш чым той ці іншы тэкст прааналізаваць, трэба нямала

намучыцца, каб зразумець, што аўтар хоча сказаць. Вучоныя шукальнікі польскай свядомасці, у тым ліку старшыня Саюза палякаў Беларусі доктар Тадэвуш Кручкоўскі, чамусьці самі не падбалі пра сваю моўную свядомасць.

Паколькі было б перагібам разглядаць кожны рэферат кожнага аўтара паасобна (іх на дзвюх канферэнцыях было ажно 50), прымем прынцып тэматычнага разгляду. Засяродзімся перш за ўсё на цэнтральнай, тытульнай праблеме: польская тоеснасць у беларускім грамадскім кантэксце. Шэраг іншых тэмаў, якія не датычаць непасрэдна тытульнай праблематыкі, згадаем адно толькі павярхоўна.

У ПОШУКАХ СХАВАНЫХ ПАЛЯКАЎ

Ешчэ Польска не згінэла
Пукі мы жыемы,
Ешчэ вудка не скваснэла
Пукі мы піемы.

Застольная песня палякаў Воранаўшчыны

Бадай, найчасцейшымі зваротамі, якія з'яўляюцца ў рэфератах, ёсць: «згуба польскай саматоеснасці», «(метадычнае) знішчэнне польскасці», «дэпаланізацыя». Тое, што праблематыка сканцэнтравана вакол «згубы» саматоеснасці, досыць зразумела, бо ніхто не будзе аспрэчваць таго, што, пачынаючы ад падзелу Рэчы Паспалітай, палякі былі больш або менш дыскрымінаваныя спачатку расейскімі, а потым савецкімі ўладамі, якія панавалі на Беларусі. Таксама і сёння, у меру ўзмацнення аўтарытарызму, раз-пораз парушаюцца правы нацыянальных меншасцяў у нашай краіне, у тым ліку палякаў. Канстатацыя «згубы» спалучаецца з пастулатам «аднавіць», «адбудаваць» страчаную саматоеснасць, вярнуць да сваіх каранёў тых, хто з тых ці іншых прычын ад іх адышоў. Сітуацыя характарызуецца пэўнай парадаксальнасцю і драматызмам: як шукаць палякаў на Беларусі, калі паняцце польскасці паглынута «ненацыянальнай» семантыкай: яно звязваецца і з каталіцызмам, і са шляхецкасцю, і з тэрыторыяй – г. зн. аспектамі, якія звычайна з'яўляюцца другараднымі ці трэцярадным ў нацыянальнай самаідэнтыфікацыі.

Самаакрэсленне многіх палякаў Беларусі вельмі часта мае ірацыянальны характар: адны ў адказ на пытанне «Хто вы паводле нацыянальнасці?» уваходзяць у стан амаль містычнай экзальтацыі: «*Jestem Polak, i nikt mi nie zabierze mej polskości, nawet jeśli będą wrzucać do ognia, nawet jeśli będą katować – zawsze jestem Polak!*», а іншыя ў той час адказваюць зусім не патэтычна: «А хто мы такія, дык Бог яго знае». Вучоныя рэферэнты і адных, і другіх залічваюць да палякаў. Паўстае пытанне, якімі крытэрамі яны кіруюцца і як гэта абгрунтоўваюць.

Мікола Бяспамятных (Гарадзенскі універсітэт) прыйшоў да высновы, што трэба выкарыстоўваць дзве катэгорыі для вытлумачэння феномена «знікнення» палякаў: *інверсія ідэнтыфікацыі* і *латэнсіфікацыя ідэнтыфікацыі*. Першая азначае працэс, які вядзе альбо да поўнай асіміляцыі, альбо да «латэнсіфікацыі ідэнтыфікацыі». А гэтую латэнсіфікацыю Бяспамятных характарызуе не зусім ясна: «схаваныя слаі этнічна-культурнага памежжа». Як тут разумець «слаі памежжа»? Ну, у любым разе, гаворка пра тое, што сярод нас ёсць сціжма палякаў, польскасць якіх пакуль што «схаваная». Спадар Мікола досыць паспяхова стасуе гэтую катэгорыю і для вытлумачэння статыстычных няроўнасцяў у дыяхранічнай плоскасці: калі палякаў у пэўны момант гісторыі рабілася менш, гэта азначала, што яны ўваходзілі ў стан «латэнцыі», а калі іх рабілася больш, гэта значыць, што яны выходзілі з гэтага стану. Але заўсёды быў і ёсць сталы *квантум* польскай стыхіі.

Гэтую «тэорыю латэнцыі» Бяспамятных прадставіў на канферэнцыі-2001. У 2003 г. ён выступіў з тэорыяй «эксплікаваных праяваў культурных межаў» і «схаваных праяў». Інтрыгуе тут спосаб стасавання назваўтваральных функтараў: «эксплікаваная праява» – гэта ж не што іншае, як «праява, якая праявілася», а «схаваная праява» – гэта «праява, якая не праявілася». І якая тут абазначальная функцыя згаданых катэгорый – хто яго ведае?!

Дарма што тэкст (польскамоўны) Бяспамятных напісаны надзвычай непісьменна (ці не ў кожным сказе ёсць памылкі) і часам няясны ў плане логікі, варта звярнуць увагу на некаторыя вартасныя зацемы. Аўтар трапна заўважыў, што ўсведамленне палякамі Гарадзеншчыны быцця «меншасцю» ў сённяшняй Беларусі ўваходзіць у пэўны канфлікт з памяццю аб

другой Рэчы Паспалітай, калі палякі былі большасцю, а беларусы – меншасцю. Іншая заўвага, вартая падкрэслення, што «*сімволіка* sacrum *дамінуе над* profanum. (...) *Гэта датычыць перш за ўсё польскай культуры, у якой адбылося аб'яднанне сакральных і этнічных элементаў у моўнай сферы (польская мова – гэта перадусім мова Касцёла), сямейных традыцый і культурнай ідэнтыфікацыі зусім* (нелагічнае тут «зусім» – літаральны пераклад наяўнага ў польскамоўным варыянце нелагічнага «wcale». – **Аўт.**)».

Абодва зацемы паходзяць з рэферату на канферэнцыі-2003. Тут варта вярнуцца да рэферату Бяспамятных на канферэнцыі-2001, дзе ён таксама згадвае пра сакральнае вымярэнне польскасці і інтэрпрэтуе яго гэткім чынам: «*Незалежна, на якой мове гаворыць паляк, незалежна, у якой ступені ён паддаўся акультурацыі, да Бога заўжды ён будзе звяртацца па-польску*».

Феномен сакралізацыі мовы сведчыць, хутчэй за ўсё, пра прэмадэрнісцкі, данацыянальны ўзровень самасвядомасці «палякаў», але Бяспамятных дашукваецца тут чагосьці іншага: «*Можа, тут схавана разгадка «таямніцы» адзінства нацыянальнага і канфесійнага фактараў?..*»

Сказана – зроблена. «Разгадка таямніцы», якую засугераваў доктар Бяспамятных, сталася метадалагічнай догмай для многіх рэферэнтаў на абедзвюх канферэнцыях. І ксёндз прафесар Роман Дзванкоўскі, і старшыня Саюза палякаў Беларусі доктар Тадэвуш Кручкоўскі, і псіхолагі з Любліна спадарства Юлія і Алег Гарбанюкі верна спавядаюць і зацята бароняць гэтую догму. На іх поглядах спынімся адмыслова крыху пазней, цяпер жа прысвецім трохі ўвагі рэферату Гэлены Гебень (Ліда–Вроцлаў), якая на канферэнцыі-2003 прэзентавала вынікі даследавання моўнай свядомасці палякаў у Лідскім раёне.

НАС
АБ'ЯДНАЛА
ПОЛЬСКАЯ
ВЕРА...

– Пан поляк?
– Ага, католік.

Гэлена Гебень пачынае з таго, што прыводзіць афіцыйныя

звесткі: у Беларусі – 395 712 палякаў, з іх толькі 16,5 % прызналі польскую мову сваёй роднай, і ўсяго 4,7 % гавораць на гэтай мове дома. Далей пачынаецца рытуальная працэдура аспрэчвання афіцыйных звестак і выяўлення ісціны: палякаў намнога больш, чым гэта пададзена ўладамі. Шкада, што гэтая «ісціна» надта неакрэсленая: некаторыя з рэферэнтаў кажуць пра адзін мільён, некаторыя пра паўтара, часам пра два, зрэдку пра тры. Канстатацыя колькасці палякаў звычайна суправаджаецца засцярогай, што «*апрача гэтага, трэба ўзяць пад увагу мноства палякаў, якія цягам гісторыі былі гвалтам аправаслаўленыя, абеларушаныя або зрусіфікаваныя*» (цытата перыфразаваная), і гэта яшчэ больш павялічвае неакрэсленасць. Паводле спадарыні Гебень, на заходніх землях Беларусі амаль усе (90–100 %) каталіцкія вернікі ёсць палякамі. А вось эмпірычная база дадзенага сцвярджэння:

…у адказ на пытанне: «Якой вы нацыянальнасці?» можна неадноўчы пачуць: «Я – каталік (-ічка)», гэтаксама, адказваючы на пытанне: «З якой сям'і вы паходзіце?», у першую чаргу людзі называлі веравызнанне, потым нацыянальнасць (аднак здаралася, што вернікі ўвогуле не згадвалі пра нацыянальнасць, аперавалі выключна паняткам прыналежнасці да каталіцкае веры): «Наша сям'я ўся каталіцкая. Мы – каталікі, палякі. У якой веры нарадзіліся, у такой і памром. От так» (з апытанняў, ладжаных у Бяліцы).

Рэферэнты вельмі часта прыводзяць такія выказванні і пагаджаюцца з тым, што атаясамленне «паляк–каталік» ёсць стэрэатыпам і бярэцца з нізкай культурнай свядомасці і недаадукаванасці. Дый аспрэчваць гэта не было б сэнсу, бо яно пацвярджаецца эмпірычнымі даследаваннямі. З доследаў, якія прадставілі Юлія і Алег Гарбанюкі, яскрава відаць, што колькасць палякаў сярод каталікоў адваротна прапарцыянальная да ступені адукацыі: сярод апытаных каталікоў з вышэйшай адукацыяй толькі 44 % назвалі сябе палякамі, сярод каталікоў з сярэдняй адукацыяй – 56 %, з базавай – 60 %, з пачатковай – 86 %. Паводле тых самых даследаванняў, палякамі лічаць сябе пераважна каталікі старэйшага веку – ад 50 гадоў і вышэй. Сярод каталікоў ад 18 да 50 гадоў менш за 50 % лічаць сябе палякамі. Як кажа сама Гэлена Гебень, польскасць у асноўным абапіраецца на «instytucji polskiej babci».

Як высвятляецца, не толькі каталікі-пенсіянеры вызначаюцца ірацыянальнасцю. Многія палякі-навукоўцы, якія выступілі падчас гэтых дзвюх канферэнцый, таксама прэзентуюць ірацыяналізм у сваім падыходзе да інтэрпрэтацыі фактаў і ў фармуляванні канкрэтных прапаноў. Яны не здольныя асэнсаваць метадалагічныя складанасці, звязаныя з ідэнтыфікацыяй нацыянальнасці. Час ад часу, праўда, некаторыя любяць «сыпануць» паўтузінам дэфініцый ды спаслацца на вядомыя прозвішчы класікаў, такіх як Гельнэр, Сміт ці Калакоўскі, толькі ў гэтым сваім цытаванні яны паводзяць сябе хутчэй як калекцыянеры: маўляў, вось, гляньце, колькі я назбіраў дэфініцый народа/нацыі, толькі не стае сілы, каб іх асэнсаваць і зрабіць адпаведныя высновы. На практыцы тыя ж рэферэнты – самі таго не ўсведамляючы – абапіраюцца на аб'ектывісцкую канцэпцыю нацыі/народа (у дадзеным артыкуле я не бачу патрэбы адрозніваць гэтыя два паняткі і буду карыстацца імі як сінонімамі). Праблемнасць гэтага падыходу разгледзім пазней, цяпер жа абмяжуемся заўвагай, што бяда тут не столькі ў тым, што рэферэнты вызнаюць «аб'ектывізм» народа, колькі ў тым, што гэты аб'ектывізм не папярэджаны адпаведнай рэфлексіяй і не мае тэарэтычнай акрэсленасці. Адсюль бярэцца непаслядоўнасць навукоўцаў: раз-пораз яны незаўважна пераходзяць ад аб'ектывізму да суб'ектывізму, як трэба, то кажуць, што нацыянальнасць – гэта «справа самавызначэння», а як даходзяць да каталікоў, якія сябе лічаць беларусамі, то кажуць, што гэта вынік саветызацыі альбо «бээнэфізацыі», маўляў, аб'ектыўна яны – палякі. Рэферэнты зацята змагаюцца з «функцыяналісцкай» тэорыяй народа, якую час ад часу прасоўваюць беларускія публіцысты («усе грамадзяне Беларусі – беларусы»), але не заўважаюць, што гэта папросту адна з версій аб'ектывізму, які яны самі вызнаюць. Не заўважаюць таксама, што ў іхніх тэкстах з'яўляецца і змадыфікаваны функцыяналізм, які можа быць выражаны ў гэткай формуле: «усе вернікі Каталіцкага касцёла на Беларусі – палякі-аўтахтоны» (нязначная папраўка адносна квантыфікатара «ўсе», якую часам рэферэнты робяць, гэтага не змяняе, згаданая формула ёсць прыкладам функцыяналізму). Кручкоўскі, Гебень, Гарбанюкі, ксёндз Дзванкоўскі і інш. аднагалосна настойваюць на неабходнасці мабілізацыі Каталіцкага касцёла для абароны польскасці, «каб, прынамсі, –

кажуць Гарбанюкі, – запаволіць працэс дэпаланізацыі». І трэба прызнаць, кансэнсус сярод гарадзенскага духавенства наконт місіі абароны польскасці надзвычай трывалы, а ўсякія спробы ўвесці беларускую мову ў касцёлы сустракаюцца з энергічным вета бескампрамісных змагароў за *status quo*. Прывядзём выказванне аднаго ксяндза, якога цытуе спадарыня Гебень, не падаючы яго прозвішча (зноў жа заганная стылістыка будзе адлюстраваннем заганнасці ў арыгінальным выказванні):
Няма якіх-кольвечы дакументаў ці дэкрэтаў на тэму, каб там мову ўводзіць, тое, што ўведзена мова, то толькі з прычыны якогасьці святара, напрыклад, у Лідзе ксёндз Ігар Л., сын Станіслава, ну, бацька цяжка сказаць, што беларус, але от, перайшоў хутка на мову беларускую, пачаў тут людзей падбухторваць і пісаць подпісы, і перайшлі, зрабілі адна імша, ну і што далей? (…) Чаму гэта так гэтыя БНФ неяк прыціх, бо не бачаць магчымасці рабіць кар'еру, а лічылі, што людзі пачне гэта навяртаць.
«*Мне часта крыкуны мільгаюць у вачах / Да славы прагныя, ды вузкія ў плячах*», – як пісаў у адной байцы Кандрат Крапіва. Так і тут – не навучыўся чалавек ані гаварыць па-польску, ані правільна сказы будаваць, а ўвесь свет бярэцца павучаць ды бэсціць тых, хто адважыўся па-беларуску імшу адпраўляць. Выказванне гэтага лідскага ксяндза няблага сімвалізуе і этыку, якой кіруецца значная частка духавенства пры ахове польскасці, і ступень адукаванасці гэтых святароў, і меру агрэсіі да «ворагаў польскасці». Сімптаматычна, што найбольшую пагрозу для польскасці яны бачаць не з боку аўтарытарнай палітыкі Лукашэнкі, а з боку культурна-адраджэнскіх плыняў у Беларусі: увесь беларускі адраджэнскі рух падцягнены імі пад катэгорыю «БНФ», а сам БНФ безупынна дэманізуецца. Гэткая рэакцыя бярэцца з усведамлення сваёй няздольнасці да дыялогу з сучаснымі культурнымі плынямі. Польскія нацыяналісты ў Беларусі баяцца не толькі беларускай культуры, яшчэ большы страх у іх выклікаюць сучасныя плыні ў польскай культуры: лібералізм і плюралізм для іх – гэта нешта горшае, чым камунізм, а Еўразвяз – гэта спараджэнне д'ябла.
Сярод рэферэнтаў быў адзін ксёндз, пра якога ўжо была гаворка – Роман Дзванкоўскі (з Люблінскага каталіцкага універсітэта), адзіны рэферэнт з тытулам прафесара. На

канферэнцыю-2001 ён не змог прыехаць асабіста, але даслаў свой рэферат. Гэты рэферат і будзе нас цікавіць, бо ён прысвечаны ролі і функцыі Каталіцкага касцёла на «ўсходніх землях», якая разглядаецца ў этычнай і тэалагічнай перспектыве.

ПОЛЬСКІ КАСЦЁЛ І КАСЦЁЛ ПАЛЯКАЎ

Беларускага ў касцёле не хачу, зусім не хачу.
Не хадзіла бы да касцёла, памадліла бы ся ў хаце.
Ой, у нас людзі бы запратэставалі!
Па-беларуску якась дзіка, хаця яно і тое самае здаецца...

Выказванне адной рэспандэнткі з Парэчча

Свой дыскурс Дзванкоўскі таксама распачынае спробай высветліць «праўдзівую» колькасць палякаў у Беларусі: «*У гэтай сітуацыі можна з пэўнымі засцярогамі прыняць гэтак званы канфесійны крытэр*». Святар не ўдакладняе, у чым палягаюць гэтыя «пэўныя засцярогі» і застаецца няясным, які адсотак трэба адняць, каб атрымаць «чысты» канфесійны крытэр без засцярог.

Такім чынам, надзейнай «эмпірычнай базай» для Дзванкоўскага ёсць «канфесійны крытэр». Паколькі каталікоў у Беларусі, паводле розных ацэнак, на якія прафесар спасылаецца, ад 1240 тысяч да 2 мільёнаў, то і лічба палякаў у Беларусі будзе прыкладна такая ж. (З кантэксту трэба меркаваць, што «пэўныя засцярогі», якія ксёндз пакінуў недаакрэсленымі, не тояць у сабе вялікай колькасці выключэнняў з гэтай імплікацыі: каталік – паляк.) Усталяванне гэтай новай «базы» суправаджаецца дадатковым тэзісам: палякі ў Беларусі з'яўляюцца аўтахтонамі. Пасля гэтых канстатацый святар пачынае разважаць пра ролю Каталіцкага касцёла. Ён прызнае, што Касцёл універсальны і таму павінен абмежавацца толькі душпастырскай функцыяй, абвяшчаць Дабравесце, а не займацца нацыянальнымі справамі. На першы погляд, пастулат шляхетны і добры, але праблема ў

тым, што ён крайне непрактычны. Сам Дзванкоўскі ўскосна сцвярджае гэтую непрактычнасць, рытарычна пытаючы: «*Ці пад шыльдай універсалізму не праводзіцца беларусізацыя альбо – на Украіне – украінізацыя Касцёла?*» Ці пад шыльдай універсалізму – таксама рытарычна спытайма ў ксяндза Дзванкоўскага – не кансервуецца прэмадэрнісцкі светапогляд і ці не блакуецца трансфармацыя свядомасці многіх тысяч каталікоў?

Нядаўна моладзь адной каталіцкай парафіі на Гарадзеншчыне расказала мне пра такі інцыдэнт. Была падрыхтоўка да пілігрымкі ў Тракелі (мясцовы санктуарый, аналаг Будслава). Калі моладзь прапанавала заспяваць беларускую рэлігійную песню падчас уваходу ў Тракелі, рэакцыя ксяндза (не буду называць прозвішча) была трагікамічнай: «*У яго пачалі нервова хадзіць пашчэнкі*, – расказваюць відавочцы, – *а нас ён пачаў называць «дэбіламі»*.

Ці ксёндз прафесар Дзванкоўскі, які – як запэўнівае рэдактар кнігі – «шмат вандраваў па каталіцкіх парафіях Беларусі і з уласнага досведу добра ведае сітуацыю», спаткаўся з такімі з'явамі? Ці Дзванкоўскі не ведае пра атмасферу пагарды і дыскрымінацыі ў стасунку да ўсяго беларускага, якая пануе сярод гарадзенскага духавенства? Ці дасведчаны прафесар ніколі не чуў, як польскія ксяндзы з асалодай цытуюць шчырае прызнанне адной бабулі: «Па-беларуску то можна гаварыць у хляве, у свінарніку, але ў касцёле – ніколі». Ці ён ніколі не чуў аргумента, што мова беларуская не толькі недаразвітая, але і паганская, і менавіта таму яна не можа прысутнічаць у касцёлах? У параўнанні з гэтым нават Лукашэнкава пазіцыя ў справе беларускасці можа быць названа пікам талерантнасці.

Ці Дзванкоўскі размаўляў з гарадзенскай каталіцкай інтэлігенцыяй? Ці даследаваў сітуацыю ў Духоўнай семінарыі ў Горадні? Ці ведае пра лёс многіх клерыкаў, якія спрабавалі заявіць пра тое, што яны – беларусы? Ці ўсё гэта таксама «ў імя універсалізму ды душпастырскага служэння»?

Праблема тут яшчэ глыбейшая. Яна палягае ў непрадуманай спасылцы, што душпастырскую дзейнасць можна аддзяліць ад культурнай. Мяркую, што і сам аўтар не ўспрымае сур'ёзна гэтай дыстынкцыі, хоць і пераконвае, што за захаваннем *status quo* стаяць выключна душпастырскія матывы. Спакон вякоў рэлігія і культура былі моцна сплеценыя паміж сабой, заўсёды рэлігійная (=душпастырская) дзейнасць азначала таксама

выкананне культурнай і адукацыйнай функцыі. І той святар, які падтрымлівае прэмадэрнісцкае самаакрэсленне сваіх парафіянаў і замацоўвае тэзіс «каталік – паляк», і той, які спрабуе спрыяць ментальнай трансфармацыі, – абодва выконваюць культурную функцыю, абодва ажыццяўляюць тую ці іншую культурную мадэль. Такім чынам, дыскусія павінна весціся не вакол альтэрнатывы: універсалізм *ці* нацыянальная афарбоўка Касцёла, душпастырства *ці* павышэнне нацыянальнай свядомасці, а вакол пытання: *якім чынам усё гэта мае адбывацца*? Карацей кажучы: *этыка* ці *макіявелізм*? Дзванкоўскі ў імя універсалізму Касцёла дэканструюе выраз «польскі Касцёл», і нават сур'ёзна гаворыць пра «неабходнасць дэпаланізацыі». Але дэпаланізацыя азначае тут адно толькі ўсведамленне нятоеснасці паняткаў «польскі» і «каталіцкі» і *nihil plus*, нічога болей. *«Дылема выбару,* – кажа святар, – *паміж польскасцю і універсалізмам (…) не існуе ў рэчаіснасці. (…) Патрабаванне, каб палякі адмовіліся ад сваёй мовы ў літургіі ў імя фальшывага універсалізму, ёсць насамрэч патрабаваннем, каб яны ўчынілі этнічнае самагубства*» (2001). Такім чынам, адмовіўшыся ад панятку «польскі Касцёл», прафесар прасоўвае панятак «Касцёл палякаў», гэта значыць, што на беларускіх (і ўкраінскіх) землях *амаль няма* каталікоў-непалякаў. Дзеля большай яснасці вылучым асноўныя тэзісы Дзванкоўскага:
1) у Беларусі – блізу паўтара мільёна палякаў;
2) усе палякі ў Беларусі хочуць, каб літургічнаю мовай была польская;
3) каталіцкія іерархі абавязаны падбаць, каб у касцёлах набажэнствы вяліся на польскай мове – на падставе 1) і 2). Наконт 1). Застаецца крайне нявыразная эмпірычная база гэтага сцверджання. Адзінае, на што абапіраецца Дзванкоўскі, гэта заўвага, што «*раней было болей*», ды выказванне Ст. Салікоўскага на старонках «Głos znad Niemna»: «*…без сумневу, нас у некалькі разоў болей, чым гэта падаюць афіцыйныя звесткі з савецкай статыстыкі*». Крыху пазней паглядзім, якім чынам абгрунтоўвае гэты тэзіс Кручкоўскі, але ўжо цяпер можам заўважыць, што звышвысокая лічба палякаў у Беларусі – гэта прапагандысцкая фікцыя. Трэба адзначыць, што ўжо ў дарэвалюцыйныя часы сфармаваўся моцны і ўплывовы беларускі каталіцкі адраджэнскі рух, якому таксама – як і беларускім палякам – наканаваны быў пакутніцкі лёс у

савецкай Беларусі, але які пратрываў і «ўваскрос» у гады сучаснага адраджэння. Як не круці, але зноў і ўсцяж знаходзяцца такія каталікі, якіх чамусьці вабіць беларускамоўная версія каталіцызму, і яны хочуць, каб беларускасць і каталіцкасць набылі культурнае афармленне. І што цяпер рабіць з гэтымі каталікамі-беларусамі?
Падаецца, што праблема тут не столькі ў канцэпцыі Касцёла, колькі ў антрапалогіі. Вельмі часта бянтэжыць і нават палохае погляд на чалавека многіх духоўнікаў. З цытаванага выказвання святара з Ліды (аднаго з рэспандэнтаў Г. Гебень) яскрава відаць, што ён не здольны ўспрыняць таго факту, што сам чалавек можа быць *аўтаномны* ў распазнанні сваёй нацыянальнасці. Многія польскія духоўнікі не вераць і не прызнаюць магчымасці такой сітуацыі, калі хтосьці, хто раней *лічыўся* палякам, цяпер *свядома стаў* беларусам. Дэ факта яны ёсць праціўнікамі свабоды самавызначэння. Нацыянальнасць для іх – гэта сфера дэтэрмінізму. Часам дзіву даешся, як святары, якія зазвычай зацята пільнуюць таго, што духоўнае (і слушна), раптам становяцца заядлымі матэрыялістамі, калі пачынаюць разважаць пра нацыянальнасць. Найчасцей – быццам верныя вучні Хекля (Haeckel) – навязваюць нейкі біялагічны дэтэрмінізм («кроў польская»), а гэты дэтэрмінізм зазвычай спалучаецца з патрыярхальным традыцыяналізмам (абавязак застацца той жа нацыянальнасці, што і продкі) і з пераканаццем у цывілізацыйнай і маральнай вышэйшасці палякаў (адаптацыя прымітыўнага проціпастаўлення тыпу «эліны–варвары»).
Такім чынам, «паўтара мільёна палякаў на Беларусі» – гэта прадукт комплексу звышвартасці.
Наконт 2) і 3). Тут, як бачым, мы маем справу з догмаю «воля народу – suprema lex», абсалютызацыяй патрабаванняў люду. Ізноў здзіўляе пэўная акалічнасць, а менавіта, што святары, якія заўзята і бескампрамісна бароняць прынцып «іерархічнасці Касцёла», нечакана становяцца бескампраміснымі дэмакратамі, калі гаворка заходзіць пра мову ў літургіі: «*Людзі хочуць, каб імша была толькі па-польску*». Дарэчы, гэты «эгалітарызм» зусім не замінае іхняму «іерархізму»: «*Не было якіх-небоньдзь документув люб дэкрэтув*», – як кажа на пакалечанай польскай мове лідскі ксёндз.
Гэта зусім не азначае, што альтэрнатывай павінна быць

безумоўная беларусізацыя прастамоўных каталікоў, якія дамагаюцца польскай мовы ў касцёлах. Крытыка польскага традыцыяналізму мае тут толькі адну мэту: паказаць, што каталікі-палякі патрабуюць культурнай сацыялізацыі, а іх культурная нацыянальнасць застаецца справай адкрытай. Можа быць так, што ў працэсе павышэння культурнай свядомасці яны трансфармуюцца ў паўнавартасных палякаў і пачнуць будаваць сваю тоеснасць на базе польскай нацыянальнай культуры, а можа быць так, што схіляцца да беларускай нацыянальнасці. Прастамоўныя палякі-тутэйшыя пакуль што несамастойныя ў самавызначэнні і неакрэсленыя ў нацыянальным плане. Крытыка польскага традыцыяналізму, такім чынам, абумоўлена абаронай пэўных пазітыўных каштоўнасцяў. Польскія традыцыяналісты асуджаюцца тут не таму, што з'яўляюцца прыхільнікамі польскай культуры, а таму, што замацоўваюць прэмадэрнісцкую субкультуру ў беларускім грамадстве. Святары-палякі, якія нарадзіліся ў Беларусі, пераважна не валодаюць літаратурнай польскай мовай, гавораць казані на трасянцы, а калі да гэтага яшчэ дадаецца бязглузды змест, то можна ўявіць сілу «культурнага эфекту». «Польскасць» можна тут успрымаць толькі як папулісцкі прыём, а не як культурную опцыю. А для некаторых духоўных і свецкіх польскасць – гэта папросту адаптацыйная стратэгія. З гэтым звязана праблема, пра якую ўжо была гаворка – няздольнасць да культурнай дыскусіі з канкурэнцыйнай культурнай опцыяй – беларускамоўнай версіяй каталіцызму. У гэтай сітуацыі застаецца ў польскіх традыцыяналістаў адно – стрымліваць канкурэнцыйную культурную плынь пры дапамозе «адміністрацыйнага рэсурсу». І трэба прызнаць, на Гарадзеншчыне гэты рэсурс выкарыстоўваецца напоўніцу. Роман Дзванкоўскі як святар павінен ведаць, што ўсякая несправядлівасць, у якой задзейнічаны рэлігійныя пачуцці, набывае нашмат больш трагізму, чым звычайная несправядлівасць. Пераконванне да польскасці «ў імя еднасці Касцёла, містычнага Цела Хрыста» – як гэта нярэдка робіцца на Гарадзеншчыне – можа альбо знішчыць сумленне, альбо скампраметаваць гэтую «еднасць». Гвалт над сумленнем у гэтай сітуацыі асабліва небяспечны.

ПОЛЬСКАЯ ДУША – ЯЕ

СВЯТАСЦЬ, СВЕЦКАСЦЬ І САВЕЦКАСЦЬ

Недостойно свободных существ
во всём всегда винить внешние силы
и их виной себя оправдывать.

Николай Бердяев

Аповеды старшыні Саюза палякаў Беларусі Тадэвуша Кручкоўскага (пра некаторыя аспекты этнічнай гісторыі палякаў у Беларусі), Здзіслава Вінніцкага (пра сродкі і метады дэпаланізацыі) і згаданага ўжо ксяндза Р. Дзванкоўскага носяць знакамітую рысу *lacrimous story*, рысу, тыповую для нацыяналістычных нарацый. Структура аповеду зазвычай такая: 1) прывядзенне афіцыйных звестак пра палякаў у Беларусі; 2) выяўленне «праўдзівай» колькасці палякаў; 3) рытуальны напамін пра пакутніцкае мінулае палякаў (гэты рытуал паспяхова нейтралізуе сумневы, якія могуць узнікнуць у сувязі з 2); 4) дэманізацыя галоўнага канкурэнта – беларускага адраджэнскага руху; 5) нараканні-павучанні-папярэджанні на адрас беларускай дзяржавы.
Бадай, у «ідэальнай форме» гэтая нарацыя прысутнічае ў тэкстах Кручкоўскага. Спынімся на гэтых тэкстах адмыслова.
1. *Праблема з афіцыйнымі звесткамі. «Нават уступны аналіз першых вынікаў перапісу насельніцтва паказвае, што ён быў негрунтоўны»,* – піша Кручкоўскі (2004). Да гэтага выказвання можна паставіцца з разуменнем: не сакрэт, што беларуская ўлада вельмі часта дзейнічае паводле прынцыпу: «калі факты пярэчаць тэорыі, то тым горш для фактаў». Фальсіфікацыя ці перакручванне рэчаіснасці – гэта для беларускага рэжыму не праблема. Адначасна ж не трэба тут перабольшваць, што, маўляў, беларускай уладзе выгадна замоўчваць ці фальсіфікаваць праўдзівую колькасць палякаў. Калі больш уважліва ацэнім сітуацыю, то выявіцца, што найбольш апанентаў рэжыму Лукашэнкі якраз сярод прабеларускага каталіцкага руху. Тым часам прастамоўныя каталікі-тутэйшыя, якія акрэсліваюць сябе палякамі, пераважна вельмі прывязаныя

да «калгаснасці», што добра пасуе да іхняй «тутэйшасці» і «парафіяльнасці», утвараючы з імі аснову прэмадэрнісцкага светаадчування. «Калгаснасць» ёсць выдатным прытулкам для няздольных дапасавацца да шырэйшых культур – польскай, беларускай альбо расейскай. Сярод іх пераважна людзі старыя і малаадукаваныя, якія і ўтвараюць асяродак «польскасці» на Гарадзеншчыне. Лукашэнка для іх – гэта гарант старога парадку, да якога яны прывыклі і з якім зжыліся, а для самога Лукашэнкі прастамоўныя палякі – гэта даволі надзейны электарат.

Можна тут высунуць тэзіс, што ўлада магла сфальсіфікаваць колькасць палякаў, каб аслабіць пазіцыі Саюза палякаў Беларусі, які ў 1999 г. быў у выразнай апазіцыі да рэжыму Лукашэнкі. (Гэтага тэзісу Кручкоўскі не фармулюе, бо сам ён узяў курс на большую лаяльнасць да рэжыму Лукашэнкі, і яму (Кручкоўскаму) было б цяжка прызнаць, што яго папярэднік Тадэвуш Гавін трымаў больш апазіцыйны курс.) Спекуляцый наконт таго, наколькі гэты чыннік мог быць важны для ўладаў, ці бралі яго пад увагу, ці ўзважвалі плюсы і мінусы магчымай фальсіфікацыі, няма сэнсу множыць, тут патрэбны былі б нейкія эмпірычныя звесткі. Пагадзіцца можна толькі з тым, што *ўлады* маглі *сфальсіфікаваць*. І тут да месца будзе адзін анекдот: «*За што ты, цыгане, б'еш сына, ён жа нічога благога не зрабіў!» «Ну то і што, што не зрабіў, а* мог *зрабіць. А калі мог зрабіць благое, то і зрабіў, бо чаму ж меў не рабіць?!*»

Дакладна такой логікай кіруецца і Кручкоўскі: калі ўлада *магла* сфальсіфікаваць, то і сфальсіфікавала, бо чаму ж ёй было не фальсіфікаваць! Ну, «дружба дружбай», а пагадзіцца з такой логікай нельга, патрэбны нейкія доказы. Такімі доказамі маглі б быць задакументаваныя заявы саміх людзей (напрыклад: «*Я ім сказаў, што паляк, а яны запісалі мяне беларусам*») альбо альтэрнатыўны падлік. Тым часам Кручкоўскі спасылаецца адно толькі на вядомы тэзіс, што «*раней было больш*». Раней было больш палякаў, цяпер менш, эміграцый не было, паморкаў не было – *ergo*: фальш!

Дылетанцтва тут навідавоку: па-першае, колькасць палякаў паводле афіцыйных звестак зменшылася зусім нязначна: усяго на пару працэнтаў у параўнанні з 1989 г. Па-другое, малалеткі, чыю польскасць у 1989 г. вызначылі бацькі і бабулі, маглі ў 1999 г. самастойна акрэсліць сябе інакш. (Дарэчы, як

паказваюць даследаванні Гарбанюкоў (2004), сярод апытаных каталікоў палякамі сябе называлі часцей дзеці да 18 гадоў, а ва ўзросце ад 18 да 30 колькасць каталікоў-палякаў змяншалася.) Па-трэцяе, трэба ўзяць пад увагу магчымасць эвалюцыі свядомасці. Не ўсе так моцна, як Кручкоўскі, перакананы ў сваёй польскасці, таму няхай ён пагодзіцца з тым, што сённяшні паляк заўтра можа назваць сябе беларусам альбо нават яўрэем. І не патрэбны тут лямантацыі і вырыванне валасоў з галавы, бо гэта нармальная, людская з'ява, якая паўсюль і заўсёды дзеецца.

Калі Кручкоўскі нізавошта не хоча пагадзіцца з чыннікам эміграцыі альбо натуральных смерцяў (хоць, нагадаць трэба, палякі – таксама смяротныя істоты), то вышэйназваных фактараў цалкам дастаткова, каб растлумачыць загадку «знікнення» 22 тысяч палякаў, якія яшчэ дзесяць гадоў таму былі.

2. Лічба каталікоў на Беларусі, паводле Кручкоўскага, – 2,5–3 мільёны. 90 % з іх – палякі. Падчас разгляду рэферату Дзванкоўскага мы ўжо аналізавалі структуру гэтай высновы. Таму цяпер абмяжуемся толькі псіхалагічнай сугестыяй – ці маніякальная тэндэнцыя Кручкоўскага паўсюль і ўсюды бачыць фальсіфікацыю не ёсць праекцыяй яго ўласнай звычкі тварыць рэчаіснасць паводле ўласнага ўяўлення?

3. Падчас канферэнцый, на шчасце, не было месіянісцкіх рэфлексій (ну, як-ніяк, канферэнцыі ж – «навуковыя»), але безупынна давала пра сябе знаць віктымісцка-трыумфалісцкая нарацыя. Толькі прыкра трохі, што Кручкоўскі і іншыя вучоныя рэферэнты не заўважаюць іншых пакутнікаў, якія разам з палякамі цярпелі ў Савецкім Саюзе. У такіх сітуацыях брыдка спрачацца, хто болей нацярпеўся і хто ў сувязі з гэтым больш святы. Ізноў, каб лепш усвядоміць праблему, выкарыстаем анекдот, бо анекдот – гэта выдатны метад інтэрпрэтацыі рэчаіснасці. Памёр будыст і пайшоў у неба. Святы Пётр бярэ яго пад руку і водзіць па небе, паказвае, што дзе ёсць і хто дзе знаходзіцца. «*Вось тут*, – кажа Пётр, – *нашыя браты індуісты, а там – жыды. Вунь на тым баку жывуць пратэстанты, а там, далей – праваслаўныя». «А хто там, за гэтым мурам?»* – пытаецца будыст. Тут святы Пётр нахіліўся і гаворыць шэптам на вуха будысту: *«За гэтым мурам жывуць каталікі. Але ціха, бо яны думаюць, што адныя ў небе. Калі даведаюцца, што яшчэ*

хтосьці ёсць, то страшна абурацца...»
Нешта такое і з палякамі ў Беларусі. Калі даведаюцца, што хтосьці, апрача іх, таксама цярпеў у Савецкім Саюзе, то страшна абурацца. Так што ціха, не будзем пра гэта гаварыць...
4. Тым не менш давядзецца трохі пагаварыць пра дэманізацыю беларускага адраджэнскага руху ў рэдакцыі Кручкоўскага. Нагадаем, што адным з галоўных пунктаў праграмы новаабранага на пасаду старшыні Саюза палякаў Беларусі ў лістападзе 2000 г. Т. Кручкоўскага была рашучая адмова ад супрацоўніцтва з беларускай апазіцыяй. Папярэднік Кручкоўскага, Тадэвуш Гавін, супрацоўнічаў з ёю, і гэта было – на думку новага старшыні – вялікай памылкай. Пра гэта Кручкоўскі згадвае і ў сваім рэфераце на канферэнцыі-2003: *«Заангажаванне лідэраў СПБ у падтрымку БНФ было дадатковай важнай прычынай дыскрымінацыйнага абыходжання мясцовых уладаў з польскай меншасцю. (...) Гэта яскрава відаць на прыкладах адмовы ў будаванні польскіх школ у Новагародку, Воранаве ці ў Лідзе і г. д.»* (2004). Ну вось, і куды падзеўся той знакаміты польскі гераізм і хвалёная шляхетнасць, няўжо са страху перад палітычнай уладай можна здраджваць учарашнім сябрам? Да таго ж у імя блізарукага прагматызму. І чаго Кручкоўскі хоча дамагчыся ад сённяшніх уладаў узамен за лаяльнасць?
У цытаваным рэфераце старшыня Саюза вельмі часта згадвае пра беларускі адраджэнскі рух, і заўсёды адмоўна. Часам паўстае ўражанне, што рытарычныя фігуры, якія ён стасуе для характарыстыкі гэтага руху, наўпрост узяты з «Советской Белоруссии» ці нават з прамоў Лукашэнкі. Кручкоўскі, як і Лукашэнка, глядзіць на беларускае адраджэнне выключна як на палітычную з'яву, а культурнае і культуратворчае вымярэнне, якое ў беларускім адраджэнні прымарнае, Кручкоўскага не цікавіць. Гэтак, як і Лукашэнка, Кручкоўскі зусім не дбае пра тое, каб узяць пад увагу разнастайнасць і неаднароднасць гэтага руху. Можа, каб ён больш сумленна пазнаёміўся з гісторыяй і актуаліямі беларускага адраджэнскага руху, то заўважыў бы, што антыпольскасць у гэтым руху – гэта справа, хутчэй, маргінальная. Ідэйны спектр гэтага руху вельмі багаты і дыферэнцыяваны, а стасунак да польскасці хутчэй выпадае на карысць паланафіліі, чым паланафобіі. Ва ўсякім разе, сярод беларусаў-адраджэнцаў Кручкоўскі мог бы знайсці сціжму

надзейных саюзнікаў у змаганні з паланафобіяй, і наўрад ці ён знойдзе такіх сярод скарумпаванай уладнай наменклатуры. Старшыня Саюза палякаў чамусьці не заўважыў таго, што менавіта зненавіджаны ім БНФ (Вячоркава крыло) выступіў у свой час з рашучай абаронай этнічных меншасцяў у Беларусі, у тым ліку і супраць дыскрымінацыі палякаў: «*Мы адзначаем усё большы ціск уладаў у адрас грамадзкіх арганізацый польскае меншыні. Так, Саюз палякаў у Беларусі атрымаў ад Міністэрства юстыцыі за ўяўныя альбо неістотныя парушэньні заканадаўства папярэджаньне, якое пагражае гэтай арганізацыі ліквідацыяй*». Варта ўвагі тое, што заява была прынятая ў кастрычніку 2003 г., амаль тры гады пасля змены кіраўніцтва СПБ. Як высвятляецца, для БНФ маральныя прынцыпы ўсё ж важнейшыя за палітычную кан'юнктуру.

Кручкоўскі ў сваім рэфераце ставіць у адным шэрагу РНЕ і «Зубр» – і гэта таксама аб'ядноўвае яго з Лукашэнкам. Адначасна ж адсутнасць у Беларусі выразных антыпольскіх настрояў з'яўляецца для яго пэўнай праблемай. Ён пачынае шукаць ворагаў палякаў у *«імкненні да ўзмацнення пачуцця беларускасці сярод каталіцкага насельніцтва»*. Дзякуй Богу, старшыня прызнае, што *«гэтая антыпольскасць, у прынцыпе, абмежавана толькі пэўнай часткай палітычных асяродкаў»*, аднак жа надалей бянтэжыць гэтае атаясамліванне прабеларускай тэндэнцыі ў каталіцызме з антыпольскасцю.

5. Свой рэферат Кручкоўскі заканчвае такім чынам: *«Палітыка беларускіх уладаў да гэтага часу ніколі не адпавядала еўрапейскім стандартам у дачыненні да нацыянальных меншасцяў. (...) Беларускае грамадства павінна ўсвядоміць, што свет і Еўропа не будуць доўга чакаць на адпаведныя змены ў Беларусі»*. І гэта, бадай, адзінае, у чым можна пагадзіцца з Кручкоўскім.

Кручкоўскі – гэта савецкі чалавек. Атмасферу, якая запанавала ў Саюзе палякаў пасля абрання яго старшынём, вельмі добра апісаў гарадзенскі паэт Юры Гумянюк у двух нумарах часопісу «Czasopis» (03/ і 04/2003).

У студзені 2003 г., – піша Ю. Гумянюк, – *дайшло нават да таго, што такія дзеячы польскага руху, як Станіслаў Пачобут і Леон Подлях мусілі распачаць галадоўку, каб дамагчыся склікання рады і выразіць пратэст проці парушэння статутных дакументаў.*

Рада была скліканая, тым не менш аўтарытарнае панаванне засталося. Засталася таксама цэнзура і зацятая нянавісць да Тадэвуша Гавіна, папярэдняга лідэра беларускіх палякаў. Кручкоўскі пераняў этыку кіравання ад беларускага рэжыму, які ў сваю чаргу раўніва трымаецца савецкай этыкі. Рэжым унутры Саюза палякаў можна ўспрымаць як рэплікацыю беларускага палітычнага рэжыму.

Але не толькі «ўнутраная палітыка» Кручкоўскага выклікае занепакоенасць, непакоіць таксама ягоная «вонкавая палітыка». Ён сам у сваім рэфераце гаворыць: *«…Саюз палякаў на Беларусі рабіў ціск на мясцовых біскупаў, а таксама – праз пасярэдніцтва «Wspólnoty Polskiej» – і некаторых польскіх палітыкаў, на Польскі епіскапат з мэтай селекцыі высыланых на Беларусь святароў з пункту гледжання іхняй уважлівасці да патрэбаў польскага насельніцтва»*. Кручкоўскі згадвае пра заклік Саюза палякаў да Каталіцкага касцёла ў Беларусі, каб *«застаўся польскім». «Дзяржаўная мова,* – кажа пазней Кручкоўскі, – *пачынае ўжывацца ў каталіцкай Духоўнай семінарыі ў Горадні, а гэта ўжо недаравальна»*. Сапраўды, недаравальна, бо і дараваць тут няма чаго: «ужыванне беларускай мовы» ў гарадзенскай семінарыі зводзіцца толькі да таго, што расклад заняткаў вывешаны ў беларускай версіі (побач з польскай) ды на працягу аднаго года выкладаецца беларуская мова (гадзін польскай мовы – столькі сама, плюс цэлы год польскай фанетыкі). Усе заняткі – навуковыя і фармацыйныя – вядуцца па-польску, імшы і малітвы – таксама па-польску, і толькі адзін раз у тыдзень, у будны дзень, ёсць імша па-беларуску.

Што ж, застаецца толькі выказаць пажаданне, каб польская культура ў Беларусі развівалася *нягледзячы* на кіраўніцтва галоўнай польскай арганізацыі, якое цяпер здольнае адно толькі кампраметаваць гэтую культуру сваімі паводзінамі і глабальнай агрэсіяй. Польская культура ў Беларусі мае агромністы патэнцыял, да канца не ўсвядомлены, і агромністую спадчыну, да канца не адроджаную, і, трэба спадзявацца, што ў будучыні яна набудзе каларыту і стане інтэгральным элементам беларускага грамадства. Але дзеля гэтага патрэбна дэмакратызацыя – і ў краіне, і ўнутры польскіх арганізацый.

НАРОД – МАСТАЦКІ

ТВОР ЦІ ПРЫРОДНАЯ СТЫХІЯ?

Nations are imagined communities.

Benedict Anderson

Адной з ключавых праблем, якая з'яўлялася ў рэфератах, была праблема канцэпцыі народа/нацыі. Рэферэнты ўсведамлялі наяўнасць гэтай праблемы толькі тады, калі пачыналі крытыкаваць тую ці іншую канцэпцыю народа, якая ім была не да спадобы, напрыклад, функцыяналізм. Як ужо адзначалася раней, прамоўцы на практыцы не трымаліся адной канцэпцыі народа, у межах аднаго тэксту можна заўважыць наяўнасць некалькіх канцэпцый, якія аўтар несвядома прымае: раз, напрыклад, спасылаецца на самаакрэсленне (суб'ектыўны крытэр), а колькі радкоў далей ужо вызнае якуюсь версію аб'ектывізму (напрыклад, «кроў», «паходжанне»). Коратка прааналізуем пару праблемных пытанняў, звязаных з нацыянальнай прыналежнасцю.

І на гэты раз выкарыстаем выясняльны патэнцыял анекдота, толькі гэтым разам жыўцом узятага з жыцця. Адзін ксёндз, актыўны дзяяч Саюза палякаў (пакінем яго ананімам), любіць паўтараць пры любой нагодзе выслоўе: *«Калі арол нарадзіўся ў канюшні, то гэта яшчэ не значыць, што ён – конь. Калі паляк нарадзіўся ў Беларусі, гэта не значыць, што ён – беларус»*. Маем тут справу з крайняй версіяй аб'ектывізму, а менавіта – субстанцыяналізмам, «групавым рэалізмам»: калі «паляк» стаў «беларусам», значыць, ён згубіў сваю сутнасць, ён – ніхто. Ну, каб крыху аслабіць радыкалізм гэтага ксяндза, заўважым, што паміж палякам і беларусам розніца крыху меншая, чым паміж арлом і канём. І палякі, і беларусы належаць да таго ж самага біялагічнага віду, яскравым доказам чаго ёсць факт, што беларус і полька могуць паспяхова спладзіць патомства, а ў выпадку арла і каня такога феномена – прынамсі, дагэтуль – не назіралася...

Ірацыянальнасць такой канцэпцыі – субстанцыяналізму – мабыць, няма патрэбы даводзіць. Ён бярэцца са звычкі гіпастазаваць абстрактныя быццi, прыпісваць ментальным канструктам рэальнае існаванне. Адначасна ж нельга не

заўважыць, што субстанцыяналізм некаторых палякаў ёсць роспачнай спробай супрацьпаставіцца іншай версіі аб'ектывізму, а менавіта – функцыяналізму. Кручкоўскі ў сваім рэфераце (2004) цытуе З. Шыбеку: *«Беручы пад увагу сённяшнюю сітуацыю, трэба імкнуцца не да культурнай мадэлі народа (моўна-этнічнай, субстанцыянальнай), але да функцыянальнай мадэлі. Усё тое, што знаходзіцца на Беларусі – беларускае. Усе грамадзяне Беларусі – беларусы»*.
Польскія рэферэнты, згадваючы пра такую канцэпцыю народа, адразу ж бачаць у ёй палітычныя матывы, а тым часам гэта папросту адна са спробаў пераадолення гнасеалагічнай дылемы ў справе разумення народа. Іншая рэч, што гэтая спроба не дужа ўдалая. Падаецца, аналагам функцыяналізму ў тэорыі народа ёсць так званы «інстытуцыяналізм» у галіне тэорыі мастацкага твора. Некаторыя эстэтыкі (Артур Данто, Джордж Дзікі) у свой час сфармулявалі такую дэфініцыю мастацкага твора: *артэфакт, якому прадстаўнік свету мастацтва («artworld») надаў статус кандыдата для ацэнкі*. «Тэрыторыя» ў функцыяналісцкай тэорыі народа выконвае тую ж функцыю, што «artworld» у інстытуцыяналісцкай тэорыі мастацтва. Гэтыя паняткі маюць пад сабой даволі ясны, лёгка распазнавальны эмпірычны дэсігнат, і таму найменш было б клопатаў у разуменні паняткаў «мастацтва» і «народ», якія дагэтуль былі расплывістымі. Пакінем убаку мастацтва і эстэтыку, а звернем увагу, што функцыяналісцкая канцэпцыя народа, хоць і выгадная ў аспекце камунікацыі, выклікае сур'ёзныя этычна-антрапалагічныя засцярогі. Нас не цікавіць – можам сказаць – тое, што ты адчуваеш сябе палякам, расейцам ці ўкраінцам, нас цікавіць толькі тое, што маеш пашпарт РБ і таму – ты беларус. Такая пастаноўка пытання напэўна не мае нічога агульнага з ідэяй свабоднага грамадства і прынцыпам персаналізму. Праўда тут такая, што шэраг людзей адчувае сябе палякамі, расейцамі і г. д., і мы маем абавязак ушанаваць гэтае адчуванне і ўшанаваць імкненне гэтых людзей маніфеставаць сябе ў публічным і палітычным жыцці.
Гэта вядзе да пастаноўкі пытання пра іншыя магчымыя тэорыі народа. Досвед эстэтыкі ізноў можа нам дапамагчы. Роман Інгардэн стварыў тэорыю мастацкага твора, згодна з якой мастацкі твор – гэта *інтэнцыянальнае быццё*, г. зн. быццё, існаванне якога залежыць ад актаў свядомасці. Гэты філосаф

адрозніў мастацкі твор ад «быццёвай падставы», якою з'яўляецца, напрыклад, палатно ды хімічны склад пігментаў фарбы ў мастацтве. У рэфлексіі над канцэпцыяй народа мы таксама можам вылучыць «быццёвую падставу»: мову, звычаі, кроўныя повязі, традыцыі, рэлігію, вераванні, класавую прыналежнасць, псіхалагічныя асаблівасці. Ніводнаму з гэтых элементаў нельга прыпісваць якойсьці магічнай сілы «прадвызначэння» альбо «вызначэння» нацыянальнасці. Пералічаныя элементы (магчымыя і іншыя) ёсць адно толькі субстратам: яны *могуць* стацца падставай нацыянальнага самавызначэння, але не мусяць. Не кожны, хто жыве ў Беларусі – беларус, і не кожны, хто гаворыць па-польску – паляк. Але гэта не значыць, што небеларус не можа стацца беларусам, а непаляк не можа стацца палякам.

Паўстае цяпер чарговая праблема: ці можам лічыць самадастатковымі пратакольныя сказы тыпу: «*S* сцвярджае, што ён – паляк» і «*P* сцвярджае, што ён – беларус», каб зрабіць выснову: *S* – сапраўды паляк, а *P* – сапраўды беларус. Інакш кажучы, ці мае права хтосьці распачаць спрэчку з *S* і *P* і пачаць даводзіць: «ты – не паляк», або: «ты – не беларус». Рэферэнты на канферэнцыях – у залежнасці ад патрэб – прымалі раз адну, раз другую пазіцыю.

Рэферэнты прэзентавалі даволі багаты эмпірычны матэрыял, здабыты шляхам сістэматычных даследаванняў, але праз сваю непісьменнасць у інтэрпрэтаванні, можна сказаць, змарнавалі яго навуковую вартасць. Возьмем узорны пратакольны сказ: *«Поляк пан?» – «Ага, католік»*. Навуковец у гэтым выпадку не мае права без засцярог сцвердзіць, што польскасць гэтага чалавека ёсць *фактам*. Гэтае «ага» трэба інтэрпрэтаваць у бліжэйшым кантэксце сказанага. У дазеным выпадку шукаць бліжэйшага кантэксту не даводзіцца, ён акрэслены словам «католік». Вынік тут даволі відавочны: *мы нічога не даведаліся пра нацыянальнасць, мы даведаліся толькі пра канфесійную прыналежнасць гэтага чалавека*. Аналагічна, калі б мы спыталі ў дзіцяці: *«Сябруеш з Ванькам?»* і пачулі: *«Ага, гуляю»*, то мусілі б узяць пад увагу спецыфіку разумення слова «сябраваць».

Але зважаць трэба не толькі на бліжэйшы кантэкст. Мы абавязаны браць пад увагу і *шырэйшы кантэкст*, так званы *Sitz im Leben*, жыццёвае асяроддзе, *мы мусім ажыццявіць рэканструкцыю менталітэту апытаных асоб*, устанавіць, як у

дадзеным асяроддзі функцыянуюць такія паняткі, як «беларус», «паляк», «польская мова», «беларуская мова», «простая мова» і г. д. Рэферэнты не заўважылі, што розныя асяроддзі гавораць на розных мовах і што гэтую рознасць трэба назваць і не блытаць падчас інтэрпрэтацыі. Яны наіўна прымаюць, што «паляк» у вуснах вясковай бабулі і «паляк» у вуснах гарадскога інтэлігента значаць адно і тое ж, і што абодва, акрэсліваючы сябе палякамі, належаць да аднаго і таго ж метафізічнага арганізму. Тым часам, вельмі праўдападобна, што бабуля, называючы сябе полькай, выражае сваю прыналежнасць да пэўнай канфесіі, да пэўнай малой супольнасці – вёскі, парафіі, калгасу («бо ўсе ў нас – палякі») да пэўнага канону паводзін і традыцый. Інтэлігент жа, называючы сябе палякам, можа выражаць зусім іншае, чымся тая бабуля – прыналежнасць да культуры, салідарнасць з усімі, хто вызнае тыя ж самыя сімвалы, нарацыі, захоўвае сантымент да польскай мовы і г. д. Няма субстанцыі народа і няма ў сувязі з гэтым сталага квантуму носьбітаў нацыянальнасці. Гэта можна выразіць яшчэ больш суха і сурова: няма насамрэч чагосьці такога як «народ» ці «нацыя», ёсць толькі людзі, якія акрэсліваюць сябе паводле той ці іншай нацыянальнай прыналежнасці. Існаванне нацыі/народа ёсць вытворным існаваннем – яно цалкам залежыць ад інтэнцыянальных актаў чалавечай свядомасці. Адноснай аб'ектыўнасцю характарызуецца толькі субстрат, і на базе гэтага субстрату можа сфармавацца нацыянальная самаідэнтыфікацыя. Нацыя ў сучасным разуменні – гэта свайго роду «мастацкі твор», ментальны канструкт. Вось такая, зусім «не рамантычная» наша канцэпцыя народа.

* * *

Апрача тытульнай тэмы – нацыянальная свядомасць палякаў – прысутнічалі і іншыя, апасродкавана звязаныя з асноўнаю: на канферэнцыі-2001 Анатоль Жытко з Менску выступіў з беларускамоўным рэфератам пра становішча дваран-каталікоў Беларусі, якія дыскрымінаваліся ў Расейскай імперыі, Вячаслаў Швед з Горадні расказваў пра гарадзенскіх губернатараў польскага паходжання (таксама па-беларуску), Тацяна Залеская прачытала рэферат пра паэта пары Асветніцтва Адама Нарушэвіча (па-польску) і інш. На заканчэнне Яцак Стружынскі

з Варшавы гаварыў пра будучыню і мінуўшчыну палякаў і беларусаў. Гэта вельмі зычлівая – хоць занадта агульная і расплывістая – рэфлексія над роляй Польшчы і Беларусі ў справе сумеснага фармавання Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Падчас канферэнцыі-2003 таксама быў шэраг вартасных рэфератаў, прысвечаных зазвычай вузкім тэмам. Сяргей Донскіх з Горадні ў сваім расейскамоўным рэфераце паказаў полісемантычнасць панятку «паляк» у дыяхранічнай плоскасці: як у розныя перыяды гісторыі функцыянавала паняцце «паляк», «польскасць»; Эдуард Мазько, таксама гарадзенец, прачытаў цікавы рэферат на тэму этнічных стэрэатыпаў у Беларусі пасля аб'яднання заходняй і ўсходняй Беларусі – у 1939–1941 гг. Былі рэфераты і на тэму ўдзельнікаў медыцынскіх працаўнікоў у паўстанні 1863 г., і пра гісторыю Урублеўскіх, пра ідэю «неаўніі» ў другой Рэчы Паспалітай, пра калекцыі палонікі і інш.

Падагульняючы праблематыку свядомасці палякаў, мусім заўважыць, што яна палягае, у асноўным, у адсутнасці панятку нацыянальнасці ў большасці тых, хто акрэсліваюць сябе палякамі. Прастамоўе, тутэйшасць, парафіяльнасць, калгаснасць – вось вызначальнікі «грамадскай» самасвядомасці пераважнай большасці беларускіх «палякаў». Гэта – данацыянальныя супольнасці і паказнік устойлівасці прэмадэрнізму ў Беларусі. Гэта – цэлыя гектары глебы, якія чакаюць культурнай ды адукацыйнай апрацоўкі. Як, калі і ў якую нацыю трансфармуюцца прастамоўныя каталікі-тутэйшыя – застаецца справай адкрытай, адно толькі вядома, што сённяшні палітычны рэжым спрыяе кансервацыі гэтых прэмадэрнісцкіх рэзідыумаў. На жаль, падобнае трэба сказаць і пра частку польскай эліты.

Рэфлексію над польскай самасвядомасцю хочацца скончыць аповедам аднаго літоўскага паляка, сябра суполкі «Аматары Літвы» (Lietuvos mylėtojai): «*Нас* [палякаў – аматараў Літвы] *надта не любяць літоўскія нацыяналісты, бо мы – на іх думку – паланізуем літоўскую інтэлігенцыю. Рэч у тым, што калі мы, палякі, пачынаем вывучаць літоўскую мову, культуру, з павагай ставімся да літоўскай самабытнасці, то і літоўцы, хочучы нам адудзячыць, пачынаюць гаварыць па-польску! І выходзіць, што мы іх паланізуем!*» Хочацца пажадаць і беларускім палякам, каб пачалі паланізаваць нас, беларусаў, гэткімі метадамі, як іхнія

суродзічы ў Літве.

ЧАСТКА ДРУГАЯ

БЕЛАРУСЬ У БЕЛАРУСКІМ ПАЛОНЕ

«Tematy polsko-białoruskie» – гэта таксама зборнік тэкстаў 25 аўтараў з Польшчы, Беларусі, Літвы ды Нямеччыны. Кніга падзелена на тры тэматычныя блокі: «Гісторыя», «Літаратура» ды «Адукацыя». Рэдактар кнігі, Роберт Траба, напісаў караценькі, на паўстаронкі, тэкст пад назвай «Замест уступу: Польшчы патрэбна Беларусь»,

дзе адзначае: «*Урэшце, рэдка бывае, каб у суседняй краіне хтосьці знайшоў сваю «родавую» маёмасць. А Трабы насамрэч існуюць. Знаходзяцца яны ў Ашмянскім павеце недалёка мяжы з Літвою; праўда, тое, што існуе нейкая сувязь між намі – гэта казка*». А раз казка, то можам глянуць на гэтую сувязь як на пэўны сімвал: мястэчка Трабы і рэдактар Траба сімвалізуюць сумежжа,

спатканне
памежных
культур,
прынамсі,
трох –
польскай,
літоўскай і
беларускай.
Паспрабуем,
такім
чынам,
прыгледзецца,
як існуе
гэтае
сумежжа ў
розных
дыскурсах –
у дыскурсах
філосафаў,
гісторыкаў,
філолагаў,
сацыёлагаў і
іншых
разумных
людзей.
НА
ПАЧАТКУ
БЫЎ
БАБКОЎ…

Чалавечаму розуму патрэбна волава, а не крылы.

Фрэнсіс Бэкан

Бабкоў сапраўды быў «на пачатку», але не ў гэтай кнізе, а ў іншай рэчаіснасці. У «Tematach…» спадар Ігар зусім не на пачатку і нават не ў сярэдзіне. Яго філасофскі роздум змешчаны ў блоку «Літаратура», які знаходзіцца *паміж*

сярэдзінай і канцом кнігі. Ігар Бабкоў «быў на пачатку» ў іншым сэнсе: калі верыць Юрасю Пацюпу, то «*ён, Бабкоў, быў на пачатку беларускага постмадэрнізму*» (апрача самога Пацюпы, канечне ж). А як гэта было б па-грэцку: «En archē ēn Babkou». Ну, а раз Бабкоў быў *на пачатку*, г.зн. на «ARCHE», то хай яно так і будзе: пачнём ад рэфлексіі над «памежжам» і «паміжжам» Ігара Бабкова.

Той самы Юрась Пацюпа наракаў на Бабкова, што ён заўсёды «*нешта пярэчыць, нешта ўдакладняе. Ты пачнеш сцвярджаць гэта, а ён – тое, ты – тое, а ён – гэна і г. д.*». Што тычыць поглядаў самога Бабкова, то яны наагул «дыспазіцыйныя»: можна паўсюль згаджацца з ім без шкоды для ўласнага сумлення, а можна і паўсюль спрачацца, «удакладняць», «пярэчыць». Адначасна ж, трэба прызнаць, сярод спекуляцыйных філосафаў Бабкоў ці не самы дысцыплінаваны і паслядоўны ў сваім разуменні. Але, каб было цікавей, пры абмяркоўванні ягонага тэксту абяром другую тактыку: калі ён будзе сцвярджаць тое, мы – гэта, ён гэна – мы тое, дакладна як у Пацюпавай скарзе. Будзем рэалізаваць *respective dissent*.

Нашым заданнем ёсць, – піша на самым пачатку Бабкоў, – *выясніць значэнне пяці словаў, ужытых у загалоўку. Тры сярод іх – гэта паняткі, якія, згодна з доўгай традыцыяй еўрапейскай думкі, імкнуцца да універсальнага, незалежнага ад якіх-небудзь лакальных кантэкстаў, значэння. Гэтымі словамі з'яўляюцца: памежжа, этыка, транскультурнасць. Два астатнія словы ўтвараюць тэрмін, у абсягу якога абодва лакалізуюць сваё значэнне. Гэтым тэрмінам ёсць: «беларускі досвед».*

«Памежжа», «этыка», «транскультурнасць», «беларускі досвед» – вось тыя «Holzwege» («лясныя сцежкі»), па якіх нас вядзе беларускі філосаф у сваім роздуме. Кожны з гэтых паняткаў прэтэндуе быць «паняццем» у гайдэгераўскім разуменні: «уцелаўленнем», «увасабленнем», хочацца нават сказаць: «кантэйнерам» чагосьці нам непасрэдна не вядомага.

1. Спачатку асцярожна ўвойдзем у сферу «памежжа». Памежжа – гэта «*прастора, для якой мяжа ёсць элементам арганізавальным, сутнасцю быцця і цэнтрам прыцягнення. …Менавіта гэты дынамічны працэс адпавядае таму, што ў еўрапейскай думцы называецца сутнасцю, цэнтрам, прынцыпам, першай прычынай, Богам*». Крыху далей з'яўляецца такі прэдыкат адносна мяжы: «*Мяжа – гэта разарванне тоеснасці*» –

і такое сцверджанне: «*У прысутнасці мяжы сутнасці рэчаў з'яўляюцца найбольш адкрытымі, найбольш агрэсіўнымі*». Больш цытаваць пакуль што не будзем, бо і так ужо цямнее ўваччу ад гушчы універсаліяў.

Па-першае, зноў Пана Бога ўблыталі ў «цэнтр» і ў «першую прычыну». Па-другое, зноў маячыць «метафізіка сутнасці». Па-трэцяе, зноў тарнуецца забабон, што сутыкненне з *іншасцю* суправаджаецца агрэсіяй. Паспрабуем разабрацца. *Наконт першага:* ці не таму Валянцін Акудовіч у сваёй кнізе «Мяне няма...» так сварыўся з Богам і так брыдкасловіў на Яго, што Ён, Пан Бог, звязаўся з Першапрычынай → Цэнтрам → Уладай? Ёсць розныя версіі богааб'яўлення. Буду гаварыць пра такога Бога, якога я ведаю. Я ведаю Бога, які, аплёваны і пабіты, адкінуты сваімі і чужымі, стаіць перад Понціем Пілатам і кажа: «Так, я – Кароль». Ці не ёсць гэта найбольш дзейсная дэканструкцыя каралеўскай → абсалютнай улады? Ці не ёсць гэта пачатак Вялікай Дэцэнтралізацыі і эманцыпацыі маргінальнага, пагарджанага, *рознага*? «На пачатку было Слова». І гэтае Слова сталася *не* розумам, *не* духам – г. зн. прэстыжнай формай чалавечага быцця – і нават *не* целам («цела» гучыць яшчэ занадта прэстыжна). Яно, Слова, сталася... *саркс*. Саркс – гэта найбольш пагарджаная форма існавання, *цень* у юнгаўскім значэнні. Бог, якога я ведаю, не нарадзіўся ў цэнтры тагачаснага свету (Рым), і нават не ў цэнтры лакальнага свету (Ерусалім), Ён выбраў месцам нараджэння *хлеў*. «Прыгадванне-Бога-ў-Ягонай-спачатнасці» – гэта хіба найвялікшы выклік для паслясучаснасці. Ніцшэ зацята змагаўся з Богам-Цэнтрам, Богам-Уладай. А пасля гэтага змагання слушна сказаў: «Бог памёр». Слушна, бо Бога не было ў Цэнтры, ува Уладзе і нават не было ў Розуме. Ён *ад пачатку* быў у «саркс», у «хляве» і на «крыжы», г. зн. у Беларусі. Калі польскія ксяндзы пачалі даводзіць, што мова беларуская можа прысутнічаць толькі ў хляве, а не ў касцёле, я супакоіўся: усё ў парадку: Бог нарадзіўся ў хляве, а не ў касцёле.

Наконт другога: можна і трэба стасаваць метафару *мяжы* для інтэрпрэтацыі беларускай рэчаіснасці. Але нашто шукаць гэтую сакраментальную *сутнасць* мяжы? Няўжо нельга філасафаваць без палёту ў космас? Ну, бо каб вызначыць *сутнасць, эйдас, ідэю* чагосьці, трэба ўзняцца высока-высока, у панадмесячную прастору, бо толькі там – кажа Платон – месцяцца Сутнасці,

Эйдасы, Вечныя Ідэі…
Наконт трэцяга: гэта праўда, што некаторыя вельмі *баяцца* мяжы. А ад боязі да агрэсіі адзін крок. Але тое, што беларускі рэжым баіцца ўсяго *іншага* і *не(с)вядомага*, яшчэ не значыць, што боязь і агрэсія ў беларускім кантэксце – наканаванне. І ў Еўропе, і ў Беларусі развіваецца *культура любові* да таго, што Іншае, культура *культурнай любові*, без апрадмечвання і авалодвання.
2. «*Прэфікс* транс- *азначае пэўны дынамізм, рух* цераз *альбо* ўздоўж *пэўнае прасторы*», – так піша Бабкоў, характарызуючы «транскультурнасць». *«Транскультурнасць ставіць пад знак пытання нарматыўнасць сучаснай еўрапейскай утопіі – нацыянальнай культуры, культуры па азначэнні гамагеннай, самастойнай, межы якой супадаюць з палітычнымі межамі, культуры, дакладна адмежаванай ад суседніх»*. Беларускі філосаф не абмяжоўваецца абвінавачаннем Еўропы ва утапізме, гамагенізме і аўтаркізме, якія для паслясучаснасці ёсць смяротнымі грахамі, ён спісвае на рахунак еўрапейскай культуры нямала і іншых брыдкіх рэчаў. Сярод гэтых брыдкіх рэчаў – «*неакаланіяльныя практыкі Захаду*», аблуда Старога Свету, які пад шыльдай талеранцыі і плюралізму маскуе глыбокую абыякавасць да ўсяго *іншага*. Бабкоў таксама дэмаскуе філасофіі дыялогу Бубера і Бахціна, кажучы, што філасофія першага «*вырастае хіба з найбольш замкнёнай і непразрыстай жыдоўскай традыцыі*», а дыялагічнасць другога «*дзіўна кантрастуе з практыкай адной з найбольш нарцысічных культур свету – расейскай культуры…*». Ну вось, і хто гэта – паспрабуйма адгадаць – навучыў Бабкова ацэньваць паасобныя філасофіі праз прызму культуры, у якой яны паўсталі? Ці не савецкія марксісты пакінулі звычку ацэньваць філасофію (а таксама матэматыку, фізіку і біялогію) на падставе таго, дзе яна паўстала?
Трохі далей Бабкоў кажа, што беларускі культурны досвед суправаджаецца пачуццём непаўнавартасці і нават траўмы з прычыны «*недахопу моцнай, гамагеннай, нацыянальнай культурнай прасторы*». Мысляр тонка пакеплівае з роспачных намаганняў беларускіх культурнікаў «адчыніць вокны» на вялікую заходнюю нарацыю… Ізноў нарацыя. Тут буду злосны: згаданая «вялікая нарацыя» – гэта хутчэй прадукт вялікага ўяўлення крылатых філосафаў, чымся заходняя рэчаіснасць.

Бабкоў належыць да тых філосафаў, якія любяць «арыштоўваць» Еўропу і рабіць для яе «судны дзень». Вось пасадзілі гэтую Еўропу ў следчы ізалятар і цяпер заходзяць адзін за адным і пачынаюць *per fas et nefas* прымушаць гэтую Еўропу даваць паказанні: то прызнайся, што неталерантна навязваеш талеранцыю, то прызнайся, што пад спадніцай разнастайнасці хаваеш нейкую аднастайнасць, што няправільна вядзеш дыялог і г. д. І сядзіць маўкліва гэтая бедная Еўропа, не ведаючы, што сказаць ці што зрабіць, аж міжволі ўзнікае жаданне ўзяць ды заступіцца за яе: добрыя людзі, чаго вы хочаце ад гэтай Еўропы? Еўропа – гэта старая кабета, якая шмат чаго перажыла і напладзіла розных дзяцей – благіх і добрых. Калі вам не падабаецца Платонава «Палітэя», дык крытыкуйце гэтага Платона, калі вам не да спадобы Рэне Дэкарт і ягоны «логацэнтрызм», дык сварыцеся з Дэкартам, калі якісьці палітык каланізуе трэці свет пад шырмай лібералізму, дык давай здэмаскуем нягодніка, але навошта за кожным разам чапляцца да гэтай Еўропы і прыпісваць ёй няствораныя рэчы!
3. Пра «беларускі досвед» Бабкоў піша гэтак: «*Беларуская культурная прастора характарызуецца складанай структурай дзвюхкультурнасці: структурай, у якой – у межах напалову пэўнай, напалову акрэсленай цэльнасці – суіснуюць беларуская і заходнерасейская*». Калі б дыскурс Бабкова прэтэндаваў на апісанне беларускіх грамадска-культурных рэалій, то можна было б больш пільна прыгледзецца да гэтых катэгорый – «беларуская цэльнасць» і «заходнерасейская цэльнасць». Але, як мы ўжо мелі магчымасць пераканацца, філасофія Бабкова – гэта «палёт у космас», пагоня за Ідэямі ды Сутнасцямі, сузіранне вячыстых універсалій, а ад такой «велічнай» філасофіі няёмка патрабаваць эмпірычнай рэферэнцыйнасці…
4. Крайне коратка беларускі філосаф піша пра «*этыку памежжа*»: прысвячае ёй толькі тры сказы. Але, нягледзячы на гэтую лаканічнасць, чарговы раз паўстае пакутная дылема, які сказ працытаваць. На жаль, не стае ўжо філасофскай эмпатыі, бо ступень адарванасці і абстрактнасці такая высокая, што нават Ідэй, да якіх адносяць гэтыя сказы, не відаць.
Можа, лепшым выйсцем будзе сфармуляваць уласную *этычную* рэфлексію. На маю думку, можна вылучыць два тыпы філасофскага постмадэрнізму. Першы тып успрымае «мадэрну» як *поле вядомага*, перажытага, непасрэдна дадзенага.

«Мадэрна» для некаторых філосафаў – тое самае, што «фізіка» для старажытных грэкаў, а «пост-» – гэта не столькі «пасля», колькі «па-над». Такім чынам, «пост-мадэрна» – гэта транскрыпцыя «мета-фізікі», спосаб рэалізацыі досыць папулярнай патрэбы ў *эзатэрычнай*, нават *магічнай* ведзе. Існуе таксама постмадэрнізм, у якім «пост-» сімвалізуе нязгоду на ператварэнне мадэрны ў *эпоху*. Грэцкае *epochē* дакладна значыць затрыманне, запаволенне, упынішча; вось жа другі тып постмадэрнізму імкнецца пераадолець гэтае «затрыманне» і «запаволенне».
Калі Бабкоў сапраўды з'яўляецца постмадэрністам, то, несумнеўна, у першым значэнні.

* * *

Пасля «бітвы на вышынях», на якія нас зацягнуў дыскурс Бабкова, сыдзем у шэрую будзённасць беларуска-польскіх рэалій. Абмяркуем колькі эмпірычных даследаванняў, прысвечаных такім тэмам, як ідэі беларускасці, Рэч Паспалітая і Вялікае Княства Літоўскае ды праблема «тутэйшых». Зноў жа, выбар гэтых тэмаў прымушае нас абмінуць іншыя тэмы, як, напрыклад, жыды ў Беларусі ў другой чвэрці XX ст., гісторыя беларускіх жаўнераў у арміі Андэрса і інш. Не будзем таксама спецыяльна спыняцца на тэкстах з блоку «Адукацыя».

ЭМПІРЫЧНАЕ
ПАМЕЖЖА

Трэ злізаць усіх міністраў,
Бюракратаў, антыхрыстаў...

Цётка

Пра ідэі беларускасці пісаў беластоцкі гісторык прафесар Яўген Мірановіч. Множны лік тут невыпадковы, бо, як слушна заўважыў прафесар, «*няма адной ідэі беларускасці, няма таксама адной беларускай народнай міфалогіі*». Пішучы пра беларускасць унутры самой Беларусі, Мірановіч, гэтак як і Бабкоў, кажа пра дзве культурна-палітычныя тэндэнцыі, толькі не называе іх «цэльнасцямі»: *заходнерусізм* ды *незалежніцтва*. У конадзень распаду Савецкага Саюза пачалася эманцыпацыя незалежніцкага руху, што праявілася ў такіх дзеяннях, як «Ліст 28» (ліст артыстаў і вучоных да Гарбачова ў абарону беларускай культуры) у 1986 г., паўстанне «Талакі» ў Менску і

«Пагоні» ў Горадні і, урэшце, заснаванне Беларускага народнага фронту «Адраджэнне» пад канец 1988 г. Тым не менш, не хапала цвярозай ацэнкі сітуацыі, пазнякоўскае адраджэнне настолькі было сканцэнтравана на мінулым, што занядбала сучаснасць і будучыню. Тагачасны БНФ стаў на пазіцыі бескампраміснай антырасейскасці ды радыкальнага антыкамунізму. Адначасна значная частка адраджэнцаў на чале з Пазняком дыстанцыявалася ад заходняга лібералізму. Такім чынам, гэтая версія адраджэння сама сабе згатавала лёс «акружанай крэпасці» і пачала адпіхваць сваім агрэсіўным нацыяналізмам. «*Вера Пазняка ў калектыўную мудрасць народа пазбаўлена рацыяналізму ў той самай ступені, што і вера таго ж народа ў мудрасць «бацькі»*, – трапна заўважае Мірановіч.
У такой сітуацыі здабывае падтрымку папулісцкі аўтарытарызм Аляксандра Лукашэнкі. І тут, падаецца, беластоцкі прафесар не дужа клапоціцца пра тое, каб як мага больш трапна апісаць гэтае з'явішча: надта шмат у яго празмерна абагульненых і празмерна катэгарычных сцверджанняў. Ані ў культурнай, ані ў палітычнай сферы Мірановіч не бачыць сапраўднай канкурэнцыі для лукашызму. У культурнай сферы ён заўважыў толькі «Тутэйшых», ды і то зрабіў даволі павярхоўную выснову: «*Тутэйшыя» вельмі хутка захапіліся Захадам. Уцякаючы ад савецкага універсалізму, з разгону трапілі ў заходнееўрапейскі постмадэрнізм. А беларускі люд застаўся дома*». Па-першае, што яшчэ за «савецкі універсалізм», ад якога быццам бы ўцякалі «Тутэйшыя»? Цяжка сказаць, што яны ўвогуле ад чагосьці ўцякалі. Папросту рабілі спробу пераасэнсаваць існуючую рэчаіснасць, пераадолець, «перахварэць» саветызм. Па-другое, хутчэй можна паверыць у існаванне «квадратнага кола», чым у існаванне «савецкага універсалізму». А вось «савецкі патрыятызм», які характарызуецца хранічнай фобіяй універсалізму, сапраўды шчасліва жыве ў Беларусі, ягонай дэканструкцыяй «Тутэйшыя» і займаліся. Па-трэцяе, постмадэрнізм, хай сабе і заходнееўрапейскі, дазваляе эманцыпацыю ўсяго, што *лакальнае, мясцовае, тутэйшае* без утварэння рэвалюцыйна-агрэсіўнай атмасферы, якую стварыў калісьці пазнякоўскі Фронт.
Наконт палітыкі, Мірановіч абмяжоўваецца толькі цытатай Лукашэнкі: «*Такая апазіцыя мяне задавальняе*», ды дасціпнай іроніяй нейкіх менчукоў, што «*апазіцыя таксама магла б*

здрадзіць сваю найбольшую таямніцу, абвяшчаючы, што такі прэзідэнт яе задавальняе». Мірановіч пісаў гэты тэкст пару гадоў таму, але цікава было б ведаць, ці падпісаўся б ён пад гэтымі словамі пасля падзей, звязаных з сёлетнімі «выбарамі» і «рэферэндумам»; пасля таго, як збіты Анатоль Лябедзька апынуўся ў інвалідным вазку, непаўналетнюю Маргарыту Анцілеўскую скатавала міліцыя, а сотні апазіцыянераў апынуліся ў вязніцах. Пасмейвацца з гэтых людзей і фармуляваць дасціпныя звароты на іх адрас было б праявай цынізму і бесчалавечнасці.

Сваю дыягностыку сучаснага грамадска-культурнага стану ў Беларусі Мірановіч сфармуляваў пад выразным уплывам рэфлексій гарадзенскага паэта Алеся Чобата. А ў Чобата маем выразную перавагу эмацыйнага светаадчування над рацыянальнай рэфлексіяй. У Беларусі, трэба прызнаць, ёсць досыць шмат натхнёных прапаведнікаў і харызматычных крытыкаў. Нам патрэбна рацыянальная крытыка, а не харызматычная.

ГІСТАРЫЧНАЯ
БЕЛАРУСЬ
ПАД
СПАДНІЦАЙ
ЛІТВЫ І
ПОЛЬШЧЫ

– А хто там ідзе?

Янка Купала

Пра Рэч Паспалітую і Вялікае Княства Літоўскае пісалі гісторыкі з Варшаўскага універсітэта Антоні Мончак ды Войцех Тыгельскі і дырэктар віленскага Інстытута гісторыі Альвідас Нікжантайціс.

Гістарычная навука заўжды стаяла перад праблемай, як інтэрпрэтаваць гістарычныя факты. Тое, наколькі праблема інтэрпрэтацыі складаная, даводзяць даследаванні палітолага Андрэя Казакевіча, апублікаваныя ў «ARCHE» ды «Палітычнай сферы». Вось жа, рэфлексія згаданых трох гісторыкаў – Мончка, Тыгельскага і Нікжантайціса – тым цікавая, што папярэджана метадалагічнай рэфлексіяй, спробай пошукаў новых катэгорый, якія б лепш апісвалі і лепш тлумачылі гістарычныя рэаліі.

Антоні Мончак (ужо нябожчык) і Войцех Тыгельскі прэзентуюць амаль аднолькавую даследніцкую пазіцыю. Рэгулятыўнай ідэяй для іх ёсць пытанне пра прычыны слабасці канфедэратыўнай Рэчы Паспалітай у конадзень падзелаў. Пытанне пра «прычыннасць» варта ўспрымаць як прэтэкст для пераасэнсавання ўсяе рэчаіснасці, якая папярэднічала нейкім важным падзеям, якія зазвычай успрымаюцца як «вынікі». Першым крокам на шляху пераасэнсавання ёсць для польскіх гісторыкаў як мага паўнейшае выкарыстанне *параўнальнага падыходу*. У звязку з гэтым «*давялося адкінуць*, – піша прафесар Тыгельскі, – *эксплуатаваны дзесяцігоддзямі тэзіс наконт анармальнасці польска-літоўскіх саюзаў што да еўрапейскае нормы. Такой нормы, у чым Антоні Мончак так горача і паспяхова нас пераконваў, папросту не было*». Навукоўцы разбіваюць устойлівае (і выгаднае) перакананне пра «польска-літоўскую слабасць» у супрацьлегласць «моцы заходнееўрапейскага абсалютызму». Тым часам менавіта Францыю з яе абсалютызмам можна ўспрымаць як пэўны вынятак у Заходняй Еўропе: ані Англія, ані Нідэрланды, ані тым болей Італія не былі абсалютнымі манархіямі.
Трэба шукаць іншых прычын слабасці Рэчы Паспалітай. Такой прычынай – паводле Мончка і Тыгельскага – было выключнае дамінаванне ў дзяржаве толькі аднаго стану – шляхты. Пачатак гэтаму дамінаванню паклалі каралеўскія статуты XV ст., у прыватнасці Петрыкаўскі Статут 1496 г. Гэткая серыя свабод для аднаго стану і абмежаванняў для другога (мяшчанства) была выняткам у Еўропе. Чарговай прычынай слабасці польска-літоўскай дзяржавы была адсутнасць тэрытарыяльнай адміністрацыі, у выніку чаго мясцовае кіраванне аказалася ў руках шляхты і характарызавалася непрафесійнасцю і неэфектыўнасцю. Сярод іншых прычын – гаспадарчая адсталасць (збожжавая монакультура ды шляхецкая манаполія ў галіне гандлю) і неэфектыўная падатковая сістэма.
Асобна трэба падкрэсліць значэнне даследаванняў прафесарам Мончкам феномена, які атрымаў назву *кліентэлізму*. Гэтая тлумачальная катэгорыя з'явілася ў процівагу да іншай, дагэтуль вызнаванай, катэгорыі *магнацкай алігархіі*. Мончак і Тыгельскі падкрэсліваюць, што насамрэч не было ўстойлівага паразумення паміж пануючымі родамі, і таму тэрмін «алігархія» тут не пасуе. Арганізацыя ўнутранага палітычнага

жыцця ў Рэчы Паспалітай абапіралася, у асноўным, на нефармальныя сістэмы повязяў і залежнасцяў паміж магнатамі і шляхтай: магнаты бралі ў абарону «сваіх» шляхцічаў, а тыя, у сваю чаргу, гарантавалі сваім патронам лаяльнасць на публічнай сцэне. Такім чынам, у Рэчы Паспалітай маем справу не з «магнацкай алігархіяй», а з «магнацкім кліентэлізмам».
У Рэчы Паспалітай не было вырашана «казацкае пытанне», і гэта сутнасна аслабіла гэтую дзяржаву. «*Менавіта тады*, – кажа Тыгельскі, маючы на ўвеце XVI–XVII стст., – *Рэч Паспалітая Двух Народаў не сталася, хоць магла стацца, дзяржавай «трох народаў»*. Гэтая контрфактычная ўстаўка «хоць магла стацца» ёсць хутчэй за ўсё праекцыяй асабістага жадання навукоўца, бо насамрэч наўрад ці шляхецкая дзяржава ў XVI–XVII стст. была ў стане прайсці аж такую сур'ёзную трансфармацыю і правесці «ломку ментальнасці», каб выпрацаваць зусім новую канцэпцыю дзяржаўнага ладу. Ды і сам Тыгельскі крыху пазней адзначае «*вялікі супраціў польска-літоўскае шляхты, якая… толькі ў мінімальнай ступені была схільнай прымаць замежныя ўзоры*». Адначасна трэба памятаць і пра спецыфіку казацкай стыхіі. Расейскі філосаф і грамадскі мысляр Пётр Струве кажа пра свайго роду хранічны сепаратызм казакаў і іх бунтоўнае стаўленне да ўсякай дзяржаўнай улады, не толькі да ўлады Рэчы Паспалітай. Тым не менш, праўда, што «казацкі крызіс» ёсць добрым прыкладам, які паказвае вынікі палітычнай неталерантнасці і блізарукасці.
Гэта асноўныя пункты гістарычнай рэфлексіі двух польскіх гісторыкаў, хоць, трэба прызнаць, цяжка ў скароце прадставіць усе важныя тэзісы іх артыкулаў, а самім навукоўцам, у сваю чаргу, было цяжка ў кароткіх артыкулах змясціць усе свае метадалагічныя і інтэрпрэтацыйныя прапановы. Аднак, падаецца, нават кароткі агляд дае магчымасць заўважыць вагу гэтага навуковага падыходу.
Мяркую, што згаданыя даследаванні А. Казакевіча маглі б стацца дадатковым выклікам для метадалогіі Мончка і Тыгельскага: ці новыя падыходы, якія яны прэзентуюць, абумоўленыя іх палітычнай візіяй сучасных польска-літоўска-беларуска-ўкраінскіх стасункаў? У той жа час даследаванні польскіх гісторыкаў могуць стацца выклікам для самога Андрэя Казакевіча: ці сапраўды посткунаўская метадалогія (дакладней, антыметадалогія), у рэчышчы якой працуе Казакевіч, ёсць

апошнім словам? Цікава было б паглядзець, ці Казакевіч здолеў бы зрабіць рэканструкцыю палітычнай ментальнасці Мончка і Тыгельскага, якая абумовіла іх інтэрпрэтацыйны падыход. Тэкст літоўскага гісторыка таксама па-свойму цікавы, хоць часам паўстае ўражанне, што ён быў пісаны спехам, бо ёсць багата непатрэбных паўтораў, няясных месцаў і раз-пораз банальных сцверджанняў. Асноўны тэзіс А. Нікжантайціса – *насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага было асобным народам*. Тут, канечне, патрэбна ўдакладненне: народам не ў сучасным разуменні, а ў разуменні, уласцівым Сярэднявеччу і даасветніцкаму Новаму Часу. Літоўскі гісторык добра ўсведамляе і падкрэслівае наяўнасць гэтай розніцы, можа, нават перабольшваючы, кажучы, што паміж сярэднявечна-дамадэрнымі народамі і мадэрнымі народамі ляжыць прорва. Заўважым, што і сучасныя народы не з'явіліся *ex nihilo*, яны былі вынікам эвалюцыйнай трансфармацыі пачуцця калектыўнай салідарнасці, якое сфармавалася яшчэ ў эпоху прэмадэрных народаў.

Народ ВКЛ Нікжантайціс называе «палітычным народам», а разумее пад гэтым «*этнапалітычнае ўтварэнне, што ахоплівала палітычна актыўных прадстаўнікоў шляхты, якія характарызаваліся выразна акрэсленай нацыянальнай свядомасцю*». Усякі палітычны народ паўстае дзякуючы тром чыннікам: шляхце, духавенству і дынастыі. У ВКЛ, заўважае літоўскі гісторык, найболей было праблем з гэтым другім чыннікам – духавенствам і супольнай верай. Але аўтакефальныя тэндэнцыі ў праваслаўі, інспіраваныя Вітаўтам, а пазней, ад Фларэнційскага сабору (1439), унійныя тэндэнцыі сведчылі пра тое, што палітычны літоўскі народ сапраўды імкнуўся да ўнутранай еднасці і – што асабліва важна – рабіў гэта свядома.

Цікавая таксама этнічна-лінгвістычная рэфлексія Нікжантайціса. ВКЛ характарызавалася «трыадзінасцю» ў этнічным плане: пачаткова амаль выключна дамінавала літоўска-жамойцкая шляхта, потым разам з беларускай. Што тычыць моўнай праблемы (нагадаем, што моўны чыннік не меў першапланавага значэння для палітычнага народа), то літоўскі гісторык гаворыць пра наяўнасць трох мадэляў «роднае мовы»: лацінскай, літоўскай і сармацкай. Перавагу здабыла трэцяя, сармацкая канцэпцыя, якая палягала ў памяншэнні моўнага

чынніку, а падкрэслівала супольную гісторыю польскага і літоўскага палітычных народаў. Цяжка вызначыць на падставе тэксту Нікжантайціса, ці прысутнічала беларускамоўная мадэль у ВКЛ. Гісторык абмяжоўваецца толькі зацемам, што беларуская праблематыка «*застаецца адным з найважнейшых заданняў для далейшых даследаванняў палітычнага народа ВКЛ*».

Артыкул Альвідаса Ніжантайціса наводзіць на пэўныя агульныя рэфлексіі датычна беларуска-літоўскага памежжа. У ім выразна відаць, што інфляцыйны тэрмін «літоўскі», «літовец» зноў стварае нязручную сітуацыю: як ні імкнуцца беларусы замацаваць дыстынкцыю «літовец – ліцвін» (трэба прызнаць, штучна створаную), літоўцы не рупяцца, каб трымацца яе. З другога боку, заўважма, што літоўцы, у адрозненне ад саміх беларусаў, не маюць праблем, каб ідэнтыфікаваць гістарычных беларусаў: у вуснай і пісьмовай літоўскамоўнай традыцыі беларусы з няпамятных часоў існуюць пад назвай «gudai». Тым самым літоўцы нас пацяшаюць: беларусы, як этнас, сапраўды ўзніклі значна раней, чым назва «беларусы».

ТУТЭЙШЫЯ
– БЫЛІ,
ЁСЦЬ І
БУДУЦЬ

Мяне няма.

Валянцін Акудовіч

Быў. Ёсць. Буду.

Уладзімір Караткевіч

Паволі, паволі рухаемся з Усходу на Захад. Спачатку мы абмяркоўвалі Ігара Бабкова, найбольш усходняга аўтара кнігі, потым – больш заходняга Яўгена Мірановіча, кагадзе – Мончка, Тыгельскага і Нікжантайціса, якія ўжо напоўніцу належаць да заходняга свету, а цяпер пачытаем Ханса-Хрысціяна Трэптэ, навукоўца з Ляйпцыгскага універсітэта. І чым больш мы рухаемся на Захад, тым больш эмпірычнымі здаюцца даследаванні. Трохі парадаксальна, але менавіта нямецкі даследнік сутыкне нас з «найбольш эмпірычнай» (калі можна ступняваць эмпірычнасць) з'явай беларускай рэчаіснасці – тутэйшасцю. Пра тутэйшасць ужо даводзілася згадваць пры разглядзе «польскага пытання» ў першай частцы, а цяпер

прыйдзецца з ёю сутыкнуцца ў кантэксце «беларускага пытання».

«People in between», «terra incognita», «культурны вакуум» – Беларусь і беларусаў можна характарызаваць усяляк. Гэтыя рэалістычныя катэгорыі няўмольна наганяюць метафізічны настрой: пачынае прыпамінацца Анаксімандраў «апейрон», *coincidentia oppositorum* Міколы Кузанскага і юнгаўскія «не(с)вядомае», «цень», «аніма»:

У беларусаў і «тутэйшых», – піша Трэптэ, – *адсутнічае так званая катэгорыя самамадэрнізацыі (Selbstmodernisierung), якая з'яўляецца адной з асноўных умоваў фармавання нацыянальнасці этнічных групаў. Адсутнічае пачуццё ўласнай дзяржаўнасці, можна таксама адчуць недахоп адпаведнага правадыра-будзіцеля, вялікай дынастыі і інтэгравальных постацяў.*

Тутэйшыя характарызуюцца «шматузроўневай» тоеснасцю: палякі-рускія-саветы-беларусы. Адначасна, прыкмячае нямецкі славіст, ім уласціва аўтаідэнтыфікацыя паводле моўнага крытэру: «*Той, хто не гаворыць так, як мы, не належыць да нас*». Тое, што беларускія тутэйшыя дагэтуль не трансфармаваліся ў нацыянальную супольнасць, спрычынена пачуццём адчужанасці да палітычнай улады, якая генеравала залежную ад сябе культуру, таксама чужую і непрымальную для тутэйшых. У тутэйшых замацаваўся не толькі комплекс непаўнавартасці, але і «*комплекс прымусовай адаптацыі да ўсякіх палітычных, культурных і грамадскіх зменаў*». Пазбаўленая культурнага і палітычнага зместу, катэгорыя тутэйшасці ёсць праявай ізаляцыянізму, імкнення «*тварыць этнічнае гета… штучную блакаду і аддзяліць сябе ад навакольнага свету, уцячы ў абшар чыстай індывідуальнасці*».

Трэптэ звяртае таксама ўвагу на псіхалагічны аспект успрымання тутэйшых карэннымі палякамі: у іх (палякаў) «*паўстала пачуццё незразумеласці, дзіўнаватасці непрыемнай альбо смешнай для іхняга вуха іншай, хоць і блізкай мовы альбо дыялекту. (…) Моўныя адрозненні ўспрымаюцца часта як гумарыстычныя, парадыйныя… блізкая мова ацэньваецца як недаразвітая, нават прымітыўная форма высокаразвітай мовы*». Вартыя асаблівай увагі даследаванні Трэптэ вобразу тутэйшых-мужыкоў у польскай літаратуры: раз можна спаткаць вобраз ліберальнага мужыка, а часам тутэйшы прадстаўлены як «*просты, нецывілізаваны, нават прымітыўны жыхар, які жыве-*

вегетуе ва ўлонні цнатлівай прыроды» (з гэтай нагоды можна згадаць пра юнгаўскую «хтанічную істоту», якая бытуе ў недрах несвядомага). «*З другога ж боку,* – працягвае Трэптэ, – *гэта можа быць чужы, часам жорсткі і незразумелы мікракосмас*».

* * *

Тутэйшыя – гэта «бяспанская» маса, бяспанская ў культурным плане. З псіхааналітычнага гледзішча, тутэйшым можна прыпісаць прыметы, уласцівыя несвядомай сферы калектыўнай псіхікі: *негістарычнасць* у супрацьлегласць гістарычнасці, *стыхійнасць* проці цывілізацыі, *эмбрыянальнасць* супраць «народжанасці» – natio, *прастацкасць і бязмоўе*, якім адпавядае на свядомым узроўні элітарнасць і мова. Калі згадаць выказванні некаторых польскіх ксяндзоў пра «мову хлява» (беларускую) і «мову касцёла» (польскую), то можна заўважыць спецыфіку пэўных комплексаў: беларусы – гэта *праваслаўныя, Непраўдзівая Царква*, як процівага станоўчаму зместу на ўзроўні свядомасці: палякі – *каталікі, Праўдзівы Касцёл*. Гэтая асацыяцыя ўваходзіць у сувязь з больш старой, архетыпнай асацыяцыяй, якая можа быць выражана ў тэрмінах: *masa damnata, цёмная, праклятая маса* (беларусы), чаму адпавядае на ўзроўні свядомасці *«Civitas Dei» – Божы Горад, абраны народ* (палякі). «Польскі комплекс» і «беларускі комплекс» рэпрадукуюцца таксама дзякуючы іншым архетыпным асацыяцыям: *акрэсленасць* (Польшча) – *неакрэсленасць* (Беларусь), *форма – аморфнасць, воля – інертнасць, дух – зямля, матэрыя, cultura – natura.* Настойлівасць, з якою некаторыя палякі спрабавалі прынізіць беларускае адраджэнне на гарадзенскіх канферэнцыях, дае падставу падазраваць, што мы маем справу з *несвядомай праекцыяй*: яны так маскуюць уласную тутэйшасць і ўласнае прастамоўе.
Культурныя палякі, г. зн. палякі, якія ўвайшлі ў стадыю сучаснай нацыянальнай свядомасці, зазвычай з сімпатыяй ставяцца да беларускага адраджэння. Тое, што беларускія культурнікі зацікаўлены ў ператварэнні тутэйшых у беларускую нацыю, для іх цалкам натуральная і зразумелая з'ява. Нельга выключаць, што для пэўнай часткі тутэйшых польская культурная мадэль будзе больш натуральнай, чым беларуская, таму хочацца запрасіць і прадстаўнікоў польскай

нацыянальнай культуры, каб актыўна выходзілі з уласнай культурнай прапановай для тутэйшых.
У Беларусі суіснуюць прэмадэрнізм, мадэрнізм і постмадэрнізм. Значная частка беларускіх і польскіх эліт трывала і бескампрамісна спавядае мадэрнісцкую канцэпцыю нацыі, заснаванай на ідэалах (ідалах) Еднасці, Цэльнасці і Аўтаркіі. Ідал Еднасці, які багомяць мадэрністы, часта стварае нездаровую атмасферу: множацца неўратычныя лямантацыі (праз «слепату» і «няспеласць» народа), паэты прапаведуюць катастрофы і ўвогуле «канец свету», а філосафы прадукуюць таталітарныя праекты. «*Нават прарок і святар, нічога не разумеючы, бадзяюцца па краіне*», – як кажа Пісанне. Намнога здаравей было б палюбіць *différence*, якая здабыла папулярнасць сярод постмадэрністаў. *Différence* характарызуецца большай лагоднасцю і ветлівасцю, чым рэвалюцыйная *Unitas*. *Différence* дазваляе жартаваць разам з тутэйшымі, гуляць з імі і, галоўнае, уважліва іх слухаць, без настырнага маралізатарства і прымусовага асветніцтва.
У літаратуры працэс, мабыць, ужо пайшоў. Менскіх тутэйшых паспяхова асвойвае «прастамоўны інтэлектуал» Андрэй Хадановіч, «*зрабіць «вясковасць» беларускай культуры яе фірмовым знакам*» абяцаў Юрась Пацюпа. Варта было б у гэты працэс заангажаваць яшчэ палітыкаў, напрыклад, Аляксандра Лукашэнку, але ён, мабыць, не згодзіцца. Надта шмат мае работы.
Кракаў, лістапад 2004
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/5/25**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

[image]

крытыка [image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

Даніла Жукоўскі Асаблівасці каланіяльнае сацыялізацыі

начальнік цэху гарадзенскага шклозаводу. У вольны ад працы час піша крытыку для «ARCHE» і «Нашай Нівы».

Кнігі, якія аглядаюцца ў артыкуле:

С. Букчин. *Польский дневник.* Минск: Энциклопедикс, 2002. – 492 с.

С. Букчин. *Тайная свобода.* Минск: Энциклопедикс, 2004. – 520 с.

Цяжка прайсці безуважна каля трапнага выразу, і я, прачытаўшы артыкул В. Булгакава (ARCHE. 2004. № 5), паддаўся чарам чужога

красамоўства.
Добра, што і
рэцэнзаваны
аўтар, што
відаць з
назваў,
таксама не
вольны ад
гэтага граху.

Доўгі час я барукаўся з пытаннем, чаму шмат у чым выдатная «Тайная свабода» не прылягае да беларускае культурнае сітуацыі. *Чаму?* – думаў я, перачытваючы цудоўны нарыс пра апошнія публічныя выступы Уласа Дарашэвіча, які здолеў крытыку бальшавіцкага рэжыму выкласці пад маскаю лекцый пра газетчыкаў Вялікае французскае рэвалюцыі. *Чаму?* – здзіўляўся, зноў прабягаючы вокам па тэкстах, прысвечаных Лізавеце Паўлоўскай, Генадзю Кісялёву і аўтарам вядомых ананімных паэм.
Не прынеслі адказу і пранікнёныя радкі пра Васіля Быкава, Сяргея Пясецкага, Навума Кісліка, Тадэвуша Касцюшку, Ігара Герменчука. Шукаў, зноў і зноў перабіраючы змест, узіраючыся ў беларускія эпізоды з біяграфій расейскіх знакамітасцяў... Шукаў і не знаходзіў тлумачэння ў букчынскім аналізе польска-беларускіх, расейска-польскіх, яўрэйска-польскіх, беларуска-яўрэйскіх ды яўрэйска-расейскіх стасункаў – дарэмна.
Адказ быў прапісаны на вокладцы. Пушкінска-блокаўская *тайная свобода* – не з беларускага лексікону. Для расейскае культуры гэта стрыжнявы панятак. У ім – дачыненні творчае асобы і палітычнага рэжыму, пачэсная (бо ёсць і іншыя) роля інтэлектуала ў расейскім грамадстве. Але ў ягонага беларускага калегі тае спецыфічнае свабоды ў заўважальнае колькасці ніколі не было. Пахваляцца перад ім прыхаванаю свабодаю – што хлебам перад галодным.
Бо прыхаваная свабода, пра якую гаварылася ў славутай прамове, – не знакаміты беларускі кукіш у кішэні. Гэта дзіўны стан раўнавагі, калі ўлада не можа заткнуць непакорліваму творцу рот цалкам. Расейская культура існавала ў гэткім стане стагоддзі.
Метафара лёсу сумленнага расейскага грамадзяніна – турма,

нарыс пра гэта закрывае першы раздзел кнігі – «Даследаванні». «Тайная свабода» адлюстроўвае заняволенасць чалавека, але без неўнікнёнае пагрозы фізічнаму існаванню: прымус, як сказаў бы спадар Дракахруст, калектыўных уяўленняў у выкананні магутнага дзяржаўнага апарату. Лёс адукаванага свядомага беларуса лепш апісваецца іншай метафарай, якую, як тое не дзіўна, цягам ці не ўсёй савецкае і паслясавецкае гісторыі бязлітасна эксплуатуе афіцыйная плынь мастацтва. Метафара гэтая – жыццё пад акупацыяй. Жудасны стан выбару паміж горшым і найгоршым у імя малаверагоднага выжывання. Сумняюся, каб Францішак Аляхновіч меў нешта супраць прыхаванае свабоды, але неяк не атрымлівалася.

На памяць прыходзяць імёны тых, хто «абраў» для сябе нешта накшталт патаемнае свабоды. У гісторыі беларускае культуры яны выглядаюць па-рабінзонаўску. Язэп Драздовіч: амаль поўная адасобленасць ад культурнага працэсу, бадзянне па вёсках, жыццё ў чужых хатах. Мікола Ермаловіч: напрыканцы жыцця выдаў-ткі плён шматгадовае працы і меў нават магчымасць пабачыць яе ўплыў на грамадства. Ермаловіч – вынятак, Драздовіч – закон прыроды.

Кніга спадара Букчына, паўтаруся, добрая. Бліскучая крытыка танных папулярызатарскіх прыёмаў Кісялёва цешыць сэрца спалучэннем прынцыповасці і спачувальнасці. Нарысы пра беларускіх карэспандэнтаў Чэхава ды выступ Дарашэвіча радуюць багаццем старанна адабранага фактычнага матэрыялу, успаміны пра сучаснікаў кранаюць павагай і эмацыйным стаўленнем да выведзеных у іх людзей. Россып артыкулаў на размаітыя – ад геапалітыкі да бібліяфіліі – тэмы дамалёўвае партрэт культурнага чалавека, нашага, хай гэта банальна гучыць, інтэлігентнага сучасніка.

Адно што неяк цяжкавата называць яго нашым суайчыннікам. Нібыта і трэба (асабліва ўлічыўшы насычаны актуальнаю беларускаю праблематыкай «Польскі дзённік»), але шукаеш іншыя словы. Сямён Букчын – сужыхар нашае з ім Беларусі, суграмадзянін – бо гэта пытанне юрыдычнае. Але не аднадумца. Праблема ў свядомасці: у кнігах спадар Букчын выглядае жыхаром расейскае ўскраіны, грамадзянінам (нібы па кантрасце з Чэславам Мілашам) *Северо-Западного Края*.

Ён шматкроць цытуе словы Пушкіна пра беларусаў: «народ, издревле нам родной», і кожны раз ягонае *я* – дзе прыкметна,

дзе непрыкметна – зліваецца з пушкінскім. Гэта пра расейскую культуру ён нязмушана, ад чыстага сэрца кажа «ў нас» – і якраз-такі ў сувязі з тэмаю прыхаванае свабоды: «Пераадоленне турмы, фізічнай і духоўнай, разраслося ў нас у… велізарную інтэлектуальную з'яву…».

Букчын трымаецца класічнага расейскага падыходу, які добра ілюструе прытча пра індыйскага ўладара, які прымусіў мудрацоў даць адказ на пытанне: «Хто большы – я ці Бог?» Мудрацы выкруціліся, абвесціўшы: «Несумненна Ты, пане, бо можаш выкінуць нас са свайго царства, а Бог не можа – Ён паўсюль і сысці ад Яго немагчыма».

Вось жа, калі казаць пра расейскую турму і ейнае пераадоленне, то беларусам не чужая думка, што сысці з гэтае турмы можна і трэба, а пераадольваць яе расейцы і без нас могуць. Нямала пра гэта напісана: ад Ластоўскага да Дынька. Беларусам (прынамсі, некаторым) у гэткім выйсці бачыцца альтэрнатыва прыхаванай свабодзе, свабода сапраўдная і поўная. Можна спрачацца, колькі ў гэтым ідэалізму, колькі рэалізму, але відавочна, што для расейца гэта ерась. Яму няма куды сыходзіць. Таму і паўстала «велізарная інтэлектуальная з'ява».

Варта, як той сказаў бы, адцеміць, што для беларускага інтэлектуала стан прыхаванае свабоды недасяжны яшчэ і таму, што для ягонай рэалізацыі патрэбная мацнейшая інтэлектуальная традыцыя, большая незалежнасць творцы, трывалейшае ўсведамленне грамадствам важнасці ягонага слова.

У выніку беларускі інтэлектуал і «не можа», і «не хоча» прыхаванае свабоды. Яна, як любіў трыумфальна абвяшчаць Сяргей Дубавец, НЕ НАША. З сумам даводзіцца пагадзіцца. Можа, крыху пазней, калі паспяхова будзе працягваць сваю дзейнасць Валянцін Акудовіч, уразяць геніяльнымі творамі найноўшыя эмігранты, тады патаемная свабода народзіцца і ў беларускай культурнай прасторы. Імпартаваць яе туды з расейскае немагчыма, бо ў Расеі ейны грунт – патрыятызм, перакананне, што вялікая і прыўкрасная Расея не намі пачатая, не намі павінна скончыцца.

Для беларусаў такое кансерватыўнае стаўленне пакуль неактуальнае. Нам трэба не падтрымліваць існаванне, а будаваць сваю краіну, не пераадольваць, а перарабляць

асяроддзе, палягаючы больш не на моц традыцыі і назапашаныя продкамі культурныя скарбы, а на творчы патэнцыял і нявыкарыстаныя магчымасці развіцця. З сумам мушу зазначыць: пра гэта ў цудоўнай кнізе сп. Букчына я не знайшоў ані слова, ані намёку.

* * *

Несупадзенне пазіцый сп. Букчына з беларускаю інтэлектуальнаю традыцыяй адраджэнцка-незалежніцкага кшталту спрычынілася, як мне падаецца, да поспеху, па ягоным уласным выразе, «раману з Польшчаю». Формы інтэлектуальнага жыцця, ступень развіцця культурнае традыцыі нашых заходніх суседзяў, метады грамадскае рэфлексіі нашмат бліжэйшыя да расейскіх (асабліва ў іх маскоўска-пецярбургскім экспартным варыянце).

Гаварыць з палякамі сп. Букчыну лёгка, і ён з задавальненнем абмяркоўвае самыя розныя пытанні, не ў апошнюю чаргу – беларускія, уважліва і неабыякава сочыць за развіццём міждзяржаўных і міжнацыянальных кантактаў. Асаблівую ўвагу публіцыста (кнігу складаюць артыкулы для газет і часопісаў) прыцягвае досвед жыцця беларускіх эмігрантаў і гастарбайтэраў у Польшчы, тое, як жыццё ў польскім асяроддзі ўплывае на іхнія погляды і звычкі. Шмат старонак аддадзена пад аналіз польскага палітычнага досведу апошніх дзесяцігоддзяў.

Перад намі культурны суразмоўца, уважлівы назіральнік, праніклівы аналітык. Выклікае сапраўднае захапленне, як сп. Букчын пазбягае дыдактычна-ментарскага тону. Што праўда, пэўную ролю адыгрывае гістарычная дыстанцыя. Калі я ўпершыню пазнаёміўся з інтэрв'ю з Сакратам Яновічам «Грамадзянін Крынак», ягоная вальяжная нетаропкасць, спакойная няўважлівасць да надзённых тады дробязяў выклікала не толькі станоўчыя эмоцыі. За тры з лішкам гады ўсе падрабязнасці падзабыліся, і цяпер увага засяроджваецца на прагнастычных тэзісах, для якіх нарасла немалая база параўнання. І хаця яны не ўражваюць сенсацыйнымі прадбачаннямі, але і не вярэдзяць душу няспраўджанымі праронтвамі.

У «Польскім дзённіку» вельмі выразны празаходні настрой аўтара. Ён круціць раман не толькі з Польшчаю, але і бярэ

ўдзел у польскім рамане з Захадам, адначасна асцярожна (улічыўшы палітычную сітуацыю, навошта спяшацца) прымяраючы польскі варыянт да Беларусі. Яму цікавыя ўсе аспекты несавецкага жыцця: ад працоўных адносін і прафсаюзнага руху да мастацтва і палітыкі. У полі зроку не толькі Польшча, але – праз прэсу – увесь абшар на захад ад Берасця і Горадні.

Апынуўшыся на адлегласці ад Беларусі, сп. Букчын нарэшце заняў пазіцыю, якая з беларусацэнтрычнага гледзішча найбольш адпавядае ягонай пастаце. Зменшылася да незаўважальнасці неадпаведнасць паміж ягонай нутранай аддаленасцю ад духоўнага жыцця нацыі і прафесійнай уцягненасцю ў яго. Выйшла на першы план непадробнае жаданне дабра і поспеху Беларусі і беларусам. Адпала патрэба шукаць няіснага кампрамісу ў адначаснай прыналежнасці (паводле ўзроўню ўсвядомленых абавязкаў гэта можна параўнаць з грамадзянствам) да расейскае культуры і да беларускага грамадства. Засталася прышчэпленая творамі Чэхава і Талстога павага да думкі і прыхільнасць да высокіх этычных стандартаў.

Немалую ролю адыгрывае і захапленне Польшчаю. Не ўсё ў гэтай краіне цудоўна, але пяро Букчына засяроджваецца на тым, што можа служыць узорам для беларусаў, тым, з чаго жыхары нашае краіны могуць выцягнуць для сябе параду і прыклад. Нават апісваючы цяжкую для палякаў тэму разні ў Ядвабне, дзе ў Другую сусветную вайну адбылося масавае забойства палякамі сваіх суседзяў па мястэчку – яўрэяў (яўрэйская тэма заўсёды ў полі ўвагі публіцыста, але не замінае, як гэта часам здараецца, развіццю іншых), Сямён Букчын робіць націск на цывілізаваны характар дыскусіі, на здольнасць і прагу палякаў вырашаць складаныя праблемы нацыянальнага сумлення.

Памыліцца аднак той, хто пабачыць у адрознасці паміж «Тайнай свабодай» і «Польскім дзённікам» эвалюцыю поглядаў аўтара. Эвалюцыя, магчыма, ёсць, але не настолькі простая. Дзве гэтыя кнігі хутчэй як дзве праекцыі на чарцяжы: кожная паасобку не ў стане перадаць усе асаблівасці канструкцыі (часам і трох праекцый недастаткова, у ход ідуць разрэзы, вынаскі ды іншыя хітрыкі).

Нутраны свет Сямёна Букчына ані ў якім разе нельга

характарызаваць словам «прымітыўны». Тут не толькі ягоны дваісты патрыятызм і спалучаныя з гэтым культурныя і этычныя дылемы. На першым месцы – высокі ўзровень асабістае культуры, які не дазваляе задавольвацца недасканалымі рашэннямі, непадробная прага культуры, якая супраціўляецца ўсялякім штучным абмежаванням.
Не было б у спадара Букчына патрабавальнасці да сябе як навукоўца, ён лёгка мог бы зрабіцца бесклапотным прадаўжальнікам лініі Абэцэдарскага. Не прасякнуўся б ён ідэаламі, прапагандаванымі светачамі расейскае культуры, – цалкам мог бы стаць побач з апантанымі інтэгратарамі-антызаходнікамі. Меў бы слабейшую культуралагічную падрыхтоўку – сам сабою апынуўся б у шэрагах настальгоўцаў па савецкім мастацтве.
Але лёгкія шляхі маюць відавочныя для чалавека ягонага ўзроўню пасткі, і, агледзеўшыся, ён пачынае блукаць і балансаваць, спрабуе палагодзіць супрацьлегласці. Букчын не хоча адмаўляцца ад беларускіх (яўрэйскіх, польскіх) кампанентаў свайго ўнутранага свету, бо расейская культура навучыла яго, што даражэйшага за гэты свет у чалавека нічога няма. Ён імкнецца да дасканалага вырашэння, і хай дасканаласць ніколі не асягаецца, справаздача аб працэсе пошукаў мае пэўную каштоўнасць для вонкавага назіральніка (у дадзеным выпадку – чытача) незалежна ад таго, у якой ступені ён падзяляе думкі і каштоўнасці аўтара.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

[image]

крытыка [image]2005

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ВОЛЬФ РУБІНЧЫК

Вольф Рубінчык Балота ці трагедыя?

Кнігі, якія аглядаюцца ў артыкуле:

С. Букчин. *Хроника суверенного болота*. – Минск: Европейское время, 1996. – 432 с.

С. Букчин. *Белорусская трагедия*. 1986–1999. – Варшава, 2000. – 632 с.

С. Букчин. *Польский дневник*. – Минск.: Энциклопедикс, 2002. – 492 с.

С. Букчин. *Тайная свобода*. – Минск: Энциклопедикс, 2004. – 520 с.

Хоць гэтыя чатыры кнігі і розняцца паводле фармату, аб’ёму, накладу, яны шмат у чым падобныя – нібы тамы з будучага

збору
твораў. Па
праўдзе,
чаму б
кандыдату
філалагічных
навук,
1941 г.
нараджэння,
які ў
«застойныя»
гады
апублікаваў
серыю кніг
пра
дзекабрыстаў,
Чэхава, Льва
Талстога etc.
не выдаць
такі збор?
Яднае кнігі
стыль:
«пошук
чалавека»
суправаджаецца
ўсплёскамі
іроніі ды
інвектывамі
на адрас
тых, хто
чалавечую
існасць, па
версіі
аўтара, так
ці інакш
прыніжае.
Загалоўкі са
словамі
«хроніка»,
«дзённік»

раскрываюць
яшчэ адну з
аўтарскіх
задумак –
рэгістрацыю
падзей.
Літаратар і
літаратуразнаўца
пайшоў у
хранікёры, а
значыць, і ў
гісторыкі,
беручы на
сябе
дадатковую
адказнасць у
параўнанні з
тым уяўным
калегам,
каго ён
называе
«малакультурным,
малапісьменным
мешчанінам,
што папёр у
журналістыку».
Аўтар
тлумачыць
сэнс сваёй
журналісцкай
работы
проста: «Як
многія
іншыя
літаратары,
я яшчэ ў
перабудовачныя
гады
рынуўся
непасрэдна

ў публіцыстыку, бо накіпела, хацелася выказацца, урэшце, верылася ў добрыя перамены і неабходнасць асабістага ў іх удзелу» («Польскі дзённік», с. 482). У гэтым плане названыя кнігі с. Букчына, а перадусім тры першыя, – плён перабудовы: ня столькі суцэльнага працэсу, абвешчанага Гарбачовым у 1985 г., што ўключаў у сябе і «паскарэнне», і барацьбу з п’янствам, і шмат чаго падзабытага накшталт «вяртання да ленінскіх

нормаў»,
колькі
«галоснасці»
з яе
падкантрольнай
разняволенасцю,
калі наклад
газеты
«Знамя
юности»
сягаў
паўмільёна
асобнікаў,
але
фінансавыя
лейцы ўсё-
ткі
знаходзіліся
ў руках
аслабелай
«партнаменклатуры».
Разняволенасць
выяўлялася
ў атаках на
«бюракратаў»,
якія не
жадаюць
«жыць па-
новаму», а
дазволеныя
рэфлексіі на
тэму дабра і
зла былі
аддушынай
пасля доўгіх
гадоў
амаральнасці.
Здавалася,
логас рабіў
гісторыю;

неўзабаве
пасля
выкрыцця
заганаў на
шляху
«рэформаў»
на
тэрыторыі
шостай
часткі сушы
мусіла
надысці
«царства
свабоды»...
Зрэшты,
утапізм
тагачасных
«*Огоньков*» –
асобная
тэма. Рэдкая
птушка
перабудовачнага
часу
даляцела да
суворых
часоў
беларускай
рэчаіснасці
пачатку XXI
ст. – хто
з'ехаў за
мяжу, хто
змяніў
сферы
прыкладання
сілаў… Тым
цікавей
«паглядам
акінуць
шлях»,

пройдзены
побач з
аўтарам.
Пагатоў што
ён і
запрашае
«азірнуцца…
не ў гневе, а
з
высакамерным
жаданнем
зразумець»
(«Хроніка», с.
4).

1. ТУГА ПА «ЕЎРАПЕЙСКІМ ЧАСЕ»

«Хроніка суверэннага балота» – набор размаітых артыкулаў, надрукаваных, галоўным чынам, у газетах «Знамя юности», «ЛіМ», «Литературная газета» часоў перабудовы і першых гадоў незалежнай Беларусі. Некалькі тэкстаў узяты з перыёдыка «Европейское время», заснаванага с. Букчыным пры дапамозе фонду Сораса ў 1992 г. Яна выходзіла да 1995 г., і падобна, што на яе старонках погляды с. Букчына адлюстроўваліся найбольш поўна і ясна. Будучы, паводле прызнання рэдактара, «заўчасным выданнем», «газетай-марай», яна знікла, пакінуўшы справаздачу аб зробленым – кнігу з адмыслова правакацыйнай назвай. Правакуе аўтар і зместам – чырвонай ніткай паўз добрую палову артыкулаў праходзіць спрэчка з «нацыяналамі», яны ж – «нацыянальна арыентаваныя». Стыль допісаў сведчыць, што іх аўтар добра засвоіў урокі дарэвалюцыйнага «караля фельетонаў» Уласа Дарашэвіча, кнігу якога ён кагадзе адрэдагаваў[1]. Каму толькі не навязваў дыскусію с. Букчын у канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг., закідаючы «нацыянальную абмежаванасць» і/альбо «правінцыялізм»… Лявон Баршчэўскі, Вольга Іпатава, Зянон Пазняк, Алег Трусаў, Павел Церашковіч, Яўген Цумараў, Віталь Цыганкоў… Гэта далёка ня поўны пералік тых, хто «трапіў пад раздачу». Цяпер даўнія дыскусіі з імі выклікаюць амаль замілаванне – і знаходзіўся ж імпэт на

такія рытарычныя фігуры, як «чаму такі недавер, Лявон Пятровіч, да ісцінна дэмакратычных сілаў Расеі?», «скажыце, Павел Усеваладавіч, каму канкрэтна вы збіраецеся вяртаць гэты «доўг насілля»?»[2].

Другая кніга названа не менш контраверсійна і ўяўляе сабой… збор газетных выцінак з калекцыі складальніка. «Нейкая накшталт публіцыстычнай сімфоніі», – так прэзентуе кнігу Букчын у прадмове. Як на густ аматара публіцыстыкі, сімфонія трохі зацягнутая (рэдкі аматар вытрывае 600 старонак газетных тэкстаў), як для даследчыка – аўтар спрашчае карціну найноўшай гісторыі, падаючы безліч газетных мікрадумак аб асобных праблемах беларускай рэчаіснасці, аднак замоўчваючы іншыя, дапускаючы скажэнні пры перадачы інфармацыі[3] … «Так, гэтая кніга дастаткова суб'ектыўная», – прызнае складальнік (с. 8). Паміж тым артыкулаў, згрупаваных па тэмах, трапляюцца сапраўдныя каментары с. Букчына накшталт: «Сп. Якубовіч не можа ўявіць сабе, што ёсць людзі, да яго непадобныя, – якія дзейнічаюць не па разліку, а па сумленні» (с. 327). З пазіцый 2000 г. ён дае ацэнку выказваннях пачатку 1990-х гг., грунтуючы над публіцыстам, які лічыў, што беларускай дзяржаве патрэбны інстытут прэзідэнцтва: «Ну адкуль у нас, такіх талерантных, возьмуцца дыктатары! Таму няхай будзе прэзідэнт!.. не спадабаецца – адправім у адстаўку» (с. 80-81). Няма чаго казаць, наколькі падступнай гучала «працэсуальная пазіцыя», бо можа быць лёгка звернута і супраць складальніка[4]. «Мы», на думку с. Букчына, «не змагаліся за незалежнасць», якая «упала на нашы галовы зусім не чакана». Гаспадарожданы ідэямі, у якім праўда толькі тое, што незалежнасць звалілася нечакана на галаву яго рэтранслятара і, магчыма, мікрагрупы, з якой ён сябе атаясамлівае. Кніга прызначана найперш для замежнага чытача, якому «нішто кардынальна у газетных ландшафтах Еўропы за апошнія 10 гадоў не змянілася» (с. 5). Усе думкі, выказаныя ў кнізе, аўтар «адаслаў бы з рук *famous Belorussian writer and journalist*» (назнака на вокладцы). Праўда, і беларус, які цікавіцца нядаўнім мінулым, пры жаданні знойдзе нямала карыснага у дабраных публіцыстычных радках – таго, што ўжо пачынае забывацца. Даведаецца, напрыклад, што дэпутатка Нацыянальнага сходу Вольга Абрамава ўвосень 1996 г. была апантанай прыхільніцай імпічменту А. Лукашэнкі. Убачыць, што Лукашэнка запазычыў многія прыёмы рыторыкі

[1] Тытульная старонка кнігі. Тут і далей пазначаны толькі нумары старонак.

[2,3] разважанняў этнолага П. Церашковіча пра которые спавернутага гвалту» была зроблена паспешлівая выснова пра абгрунтаванне навукоўцам міжэтнічнай варажнечы («Хроніка», с. 199). Аматары аналагічных высноў здольныя напэўна, знайсці абгрунтаванне гвалту ў тэзісе с. Букчына пра беларускую незалежнасць: «тое, што здарэцца не нас з неба ў канцы 1991 г., патрабуе ахвяр сёння» («Беларуская трагедыя», с. 620).

[4] На нашу думку, апублікаванне ў 1996 г. уласных артыкулаў канца 1980-х з выразамі накшталт «Не так уже шмат часу застаюся да XIX партканферэнцыі. Усе думкі – аб ёй» («Хроніка», с. 48) ці заклікам да «ідэалагічных работнікаў, арыентаваных на «ленінскую культуру зносін з народам» (с. 58) не пазбаўлена сатырычна-публіцыстычнага характару.

«нацыяналаў»: гэтак, у 2004 г. яго кампанія будавалася нібыта на разважаннях с. Дубаўца пачатку 1990-х: «Які аптымальны крытэр нашай кансалідацыі? Такі крытэр ёсць: мы – за Беларусь».

Нельга не адчуць мінорнага тону абедзвюх кніг. Нават іх загалоўкі – «Балота», «Трагедыя» – гучаць як дыягназ. А доктар хто? – напрошваецца пытанне. Нашай мэтай не з'яўляецца лавіць аўтара на памылках, але ўсё ж трэба заўважыць, што яго высновы ў першай палове 1990-х гг. рэдка адрозніваліся праніклівасцю. Кебічаўскі лад у чэрвені 1994 г. ён ацэньваў як «таталітарна-наменклатурную сістэму» («Хроніка», с. 277), што, урэшце, не дзіўна, калі браць пад увагу апакаліптычны настрой большасці тэкстаў. Выступленне на з'ездзе «руху дэмакратычных рэформаў» у лістападзе 1991 г.: «*Або мы прымаем нормы чалавечага супольнага жыцця, або спараджаем разнастайныя формы «гамсахурдзізму» з усімі адпаведнымі «асеціямі», «карабахамі», «чачэніямі*». На думку с. Букчына, менавіта з боку тых, хто надае «нацыянальнаму пытанню» гіпертрафаванае значэнне, зыходзіла галоўная пагроза беларускаму грамадству ў год абвяшчэння незалежнасці («Хроніка», с. 189–190). Эмацыйны прагноз, заснаваны на простай аналогіі, мог адно падрыхтаваць глебу для прыходу таго, хто напісаў на сваім сцягу «стабільнасць перадусім».

Калі тлумачальныя схемы кульгаюць, на першы план выходзіць найпрасцейшае абгрунтаванне дзеянняў тых, хто трапляе пад агонь крытыкі, – славутае «Есці хочацца!», паўторанае шматкроць у тэкстах розных гадоў («Хроніка», с. 279, 285, 354, 355). Скрушна чытаць крытычныя нататкі пра «плебея Лукашэнку» ў артыкуле за ліпень 1994 г. («Беларуская трагедыя», с. 279). Павярхоўнасць і безадказнасць такога тыпу разважанняў мажліва было адзначыць і адразу па абранні першага прэзідэнта. Найбольш крыўдным з'яўляецца тое, што тэзіс с. Букчына быў, хацеў таго аўтар ці не, развіты дзесяткамі, калі не сотнямі беларускіх ды замежных публіцыстаў, што зацьміла сапраўднае аблічча А. Лукашэнкі і, верагодна, дапамагло яму здзейсніць тое, што здзейснена ўвосень 2004 г.

Драматызацыя якой-кольвечы падзеі – нармальны прыём для

журналіста. Аднак з цягам часу пафасныя тэксты застараюць і чытаюцца не без цяжкасці. У дадзеным выпадку па іх прачытанні просіцца сцёртая метафара: аўтар, нібы той пастух, крычаў «ваўкі!», а ваўкі прыйшлі ня ў час і з іншага боку. Робіцца выгляд, што так і было прадказана, што менавіта «нацыяналы» бязглуздымі заявамі і ўчынкамі справакавалі прыход Лукашэнкі – выснова, на якой аўтар настойваў яшчэ ў сярэдзіне 1990-х гг. («Беларуская трагедыя», с. 343), салідарны з першым прэзідэнтам, які не раз прызнаваўся ў тым, што «гвалтоўная» беларусізацыя дапамагла яму прыйсці да ўлады. Доля ісціны, як у кожным міфе, тут невялікая – яе дакладнае вызначэнне выходзіць па-за межы гэтага водгуку. Ва ўсялякім разе, напярэдадні выбараў 1994 г. скасаванне вынікаў «беларусізацыі» не было галоўнай тэмай у выбарчай кампаніі А. Лукашэнкі.

Дыскусія на старонках «Народнай волі» і «Нашай Нівы» аб амаральнасці «супрацоўніцтва з уладамі», што разгарнулася ў канцы 2003 г.[5] , дала нямнога плёну ў тым ліку і таму, што ініцыятар не здолеў адмовіцца ад наўмыснай драматызацыі становішча. Ізноў было паўторана, што ад пачатку 1990-х гг. у Беларуссю адбываецца трагедыя і пазітыўных зрухаў чакаць не варта. Аўтары і ідэолагі «Нашай Нівы» па традыцыі клеймаваліся с. Букчыным як «нацыянальна абмежаваныя», выстаўляліся як замшэлыя дагматыкі, якіх вышэйзгаданая «трагедыя» нічому не навучыла. Калі сутнаснага паразумення ў такім рэчышчы дасягнуць наўрад ці магчыма, то фармальны дыялог адбыўся праз пасрэдніцтва радыё «Свабода». І хочацца верыць, што ён наблізіў бакі да ісціны.

[5] Гл.: Букчын С. Старыя і новыя беларусы // Народная воля. 2003. 30 снежня; Дзмітрыеў А. Драматыя і трагічныя ілюзіі // Наша Ніва. 2003. 26 снежня.

[6] Гл.: Хто падвядзе «тлустую рысу?» // Народная воля». 2004. 23 студзеня. Катэгарычнае меркаванне с. Букчына аб тым, што «наша краіна цалкам падпарадкавана расейскаму КДБ, расейскаму войску, расейскай уладзе» само па сабе «падводзіць тлустую рысу» пад усімі дыскусіямі.

[7] Такіх «дзённікаў», якія не зводзіліся б да падарожных нататак, у сучаснай беларускай літаратуры нямнога. Нягледзячы на ідэалагічныя устаўкі, дагэтуль уражвае аповед А. Кобец-Філімонавай аб Грэцыі «У каралеўстве… але не

Кніга «Польскі дзённік» – бадай, наймацнейшая з чатырох. Аўтар звяртаецца да фактаў жыцця краіны-суседкі, фактаў прыводзіць многа, і яны маюць бясспрэчную каштоўнасць (хоць часам у іх падборы адчуваецца ўсё тая ж «суб'ектыўнасць» без ухілу ў апалагетыку – можа быць, таму, што выданне кнігі спансаравана Інстытутам Польскім). Польшча апісваецца і знутры, і звонку, але – з гледзішча беларуса, зацікаўленага ў

недаацэнены Ё.У. (1968). не «еўрапейца», які выпадкова апынуўся ў
«У Беларусі дасюлета тузін сінагог, у 1990-я гг. паўстала
некалькі дзесяткаў помнікаў яўрэям – ахвярам гітлераўскага
генацыду. На жаль, у пытанні пра стаў яўрэяў у Беларусі
прынцып «тым горш – тым лепш», прынсаны е. Бук-ным
«беларускай анаміі» («Польскі дзённік», с. 223), скарыстаны
напоўніцу. Павярхоўным, апрочтага, выглядае уключэнне кнігі
амерыканскага прафесара палітлогіі Ч. Фінкельштэйна
«Індустрыя халакосту» у пералік «антысемітаў» (с. 287).
Насамрэчэна прысвечана прысабе пытанню крадзяжу асобных
амерыканскіх яўрэйскіх суполак права на дыскурс пра
катастрофу еўрапейскага яўрэйства, нелегітымнаму, на думку
аўтара, цэнтра ў швейцарскіх банках, неспраўдліваму падзелу
грошай для захавання халакосту і т. д. Тое, што пазнымі фактамі
з кнігі скарыстаўся антысемітызм, яшчэ не аргумент, каб
стыгматызаваць ейнага аўтара.

«Мы былі на-свойму шчаслівыя, калі нічога не ведалі, што дасягаткова
правесці сапраўдныя выбары, ліквідаваць манаполію КПСС,
увесці рынкавыя адносіны, садзейнічаць прыходу да ўлады
добрых, прыстойных людзей – і надыдзе царства дабра,
справядлівасці і дэмакратыі. А яно вунь як абярнулася!» –
скардзіцца аўтар карэспандэнту «Народнай волі» у 2001 г.
(«Польскі дзённік», с. 482). Імя аўтара інтэрв ю – А. Корзуна – у
кнізе апушчана.

Аўтар гутарыць з блізкімі па духу людзьмі – і прадукуе
дыялогі, насычаныя каліне глыбокімі думкамі, то, прынамсі,
дасціпнымі «падколкамі». Так, запамінаюцца гутаркі з экс-
дысідэнтам, славістам Анджэем Дравічам, пісьменнікам
Сакратам Яновічам. Размовы ж з палітыкамі вядуць да
нагуравашчання банальнасцяў і павярхоўных меркаванняў:
«Беларусь сама выбрала свой шлях. Яна яднаецца з Расеяй...»
(«Тайная свабода», с. 241–242). Ці не правобраз сённяшніх
гора-апазіцыянераў, што намагаюцца разбіць муры чужымі
галовамі?

11 Прынiжэнне «сакральнай каровы», верагодна, паклікана
апраўдаць уласную прынцыповую згоду з «правіламі гульні» у
«рынкавых рэформах». Пэўная перадузятасць у духу
1970-я гг. («бо усе былі такія»). Мастак М. Шамякін казаў пра
дамаросłых лібертарыянцаў... Ці так ужо было абавязкова
У. Высоцкага: «Быў ён паводле сваіх перакананняў савецкі ці.
закідаць польскім прафсаюзам, якія не жадалі «лібералізацыі»
антысавецкі? (...) Думаю, хутчэй за усе, не быў ні першым, ні
працоунага заканадаўства, эгаістычную пазіцыю (с. 319)? Але ж
другім. Высоцкі папросту не пераносіў зла і несправядлівасці у
не гэта галоунае у кнізе, прасякнутай аутэнтычным досведам
любых праявах».
грамадзяніна Беларусі, які доўгі час жыў за мяжой і ўважліва
12 Мянчанін Леў Лісіц быў арыштаваны і асуджаны да
вывучаў «іх норавы».
турэмнага зняволення не ў пачатку 1970-х гг., а пасля прыезду

Выхаванцы Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта (Я. Лісецкая, 1998 г.) ёсць і ў кнізе «Сем сорак» (Мінск, 1992. с. 94–95)[11]. У «Хроніцы суверэннага балота» (с. 16–17) с. Букчына фактычна апрацоўвае сваю адмову ад яўрэйскага імя і падаведнага запісу ў пашпарце паводзінам дзяржавы, якая шмат чаго не дазваляла яўрэям у СССР.

Тыповым для стану навукі ў тэмах і падыходах «даследавання» з. Дарашэвіч на якой трунтуецца на апытанні 1988 г.: Дорошевич Э. Евреи в Беларуси (историко-социологический анализ) // Динамика социальных процессов в условиях государственной независимости Беларуси. социологический анализ. Вып. 2. – Минск: Право и экономика, 2000. с. 71–74.

На старонках «Тайнай свабоды», што складаецца з разнапланавых «росшукаў» (вынікі некаторых з іх былі апублікаваныя яшчэ ў 1980-я гг.), «эпюдаў», рэцэнзій, некралогаў, адбываецца вяртанне на рэальную, блізкую аўтару глебу. Канечне, шмат чаго карціць адпрэчыць «з ліста»[10] , параней шаму многа фігур умаўчання. Тое, што большая частка матэрыялаў трапіла ў кнігу з газетных старонак, відавочна, аднак спасылкі на «Белорусскую газету», «Народную волю», у адрозненне ад ранейшых зборнікаў, з нейкай прычыны выпалі. Чаму разняволены пясняр Высоцкі, якому выпала жыць у СССР, у с. Букчына стаў «самым савецкім з нас» (с. 276), мне не было зразумела ні ў 1998 г. (год публікацыі ўрыўка ў перыёдыку

[13] У набыцці «кнігі» ці «кнігаў» (с. 16) ёсць і «сэнс», і «сэнсы», і «сэнсаў», і «сэнсам», і «сэнсамі», і «сэнсах». Яны ўлічаны ў «Хроніцы» (с. 193).

[14] Зноска на с. 404–407, 415.

[15] Гэта «Бурка», «Гайнуе», «Гарбата», «Дзяўчынка», «Дзяўчынка», «Дзяўчынка

«Белорусская газета»), ні ў 2004 г. Тэзіс с. Букчына яўна вымагае больш глыбокай аргументацыі, чым пададзеная ў кнізе (маўляў, Высоцкі апяваў савецкі побыт, як ніхто іншы)[11] . Прыблізнасць звестак пра канцэрт Высоцкага ў Менску («здаецца, у пачатку 1970-х гг… завязаўся нейкі скандал з білетамі… асудзілі аднаго кніжнага актывіста») сведчыць пра тое, што рамяством гісторыка сучаснасці аўтар валодае далёка не ў той ступені, як пяром публіцыста[12] . І ў іншых месцах хапае накладак: сумна на пачатку XXI ст. чытаць, што ў Беларусі «адзіная мячэць» (с. 480). Ужо на момант напісання рэцэнзіі на польскі даведнік 1997 г. мячэцяў у Беларусі было, як мінімум, дзве. Паэт Веньямін Айзенштат памёр у 1999 г., гэта значыць, пасля Навума Кісліка, а не «незадоўга да яго», як вынікае з нарыса «Вышэйшы суд паэта» (с. 309). Тым не менш, кніга каштоўная ўжо хаця б тым, што прызнаны майстар парадоксаў дзеліцца сваімі поглядамі на расейскую, польскую, заходнееўрапейскую, амерыканскую літаратуру і мастацтва. Суб'ектыўнасць поглядаў на творчасць Б. Ахмадулінай, І. Бродскага, с. Лема, У. Бэроўза ды іншых у спалучэнні з эрудыцыяй не можа не прываблівaць…

Пры ўважлівым чытанні апошніх дзвюх кніг бачыцца, што адыход аўтара ад захаплення расейскім лібералізмам адбыўся дзесьці ў сярэдзіне 1990-х гг. Калі ў «Хроніцы» падаюцца як бясспрэчныя інтэрпрэтацыі расейскімі ўладамі падзей 1991 і 1993 гг., а менавіта абароны і штурму Белага дому[13] , то ў нарысе, датаваным 1997 г. («Тайная свабода», с. 269), спачувальна цытуецца Андрэй Сіняўскі з яго крытыкай Ельцына за расстрэл Белага дому, бамбёжкі ў Чачэніі і падгон канстытуцыі пад аднаго чалавека. «У Расеі ўжо і лібералы пранікліся дзяржаўна-імперскімі настроямі, – заяўляецца крыху пазней, – там правіць баль усё тая ж партыйна-савецкая наменклатура» («Польскі дзённік, с. 483). Відаць, на «змену вех» паўплывала вайна ў Чачэніі, спалучаная з абыякавасцю расейскіх «прыўладных дэмакратаў» што да эскападаў А. Л., выбраная многімі з іх пазіцыя «сукін сын, але наш»[14].

Пэўнае пераасэнсаванне цяперашніх рэалій звязана, магчыма, з тым, што на многіх прынцыповых разгалінаваннях у 1980–1990-х гг. аўтарам як даследчыкам і ідэолагам быў выбраны

шлях, карысці ад якога было, кажучы радком з верша Ф. Баторына, «бы камарык той натоўк». Ці наблізілася Беларусь да дэмакратыі дзякуючы высілкам с. Букчына, такога ахвотнага навучаць ёй «насельніцтва», «плебс, ён жа электарат, ён жа народ» («Беларуская трагедыя», с. 283) – вялікае пытанне. Што ж, запярэчаць талерантныя гісторыкі будучыні, адмоўны вынік – таксама вынік, затое які пласт падзей быў падняты! Часам у навуковых колах прынята хваліць проста за зварот да тэмы, а не за якасць яе асвятлення, але такі падыход якраз і ёсць шляхам да «правінцыялізму», супраць якога выступае аўтар. Ці выпадкова тое, што публіцыстычныя маланкі, абрынутыя, напрыклад, на Э. Скобелева, параўнанага, між іншага, з «вар'ятам» («Беларуская трагедыя», с. 54), давялося паўтараць праз некалькі гадоў («Тайная свабода», с. 500), амаль у тых самых выразах («у ідыётаў уласная гордасць») і з тым самым эфектам? Замілаванне гэткая вернасць аб'екту крытыкі можа выклікаць хіба ў сяброў аўтара[15]. Калейдаскапічнасць кніг с. Букчына чымсьці нагадвае даволі вядомыя ўспаміны І. Эрэнбурга «Людзі, гады, жыццё». Гэтая калейдаскапічнасць – на аматара, але для «інфармацыйнага грамадства» яна цалкам натуральная.

Саматужніцтва ў пісаннях на палітычныя тэмы ўласцівае канцу 1980-х – пачатку 1990-х гг., калі газетны ці часопісны артыкул з поспехам выконваў функцыі і гістарычнага даследавання, і палітычнага маніфесту. Але той час мінуў і, падобна, незваротна. Наклады газет, часопісаў ды кніг і асабліва давер да друкаванага слова наўрад ці вернуцца да адзнакі 15-гадовай даўніны. Кнігі с. Букчына, складзеныя пераважна з газетных матэрыялаў як «сапраўднага аскепка часу» («Беларуская трагедыя», с. 8) – хутчэй помнікі для будучых карпатлівых даследчыкаў, якім давядзецца вылушчваць зерне ісціны з нашых інфармацыйных плыняў, чым падручнікі па дэмакратызацыі грамадства, на што, здаецца, прэтэндуе аўтар[16] . Калі такія падручнікі і патрэбныя, наўрад ці надалей яны набываць форму зборнікаў газетных выцінак[17].

Па вялікім рахунку, каб зразумець прагу аўтара да «нармальнасці», варта было б звярнуцца да адметнасцей яго «двухадзінай» ці нават «трыадзінай» асобы – «рускага-яўрэя-

беларуса», які схільны ставіць «справядлівасць» вышэй за «бюракратычныя нормы»[18]. Наколькі ў такім выпадку шматгранная творчасць Сямёна Букчына характэрная для «руска-яўрэйскай інтэлігенцыі» Беларусі, да якой, наўскідку, можна аднесці такіх розных творцаў, як рэжысёр Юры Хашчавацкі, філосафы Леў Крывіцкі, Ілля Лявяш? Ці складае гэтая інтэлігенцыя, крытычная і да савецкасці, і да «вузкіх рамак» разнастайных яўрэйскіх суполак, і да праяваў беларускага нацыяналізму ў яго этнічнай версіі, рэальную, а не намінальную групу – гэта значыць групу ўплыву? Калі так, то наколькі яна ўплывовая і ў якой ступені яе культурніцкія арыентацыі змяніліся за апошнія 10–15 гадоў? Ці сведчаць пра агульную «змену вех» актыўныя пошукі апірышча ў кнігах Сямёна Букчына, а калі так, то наколькі яго творы заслугоўваюць таго, каб «люстэркам пераменаў» звацца? Пытанні, што застаюцца адкрытымі. Знаходжанне на іх адказаў ускладняецца праз адсутнасць дастатковых эмпірычных дадзеных: пасля спынення выхаду добрай памяці бюлетэню «Форум» уплыў этнічных працэсаў на сацыяльныя і палітычныя з'явы ніхто ў Беларусі сур'ёзна не вывучае, а калі і вывучае, то не спяшаецца афішаваць вынікі доследаў[19].

Кнігі с. Букчына – безумоўна, з'ява для лукашэнкаўскай Беларусі. Гэткі напал крытычнасці, як бы да яго ні ставіцца, апошнім часам сустракаецца рэдка. Хінін – таксама лекавае рэчыва, хоць у вялікіх дозах арганізму можа і пашкодзіць. Найлепшы спосаб пазбавіцца рызыкі, звязанай з перадазаваннем хініну, – адужаць хваробу…

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[redacted]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]

[image]2005

"да Зыкастуі"

паэмыка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ЭНДРУ ЎІЛСАН

Эндру Ўілсан Як урэшце стаць нацыяналістам? Лукашэнкавы стратэгіі да і пасля 2006 года

У праграмнай прамове Лукашэнкі, названай «Курс дзяржавы не зменіцца», тоіцца пэўны сігнал. Вось ужо на працягу некалькіх гадоў Лукашэнка праводзіць

палітыку, якую можна вызначыць словамі «Шын Фэйн», што ў перакладзе азначае «Мы самі». Як падкрэслена ў яго прамове, «*супраць нас абрушылася ўся «машына» – і на Захадзе, і, няма чаго граху таіць, некаторыя палітычныя сілы ў нашай брацкай Расіі*». Беларусь, у Лукашэнкавым бачанні свету, атакаваная з усіх бакоў, але не таму, што яна сапраўды пагражае дэмакратыі, а таму, што яна ёсць астраўком стабільнасці

і
перашкодай
для
суперліберальнага
Новага
сусветнага
парадку.

Захад даўно махнуў рукой на прэзідэнта Беларусі; што да рознагалоссяў апошняга з Расіяй, яны бяруць пачатак у 2000–2001 гадах. Па-першае, Лукашэнка перастаў задавальняць інтарэсы Крамля ў той ступені, як гэта было ў эру Ельцына. Менш ідэалагізаваная, больш прагматычная і жорсткая замежная палітыка Пуціна мае менш патрэбы ў сімвалічным «руху да саюзнай дзяржавы». Больш увагі надаецца праблемным пастаўкам нафты і газу, а патэнтаваны «флагман» у замежнай палітыцы, што абараняў бы жорсткую пазіцыю ў сербскім, іракскім і іншых пытаннях, «прыкрываючы» Расію (афіцыйна выказваць такую пазіцыю азначала б для яе канфрантаваць з Захадам), становіцца ўсё менш карысным. Больш за тое, улічваючы галоўны расійскі выйгрыш пасля 11 верасня 2001 года – згоду Вашынгтона на вайсковыя аперацыі на паўднёвай мяжы Расіі, што рэкламуюцца як частка «вайны з тэрарызмам», – Крэмль ужо не так ахвотна водзіцца з «дзяржавамі-ізгоямі», як раней. Да таго ж, на Лукашэнку былі завязаны бізнэс-інтарэсы старой Сям'і; калі найноўшыя калякрамлёўскія кланы чакалі адкрыцця беларускіх рынкаў для расійскага капіталу пасля пераабрання Лукашэнкі ў 2001 годзе, гэтага не здарылася.
Паварот Лукашэнкі «унутр краіны» праявіўся ўжо і сімвалічна. Яго асабісты вебсайт, у прыватнасці раздзел, прысвечаны нацыянальнай гісторыі стаў па-дзіўнаму эклектычным. Назіраецца яўнае аддаленне ад звыклай Лукашэнкавай пазіцыі, што беларуская гісторыя была збольшага terra incognita да абвяшчэння ССРБ у студзені 1919 года. «Прыдворныя інтэлектуалы» перапрацавалі сваю мяшанку з савецкай настальгіі і заходнерусізму так, што яна цяпер больш падобная да сумесі заходнерусізму з некаторымі прагматычнымі запазычаннямі з «нацыянальнай» традыцыі: імя паэта тут, празаіка там… У адным з раздзелаў вебсайту Лукашэнкі, дзе

пералічваюцца культурныя героі, здзейснена спроба сімвалічна паяднаць амаль усіх славутых беларусаў, уключаючы нават уніяцкага мітрапаліта Язэпа Руцкага.
Лукашэнкаў палітычны дыскурс таксама радыкальна змяніўся за апошнія гады. Параўнанне ў лютым 2004 года расійскага зніжэння паставак газу пасярод зімы з «тэрарызмам» было неймаверным чатыры гады таму[1].
Рашэнне Лукашэнкі прайсці праз рэферэндум 17 кастрычніка азначала, такім чынам, уступленне ў рызыкоўную гульню, на якую Расія пасля Беслана магла паглядзець іначай. Але на што скіравана прамова Лукашэнкі пра ягоны новы курс да і пасля чаканага пераабрання ў 2006 годзе? Лёгка высмейваць Лукашэнкава даручэнне чыноўнікам забяспечыць працу ў мадэльных агенцтвах тутэйшым прыгажуням альбо гарантаваць, каб усе беларускія дзеці даглядаліся дома. Большая частка прамовы – звычайная папулісцкая жованка, не абавязкова бескарысная і неэфектыўная. Як падкрэсліў прамоўца: «*Мае прыхільнікі – простыя людзі*». Адсюль яго шчодрыя абяцанкі падтрымліваць сацыяльна значныя «*прамысловыя гіганты*», прадухіліць «дыскрымінацыю» тутэйшых таваравытворцаў і да т. п.
Тым не менш, цікава адзначыць, што Лукашэнка надаў увагу больш агульным грамадскім дабротам, чым тыя, якімі звычайна выхваляюцца аўтарытарныя дзяржавы. У сваёй прамове напачатку верасня, абвяшчаючы рэферэндум, Лукашэнка падкрэсліў гэта рэзка: «*Госпад абараняе нас – за гэтыя дзесяць гадоў ні адзін беларус не стаў ахвярай тэрарыстычнага акта, узброенага канфлікту. Мы збераглі сваю краіну ад удзелу ў міжнародных авантурах, якія хоць у найменшай ступені ставілі б пад пагрозу ваша жыццё і бяспеку. Гэта найвялікшы наш здабытак*». Беларусь застаецца «спакойным і ўтульным домам, дзе пануюць мір і гармонія»[2] . Дасягненне ад процілеглага, ды ўсё-такі яно важнае для многіх беларусаў.
Цікавымі таксама былі некаторыя з яго больш дэталізаваных абяцанняў. Ізноў жа, іх не варта высмейваць. Праграмы Біла Клінтана (1997–2001) і неалейбарыста Тоні Блэра (2001–2005) у час іх другой кадэнцыі вызначаліся адмовай ад ідэалагічнай драматызацыі і вялікага наратыву ў палітыцы на карысць міні-, нават мікраскапічнай палітыкі «малых рэчаў». Таму і

Лукашэнка паабяцаў асекчы «*хамаватых прадаўцоў*», знізіць кошт пабудовы сельскіх дамоў да $18 000, выдаваць ільготныя крэдыты, аказваць бясплатныя прававыя кансультацыі. Калі такія ініцыятывы добра прапанаваць іх спажыўцам – а няма сумневу, што дзяржаўныя СМІ расхваляць ініцыятывы да нябёсаў – нават малыя крокі ў кірунку рэалізацыі будуць сведчыць пра выгады, якія можа прынесці «неідэалагічны падыход».

Прамова Лукашэнкі была таксама адметнай дзякуючы разважанням пра нацыянальны характар. Прамоўца яўна лічыць, што эканамічны нацыяналізм не з'яўляецца несумяшчальным з яго традыцыйнай рыторыкай пра «савецкую славянскую цывілізацыю». Але найбольш дзіўнай часткай прамовы трэба лічыць яго думку, што народу ўжо не пасуюць савецкія каштоўнасці. Папярэджанні пра доўгатэрміновыя дэмаграфічныя тэндэнцыі азначалі, між іншага, дапушчэнне таго, што патэрналісцкія захады кіраўніка не могуць бясконца ізаляваць краіну ад сацыяльных праблем, з якімі сутыкаюцца Расія і Ўкраіна – нават калі колькасць насельніцтва не зніжаецца так рэзка і дзяржаўная сістэма аховы здароўя яшчэ не ў такім катастрафічным стане, як у гэтых дзвюх краінах. Лукашэнка таксама атакаваў «*кніжных*» эканамістаў, якія, вядома ж, маглі б яго папракнуць за тое, што ягоная эканамічная палітыка вядзе ўрэшце да зніжэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі і што яе абсалютны кошт выявіцца ў будучым. Вядома, атакаваў даволі непераканаўча. «Луканоміка» бясспрэчна залежыць ад казырнай карты, якую Лукашэнка атрымаў яшчэ ў 1994 годзе. На 2000 год расійскія субсідыі, простыя і ўскосныя (дараванні запазычанасцяў, адтэрміноўкі, саступкі ў мытных тарыфах, падтрыманне курсу беларускай валюты) прыносілі Беларусі як мінімум 1,2 мільярда долараў на год, або 10 % ВУП краіны[3] . А паводле некаторых ацэнак, лічба 3 мільярды нават больш рэалістычная, і тады працэнт узнімаецца да амаль 30 % ВУП. З цяперашнімі рэаліямі лепш стасуецца ніжэйшая лічба, і надалей можна чакаць толькі яе падзення. «Беларуская мадэль» захавае ўстойлівасць адно ў тым выпадку, калі зніжэнне памеру расійскіх субсідый будзе паступовым. З іншага боку, эканамічны ўплыў важны для Крамля, бо ў такой адносна аўтакратычнай краіне, як Беларусь, Масква не можа ўжыць свае

ўлюбёныя «палітычныя тэхналогіі», асабліва пасля іх нядаўняга правалу ва Ўкраіне.

Вядома ж, Лукашэнка ўздыхнуў з палёгкай, дасягнуўшы перамогі на рэферэндуме да цяперашняга пераворату ва Ўкраіне, а не пасля яго. Бясспрэчна, цяперака ён здолее стрымаць любыя «ўкраінападобныя» хвалі пратэсту ў межах краіны. Тым не менш, Беларусь застаецца ў небяспечнай зоне. Бялград у 2000 годзе, Тбілісі ў 2002 годзе і Кіеў у 2004 годзе былі паўстаннямі не супраць аўтакратыі, а супраць псеўдадэмакратыі. Такія лідэры, як Карымаў і Туркменбашы, пачуваюць сябе ў бяспецы, а тыя, хто на словах падтрымлівае дэмакратыю, як Лукашэнка, знаходзяцца пад пагрозай.

Верагодна, Беларусь пойдзе на яшчэ большую ізаляцыю ў бліжэйшыя пару гадоў. Паколькі Лукашэнка імкнецца да змагання з расійскім уплывам, ён робіць стаўку на развіццё ўласных эканамічных захадаў унутры краіны. Але з 1860-х размоў пра будаўніцтва «моцнай і квітнеючай Беларусі з *сучаснымі атрыбутамі дзяржаўнасці*», з ягоных захадаў у час кожнага тэрміну (1994–2001) высвятляецца, што ён не падрыхтаваў глебы для праграмы нацыянальнай ахвярнасці ў духу Ліста*. Гэта значыць, што ягоныя апеляцыі да насельніцтва, каб яно часова «зацягнула паясы» ў імя нацыі, так часта трактаваныя Лукашэнкам як гібрыдная – савецка-беларуская, слаўянска-беларуская альбо праваслаўна-беларуская (а не проста беларуская, як у БНФ), рызыкуюць аказацца незразумелымі. Аднак калі ягоныя ўсёахопныя захады акажуцца не будуць словамі, ён можа ўрэшце стаць сапраўдным нацыянальным

Пераклаў з ангельскай В.Р.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (35) - 2005

3 IMF, *Republic of Belarus: Selected Issues and Statistical Appendix*, IMF Country Report no. 02/32 (Washington, DC, 2002), pp. 5, 39.

4 Да выдрых ліст (1789–1846) рабіў ставаную ахвярнасці ў каротка перспектыве выйгрышу будучых пакаленняў.

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[redacted] (35) 2005

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image] [image] 2005

"Да Зямсту"

[image] **[image]** **[image]** **[image]** **аналітыка** • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image] **ІМАНУІЛ ВАЛЕРСТАЙН**

Імануіл Валерстайн Выбары 2004 года ў ЗША

Джордж Буш-малодшы зноў абраны прэзідэнтам Злучаных Штатаў. Рэспубліканцы дабіліся ў абедзвюх палатах Кангрэса такой большасці, якой пры ім ніколі не мелі. Якія змены чакаюць цяпер ЗША і свет? Наш

аналіз мы
павінны
пачаць з
ацэнкі
самога
Буша.
Паводле
сваіх
поглядаў ён
найбольш
правы з усіх
сваіх
папярэднікаў,
пачынаючы
ад часоў
Вялікай
Дэпрэсіі.
Дж. Буш-
малодшы –
самы
агрэсіўны
рэакцыянер
з усіх
амерыканскіх
прэзідэнтаў.
Я ўжываю
тэрмін
«рэакцыянер»
у яго
класічным
палітычным
значэнні –
таго, хто
хоча
павярнуць
стрэлкі
палітычнага
гадзінніка
назад.

Буш ужо прадэманстраваў у час першага прэзідэнцкага тэрміну, што пры рэалізацыі сваёй праграмы ён не збіраецца шукаць кампрамісаў і не будзе асцярожнічаць у ажыццяўленні сваёй праграмы. Яго можна параўнаць з бульдозерам, які на сваім шляху да мэты трамбуе апазіцыйныя сілы і заадно слабакоў ва ўласным лагеры. Пра сваё пераабранне Буш ужо сказаў, што «атрымаў палітычны капітал» і пастараецца яго «вытраціць». Унутры Рэспубліканскай партыі Буш мае тры розныя апірышчы: хрысціянскую правіцу, буйны бізнес і ваеншчыну. Кожная з груп мае сур'ёзныя рэсурсы і цісне на Буша, каб здаволіць уласныя інтарэсы. Аднак іх прыярытэты вельмі розняцца, і таму кожная з груповак схільная аказваць дзвюм астатнім адно намінальную падтрымку.

Хрысціянская правіца клапоціцца перадусім пра ўнутраныя справы амерыканскага грамадства. Агонь правіцы засяроджаны на дзвюх цэлях: аднаполыя шлюбы і аборты. Яна хоча зрабіць аднаполыя шлюбы незаконнымі ў прынцыпе; каб вырашыць гэтае пытанне раз і назаўжды, ёй трэба ўнесці папраўку да Канстытуцыі. Правыя хацелі б паставіць па-за законам і аборты, дзеля чаго мусіць быць адменена пастанова Вярхоўнага Суду ў справе Роэ в. Вэйда[1]. Зрабіць гэта можна, прызначыўшы столькі новых суддзяў у Вярхоўны Суд, каб той змог пяцьма галасамі супраць чатырох прагаласаваць за скасаванне ранейшага рашэння. На сёння трое суддзяў гатовыя прагаласаваць за дэлегалізацыю абортаў, але паўнамоцтвы аднаго з іх неўзабаве сканчаюцца. Выходзіць, што Буш мае прызначыць трох суддзяў, гатовых перагледзець рашэнне ў згаданай справе.

Але ж спіс патрабаванняў хрысціянскай правіцы шырэйшы, чым указаныя два пункты. Яна жадала б узяць норавы пад кантроль наогул, дарма што разняволенне нораваў было адной з характэрных рысаў апошняга стагоддзя ня толькі ў ЗША, а і ў Еўропе ды ў большасці краін свету. Калі ў ЗША правыя даб'юцца забароны аднаполых шлюбаў і абортаў, то пасля яны пастараюцца забараніць кантрацэпцыю, зрабіць незаконнымі гомасексуальныя сувязі, абмежаваць або нават скасаваць права на развод; некаторыя з іх настойваюць на выключэнні жанчыны з рынку рабочай сілы або нават на пазбаўленні іх выбарчага права. Яшчэ адзін пункт іх праграмы – перавод стрэлак палітычнага гадзінніка на часы расізму, то бок аднаўленне Злучаных Штатаў як краіны, дзе ў сацыяльным і палітычным

плане дамінуюць белыя пратэстанты. Правыя мараць прыпыніць «падтрымчыя захады» (affirmative action[2]) ва ўсіх іх формах, спыніць прыток імігрантаў, а потым, магчыма, абмежаваць правы выбаршчыкаў. Гэта павярнула б назад увесь працэс эвалюцыі амерыканскага грамадства ад пачатку XX ст. Вядома, усё, што пералічана вышэй, уваходзіць у намеры толькі найбольш радыкальнай групоўкі правых. Але трэба адзначыць, што на цяперашні час гэтая радыкальная групоўка кантралюе большасць палітычных структур хрысціянскай правіцы і адыгрывае ў Рэспубліканскай партыі вельмі важную ролю. Палітычная стратэгія правых палягае ў тым, каб атрымаць такі склад судовых органаў, які дазволіць заканадаўчым органам, здзейсніць гэткія рэчы; прызначыць дастаткова маладых людзей на важныя пасады, каб гарантаваць сабе інстытуцыянае замацаванне сваіх рашэнняў; урэшце, дабіцца выразнага ўплыву ва ўсіх заканадаўчых органах.

[1] Прыкладам такой дзеянасці, прынятая 22 студзеня 1973 г. Вярхоўным судом ЗША (па іску жанчыны з штату Тэхас) аб забароне абортаў супярэчаць амерыканскай канстытуцыі. **Заўв. перакл.**

Ці здольныя правыя дасягнуць сваіх мэтаў? Хрысціянская правіца, безумоўна, мае больш шанцаў, чым калі-кольвек раней, паўплываць на прызначэнне «сваіх» суддзяў. Магчыма, яна даб'ецца нават папраўкі ў Канстытуцыю, дарма што такая папраўка павінна быць зацверджаная дзвюма трацінамі галасоў Сенату ды трыма чвэрцямі штатаў. Задача няпростая, але ўсё-такі ажыццяўляльная, асабліва калі Буш скарыстае тутака свае прэрагатывы.

[2] Прадастаўленне «неабароненым» групам (афраамерыканцам, жанчынам) ільгот у галіне адукацыі, прыярытэтнага доступу да некаторых пасад etc. **Заўв. перакл.**

Няма чаго казаць, такія знамаганні будуць аспрэчвацца палітыкамі і стануць раздражняльным фактарам для ўсё яшчэ значнай меншасці г. зв. «памяркоўных рэспубліканцаў». Буш падтрымае хрысціянскую правіцу пры ўмове, што яна не стане пагражаць яго задумкам на эканамічным фронце, які для яго асабіста і для ягоных прыхільнікаў з асяроддзя буйнога бізнесу найважнейшы.

Чаго хочуць эканамічныя кансерватары? Яны таксама хацелі б пусціць гадзіннік у адваротны бок, прынамсі, у тым, што тычыцца падаткаабкладання, дзяржаўнага рэгулявання сферы прыродных рэсурсаў, юрыдычнага пераследавання буйных кампаній, цэнаў на паслугі аховы здароўя. Што да падаткаў, тут усё проста: кансерватары па традыцыі хочуць перакласці іх

цяжар з багатых на бедных. Дагэтуль яны дасягалі сваёй мэты шматлікімі сродкамі: зніжэннем ставак падаткаабкладання для катэгорый з найвышэйшымі прыбыткамі, абмежаваннем падаткаў на дывідэнды, т. зв. рэформамі сацыяльнай бяспекі і медычнага страхавання. Самая актуальная для іх задача – замацаванне буйнога зніжэння падаткаў, уведзеных у першыя чатыры гады Бушавага кіравання і дазвол на выбар праграмы сацыяльнай бяспекі праз т. зв. індывідуальныя рахункі. Гэтая сістэма адахвоціць маладзейшых і багацейшых ад сплаты ўнёскаў у пенсійны фонд. Наступным крокам можа быць поўнае знішчэнне сістэмы сацыяльнай бяспекі, заснаванай адміністрацыяй Рузвельта ў 1935 г. Акрамя таго, можа быць адменены падатак на даходы, уведзены ў 1913 г. канстытуцыйнай папраўкай. У такім выпадку ўрад будзе вымушаны чэрпаць даходы або праз падатак на нерухомасць, або праз агульнаамерыканскі падатак на продажы, прычым абодва гэтыя падаткі маюць рэгрэсіўны характар.

У тым, што тычыцца выкарыстання прыродных рэсурсаў, большасць задач Буша будзе ажыццяўляцца адміністратыўнымі захадамі, хаця Бушавы прыхільнікі ўсё-такі паспрабуюць правесці рашэнне аб нафтаправодзе на Алясцы праз Кангрэс, спадзеючыся, што новы склад суддзяў не спыніць іх[3]. Тым самым шляхам яны могуць абмежаваць т. зв. «класавыя пазовы» (class action suits), што прымушалі буйныя фірмы адказваць за свае правапарушэнні. Тут Буш пастараецца знізіць ліміт для штрафаў і кампенсацый, што вызначаюцца судамі. І, вядома, Бушу даручана не абмяжоўваць завоблачныя прыбыткі фармацэўтычных кампаній, хоць ён і спрабуе правесці ў медычным страхаванні т. зв. «рэформы», якія фактычна пагражаюць падзеннем рэальных даходаў у гэтым сектары.

Усе пералічаныя захады таксама будуць прыняты ў штыхі рознымі палітычнымі коламі. Найбольшы супраціў Бушу[3] Маецца на будуць чыніць не дэмакраты, а слой дальнабачных ўвазе план капіталістаў, занепакоены далейшым падзеннем долары і адміністрацыі скачкападобным ростам бюджэтнага дэфіцыту, што Буша, дасягнуў ужо гіганцкіх памераў. Абедзве з’явы пагражаюць каталіцкай звязаны са фондаваму рынку. Некаторыя з памяркоўных крытыкаў Буша здабычай скажуць, што ягоныя рэформы дадуць плён, калі ўрад ЗША на фты на

радыкальна скароціць свае выдаткі. А адзіны сектар, дзе іх можа іх значна скараціць ў бліжэйшы час, – гэта вайсковы бюджэт, які выводзіць нас на трэцюю прабушаўскую групоўку, ваеншчыну (уключаючы групоўку неакансерватараў).

Ваеншчыне мроіцца вяртанне ў нядаўнія часы, калі ЗША былі бясспрэчным гегемонам у свеце, дыктуючы сваю волю паўсюль або амаль паўсюль. Гэтая групоўка дамінавала ў першай бушаўскай адміністрацыі; пытанне ў тым, ці здолеюць вайскоўцы захаваць свае пазіцыі ў другой бушаўскай адміністрацыі. Ясна, што ірацкая вайна пайшла не так, як спадзяваліся і прадказвалі вайскоўцы і неакансерватары. На радзіме яны трапілі пад крытыку не толькі антываеннага руху, але і кансерватыўных ды цэнтрысцкіх сілаў, збянтэжаных бессэнсоўнасцю ўварвання ў Ірак і эканамічным коштам інтэрвенцыі. Ясна таксама, што сама армія, з задавальненнем атрымліваючы больш грошай на ўзбраенні, баіцца завязнуць у ваенным канфлікце. Яна зусім не пэўная ў перамозе, яна пабойваецца падрыву ўласнага прэстыжу ў выпадку вываду войскаў. Вышэйшыя вайскоўцы памятаюць В'етнам, бо тады ўсе яны былі маладымі афіцэрамі.

«Мілітарысты ў цывільным», здаецца, хочуць усяго і адразу – заваяваць Іран, тады Кубу... Аднак на гэтым напрамку намеры каманды Буша наўрад ці прынясуць поспех ці нават наогул здзейсняцца. Апрача таго, што ва ўсім свеце адбываецца рост варожасці да ЗША як да «дзяржавы-дзержыморды» (Венгрыя абвясціла аб вывадзе сваіх войскаў з Іраку на наступны дзень пасля выбараў у ЗША), дзеля сваёй неразваротлівасці ваеншчына наўрад ці будзе карыстацца паважнай падтрымкай буйнога бізнесу. Яго нервуе працяглы адплыў грошай на ваенныя выдаткі, што замінае яму дабіцца жаданых зменаў у эканоміцы.

Ад Буша чакаюць рэзкіх, рашучых крокаў. Аднак ён рызыкуе натыкнуцца на падзелы ва ўласным лагеры і сур'ёзную незадаволенасць на сусветнай арэне, дзе ідэя вываду войскаў з Іраку мае ўплывовых прыхільнікаў. У выніку ў ЗША можа паўстаць вельмі моцны антываенны рух, які ажывіць лявіцу. Яго паўстанне будзе суправаджацца адраджэннем

Гэты і наступны нумары Нацыянальнага парку ўключаюць артыкулы, распрацаваны ў 2002 г. і дагэтуль не рэалізаваны.

Заўв. пераклад.

ізаляцыянізму, што гістарычна меў базу і сярод левых, і сярод правых. Такім чынам, у доўгатэрміновай перспектыве і ў сусветным маштабе задумкам Буша многа не свеціць. А вось Бушавы планы ва ўнутранай палітыцы сапраўды маюць шанцы здзейсніцца. Насамрэч, ЗША могуць атрымаць такую юрыдычную сістэму, якая адкіне грамадства назад. Калі так здарыцца, беспрэцэдэнтная палярызацыя палітычнага жыцця можа выліцца ў сур'ёзныя ўнутраныя канфлікты. Злучаныя Штаты моцна прайгралі на выбарах 2004 г., але свет, урэшце, можа выйграць.

Пераклаў з амерыканскай В.Р.
паводле http://fbc.binghamton.edu/149en.htm

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]2005

"да Зыгмунта"

аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Славой Жыжак Над вясёлкай

У Канзасе і іншых штатах самага сэрца Амерыкі эканамічна-класавы канфлікт (бедныя фермеры і рабочыя супраць адвакатаў, банкіраў, вялікіх карпарацый) пакрысе ператвараецца ў супрацьстаянне паміж сумленнымі,

СЛАВОЙ ЖЫЖАК дыялектычны матэрыяліст. Яго першы аналіз перакладзены з «London Review of Books» (2004. № 21), другі з сайту www.lacan.com, абодва – з ласкавай згоды аўтара.

працавітымі,
пабожнымі
амерыканцамі,
з аднаго
боку, і
ўпаднікамі-
лібераламі,
што
папіваюць
сабе каву з
малаком,
водзяць
замежныя
аўтамабілі,
высмейваюць
патрыятызм
і
адстойваюць
аборты і
гомасексуалізм,
з іншага
боку; так
сцвярджае
Томас
Фрэнк у
сваёй кнізе
«Што
здарылася з
Амерыкай?»
(Thomas
Frank, *What's
the Matter
with
America?*).
Галоўны
эканамічны
інтарэс
папулістаў-
кансерватараў
– пазбавіцца

моцнай дзяржавы, якая абкладае насельніцтва падаткамі, каб фінансаваць свае рэгулюючыя захады, і ўвесці эканамічную праграму пад лозунгам «менш падаткаў, менш рэгулявання». Са стандартнага гледзішча, якое мае на ўвазе, што эканамічная дзейнасць грунтуецца на рацыянальным клопаце пра асабістыя інтарэсы, няправільнасць гэтай пазіцыі відавочная: папулісты-кансерватары галасамі

выбарцаў
літаральна
пракладаюць
сабе шлях
наўпрост да
эканамічнага
краху.
Змяншэнне
падаткаў і
адсутнасць
кантролю з
боку
дзяржавы
азначае
большую
свабоду для
вялікіх
карпарацый,
якія
выжываюць
з рынку
збяднелых
фермераў;
меншае
ўмяшальніцтва
з боку
дзяржавы
азначае
змяншэнне
федэральнай
дапамогі
дробным
фермерам і
гэтак далей.
Аднак ва
ўяўленні
палкіх
папулістаў
дзяржава
з'яўляецца

чужароднай
сілай і –
разам з ААН
–
паслужніцай
Антыхрыста:
яна здымае з
верніка-
хрысціяніна
адказнасць
за
стырнаванне
ўласным
жыццём і
такім чынам
разбурае
патрэбу ў
асабістай
маральнасці,
якая змушае
кожнага з
нас дбаць аб
выратаванні
ўласнай
душы.

Не дзіва, што вялікія карпарацыі ў захапленні ад гэтых фанатычных нападак на дзяржаву, калі дзяржава спрабуе рэгуляваць зліццё медыя-кампаній або дзейнасць энергетычных канцэрнаў, уводзіць больш жорсткія нормы забруджвання паветра, абараняць прыроду, абмяжоўваць лесанарыхтоўкі ў нацыянальных парках і гэтак далей. Вось у чым глыбокая іронія сітуацыі: апраўданнем таго, што велізарная большасць індывідаў адчувае сілу, якая кантралюе іхнія жыцці, агромністай і безыменнай, служыць радыкальны індывідуалізм. Што да ідэалагічнага аспекту іхняй барацьбы, Фрэнк адзначае відавочны факт, які тым не менш варта згадаць яшчэ раз: папулісты вядуць вайну, у якой нельга перамагчы. Калі б рэспубліканцы захацелі сапраўды аб'явіць аборты па-за законам, калі б яны забаранілі выкладанне тэорыі эвалюцыі,

калі б ім заманулася ўвесці федэральнае рэгуляванне ў Галівудзе, гэта прывяло б не толькі да глабальнай мабілізацыі іхніх палітычных апанентаў, але таксама да шырокамаштабнага эканамічнага крызісу ў Злучаных Штатах. Такім чынам, вынікам ёсць узаемаслабляльны сімбіёз: кіруючы клас, не згаджаючыся з поглядамі папулістаў на мараль, тым не меней іх талеруе ў якасці сродку кантролю за ніжэйшымі класамі. «Маральная вайна» дае магчымасць ніжэйшым класам выплюхнуць уласнае абурэнне, не шкодзячы асноўным эканамічным інтарэсам. Інакш кажучы, культурная вайна – гэта тая ж класавая вайна, што вядзецца іншымі сродкамі, – адна мадэль замяшчае сабой другую.

Тым не меней, гэта толькі робіць загадку яшчэ больш неспасцігальнай: якім чынам магчыма падобнае замяшчэнне? «Дурасць» і «ідэалагічнае маніпуляванне» не з'яўляюцца досыць добрымі адказамі; відавочна не будзе дастаткова сцвердзіць, нібыта ніжэйшым класам нагэтулькі затлумілі галовы ідэалагічнай апрацоўкай, што тыя не ў стане вызначыць свае сапраўдныя інтарэсы. Калі на тое пайшло, варта прыгадаць, што дзесяткі гадоў таму Канзас быў асяродкам прагрэсіўнага папулізму, і людзі безумоўна не падурнелі з тае пары. Не з'яўляецца дастатковым і тлумачэнне Эрнеста Лаклаў: паміж сацыяльна-эканамічнай і ідэалагічнай пазіцыямі няма «натуральнай» сувязі, таму не мае сэнсу казаць пра «падман» і «фальшывую свядомасць», як быццам бы існуе ўзровень ідэйнай свядомасці, «адпаведны» для сацыяльна-эканамічнага статусу асобы. Кожная ідэалагічная дактрына з'яўляецца вынікам барацьбы за тое, каб усталяваць або гвалтоўна навязаць падставовы ланцужок раўназначнасцяў паміж шматлікімі відамі барацьбы – эканамічнай, за дэмакратыю, за экалогію, фемінісцкай, супраць расізму і да т. п. – і вынік гэты ў вышэйшай ступені непрадказальны, не гарантаваны аб'ектыўным сацыяльна-эканамічным становішчам.

Першае, што належыць тут адзначыць, – як для сваркі патрэбна дваіх, так і для культурнай вайны неабходныя два бакі: культура з'яўляецца таксама асноўным ідэалагічным клопатам «перадавых» лібералаў, што выступаюць супраць сексізму, расізму і фундаменталізму і за мультыкультурную талерантнасць. Сённяшняе значэнне слова «культура» цесна звязана са статусам веры. Мы больш не верым па-сапраўднаму,

а толькі выконваем пэўныя рэлігійныя рытуалы і пільнуемся тых ці іншых звычаяў у знак павагі да супольнасці, да якой належым: няверуючыя габрэі прытрымліваюцца кашэрных правілаў з павагі да традыцыі і гэтак далей. Выказванне «Я ў гэта насамрэч не веру, гэта проста частка маёй культуры» выдатна перадае веру, характэрную для нашага часу – веру, якой выракліся зусім або якую замясцілі іншай. Мы не верым у Санта-Клаўса, аднак штоснежань у кожным доме і ў кожным грамадскім месцы з'яўляецца калядная ялінка. Мы ўжываем назву «культура» для ўсіх тых рэчаў, якія мы практыкуем, не верачы ў іх па-сапраўднаму, не ўспрымаючы іх сур'ёзна. Другое, што належыць адзначыць: хоць лібералы і заяўляюць голасна пра сваю салідарнасць з немаёмнымі, іхняе змаганне за мультыкультурную талерантнасць і правы жанчын супрацьпастаўляе іх «ніжэйшым класам» з уласцівымі тым меркаванымі нецярпімасцю, фундаменталізмам і сексізмам. Сапраўдныя лініі падзелу свядома заціраюцца пры дапамозе стараннага выкарыстання тэрміналогіі. Павучальным у гэтым сэнсе з'яўляецца ўжыванне тэрміна «мадэрнізацыя». Спярша ствараецца абстрактная апазіцыя паміж «мадэрнізатарамі» (тымі, хто падтрымлівае глабальны капіталізм ва ўсіх аспектах, ад эканамічнага да культурнага) і «традыцыяналістамі» (тымі, хто супраціўляецца глабалізацыі). У катэгорыю тых, што супраціўляюцца, потым можна зваліць мяшанку з традыцыйных кансерватараў, правых папулістаў і асобных элементаў «старых левых» – тых, якія працягваюць адстойваць «дзяржаву ўсеагульнага дабрабыту», прафсаюзы і гэтак далей. І гэта сапраўды складае частку грамадскіх рэалій – у Нямеччыне кааліцыя царкоўнікаў і прафсаюзаў летась не дапусціла легалізацыі працы прадпрыемстваў гандлю ў нядзелі – аднак гэта не можа быць тлумачэннем для ўсяго сацыяльнага поля папросту таму, што закранае розныя слаі і класы. «Мадэрнізацыя» не ў стане выконваць ролю ключа да ўсяго грамадства цалкам, бо гэта абстрактная універсалія, у той час як марксізм закладае, што існуе адзін антаганізм (класавая барацьба), які вызначае ўсе астатнія і адпаведна з'яўляецца універсаліяй канкрэтнай. Фемінізм гэтаксама абстрактны: ён можа быць звязаны з барацьбой за эмансіпацыю ніжэйшых класаў або можа функцыянаваць (і без сумневу функцыянуе) як ідэалагічны інструмент вышэйшай праслойкі сярэдніх класаў,

які тая ўжывае, каб сцвердзіць сваю перавагу над ніжэйшымі класамі, што вызначаюцца, як мяркуецца, патрыярхальнасцю і нецярпімасцю. Класавы антаганізм, як бы там ні было, тут двойчы акрэслены: менавіта спецыфічны комплекс уяўленняў пра класавую барацьбу тлумачыць, чаму фемінізм быў прыўлашчаны вышэйшымі класамі. (Тое самае з расізмам; менавіта дынаміка самой класавай барацьбы тлумачыць, чаму расізм наймацней праяўляецца ў асяроддзі белага рабочага класа.)

Трэцяе, што належыць адзначыць, гэта фундаментальнае адрозненне паміж барацьбой фемінісцкай, антырасісцкай, антысексісцкай, з аднаго боку, і барацьбой класавай, з іншага боку. У першым выпадку мэта – пераўтварэнне антаганізму ў адрозненне (мірнае суіснаванне полаў, рэлігій, этнічных групаў), а мэта класавай барацьбы з дакладнасцю адваротная: узмацніць розніцу класаў да ступені класавага антаганізму. Усталяваць шэраг раўназначнасцяў паміж расай, полам і класам – значыць затушаваць своеасаблівую логіку класавай барацьбы, што накіраваная на тое, каб перамагчы, падпарадкаваць, нават дашчэнту знішчыць іншае – калі не яго фізічную сутнасць, то хаця б яго сацыяльна-палітычную ролю і функцыю. У адным выпадку мы маем гарызантальную логіку, якая прадугледжвае ўзаемапрызнанне розных тоеснасцяў, у іншым – логіку барацьбы з антаганістам.

Парадокс у тым, што фундаменталісты папулізму захоўваюць гэту логіку антаганізму, у той час як левыя лібералы ўпарта адстойваюць логіку прызнання адрозненняў. У той час як лібералы аддаюць перавагу згладжванню антаганізмаў, масавыя кампаніі папулістаў-кансерватараў перанялі старую ўстаноўку левых радыкалаў на мабілізацыю народных мас і барацьбу супраць эксплуатацыі вышэйшымі класамі. Гэта нечаканая змена роляў – толькі адзін з доўгага шэрагу прыкладаў. Можа падацца, што ў Злучаных Штатах рэспубліканцы і дэмакраты памяняліся сваімі традыцыйнымі ролямі: не кажучы ўжо пра новы глабальны інтэрвенцыянізм рэспубліканцаў, тыя яшчэ і патрацілі дзяржаўныя грошы, спарадзіўшы такім чынам рэкордны дэфіцыт бюджэту і дэ-факта паспрыяўшы пабудове моцнай федэральнай дзяржавы. Дэмакраты, з іншага боку, прытрымліваюцца жорсткай фіскальнай палітыкі, якая, за Клінтана, паклала канец

бюджэтнаму дэфіцыту. Нават у далікатнай сферы сацыяльна-эканамічнай палітыкі дэмакраты (падобна да Блэра) маюць неаліберальную праграму скасавання «дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту», зніжэння падаткаў, прыватызацыі і г. д., у той час як Буш прапанаваў радыкальныя захады, скіраваныя на легалізацыю статусу мільёнаў рабочых-мексіканцаў, і зрабіў ахову здароўя нашмат болей даступнай для пенсіянераў. Скрайнім прыкладам гэтай інверсіі з'яўляюцца групы руху за выжыванне (сэрвайвалісты). Хаця іхняй ідэалогіяй з'яўляецца рэлігійны расізм, спосабам сваёй арганізацыі (маленькія нелегальныя групы змагаюцца з ФБР і іншымі федэральнымі агенцтвамі) яны жудасна нагадваюць «чорных пантэр» у 1960-х. Таму нам варта адмовіцца не толькі ад вялай ліберальнай пагарды да папулісцкіх фундаменталістаў (і горш таго, паблажлівага жалю з нагоды іхняга меркаванага маніпулявання), але і ад саміх тэрмінаў культурнай вайны. Дарма што радыкальныя левыя будуць, вядома ж, падтрымліваць пазіцыю лібералаў па такіх праблемах, як аборты, расізм і гамафобія, ім варта заўсёды памятаць, што ў доўгатэрміновай перспектыве менавіта папулісцкія фундаменталісты, а не лібералы, з'яўляюцца іх саюзнікамі. Як бы папулісты ні злаваліся, яны ўсё ж недастаткова ўзлаваныя – недастаткова радыкальныя, каб адчуць сувязь паміж капіталізмам і заняпадам маралі, які яны голасна асуджаюць. Згадайма бясслаўныя нараканні Роберта Борка з ягонага «Спаўзання ў Гамору» (1996):

Індустрыя забаваў не навязвае сілком разбэшчанасць знеахвочанай амерыканскай публіцы. Попыт на дэкадэнцтва яшчэ той. Гэты факт не апраўдвае тых, хто прадае гэты ўпадніцкі тавар, таксама як попыт на крэк не апраўдвае какаінавага дылера. Аднак мы мусім нагадваць самім сабе, што вінаватыя мы самі, чалавечая натура, якую не стрымліваюць вонкавыя сілы.

У гэтым месцы Борк дзеля ідэалогіі дзейнічае крыху ў абыход правілаў: замест таго, каб паказаць на логіку капіталізму, які дзеля падтрымкі ўласнага існавання вымушаны пастаянна ствараць новы попыт, ён звальвае віну за спажывецкае «дэкадэнцтва» на «чалавечую натуру», якая, адданая сама сабе, спаўзае ў разбэшчанасць і таму патрабуе несупыннага кантролю і цэнзуравання. «Уяўленне, што людзі ад прыроды

рацыянальныя і маральныя істоты, якія не маюць патрэбы ў моцных абмежаваннях звонку, было абвергнута досведам. Існуе прагны попыт на распусту, які ўвесь час расце, а таксама прыбытковая індустрыя, прысвечаная таму, каб яго забяспечваць».

Гэткі погляд, аднак, стварае пэўную праблему для «маральнага» крыжовага паходу змагароў халоднай вайны супраць камунізму, бо камуністычныя рэжымы Усходняй Еўропы былі пераможаныя якраз дзякуючы спалучэнню трох найвялікшых антаганістаў кансерватызму: моладзі, інтэлектуалаў-шасцідзесятнікаў і рабочых, што працягвалі верыць у салідарнасць як процівагу індывідуалізму. Гэтая праблема вяртаецца і турбуе Борка: у сваёй кнізе ён распавядае, як на адной канферэнцыі «непахвальна азваўся пра выступ Майкла Джэксана на «Суперкубку» (фінале першынства Нацыянальнай лігі амерыканскага футболу), падчас якога той выконваў непрыстойныя рухі. Іншы ўдзельнік дыскусіі з'едліва мне паведаміў, што менавіта прага цешыцца гэткімі праявамі амерыканскай культуры разбурыла Берлінскую сцяну. Гэта падаецца неблагім аргументам на карысць таго, каб узвесці тую сцяну зноўку». Борк усведамляе іронію сваёй пазіцыі, аднак відавочна не разумее яе глыбейшага аспекту.

Згодна з лаканаўскім акрэсленнем паспяховай камунікацыі, я атрымліваю ад іншых сваё ўласнае паведамленне ў адваротным выглядзе, інакш кажучы, з ягоным сапраўдным значэннем – праўду пра мяне самога, якую я выцясняў са свядомасці. Ці сённяшнія лібералы атрымліваюць ад кансерватыўных папулістаў сваю ўласную ідэю ў адваротным/сапраўдным выглядзе? Інакш кажучы, ці з'яўляецца кансерватыўны папулізм адзнакай ліберальнай талерантнасці? Ці неачэсаны дзяцюк з Канзаса, што раздзімаецца ад гневу на распуснасць лібералаў, з'яўляецца той самай постаццю, якая дапаможа лібералу спасцігнуць ісціну за ўсім ягоным крывадушшам? Можа, нам варта ўзяць за прыклад найбольш папулярную песеньку пра Канзас і пашукаць сабе саюзнікаў там, дзесьці над вясёлкай: па-за межамі «вясёлкавай кааліцыі» радыкальных лібералаў ды іхніх змаганняў за вузкаспецыялізаваныя асобныя мэты і бліжэй да тых, у кім яны бачаць ворага.

Ліберальнае

Ватэрлоо (Або, нарэшце, добрыя навіны з Вашынгтона)

Першай рэакцыяй прагрэсістаў на другую перамогу Буша была роспач і нават страх: апошнія чатыры гады аказаліся не проста страшным сном. Жахлівая кааліцыя вялікага бізнесу і фундаменталісцкага папулізму пакоціцца далей, у той час як Буш з новай насалодай ажыццяўляе сваю праграму, прызначаючы ў Вярхоўны суд суддзяў-кансерватараў, захопліваючы наступную пасля Ірака краіну і штурхаючы лібералізм у Злучаных Штатах яшчэ на крок бліжэй да вымірання. Аднак чаму нам нельга паддавацца, дык гэта менавіта такой эмацыянальнай рэакцыі – яна толькі сведчыць, наколькі вялікага поспеху дасягнулі лібералы ў тым, каб навязаць нам свой светапогляд. Калі, захаваўшы вытрымку, спакойна прааналізаваць вынікі, выбары 2004 года выглядаюць у цалкам іншым святле.

Шмат хто ў Еўропе здзіўляецца, як Буш мог выйграць, пры тым што супраць яго выступала інтэлектуальная эліта і эліта поп-культуры. Цяперака яны ўрэшце мусяць сутыкнуцца з недаацэненай мабілізуючай сілай амерыканскага хрысціянскага фундаменталізму. Менавіта з-за сваёй відавочнай дэбільнасці ён уяўляе сабой нашмат больш парадаксальную, па-сапраўднаму постмадэрнісцкую з'яву, чым здаецца.

Возьмем літаратурныя бестселеры хрысціянскага фундаменталізму ЗША, цыкл з дванаццаці раманаў Тыма Ф. ЛаХае і Джэры Б. Джэнкінс «Пакінутыя» (Tim F. LaHaye, Jerry B. Jenkins, *Left Behind*), прысвечаны надыходу канца свету, – выданне, што распрадалося накладам болей за 60 мільёнаў асобнікаў. Гісторыя «Пакінутых» пачынаецца раптоўным і невытлумачальным знікненнем мільёнаў людзей – выратаваных душаў, якіх Бог паклікаў да сябе, каб выбавіць іх ад жахаў Армагедону. Потым з'яўляецца Антыхрыст, малады, спрытны і харызматычны румынскі палітык, якога зваць Нікалае Карпатыя; выбраны на пасаду Генеральнага сакратара

Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, ён перамяшчае штаб-кватэру ААН у Вавілон і стварае там антыамерыканскі сусветны ўрад, які раззбройвае ўсе нацыянальныя дзяржавы. Гэты недарэчны сюжэт разгортваецца ажно да фінальнай бітвы, калі ўсе нехрысціяне – габрэі, мусульмане і каторыя з імі – згараюць у агні катаклізму. Уявіце сабе абурэнне заходніх ліберальных медыяў, калі б падобны аповед, напісаны з мусульманскага гледзішча, зрабіўся б бестселерам у арабскіх краінах! Дух займае не ад беднасці і прымітывізму гэтых раманаў, а хутчэй ад дзіўнага скрыжавання «сур’ёзнай» рэлігійнай ідэі і самых нізкаякасных завядзёнак поп-культурнага камерцыялізму.
Маё наступнае разважанне датычыць асноўнага парадоксу дэмакратыі, як ён раскрыты ў «Гісторыі ВКП(б)» – Біблііі сталінізму. Сталін (які фактычна напісаў гэту кнігу) апісвае галасаванне на партыйным з’ездзе напрыканцы 1920-х гадоў: «Пераважнай бальшынёй галасоў дэпутаты аднадушна ўхвалілі рэзалюцыю, прапанаваную ЦК». Калі аднадушна (=аднагалосна), то дзе падзелася меншыня? Гэты парадокс зусім не выдае ніякага вычварнага «таталітарнага» фокусу, наадварот, ён убудаваны ў саму структуру дэмакратыі. Дэмакратыя грунтуецца на кароткім замыканні паміж бальшынёй і «ўсімі». У гэтай маніпуляцыі пераможца забірае ўсё, а бальшыня лічыцца як «усе» і атрымлівае ўсю ўладу, нават калі гэтая бальшыня – пара соцень галасоў на некалькі мільёнаў чалавек.
«Дэмакратыя» – не проста «ўлада народа і для народа». Недастаткова сцвердзіць, што ў дэмакратычнай дзяржаве воля і інтарэсы (якія не заўжды аўтаматычна супадаюць) бальшыні прадвызначаюць дзяржаўныя рашэнні. Сёння дэмакратыя ўзнялася вышэй за ўсё, звязанае з фармальнай вернасцю літары закону – безумоўнай адданасцю набору правілаў, якія гарантуюць, што палітычная арэна напоўніцу паглыне ўсе антаганізмы грамадства. «Дэмакратыя» азначае, што якія б электаральныя маніпуляцыі ні адбываліся, палітыкі па вызначэнні з шанаваннем паставяцца да выніку. У гэтым сэнсе прэзідэнцкія выбары ў 2000 годзе былі сапраўды «дэмакратычнымі»: нягледзячы на відавочныя электаральныя маніпуляцыі і яўную бессэнсоўнасць таго, што некалькі соцень галасоў у Фларыдзе вырашалі, хто будзе прэзідэнтам цэлай дзяржавы, кандыдат ад дэмакратаў пагадзіўся з паразай. У час

няпэўнасці, які расцягнуўся на тыдні пасля выбараў, Біл Клінтан адпаведна моманту з'едліва пракаментаваў: «Амерыканцы выказаліся, толькі мы не ведаем, што яны сказалі». Гэты каментар належыць успрымаць больш сур'ёзна, чым ён меркаваўся. Дагэтуль, да сённяшняга дня, мы не ведаем, што яны сказалі – магчыма таму, што за вынікам і не стаяла ніякага «паведамлення».

Досыць сталыя людзі дасюль памятаюць нудныя спробы «дэмакратычных сацыялістаў» апаніраваць няшчаснаму «рэальна існуючаму сацыялізму», малюючы карціну сацыялізму аўтэнтычнага. Належны водгук на гэтыя спробы забяспечвае стандартны гегельянскі адказ: няздольнасць рэчаіснасці апраўдаць ідэю сведчыць пра прыроджаную слабасць ідэі як такой. Чаму б не паставіцца гэтак і да дэмакратыі? Ці не занадта проста супрацьпаставіць «рэальна існуючую» ліберальную капіталістычную дэмакратыю больш праўдзівай радыкальнай дэмакратыі?

Гэта не намёк на тое, што перамога Буша была выпадковай памылкай, вынікам падману ці маніпулявання. Гегель пісаў пра Напалеона, што таму давялося прайграць двойчы: толькі пасля Ватэрлоо яму сталася зразумелым, што ягоная параза была не выпадковасцю вайны, а праявай глыбейшага гістарычнага зруху. Тое самае з Бушам: яму трэба было перамагчы два разы, каб лібералы адчулі, што для ўсіх нас пачынаецца новая эпоха. 11 верасня 2001 года былі атакаваныя вежы-блізняты Сусветнага гандлёвага цэнтру. Дванаццаццю гадамі раней, 9 лістапада 1989 года, пала Берлінская сцяна. 9 лістапада азнаменавала «шчаслівыя 1990-я», мару Фрэнсіса Фукуямы пра «канец гісторыі», веру ў тое, што ліберальная дэмакратыя ў прынцыпе перамагла і што адзінымі перашкодамі на шляху да звышгалівудаўскага хэпіэнду застаюцца толькі лакальныя агмяні супраціву, дзе лідэры яшчэ не паспелі ўсвядоміць, што іхні час скончыўся. У процілегласць гэтаму, 11 верасня сімвалізуе заканчэнне клінтанскіх «шчаслівых 1990-х», абвяшчаючы эпоху новых сценаў – паміж Ізраілем і Заходнім Берагам, вакол Еўразвяза, на мяжы паміж ЗША і Мексікай.

У сваёй нядаўняй кнізе «Вайна за Ірак» Уільям Крыстал і Лорэнс Ф. Каплан пішуць: «Місія пачынаецца ў Багдадзе, аднак яна там не сканчваецца... Мы стаім на парозе новай гістарычнай эпохі... Гэта вырашальны момант... Відавочна, што

рэч не толькі ў Іраку… І нават не толькі ў будучыні Блізкага Усходу і вайне з тэрарызмам. Рэч у тым, якую ролю збіраюцца прыняць Злучаныя Штаты ў дваццаць першым стагоддзі». Нельга не згадзіцца з аўтарамі. Сапраўды, на карту цяпер пастаўлена менавіта будучыня міжнароднай супольнасці – новыя правілы, якімі яна будзе рэгуляваць, новы сусветны лад.

Такім чынам, новы вобраз Новага Сусветнага Ладу паўстае як дзейсная схема сучаснай палітыкі Злучаных Штатаў. Пасля падзей 11 верасня Амерыка фактычна адмовілася ўспрымаць рэшту свету як надзейнага партнёра. Канчатковай мэтай стала ўжо не фукуямаўская утопія аб пашырэнні сусветнай ліберальнай дэмакратыі, а пераўтварэнне Злучаных Штатаў у «Крэпасць Амерыку», ізаляваную ад рэшты свету самотную звышдзяржаву, якая б абараняла ўласныя эканамічныя інтарэсы і гарантавала ўласную бяспеку з дапамогай сваёй новай мілітарнай моцы. Гэтая новая вайсковая моц улучае не толькі сілы, здольныя да хуткага разгортвання ў якім заўгодна пункце зямнога шара, але таксама распрацоўку касмічных відаў зброі, якія дадуць Пентагону магчымасць кантраляваць паверхню зямнога шара з вышыні. Гэтая стратэгія пралівае новае святло на апошнія канфлікты паміж Еўропай і Злучанымі Штатамі. Не Еўропа «здраджвае» Злучаным Штатам, а Штаты больш не маюць патрэбы ў тым, каб абапірацца на сваё выключнае партнёрства з Еўропай. У двух словах, Амерыка Буша прэтэндуе на тое, каб быць новай сусветнай імперыяй, аднак такою не з'яўляецца. Хутчэй яна застаецца нацыянальнай дзяржавай, якая жорстка дбае пра ўласныя інтарэсы. Падобна на тое, як быццам бы палітыкай Злучаных Штатаў цяпер кіруе славуты лозунг эколагаў, толькі вычварна перакулены: «Дзейнічай глабальна, думай лакальна».

У гэтай сістэме каардынат кожнаму здольнаму думаць прагрэсісту належыць радавацца перамозе Буша. Гэта добра для ўсяго свету, бо абрысы будучых канфрантацый будуць цяпер крэсліцца нашмат болей выразна. Перамога Керы была б чымсь накшталт гістарычнай анамаліі, якая б затушавала рэальныя лініі падзелу. Урэшце, у Керы не было глабальнага падыходу, які б склаў рэальную альтэрнатыву палітыцы Буша. Больш таго, перамога Буша, як ні парадаксальна, больш спрыяльная для еўрапейскай і лацінаамерыканскай эканомік –

Керы, каб забяспечыць сабе прыхільнасць прафзвязаў, абяцаў падтрымаць пратэкцыянісцкія захады.
Аднак галоўная перавага датычыць міжнароднай палітыкі. Калі б выйграў Керы, лібералы былі б вымушаныя мець справу з наступствамі вайны ў Іраку, што дазволіла б лагеру Буша ускласці на дэмакратаў віну за вынікі ўласных катастрафічных рашэнняў. У сваім вядомым эсэ «Дыктатары і падвойныя стандарты» (*Commentary*, 1979) Джын Кіркпатрык дэтальна тлумачыла адрозненні паміж «аўтарытарным» і «таталітарным» рэжымамі, каб апраўдаць палітыку супрацоўніцтва з правымі дыктатарамі, якую тады праводзілі Злучаныя Штаты (у той самы час актыўна ведучы падрыўную дзейнасць супраць рэжымаў камуністычных). Аўтарытарныя дыктатары – прагматычныя валадары, заклапочаныя пытаннямі ўлады і багацця і абыякавыя да ідэалагічных праблем, нават калі яны і падтрымліваюць на словах нейкую высокую ідэю. У адрозненне ад іх, таталітарныя лідэры – самаахвярныя фанатыкі, якіх вядзе ідэалогія, якія паставяць на карту што заўгодна ў імя сваіх ідэалаў. Таму з аўтарытарнымі лідэрамі, якія рэагуюць рацыянальна і прадказальна на матэрыяльныя і мілітарныя пагрозы, можна мець справу, а таталітарныя лідэры больш небяспечныя, і з імі трэба наўпрост змагацца. Іронія палягае ў тым, што гэтае размежаванне цудоўна дэманструе, што адбылося не так у справе з амерыканскім захопам Ірака. Садам быў прадажным аўтарытарным дыктатарам, які імкнуўся да ўлады і зыходзіў з меркаванняў жорстка прагматычных (дзякуючы чаму супрацоўнічаў са Злучанымі Штатамі на працягу ўсіх 1980-х). Аднак, прыбраўшы яго, Злучаныя Штаты сваім умяшальніцтвам прывялі да стварэння «фундаменталісцкай» апазіцыі, якая загадзя выключае магчымасць любых прагматычных кампрамісаў.
Перамога Буша развее ілюзіі пра адзінства інтарэсаў у асяроддзі развітых заходніх краін. Яна дасць новы штуршок балючаму, але неабходнаму працэсу ўзмацнення новых саюзаў, такіх як Еўрапейскі Звяз або блок Меркасур у Паўднёвай Амерыцы. Ухваленне «постмадэрнісцкай» дынамікі амерыканскага капіталізму на фоне «старэнькай Еўропы», якая завязла ў сваіх ілюзіях зарэгуляванай Дзяржавы Ўсеагульнага Дабрабыту, ужо зрабілася журналісцкім клішэ. Тым не менш, у сферы палітычнай арганізацыі Еўропа цяпер пасоўваецца

нашмат далей, чым пасунуліся Злучаныя Штаты, да таго, каб сцвердзіць сябе ў якасці беспрэцэдэнтнага, па-сапраўднаму «постмадэрнісцкага», трансдзяржаўнага калектыву, які ў стане забяспечыць месца кожнаму, незалежна ад геаграфіі і культуры.
Так што няма нагоды для роспачы. Сёння перспектывы могуць быць змрочныя, аднак згадайма адзін з вялікіх «бушызмаў»: «Будучыня будзе лепшая заўтра».
З ангельскай мовы пераклала Мілана Міхалевіч

[image]
[image]

№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[illegible] (ў’2000)

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 1 (35) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image] [image] [image] 2005

"да Зьбігнеў

аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ЗЬБІГНЕЎ БЖАЗІНСКІ

Зьбігнеў Бжазінскі Глябальнае дамінаваньне ці сусьветнае лідэрства? Заключэньне*

Сусьветная гегемонія Амэрыкі – жыцьцёвы факт. І ніхто, у тым ліку й сама Амэрыка, нічога ня можа з гэтым зрабіць. Сапраўды, Амэрыка паставіла б пад пытаньне сваё ўласнае

існаваньне,
як Кітай
больш за
паўтысячагодзьдзя
таму, калі б
раптам
сышла з
сусьветнай
арэны. У
адрозьненьне
ад Кітаю,
Амэрыка не
змагла б
ізаляваць
сябе ад
глябальнага
хаосу, які
выклікаў бы
падобны
сыход. Але
як у жыцьці,
так і ў
палітычных
справах усё
калісьці мае
свой канец.
Гегемонія –
гэта часовая
гістарычная
фаза. Можа
й ня хутка,
аднак
глябальнае
дамінаваньне
Амэрыкі
некалі
скончыцца.
Такім
чынам,
амэрыканцам

трэба ўжо
цяпер
імкнуцца
акрэсьліць
тую форму,
якую будзе
мець
спадчына іх
сусьветнай
гегемоніі.

Сапраўдны выбар палягае ў тым, як мусіць Амэрыка ажыццяўляць сваю гегемонію, з кім мусіць дзяліцца ўладаю і на якія канчатковыя мэты яна мусіць сваё панаваньне скіроўваць. Якая галоўная мэта сусьветнага панаваньня Амэрыкі? Адказ на гэтае пытаньне канчаткова акрэсьліць варыянты: ці гэта будзе міжнароднае лідэрства на аснове супольнай згоды і легітымнасьці, ці гэта будзе першынство, якое ў значнай ступені абапіраецца на сілавое дамінаваньне, заснаванае проста на магутнасьці. Лідэрства на аснове згоды ўзмоцніць вяршэнства Амэрыкі ў сусьветных справах, а легітымнасьць гэтага лідэрства замацуе за Амэрыкай статус адзінай сусьветнай супэрдзяржавы; дамінаваньне запатрабуе большых вайсковых выдаткаў, нават калі Амэрыка й будзе займаць выключную пазыцыю. Іншымі словамі, пры першым варыянце Амэрыка будзе Супэрдзяржавай Плюс, а пры другім – Супэрдзяржавай Мінус.
Ня варта й казаць, што першаснай і галоўнай мэтай існаваньня амэрыканскай фэдэральнай улады мусіць быць бясьпека самой Амэрыкі. Пры ўсё большай няпэўнасьці ў галіне сусьветнай бясьпекі, калі магчымасьці ўжыцьця зброі масавага зьнішчэньня маюць ужо ня толькі дзяржавы, але і асобныя падпольныя арганізацыі, бясьпека амэрыканскага народу мусіць стаць галоўнай мэтай амэрыканскай замежнай палітыкі. Але ў наш час бясьпека асобнай дзяржавы – гэта хімэра. Барацьба за бясьпеку мусіць уключаць у сябе высілкі, накіраваныя на прыцягненьне большай сусьветнай падтрымкі. Інакш азлобленасьць і зайздрасьць з боку іншых дзяржаваў да амэрыканскага першынства могуць ператварыцца ў сур'ёзную пагрозу бясьпецы.

У пэўным сэнсе, гэтая злавесная тэндэнцыя ўжо пачалася. Амэрыка выйшла трыюмфатарам з халоднай вайны, сапраўднай Супэрдзяржавай Плюс. Але празь дзесяцігодзьдзе пасьля гэтага яна рызыкуе стацца Супэрдзяржавай Мінус. Праз два гады пасьля 11 верасьня сусьветная салідарнасьць з Амэрыкай усё больш ператвараецца ў «амэрыканскую адзіноту», сусьветная падтрымка ператварылася ў распаўсюджаную падазронасьць наконт сапраўдных матываў амэрыканскай супэрдзяржавы.

У прыватнасьці, пасьпяховая з вайсковага пункту гледжаньня, але супярэчлівая ў міжнародным пляне ірацкая кампанія сталася крыніцаю дзіўнага парадоксу; давер да амэрыканскай вайсковай моцы з боку сусьветнай супольнасьці ніколі ня быў такім высокім, але давер да амэрыканскай палітыкі ніколі ня быў такім нізкім. Паўсюдна прызнаецца факт, што ЗША – адзіная дзяржава, здольная арганізаваць і пасьпяхова правесьці вайсковую апэрацыю ў любым кутку сьвету. Аднак апраўданьне вайны ў Іраку тым, што Ірак валодае зброяй масавага зьнішчэньня, абвінавачаньне, якое катэгарычна выказвалася прэзыдэнтам і вышэйшымі чыноўнікамі ЗША, аказалася неадпаведным рэчаіснасьці. Гэта падарвала сусьветную рэпутацыю Амэрыкі, і ня толькі сярод традыцыйна антыамэрыканскай лявіцы, але й сярод правых. Паколькі міжнародная легітымнасьць у значнай ступені базуецца на даверы, стратаў, якія панесла рэпутацыя Амэрыкі ў сьвеце, нельга прымяншаць.

Такім чынам, яшчэ больш важным робіцца тое, як Амэрыка акрэсьліць галоўныя задачы сваёй гегемоніі для сябе і для астатняга сьвету. Гэтае акрэсьленьне павінна ўключаць у сябе і ясна фармуляваць асноўны стратэгічны выклік, які стаіць перад Амэрыкай і на пераадоленьне якога яна намагаецца мабілізаваць сьвет. Тое, як яна зробіць гэта, наколькі празрыста і маральна, зь якой ступеньню разуменьня патрэбаў і надзеяў іншых краінаў – вызначыць рэальныя межы і ступень складанасьці ў ажыцьцяўленьні амэрыканскай магутнасьці. Карацей кажучы, гэта пакажа, ці стане Амэрыка Супэрдзяржавай Плюс ці Супэрдзяржавай Мінус.

З 11 верасьня большасьці сьвету падаецца, што галоўнай кірунак палітыкі бясьпекі ЗША, як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне, – гэта «вайна супраць тэрарызму». Такі

глябальным маштабе»[1] . Зьвярнуць увагу на тэрарызм як галоўнай піяр-задачай бушаўскай адміністрацыі. Тэрарызм туманна акрэсьлены, зганены ў тэалягічных і маралізатарскіх тэрмінах і без прывязкі да рэгіянальных праблемаў, якія агульна асацыяваны з ісламам – мусіць атрымаць адпор. Гэтае створаных спэцыяльна для гэтага кааліцыяў з аднадумцаў, якія падзяляюць (ці дыпляматычна заяўляюць аб тым, што падзяляюць) заклапочанасьць тэрарызмам як галоўнай выклікам бясьпецы нашага часу. Выкараненьне гэтага, такім чынам, падаецца як неадкладная задача Амэрыкі, якой палегчыць агульны прагрэс глябальнай бясьпекі. Засяроджанасьць на тэрарызьме вельмі палітычна прыцягальная ў каротката эрміновай пэрспэктыве. Яна дае бясспрэчную перавагу – простасьць. Праз дэманізацыю невядомага ворага і эксплюатацыю няпэўных страхаў можа быць дасягнутая шырокая народная падтрымка. Але ў доўгатэрміновай стратэгіі ёй не стае надзейнай моцы, яна можа выклікаць міжнацыянальныя канфлікты, нецярпімасьць да іншых («хто ня з намі, той супраць нас»), і даць дорогу шавіністычным эмоцыям, а таксама можа стацца адправым пунктам для адвольнага вызначэньня Амэрыкай інцыдэнтаў як «пастаўленых па-за законам». У выніку гэта стварае магчымасьць таго, што Амэрыка будзе ўспрымацца эгацэнтрычная краіна, а ідэолягі антыамэрыканізму атрымаюць міжнароднае прызнаньне, заклеймаваўшы Амэрыку як самазванага жандара.

Тры галоўныя высновы, зробленыя з акрэсьленьня тэрарызму як цэнтральнай пагрозы амэрыканскай бясьпецы (1) хто ня з намі – той супраць нас; 2) Амэрыка мае права на ваенны ўдар і прэвэнтыўныя захады неваеннага характару, і 3) абедзьве гэтыя меры могуць ужывацца разам ці паасобку; сталыя альянсы могуць лёгка падмяняцца прынагодна створанымі кааліцыямі) выклікалі шырокую заклапочанасьць на ўсім сьвеце. Нам бачыцца, што першая выснова вядзе да небясьпечнага расколу, другая – да стратэгічнай непрадказальнасьці, а трэцяя можа выклікаць палітычную напружанасьць. Разам гэтыя высновы шмат дадалі да іміджу Амэрыкі як усё больш непасьлядоўнай супэрдзяржавы.

[1] Цытата з прэзыдэнцкага выступу ў Кангрэсе 20 верасьня 2001 г.

Дасьведчаны эўрапейскі назіральнік, параўноўваючы сучасную Амэрыку з старажытным Рымам, трапна зазначыў:

Сусьветныя супэрдзяржавы без супернікаў – кляса ў сабе. Яны нікога не ўспрымаюць як роўнага і занадта хутка пачынаюць называць верных пасьлядоўнікаў сябрамі, ці «amicus populi Romani». Ім больш ня ведамы ворагі, яны маюць справу толькі зь мяцежнікамі, тэрарыстамі і «дзяржавамі-ізгоямі». Яны больш не змагаюцца – толькі караюць. Яны больш не вядуць войнаў – яны твораць мір. Яны шчыра абураюцца, калі васалы не жадаюць паводзіць сябе па-васальнаму.

таксама ўжо выпадкі ўжываньня іншымі дзяржавамі сьляпога гвалту ў дачыненьні да цывільнага насельніцтва з мэтамі задушэньня тэрарызму.

(Карціць таксама дадаць, што яны не нападаюць на іншыя краіны, а вызваляюць іх.) Аўтар пісаў гэта да 11 верасьня, але гэты камэнтар з ашаламляльнай дакладнасьцю перадае стаўленьне некаторых творцаў амэрыканскай палітыкі, якое яны выказалі падчас ААНаўскіх дэбатаў у 2003 г. вакол праблемы Іраку. Альтэрнатыўным падыходам да акрэсьленьня галоўнай стратэгічнай праблемы быў бы больш шырокі фокус на глябальным бязладзьдзі ў некалькіх яго рэгіянальных і грамадзкіх праявах – сярод якіх, натуральна, тэрарызм сапраўды зьяўляецца пагрозьлівым сымптомам, – каб стварыць сталы альянс дэмакратыяў-аднадумцаў з тэндэнцыяй да пашырэньня, мэтай якога была б усёахопная кампанія па ліквідацыі ўмоваў, якія ёсьць першапачатковай прычынай гэтага бязладзьдзя. У гэтым дачыненьні прыцягальны посьпех амэрыканскай дэмакратыі і яе вонкавая праекцыя ў выглядзе гуманнага акрэсьленьня глябалізацыі ўзмацнілі б легітымнасьць і эфэктыўнасьць амэрыканскай магутнасьці і палепшылі б здольнасьць ЗША пераадольваць – разам зь іншымі краінамі – як наступствы, так і прычыны сусьветнага бязладзьдзя.

Сусьветнае бязладзьдзе мае шэраг праяваў. Яго ўзмацняе ранейшая масавая галеча і грамадзкая несправядлівасьць, хоць яны не зьяўляюцца адзінымі прычынамі бязладзьдзя. У некаторых рэгіёнах мае месца этнічны прыгнёт, у іншых доўжацца міжплемянныя канфлікты, яшчэ недзе пануе рэлігійны фундамэнталізм. Гэта ўсё прыводзіць да выбухаў

гвалту і беспарадкаў на паўднёвай ускраіне Эўразіі, Блізкім Усходзе, у вялікай частцы Афрыкі і некаторых рэгіёнах Лацінскай Амэрыкі. Усё гэта спараджае нянавісьць і зайздрасьць да тых, хто пануе і працьвітае, і, зь вялікай імавернасьцю, будзе прыводзіць да яшчэ большай колькасьці ахвяраў, асабліва ў выніку распаўсюджаньня зброі масавага зьнішчэньня. У пэўных выпадках гэты гвалт куды менш пераборлівы, чым тэрарызм; штогод лік ахвяраў такога гвалту ідзе на дзясяткі тысяч, сотні тысяч застаюцца зьнявечанымі, пацярпелых жа – мільёны.

Прызнаньне глябальнага хаосу галоўным выклікам нашага часу патрабуе складаных, комплексных захадаў у адказ. А гэта – слабое месца, бо справа тычыцца амэрыканскай палітычнай арэны. Тутака не праходзіць тактыка гучных лёзунгаў, і гэтая праблема не ўзрушае амэрыканцаў так, як тэрарызм. Хаос цяжэй пэрсаналізаваць праз адсутнасьць дэманічнага ўвасабленьня накшталт Асамы бін Ладэна. Ня знойдзеш тут і эпічных паралеляў з барацьбой паміж дабром і злом, якія пасавалі да тытанічнага змаганьня з нацызмам і камунізмам. Аднак не зьвяртаць увагі на глябальны хаос значыць ігнараваць цэнтральную рэалію нашага часу – масавае палітычнае абуджэньне чалавецтва ў сусьветных маштабах і рост усьведамленьня ім невыноснай няроўнасьці ўва ўмовах жыцьця людзей.

Ключавое для будучыні пытаньне ў тым, ці будзе гэтае абуджэньне заўважана й скарыстана поўнымі нянавісьці антыамэрыканскімі дэмагогамі ці, наадварот, захапляльнае бачаньне сусьветнай супольнасьці з супольнымі інтарэсамі будзе атаясамлівацца з сусьветнай роляй Амэрыкі. Вядома, як у прыкладзе з вузкім засяроджаньнем на тэрарызьме, эфэктыўнае рэагаваньне на сусьветны хаос патрабуе большага даверу да амэрыканскай магутнасьці, якая цяпер ёсьць асноўнай перадумовай сусьветнай стабільнасьці. Але таксама патрэбныя доўгатэрміновыя мэтанакіраваныя высілкі з боку Амэрыкі, якія б мелі за аснову як уласны нацыянальны інтарэс, так і пачуцьце маральнай справядлівасьці, каб паступова трансфармаваць амэрыканскае дамінаваньне ў кааптыўную гегемонію – такую, у якой лідэрства ажыцьцяўлялася б хутчэй дзякуючы супольным

з сталымі саюзьнікамі перакананьнямі, чым праз агрэсіўнае дамінаваньне.

Але ня варта блытаць глябальную супольнасьць з супольнымі інтарэсамі і сусьветны ўрад. На дадзеным этапе гісторыі стварэньне сусьветнага ўраду ня можа быць практычна ажыцьцяўляльнай задачай. Амэрыцы, безумоўна, ня варта ахвяраваць сваім сувэрэнітэтам на карысьць нейкай наднацыянальнай улады ў сьвеце, якому не стае нават мінімальнага кансэнсусу для агульнага ўраду. Адзіным «сусьветным урадам», магчымым на нашым этапе, магла б стаць сусьветная дыктатура Амэрыкі, але яна, пэўна, была б нестабільнай і ўрэшце самазьнішчальнай авантурай. Сусьветны ўрад – гэта, у залежнасьці ад уяўленьня, ці то нязбыўная сьветлая мара, ці то цяжкі начны кашмар, але ніяк не сур’ёзная пэрспэктыва для некалькіх найбліжэйшых пакаленьняў.

Сусьветная ж супольнасьць з супольнымі інтарэсамі, з другога боку, рэч ня толькі магчымая і пажаданая – яна ўжо пачынае зьяўляцца. Часткова гэта вынік спантанных працэсаў, уласьцівых дынаміцы глябалізацыі, часткова вынік больш мэтанакіраваных высілкаў, асабліва з боку ЗША і ЭЗ, мэтай якіх ёсьць стварэньне шырэйшай сеткі яднальнага міжнароднага супрацоўніцтва, якое праводзіцца праз спэцыяльна створаныя ўстановы[2]. Двухбаковыя і шматбаковыя пагадненьні аб свабодным гандлі, форумы па рэгіянальнай палітыцы і фармальныя альянсы – усё гэта робіць свой унёсак у стварэньне сеткі ўзаемазалежных адносінаў, на дадзенай стадыі больш на рэгіянальным узроўні, але таксама ўсё больш на сусьветным. Сукупна яны прадстаўляюць натуральную эвалюцыю міждзяржаўных адносінаў у бок стварэньня нефармальнай структуры міжнароднага кіраваньня.

Гэты працэс патрабуе заахвочваньня, пашырэньня і стварэньня адпаведных установаў дзеля таго, каб прасоўваць усё большасьці ўсьведамленьне адзінства лёсу ўсяго чалавецтва. Вынікам супольных інтарэсаў ёсьць балянс паміж правамі і абавязкамі, наданьне бакам паўнамоцтваў, а ніякім чынам не дыктатура ня імі. Амэрыка знаходзіцца ў стане ўнікальнай прыдатнасьці для лідэрства ў гэтым працэсе, бо яна як упэўненая ў сваёй

[2] Стварэньне ўстоўнасьці Амэрыкі ў гэтым напрамку ня надасьць добра вядомая

магутнасьці, так і мае дэмакратычны ўрад. І калі эгаістычная гегемонія непазьбежна спараджае сваю антытэзу, то дэмакратыя спараджае сваю ўласную «заразу», а менавіта, дыктат здаровага сэнсу і рэалізму, паводле якога Амерыка мусіць падняцца на гэты покліч.

Практычнае пытаньне захаваньня сваёй пазыцыі залежыць, такім чынам, ад самога характару амэрыканскага сусьветнага лідэрства. Лідэрства мае на ўвазе ўсьведамленьне кірунку і мабілізуе іншых. Улада дзеля ўлады, дамінаваньне, накіраванае на ўвекавечаньне дамінаваньня, ніяк ня можа быць формулай працяглага посьпеху. Дамінаваньне як мэта сама па сабе – тупіковы шлях. Яно ўрэшце змабілізавала б супраць вагу апазыцыі, а ўласьцівая яму фанабэрыя прывяла б да самападманлівай гістарычнай сьлепаты. Найбліжэйшым пунктам прызначэньня для чалавецтва, як падавалася ў папярэдніх разьдзелах, будзе ці то паступовы і трывалы рухом сусьветнай супольнасьці з супольнымі інтарэсамі на працягу прыкладна двух дзесяцігодзьдзяў, ці то хуткае пагружэньне ў багну сусьветнага хаосу. Прыняцьце амэрыканскага лідэрства астатнімі краінамі – гэта абавязковая ўмова для таго, каб пазьбегнуць хаосу.

У рэальнасьці мудрае кіраваньне сусьветнымі справамі патрабуе, перш за ўсё, рацыянальнай і ўраўнаважанай палітыкі самаабароны з мэтай памяншэньня самых імаверных і грозных небясьпек для амэрыканскага грамадзтва без адначасовага разьдзіманьня паранаідальнага пачуцьця нацыянальнай неабароненасьці. Па-другое, патрабуецца цярплівая і працяглая праца па замірэньні найбольш ненадзейных рэгіёнаў плянэты, якія генэруюць вялікую долю эмацыйнай варожасьці, што распальвае гвалт. Па-трэцяе, патрабуецца настойлівая праца па ўцягненьні найбольш важных і прыязных рэгіёнаў плянэты ў адзіную сетку, што дапамагло б лякалізаваць і, калі гэта магчыма, ліквідаваць крыніцы найвялікшых небясьпек. Па-чацьвертае, неабходна прызнаць, што глябалізацыя – гэта нешта большае за простую магчымасьць лепш гандляваць і мець большыя прыбыткі, але зьява, што мае больш глыбокае, маральнае вымярэньне. І па-пятае, неабходна разьвіваць унутраную палітычную культуру, у якой актыўна

ліпрочная амэрыканскай публіцы. За першыя 150 гадоў існаваньня нацыі, паміж 1789 і 1939 гг., ЗША заключылі 799 фармальных дамоваў і 1182 ўрадовых пагадненьняў. Паміж 1939 і 1999 гг., то бок цягам апошніх 60 гадоў, ЗША заключылі 951 дамову і 14 555 ўрадовых пагадненьняў.

ўсьведамляліся б складаныя абавязкі, уласьцівыя глябальнай узаемазалежнасьці.

Патрэбнае нам кааптыўнае сусьветнае лідэрства патрабуе сьвядомага, стратэгічна пасьлядоўнага і патрабавальнага ў дачыненьні да саміх сябе высілку з боку чалавека, якога амэрыканцы абяруць сваім прэзыдэнтам, каго б яны ні выбралі. Прэзыдэнт мусіць ня проста эмацыйна ўзрушваць амэрыканцаў, ён мусіць і адукоўваць іх. Палітычная адукацыя ў вялікай дэмакратычнай дзяржаве ня можа ажыцьцяўляцца выключна праз патрыятычныя лёзунгі, застрашэньне ці культ самазакаханасьці. Кожны палітык мае такую спакусу, і паддацца ёй – значыць атрымаць імгненныя палітычныя дывідэнды. Але мусіраваньне праблемы тэрарызму скажае бачаньне сьвету грамадзтвам. Яно павялічвае рызыку апынуцца ў агрэсіўнай самаізаляцыі, не дае грамадзтву рэалістычнага разуменьня складанасьці сьвету і да таго ж спрыяе парушэньню цэласнасьці нацыянальнай стратэгіі. Амэрыка толькі тады зможа ажыцьцяўляць сусьветнае лідэрства доўгі час, калі яе грамадзтвам будзе дасягнутае лепшае разуменьне ўзаемазалежнасьці паміж бясьпекай Амэрыкі і бясьпекай сьвету, усьведамленьне натуральнасьці цяжару сусьветнага першынства, і, як выніку гэтага, – неабходнасьці стварэньня сталых дэмакратычных альянсаў для пераадоленьня сусьветнага бязладзьдзя.

Вялікі стратэгічны выбар, які стаіць перад Амэрыкай, прадугледжвае некалькі спэцыфічных высноваў. Асноўнай высновай ёсьць найвялікшая важнасьць дадатковага і больш цеснага амэрыканска-эўрапейскага глябальнага супрацоўніцтва. Узаемадапаўняльны, нават калі й трохі асымэтрычны, Атлянтычны альянс глябальных маштабаў натуральна адпавядае інтарэсам абодвух бакоў. З такім альянсам Амэрыка робіцца Супэрдзяржавай Плюс, а Эўропа можа спакойна працягваць працэс яднаньня. Без Эўропы Амэрыка ўсё адно застаецца дамінантнай сілай, але не ўсясьветна магутнай, а Эўропа без Амэрыкі – багатая, але бясьсільная. Некаторыя эўрапейскія лідэры і дзяржавы могуць мець спакусу шукаць адзінства праз антыамэрыканскае (ці, хутчэй, антыатлянтычнае) самаакрэсьленьне, але пры такой

спробе ў найбольшай прайгранцы апынуцца менавіта Амэрыка разам з Эўропаю. У якасьці Супэрдзяржавы Мінус Амэрыка будзе вымушана плаціць за сусьветнае лідэрства па значна вышэйшых рахунках, а Эўропа будзе мець значна менш шанцаў на аб'яднаньне, бо антыатлянтычная плятформа ніколі не зьбярэ большасьці сярод цяперашніх і патэнцыйных чальцоў ЭЗ.

Толькі супраца абодвух берагоў Атлянтыкі можа пракласьці сапраўды сусьветны курс, здольны рэальна палепшыць стан справаў у сьвеце. Дзеля гэтага Эўропа мусіць выйсьці з сваёй цяперашняй комы, усьвядоміць, што яе бясьпеку яшчэ цяжэй аддзяліць ад бясьпекі на ўсім сьвеце, чым бясьпеку Амэрыкі, і зрабіць непазьбежныя практычныя высновы. Яна ня можа быць у бясьпецы без Амэрыкі, ня можа аб'яднацца супраць Амэрыкі і можа больш-менш значна ўплываць на Амэрыку толькі пры жаданьні дзейнічаць разам з Амэрыкай. У агляднай будучыні «аўтаномная» вайскова-палітычная роля Эўропы па-за Эўропай, якая шмат абмяркоўвалася, застанецца вельмі абмежаванай, у значнай ступені таму, што эўрапейскія лёзунгі наконт яе зусім не адпавядаюць гатоўнасьці за гэтую ролю плаціць.

Адначасова з гэтым Амэрыка мусіць не паддавацца спакусе раскалоць свайго найважнейшага стратэгічнага партнэра. Няма «старой» ці «новай» Эўропы. Гэта таксама лёзунг, які ня мае ні геаграфічнага, ні гістарычнага зьместу. Больш за тое, паступовае аб'яднаньне Эўропы не пагражае Амэрыцы, наадварот, – яно вельмі спрыяльнае для Амэрыкі, бо павялічвае агульную вагу Атлянтычнай супольнасьці. Палітыка *divide et impera*, нават калі і спакусьлівая з практычнага боку для зьвядзеньня рахункаў, была б недальнабачнай і цалкам непрадуктыўнай.

Важная рэалія, зь якой таксама давядзецца сутыкнуцца – гэта тое, што Атлянтычны альянс ня можа быць ідэальна збалянсаваным партнэрствам 50/50. Сама ідэя такой дакладна наладжанай і сымэтрычнай роўнасьці ёсьць палітычным мітам. Нават у бізнэсе, дзе долі могуць быць акуратна падлічаны, расклад 50/50 ніколі не працуе. Дэмаграфічна маладзейшая, больш энэргічная і ў палітычным сэнсе адзіная Амэрыка ня можа быць палітычна і вайскова прыраўнанай да Эўропы, што

складаецца з розных старэючых нацыяў, якія хаця і яднаюцца, але яшчэ вельмі далёкія ад адзінства. Тым ня менш, кожны бок Атлянтыкі мае тое, што патрэбна другому. Амэрыка будзе заставацца ў агляднай будучыні адзіным гарантам сусьветнай бясьпекі, нават калі Эўропа значна палепшыць свае пакуль што невялікія вайсковыя магчымасьці. Эўропа можа ўзмацніць узброеныя сілы Амэрыкі, а аб'яднаныя эканамічныя рэсурсы ЗША і ЭЗ зробяць Атлянтычны альянс усёмагутным у глябальным маштабе[3].

Адзіны рэальны выбар, такім чынам, – гэта не эўрапейскі партнэр роўнай вагі і нават не супрацьвага, а эўрапейскі партнэр з важкім уплывам на фармаваньне і ажыцьцяўленьне сумеснай глябальнай палітыкі. Ажыцьцяўленьне ўплыву з крытычнай удзельнай вагою, нават калі гэта не адпавядае дакладна роўнай долі ў прыняцьці рашэньняў, патрабуе гатоўнасьці абодвух бакоў пры неабходнасьці дзейнічаць, дый, які мае большыя сродкі для дзеяньня ці большую ў дачыненьні зацікаўленасьць, урэшце мае больш важкі голас. Амэрыканскае першынство не абавязкова азначае аўтаматычна падпарадкаваную ролю Эўропы, а партнэрства не абавязкова азначае агульны паралюш у выпадках разыходжаньняў у базавых пытаньнях. Абодва бакі мусяць разьвіваць ёсьць і выпрацоўваць супольныя стратэгічныя пэрспэктывы і дадатковыя мэханізмы Атлянтычнага альянсу для сканцэнтраваньня сусьветнага палітычнага плянаваньня.

Хаця эканамічнае аб'яднаньне Эўропы ідзе хутчэй за палітычнае, ня рана падумаць аб пэўнай рэарганізацыі NATOўскага апарату прыняцьця рашэньняў, каб узяць да ўвагі палітычны абрыс ЭЗ, які паступова вымалёўваецца. Калі як эўрапейская канстытуцыя ўплятаецца ў тканіну эўрапейскага грамадзтва, будзе набываць форму агульнаэўрапейская палітычная арыентацыя. Паколькі пераважная большасьць чальцоў NATO – таксама чальцы ЭЗ, спосаб дзеяньня альянсу мусіць адлюстроўваць той факт, што Альянс робіцца ўсё менш складаным цэлым з 26 нацыянальных дзяржаваў (адна зь якіх значна магутнейшая за ўсе астатнія), і ўсё больш – «дзьвюхступеневай» паўночнаамэрыканска-

[3] Шмат якія эўрапейцы лічаць, што ЗША павінны рабіць больш, каб дагадзіць ім, дый, дзеля справядлівасьці, варта адзначыць, што амэрыканскае грамадзтва таксама абноўленага Атлянтычнага альянсу ўсьцяж падтрымлівае. Гл. Танюжы «Les sentinelles de la Liberte: l'Europe et l'Amerique au seuil du XXI siecle» (Paris, 2003).

эўрапейскай структурай. Непрыманьне гэтай рэаліі да ўвагі толькі ўмацуе прыхільнікаў спробы асобнай і патэнцыйна разьяднальнай пабудовы эўрапейскай сыстэмы абароны.

Трансатлянтычнае абмеркаваньне наступстваў гэтай новай рэаліі было б цалкам своечасовым. Мусяць абмяркоўвацца ня толькі доўгатэрміновыя стратэгічныя пляны для новаакрэсьленага і, мабыць, рэарганізаванага Альянсу, але і шырэйшыя глябальныя высновы з таго факту, што Амэрыка і Эўропа разам – сапраўды ўсёмагутныя. Гэты факт мае на ўвазе тое, што Эўропа павінна аддаць большую ўвагу працы для сусьветнай бясьпекі. Абрысы эўрапейскай бясьпекі ня могуць больш абмяжоўвацца эўрапейскім кантынэнтам і яго пэрыфэрыяй. NATO ўжо прысутнічае ў Аўганістане, ускосна ў Іраку, і ў хуткім часе, мабыць, зьявіцца ўздоўж палестынска-ізраільскай мяжы. Стратэгічны ахоп Атлянтычнага альянсу мусіць неўзабаве ўключыць усю Эўразію.

Шчыры амэрыканска-эўрапейскі трансатлянтычны альянс, заснаваны на супольнай глябальнай пэрспэктыве, мусіць зыходзіць з супольнага стратэгічнага разуменьня прыроды нашай эпохі, галоўнай пагрозы, якая стаіць перад сьветам, ролі і місіі Захаду ў цэлым. Гэта кліча да сур'ёзнага, глыбокага і ўдумлівага сумеснага дыялёгу, а не да ўзаемных абвінавачаньняў (часта заснаваных на мудрагелістай аргумэнтацыі наконт таго, што Амэрыка з Эўропай рушаць у фундамэнтальна супрацьлеглых напрамках). Праўда застаецца ў тым, што Захад у цэлым можа шмат чаго даць сьвету, але толькі тады, калі ён прыйдзе да адзінага бачаньня. Захаду цяпер не бракуе ні вайсковай моцы (Амэрыка мае яе зь лішкам), ні грашовых рэсурсаў (эўрапейскія фінансы параўнальныя з амэрыканскімі), – яна палягае ў няздольнасьці ўзьняцца над местачковымі праблемамі і вузкімі інтарэсамі. У час нечуваных дагэтуль выклікаў бясьпецы і дабрабыту чалавецтва заходняе кіраўніцтва, здаецца, ня мае канструктыўных ідэяў. Сьвядомае стратэгічнае абмеркаваньне можа ініцыяваць неабходныя палітычныя інавацыі глябальнага маштабу.

У любым разе, нават без такога грунтоўнага перагляду

трансатлянтычнаму альянсу неабходна прыняць больш канкрэтны плян дзеяньняў. У Эўропе ён заключаецца ў сталым пашырэньні як ЭЗ, так і NATO. Гэтае пашырэньне ўваходзіць цяпер у сваю трэцюю фазу. Першая, Варшаўскі раўнд, ставіла на мэце хуткае вырашэньне пытаньня геастратэгічнай спадчыны часоў халоднай вайны і выявілася ў наданьні Польшчы, Чэскай Рэспубліцы і Вугоршчыне сяброўства ў NATO; другая, Віленскі раўнд, сталася амаль адначасовым і геаграфічна абсяжным рашэньнем аб прыняцьці ў ЭЗ і ў NATO сямі і дзесяці новых чальцоў адпаведна; трэцяя, Кіеўскі раўнд, накіраваная далей на ўсход, да Ўкраіны і, мабыць, да Каўказу, у ім можа нават разглядацца сяброўства, урэшце, Расеі.

Па-за самой Эўропай Блізкі Ўсход ёсьць зонай вялікага амэрыканскага інтарэсу і непасрэднага дачыненьня да Эўропы. Шлях да палестынска-ізраільскага міру – у значнай ступені залежнага ад сумесных намаганьняў Амэрыкі і Эўропы – неаддзельны ад шляху да адбудовы Іраку ў якасьці стабільнай, незалежнай і дэмакратызаванай дзяржавы. Без вырашэньня абедзьвюх гэтых праблемаў мір у рэгіёне немагчымы[4]. Працуючы разам, ЗША і ЭЗ змогуць таксама больш эфэктыўна пазьбегнуць лабавога сутыкненьня паміж Захадам і ісламам і падтрымліваць пазытыўныя тэндэнцыі ўнутры ісламскага сьвету, што паспрыяла б яго канчатковай інкарпарацыі ў сучасны дэмакратычны сьвет.

Але сумеснае дасягненьне гэтай мэты патрабуе таксама тонкага разуменьня канфліктных плыняў унутры самога ісламу, і Эўропа ў гэтым дачыненьні мае перавагу над Амэрыкай. У дадатак амэрыканскае спачуваньне праблеме бясьпекі ізраільцянаў ураўнаважваецца эўрапейскім спачуваньнем палестынскай бядзе. Мірнае вырашэньне палестынска-ізраільскага канфлікту немагчымае без сумеснай да пільнай увагі і дэталёвага разгляду абодвух пунктаў гледжаньня. Мірнае вырашэньне палегчыць, у сваю чаргу, неабходныя і даўно адкладаныя пераўтварэньні ў сумежных арабскіх краінах і паменшыць варожасьць да Амэрыкі ў іх. Нежаданьне некалькіх амэрыканскіх урадаў мужна фасаваць вырашэньне гэтай балючай праблемы стала адным з асноўных фактараў эскаляцыі экстрэмізму ў дадзеным рэгіёне.

[4] Калі гэтая мэта ўсьпрыняцца супольнасьцю ўсё больш адзінакі ў тых фасаваньнях ЗША ў дачыненьні

Амэрыка, да таго ж, мае адыгрываць унікальную ролю ў прасоўваньні дэмакратыі ў арабскім сьвеце. На працягу больш як двух стагодзьдзяў Амэрыка была калыскай свабоды, прытулішчам для тых, хто шукаў свабоды, і крыніцай натхненьня для тых, хто хоча зрабіць свае краіны такімі ж свабоднымі, як Амэрыка. Падчас халоднай вайны Амэрыка была адзінай краінай, што выразна заявіла – праз рацыю «Свабодная Эўропа» – аб сваім непрыманьні падпарадкаваньня Цэнтральнай Эўропы маскоўскаму кантролю. Менавіта Амэрыка падчас прэзыдэнцтва Картэра разгарнула кампанію абароны правоў чалавека, што паставіла Савецкі Саюз у ідэалягічна абарончую пазыцыю. Амэрыка, такім чынам, распаўсюджвала агульную мару і надзею, не шукаючы прыліпухі для насаджэньня сваёй уласнай палітычнай культуры.

Гэта важна нагадаць цяпер, у час, калі ўсясьветна магутная Амэрыка публічна сьцьвярджае аб сваім рашучым намеры дэмакратызаваць ісламскія краіны. Гэта ня толькі высакародная, але і практычная мэта, бо распаўсюджваньне дэмакратыі ў цэлым супадае з канцэпцыяй глябальнага міру. Але таксама важна не забывацца пра асноўны ўрок гісторыі: любая самая справядлівая ідэя ў руках фанатыкаў выраджваецца ў сваю антытэзу. Менавіта гэта адбылося, калі рэлігійная ліхаманка ў сярэднявечнай Эўропе ператварыла выключна спагадлівую і мяккую ў сваёй сутнасьці веру ў жах Інквізыцыі. У больш блізкія часы тое самае здарылася, калі Французская рэвалюцыя, што адбывалася пад лёзунгамі «свабоды, роўнасьці–братэрства», стала сымбалізавацца гільятынай. А толькі што прамінулым стагодзьдзі людзі страшна мучыліся ад выраджэньня ідэяў сацыялізму ў нялюдзкі ленінска-сталінскі таталітарызм.

Прасоўваньне дэмакратыі, калі яно ажыцьцяўляецца з фанатычнай упартасьцю, якая ігнаруе гістарычныя і культурныя традыцыі ісламу, папросту прывядзе да адмаўленьня самой дэмакратыі. Сьцьвярджэньне таго, што Амэрыка пасьля Другой сусьветнай вайны пасьпяхова ўсталявала дэмакратыю ў Нямеччыне і ў Японіі, ігнаруе некаторыя важныя гістарычныя факты. Вось хаця б два зь іх. У 2003 г. у Бэрліне сьвяткавалася сотая гадавіна перамогі

да Ізраілю ў цэлым больш як права на адбілася на такіх амэрыканскага выказаваньня падтрыманьня вялікіх кампанію незаконных дзеяньнях Ізраіля супраць акупаваных палестынскіх тэрыторыях». За прыняцьце рэзалюцыі прагаласавалі 133 краіны-удзельніцы, і супраць 13. 13 устрымаліся. Гэтымі чатырма былі ЗША, Ізраіль, Мікранэзія і Маршалавы астравы. Усе бліжэйшыя саюзьнікі Амэрыкі ў Эўропе (у тым ліку Вялікая Брытанія) і ў Азіі

Нямецкай сацыялістычнай партыі ў муніцыпальных выбарах — ні больш ні менш у самой сталіцы кайзэраўскай Нямеччыны. Згода японцаў з амэрыканскімі пасьляваеннымі рэформамі стала магчымай толькі таму, што першым даў на іхняга ўласнага імпэратар Японіі. У абодвух выпадках меўся сацыяльны падмурак, на базе якога ЗША здолелі сканструяваць дэмакратычныя канстытуцыі.

Падрыхтаваны
Германія,
Японія,
Расея,
Бразылія ды
іншыя.

Ёсьць пэўныя, хаця і абмежаваныя падставы для пошуку падобнага вырашэньня пытаньня на Блізкім Усходзе; але рабіць гэта прыйдзецца зь вялікай гістарычнай цярплівасьцю і культурнай чуйнасьцю. Досьвед некаторых ісламскіх краінаў, што месьцяцца на пэрыфэрыі Захаду, асабліва Турэччыны, а таксама Марока і (нягледзячы на фундамэнталісцкае вонкавае аблічча) Ірану, паказвае, што калі дэмакратызацыя адбываецца праз арганічны рост, а не праз дагматычнае насаджэньне вонкавай сілай, ісламскія грамадзтвы паступова ўбіраюць і асымілююць дэмакратычную палітычную культуру.

Прымаючы да ўвагі надзвычайную ролю Амэрыкі ў палітычным жыцьці арабскага Блізкага Ўсходу пасьля акупацыі Іраку, вельмі важна, каб амэрыканскія палітыкі не спакусіліся дагматычнымі ідэямі прыўнесенай звонку і неадкладнай дэмакратызацыі, так бы мовіць, «дэмакратызацыі зьверху». Лёзунгі на гэтую тэму ў некаторым сэнсе адлюстроўваюць пагарду да ісламскіх традыцыяў. Для іншых палітыкаў гэтае памкненьне можа быць накшталт тактычнага ходу і зыходзіць з надзеі на тое, што засяроджанасьць на дэмакратызацыі Іраку адцягне ўвагу ад высілкаў, каб змусіць ізраільцянаў і арабаў да прыняцьця кампрамісаў, неабходных для мірнага ўрэгуляваньня іхнага канфлікту. Якой бы ні была матывацыя, фактам застаецца тое, што сапраўдная і сталая дэмакратыя найлепшым чынам ствараецца ўва ўмовах, якія паступова спрыяюць самастойным зьменам і ні ў якім разе не сумяшчаюць прымус з пасьпешлівасьцю. Першы падыход можа сапраўды трансфармаваць палітычную культуру, апошні ж можа толькі прымусіць да паліткарэктнасьці, якая па сутнасьці сваёй доўга не пратрывае.

Стратэгічная сфэра дзеяньня Атлянтычнага альянсу сягае

значна далей за Блізкі Ўсход. Новыя Сусьветныя Балканы – дуга крызісу, што распасьціраецца ад Пэрсідзкага заліву да Сыньцзяню – сталі б менш выбуховымі, калі б рэсурсы трох найбольш пасьпяховых рэгіёнаў сьвету – палітычна энэргічнай Амэрыкі, Эўропы, што эканамічна аб'ядноўваецца, і камэрцыйна дынамічнай Усходняй Азіі – аб'ядналіся ў сумесным намаганьні супрацьстаяць пагрозе бясьпецы, якую выклікае бязладзьдзе ў гэтым вялікім абшары. Гэтая пагроза абвастраецца атрыманьнем ядзернай зброі дзьвюма суседнімі, але варожымі дзяржавамі – Індыяй і Пакістанам, – кожная зь якіх пакутуе таксама ад унутранай напружанасьці. Амэрыцы разам з Эўропай прыйдзецца і надалей ціснуць на Японію і Кітай, каб яны больш высілкаў паклалі на супольную справу стрымліваньня разбуральных тэндэнцыяў. Абедзьве гэтыя краіны ўжо цяпер надта залежаць ад энэрганосьбітаў з Пэрсідзкага заліву і Цэнтральнай Азіі, і залежаць усё болей, таму яны ня могуць заставацца пабочнымі назіральнікамі перад абліччам агульнага выкліку з гэтага нестабільнага рэгіёну, які б мог стацца зыбкім пяском для адной, пазбаўленай хаўрусьнікаў, Амэрыкі.

Амэрыка ўжо значна пашырыла сваю вайсковую прысутнасьць у Эўразіі. Цяпер яна мае сталую вайсковую прысутнасьць у Аўганістане і ў некаторых цэнтральнаазіяцкіх краінах, што нядаўна атрымалі незалежнасьць. Беручы да ўвагі пашырэньне кітайскага эканамічнага і палітычнага ўплыву на Цэнтральную Азію, зону, якая да нядаўняга часу была пад выключна расейскім кантролем, патрэба ў шырэйшай міжнароднай каапэрацыі дзеля таго, каб пераадолець нестабільнасьць у гэтым рэгіёне, становіцца неадкладнай. І Японія, і Кітай павінны стаць перакананымі ў неабходнасьці рэальнага ўдзелу ў працы для палітычнай і грамадзкай стабілізацыі гэтага рэгіёну.

Тое, якую форму мае дынаміка сілаў на Далёкім Усходзе пры ўзаемадзеяньні паміж Амэрыкай, Японіяй і Кітаем, таксама ўплывае на сусьветную стабільнасьць. ЗША павінны намагацца ператварыць раўнавагу, якая зьявілася паміж імі, Японіяй і Кітаем, у больш структурныя адносіны ў сфэры бясьпекі. Геаграфічна Азія аддалена нагадвае Эўропу перад Першай

сусьветнай вайной. Амэрыка стабілізавала Эўропу, але яна ўсё яшчэ стаіць перад пагрозай структурнага крызісу ў Азіі, дзе некалькі асноўных дзяржаваў усё яшчэ спаборнічаюць паміж сабой, хаця і пад ускосным кантролем пэрыфэрыйнай стратэгічнай прысутнасьці Амэрыкі. Гэтая прысутнасьць замацоўваецца амэрыканска-японскімі сувязямі, але ўздым Кітаю, што дамінуе ў гэтым рэгіёне, і непрадказальнасьць Паўночнай Карэі паказваюць на неабходнасьць больш актыўнай палітыкі ЗША, накіраванай на стварэньне, як мінімум, трохбаковай структуры бясьпекі. Як даводзілася вышэй, такая трохбаковая раўнавага, каб стацца трывалай, запатрабуе большага ўдзелу Японіі ў міжнародных справах, і той прыйдзецца паступова прыняць на сябе шырэйшы спэктар вайсковых абавязкаў. Стварэньне такой раўнавагі можа, у сваю чаргу, выклікаць стварэньне трансэўразійскай шматбаковай структуры бясьпекі для працы над новымі вымярэньнямі глябальнай бясьпекі. Няўдача з уцягненьнем Кітаю і Японіі ў структуру бясьпекі хаця б дэ-факта можа ўрэшце выклікаць небясьпечны тэктанічны зрух, які прывядзе, магчыма, да аднабаковай рэмілітарызацыі Японіі, якая ўжо цяпер мае патэнцыял для таго, каб вельмі хутка зрабіцца ядзернай дзяржавай, у дадатак да вельмі цяжкой праблемы, якую ўяўляе сабой імкненьне Паўночнай Карэі стварыць свой уласны ядзерны арсэнал. Патрэба ў калектыўным рэгіянальным адказе Паўночнай Карэі ўзмацняе больш агульную ідэю таго, што толькі кааптыўная амэрыканская гегемонія зможа эфэктыўна даваць рады з хуткім распаўсюджаньнем зброі масавага зьнішчэньня як сярод дзяржаваў, так і сярод экстрэмісцкіх арганізацыяў.

Амэрыцы давядзецца працаваць з гэтымі дылемамі ў кантэксьце гістарычнага альянсу паміж амэрыканскай глябальнай сілай і глябальнай узаемазалежнасьцю ў эпоху імгненных камунікацыяў. Пошук балянсу паміж існуючай гегемоніяй адной дзяржавы і нованароджанай сусьветнай супольнасьцю, паміж дэмакратычнымі каштоўнасьцямі і імпэратывамі глябальнай улады будзе і надалей асноўнай амэрыканскай дылемай. Глябалізацыя, якую Амэрыка заахвочвае і прасоўвае, можа паспрыяць зьмяншэньню сусьветнага бязладзьдзя, але толькі калі яна будзе ўзмацняць, а не аслабляць бедныя краіны,

і толькі калі яна будзе ажыцьцяўляцца ў зьвязцы з гуманізмам, а не з аднымі толькі эгаістычнымі эканамічнымі інтарэсамі. Стаўленьне ЗША да шматбаковых абавязаньняў, асабліва да тых, якія не супадаюць з больш вузкімі і непасрэднымі задачамі Амэрыкі, зьяўляюцца, такім чынам, лякмусавай паперкай для праверкі гатоўнасьці прасоўваць глябалізацыю, якая б сапраўды вяла да справядлівай узаемазалежнасьці, а не аднабаковай залежнасьці[5].

Амэрыканскі паслужны сьпіс апошніх гадоў у дачыненьні да шматбаковых абавязаньняў стварае агульнае ўражаньне, што роўныя правілы гульні ня ёсьць галоўнай мэтай Амэрыкі.

Амэрыка мусіць лепш усьвядоміць, што атаясамліваньне яе зь несправядлівай вэрсіяй глябалізацыі можа падштурхнуць сусьветную рэакцыю, якая прывядзе да ўзьнікненьня новай ідэалёгіі антыамэрыканізму. Бясьпека залежыць ня толькі ад вайсковай моцы, але, у гэтую эру глябальнага палітычнага абуджэньня, і ад кірункаў грамадзкіх жарсьцяў і фанатычных нянавісьцяў; і тое, як Амэрыка акрэсьліць і будзе праводзіць глябалізацыю, наўпрост адаб’ецца на яе доўгатэрміновай бясьпецы.

Таксама Амэрыцы сьлед быць сьведамай нечаканых палітычных наступстваў яе выключнага культурнага ўплыву на астатні сьвет. Прыцягальнасьць сусьветнай магутнасьці ЗША мае нечаканым вынікам перабольшаныя спадзяваньні на ЗША з боку народаў сьвету. Яны ацэньваюць Амэрыку вышэй за іншыя краіны і нават вышэй за сваю ўласную краіну. Антыамэрыканізм мае шмат атрыбутаў падманутага спадзеву. Як вынік, расчараваныя асабліва разьюшваюцца, калі яны адчуваюць, што Амэрыка робіць недастаткова для таго, каб палепшыць іх уласнае гаротнае становішча. Такім чынам, амэрыканская культурная спакуса бывае фактарам палітычнай дэстабілізацыі, хоць Амэрыка імкнецца дасягнуць сусьветнай стабільнасьці дзеля сваіх шырэйшых стратэгічных інтарэсаў. Толькі калі Амэрыка зробіць большую стаўку на сапраўды супольную для ўсіх краінаў справу, яна зможа атрымаць палітычную карысьць з культурнай рэвалюцыі, якую яна разгортвае на ўсім сьвеце.

[5] Хаця ў некаторых адносінах пярэчаньні ЗША наконт міжнародных канвэнцыяў і могуць мець нейкі сэнс, сьпіс пагадненьняў, да якіх ЗША за апошнія гады не далучыліся, нясе пагрозьлівае адценьне: Кіёцкі пратакол па кантролі за кліматам, Міжнародны крымінальны суд, Канвэнцыя па правах дзіцяці (пярэчаньне ЗША было падтрыманае

Паколькі надзвычай важнай крыніцай глябальнай прывабнасьці Амэрыкі, а значыць і яе магутнасьці, ёсьць магнэтычная прыцягальнасьць яе дэмакратычнай сыстэмы, вельмі істотная задача амэрыканцаў – стараннае падтрыманьне крохкага балянсу паміж іхнымі грамадзянскімі правамі і вымогамі ихнай нацыянальнай бясьпекі. Гэта лягчэй рабіць, калі войны ведуцца, а іх кошты сацыяльна прымальныя. Але вострая грамадзкая рэакцыя на злачынства 11 верасьня, магчыма, наўмысна разьдзьмутая з палітычных матываў, можа прывесьці да глыбокага пераасэнсаваньня гэтага балянсу. Мэнталітэт вайсковай дыктатуры можа атруціць любую дэмакратыю. Так, што зрабілі з Ізраілем рэгіянальныя канфлікты, можа стацца з Амэрыкай страх, узмоцнены сусьветнай варожасьцю.

З гэтага вынікае, што ўнутраная бясьпека мусіць фармавацца так, каб гэта і ўзмацняла сусьветную магутнасьць Амэрыкі, і спрыяла сусьветнай легітымізацыі гэтай магутнасьці. Паўтараючы тое, што было выкладзена вышэй, трэба сказаць, што цяпер Амэрыка ўцягнутая ў трэцюю вялікую спрэчку з часоў яе ўзьнікненьня як незалежнай краіны, заклапочанай сваёй абаронай. Гэтая спрэчка натуральным чынам тычыцца здольнасьці выжываньня грамадзтва ў новых умовах распаўсюджваньня зброі масавага зьнішчэньня і стварэньня яе новых відаў, што спрыяе разрастаньню сусьветнага бязладзьдзя і боязі тэрарызму.

Гэта новыя гістарычныя ўмовы для Амэрыкі. Яны ствараюць найцясьнейшую залежнасьць паміж бясьпекай самой Амэрыкі і агульным станам рэчаў на ўсім сьвеце. Роля Амэрыкі ў сусьветнай бясьпецы і глябальная прысутнасьць Амэрыкі настолькі вялікія, што гэтая краіна мае права клапаціцца пра сваю бясьпеку ў большай ступені, чым іншыя краіны. Ёй патрэбныя сілы, здольныя да разгортваньня ў любым пункце сьвету. Ёй патрэбнае павышэньне эфэктыўнасьці спэцслужбаў (замест марнаваньня сродкаў на агромністы бюракратычны апарат, што фармуе бясьпеку ўнутры краіны), каб пагрозы Амэрыцы можна было прадбачыць. Амэрыка мусіць падтрымліваць адчувальную тэхналягічную перавагу над сваімі патэнцыйнымі супернікамі як у сваіх стратэгічных, так і звычайных узброеных сілах. Але яна таксама мусіць

акрэсьліваць сваю бясьпеку так, каб гэта адпавядала ўласным інтарэсам іншых краінаў. Гэтая ўсёабдымная задача магла б вырашацца больш эфэктыўна, калі б сьвет разумеў, што вялікая амэрыканская стратэгія накіраваная на стварэньне глябальнай супольнасьці з супольнымі інтарэсамі.

Крэпасьць на пагорку можа стаяць толькі ў поўнай самоце, кідаючы пагрозьлівы цень ад сваіх муроў на ўсю акругу. У такой якасьці Амэрыка сталася б цэнтрам нянавісьці ўсяго сьвету. Горад на пагорку, наадварот, асьвятліў бы сьвет надзеяй на прагрэс чалавецтва – але толькі пры ўмове, што гэты прагрэс бачны ўсім і дасягальны для ўсіх. «Вы – сьвятло сьвету. Ня можа места схавацца, стоячы на версе гары...Гэтак няхай сьвеціць сьвятло вашае перад людзьмі, каб яны бачылі добрыя ўчынкі вашыя»[6]. Нясі сьвятло, Амэрыка!

Пераклаў з амэрыканскай Аляксей Ігнатовіч

[6] Мацьвей 5:14 – 16.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[redacted] (Ліпень'2000)

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image] [image] [image] [

эфэктыўнасьці,
маральнасьці
і
пажаданасьці
яе
ўжываньня –
усё больш
разыходзяцца.
Эўропа
паступова
адмаўляецца
ад сілы ці,
калі сказаць
дакладней,
рухаецца па-
за сілу ў
кірунку
самадастатковага
сьвету
законаў і
правілаў,
транснацыянальных
пагадненьняў
і
супрацоўніцтва.
Яна
ўваходзіць у
постгістарычны
рай міру і
адноснага
працьвітаньня,
увасабленьне
«вечнага
міру»
Імануіла
Канта.
Тымчасам
Амэрыка
загрузла ў
гісторыі,

ужываючы
сілу ў
анархічным
Гобсавым
сьвеце, у
якім нельга
спадзявацца
на
міжнародныя
законы і
правілы, дзе
сапраўдная
бясьпека і
абароненасьць,
як і
прасоўваньне
лібэральнага
ладу,
залежаць ад
наяўнасьці і
выкарыстаньня
вайсковай
магутнасьці.
Менавіта
таму ў
асноўных
стратэгічных
і
міжнародных
пытаньнях
нашага часу
амэрыканцы
– з Марсу, а
эўрапейцы –
з Вэнэры*.

Яны згаджаюцца па ўсё меншым коле пытаньняў і разумеюць адны другіх усё менш. І такі стан рэчаў не часовы, гэта ня вынік адных амэрыканскіх выбараў ці аднаго катастрафічнага здарэньня. Прычыны трансатлянтычнага ідэйнага расколу

глыбокія, маюць даўнюю гісторыю, і гэты раскол наўрад ці зьнікне хутка. У тым, што тычыцца вылучэньня нацыянальных прыярытэтаў, выяўленьня пагрозаў, акрэсьленьня задачаў, фармаваньня і ажыцьцяўленьня замежнай і абароннай палітыкі, дарогі ЗША і Эўропы разышліся.

Гэты кантраст выразьней відаць амэрыканцу, які жыве ў Эўропе. Эўрапейцы часьцей заўважаюць гэтыя адрозьненьні, мабыць, таму, што больш іх баяцца. Эўрапейскія інтэлектуалы амаль аднадушныя ў меркаваньні, што амэрыканцы і эўрапейцы больш не падзяляюць адзінай «стратэгічнай культуры». Найбольш абагульненым і карыкатурным бачаньнем Амэрыкі эўрапейцамі ёсьць вобраз краіны, апантанай «культураю сьмерці». Ваяўнічы тэмпэрамэнт амэрыканцаў лічыцца натуральным прадуктам грамадзтва гвалту, у якім у кожнага ёсьць стрэльба і дзе налева й направа ўжываецца сьмяротнае пакараньне. Але нават тыя, хто ўнікае такіх абагульненьняў, згодныя, што існуюць глыбокія адрозьненьні ў ажыцьцяўленьні замежнай палітыкі Злучанымі Штатамі і Эўропаю.

ЗША, на іх думку, у адрозьненьне ад Эўропы, больш ахвотна ўжываюць сілу і менш пераборлівыя ў дыпляматыі. Большасьць амэрыканцаў бачыць сьвет як барацьбу паміж дабром і злом, паміж сябрамі і ворагамі, у той час як эўрапейцы схільныя бачыць больш складаную карціну. Сутыкаючыся з рэальнымі ці патэнцыйнымі праціўнікамі, амэрыканцы звычайна аддаюць перавагу палітыцы прымусу, а не перакананьня, робячы акцэнт на карных санкцыях замест пабуджэньня да лепшых паводзінаў, ужываюць хутчэй бізун, чым пернік. Амэрыканцы імкнуцца да канчатковасьці ў міжнародных справах: праблемы вырашаныя, пагрозы зьнішчаныя. І, вядома, амэрыканцы аддаюць перавагу аднабаковасьці ў міжнародных справах. Яны менш схільныя дзейнічаць празь міжнародныя арганізацыі, такія, як ААН, менш схільныя да супрацоўніцтва зь іншымі дзяржавамі, скептычныя ў дачыненьні да міжнароднага права і гатовыя пераступаць празь яго, калі бачаць такую неабходнасьць ці папросту калі лічаць гэта карысным[1].

Эўрапейскі падыход да праблемаў танчэйшы й складанейшы, настойваюць у Парыжы й Бэрліне. Эўропа намагаецца ўплываць на іншых вытанчана і ўскосна. Яна талерантней стаўіцца да паразаў, цярпімей – да прамаруджваньня з вырашэньнем

[1] Адзін далучыць фірма, які навіны

канфліктаў. Яна ў асноўным аддае перавагу мірным падыходам на праблемы, перамовам, дыпляматыі і пераконванню, а не ваенскі прымусу. Эўрапейцы больш схільныя апэляваць да міжнароднага права, міжнародных канвэнцыяў і міжнароднай грамадзкай думкі пры вырашэньні спрэчных пытанняў. Яны намагаюцца выкарыстоўваць гандлёвыя і эканамічныя для выбудоўваньня сувязяў паміж краінамі. Яны часта глядзяць на працэс над мэтаю, лічачы, што менавіта працэс урэшце-рэшт перайсьці ў якасьць мэты.

Гэтыя карыкатурныя партрэты эўрапейцаў і амэрыканцаў – дваістае абагульненьне, з доляю перабольшваньняў і спрашчэньняў. Немагчыма абагульніць усіх эўрапейцаў. Погляды брытанцаў на сілу, напрыклад, могуць быць больш «амэрыканскімі», чым у кантынэнтальных эўрапейцаў. Іхняя імпэрская гістарычная памяць, іхнія «асаблівыя адносіны» з ЗША, што сфармаваліся падчас Другой сусьветнай вайны і на золку халоднай вайны, і іхняя гістарычна адстароненая пазыцыя ў дачыненьні да рэшты Эўропы аўтаматычна спрыяюць іх адасобленасьці. Нельга таксама ляпіць у адзіны камяк французаў і немцаў. Першыя ганарлівыя і незалежныя, хаця і надзіва безабаронныя, у другіх самаўпэўненасьць мяшаецца зь зьняверанасьцю ўва ўласныя сілы, спароджанай Другой сусьветнай вайной. Але народы Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропы маюць гісторыю, цалкам адрозную ад гісторыі іх заходнеэўрапейскіх суседзяў; у іх сьвядомасьці глыбока ўкаранёны страх перад расейскім панаваньнем і, адпаведна, больш амэрыканскі погляд на Гобсавы рэаліі. І, вядома ж, погляды на рэчаіснасьць значна розьняцца ўнутры саміх нацыяў абапал Атлянтыкі. Французскія галісты – не абое рабое з французскімі сацыялістамі. У Штатах дэмакраты часта падаюцца большымі «эўрапейцамі» за рэспубліканцаў. Дзяржсакратар Колін Паўэл можа падацца больш «эўрапейскім» за міністра абароны Дональда Рамсфэльда. Многія амэрыканцы, асабліва з асяродзьдзя інтэлектуальнай эліты, заклапочаныя «цьвердалобасьцю» замежнай палітыкі ЗША ня менш за любога эўрапейца, а некаторыя эўрапейцы шануюць моц ня менш за амэрыканцаў.

Тым ня менш, гэтыя карыкатурныя партрэты сапраўды

адлюстроўваюць асноўную ісьціну: цяпер ЗША і Эўропа фундамэнтальна розьняцца. Паўэл і Рамсфэльд маюць больш супольнага, чымсьці Паўэл і міністры замежных справаў Францыі, Германіі ці нават Вялікай Брытаніі. Калі справа даходзіць да ўжываньня сілы, пераважная большасьць амэрыканскіх дэмакратаў мае больш супольнага з рэспубліканцамі, чымсьці зь якімі-кольвек эўрапейскімі партнэрамі. У 1990-я гады нават амэрыканскія лібэралы былі больш схільнымі прызнаць неабходнасьць ужываньня сілы і больш маніхейскімі ў сваім бачаньні сьвету, чым асноўная маса эўрапейскіх лібэралаў. Клінтанаўская адміністрацыя бамбіла Ірак, а таксама Аўганістан і Судан. Можна з пэўнасьцю сказаць, што большасьць эўрапейскіх урадаў на такое не пайшлі б, і эўрапейцы былі сапраўды зьбянтэжаныя ваяўнічасьцю амэрыканцаў. Ці бамбілі б эўрапейцы Бялград у 1999 годзе, калі б Злучаныя Штаты іх да таго не прымусілі – гэта цікавае пытаньне[2]. У кастрычніку 2002 году большасьць дэмакратаў у Сэнаце падтрымала рэзалюцыю, якая ўпаўнаважвала прэзыдэнта Буша на вайну супраць Іраку, у той час як іх палітычныя адпаведнікі ў Францыі, Нямеччыне, Італіі, Бэльгіі і нават у Аб'яднаным Каралеўстве глядзелі на гэта зь зьдзіўленьнем і лёгкім жахам.

У чым жа крыніца гэтай адрознасьці поглядаў на стратэгічныя пэрспэктывы? Гэтаму пытаньню надавалася замала ўвагі ў апошнія гады. Дасьледчыкі замежнапалітычных аднаўленьне самі палітыкі абапал акіяну ці адмаўлялі існаваньне сапраўдных разыходжаньняў, ці зводзілі цяперашнія рознагалосьсі да сьмеху, адзначаючы, што і ў мінулым Атлянтычны альянс перажываў моманты ўнутранай напружанасьці. Тыя ж, хто паставіўся да цяперашніх рознагалосьсяў больш сур'ёзна, асабліва эўрапейцы, звычайна пераймаюцца выпадамі ў бок Злучаных Штатаў, чым спрабуюць зразумець, чаму ЗША робяць тое, што робяць, ці, наадварот, чаму Эўропа робіць тое, што робіць. Надышоў час прапусьціць далей за адмаўленьне і абразы і паглядзець праблеме ў вочы.

Гэтыя адрозьненьні ў стратэгічнай культуры не вынікаюць натуральным чынам з нацыянальных характараў амэрыканцаў і эўрапейцаў, як бы многія эўрапейцы і некаторыя амэрыканцы

[2] Выпадкам
[2] Выпадкам
[2] Выпадкам

не былі перакананыя ў адваротным. Тое, што эўрапейцы
сваёй больш стратэгічнай культурай міру з гістарычнага
пункту гледжаньня – зьява нядаўняя. Яна ўяўляе сабой
эвалюцыйнага адыходу ад зусім іншай стратэгічнай культуры,
што панавала ў Эўропе на працягу стагодзьдзяў і, прыкладна,
Першай сусьветнай вайны. Эўрапейскія ўрады і народы,
энтузіязмам кінуліся ў гэтую кантынэнтальнага маштабу
вайну, верылі ў Machtpolitik, сілавую палітыку. Яны былі
апантанымі нацыяналістамі, гатовымі папулярызаваць
нацыянальную ідэю сілаю зброі, як немцы ў час Бісмарка.
папулярызаваць роўнасьць і братэрства агнём і мячом, як
спрабаваў гэта рабіць трохі раней Напалеон, ці папулярызаваць
даброты лібэральнай цывілізацыі гарматамі, як тое рабілі
брытанцы цягам XVII, XVIII і XIX стагодзьдзяў. Эўрапейскі
парадак, утвораны пасьля аб'яднаньня Нямеччыны ў 1871 м,
быў, «як усе яго папярэднікі, створаны вайною». Карані
цяперашняга эўрапейскага сьветапогляду, як і карані самога
Эўразьвязу, можна прасачыць аж да эпохі Асьветніцтва,
палітыка эўрапейскіх супэрдзяржаваў у апошнія трыста
зусім не адпавядала візіянэрскім мадэлям філёзафаў і
фізіякратаў.

Што тычыцца Амэрыкі, то і ёй не заўжды была ўласьцівая
цяперашняя перабольшаная стаўка на сілу ў якасьці
інструмэнту міжнародных адносінаў, і яна не заўжды грабавала
нормамі міжнароднага права на карысьць аднабаковасьці.
Амэрыканцы – таксама дзеці Асьветніцтва, і ў раньнія гады
Рэспублікі яны былі самымі палымянымі прыхільнікамі гэтай
веры. У часы свайго зараджэньня ЗША былі вялікай
эўрапейцаў-асьветнікаў, што з адчаем назіралі за сваім
кантынэнтам і разглядалі Амэрыку як найлепшае месца, дзе
«розум і чалавечнасьць маглі б разьвівацца хутчэй, чым дзе
інш». Мо не заўжды практыка, але рыторыка замежнай палітыкі
ЗША раньняга пэрыяду былі прасякнутыя прынцыпамі
Асьветніцтва. Амэрыканскія палітыкі канца XVIII стагодзьдзя
таксама як і сёньняшнія эўрапейскія палітыкі, услаўлялі
гандаль як гаючы бальзам на раны міжнародных канфліктаў і
ставілі міжнароднае права і грамадзкую думку вышэй за
праявы грубай моцы. Маладыя Злучаныя Штаты ўжывалі сілу
супраць слабейшых народаў паўночнаамэрыканскага

Тым ня менш
чым больш
свайго
сьцяжэньня
прыкладна,
годы, якія з
пэўнай
канчатковай
адміністрацыі.
(Варта
таксама
ўдасканальваць
рабіўшых
прыхільнікаў
1871-м,
ня
цяперашніх
ніякіх
гэтага
гадоў
каўсаўскага
крызісу.)

Варта
таксама
заўважыць,
што нядаўняга
басьнійскага
канфлікту
эўрапейцы,
у
адрозьненьне
ад
амэрыканцаў,
ужывалі
піхоту,
пляцдзяры
на ніжнюю
эфэктыўнасьць
гэтага роду
войскаў.

кантынэнту, але калі справа датычыла адносінаў з эўрапейскімі волатамі, яны заяўлялі аб сваёй адмове ад грубай моцы і асуджалі палітыку эўрапейскіх імпэрыяў XVIII і XIX стагодзьдзяў як атавістычную.

Гэтая акалічнасьць прывяла некаторых гісторыкаў да памылковага меркаваньня, што бацькі-заснавальнікі ЗША былі ўтапістамі і што яны шчыра разглядалі палітыку з пазыцыі сілы як «чужую і агідную» і папросту «былі няздольнымі спасьцігнуць важнасьць сілавога фактару ў міжнародных адносінах». Але Джордж Вашынгтон, Аляксандар Гамільтан, Джон Адамс і нават Томас Джэфэрсан не былі ўтапістамі. Яны былі добра дасьведчанымі ў пытаньнях міжнароднай сілавой палітыкі. Яны маглі гуляць па эўрапейскіх правілах, калі дазвалялі ўмовы, і часта шкадавалі, што ня маюць дастаткова моцы для таго, каб весьці гэтую гульню больш эфэктыўна. Але яны былі таксама дастаткова рэалістычнымі людзьмі, каб здаваць сабе справу з сваёй слабасьці, і як сьвядома, так і падсьвядома яны карысталіся стратэгіяй слабых, каб неяк захавацца ў гэтым сьвеце. Яны кляймілі палітыку з пазыцыі сілы і заяўлялі аб сваім непрыманьні вайны і ваеннай сілы, бо менавіта ў гэтых сфэрах яны значна саступалі вялікім эўрапейскім дзяржавам. Яны ўсхвалялі даброты і станоўчы ўплыў гандлю, у сфэры якога амэрыканцы маглі канкураваць больш ці менш на роўных. Яны апэлявалі да міжнароднага права як да найлепшага сродку рэгуляваньня паводзінаў дзяржаваў, ведаючы, што яны амаль ня маюць іншых сродкаў для стрымліваньня Англіі і Францыі. З працаў Ватэля амэрыканскія палітыкі запомнілі, што «моц ці слабасьць… нічога ня значаць. Карла – такі ж чалавек, як і волат; маленькая рэспубліка – гэта такая ж сувэрэнная дзяржава, як наймагутнейшае з каралеўстваў». Пазьнейшыя пакаленьні амэрыканцаў мелі і маюць значна больш моцы і ўплыву на міжнароднай арэне, і яны не заўсёды так аддана веравалі ў роўнасьць усіх перад міжнародным правам і абавязковасьць яго для ўсіх. Але пры канцы XVIII і на пачатку XIX стагодзьдзяў менавіта эўрапейскія супэрдзяржавы былі супраць такіх абмежаваньняў.

Праз два стагодзьдзі амэрыканцы і эўрапейцы памяняліся

месцамі і пэрспэктывамі. Гэта адбылося часткова таму, што за тыя дзьвесьце гадоў і асабліва за апошнія некалькі дзесяцігодзьдзяў адбыўся неабыякі зрух у раўнавазе сілаў. Калі ЗША былі слабымі, яны прытрымліваліся стратэгіі ўскоснасьці, стратэгіі слабасьці; цяпер, калі ЗША – магутная дзяржава, яна паводзіць сябе як усе магутныя дзяржавы. Калі вялікія дзяржавы Эўропы былі моцнымі, яны верылі ў моц і вайсковую славу. Цяпер яны глядзяць на сьвет вачамі слабейшых. Гэтыя вельмі адрозныя пункты гледжаньня натуральным чынам спарадзілі розныя стратэгічныя мысьленьні, розныя ацэнкі пагрозаў і адпаведных сродкаў рэагаваньня на гэтыя пагрозы, розныя прынцыпы падліку выгодаў і розныя погляды на каштоўнасьць і значэньне міжнароднага права і міжнародных арганізацыяў.

Але розьніца ў канцэпцыях улады толькі часткова тлумачыць тую прорву, якая пралягла паміж ЗША і Эўропай. Бо, разам з натуральнымі наступствамі сілавой дыспрапорцыі, ЗША і Эўропу падзяляе таксама шырокая ідэалягічная бездань. Эўрапейцы, дзякуючы ўнікальнаму гістарычнаму досьведу папярэдняга стагодзьдзя, кульмінацыяй якога стала стварэньне Эўразьвязу, разьвілі корпус ідэалаў і прынцыпаў, датычных карысьці і маральнасьці ўлады, адрозны ад корпусу ідэалаў і прынцыпаў амэрыканцаў, якія ня мелі такога досьведу. І стратэгічны разрыў паміж ЗША і Эўропай падаецца сёньня шырэйшым, чым калі-кольвек раней, ён расьце з грознай хуткасьцю менавіта таму, што матэрыяльныя і ідэалягічныя адрозьненьні маюць тэндэнцыю да ўзаемаўзмацненьня. І можа стацца так, што гэтую тэндэнцыю немагчыма будзе павярнуць назад.

РОЗЬНІЦА Ў КАНЦЭПЦЫЯХ УЛАДЫ

Некаторыя могуць спытацца: «А што ў гэтым новага»? Сапраўды, вайсковая магутнасьць Эўропы заняпала не адразу, гэты заняпад быў доўгім і паступовым. Самы скрышальны ўдар па эўрапейскай магутнасьці і самаацэнцы быў нанесены амаль стагодзьдзе таму, падчас сусьветнай вайны, якая выбухнула ў 1914-м. Гэты жудасны канфлікт спустошыў трох зь пяці

эўрапейскіх волатаў – Нямеччыну, Аўстра-Вугоршчыну і Расею, якія былі астоямі раўнавагі сілаў на кантынэнце з 1871 году. Гэтая вайна падарвала эканоміку Эўропы, што трапіла ў шматгадовую залежнасьць ад амэрыканскіх банкіраў. Галоўнае ж, вайна падтачыла волю і дух Вялікай Брытаніі і Францыі, прынамсі, да 1939 году, калі Брытанію зноў абудзіў Чэрчыль, але было ўжо позна і не было ніякай магчымасьці прадухіліць наступную сусьветную вайну. У 1920 годзе Брытанія знаходзілася ў шокавым стане праз тое, што згубіла на палёх бітваў, пад Пасшэндэлем і іншых, амаль цэлае пакаленьне моладзі, і пад канец вайны ангельскі ўрад пачаў імклівую дэмабілізацыю свайго войска. Спужаная Францыя рабіла ўсе намаганьні, каб захаваць належны вайсковы патэнцыял, каб стрымаць непазьбежнае, на яе думку, адраджэньне нямецкай магутнасьці і натуральны ў такім выпадку рэваншызм. Напачатку 1920-х Францыя адчайна шукала альянсу зь Вялікай Брытаніяй, але ангельска-амэрыканскае забавязаньне абараняць Францыю, уключанае ў тэкст Вэрсальскага пагадненьня, разьвеялася як сон, калі Сэнат ЗША адмовіўся яго ратыфікаваць. Тымчасам траўмаваныя брытанцы, насуперак здароваму сэнсу, працягвалі аж да 1934 году настойваць на тым, каб Францыя раззброілася да ўзроўню Нямеччыны. Адзіным, хто папярэджваў аб «жудаснай небясьпецы» «пастаяннага настойваньня на самааслабленьні французаў», быў Уінстан Чэрчыль.

Міжваенны пэрыяд быў часам, калі Эўропа ўпершыню паспрабавала адмовіцца ад палітыкі з пазыцыі сілы, паспрабавала ператварыць слабасьць у каштоўнасьць. Замест таго каб пакладацца на палітыку сілы, як гэта рабілася раней, эўрапейскія краіны, што перамаглі ў Першай сусьветнай вайне, даверыліся «калектыўнай бясьпецы» і яе ўвасабленьню ў выглядзе ўстановы – Лізе Нацыяў. «Нашай мэтай, – як казаў адзін зь вядучых функцыянэраў Лігі, – было зрабіць вайну немагчымай, забіць яе, цалкам зьнішчыць. Каб гэта ажыццявіць, нам трэба было стварыць сыстэму». Але сыстэма не спрацоўвала, і часткова таму, што яе галоўныя ўдзельнікі ня мелі для таго ні рэсурсаў, ні волі. Сьмешна, але інтэлектуальным рухавіком гэтай спробы пераадоленьня эўрапейскага крызісу бясьпекі шляхам стварэньня

наднацыянальнага праўнага інстытуту быў амэрыканец Вудра Ўілсан. Уілсан прамаўляў ад імя краіны, якой неўзабаве судзілася зрабіцца самай багатай і магутнай краінаю сьвету і запозьненае ўступленьне якой у Першую сусьветную вайну значна паспрыяла перамозе Антанты. На жаль, Уілсан прамаўляў ад імя Амэрыкі ў час, калі яна таксама намагалася ўнікнуць сілавой палітыкі, і як аказалася пазьней, Уілсан прамаўляў не ад імя сваёй краіны. Адмова Амэрыкі ад удзелу ў створанай Уілсанам арганізацыі скасавала апошні малюпасенькі шанец на посьпех справы Лігі Нацыяў. Як з іроніяй зазначыў Чэрчыль, «мы гэтак давяраліся меркаваньням і пажаданьням Уілсана ў гэтай міратворчай задуме, аж урэшце нам сказалі, што няблага было б нам таксама лепей ведаць амэрыканскую канстытуцыю». Эўрапейцы былі пакінутыя самнасам з сабою, і калі ў 1930-я нямецкія рэвізіяністы зноў пачалі гонку ўзбраеньняў, «калектыўная бясьпека» растала як дым, і на зьмену ёй прыйшла палітыка залагоджваньня. Па сваёй сутнасьці, залагоджваньне нацысцкай Нямеччыны было стратэгіяй, заснаванай на слабасьці, але яна паходзіла хутчэй не ад сапраўднай няздольнасьці супрацьстаяць нямецкай моцы, а з страху перад магчымасьцю яшчэ адной вялікай вайны ў Эўропе. На гэтым падмурку вырасла складаная структура з мудрагелістых аргумэнтаў наконт прыроды пагрозы, якую прадстаўляе Нямеччына, і найлепшых спосабаў рэагаваньня на яе. Брытанскія чыноўнікі, напрыклад, пасьлядоўна прымяншалі пагрозу ці настойвалі на тым, што яна яшчэ не настолькі вялікая, каб патрабаваць якіх-кольвек дзеяньняў у адказ. «Калі б пераўзбраеньне Нямеччыны магчыма было давесьці, – заяўляў лідэр брытанскіх кансэрватараў Стэнлі Болдуін у 1933 годзе, – тады Эўропа сапраўды мусіла б нешта рабіць у адказ. Але для гэтага пакуль што няма рэальных падставаў». Прыхільнікі залагоджваньня высоўвалі шмат аргумэнтаў, чаму ўжываньне сілы непатрэбнае і неадпаведнае сытуацыі. Некаторыя зь іх казалі, што прэтэнзіі і крыўды Нямеччыны і яе нацысцкага ўраду цалкам законныя і мусяць быць прынятыя да ўвагі заходнімі дзяржавамі. Вэрсальскае пагадненьне было занадта жорсткім і прывяло да супрацьлеглых вынікаў, тлумачыў Джон Мэйнард Кейнз, а ў тым, што нямецкія палітыкі палаюць гневам і прагнуць рэваншу, Брытанія і Францыя мусяць вінаваціць толькі сябе. Калі Гітлер наракаў на благое

стаўленьне да этнічных немцаў у Чэхаславаччыне і іншых краінах Эўропы, заходнія дэмакратыі былі гатовыя на саступкі ў гэтым пункце. Не жадалі ў астатніх краінах Эўропы верыць і ў тое, што ідэалягічная прорва рабіла немагчымымі якія-кольвек кампрамісы з Гітлерам і нацыстамі. У 1936 годзе прэм'ер-міністар Францыі Леон Блюм сказаў нямецкаму міністру, які наведваў Францыю зь візытам: «Я марксіст і габрэй, але мы ня зможам дасягнуць нічога, калі будзем лічыць ідэалягічныя бар'еры непераадольнымі». Шмат хто суцяшаў сябе тым, што, які ні благі Гітлер, альтэрнатывы яму ў Нямеччыне яшчэ горшыя. Брытанскія і французскія чыноўнікі шмат высілкаў аддавалі на тое, каб атрымаць подпіс Гітлера пад пагадненьнямі, верачы, што толькі ён адзін можа кантраляваць самыя экстрэмісцкія сілы нямецкага грамадзтва[3].

Мэтаю залагоджваньня было выйграць час у спадзяваньні на тое, што Гітлер нарэшце насыціцца. Але гэтая стратэгія мела катастрафічныя для Брытаніі і Францыі наступствы. Кожны год такой палітыкі дазваляў Нямеччыне карыстацца зь ейнай патэнцыйнай эканамічнай і прамысловай перавагі ў параўнаньні з ўзброенасьці дэмакратычныя краіны Эўропы. Тыя акажуцца няздольныя стрымаць Гітлера, калі ён нарэшце ўдарыць. У 1940 годзе гітлерскі міністар прапаганды Ёзэф Гёбэльс адзначаўся на папярэднія дваццаць гадоў эўрапейскай дыпляматыкі з некаторым зьдзіўленьнем:

У 1933 годзе французскі прэм'ер мусіў сказаць наступнае (і калі б французскім прэм'ерам быў я, я б так і сказаў): «Новы райхсканцлер – чалавек, які напісаў «Майн Кампф», у якой гаварыцца тое і тое. Гэтага чалавека нельга трываць побач з намі. Ці ён сыходзіць з палітычнай арэны, ці мы ідзём на яго вайной!» Але яны гэтага не зрабілі. Яны нас не чапалі і дазволілі нам прайсьці празь небясьпечную зону і абысьці ўсе падводныя рыфы. І калі мы былі гатовыя і добра ўзброеныя, лепш за іх, толькі тады яны пачалі вайну.

Мудрагелістыя аргумэнты залагоджваньня былі б зауважна больш эфэктыўнымі, калі б іх ужылі да іншага чалавека ў іншай краіне, напрыклад, да нямецкага лідэра 1920-х Густава Штрэзэмана. Але яны былі няправільна ўжытыя да Гітлера і да

[3] Як ні на
зазнаюць
Кожны
французскі
чыноўнік,
ка
У 1940
Бэрдзіяе
Калі Гітлер
шчыры ў
сваіх заявах
аб імкненьні
да міру, мы
зможам
павяшаваць
сябе з
дасягненьнем
згоды, але
калі ён
напраўдзе
мае іншыя
намеры ці
калі ён
адкрые
дарогу

Нямеччыны 1930-х, калі стратэгія залагоджваньня бяспекам-вынікам не бесстароньняга аналізу, а простай слабасьці.

Першая сусьветная вайна моцна аслабіла Эўропу, Другая стала вынікам паразы эўрапейскай стратэгіі і дыпляматыі і падарвала пазыцыі эўрапейскіх краінаў у сьвеце. Іх пасьляваенная няздольнасьць утрымліваць дастатковыя сілы ў сваіх заморскіх уладаньнях прывяла да страты калёніяў у Азіі, Афрыцы і на Блізкім Усходзе пасьля больш як пяці стагодзьдзяў імпэрскага панаваньня. Гэта была, бадай, самая маштабная страта ўплыву ў сьвеце ў гісторыі чалавецтва. Менш чым за дзесяцігодзьдзе пасьля пачатку халоднай вайны эўрапейцы страцілі свае калёніі і саступілі Злучаным Штатам свае стратэгічныя абавязкі ў Азіі і на Блізкім Усходзе, часам добраахвотна, часам пад амэрыканскім ціскам, як у выпадку Суэцкага крызісу.

Пры канцы Другой сусьветнай многія ўплывовыя амэрыканцы спадзяваліся, што Эўропа адродзіцца ў якасьці «трэцяй сілы» ў сьвеце, дастаткова моцнай для таго, каб сам-насам супрацьстаяць Савецкаму Саюзу і дазволіць ЗША сысьці з Эўропы. Франклін Рузвэльт, Дын Арчысан і іншыя амэрыканскія назіральнікі меркавалі, што Вялікая Брытанія здолее ўзяць на сябе цяжар абароны ад Савецкага Саюзу большасьці краінаў сьвету. У тыя першыя пасьляваенныя дні прэзыдэнт Гары Трумэн нават мог уявіць сьвет, у якім Лёндан і Масква спаборнічалі б за ўплыў, а ЗША адыгравалі б ролю «бесстароньняга арбітра». Але неўзабаве брытанскі ўрад даў зразумець, што ён ня ў стане працягваць аказаньне эканамічнай і вайсковай падтрымкі Грэцыі і Турэччыне, якое ажыцьцяўлялася ад заканчэньня вайны. Пад 1947 год брытанскія палітыкі разумелі, што хутка «ЗША вырвуць зь іх здранцьвелых далоняў паходню сусьветнага лідэрства». З таго часу бясьпека Эўропы і астатняга сьвету залежала ад ЗША. Францыі і Брытаніі не падабалася нават сама ідэя незалежнага эўрапейскага блёку, «трэцяй сілы», бо яны баяліся, што гэта дасьць падставу амэрыканцам вывесьці свае войскі з Эўропы, у выніку чаго Брытанія і Францыя зноў апынуцца сам-насам зь Нямеччынай, дый з Савецкім Саюзам. Як сказаў адзін амэрыканскі ўрадовец: «Адзіным элемэнтам пэўнасьці, за які

якому-небудзь фанатыку, то мы хаця б зможам задаволіцца тым, што нам удалося адтэрмінаваць вайну».

чапляюцца французы, застаецца той факт, што паміж імі і Чырвонай арміяй стаяць моцныя амэрыканскія войскі».

Такім чынам ад канца Другой сусьветнай вайны і на наступныя пяцьдзясят гадоў Эўропа трапіла ў стан стратэгічнай залежнасьці ад ЗША. Калісьці глябальны, уплыў эўрапейскіх краінаў цяпер абмяжоўваўся граніцамі самой Эўропы. Адзінай жыцьцёва важнай задачай Эўропы падчас халоднай вайны было, у разе савецкай агрэсіі, пратрымацца да прыходу амэрыканцаў. І нават да гэтага эўрапейцаў трэба было прымушаць. Нежаданьне Эўропы выдаткоўваць на вайсковыя патрэбы сумы, якія лічыў неабходнымі амэрыканскі ўрад, было сталай крыніцай напружанасьці ў трансатлянтычных адносінах ад часу заснаваньня NATO да эпохі Кенэдзі, чыя дактрына «гнуткага рэагаваньня» мела ўмовай значны рост звычайных вайсковых сілаў, а пасьля да часу Рэйгана, калі кангрэсмэны распачалі цэлую кампанію за тое, каб Эўропа нарэшце пагадзілася дзяліць цяжар выдаткаў на спраўджаньне супольнай бясьпекі.

Але абставіны халоднай вайны стварылі бадай непазьбежнае разыходжаньне паміж амэрыканскімі і эўрапейскімі інтарэсамі. Амэрыканцам хацелася, каб эўрапейцы мелі эфэктыўныя ўзброеныя сілы, натуральна, пад кантролем NATO, здольныя спыніць савецкія полчышчы на эўрапейскай зямлі бяз атамнай вайны, каб асноўныя страты панесьлі эўрапейцы, а не амэрыканцы. Дзіва што большасьць эўрапейцаў трымалася іншага меркаваньня наконт пажаданага спосабу стрымліваньня саветаў.

Іх цалкам задавальняла тая абарона, якую ім забясьпечваў амэрыканскі «атамны парасон». Яны спадзяваліся, што бясьпеку Эўропы можа гарантаваць амэрыканска-савецкая раўнавага стрымліваньня і пэрспэктыва абавязковага ўзаемазьнішчэньня ў выпадку агрэсіі любога з бакоў. У любым выпадку, у першыя гады халоднай вайны эканоміка эўрапейскіх краінаў была заслабая для фінансаваньня вайсковага патэнцыялу, дастатковага для самаабароны. Але і ў пазьнейшыя гады халоднай вайны, калі гаспадарка адбудавалася, урады не сьпяшаліся наганяць адставаньне ў вайсковай моцы.

Амэрыканская «атамная гарантыя» пазбавіла эўрапейцаў стымулу да выдаткаваньня грашовых сродкаў, неабходных для аднаўленьня статусу вялікіх у ваенным сэнсе дзяржаваў. Гэтая псыхалёгія залежнасьці была непазьбежнай рэчаіснасьцю часу халоднай вайны і атамнага веку. Ганарыстая Францыя дэ Голя намагалася пераламіць гэтую сытуацыю, выйшаўшы з NATO і стварыўшы сваю невялічкую атамную сілу. Але яе *orce de frappe* была чыста сымбалічнаю, бо ні ў якім разе не звальняла Эўропы з стратэгічнай залежнасьці ад ЗША.

Адносная слабасьць Эўропы не падавалася такой ужо вялікай праблемай у гэтым трансатлянтычным канфлікце празь яго ўнікальныя геапалітычныя ўмовы. У цені дзьвюх варожых супэрдзяржаваў аслабленая Эўропа, тым ня менш, была галоўным стратэгічным тэатрам сусьветнага змаганьня паміж камунізмам і дэмакратычным капіталізмам, і гэта, разам з даўняй звычкай да сусьветнага лідэрства, дазволіла эўрапейцам захаваць міжнародны ўплыў і павагу, нягледзячы на рэальна нізкі ваенны патэнцыял. Амэрыканская стратэгія халоднай вайны была пабудаваная вакол трансатлянтычнага альянсу. Падтрыманьне адзінства і згуртаванасьці Захаду было асноўнай мэтай. Натуральна, гэта павышала важнасьць эўрапейскай думкі па глябальных пытаньнях, даючы як эўрапейцам, так і амэрыканцам трохі перабольшанае бачаньне эўрапейскай моцы. Гэтае бачаньне дажыло аж да сярэдзіны 1990-х. Балканскія канфлікты таго дзесяцігодзьдзя прымусілі ЗША і надалей разглядаць Эўропу як стратэгічны прыярытэт.

Так, неўзабаве пасьля заканчэньня халоднай вайны перад NATO паўстала новая задача замірыць гэтую частку эўрапейскага кантынэнту, дзе ўсё яшчэ спалохвалі крывавыя міжэтнічныя канфлікты, якія, хоць і меншыя маштабам, мала розьніліся сваёй сутнасьцю ад вялікіх войнаў XX стагодзьдзя. Пашырэньне NATO на краіны былога савецкага блёку, замацаваньне перамогі ў халоднай вайне і стварэньне «адзінай і свабоднай» Эўропы было іншым вялікім праектам Захаду, дзеля якога Эўропа была цэнтральным пунктам амэрыканскай стратэгіі і палітыкі.

І тады, напачатку працэсу аб’яднаньня, зьявілася гэтая надзея

на стварэньне «новай Эўропы». Аб'яднаньне ў цэльную палітычную і эканамічную адзінку праз гістарычную Маастрыхцкую дамову 1992 году, як многія спадзяваліся, павінна было аднавіць былую веліч Эўропы ў новай палітычнай форме. Эўропа мусіла б стаць яшчэ адной звышдзяржавай, прычым ня толькі ў эканамічным і палітычным сэнсе, але і ў ваенным. Яна мусіла б даваць рады крызісам на эўрапейскім кантынэнце, такім як этнічныя канфлікты на Балканах, і мусіла б зрабіцца «глябальным гульцом вышэйшай лігі». У 1990-я эўрапейцы яшчэ маглі з пэўнасьцю сьцьвярджаць, што магутнасьць аб'яднанай Эўропы нарэшце адновіць «шматпалярнасьць», разбураную халоднай вайною і яе наступствамі. І многія амэрыканцы сьцяўшы зубы прызнавалі, што будучыня – за Супэрдзяржавай Эўропай. Сэмюэл Гантынгтан з Гарвардзкага ўнівэрсытэту прадказваў, што крышталізацыя Эўразьвязу стане «адзіным сапраўды важным ходам» у рамках сусьветнай рэакцыі на амэрыканскую гегемонію, вынікам чаго стане «сапраўдная шматпалярнасьць XXI стагодзьдзя».

І калі б Эўропа ў 1990-я гады спраўдзіла гэтыя надзеі, сёньняшні сьвет, пэўна, моцна адрозьніваўся б ад таго, якім ён ёсьць. Цяпер ЗША і Эўропа, магчыма, выпрацоўвалі б новыя ўмовы адносінаў, заснаваныя на прыблізным парытэце сілаў, а не змагаліся б зь іх вялікай няроўнасьцю. Цалкам магчыма, што плён гэткага ўзаемапрыстасаваньня быў бы выгадны абодвум бакам; Эўропа ўзяла б на сябе некаторыя выдаткі на сусьветную бясьпеку, а ЗША б зьвярталі больш увагі на эўрапейскія інтарэсы і спадзяваньні пры фармуляваньні сваёй замежнай палітыкі.

Але «новая» Эўропа ня спраўдзіла гэтых надзеяў. У сфэрах палітыкі і эканомікі Эўразьвяз стварaў цуды. Нягледзячы на праροцтвы скептыкаў абапал Атлянтыкі, нічога благога з эўрапейскім адзінствам не адбылося. І аб'яднаная Эўропа паўстала як эканамічны волат найвышэйшага ўзроўню, здольны трымацца на роўных з ЗША і азіяцкімі эканомікамі і на роўных абмяркоўваць пытаньні міжнароднага гандлю і фінансаў. Калі дапусьціць, што канец халоднай вайны адкрыў перад сьветам эпоху, калі эканамічная моц значыць больш за

вайсковую, як на гэта спадзяваліся многія эўрапейцы і амэрыканцы, то сапраўды можна сьцьвярджаць, што Эўразьвяз мае ня менш моцы для ўплыву на фармаваньне сусьветнага парадку, чым ЗША.

Але заканчэньне халоднай вайны ня зьменшыла важнасьці вайсковай моцы, а эўрапейцы пабачылі, што эканамічную моц не заўжды можна канвэртаваць у стратэгічную ці геапалітычную. Захаваўшы як эканамічную, так і вайсковую магутнасьць, Злучаныя Штаты далёка абагналі Эўропу ў сумарнай моцы, якую можна скіроўваць на аказаньне ўплыву на міжнародным узроўні.

Фактычна 1990-я гады сталі часам ня ўздыму Эўропы, а наадварот – яе далейшага вайсковага заняпаду ў параўнаньні з Амэрыкай. Балканскі канфлікт пачатку дзесяцігодзьдзя паказаў слабасьць эўрапейскіх войскаў і палітычны разлад паміж краінамі-міратворцамі; косаўскі канфлікт канца дзесяцігодзьдзя паказаў разрыў паміж Эўропай і ЗША ўва ўзроўнях ваенных тэхналёгіяў і здольнасьці вядзеньня баявых дзеяньняў на сучасным узроўні, і гэты разрыў у далейшыя гады вырас яшчэ больш. Гэтая няроўнасьць вайсковых магчымасьцяў пры канцы 1990-х зрабілася яшчэ больш відавочнай, калі стала ясна, што здольнасьць эўрапейскіх краінаў перакідваць, паасобку ці разам, больш-менш значныя вайсковыя сілы за межы кантынэнту і падтрымліваць іхнюю баяздольнасьць там амаль што роўная нулю. Эўрапейцы здолелі накіраваць міратворчыя сілы на Балканы, – сапраўды, яны ўрэшце адправілі вялікія кантынгенты ў Босьнію, Косава, Македонію – і нават у Аўганістан, і, мабыць, калісьці дашлюць салдатаў у Ірак. Але ім не хапала сродкаў, каб увесьці свае ўзброеныя сілы на патэнцыйна варожую тэрыторыю, нават у самой Эўропе, ня кажучы ўжо пра тое, каб дастатковы час там іх утрымліваць. У найлепшым выпадку, роля эўрапейцаў заключалася ў разьмяшчэньні міратворчых сілаў у тых зонах, у якіх сытуацыю ўжо стабілізавалі амэрыканцы. Як іранічна зазначалі некаторыя эўрапейцы, сапраўдны падзел працы заключаўся ў тым, што амэрыканцы «гатавалі абед», а эўрапейцы «мылі талеркі».

Большая схільнасьць амэрыканцаў да ўжываньня вайсковай

сілы не заўжды азначала жаданьне рызыкаваць людзьмі. Няроўнасьць вайсковых патэнцыялаў ніяк ня тычылася пытаньня параўнальнай сьмеласьці амэрыканскіх і эўрапейскіх жаўнераў. Прынамсі, французскі, брытанскі і нават нямецкі ўрады часам нават менш турбаваліся аб сваіх жаўнерах, чым амэрыканскія прэзыдэнты аб сваіх. Падчас Балканскага крызісу ў сярэдзіне 1990-х і пазьней у Косаве брытанскі прэм'ер-міністар Тоні Блэр быў куды больш схільны да ўжываньня сухаземных войскаў, чым прэзыдэнт Біл Клінтан. І гэтая неаднолькавасьць стаўленьня таксама, пэўным чынам, працавала супраць эўрапейцаў. Жаданьне амэрыканцаў пазьбягаць стратаў і іх гатоўнасьць шчодра выдаткоўваць сродкі на ваенныя тэхналёгіі забясьпечыла ЗША грознай ваеннай магутнасьцю і сьмяротнай дакладнасьцю ў зьнішчэньні цэляў зь меншай небясьпекаю для людзей. Эўрапейскія войскі, насупраць, былі тэхналягічна адсталымі і, такім чынам, больш залежнымі ад непасрэдных сутыкненьняў з праціўнікам. Вынікам гэтай тэхналягічнай прорвы, якая павялічылася цягам 1990-х, калі амэрыканская вайсковая прамысловасьць дасягнула значных посьпехаў у стварэньні высокадакладных узбраеньняў, распрацоўцы апэрацыяў шматвэктарнага адначасовага ўдару, стварэньні магутных сыстэмаў сувязі і збору зьвестак, стала большая гатоўнасьць амэрыканцаў ваяваць у параўнаньні з эўрапейцамі, якія ня мелі магчымасьці ажыцьцяўляць спусташальныя атакі зь бясьпечнай адлегласьці і, такім чынам, мусілі б плаціць большую цану за любую атаку.

У гэтым ваенным адставаньні Эўропы ад Амэрыкі няма нічога дзіўнага, бо яно вынікае з эўрапейскай ваеннай дактрыны часу халоднай вайны. Стратэгічныя задачы халоднай вайны і дактрыны стрымліваньня патрабавалі, згодна з Джорджам Кенанам, наяўнасьці «гнуткай і апэратыўнай ударнай моцы ў шэрагу геаграфічных і палітычных пунктаў, месца знаходжаньня якой стала мяняецца». Гэта прымусіла ЗША ствараць вайсковыя адзінкі, здольныя вырашаць стратэгічныя задачы адначасова ў некалькіх аддаленых адзін ад другога рэгіёнах. Стратэгічнай задачай эўрапейцаў было вытрымаць націск савецкіх войскаў на сваёй тэрыторыі, задачы перакідваньня ваеннай моцы на вялікія адлегласьці ня ставілася[4]. Для большасьці эўрапейскіх краінаў выкананьне

гэтай задачы патрабавала ўтрыманьня на сваёй уласнай тэрыторыі вялікіх сухаземных сілаў, гатовых заблякаваць шляхі наступу савецкіх войскаў, і не патрабавала наяўнасьці мабільных фармаваньняў, гатовых для перакіданьня ў любы куток сьвету. Амэрыканцы і эўрапейцы, якія пасьля сканчэньня халоднай вайны прасоўвалі ідэю павелічэньня стратэгічнай ролі Эўропы за межамі кантынэнту, фактычна патрабавалі рэвалюцыйных зьменаў у эўрапейскай стратэгіі і патэнцыяле. Было нерэалістычна чакаць ад эўрапейцаў вяртаньня да статусу сусьветных супэрдзяржаваў, які яны мелі да Другой сусьветнай вайны, пакуль жыхары Старога сьвету не пагаджаліся на перанос значных грашовых сродкаў ад сацыяльных праграмаў на вайсковыя мэты, на рэструктурызацыю і мадэрнізацыю ўзброеных сілаў, якая б дазволіла перайсьці ад дактрыны пасіўнай абароны да здольнасьці перакідваць і ўтрымліваць вайсковыя кантынгенты далёка ад дому.

Натуральна, эўрапейская супольнасьць не згадзілася ўвайсці ў такую рэвалюцыйную зьмену прыярытэтаў. Эўрапейцы ня бачылі ніякіх жадалі выдаткоўваць на стварэньне ўзброеных сілаў Францыя сусьветнага значэньня, але пасьля заканчэньня халоднай вайны нават не жадалі ўтрымліваць узброеныя сілы, дастатковыя для вядзеньня баявых дзеяньняў на ўласнай тэрыторыі без амэрыканскай дапамогі. Эўрапейская супольнасьць нават адмаўлялася выдаткоўваць сродкі на ўзмацненьне NATO ў разьвіцьцё ўласнай, эўрапейскай абароннай палітыкі. Замест таго каб разглядаць распад Савецкага Саюзу як шанец для пашырэньня стратэгічнага ўплыву Эўропы, эўрапейцы ўспрынялі гэтую падзею як магчымасьць скарыстацца дывідэндамі, мірнага існаваньня. Для Эўропы падзеньне Савецкага Саюзу ня толькі ліквідавала стратэгічную шматпалярнасьць, але гэтыя ліквідавала самую патрэбу ў геапалітыцы. Многія эўрапейцы ўспрынялі канец халоднай вайны як такую жаданую нагоду стратэгіі на пэнсію. Нягледзячы на размовы аб вяртаньні Эўропе статусу супэрдзяржавы, сярэднія вайсковыя выдаткі стала зьмяншаліся і паступова ўпалі ніжэй за 2 % ад ВУП, і такім чынам, цягам 1990-х эўрапейская моц усё больш адставала ад амэрыканскай.

Канец халоднай вайны зусім па-іншаму адбіўся на другім баку

Атлянтыкі. Хаця амэрыканцы таксама былі ня супраць скарыстацца з выгадаў мірнага існаваньня, і абаронныя выдаткі ЗША таксама скараціліся на некаторых кірунках, а на іншых цягам 1990-х яны заставаліся на ранейшым узроўні, выдаткі на абаронныя патрэбы, як і раней, перавышалі 3 % ад ВУП. Перад самым распадам Савецкага Саюзу адбылося ўварваньне Іраку ў Кувэйт, якое пацягнула за сабою самую вялікамаштабную ваенную апэрацыю ЗША за апошнія дваццаць пяць гадоў. У раён Пэрсідзкай затокі было ўведзена амаль паўмільённае войска. Пасьля гэтага амэрыканскі ўрад, вядома, скараціў узброеныя сілы, але не настолькі, наколькі гэтага можна было чакаць. Фактычна, наступныя пасьля заканчэньня халоднай вайны амэрыканскія ўрады не разглядалі гэтае заканчэньне як падставу для стратэгічнага адпачынку. Ад першага бушаўскага ўраду і цягам кіраваньня клінтанаўскай адміністрацыі амэрыканская стратэгія і плянаваньне ўзброеных сілаў зыходзілі з магчымасьці таго, што ЗША давядзецца змагацца і перамагаць у двух розных рэгіёнах плянэты амаль адначасова. Гэты «дзьвюхваенны» стандарт хаця часам і крытыкаваўся, ніколі не адкідаўся вайсковым і цывільным кіраўніцтвам ЗША, якія меркавалі, што краіна мусіць быць гатовай весьці войны як на Карэйскай паўвысьпе, так і ў Пэрсідзкай затоцы. Ужо сам факт, што ЗША разглядалі такую магчымасьць, аддаляў іх ад эўрапейскіх саюзьнікаў, няздольных нават да вядзеньня мінівайны ля ўласнага парогу, ня кажучы ўжо аб дзьвюх вялікіх войнах на адлегласьці тысячаў кілямэтраў. Па гістарычных мерках ваенная моц ЗША пасьля халоднай вайны, іхняя здольнасьць перакідваць гэтую моц ува ўсе куткі плянэты зьяўляюцца беспрэцэдэнтнымі.

Адначасова з гэтым распад савецкай імпэрыі значна павялічыў параўнальную моц Амэрыкі адносна іншых дзяржаваў сьвету. Магутны амэрыканскі вайсковы арсэнал, якога раней ледзьве хапала на стрымліваньне саветаў, цяпер ня мае роўных у сьвеце. Гэты «аднапалярны момант» атрымаў цалкам натуральныя наступствы: большую схільнасьць ЗША да ўжываньня сілы ў міжнародных зносінах. Зь зьнікненьнем савецкай пагрозы Злучаныя Штаты атрымалі поўную свабоду інтэрвэнцыі ў любы куток сьвету ў пажаданы для іх час, што мела свой фактычны адбітак у Панамскім канфлікце 1989 году,

вайне ў Пэрсідзкай затоцы ў 1991-м, гуманітарнай інтэрвэнцыі ў Самалі ў 1992-м падчас кіраваньня Буша. Гэтая тэндэнцыя таксама працягвалася і пры клінтанаўскай адміністрацыі: войны ў Гаіці, Босьніі, Косава. Хаця многія амэрыканскія палітыкі гаварылі аб неабходнасьці сыходу амэрыканскіх войскаў з сусьветнай арэны, у рэальнасьці ўмяшальніцтвы ўва ўнутраныя справы іншых дзяржаваў у параўнаньні з часам халоднай вайны пачасьціліся. Сучасныя вайсковыя тэхналёгіі разьвязалі для ЗША рукі для ўжываньня сілы на ўсім сьвеце праз высокадакладныя кропкавыя ўдары, што яны і сталі рабіць усё часьцей. Такім чынам, канец халоднай вайны нават паглыбіў разрыў у разуменьні сілы, які існаваў паміж ЗША і Эўропай.

ПСЫХАЛЁГІЯ МОЦЫ І СЛАБАСЬЦІ

Якім чынам можна было б пазьбегнуць утварэньня ўсё большага разрыву ў стратэгічным мысьленьні пры ўсё большай няроўнасьці ў моцы? Моцныя дзяржавы натуральным чынам бачаць сьвет інакш, чым слабыя. Яны па-рознаму ацэньваюць рызыку, па-рознаму акрэсьліваюць бясьпеку і маюць розныя парогі талераваньня небясьпекі. Тыя, хто валодае вялікай вайсковай магутнасьцю, пэўна будуць лічыць яе больш карысным інструмэнтам міжнародных зносінаў, чымся тыя, хто яе ня мае. Але моцны можа давяраць сіле ў большай ступені, чым гэта неабходна. Адзін брытанскі крытык амэрыканскай схільнасьці да ўжываньня моцы прыгадвае стары афарызм: «Калі ў цябе ёсьць малаток, усе праблемы пачынаюць здавацца цьвікамі». Гэта праўда.

Пераклаў з амэрыканскай Аляксей Ігнатовіч

[image]
[image]

№ 1 (35) - 2005

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[redacted] (2010)

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image] [image] [image] [

заснавальніка
часопіса
Оўэна
Герыеса і
часта
пачыналіся з
уступнага
слова Генры
Кісінджэра,
а іх
заўсёднікамі
былі Джын
Кіркпатрык,
Ірвінг Бі і
Біл Крыстал,
Сэмюэл
Гантынгтан,
Пол
Вулфавіц,
Норман
Падгорац,
Даніэль
Пайпс,
Чарльз
Краўтхамер,
Марці
Фельдстайн,
Эліят Коген,
Пітэр
Родман і
шэраг іншых
кансерватыўных
мысліцеляў,
пісьменнікаў
і дзеячаў, у
тым ліку
амаль усе,
каго цяпер
называюць
«неакансерватарамі».

У гэтых вячэрах мяне заўсёды заварожвала іх непрадказальнасць. Погляды гэтых людзей канчаткова сфармаваліся падчас халоднай вайны; і ў які лагер – прыхільнікаў ці праціўнікаў разрадкі – запісацца, практычна кожны (у тым ліку і я) вырашыў для сябе даўным-даўно. Але падзенне Берлінскага муру прынесла вялікія змены, і не было выразнай сувязі паміж нашымі поглядамі да 1989 года і пасля. Груба кажучы, галоўны разлом пралёг паміж тымі, хто быў у большай ступені рэалістам, і тымі, хто схіляўся да ідэалізму ці вільсанізму. Але кожны спрабаваў вырашыць адно і тое фундаментальнае пытанне: як вызначыць замежную палітыку краіны, што раптоўна стала сусветным гегемонам, цяпер, пасля знікнення дамінуючай стратэгічнай пагрозы з боку былога СССР? Наколькі вузка ці шырока можна трактаваць словазлучэнне, якое дало назву часопісу, – «нацыянальны інтарэс»?

Менавіта на адной з гэтых вячэр Чарльз Краўтхамер упершыню выказаў ідэю амерыканскай аднапалярнасці. Узімку 1990–1991 гадоў ён напісаў пра «момант аднапалярнасці» ў часопісе «Foreign Affairs», а ў зімовым выпуску «The National Interest» 2002/2003 гадоў развіў свой тэзіс, заявіўшы, што «момант аднапалярнасці ператварыўся ў эру аднапалярнасці». Нарэшце, у лютым 2004 года ён выступіў з прамовай на штогадовай урачыстай вячэры Амерыканскага інстытута прадпрымальніцтва (АІП), у якой вярнуўся да сваіх ранейшых ідэй і развіў іх яшчэ больш, беручы пад увагу вынікі вайны ў Іраку[1]. Ён акрэсліў чатыры розныя кірункі ў замежнай палітыцы – ізаляцыянізм, ліберальны інтэрнацыяналізм, рэалізм і ягоная ўласная пазіцыя, якую ён вызначае як «дэмакратычны глабалізм», – пэўная разнавіднасць сілавога вільсанізму (за выняткам стаўлення да міжнародных інстытутаў), якое лічыць мэтазгодным ужыванне вайсковай перавагі ЗША для забеспячэння адначасова і інтарэсаў бяспекі ЗША, і дэмакратыі.

Краўтхамер – адораны мысліцель, і ягоныя ідэі варта ўспрымаць сур'ёзна самі па сабе. Аднак, што, мабыць, больш важна, ягонае стратэгічнае мысленне зрабілася сімвалічным выразнікам падыходаў, якія аказалі істотны ўплыў як на стратэгію замежнапалітычнай каманды Буша, так і за яе межамі. Ва ўсім чаму працы Краўтхамера, асабліва яго прамова ў АІП,

[1] Krauthammer C. Democratic Realism: An American

патрабуюць стараннага аналізу. Менавіта ў гэтым духу ў ранейшых спрэчак я прапаную вам гэты крытычны агляд.

Прамова Краўтхамера 2004 года дзіўным чынам адарвана ад рэальнасці. Падчас чытання яе ў вас складваецца ўражанне, што вайна ў Іраку – архетыповае дастасаванне амерыканскай аднапалярнасці – была безумоўным поспехам, а ўсе дапушчэнні і чаканні, на якіх яна грунтавалася, пацвердзіліся і спраўдзіліся. Няма і найменшай згадкі пра новыя факты, якія сталі вядомымі за апошнія год-два: правал у пошуках зброі масавага знішчэння ў Іраку, небяспечны і ўсё большы антыамерыканізм на ўсім абсягу Блізкага Усходу, усё часцейшыя паўстанні ў Іраку, факт таго, што ніякага моцнага дэмакратычнага ўраду там не з'явілася, велізарная фінансавая і ўсё большая чалавечая цана вайны, няўдача ў выкарыстанні вайны для дасягнення прагрэсу на ізраільска-палесцінскім фронце, нарэшце, той факт, што большая частка дэмакратычных саюзнікаў Амерыкі не ўстала ў строй і не ўзаконіла дзеянні амерыканцаў заднім чыслом.

Fox in a Policy for A Unipolar World. Washington: The American Enterprise Institute, 2004.

Нежаданне заўважаць гэтыя факты небяспечнае, перш за ўсё, для неакансерватараў, чыю пазіцыю Краўтхамер узяўся выказваць і адстойваць. Па меры таго як вайна ў Іраку ператвараецца з трыумфальнага вызвалення ў крывавую міжусобіцу, галасы іншых – як традыцыйных рэалістаў накшталт Брэнта Скоўкрафта, так і нацыяналістаў-ізаляцыяністаў тыпу Патрыка Б'юкенена ці ліберальных інтэрнацыяналістаў, як Джон Керы, – будуць гучаць усё мацней і займеюць куды больш уплыву пры вызначэнні постіракскай замежнай палітыкі Амерыкі. Кепска ажыццёўленая нацыябудаўнічая стратэгія ў Іраку пойдзе на шкоду далейшым спробам такога роду, падрываючы ўнутраную палітычную падтрымку высакароднаму і ўтапічнаму інтэрнацыяналізму, як гэта ў свой час адбылося з в'етнамскай кампаніяй.

Такі вынік зусім не непазбежны. Можна пачаць з дапушчэнняў, ідэнтычных Краўтхамеравым, цалкам згадзіцца з яго крытыкай трох астатніх замежнапалітычных падыходаў і ўсё-такі выпрацаваць замежную палітыку, вельмі адрозную ад той, якую прапануе ён. Я лічу, што ягоная стратэгія адначасова вызначае

нашы інтарэсы так вузка, каб зрабіць неакансерватыўныя пазіцыі неадрознымі ад пазіцый рэалістаў, і ў той жа час аказваецца зусім нерэалістычнай у сваёй пераацэнцы магутнасці ЗША і іх здольнасці кантраляваць падзеі ва ўсім свеце. Мабыць, ужо надта позна выкарыстоўваць ярлык «неакансерватыўны» для чагосьці, апрача палітыкі Бушавай адміністрацыі, але па-ранейшаму варта спрабаваць перафармуляваць чацвёртую альтэрнатыву, якая б камбінавала ідэалізм і рэалізм, – але так, каб гэта забяспечыла ёй працяглае існаванне.

ПРАЗМЕРНЫ РЭАЛІЗМ

Краўтхамер і многія іншыя каментатары маюць рацыю ў тым, што «кісінджэраўскі рэалізм не з'яўляецца адэкватнай асновай для амерыканскай замежнай палітыкі. Некаторая ступень месіянскага універсалізму ў дачыненні да амерыканскіх каштоўнасцяў і інстытутаў заўсёды была неад'емным кампанентам амерыканскай нацыянальнай ідэнтычнасці: амерыканцы ніколі не адчувалі сябе зручна ў рамках маральных кампрамісаў, якія цягнула за сабой строга рэалістычная пазіцыя. Пытанне, што было пастаянным прадметам дыскусій на тых рэдакцыйных вячэрах, заключалася ў тым, якія рамкі мы гатовы накласці на ідэалісцкі план. Краўтхамер адказвае на гэтае ключавое пытанне такім чынам:

Дзе ўмешвацца? Куды несці дэмакратыю? Дзе займацца нацыябудаўніцтвам? Я прапаную адзіны крытэр: там, дзе гэта будзе апраўдвацца разлікам. Называйце гэта дэмакратычным рэалізмам. А аксіёма яго наступная: мы будзем падтрымліваць дэмакратыю паўсюль, але заплацім за яе крывёй і грашыма толькі там, дзе на гэта ёсць стратэгічная патрэба, а менавіта ў месцах, дзе вядзецца маштабная вайна супраць ворага, які пагражае нашаму існаванню і нясе смяротную пагрозу свабодзе на ўсім свеце (вылучана ў арыгінале. – **Аўт.**).

Хоць гэтая аксіёма здаецца яснай і просталінейнай, яна ўтрымлівае некалькі двухсэнсоўнасцяў, што робіць яе

малапрыдатнай для вызначэння патрэбы ўмяшальніцтва ЗША. Першая няпэўнасць звязана з фразай «стратэгічная неабходнасць», якую можна інтэрпрэтаваць больш ці менш шырока. Здаецца, што Краўтхамер займае спачатку пазіцыю рэаліста, выбіраючы вузкае вызначэнне, калі ён спасылаецца на «імавернага праціўніка» ці праціўніка, які ўяўляе сабой «смяротную» пагрозу. Калі гэтыя словы маюць нейкі рэальны сэнс, то пад імі павінны мецца на ўвазе толькі пагрозы, якія ўяўляюць небяспеку нашаму існаванню як нацыі ці як дэмакратычнаму рэжыму. Такія пагрозы існавалі ў мінулым – Савецкі Саюз мог знішчыць нас фізічна ці, магчыма, растаптаць дэмакратыю ў Паўночнай Амерыцы. Але дужа спрэчна, што якая-небудзь жыццёвая пагроза існуе цяпер. Ірак перад амерыканскай інтэрвенцыяй не ўяўляў сабой такой пагрозы: ён нёс смяротную пагрозу Кувейту, Ірану і Ізраілю, але не меў сродкаў, каб падарваць стабільнасць нашага рэжыму[2]. «Аль-Каіда» і іншыя радыкальныя ісламісцкія групоўкі мараць пра тое, каб стацца смяротнай пагрозай для амерыканскай цывілізацыі, але на цяперашнім этапе абсалютна няздольныя ажыццявіць свае мары. Ідзецца аб вельмі небяспечных таталітарных групах, але смяротную пагрозу яны ўяўляюць перадусім для блізкаўсходніх рэжымаў.

Вышэйсказанае не азначае, што Ірак і «Аль-Каіда» не [illegible] сур'ёзных пагроз амерыканскім інтарэсам: Ірак быў [illegible] сур'ёзнай рэгіянальнай пагрозай, «Аль-Каідзе» ўдалося [illegible] тысячы амерыканцаў на амерыканскай зямлі. У жывучы, і масавага знішчэння супраць ЗША мела б жахлівыя [illegible] не толькі для непасрэдных ахвяр, але і для амерыканскіх свабод: такім чынам, тэрарысты маглі б зрабіць замах [illegible] лад жыцця. Але іх пагроза ўсё-такі заставалася б [illegible] паводле маштабу, чым ранейшыя, што зыходзілі ад [illegible] Сусветныя пагрозы (нацысцкая і камуністычная) мелі [illegible] экзістэнцыйны характар і таму, што іх увасаблялі [illegible] дзяржавы, і таму, што многія жыхары ЗША і заходняга [illegible] зачароўваліся іх ідэямі. Ісламізм не валодае такой [illegible] прыцягальнасцю, можа быць, за выключэннем такіх [illegible], як Францыя, якая дазволіла масавую іміграцыю мусульман [illegible].

Маю падазрэнне, што Краўтхамер свядома ўжыў тэрмін

[2] Ірак [illegible] мог [illegible] [illegible] [illegible]

«стратэгічная патрэба» ў шырэйшым сэнсе, чым той, што ён сам
укладаў ва ўласныя словы пра смяротныя пагрозы. У канцы
свайго аксіяматычнага выказвання ён пераскоквае на ў
весці вайну «супраць ворага, які пагражае нашаму існаванню і
нясе смяротную пагрозу свабодзе на ўсім свеце», а пачынаў
гаворыць пра Злучаныя Штаты як «ахоўніка міжнароднай
сістэмы», намякаючы на шырэйшае разуменне інтарэсаў
дзяржавы. Ці слова «сусветная» азначае тут пагрозу, якая
выходзіць за межы асобных рэгіёнаў, падобна да радыкальнага
ісламізму альбо камунізму? Калі лічыцца толькі з ворагам,
сусветнага маштабу, Паўночная Карэя павінна быць выключана
з ліку «стратэгічных» ворагаў. Ці то слова «сусветная»
абазначае любую смяротную пагрозу свабодзе ў любым месцы
зямнога шару? Калі «вораг» нясе смяротную пагрозу не нам, а
іншай свабоднай краіне, ці азначае гэта, што яго трэба
залічваць у нашы ворагі? Ці ёсць Хамас, ісламісцкая групоўка,
што яўна пагражае існаванню Ізраіля, таксама і нашым
ворагам? А Сірыя? А калі яны нашы ворагі, чаму мы павінны
змагацца менавіта з імі, а не з групоўкамі, якія да нас
бліжэйшыя геаграфічна, як ФНВ, што пагражае дэмакратыі ў
Калумбіі, ці баліварысты Уга Чавэса ў Венесуэле? Што
вызначае «цэнтральны кірунак» у гэтай сусветнай вайне? Ці
быў Ірак ключавым звяном у вайне супраць радыкальнага
ісламізму?

Ясна, што аксіёма Краўтхамера на практыцы вельмі слаба
дапамагае адказаць на гэтыя пытанні. Ён мог бы запярэчыць,
што прымяненне агульнага прынцыпу вымагае звароту да
здаровага сэнсу. Далей ён мог бы сказаць, што ягоная пазіцыя
моцна адрозніваецца ад меркавання рэалістаў, паколькі ён
бачыць дэмакратыю як інструмент для прасоўвання
стратэгічных інтарэсаў ЗША: маўляў, трансфармацыя іракскай
палітычнай сістэмы і ператварэнне крыважэрнай дыктатуры ў
дэмакратыю паводле заходніх стандартаў адкрывае новыя
магчымасці для ўсяго рэгіёну, што дазволіць, урэшце,
выкараніць прычыны тэрарызму. Насамрэч, ідзецца аб амбітнай
і ў вышэйшай ступені ідэалістычнай задачы, і толькі чортаў
здаровы сэнс кідае цень на цяперашнія праекты трансфармацыі
Блізкага Усходу.

ПРАЗМЕРНЫ ІДЭАЛІЗМ

З усіх разнастайных меркаванняў, што ў наш час асацыююцца з ідэалогіяй неакансерватызму, найбольш дзіўным, як для мяне, ёсць вера ў тое, што ЗША могуць трансфармаваць Ірак у дэмакратыю паводле заходніх стандартаў і ў далейшым дэмакратызаваць Блізкі Усход наогул. Гэта здалося мне тым больш дзіўным, што тыя самыя неакансерватары патраціл нямала часу, папярэджваючы ранейшыя пакаленні (напрыклад, на старонках «The Public Interest» – выдання, роднаснага «The National Interest») аб небяспеках амбітнай сацыяльнай інжынерыі. Яны папярэджвалі і пра тое, што «планіроўшчыкі» сацыяльных зменаў ніколі не могуць кантраляваць паводзіны індывідаў і працаваць з непрадбачанымі наступствамі свайго ўмяшання. Калі ЗША не могуць выкараніць галечы, дабіцца паляпшэння вынікаў тэстаў на інтэлект у сваёй сталіцы, як яны спадзяюцца прынесці дэмакратыю ў тую частку свету, якая ўпарта супраціўляецца дэмакратызацыі і да таго ж з'яўляецца апірышчам зацятага антыамерыканізму?

Краўтхамер чапляе гэтую тэму ў сваёй прамове. Заўважаючы, што скептыкі, якія пасля Другой сусветнай вайны не верылі ў дэмакратызацыю Японіі, аказаліся, урэшце, пасаромлены, ён пытаецца: «Дзе напісана, што арабы не здольныя ўспрыняць дэмакратыю?» Тут ягоная думка перагукаецца з больш просталінейным аргументам знакамітага спецыяліста па Блізкім Усходзе Бернарда Льюіса, які не стамляўся паўтараць, што песімізм адносна будучыні дэмакратычнага Ірака выяўляе непавагу да арабскага свету.

Безумоўна, нідзе не запісана, што арабам проціпаказаная дэмакратыя, і вядома, з боку цынікаў-еўрапейцаў было памылкай «па сакрэце» сцвярджаць, што дэмакратыя на Блізкім Усходзе ўвогуле недасягальная. Напраўдзе, мы памыляліся раней – не толькі ў Японіі, а і ва Усходняй Еўропе, напярэдадні краху камунізму. Але мажлівасць не азначае ўпэўненасці, і ўдумлівая палітыка не робіцца праз кіданне ігральных костак. Культура не прадвызначае лёсу краіны, аднак яна грае важную ролю, робячы магчымым заснаванне пэўнага тыпу інстытутаў (такі погляд звычайна асацыюецца з кансерватызмам). Маё імя,

больш чым многія іншыя, асацыюецца з ідэяй, што стрэлка гістарычнага компасу паказвае на дэмакратыю, але я ніколі не лічыў, што дэмакратычныя рэжымы могуць быць усталяваныя паўсюль, варта толькі ўжыць палітычную волю. Напярэдадні іракскай вайны было мноства прычын меркаваць, што адбудова дэмакратычнага Ірака стане задачай, якая наўрад ці мае рашэнне. Некаторыя з прычын мелі дачыненне да прыроды іракскага грамадства. Не спрыяюць дэмакратызацыі раптоўнае вызваленне ад таталітарнага рэжыму, этнічныя падзелы, вялікая роля палітызаванай рэлігіі, схільнасць многіх членаў грамадства да ўжывання насілля, пляменная структура і дамінаванне кланавых, кліентэлісцкіх сувязяў, залежнасць ад уплыву іншых краін Блізкага Усходу, радыкальна антыамерыканскіх.

Іншыя прычыны тычыліся Злучаных Штатаў. Амерыка была ўцягнута прыблізна ў 18 праектаў нацыябудаўніцтва – ад заваёвы Філіпінаў у 1899 годзе і да цяперашняй акупацыі Афганістана ды Ірака. Абсалютнай удачай не быў ніводзін з праектаў. У адназначна паспяховых выпадках – у Германіі, Японіі, Паўднёвай Карэі – амерыканскія войскі прысутнічалі неабмежаваны тэрмін. У першых двух выпадках мы ўвогуле не былі «будаўнікамі нацый», а толькі надавалі легітымнасць грамадствам, што мелі да таго дужа магутныя дзяржавы. Ва ўсіх іншых выпадках ЗША альбо ўсталёўвалі псеўдадэмакратычныя інстытуты, за якімі нічога не стаяла, альбо нават пагаршалі сітуацыю ў краіне, ствараючы, як у Нікарагуа, сучасную армію і паліцыю, але не гарантуючы ніякага правапарадку ў краіне.

Усё гэта прыводзіць да больш фундаментальнай спрэчкі аб аднапалярнасці. Краўтхамер заўсёды падкрэсліваў вялізную няроўнасць у сіле паміж Злучанымі Штатамі і астатнім светам: у адносным вымярэнні ЗША нават мацнейшыя, чым Рымская імперыя ў эпоху свайго росквіту. Аднак амерыканская дамінацыя яўная толькі ў дзвюх сферах: у сферы культурнага ўплыву і ў здольнасці весці войны з ужываннем канвенцыйнай зброі, перамагаючы ў іх.

У амерыканцаў няма асаблівага густу ці магчымасцяў для таго,

каб адбудоўваць нацыі: нам бліжэйшая стратэгія ўцёкаў з праблемных краін, чым стварэнне імперыі (тэзіс, на якім настойвае Краўтхамер у пачатку сваёй лекцыі). Як жа ён спадзяецца знайсці падтрымку гэтаму неймаверна амбітнаму намаганню – змяніць палітычны лад у адным з найбольш турботных і варожых нам рэгіёне? І калі нацыя сапраўды ў сваёй сутнасці ёсць рэспублікай, пабудаванай на гандлі, чаму яму так карціць распаўсюдзіць гэты ўзор на ўвесь свет? У Іраку мы апынуліся ў становішчы нязванага госця, выявілі сваю адвечную абмежаванасць і неарганізаванасць у планаванні і вядзенні адбудовы краіны, што можна было прадказаць загадзя. Таго, хто знаёмы з амерыканскай гісторыяй, усё гэта не павінна было здзівіць.

САЮЗНІКІ, ІНСТЫТУЦЫІ І ЛЕГІТЫМНАСЦЬ

Слабасць аргументаў Краўтхамера палягае, між іншага, у ягонай трактоўцы легітымнасці, у падыходзе да адносін «Амерыка – астатні свет». Няздатнасць прызнаць, што цяпер Амерыка церпіць ад браку легітымнасці на міжнароднай арэне, шкодзіць краіне і з гледзішча рэалізму (бо змяншае нашу цяперашнюю магутнасць), і з гледзішча ідэалізму, паколькі падрывае вобраз Амерыкі як увасаблення пэўных ідэй і каштоўнасцяў.

Краўтхамер пазбягае сур'ёзнага аналізу гэтай праблемы, малюючы нейкую карыкатуру на замежных крытыкаў амерыканскай палітыкі. Гэтыя крытыкі нібыта не заслугоўваюць увагі – нашто прыслухоўвацца да «катаў плошчы Цяньаньмынь» ці да «цынікаў з Ке д'Арсэ»[3]? Ён залічвае Дэмакратычную партыю і большасць нашых еўрапейскіх саюзнікаў у адзіную катэгорыю «ліберальных інтэрнацыяналістаў», даводзячы, што іхны супраціў вядзенню вайны ў Іраку вынікаў з самаабвешчанай адданасці шматбаковым кансультацыям і міжнароднаму праву. Для ліберальных інтэрнацыяналістаў вайна легітымная толькі тады, калі яна санкцыянаваная ААН. Але ўяўная высакароднасць, паводле Краўтхамера, прыкрывае прыземленыя матывы: еўрапейцы ёсць ліліпутамі, што прагнуць звязаць Гулівера-

Амерыку, абмяжоўваючы амерыканскую свабоду дзеянняў. Такім чынам, яны: а) наіўныя; б) не заслугоўваюць нават сур'ёзнай крытыкі.

З апісання Краўтхамерам пазіцыі дэмакратаў/еўрапейцаў сапраўды можна даведацца пра погляды, якія выказваліся ў шматлікімі апанентамі вайны ў Іраку. Аднак калі б ён прыслухаўся да таго, што насамрэч было сказана многімі еўрапейцамі (амерыканцы цяпер слухаць іншых не любяць), ён адкрыў бы для сябе, што большасць пярэчанняў грунтавалася не на нарматывізме і тычылася не працэдурных пытанняў ролі ААН, а, хутчэй, апелявала да здаровага глузду падобна, не былі ўпэўнены ў тым, што Ірак быў настолькі небяспечным, якім яго малявала адміністрацыя Буша. Яны даводзілі, што Ірак пад кіраўніцтвам партыі «Баас» не мае супольнага з «Аль-Каідай» і што атака на Ірак азначала адхіленне ад Вайны з Тэрорам. Больш за тое, многія еўрапейцы не надта верылі ў тое, што ЗША здолеюць паспяхова кантраляваць паваенную сітуацыю, а яшчэ менш верылі ў амбітны план дэмакратызацыі Блізкага Усходу. Яны лічылі, што працяглы палестынска-ізраільскі канфлікт – больш небяспечная крыніца нестабільнасці і тэрарызму, чым Ірак, і што адміністрацыя Буша падрывае давер да сябе, гэтак яўна стаючы на бок ізраільскага прэм'ер-міністра Арыэля Шарона.

Усе гэтыя тэзісы былі – і вядома ж, ёсць – прадметам для дэбатаў. Што да пытання аб пагрозе, якую ўяўляў сабой Ірак: і еўрапейцы, і амерыканцы, відавочна, памыляліся, мяркуючы, што Хусэйн валодае значнымі запасамі хімічнай і бактэрыялагічнай зброі. Але еўрапейская пазіцыя аказалася бліжэйшай да ісціны, чым больш алармісцкая амерыканская. Пытанне аб сувязях Ірака з «Аль-Каідай» ад пачатку вайны было моцна палітызаванае ў Амерыцы. Я схільны думаць, што гэтыя сувязі існавалі (было б дужа дзіўна, калі б іх зусім не было), але іх значэнне было абмежаваным. 11 верасня сведчыць, што «Аль-Каіда» не мае патрэбы ў падтрымцы нейкай дзяржавы, каб нанесці велізарную шкоду Злучаным Штатам, і што, такім чынам, атака на Ірак не была найлепшым сродкам у барацьбе з «Аль-Каідай». У пытанні аб кантролі над паваенным Іракам выявілася, што найбольш скептычнае крыло еўрапейцаў

збольшага мела рацыю. Адміністрацыя Буша ўвяла войскі ў Ірак, маючы агромністыя ілюзіі адносна паваеннай сітуацыі. Што да палесцінскай праблемы, тут еўрапейцы, здаецца, памыляюцца – прынамсі, у тым, што вырашэнне канфлікту магчымае толькі ў тым выпадку, калі Злучаныя Штаты націснуць на Ізраіль.

Галоўнае пытанне не ў тым, хто мае рацыю, а ў тым, што меркаванне прыхільнікаў здаровага сэнсу нельга ацэньваць так прасталінейна, як тое робяць Краўтхамер і іншыя неаканцэрватары. З ягоных словаў вынікае, што пазіцыя адміністрацыі Буша была апраўдана па ўсіх пунктах, а любы сумнеў у яе мэтазгоднасці мае нізкую альбо несумленную матывацыю. Каб жа так было! Тое, што наша пазіцыя мела масу недахопаў, стварыла для Амерыкі вялізную праблему легітымнасці, што негатыўна адаб'ецца на нашых інтарэсах у перспектыве.

Корань закранутай праблемы ў тым, што кульгае канцэпцыя аднапалярнага свету, высунутая Краўтхамерам. Паводле ягоных словаў, Злучаныя Штаты былі прызначаны на ролю «ахоўніка міжнароднай сістэмы» праз сваю яўную вайсковую перавагу ў свеце. Калі б нас сапраўды прызначылі на гэтую ролю, ме не мелі б праблем з легітымнасцю, але, на жаль, прызначылі мы сябе самі. Насамрэч, мы сказалі рэшце свету: «хлопцы, верце нам, мы будзем адстойваць вашы інтарэсы, бо мы ж не нейкая там проста супердзяржава, мы ж Злучаныя Штаты». Самі мы не даверылі б Расіі, Кітаю, Індыі, Францыі дый нават Вялікабрытаніі гэтую ролю, але лічым, што рэшта свету мусіць яе нам даверыць. А ўсё таму, што ЗША адрозніваюцца ад іншых краін, што мы дэмакратычная краіна, якая спараджае універсальныя каштоўнасці. Такім чынам, ЗША нельга мераць на агульны капыл «уласнага інтарэсу», як іншых прэтэндэнтаў на гегемонію.

У гэтай аргументацыі штосьці ёсць, але няцяжка здагадацца, што за межамі Злучаных Штатаў яна не выкліча энтузіязму, прычым не толькі ў краінах, што з'яўляюцца адвечнымі нашымі ворагамі.

Краўтхамер-як-рэаліст адстойвае вузкае разуменне

нацыянальнага інтарэсу, з якога можна зрабіць выснову: мы будзем не вельмі надзейным партнёрам для сябра, які змагаецца поплеч, калі мы не будзем мець у дадзенай сітуацыі вялікага інтарэсу...

Легітымнасць – складанае паняцце. Яно звязана з прынцыпамі справядлівасці, але не тоеснае справядлівасці. Людзі вераць, што нейкая сістэма інстытутаў ёсць легітымнай, але легітымнасць заўсёды суадносіцца з людзьмі, якія выказваюць давер. Яна важная для нас не толькі таму, што мы жадаем быць добрымі самі для сябе, але і таму, што яна карысная. Іншыя народы пойдуць амерыканскім шляхам тады, калі павераць, што ён легітымны: іначай яны будуць супраціўляцца, скардзіцца, пратэставаць або актыўна змагацца з намі. У звязку з гэтым важна не столькі наша разуменне легітымнасці, колькі разуменне яе іншымі народамі. Калі прадстаўнікі індыйскага ўраду кажуць, што Індыя не будзе ўдзельнічаць у падтрыманні міру ў Іраку, пакуль не атрымае мандату Рады Бяспекі ААН, гэта не азначае, што мы павінны аспрэчваць легітымнасць Рады Бяспекі ААН – індыйцы тады нам не дапамогуць.

Краўтхамер і іншыя прымяншаюць важнасць легітымнасці, спасылаючыся на прыклад ААН і страляючы па гэтай вельмі лёгкай цэлі. Вядома, ААН мае праблемы з легітымнасцю, паколькі членства ў ёй базуецца не на прынцыпе легітымнасці, а на фармальным крытэры суверэнітэту. У склад ААН адпачатку ўваходзілі прадстаўнікі дыктатарскіх рэжымаў і/альбо краін, дзе ігнаруюцца правы чалавека. Нашы еўрапейскія саюзнікі самі не вераць у неабходнасць легітымізацыі міжнародных акцый праз Раду Бяспекі: калі яны ўбачылі, што не могуць дабіцца тамака падтрымкі інтэрвенцыі ў Косаве праз расійскае вета, яны цудоўна абышліся без ААН, звярнуўшыся замест таго да NATO.

Але наша праблема з легітымнасцю ў Іраку зайшла значна далей. Нават калі б мы звярнуліся па падтрымку краін-членаў NATO – да альянсу дэмакратый, што падзяляюць аднолькавыя каштоўнасці – мы не здолелі б дабіцца большасці, не кажучы пра кансенсус, патрэбны для калектыўных дзеянняў у гэтай арганізацыі. Адміністрацыя Буша любіць выхваляцца памерамі

«кааліцыі ахвотных», якую Злучаным Штатам фактычна ўдалося сабраць. Але колькасць можа задаволіць толькі тых, хто не зважае на якасць атрыманай намі дапамогі. Акрамя Брытаніі і Аўстраліі, ніводная краіна не пажадала адправіць сваіх людзей у Ірак у час актыўных баявых дзеянняў, а цяпер, калі пасляваеннае ўміратварэнне стала больш нагадваць новую фазу ваенных дзеянняў, Іспанія, Гандурас і іншыя сябры кааліцыі вырашылі «выйсці з гульні». Тыя ўрады, што падтрымалі ЗША, зрабілі гэта паводле разліку, зыходзячы з нацыянальнага інтарэсу, якім яго бачаць палітычныя эліты – амаль ва ўсіх выпадках насуперак меркаванню пераважнай большасці ўласнага насельніцтва. Апошняе датычыць і Брытаніі, Тоні Блэра, самага вернага нашага саюзніка, і Польшчы, самай праамерыканскай краіны ва Усходняй Еўропе. Дарма што паводзіны нямецкага канцлера Герхарда Шродэра, які актыўна процістаяў вайне, глыбока расчаравалі некаторых амерыканцаў: я лепей жадаў бы мець на сваім баку Германію, чым бездапаможную і карумпаваную Украіну.

Іншымі словамі, стала ясна, што вялікая частка свету, уключаючы многія народы, якія ў нармальных умовах схіляюцца да сяброўства з намі, не паверылі ў легітымнасць нашых дзеянняў у Іраку. Справа была не ў тым, што Рада Бяспекі не дала згоды на ваенныя дзеянні, а ў тым, што многія з нашых сяброў не паверылі, што мы – гэта значыць, адміністрацыя Буша – здольныя мудра скарыстаць нашу перавагу ў сіле на карысць усяго свету. З гэтым трэба лічыцца не толькі па прычынах, блізкіх рэалістам (дзеля нашай здольнасці прыцягваць саюзнікаў, каб тыя дзялілі з намі цяжар адказнасці), але і з ідэалістычных меркаванняў (дзеля захавання здольнасці натхняць іншыя краіны сваім прыкладам).

Не веру, што адміністрацыя Буша грэбавала патрэбай у легітымнасці. Хутчэй за ўсё, яна спадзявалася і верыла, што легітымнасць у міжнароднай супольнасці можна здабыць пастфактум, а не перад тым, як брацца за справу. Між супрацоўнікаў адміністрацыі была распаўсюджана думка, што як толькі стане ясна, што ЗША збіраюцца сілаю раззброіць Ірак, нашы саюзнікі ў NATO (уключаючы Францыю) урэшце

падтрымаюць нас. Усе былі шакаваны настойлівасцю, з якой Францыя і Германія процістаялі вайне, і тым, што ЗША не ўдалося атрымаць галасоў Мексікі і Чылі пры галасаванні ў Радзе Бяспекі (гэтыя краіны звычайна выказвалі нам сваю лаяльнасць).

Спадзеў на легітымацыю пастфактум не быў цалкам неабгрунтаваным. Ён мог спрацаваць, калі б пасля інтэрвенцыі ЗША выявілі ў Іраку вытворчасць зброі масавага знішчэння ці калі б пераход да дэмакратычнага ладу аказаўся такім хуткім і танным, як на тое спадзявалася адміністрацыя Буша. Многія сцвярджалі, што амерыканскае аднабаковае ўмяшанне ў Іраку наносіць удар па традыцыях міжатлантычнага супрацоўніцтва, але яны забылі гісторыю. У час халоднай вайны ЗША неаднакроць прымушалі еўрапейскіх саюзнікаў рабіць непрыемныя для іх рэчы, часта спачатку ставячы іх перад фактам, а потым просячы падтрымкі задняй датай. Пазіцыя амерыканцаў была тады больш абгрунтаванай за еўрапейскую, і іхныя дзеянні атрымлівалі легітымацыю пастфактум. Таму ў тых выпадках ЗША не тое што не ганілі за аднабаковасць у прыняцці рашэнняў, а хвалілі за лідэрства.

Хтосьці мог бы вытлумачыць сучасную вайну проста як адзінкавую памылку альбо няправільны разлік у доўгім шэрагу паспяховых акцый. Вядома, было б крайне аблудна сцвярджаць, што Злучаныя Штаты павінны сядзець як мыш пад венікам і адмаўляцца весці рэй у заходнім свеце ў выпадках, калі нашы саюзнікі выказваюць з намі нязгоду. Мы не павінны таксама рабіць высновы, што гульня на апярэджанне і аднабаковы падыход ніколі нам не спатрэбяцца.

З іншага боку, мы аказаліся няздольнымі атрымаць легітымнасць у гэты раз не проста з-за таго, што нам не пашанцавала. У параўнанні з перыядам халоднай вайны свет змяніўся настолькі, што гэта адбіваецца на нашай здольнасці весці рэй у свеце і выступаць ад імя «ўсяго свету». Змяніўся ў трох аспектах.

Першы фактар, вядома, заключаецца ў распадзе Савецкага Саюза і адсутнасці ўсёабдымнай пагрозы, што зыходзіць ад звышдзяржавы. У перыяд халоднай вайны ў свеце існаваў

паўзучы антыамерыканізм і амерыканская палітыка сутыкалася з народным супрацівам. Але наш уплыў у Еўропе заставаўся моцным дзякуючы правацэнтрысцкім партыям, якія цанілі ролю Амерыкі ў вызваленні Еўропы і баяліся савецкага ўплыву. Калі-небудзь сусветная тэрарыстычная пагроза можа быць праінтэрпрэтавана як савецкая, але пакуль да апошняй ёй далёка.

Другі фактар мае дачыненне да самой нашай ваеннай магутнасці і першынства ў свеце. У час халоднай вайны, калі наша сіла была больш ці менш супастаўляльнай з савецкай, мы моцна клапаціліся аб даверы, аб тым, каб не зрабіць недакладных крокаў. Мы сцерагліся, каб адступленне перад нейкім выклікам не было расцэнена як знак слабасці і не было эксплуатавана іншым бокам. Сёння ЗША відавочна дамінуюць у вайсковай сферы. Вера ў нашу рашучасць і здольнасць ужыць сілу застаецца важнай, але ж цяпер мы не абавязаны даказваць нашу «круцізну» пры кожнай нагодзе.

Апошні аргумент звязаны з тым фактам, што цяперашняе поле бітвы – не Еўропа, а Блізкі Усход. Паміж ЗША і іх саюзнікамі заўсёды былі вострыя рознагалоссі адносна таго, як весці сябе з СССР, але яны бляднеюць у параўнанні з рознасцю пазіцый паміж ЗША і любой іншай краінай адносна арабскай праблемы. Таму мы павінны звярнуцца да гэтага пытання.

ЯК ВЕСЦІ СЯБЕ НА БЛІЗКІМ УСХОДЗЕ

Краўтхамер многа і ўважліва разважаў пра ізраільска-палесцінскі канфлікт, і ягоныя думкі пра тое, як павінны дзейнічаць ізраільцяне, адлюстроўваюць ягоны пункт гледжання на паводзіны ЗША ў арабскім свеце. Краўтхамер не падтрымліваў раней актыўнага палітычнага ўдзелу Амерыкі ў справах арабскага свету. У мінулым ён прапаноўваў своеасаблівы погляд на арабскую псіхалогію: маўляў, арабы больш за ўсё як крыніцу легітымнасці паважаюць сілу. Як ён аднойчы сказаў у радыёінтэрв'ю: калі вы хочаце заваяваць іх сэрцы і душы, вам трэба схапіць іх і добра сціскануць.

Пры канцы сваёй прамовы ў АІП Краўтхамер гаворыць, што ЗША знаходзяцца ў разгары зацятай і бязлітаснай вайны з нястомным ворагам, які пагражае знішчыць заходнюю цывілізацыю. Гэты тып прамовы характэрны для апісання сітуацыі, у якой знаходзіцца Ізраіль ад пачатку другой інтыфады. Пытанне ў тым, ці пасуюць такія прамовы для апісання стану ЗША. Хіба мы падобныя да Ізраіля, хіба мы ўцягнуты ў бязлітасную барацьбу з вялікай часткай арабскага і мусульманскага свету і ў нас, апрача тактыкі «жалезнага кулака», няма варыянтаў дзеяння? І ўвогуле, хіба стратэгічная дактрына маленькай, уразлівай краіны, аточанай бескампрамісным ворагамі, мае сэнс для адзінай звышдзяржавы ў свеце, якая выдаткоўвае на абарону столькі ж, колькі 16 іншых самых магутных краін свету, разам узятых?

На маю думку, перанясенне сітуацыі адной краіны на другую некарэктнае. Калі Ізраілю сапраўды даводзіцца ўвесь час мець справу з ворагамі, не схільнымі да кампрамісаў, то становішча Злучаных Штатаў зусім не такое адназначнае. Насамрэч, у «Аль-Каідзе» і іншых рэгіянальных ісламісцкіх групоўках мы бачым ворагаў, якія ненавідзяць нас не так за тое, што мы робім, як за тое, што мы існуем. З прычын, выкладзеных вышэй, я не думаю, што яны з'яўляюцца для нас смяротнай пагрозай, але вядома ж, яны жадалі б выконваць гэтую ролю, і цяжка ўявіць сабе, як мы можам іх трактаваць іначай, чым знішчаючы, ізалюючы або нейтралізуючы вайсковымі сродкамі.

Але радыкалы – гэта пясчынкі ў мусульманскім моры (блізу 1,2 мільярда чалавек), якое зусім не абавязкова з'яўляецца нашым бескампрамісным ворагам. Калі хтосьці мае наконт гэтага сумневы, яму варта зазірнуць у першую з дзвюх справаздач праграмы «Гуманітарнае развіццё ў арабскім свеце» ААН, якая змяшчае апытанне, ці хацелі б рэспандэнты эміграваць у ЗША, калі б мелі такую магчымасць. Амаль ва ўсіх арабскіх краінах большасць апытаных адказала станоўча. З другога боку, назіранні П'ю за тэндэнцыямі сусветнай грамадскай думкі паказалі, што доля негатыўных меркаванняў пра ЗША ў Іарданіі, Егіпце, Турцыі, Пакістане і іншых мусульманскіх краінах, што лічацца прыязнымі да Амерыкі, упала да крытычна нізкай адзнакі. Калі аналізаваць сукупнасць

сабраных звестак, нельга ўнікнуць уражання, што маса насельніцтва ў мусульманскіх краінах не любіць альбо ненавідзіць нас не за тое, што мы існуем, а за тое, што мы робім. Ім не падабаюцца вядомыя аспекты нашай замежнай палітыкі, і гэты факт мы працягваем недаацэньваць: недастатковая ўвага да патрабаванняў палесцінцаў, некрытычная падтрымка дыктатараў у мусульманскіх краінах, а цяпер і акупацыя Ірака.

Вайна з тэрарызмам, іншымі словамі, ёсць класічнай антыпартызанскай вайной, за выняткам таго, што яна адбываецца ў сусветным маштабе. У ёй бяруць удзел сапраўдныя «кепскія хлопцы», што выяўляюцца нават больш закаранелымі ідэалагічнымі ворагамі, чым савецкія лідэры. Аднак іх поспех залежыць ад стаўлення шырэйшай масы насельніцтва, якое можа альбо выказваць падтрымку ісламістам, альбо варагаваць з імі, альбо дэманстраваць абыякавасць – у залежнасці ад таго, як мы разыграем свае карты. Як мы бачым на жывым прыкладзе іракскіх гарадоў кшталту Фалуджы ці Наджафа, вайну супраць паўстанцаў весці вельмі цяжка, бо мы павінны знішчыць ворага, не чапаючы астатняга насельніцтва – іначай можна толькі пагоршыць сітуацыю. Антыпаўстанцкая стратэгія вымагае складанай камбінацыі кропкавых удараў, палітычных захадаў і вельмі інтэнсіўных намаганняў выведкі: спалучэння бізуноў і пернікаў.

Ізраіль карыстаўся пернікамі на працягу «мірнага працэсу» пасля пагадненняў у Осла і перайшоў да ўжывання бізуноў пасля калапсу ослаўскіх дагавораў і пачатку другой інтыфады. Не маю намеру абараняць той ці іншы падыход, пагатоў абодва яны, здаецца, спрацоўвалі не вельмі добра. Але амерыканская палітыка ў дачыненні да арабскага свету, аналагічная палітыцы Шарона, што базавалася б пераважна на карыстанні бізунамі, азначала б крах: у нас недастаткова бізуноў, каб «замачыць тэрарыстаў у сарціры». Вядома ж, ісламісты ад самага пачатку ненавідзяць нас, але аднапалярнасць у стылі Краўтхамера павялічыла б нянавісць да ЗША ў шырэйшым асяроддзі. Гэта наводзіць на думку, што нам патрэбна больш складаная стратэгія, якая прывяла б да змены прапорцыі бізуноў і

пернікаў. Адміністрацыя Буша распачала «Вялікую блізкаўсходнюю ініцыятыву», але гэтая праграма павінна толькі закласці пачатак для палітычных захадаў.

Палітыка Ізраіля, што палягае ў няспынным наступленні, ударах на апярэджанне і перахопе ініцыятывы (напрыклад, шляхам мэтаскіраваных забойстваў небяспечных асоб) не зусім пасуе Злучаным Штатам. ЗША валодаюць значным полем для манеўру і не маюць патрэбы пастаянна рызыкаваць, абы толькі не ўпусціць ініцыятывы. Адзіная ў свеце звышдзяржава, якая схіляецца да ўдараў на апярэджанне, будзе палохаць не толькі ворагаў, а і сяброў. Злучаныя Штаты не павінны выракацца права «біць першымі», але гэтым правам трэба карыстацца асцярожна. Нават выказванні пра магчымасць карыстання гэтым правам, зробленыя, напрыклад, у дакуменце аб «Нацыянальнай стратэгіі бяспекі», будуць павялічваць супраціў амерыканскай палітыцы ў свеце, ліючы воду на млын яе непрыяцеляў. Ізраіль можа сабе дахволіць адмахнуцца ад патэнцыйных саюзнікаў і ігнараваць міжнародную грамадскую думку датуль, пакуль ён абапіраецца на падтрымку ЗША. Напэўна, ЗША здольныя выжыць, калі будуць ізаляванца падобна да Ізраіля, аднак незразумела, чаму мы павінны заганяць сябе ў такое становішча. Наўрад ці яно выгаднае пры ператварэнні Блізкага Усходу паводле нашых стандартаў згодна з ідэалістычнымі вільсанаўскімі ідэямі экспарту дэмакратыі.

ШТО РАБІЦЬ?

Паколькі я ўзяўся толькі крытычна асэнсаваць погляды Чарльза Краўтхамера і не збіраюся балатавацца ў прэзідэнты ЗША, я не бяруся прапаноўваць падрабязную пазітыўную праграму амерыканскай замежнай палітыкі. З іншага боку, неаканцэрватары самі прапаноўваюць элементы той замежнай палітыкі, пра якую я сказаў вышэй. Злучаныя Штаты павінны зразумець патрэбу ў ажыццяўленні ўлады ў сваіх інтарэсах і ў адпаведнасці са сваімі вартасцямі, але адначасова неабходнасць дзейнічаць асцярожна і тонка. Адзіная ў свеце супердзяржава мусіць памятаць, што на яе сілавую перавагу

іншыя краіны паглядаюць з вялікай падазронасцю і што ёй прыйдзецца або ведаць меру ў ажыццяўленні сваёй улады, або сутыкнуцца з рэакцыямі процідзеяння.

Па-першае, трэба рабіць тую простую дыпламатычную работу – перамовы, пабудова кааліцый – пра якую бушаўская адміністрацыя, здаецца, забылася перад іракскай вайной. Таксама не варта без дай прычыны абражаць «думку сусветнай грамадскасці». Нам не след станавіцца прыхільнікамі ААН дзеля ААН ці шматбаковага падыходу дзеля шматбаковага падыходу; і ўсё-ткі мы лічым міжнародныя інстытуты больш легітымнымі за нацыянальныя дзяржавы ў некаторых пытаннях. З другога боку, для ажыццяўлення як рэалістычнай, так і ідэалістычнай складовых нашай стратэгіі нам патрэбныя ідэйныя саюзнікі. Працы з імі мусім надаваць больш часу і энергіі.

Прасоўванне дэмакратыі мусіць заставацца нашым прыярытэтам нумар адзін, асабліва ў дачыненні да Блізкага Усходу. Аднак Штатам варта больш рэалістычна ацэньваць свой нацыятворчы патэнцыял і праяўляць большую асцярожнасць пры выкарыстанні тэхналогій сацыяльнай інжынерыі ў тых частках свету, у якіх мы не надта добра разбіраемся. З іншага боку, у будучыні мы будзем непазбежна ўцягнутыя ў такія праекты (напрыклад, пасля раптоўнага краху паўночнакарэйскага рэжыму), і добра было б, каб мы былі да гэтага лепш падрыхтаванымі. Гэта значыць, патрэбная структура, якая б мела адпаведныя паўнамоцтвы й рэсурсы, дастатковыя для выканання падобных функцый – і патрэба ў ёй мусіць быць улічаная ў працэсе перабудовы калясілавых ведамстваў.

Да гэтага спісу я хацеў бы дадаць яшчэ адну дэталь, хоць абмежаванасць месца не дазваляе мне спыніцца на ёй падрабязней. Прадбачлівыя творцы паваеннага парадку былі руплівымі будаўнікамі міжнародных інстытутаў. Яны стварылі не толькі шмат у чым заганную сістэму ААН, але і Брэтан-Вудскія структуры, NATO, амерыканска-японскі і амерыканска-паўднёвакарэйскі саюзы, Генеральную асацыяцыю па тарыфах і гандлі, СГА і яшчэ цэлую сціжму арганізацый. Чыноўнікі

адміністрацыі Буша структурабудаўніцтву многа ўвагі не надавалі, а мусілі б. Калі Амерыцы недаспадобы, што ў ААН першую скрыпку граюць прадстаўнікі недэмакратычных рэжымаў, трэ было больш высілкаў прысвячаць разбудове іншых арганізацый – таго ж NATO ці заснаванай за часоў Клінтана Супольнасці дэмакратычных краін, што грунтуюцца на нормах і каштоўнасцях, якія мы падзяляем. Між тым рэспубліканцы ніколі ўсур'ёз не разглядалі Супольнасці дэмакратычных краін (той самай, якую шэф французскай дыпламатыі Юбер Ведрын спрабаваў задушыць у зародку), і, думаю, няма сэнсу тлумачыць, чаму. Дык жа ж такі саюз дэмакратычных дзяржаў з новымі дэмакратыямі Усходняй Еўропы і Лацінскай Амерыкі на чале мог бы выконваць легітымуючую функцыю ў свеце, якую NATO выконваць не можа.

Калі ж стварэнне новых сусветных інстытутаў не ўяўляецца магчымым, тады Амерыцы варта развіваць сістэму міжнародных арганізацый рэгіянальнага характару. Адміністрацыя Буша сутыкнулася з шасцібаковым фарматам паўночнакарэйскіх перамоў; чаму б не паспрабаваць заснаваць пяцібаковую структуру пасля таго, як (будзем спадзявацца) будзе знойдзенае выйсце з тупіка па праблеме атамнай бомбы Кім Чэн Іра? Такая арганізацыя магла б выканаць важныя каардынуючыя функцыі ў выпадку, скажам, раптоўнага калапсу паўночнакарэйскага рэжыму. Узровень узаемнага даверу паміж Японіяй, Карэяй і Кітаем нізкі, і шматбаковы форум лепш спрыяў бы абмену інфармацыяй і планамі, чым цяперашняя сістэма, пабудаваная на двухбаковых альянсах з ЗША. Пекін усе апошнія гады праводзіў ідэю шэрагу рэгіянальных міжнародных пагадненняў – «АСЕАН плюс тры», пагадненне паміж Кітаем і АСЕАН аб зоне свабоднага гандлю, пагадненне аб Паўночна-Усходняй Азіяцкай зоне свабоднага гандлю, і, урэшце, пагадненне аб усходнеазіяцкай свабоднай зоне. Гэтыя дагаворы могуць калісьці стаць падмуркам таксама і для арганізацыі рэгіянальнай бяспекі. У той час як японцы разглядаюць гэтыя пагадненні як запрашэнні да рэгіянальнага лідэрства і адказалі на іх выгаднымі для сябе дамовамі аб гандлі, адміністрацыя Буша, наколькі я ведаю, не сфармулявала нічога падобнага на ўцямны адказ.

Ці мы жадаем проста прыняць да ведама прапановы аб стварэнні шматбаковых рэгіянальных арганізацый, як гэта адбылося ў выпадку з усходнеазіяцкай супольнасцю ў пачатку 1990-х альбо з японскай ідэяй рэгіянальнага міжнароднага валютнага фонду? Альбо мы жадаем узяць чынны ўдзел у падзеях рэгіёну і дастасоўваць такія прапановы да сваіх патрэб? Лічу, што ва Усходняй Азіі недастаткова развіты дзяржаўныя інстытуты, і Злучаным Штатам ёсць над чым творча паразважаць у гэтым рэгіёне. Мяркую таксама, што гэтая «зверка гадзіннікаў» адпавядае прапанаванаму Краўтхамерам «дэмакратычнаму глабалізму», не будучы ні ізаляцыянісцкай, ні ліберальна-ідэалісцкай, ні рэалісцкай стратэгіяй. Сумняваюся, што яна будзе разглядацца ў рэчышчы неакансерватыўнага падыходу, але – чаму б і не?

Пераклалі з амерыканскай Сяргей Петрыкевіч і Вольф Рубінчык

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[illegible] ...ыўнага

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image] [image] [image] 2005

"Да Зыхасту"

аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image] **ЧАРЛЬЗ КРАЎТХАМЕР**

Чарльз Краўтхамер У абарону дэмакратычнага рэалізму

---

10 лютага 2004 году ў лекцыі, прачытанай у Інстытуце амерыканскага прадпрымальніцтва і прысвечанай Ірвінгу Крысталу*, я выклаў тэорыю замежнай палітыкі, якую назваў тады дэмакратычным рэалізмам. Тэорыя базавалася

на
пастулаце,
згодна з
якім 1990-я
гады былі
«адпачынкам
ад гісторыі»,
ілюзорным
перыядам,
калі, як мы
лічылі,
барацьба за
выжыванне з
разнастайнымі
відамі
таталітарызму,
характэрная
для
папярэдніх
шасці
дзесяцігоддзяў,
скончылася
назаўжды.
11 верасня
жорстка
нагадала
нам, што
гісторыя не
скончылася.
Мы ўбачылі,
што зноў
мусім
змагацца за
выжыванне –
гэтым разам
нават з
больш
фанатычным,
падступным
і

мэтаскіраваным
ворагам,
чым даўней.
Тым не
менш, адзін
фактар
выявіўся на
нашу
карысць. Па
знікненні
Савецкага
Саюзу мы
ўступілі ва
ўнікальную
эпоху
чалавечай
гісторыі,
эпоху
аднапалярнасці,
калі
Амерыка
ўпершыню
мае
большую
перавагу ў
сіле, чым
якая-небудзь
іншая
дзяржава за
апошнія
пяць
стагоддзяў
існавання
сучаснага
сусветнага
парадку.
Ключавое
пытанне
гэтай новай
эпохі: ці

зможам мы
скарыстаць
сітуацыю
аднапалярнай
магутнасці,
каб адказаць
на новыя
выклікі?
Альбо мусім
даверыцца
расплывістаму
інтэрнацыяналізму,
такому
характэрнаму
для
замежнапалітычнага
мыслення
амерыканскіх
ліберalаў і
еўрапейскіх
эліт, як мы і
рабілі
першыя
дзесяць
гадоў пасля
заканчэння
халоднай
вайны?

Прамова і манаграфія, што выйшла следам за ёй[1] , выклікалі шэраг каментароў. Ніводзін, аднак, не быў такім ёмістым, як палеміка Фрэнсіса Фукуямы на 12 старонках у мінулым нумары «The National Interest». З эсэ Фукуямы карысць двайная: з аднаго боку, як удумлівай крытыкі дэмакратычнага рэалізму, з другога – як дэманстрацыі таго, што крытык мала чаго можа прапанаваць у якасці альтэрнатывы.

ДЭМАКРАТЫЧНЫ
РЭАЛІЗМ

У сваёй
прамове я

апісаў
чатыры
галоўныя
школы
амерыканскага
замежнапалітычнага
мыслення.
Ізаляцыянізм
вызначае
амерыканскія
нацыянальныя
інтарэсы
выключна
вузка і, па
сутнасці,
папросту
хоча
падняць
развадны
мост перад
амерыканскай
цвердзю. На
жаль, у
эпоху
звышгукавых
самалётаў,
падводных
лодак і
балістычных
ракет, не
кажучы пра
партатыўныя
бомбы, як
паказалі
падзеі 11
верасня,
крэпасці не
абараніць
сябе рвамі з
вадою і

развадными мастамі. Ізаляцыянізм ганарыцца сваёй славутай гісторыяй, але сёння ўяўляе сабой тэорыю настальгічную і рэакцыйную. 11 верасня стала днём адмовы ад ізаляцыянізму, як калісьці такой датай стала 11 снежня 1941 году, дзень расфармавання камітэту «Амерыка перадусім»[2].

Ліберальны інтэрнацыяналізм, школа, якая дамінуе як у колах амерыканскіх лібералаў, так і ў вонкавапалітычным істэблішменце, мае большую вагу. Яго фундаментамі з'яўляюцца: а) легалізм, гэта значыць, пабудова сеткі дамоўленасцяў і пагадненняў, пакліканых ахутаць міжнародную супольнасць покрывам норм; б) шматбаковасць, узгадненне дзеянняў з іншымі краінамі ў імя «міжнароднага права»; в) гуманітарнасць, глыбокая насцярожанасць што да «нацыянальных інтарэсаў», якія разглядаюцца як апраўданне палітыкі з пазіцыі сілы. Апошняя ўстаноўка абумовіла галасаванне дэмакратаў у Кангрэсе супраць вайны ў Іраку, заліве – пазіцыю, падтрыманую дэмакратычнай адміністрацыяй (якая ініцыявала гуманітарныя вайсковыя інтэрвенцыі ў Гаіці,

[1] Krauthammer C. Democratic Realism: An American Foreign Policy for a Unipolar World. – Washington, 2004.

Зоны і Косава). Ліберальныя інтэрнацыяналісты ўспрымаюць ў 1940 годзе. Мэтай каміформу было не дадаць ўступленне ЗША ў Другую сусветную сапраўдным мэтам і абудзе ніякай міжнароднай сістэмы, якая б пераклала б на прынцыпах нацыянальнага грамадства, гэта значыць, на праве, дамовах, пагадненнях, узаемаразуменні, то бок нормах, якія ўрэшце прывялі б да знікнення сілавой палітыкі. Дзеля гэтага ліберальныя інтэрнацыяналісты гатовыя крок за крокам адмовіцца ад амерыканскага статусу ўнікальнай аднапалярнай сілы на карысць новага сусветнага парадку, у якім Амерыка была б не арбітрам міжнародных падзеяў, а добрым і спакойным грамадзянінам свету.

Трэцяя школа, *рэалізм*, падкрэслівае першынство сілы ў міжнародных дачыненнях. Рэалісты лічаць, што міжнародная сістэма падобная да Гобсавага прыроднага стану. Яго не варта блытаць з уладкаваннем нацыянальнага грамадства, дзе прысутнічаюць адзінства вартасцяў, манаполія на ўладу і, што самае важнае, інстытут, які дыктуе нормы, – усяго гэтага няма ў міжнароднай сістэме. Рэалісты не бачаць карысці ў ліберальным інтэрнацыяналізме, які толькі адцягвае Злучаныя Штаты ад іх праўдзівых задач. ЗША, напрыклад, змарнавалі 1990-я гады на бясконцыя перамовы з мэтай запабегчы пашырэнню зброі масавага знішчэння, што не мелі абсалютна ніякага эфекту на сапраўдных тэрарыстаў і краіны-ізгоі, якія спрабуюць завалодаць гэтым відам зброі.

Рэалізм мае тую перавагу, што найбольш ясна разумее новую аднапалярнасць і яе выгады, уключна з аднабаковым і прэвентыўным ужываннем сілы ў выпадку неабходнасці. Аднак чысты рэалізм усё-такі не ўпісваецца ў амерыканскі кантэкст, бо не прапануе ніякага іншага падыходу, акрамя сілавога. Ён ёсць сродкам, але не мэтай. Ён не спрацоўвае ў збудаванай на ліберальных прынцыпах краіне, якая ўважае сябе за ўвасабленне ідэі дэмакратыі.

Чацвёртую школу – *дэмакратычны глабалізм* – часта некарэктна называюць неакансерватызмам. Яе прыхільнікі разглядаюць пашырэнне дэмакратыі, «поспех свабоды», як назваў яго Джон Ф. Кенедзі ў сваёй інаўгурацыйнай прамове, і

як мэту, і як сродак замежнай палітыкі. Найбольш вядомыя прадстаўнікі гэтай школы мыслення, Джордж Буш-малодшы і Тоні Блэр, імкнуцца аб'яднаць Амерыку і іншыя краіны ў барацьбе за гэтыя каштоўнасці. Адказ дэмакратычнага глабалізму на 11 верасня – пачатак вайны супраць тэрору, базавым элементам якой ёсць пашырэнне дэмакратыі на ўсім свеце.

Дэмакратычны глабалізм – гэта ўдасканалены рэалізм, паколькі ён разумее важнасць дэмакратыі як сродку дасягнення сусветнай бяспекі і стабільнасці. Рэалісты недаацэньваюць ролю нацыянальных дэмакратычных структур. Для іх сістэма дзяржаў – арэна, на якой сутыкаюцца більярдныя шары. Рэалісты мала цікавяцца ўнутранымі справамі. Дэмакратычныя глабалісты разумеюць, што, як правіла, саюзныя дэмакратычныя краіны мацуюць самыя бяспечныя альянсы і найбольш стабільныя адносіны. Таму пашырэнне дэмакратыі – зразуметай не толькі як свабодныя выбары, але і як рэальны падзел улады, абарона меншасцей, забеспячэнне чалавечых правоў, вяршэнства права і адкрытая эканоміка – мае, урэшце, не толькі маральную, але і геапалітычную каштоўнасць.

Праблема дэмакратычнага глабалізму, як я падкрэсліў у сваёй прамове, у тым, што ён занадта амбітны і ідэалістычны. Выказванне Тоні Блэра, маўляў, «пашырэнне свабоды ёсць нашай апошняй лініяй абароны і нашай першай лініяй атакі», надта размытае. «Небяспека дэмакратычнага глабалізму, – пісаў я, – у яго універсалізме, бясконцым дэкларацыі чалавечай свабоды, яго спакусе ўсталяваць сцяг дэмакратыі ўсюды ў свеце». Такі крыжовы паход на ўвесь свет рызыкуе вычарпаць нашы рэсурсы, падарваць маральны дух і адцягнуць увагу ад галоўнай небяспекі. Таму я прапанаваў альтэрнатыву, «мэтаскіраваны, прадуманы і выбіральны» *дэмакратычны рэалізм*, які вядзе вайну за дэмакратыю не ўсюды ў свеце, дзе існуе пагроза свабодзе, а толькі там, дзе гэта апраўдана разлікам – у тых рэгіёнах, дзе абарона альбо прасоўванне свабоды мае ключавое значэнне для поспеху ў шырэйшай вайне супраць праціўніка, што пагражае нашаму існаванню. У халоднай вайне такім нашым ворагам быў савецкі камунізм, сёння яго месца заняў арабска-ісламскі радыкалізм. Таму

«насамрэч такі разлік апраўданы ў ісламскім паўмесяцы ад Паўночнай Афрыкі да Афганістану».

ЖЫЦЦЁВАЯ ПАГРОЗА

Галоўны крытычны закід Фукуямы ў тым, што я няправільна разумею новы сусветны парадак, у якім нібыта не вядзецца барацьба на выжыванне. Называючы наша змаганне з арабскімі/ісламскімі радыкаламі «жыццёвым», я нібыта перабольшваю пагрозу і тым самым перакручваю сэнс усёй амерыканскай замежнай палітыкі. «Краўтхамер, – піша ён, – гаворыць аб тым, што ЗША знаходзяцца ў разгары зацятай і бязлітаснай вайны з нястомным ворагам, які пагражае знішчыць заходнюю цывілізацыю». «Гаворыць», быццам бы размова ішла аб лятучых талерках… Насамрэч жа, сцвярджае Фукуяма, «Аль-Каіда» і іншыя радыкальныя ісламскія групоўкі імкнуцца стаць жыццёвай пагрозай для амерыканскай цывілізацыі, але ў цяперашні час і блізка не маюць здольнасці ажыццявіць свае планы». Фукуяма, відавочна, лічыць, што агаворка «ў цяперашні час» засцеражэ яго ад смяротнай небяспекі. Але праблема якраз у тым, што пакуль мы гаворым, «Аль-Каіда» энергічна стараецца пазбавіцца сваіх «недахопаў», якія, паводле бесклапотных разважанняў Фукуямы, гарантуюць нам камфортнае існаванне. Калі Гітлер у 1936 годзе забраў сабе рэйнскі басейн, ён не меў «у гэты час» сродкаў, каб перамагчы Еўропу. Многія еўрапейцы наіўна верылі, што ён не ўяўляе сабой жыццёвай пагрозы. Згодна з Фукуямавай логікай, яны мелі рацыю.

Жыццёвую пагрозу вызначаюць намер, мэта і патэнцыйная здольнасць яе дасягнення. Жыццёвая барацьба ёсць змаганнем за выжыванне і самазахаванне. Пакуль савецкі камунізм не дэградаваў на познім этапе свайго існавання, ён быў настроены на знішчэнне таго, што называецца капіталізмам – гэта значыць, усяго заходняга ладу жыцця. Яго місіяй было зрабіць са светам тое, што ён зрабіў, скажам, у Літве і Чэхаславакіі – перарабіць яго на свой капыл. Барацьба за выжыванне ёсць барацьбой да канца – да знішчэння ці, яшчэ лепей, да навярнення ў сваю веру. Гэтым яна адрозніваецца ад іншых

відаў барацьбы, калі канфліктныя бакі, у прынцыпе, могуць дасягнуць пагаднення (прыкладам, наконт тэрыторыі альбо рэсурсаў, падзелу сферaў улады).

Фукуяма недаацэньвае радыкальны іслам таму, што, на яго погляд, ісламізму бракуе сусветнага месіянства, якім валодалі сапраўдныя жыццёвыя ворагі (камунізм і нацызм). Аднак якраз у нацызме месіянства было абмежаваным. Тэорыя звышрасы кепска спрацоўвае сярод прадстаўнікоў іншых расаў. Хіба нацызм сапраўды меў больш прыхільнікаў і «пятых калон» на Захадзе, чым мае сёння ісламізм? Ячэйкі ісламізму пастаянна ўзнікаюць амаль у кожнай еўрапейскай сталіцы, а часам нават у ЗША. І тут гаворка ідзе менавіта аб той «пятай калоне», пра якую мы ведаем з гісторыі. Якімі няўважлівымі мы былі да прысутнасці сярод нас змоўшчыкаў 11 верасня! Толькі тое, што ісламізм на Захадзе не можа набыць форму палітычнай партыі альбо захапіць думкі славутых заходніх інтэлектуалаў (як гэта здаралася з нацызмам альбо камунізмам), не змяншае пагрозы альбо магутнасці яго прыцягальнасці. Так, радыкальны ісламізм не мае свайго Сартра альбо Эзры Паўнда. Але інтэлектуальнай фанабэрыяй было б думаць, што гэта важней, чым той факт, што ў ісламістаў ёсць Рычарды Рэйды[3], якія ў наступны раз будуць узброены не выбухоўкай, схаванай у абутку, а партатыўнай атамнай бомбай альбо штамамі вугліку.

Недаацэнка прыцягальнасці радыкальнага ісламу – гэта адна фанабэрыя секулярызаванага грамадства. Радыкальны іслам не толькі найбольш бязлітасны і фанатычны ўрыванскага антыамерыканізме, антымадэрнізме і нянавісці да Захаду, вядомых нам. Ён мае выразную перавагу ў тым, што ён абапіраецца на старажытную рэлігію, якое мае больш мільярд вернікаў ва ўсім свеце. Гэта не толькі забяспечвае сталы прыток навабранцаў, выхаваных і вышкаленых у і медрэсэ са значна большай эфектыўнасцю, самастойнасцю і размахам, чым у лагерах гітлерюгенда ці камсамола, дазваляе прыстасаваць пад сябе доўгую і глыбокую паслушэнства, месіянскіх спадзяванняў і культу мучаніцтва. Гітлеру і Сталіну давялося вынаходзіць усё гэта з нуля, прапанаваная Мусаліні, была адно пародыяй. Над ісламскім радыкалізмам лунае сцяг, які мае значна большую гістарычную

[3] Ён ўдзельнічаў у стварэнні ЗША ў 2002 годзе.

традыцыю і знаходзіць значна больш водгуку ў сэрцах, чым сурагатныя рэлігіі свастыкі ці сярпа і молата, што выявіліся гістарычна беднымі і малажыццёвымі.

Фукуяма не проста недаацэньвае магутнасці рэлігіі – ён недаацэньвае і магутнасці тэхналогіі. Ён зацыклены на сваім дапушчэнні, што толькі звышдзяржавы могуць пагражаць іншым звышдзяржавам. Паколькі сёння вораг не падобны да Германіі ці Японіі, пагроза набывае «меншы маштаб». Як на рэаліста, аўтар такіх разважанняў проста сляпы да рэвалюцыі, здзейсненай тэхналогіяй. Адкрыццё сілы атама ёсць патэнцыйна найбольш разбуральным вынаходніцтвам у чалавечай гісторыі з моманту здабыцця агню. Сапраўды, упершыню атамная бомба выбухла паўстагоддзя таму, але веды, як зрабіць такую бомбу, сталі даступнымі толькі цяпер. Хімічная і біялагічная зброя маюць блізка стогадовую гісторыю, але пашырэнне ведаў аб тым, як іх атрымаць, таксама новы феномен. Радыкальны іслам не хавае свайго выразнага намеру – паралізаваць амерыканскую дзяржаву, нанесці шкоду яе эканоміцы і пасеяць усеагульны хаос. Мы пабачылі, што здолелі зрабіць нейкія 19 ісламістаў, якія нават не валодалі зброяй масавага знішчэння. Мы пабачылі таксама, якую шкоду прычынілі сталіцы сусветнай звышдзяржавы ўсяго два канверты з бацыламі вугліку. Уявіце, што нарабіў бы дзесятак бяскрыўдных фураў у дзесятку амерыканскіх гарадоў, калі б з фураў распыляліся бацылы вугліку. Уявіце жменьку атамных зарадаў, адначасова ўзарваных у Нью-Ёрку, Вашынгтоне, Чыкага і ў некалькіх іншых гарадах… Амерыка працягвала б існаваць на мапе. Але што за краіна і што за дзяржава засталіся б ад яе? Калі і гэта не лічыць жыццёвай пагрозай, што ж тады ёю лічыць?

Вядома ж, Фукуяма ўпарціцца ў адмаўленні гэтай яўнай пагрозы, бо ён праславіўся, абвясціўшы «канец гісторыі». «Канец гісторыі» азначаў – калі нешта азначаў увогуле – якраз канец усялякіх ідэалагічных жыццёвых пагроз. Можна зразумець, чаму яму не хочацца прызнаваць, што гісторыя вярнулася назад, што 1990-я гады былі не канцом гісторыі, а перыядам адпачынку ад гісторыі і што цяпер мы зноў, на жаль, у небяспецы. Але ён ідзе далей. Ён настолькі пераканаў самога

сябе ў адмаўленні гэтай новай рэальнасці, што прапануе нават нейкае псіхалагічнае тлумачэнне, чаму я і іншыя неакансерватары так непахісна ўпэўненыя ў тым, што Амерыка вядзе барацьбу на выжыванне. Ягоны адказ: неакансерватары, мабыць, настолькі моцна атаясамліваюць сябе з Ізраілем, што пераблыталі амерыканскія праблемы з ізраільскімі. Неакансерватары лічаць, што ЗША плывуць у адным чаўне з Ізраілем. Фукуяма ж падкрэслівае, што гэта не так.

Гэта выглядае дзіўна. Безумоўна, ЗША не маюць тых самых праблем, што і Ізраіль. Але што з гэтага? Неабавязкова быць Ізраілем, каб адчуваць пагрозу свайму існаванню. Калі становішча Ізраіля ўяўляе сабой узор жыццёвай пагрозы, то Захад ніколі не зазнаў падобнага на працягу шасці дзесяцігоддзяў змагання супраць фашызму і камунізму – але ж сам Фукуяма кажа, што гэта было змаганнем на выжыванне. Ізраіль, бы Карфаген, знаходзіцца пад пагрозай поўнага знішчэння. Францыя была заваявана нацысцкай Германіяй, але засталася Францыяй. Польшча і Венгрыя былі заваяваны Савецкім Саюзам, і зноў сталі незалежнымі Польшчай і Венгрыяй. Калі б Ізраіль быў пераможаны ў адной з войнаў з суседзямі, сёння і ніколі болей яго ўжо не было б. Простае несупадзенне з ізраільскім «узорам» не гаворыць нічога пра тое, знаходзіцца ці не знаходзіцца краіна ў стане вайны на выжыванне.

Цікава, што ў сваёй псіхалагічнай спекуляцыі Фукуяма дазваляе сабе своеасаблівую «юдаізацыю» неакансерватызму. Яна не такая грубая, як у Пэта Б'юкенена* ці малайзійца Махатхіра Махамада, якія, сярод іншых, сцвярджаюць, што амерыканскія неакансерватары (чытай: жыды) проста скачуць пад ізраільскую дудку ды ставяць амерыканскую замежную палітыку на службу інтарэсам Ізраіля і сусветнай яўрэйскай змовы. У параўнанні з гэтымі канспірологамі Фукуяма больш асцярожны. Ягоная аўдыторыя мусіць зразумець, што прыхільнікі лжэідэі аб лёсавызначальнасці Вайны з Тэрорам, а менавіта неакансерватары, настолькі глыбока і падсвядома атаясамліваюць сябе з яўрэйскай дзяржавай, што не могуць бачыць свет неізраільскімі вачыма.

Гіпотэза Фукуямы робіцца смешнай ад таго, што вядучыя прыхільнікі паняцця жыццёвай пагрозы тут – Джордж Буш-малодшы і Тоні Блэр. Як яны маглі пачаць атаясамліваць сябе (на момант Амерыканскае вайсковае ведамства [на момант напісання артыкулу] складалася з Дзіка Чэйні, Коліна Паўэла, Дональда Рамсфельда і Кандалізы Райс. Так, яны ахвотна гаварылі пра жыццёвую пагрозу Злучаным Штатам, дык хіба яны маглі ці пад гіпнозам «неаканцэрватараў» перайшлі ў юдаізм?

Пазней Буш-малодшы (на момант напісання артыкулу) і амерыканскі прэзідэнт Рычард Ніксан, Джэральд Форд і Рональд Рэйган. – **Рэд.**

«НЕАКАНСЕРВАТЫЗМ»

Фукуяма назваў свой крытычны артыкул «Момант неаканцэрватызму», абыграўшы загаловак першай маей работы на тэму замежнапалітычнага мыслення, апублікаванай 14 гадоў таму («Момант аднапалярнасці»)[4]. Ён намагаецца абвергнуць усю неаканцэрватыўную дактрыну. Метад Фукуямы палягае ў тым, каб прапанаваць «уважлівы аналіз таго, што напісаў Краўтхамер, у прыватнасці, ягонай прамовы ў Амерыканскім інстытуце прадпрымальніцтва», паколькі «ягоны тып мыслення стаў характэрным для ўсёй школы» (маецца на ўвазе неаканцэрватызм).

*** Тэрмін мараны (гішп. *marranos* – свінні) у сярэднявечнай Іспаніі і Партугаліі стасаваўся да нашчадкаў хрышчаных юдэяў, якіх падазравалі ў таемнай прыхільнасці да юдаізму. Са значэннем «таемны сімпатык юдаізму» дажыў да сённяшняга часу.

[4] Krauthammer Charles. The Unipolar Moment // Foreign Affairs. Winter 1990/91.

Фукуяма аказаўся не ў стане зразумець, што ў неаканцэрватызме існуюць дзве галоўныя плыні замежнапалітычнага мыслення. Ёсць дэмакратычны глабалізм, які на працягу доўгага часу распрацоўваўся такімі мысліцелямі, як Роберт Каган і Біл Крыстал. Яго прадстаўляюць Блэр і Буш. А ёсць дэмакратычны рэалізм, у абарону якога здаўна выступаю я і іншыя даследчыкі. Абедзве плыні «дэмакратычныя», бо іх абаронцы разглядаюць дэмакратыю як мэту і сродак амерыканскай замежнай палітыкі. Але адна з іх ёсць «рэалізмам», таму што адкідае ўніверсалісцкую ўстаноўку, высокі ідэалізм дэмакратычнага «глабалізму», і заўсёды патрабуе, каб умовай інтэрвенцыі была геапалітычная патрэба. Наўрад ці гэта чыста тэарэтычны дыспут: ён мае вельмі практычныя наступствы. Розніца асабліва выразна выявілася ўсяго пяць гадоў таму, калі паміж кансерватарамі адбыўся фундаментальны раскол у пытанні аб інтэрвенцыі на Балканах. У той час Каган і Крыстал, як і многія іншыя, рашуча дамагаліся амерыканскай вайсковай прысутнасці ў Косаве. Я не

выступаў за інтэрвенцыю і патлумачыў сваю пазіцыю: для амерыканскага ўмяшальніцтва гуманітарныя меркаванні ёсць неабходнай, але недастатковай перадумовай. Умяшальніцтва мусіць быць абгрунтавана стратэгічна. Пры адсутнасці стратэгічнага імператыву лепей трымаць порах сухім якраз таму, што ён можа спатрэбіцца для адказу на нейкую стратэгічную пагрозу ў будучыні. Такой пагрозай выявілася 11 верасня.

У час падзей у Косаве многія рэалісты занялі пазіцыю, аналагічную маёй, тады як шматлікія дэмакратычныя глабалісты (якіх недакладна называлі проста «неаканцерватарамі») сувора крытыкавалі мае засцярогі як здраду дэмакратычным прынцыпам. У сваім эсэ Фукуяма не толькі не праводзіць адрознення паміж названымі дзвюма плынямі, а і настойліва характарызуе мяне як прыхільніка дэмакратычнага глабалізму – той самай школы, з якой я адкрыта палемізую. Гэтак, ён піша: «Ягоная [Краўтхамерава] уласная пазіцыя, якую ён вызначае як «дэмакратычны глабалізм…». Вельмі дзіўна, калі падаецца доўгая крытыка прамовы і манаграфіі, названай «Дэмакратычны рэалізм», а потым гэтая крытыка рэзюмуецца наступным чынам: «Дэмакратычны глабалізм Краўтхамера не можа быць галоўным прынцыпам замежнай палітыкі, ён спараджае больш пытанняў, чым адказаў». Магчыма, Фукуяма верыць, што ён адзін мае права на ўжыванне слова «рэалізм». Магчыма, ён лічыць, што, аблудна атаясаміўшы мяне з глабалістамі, ён можа надалей закідаць мне кожны пралік у замежнай палітыцы Блэра і Буша. Але ж менавіта тое, што універсалісцкая і навязлівая рыторыка Блэра і Буша аб сусветным пашырэнні дэмакратыі была занадта агульнай і амбітнай, падштурхнула мяне да напісання прамовы. Альтэрнатыва, якую я прапанаваў, палягала ў абмежаванні ідэалістычнага універсалізму рэалістычнай ацэнкай стратэгічнай патрэбы. Вось цэнтральная аксіёма дэмакратычнага рэалізму:

Мы будзем падтрымліваць дэмакратыю паўсюль, але заплацім за яе крывёй і грашыма толькі там, дзе на гэта ёсць стратэгічная патрэба, а менавіта ў месцах, дзе вядзецца

маштабная вайна супраць ворага, які пагражае нашаму існаванню і нясе смяротную пагрозу свабодзе на ўсім свеце.

Фукуяма ахарактарызаваў гэтую цэнтральную аксіёму як «малапрыдатную для вызначэння патрэбы ўмяшальніцтва ЗША» на той падстве, што «яна ўтрымлівае некалькі двухсэнсоўнасцяў». Ён ставіць пытанні:

– Ці слова «сусветная» азначае тут пагрозу, якая выходзіць за межы асобных рэгіёнаў, падобна да радыкальнага ісламізму альбо камунізму?

Так.

– Калі лічыцца толькі з ворагам сусветнага маштабу, Паўночная Карэя павінна быць выключана з ліку «стратэгічных» ворагаў?

Так. Паўночная Карэя ўяўляе сабой праблемную краіну другога плану. Ісламізм – не толькі наша праблема, гэтаксама як савецкі камунізм у другой палове XX стагоддзя быў праблемай усяго свету. Паўночная Карэя не мае выразнай місіі пашырэння камунізму *чучхе* на ўсім зямным шары ці плану знішчыць ЗША. Задача яе рэжыму – у самазахаванні, хоць ён пэўным чынам і пагражае паўднёвай суседцы. Таму Паўночная Карэя стварае пагрозу, вельмі адрозную ад той жыццёвай, якую мы сустракаем у арабска-ісламскім асяроддзі, і як непрыяцель адыходзіць на другі план. Яе трэба стрымліваць, але імператыву акупацыі, скідання паўночнакарэйскага рэжыму на сёння няма і не будзе датуль, пакуль не выявіцца, што Паўночная Карэя прадае зброю масавага знішчэння нашым сапраўдным жыццёвым ворагам. У такім разе мы будзем разглядаць яе як хаўрусніка нашага ворага ў сусветнай вайне на выжыванне.

– Ці слова «сусветная» абазначае любую смяротную пагрозу свабодзе ў любым месцы зямнога шару?

Любая сур'ёзная пагроза той супольнасці дзяржаў, якую прынята называць «вольным светам», ёсць «сусветнай». У 1930–

1940-х такая пагроза зыходзіла ад фашызму, у другой палове XX стагоддзя – ад камунізму. Цяпер – ад арабска-ісламскага радыкалізму.

– Калі «вораг» нясе смяротную пагрозу не нам, а іншай свабоднай краіне, ці азначае гэта, што яго трэба залічваць у нашы ворагі?

Не.

– Ці ёсць «Хамас», ісламісцкая групоўка, што яўна нясе пагрозу існаванню Ізраіля, таксама і нашым ворагам?

Паколькі сёння «Хамас» вызначаецца як вораг Ізраіля – не. Калі ён далучыцца да вайны супраць Злучаных Штатаў, адказ будзе «так».

– А Сірыя?

З прычыны ейнай варожасці да Ізраіля – не. Аднак паколькі яна падтрымлівае іракскіх баевікоў, то можа ў далейшым разглядацца як частка варожага лагера.

– А калі яны нашы ворагі, чаму мы павінны змагацца менавіта з імі, а не з групоўкамі, якія да нас бліжэйшыя геаграфічна, як ФНВ, што пагражае дэмакратыі ў Калумбіі, ці баліварысты Уга Чавэса ў Венесуэле?

Мы не павінны. Гл. вышэй.

– Што вызначае «цэнтральны кірунак» у гэтай сусветнай вайне?

Крытэрам ёсць адказ на пытанне, ці стане змена ў палітычным курсе нейкай дзяржавы важным, а магчыма, вырашальным унёскам у перамогу над арабска-ісламскім радыкалізмам. Афганістан праходзіць гэты тэст. Тое самае можна сказаць пра Ірак.

ЛЕГІТЫМНАСЦЬ

Ва ўсім гэтым няма нічога складанага. На чым жа тады трымаецца Фукуямава варожасць да дэмакратычнага рэалізму? Падобна, што ён прымае дэмакратычны рэалізм у тэорыі, але асуджае яго на практыцы таму… так, таму, што ёсць Ірак. Ён з энтузіязмам далучыўся да легіёну тых, хто скарыстоўвае нашы цяжкасці ў Іраку, каб паставіць пад сумнеў правядзенне намі там любой дальнабачнай палітыкі, у прыватнасці, самастойнай праграмы пабудовы нацыі. Фукуяма кажа, што ў Іраку пануе бязладдзе, і іракскі досвед даводзіць: а) важнасць «захавання міжнароднага права»; б) бесперспектыўнасць амерыканскага курсу на пабудову нацыі сярод арабаў.

Што да права, Фукуяма падтрымлівае мой пункт гледжання, што міжнародная падтрымка не дае поўнага апраўдання любой акцыі, бо іншыя дзяржавы дзейнічаюць у імя сваіх інтарэсаў, а не ў імя святой мудрасці. Ён дапускае, што і ААН мае «істотныя праблемы са сваёй легітымнасцю», згаджаецца з тым, што нашы еўрапейскія саюзнікі не вераць у неабходнасць легітымацыі сваіх дзеянняў у Радзе Бяспекі, як гэта было прадэманстравана ў Косаве. Тым не менш, ён папракае мяне ў тым, што я замала ўвагі надаю практычнай карысці ад міжнароднай падтрымкі і ўхвалення.

Ніхто не адмаўляе карысці ад міжнароднай падтрымкі. Вядома, ёсць практычныя перавагі ў тым, каб мець рэзалюцыю Рады Бяспекі, падтрымку NATO альбо якое б там ні было палітычнае ўхваленне, якое магло б падштурхнуць, скажам, Індыю альбо Турцыю аказаць нам спрыянне. Можна шукаць якога заўгодна ўхвалення, падтрымкі, прыкрыцця, можна нават ісці на саступкі дзеля такога ўхвалення – ніхто не спрачаецца. Адзінае сур'ёзнае пытанне ў тым, наколькі далёка можна зайсці ў пошуках легітымацыі. Ці ёсць «легітымнасць» фактарам, які абмяжоўвае дзеянні? Калі вы яе не маеце, ці мусіце вы адмовіцца ад сваёй палітыкі? Ці мусілі мы адмовіцца ад палітыкі змены рэжыму ў Іраку – а выкарыстанне войскаў было для гэтага адзіным сродкам – з той прычыны, што не мелі дастатковага прыкрыцця?

Фукуяма, здаецца, кажа «так», трэ было адмовіцца, і, падобна Керы, чытае расплывістыя натацыі аб тым, што насамрэч мы

мелі зрабіць. Паводле Фукуямы, варта было адкласці акупацыю Ірака, улічваючы супраціў нашых саюзнікаў і адсутнасць міжнароднага кансенсусу, і што асэнсаванне наступстваў вайны толькі пацвярджае правільнасць гэтай абачлівай пазіцыі.

Але гэта прадугледжвае два дапушчэнні.

Па-першае, недахоп легітымнасці – прычына нашых паваенных праблем. Ключавой з іх з'яўляецца паўстанне сунітаў і бунт Муктады Садра. Але ж наўрад ці гэтыя групы альбо баевікі-чужаземцы, што паспяшаліся ім на дапамогу, натхняліся рэзалюцыямі ААН. Насамрэч Рада Бяспекі пасля вайны аднагалосна прыняла рэзалюцыю, якая легітымізуе амерыканскую акупацыю. ААН нават атабарылася ў Багдадзе адразу пасля вайны. На паўстанцаў гэта не зрабіла вялікага ўражання: яны разнеслі прадстаўніцтва Аб'яднаных Нацый у друзачкі. Магчыма, нам і не ўдасца перамагчы названыя агмяні супраціву, але я моцна сумняюся, што прычынай няўдачы будзе «недахоп легітымнасці».

Па-другое, выходзіць, што выбар у сакавіку 2003 года быў паміж акупацыяй і паваеннымі цяжкасцямі з аднаго боку, і даакупацыйнай стабільнасцю з другога. У нас нібыта не было сур'ёзных прычын, каб уступаць у вайну. Вядома, адсутнасць французска-германскай падтрымкі зменшыла поле для манеўру. Несумненна, адсутнасць міжнароднага кансенсусу ёсць сур'ёзнай нагодай, каб не здзяйсняць акупацыі. Але Фукуяма лічыць, што паважныя падставы былі толькі для таго, каб нічога не рабіць у Іраку і пагатоў такім коштам, што перад вайной іракская праблема знаходзілася ў свайго роду стане ўстойлівай раўнавагі. Але было інакш. Напружанасць пасля вайны ў Заліве вяла да нестабільнасці, стварала агромністыя цяжкасці для ўсіх удзельнікаў канфлікту, асабліва для Злучаных Штатаў. Па-першае, іракскі народ пакутаваў ад жорсткага і карумпаванага рэжыму санкцый, а адказнасць за мукі і голад на Блізкім Усходзе і шмат у якіх еўрапейскіх краінах ускладалася проста на ЗША. Па-другое, напружанасць у адносінах з Іракам прымушала трымаць шматлікі амерыканскі кантынгент у Саудаўскай Аравіі, краіне ісламскіх святыняў, а для многіх мусульман гэтая прысутнасць была

правакацыйнай і глыбока абразлівай. Так, у сваёй фетве 1998 году супраць Злучаных Штатаў, Бен Ладэн назваў гэтыя два факты злачынствамі, якія апраўдваюць вядзенне джыхаду супраць Амерыкі.

Больш за тое, рэжым санкцый паступова дэградаваў. Дэградацыя была часова прыпынена ўвядзеннем вялікай колькасці амерыканскіх войскаў у Кувейт напярэдадні вайны, што змусіла Раду Бяспекі пацвердзіць неабходнасць санкцый – але толькі як сродку, каб прадухіліць амерыканскую акупацыю. Самога па сабе разгортвання вайсковых сілаў было мала. Пасля іх вывядзення рэжым санкцый працягваў бы дэградаваць, што прывяло б да ўзмацнення і дадатковай легітымацыі рэжыму Садама (а потым, што было б нават горш, і ягоных сыноў). Такое ўзмацненне суправаджалася б ісламізацыяй баасісцкай ідэалогіі, пераўзбраеннем і аднаўленнем праграм стварэння зброі масавага знішчэння, пашырэннем кантактаў з тэрарыстычнымі групамі. Акурат гэта меў на ўвазе выбітны рэаліст Генры Кісінджэр, калі, добра ведаючы ўсе нашыя паваенныя турботы, ён нядаўна напісаў пра «гульню на апярэджанне»:

Ці мусілі Злучаныя Штаты чакаць, пакуль краіна, якая мае найбольшую армію ў рэгіёне, другія велічынёй запасы нафты, рэкордную колькасць выпадкаў ужывання сілы супраць уласнага насельніцтва і суседзяў і – згодна з паведамленнем камісіі па расследаванні падзей 11 верасня – кантакт на ўзроўні выведкі з «Аль-Каідай», рэальна забяспечыла б сябе зброяй масавага паражэння?[5]

Няма сумневу, адсутнасць міжнароднай падтрымкі з'яўляецца фактар пры прыняцці кожнага важнага рашэння. Але гэтая адсутнасць выклікае нашы сённяшнія турботы ў Іраку. І напярэдадні вайны яна яўна пераважвалася аргументам на карысць скідання Садама. І ўрэшце, пры прыняцці любога рашэння пытанне легітымнасці ніколі не бывае вызначальным. У 1980-я гады нашы еўрапейскія саюзнікі былі амаль адзінымі супраць амерыканскай падтрымкі нікарагуанскіх «контрас». Амаль усё чалавецтва верыла, што амерыканскі імперыялізм спрабуе рэстаўраваць рэжым Самосы, палітыка ЗША мела

5 Kissinger Henry. Better Intelligence Reforms // Washington Post. 2004. August 16.

нулявую «міжнародную легітымацыю». Калі Фукуямава вера ў яе мела б рэальную глебу, тады ЗША павінны былі б кінуць падтрымліваць «контрас». Між тым, гэтая палітыка была на той час правільнай, і гісторыя рашуча яе апраўдала.

ПАБУДОВА НАЦЫІ

Апошняе з пытанняў Фукуямы пра маю «цэнтральную аксіёму» гучала так: *ці быў Ірак ключавым звяном у вайне супраць радыкальнага ісламізму*? Я лічу, што быў і ёсць. Перад вайной мне давялося адстойваць сваю думку: мяркую, што яе правільнасць пацвердзілася. 11 верасня прывяло да неаспрэчнай высновы, што палітыка Амерыкі ў арабскім свеце, якая вялася на працягу паловы стагоддзя, правалілася. Яшчэ з таго часу, калі Рузвельт уклаў альянс з каралём Ібн Саудам, Злучаныя Штаты выбралі курс на кансервацыю палітычнага і сацыяльнага ўладкавання арабскага свету, пакуль той застаецца дружалюбным экспарцёрам нафты. Пагадненне расцягнулася на вельмі доўгі час. Калі не здарылася б 11 верасня, яно доўжылася б па сёння. Палітыка заплюшчвання вачэй на арабскі свет адкрыта ніколі не абвяшчалася, але паўсюдна мелася на ўвазе: Амерыка імкнулася да дэмакратызацыі ў Еўропе, Усходняй Азіі, Паўднёвай і Цэнтральнай Амерыцы – паўсюль, за выключэннем арабскага свету. Паўсюль дэмакратызацыя аказалася даволі паспяховай і сталася ключом да стабільнасці і спакою. Арабскі вынятак каштаваў дорага. 11 верасня, пасеяўшы вецер, мы пажалі буру і ўрэшце ўцямілі, што такая палітыка нежыццяздольная. Вядома, можна было працягваць змаганне з арабска-ісламскім радыкалізмам, ловячы лідэра тэрарыстаў тут, ліквідуючы ячэйку там. Іншым шляхам была б спроба развязаць праблему радыкальна, ажыццявіўшы рызыкоўную, але неўнікнёную аперацыю пераўладкавання арабскага свету. Поспех у Іраку стаў бы надзвычайнай перамогай у вайне з радыкальным ісламам, параза ў Іраку стала б надзвычайнай няўдачай. Я заўжды цвяроза ацэньваў маштаб задачы. І напярэдадні, і ў час, і пасля вайны я пісаў, што задача была велізарнай маштабам, рызыка значнай і параза магчымай – але сама аперацыя была неабходнай.

Фукуяма нідзе не закранае пытання неабходнасці. Замест гэтага ён спасылаецца на нашы цяжкасці і няўдачы, каб дыскрэдытаваць саму ідэю пабудовы нацыі на Блізкім Усходзе – не з-за мясцовых варункаў, а з-за таго, што амерыканцы не ўмеюць будаваць нацыі. Іракская авантура з'яўляецца прыкрай памылкай, якая немінуча прывядзе да паразы:

Мы выявілі сваю адвечную абмежаванасць і неарганізаванасць у планаванні і вядзенні адбудовы краіны, што можна было прадказаць загадзя.

Забаўна, але сам Фукуяма нічога загадзя не прадказваў. Ён чакаў год, каб даведацца, куды падзьме вецер, а затым… прадказаў тое, што ўжо адбылося. Напярэдадні вайны, піша Фукуяма ў «Нью-Ёрк Таймс», ён меў сумневы, якія трымаў пры сабе. Ён не лічыў, што вайна – мудрае рашэнне, але, «зыходзячы з таго, што я ведаў, яна магла завяршыцца паспяхова». Такім чынам, паразу немагчыма было «прадказаць загадзя».

Як Фукуяма можа нешта прадказваць цяпер? Ён піша так, нібыта гісторыя будучыні ўжо адбылася, а гэта не так. Ірак вызвалены ад Садама, і яго будучыня вырашаецца на нашых вачах. Мы знаходзімся на сярэдзіне шляху – што ў Вайне з Тэрорам, што ў адбудове Ірака. Фукуямава безапеляцыйная выснова, што Ірак намі страчаны, з'яўляецца, мякка кажучы, заўчаснай. Яна нагадвае славутае эсэ 1946 году Джона Дос Пасаса «Амерыканцы страчваюць перамогу ў Еўропе»[6]. Мы яшчэ можам і прайграць. Але вывад Фукуямы аб тым, што амерыканцы папросту не ўмеюць будаваць нацыі, ёсць недарэчным абагульненнем. Нам удалася манументальная задача адбудовы Германіі, Японіі і Паўднёвай Карэі. Мы прайгралі ў Гаіці і Самалі. У чым была прынцыповая розніца? У добрым веданні мясцовай культуры? У дэмакратычных традыцыях? Мы не вельмі добра ведалі карэйскую культуру, і Карэя не мела сталай дэмакратычнай традыцыі. Тым не менш, Карэя – яскравы поспех.

Дык у чым рэч? У стратэгічнай каштоўнасці. Калі стаўкі

[6] Знаёмая

высокія, і ўспрымаюцца як такія ў самой Амерыцы, мясцовыя пачынаем гонку і выдаткоўваем неабходныя намаганні, каб дабіцца поспеху. Калі стратэгічныя стаўкі былі мінімальнымі, як у Гаіці ці Самалі, мы цярпелі няўдачу, таму што мы правільна разумелі: пабудова нацыі ёсць вельмі дарагой задачай, а гэтыя мясціны не заслугоўваюць нашых звышвысілкаў. Адзіным важным фактарам для паспяховай пабудовы нацыі ёсць сур'ёзнасць намераў.

Сцвярджаць, што краіна, якая падняла Германію, Японію і Паўднёвую Карэю з руінаў, здзейсніўшы, магчыма, тры найвялікшыя ў гісторыі дасягненні ў пабудове нацый, у прынцыпе не здольная зрабіць тое самае ў Іраку, будзе дзяцінствам. А калі гэта так, ці не варта нам знізіць свае выдаткі ў Афганістане, краіне значна больш расколатай, паводле племяннога прынцыпу, больш прымітыўнай і менш развітай, чым Ірак?

Найбольш кідаецца ў вочы ў песімізме Фукуямы адносна пашырэння дэмакратыі ў вельмі шчыльна населенай зоне, у цэнтры адной з самых старажытных цывілізацый тое, што не так даўно сам Фукуяма дэкларавaў, што ўсё чалавецтва ўжо гатова зрабіць рашучы паварот да дэмакратыі і яе трыумф непазбежны. Як ён прызнаецца цяпер, «маё імя, больш чым многія іншыя, асацыюецца з ідэяй, што стрэлка гістарычнага компасу паказвае на дэмакратыю». Падобна, для ўсіх, акрамя арабаў. Калі пашукаць у эсэ Фукуямы хоць якую ідэю аб «стрэлцы гістарычнага компасу», якая была б прыдатнай для гэтага рэгіёну, што мы знойдзем? Адзіную мімалётную спасылку на «Вялікую блізкаўсходнюю ініцыятыву» («Greater Middle East Initiative»), вымучаную бушаўскім дзяржддэпартаментам – праграму дапамогі і абмену, скіраваную на развіццё дэмакратыі, і цяпер, як усе разумеюць, ужо безнадзейна састарэлую.

Так справа далей не пойдзе. Да 11 верасня мы маглі пасіўна чакаць, пакуль колькі пакаленняў арабаў зробяць тое, што было здзейснена з дапамогай амерыканскай інтэрвенцыі (часта вайсковай) у Еўропе, Усходняй Азіі і абедзвюх Амерыках: дэмакратызацыя, мадэрнізацыя і стабільнасць. Пасля 11

мясцовыя
стратэгічныя
мір», кажуць
дачу, і мы
незадавальныя
яго
ўхваляць.
Ніколі
прэстыж
Амерыкі ў
Еўропе не
падаў так
нізка. Мы
разабраліся
з Гітлерам,
але
пераважная
большасць
еўрапейцаў
адчуваюць,
што лекі
былі горшыя
за хваробу».

верасня мы не можам дазволіць сабе гэткай раскошы.

Адмаўленне ад пабудовы нацыі ці то з нагоды некампетэнтнасці Амерыкі, ці то з прычыны арабскага супраціву зводзіць Вайну з Тэрорам да гонкі палісменаў за злодзеямі, да змагання дзе-нідзе з баевікамі «Аль-Каіды»: арыштаў адных, ліквідацыі іншых у якой-небудзь пячоры. Але ўсё гэта не закранае кораня праблемы – палітычнага ўціску, рэлігійнай нецярпімасці і сацыяльнай напружанасці ў арабска-ісламскім свеце. Нелегітымнымі і карумпаванымі рэжымамі гэты ўціск трансфармуецца ў ваяўнічы, крывавы антыамерыканізм, які выбухнуў 11 верасня. Вас не будуць успрымаць сур'ёзна ў замежнай палітыцы пасля 11 верасня, пакуль вы адмаўляеце гэтую рэчаіснасць.

ШТО РАБІЦЬ?

Як Фукуяма ўспрымае гэтую рэчаіснасць? Якую альтэрнатыву дэмакратычнаму рэалізму ён прапануе? Найбольш дзіўная частка ягонага эсэ – заключэнне. Калі ён нарэшце падыходзіць да прапанавання альтэрнатывы, то складзеная з трох пунктаў «зверка гадзіннікаў», як ён яе называе, настолькі бездапаможная, што ён сам прызнае яе «адпаведнасць прапанаванаму Краўтхамерам дэмакратычнаму глабалізму» – гэта значыць, ён падтрымлівае тую самую замежную палітыку, да якой нібыта меў такія грунтоўныя прэтэнзіі.

У чым жа палягае «зверка гадзіннікаў», выкладзеная Фукуямам у трох пунктах?

1. «Па-першае, трэба рабіць тую простую дыпламатычную работу – перамовы, пабудова кааліцый – пра якую бушаўская адміністрацыя, здаецца, забылася перад іракскай вайной». Цяпер, безумоўна, кожны можа ўхваляць альбо крытыкаваць дыпламатычныя здольнасці адміністрацыі Буша цягам шасці месяцаў перад вайной. Але абсурдна казаць, што адміністрацыя не спрабавала дабіцца падтрымкі ў Радзе Бяспекі і па-за ёй. Яна працавала добрасумленна, хоць і мала чаго дасягнула. Але што на думку Фукуямы трэба было зрабіць, каб заручыцца

падтрымкай Францыі альбо Расіі? Адказу няма. Далей Фукуяма рэкамендуе, каб ЗША не «грэбавалі без дай прычыны грамадскай думкай усяго чалавецтва». Што для гэтага трэба? Калі гэтая рэкамендацыя не тычыць усяго толькі добрых манер, яна выступае за права іншых нацый накладаць вета на дзеянні, якія ЗША лічаць ключавымі для сваіх нацыянальных інтарэсаў і агульнай бяспекі. Аднак Фукуяма сам катэгарычна адкідвае такую інтэрпрэтацыю: паводле яго словаў, «скрайне аблудна» сцвярджаць, што «Злучаныя Штаты павінны сядзець як мыш пад венікам і адмаўляцца весці рэй у заходнім свеце ў выпадках, калі нашы саюзнікі выказваюць з намі нязгоду».

2. Злучаныя Штаты мусяць стварыць новы адміністрацыйны апарат для пабудовы нацый. Тут няма пярэчанняў. Мы маглі б скарыстаць Каланіяльнае ўпраўленне (Colonial Office) у Дзярждэпартаменце.

3. Трэба разважаць, ці не стварыць нам тое, што Фукуяма называе «сусветным *альянсам* дэмакратычных краін, кіраваным якой-небудзь новай дэмакратыяй ва Усходняй Еўропе і ў Лацінскай Амерыцы», які «мог бы выконваць функцыю легітымацыі ў свеце, якой NATO выконваць не можа». Яшчэ адна цудоўная ідэя – я прапаноўваў яе год таму[7].

Такім чынам, дыпламатыя добрых манер, каланіяльнае ўпраўленне і, магчыма, новы альянс дэмакратычных краін – вось і ўся альтэрнатыва Фукуямы дэмакратычнаму рэалізму. Апрача таго, ён дадае: «Я лічу, што ва Усходняй Азіі недастаткова развіты дзяржаўныя інстытуты, Злучаным Штатам ёсць над чым творча паразважаць у гэтым пачынаць. «Аль-Каіда» знішчае Сусветны гандлёвы цэнтр, вайна з ісламскімі баевікамі ідзе ва ўсім свеце, у Іраку выраслася будучыня краіны, а Фукуяма заклікае да творчых думак пра новыя ўсходнеазіяцкія інстытуты ўлады.

Фукуяма пачынае сваё эсэ з абяцанкі «выпрацаваць замежную палітыку, вельмі адрозную ад той, якую прапануе ён [Краўтхамер]». Завяршае ж ён драбязой: парай новых інстытутаў і заклікам да «большай дыпламатычнасці». Напрыканцы яго эсэ рассыпаецца, нібы мазаіка. Пра што ж тады палеміка? Ён сам абвяшчае сябе прыхільнікам

[7] Ён.: Washington Post. 2003. February 28: «Нам трэба пачынаць за кладку новага альянсу для замены састарэлых ужо альянсаў часоў халоднай вайны. Ён

«дэмакратычнага глабалізму», той самай школы мыслення, якой адрасуе выразныя прэтэнзіі. «Ён захоўвае, – як ён сам выказаўся ў інтэрв'ю «Нью-Ёрк Таймс», – свае неакансерватыўныя прынцыпы – веру ва універсальнае памкненне да дэмакратыі і ўжыванне амерыканскай магутнасці для пашырэння дэмакратыі ва ўсім свеце». Што ж тады застаецца ад яго абяцання «вельмі адрознай» замежнай палітыкі?

Прычына, з якой Фукуяма не прапануе нічога, палягае ў тым, што, як ён прызнае, альтэрнатывы папросту няма. Ізаляцыянізм састарэў, ліберальны інтэрнацыяналізм занадта наіўны, каб быць эфектыўным, рэалізм аказваецца няздольным усвядоміць сілу і перспектыўнасць дэмакратычнай трансфармацыі. Дэмакратычны рэалізм прапануе ясную канцэпцыю як адказаць на выклік, кінуты неспадзяваным вяртаннем гісторыі ў верасні 2001 года. Прыхільнасць Фукуямы да дэмакратычнага рэалізму трэба вітаць, а ягоную «зверку гадзінніка» высока ацаніць.

Пераклаў з амерыканскай В. Р.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу

плейнен, ён сам Злучаныя Штаты, Брытанію, Аўстралію, Турцыю, такія краіны Старой Еўропы, ізаляцыянізм падтрымкі Амерыкі, як Іспанія і Італія, і Новую Еўропу, дзе былыя камуністычныя дзяржавы арыентуюцца на Амерыку. Дадамо, магчыма, Індыю і Японію – і мы атрымаем стваральнікаў новай структуры пасляверaснёўскай эпохі».

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

Мысліцель (3'2000)

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image] [image] [image] [

Брытанія, яшчэ раней – Францыя, Гішпанія і г. д. Знакаміты нямецкі гісторык XIX ст. Леапольд фон Ранке, заснавальнік навукі дзяржаўнага кіраваньня, разумеў эўрапейскую гісторыю новага часу як зацятую барацьбу за панаваньне, пры якой балянс сілаў усталёўваўся толькі ў выніку бясконцых канфліктаў.

быў перакладзены з штодвухмесячніка «Foreign Policy» (2004, ліпень–жнівень) з ласкавай згоды аўтара.

Дасьледаваньні ўплыву эканомікі на дыпляматыю толькі пацьвярджаюць, што гісторыя – гэта змаганьне паміж дзяржавамі-суперніцамі. У 1987 г. Пол Кенэдзі выдаў свой бэстсэлер «Узьлёт і падзеньне вялікіх дзяржаваў: эканамічныя зьмены і ваенныя канфлікты з 1500 да 2000 г.». У ім гісторык зь Ельскага ўнівэрсытэту зрабіў выснову, што сучасныя звышдзяржавы – Расея і ЗША, – як і ўсе імпэрыі мінулага, непазьбежна зробяцца ахвярамі ўласнага разрастаньня. Іх месца, даводзіў Кенэдзі, неўзабаве зоймуць Кітай і Японія – дзяржавы, якія ўбіраюцца ў моц і ня цягнуць на сабе «мёртвага цяжару» імпэрскіх ваенных выдаткаў.
У 2001 г. Джон Дж. Мэерсгаймэр у кнізе «Трагедыя

вялікадзяржаўнай палітыкі» ўдакладніў прагноз Кенэдзі. На думку палітоляга з Чыкаскага ўнівэрсытэту, Злучаныя Штаты, так і не распаўшыся ад залішняга разрастаньня, адолеўшы Нямеччыну і Японію, павінны цяпер рыхтавацца да зьяўленьня новых супернікаў. «Патэнцыйна ў XXI ст. найбольшую пагрозу для Злучаных Штатаў уяўляе Кітай, – сьцьвярджае Мэерсгаймэр. – ЗША кроўна зацікаўленыя, каб эканамічны рост Кітаю ў будучыні значна запаволіўся». Аднак Мэерсгаймэр прадбачыць небясьпеку ня толькі з боку Кітаю – Эўразьвяз таксама можа ператварыцца ў «магутнага ворага».

Іншымі словамі, «натуральнай манаполіі» на ўладу не існуе: барацьба за панаваньне – адвечная і ўсюдыісная. «Аднапалярнасьць», пра якую загаварылі некаторыя камэнтатары пасьля распаду СССР, ня можа працягвацца доўга – гісторыя ня церпіць адзінай звышдзяржавы. Раней ці пазьней зьявяцца новыя супернікі, і мы зноў прыйдзем да шматпалярнага, шматуладнага сьвету.

Але што калі нашыя паважаныя тэарэтыкі глыбока памыляюцца? Што калі сьвет насамрэч ідзе да часоў, калі гегемона больш ня будзе? Што калі замест балянсу сілаў нас чакае безуладзьдзе?

Такая сытуацыя для гісторыі ня новая. Хоць летапісцы мінуўшчыны засяроджваліся пераважна на дасягненьнях магутных цэнтраў улады – цывілізацыяў, імпэрыяў або нацыянальных дзяржаваў, – яны зусім не абміналі ўвагай і пэрыяды адноснага «безуладзьдзя». На жаль, досьвед часоў «вакуўму ўлады» (або, калі хочаце, «апалярнасьці») зусім не натхняе. Кожны, каму не падабаецца гегемонія ЗША, мусіць памятаць, што рэальнай альтэрнатывай ёй будзе не шматпалярны сьвет канкурэнтных вялікіх дзяржаваў, а сьвет увогуле бязь лідэра. Апалярнасьць насамрэч можа абярнуцца анархіяй, як у змрочныя часы раньняга сярэднявечча – эпоху заняпаду імпэрыяў і рэлігійнага фанатызму, рабаваньня і спусташэньня «забытых» абшараў, эканамічнага застою і «адступленьня» цывілізацыі за ўмацаваныя муры.

ПРЭТЭНДЭНТЫ
НА СТАЛЕЦ

Чаму
напачатку
XXI ст. можа

ўтварыцца
«вакуўм
улады»?
Прычыны
ўявіць ня
цяжка.

Амэрыканскі калёс – на гліняных нагах. Так, ЗША выглядаюць на вельмі магутную дзяржаву – з боку як эканомікі й вайсковай сілы, гэтак і «мяккай» культурнай моцы. Але пры гэтым Амэрыка сутыкаецца, прынамсі, з трыма тыпамі структурнага дэфіцыту, які абмяжуе дзейснасьць і працягласьць «квазыімпэрскага» становішча ЗША ў сьвеце. Першы чыньнік – рост залежнасьці ад замежнага капіталу, каб пакрываць завялікія дзяржаўныя і прыватныя выдаткі. Цяжка прыгадаць хоць адную імпэрыю, якая б доўга пратрывала, трапіўшы ў такую залежнасьць ад замежных грошай. Другі тып дэфіцыту зьвязаны з колькасьцю ўзброеных сілаў. Паколькі ў ЗША назіраецца прыток насельніцтва зь іншых краінаў, Амэрыка ня можа падмацаваць свае прэтэнзіі на панаваньне ў сьвеце сапраўднай калянізацыяй. І разам з тым, параўнаўча невялікага добраахвотнага войска і так заледзьве стае для буйнамаштабных ваенных інтэрвэнцыяў у Аўганістан і Ірак. Нарэшце – і гэта галоўная праблема – ЗША сутыкаюцца з тым, што, бадай, лепш за ўсё назваць «дэфіцытам увагі». Іх рэспубліканскія інстытуты, як і існыя палітычныя традыцыі, не спрыяюць таму, каб знайсьці паразуменьне адносна доўгатэрміновых нацыятворчых праектаў. За лічанымі выняткамі прысутнасьць амэрыканскіх войскаў у іншых краінах у мінулым стагодзьдзі была адносна непрацяглай. Больш за 50 гадоў яны знаходзіліся ў Заходняй Нямеччыне, Японіі і Паўднёвай Карэі. На Філіпінах, Гаіці, у Дамініканскай Рэспубліцы, Віетнаме, ня кажучы пра Лібан і Самалі, яны доўга не затрымаліся. Апошнія апытаньні грамадзкай думкі сьведчаць, што амэрыканскія выбарцы яшчэ менш схільныя разьвітацца з жыцьцём (і з сваімі грашыма) на далёкіх палёх бою, чым нават падчас вайны ў Віетнаме.
«Старая Эўропа» старэе. Тыя, хто марыць, што Эўразьвяз складзе супрацьвагу звышмагутнасьці ЗША, могуць і надалей лунаць у аблоках. Як бы ні ўражвала сёлетняе пашырэньне

Эўразьвязу, ужо ня кажучы пра валютны саюз 12-ці краінаў, факт застаецца фактам: праз дэмаграфічную сытуацыю Эўразьвяз амаль пэўна асуджаны на паступовую страту свайго ўплыву (і значнасьці) на міжнароднай арэне. Пры падзеньні нараджальнасьці і росьце працягласьці жыцьця менш як праз 50 гадоў сярэдні ўзрост жыхароў Заходняй Эўропы можа пераваліць далёка за сорак. «Індэкс утрыманства» (суадносіны колькасьці грамадзянаў непрацоўнага і працоўнага ўзросту) у Эўропе сягае ненармальна высокіх лічбаў. «Старая Эўропа» неўзабаве сапраўды ператворыцца ў старую. Да 2050 г. кожнаму трэцяму італійцу, гішпанцу або грэку, нават з улікам іміграцыі, будзе за 65. Эўрапейцы апынуліся перад надзвычай балючым выбарам: альбо амэрыканізаваць сваю эканоміку, г. зн. адчыніць межы для значна большага прытоку імігрантаў, з усімі непазьбежнымі культурнымі наступствамі, альбо ператварыць Эўразьвяз ува ўмацаваны з усіх бакоў дом састарэлых. Разам з тым прабуксоўка інстытуцыйных рэформаў азначае, што па-за эканамічнай сфэрай кожная эўрапейская дзяржава будзе дзейнічаць у вялікай ступені самастойна, асабліва ў вонкавай палітыцы і сфэры бясьпекі.

Кітай – перад эканамічнай крызай. Аптымісты настойваюць, што кітайскі «эканамічны цуд» апошняга дзесяцігодзьдзя будзе назірацца і надалей, прычым тэмпы росту будуць павялічвацца так імкліва, што праз 30–40 гадоў паводле аб'ёму ВУП Кітай перагоніць Амэрыку. Аднак нельга з пэўнасьцю сьцьвярджаць, што звычайныя законы разьвіцьця новых рынкавых эканомік зробяць Пэкіну выключэньне. Перш-наперш вольны рынак, які грунтуецца толькі на прыватнай уласнасьці і вяршэнстве закону, у прынцыпе несумяшчальны з манаполіяй кампартыі на ўладу: яна спараджае карупцыю, перашкаджае стварэньню празрыстых фіскальных, фінансавых і рэгулюючых інстытутаў. Як і ўва ўсіх «азіяцкіх тыграў», вытворчасьць у Кітаі значна апярэджвае ўнутранае спажываньне (што моцна ўзалежнівае эканоміку ад экспарту). Разьвіцьцё ўласнай фінансавай сыстэмы істотна адстае ад росту вытворчасьці. Насамрэч ніхто ня ведае ўсёй глыбіні праблемаў у кітайскім банкаўскім сэктары. Заходнія банкі, што скупляюць безнадзейныя даўгавыя абавязаньні, каб замацавацца на кітайскім рынку, павінны памятаць: гэтым шляхам ужо аднойчы былі пайшлі. Гадоў сто таму, у часы палітыкі адчыненых дзьвярэй, амэрыканскія і

эўрапейскія фірмы былі кінуліся ў Кітай – і толькі й пабачылі, як іхныя інвэстыцыі згарэлі ў полымі вайны й рэвалюцыі. Тады, як і цяпер, эканамічныя пэрспэктывы Кітаю выклікалі радасную эўфарыю, асабліва ў Злучаных Штатах. Але тады гэтыя надзеі рухнулі – яны могуць не апраўдацца і цяпер. Валютная ці банкаўская крыза ў Кітаі можа скалануць увесь сьвет, асабліва калі замежныя інвэстары ўбачаць, як цяжка вярнуць з Кітаю свае актывы. Варта памятаць: калі іншаземцы ўкладаюць грошы наўпрост у заводы, без пасярэдніцтва, скажам, рынку каштоўных папераў, тады не ўзьнікае патрэбы ў кантролі за ўнутраным рынкам капіталу. Бо ўрэшце як жа можна вывезьці доменную печ?

Драбленьне ісламскай цывілізацыі. Паколькі ўзровень нараджальнасьці ў мусульманскім сьвеце больш як удвая вышэйшы ад сярэднеэўрапейскага, у будучыні ісламскія краіны паўночнай Афрыкі і Блізкага Ўсходу будуць абавязкова чыніць ціск на Эўропу і ЗША. Напрыклад, калі да 2050 г. паводле колькасьці насельніцтва Емэн перагоніць Расею, як тое прагназуе ААН пры захаваньні цяперашняй нараджальнасьці, то альбо эканамічная сытуацыя на Блізкім Усходзе мусіць карэнным чынам палепшыцца, альбо прыток эмігрантаў з арабскага сьвету ў Эўропу, што паступова старэе, значна павялічыцца. «Мяккая» ісламская калянізацыя найбольш уражвае ў гарадох кшталту французскага Марсэлю, дзе цэлыя прадмесьці населеныя паўночнаафрыканцамі. Аднак яна не абавязкова пагражае ўзьнікненьнем «Эўрабіі». Насамрэч мусульманскі сьвет па-ранейшаму застаецца падзеленым, і ня толькі на сунітаў і шыітаў. З аднаго боку, ёсьць мусульмане, якія шукаюць мірнага *modus vivendi* на Захадзе (гэтае памкненьне яскрава выяўленае ў жаданьні турэцкага ўраду ўвайсьці ў Эўразьвяз). З другога – тыя, каго вабіць рэвалюцыйна-бальшавіцкі ісламізм рэнэгатаў тыпу лідэра «Аль-Каіды» Асамы бін Ладэна. Ад Марока да Пакістану апытаньні грамадзкай думкі сьведчаць пра шырокую распаўсюджанасьць антыамэрыканскіх настрояў, але адзінадушша ў гэтым пытаньні няма. У Эўропе толькі нязначная меншасьць адкрыта спачувае тэрарыстычным арганізацыям. У Ангельшчыне большасьць маладых мусульманаў аддаюць перавагу асыміляцыі, а не джыгаду. Нам вельмі далёка да «вайны дзьвюх цывілізацыяў» і яшчэ далей – да новага халіфату, які б нёс

геапалітычную пагрозу ЗША і іх хаўрусьнікам. Карацей кажучы, кожны з магчымых «гегемонаў XXI стагодзьдзя»: ЗША, Эўропа, Кітай – мае ў сабе зародкі заняпаду, а іслам у сусьветнай палітыцы застаецца расьцярушанай сілай, якая ня мае рэсурсаў для звышмагутнасьці.

ЗМРОК І
РАЗЬЯДНАНАСЬЦЬ

Дапусьцім,
падзеі
будуць
разгортвацца
паводле
найгоршага
сцэнару, і ў
Іраку з
амэрыканскіх
нэакансэрватараў
саб'юць
пыху, а
праект
адміністрацыі
Буша на
штыхох
прынесьці
дэмакратыю
на Блізкі
Ўсход
скончыцца
ганебнай
паразай, і
менш як за
два гады мы
прыйдзем ад
імпэрыі да
дэкалянізацыі.
Дапусьцім,
ніводная
іншая
дзяржава-

суперніца не
захоча
запоўніць
узьніклы
вакуўм – ня
толькі даць
рады з
Іракам, але,
зразумела, і
з
Аўганістанам,
з Балканамі
і Гаіці. Якая
апалярнасьць
чакае нас
тады ў
будучыні?

Адказаць на пытаньне няпроста, бо ў гісторыі было вельмі мала пэрыядаў, калі ніхто не прэтэндаваў на ролю сусьветнага ці, прынамсі, рэгіянальнага лідэра. У найноўшай гісторыі апошні раз штосьці падобнае здарылася ў 1920-х гг., калі ЗША адмовіліся ад праекту прэзыдэнта Вудра Ўілсана стварыць сыстэму ўсеагульнай дэмакратыі і калектыўнай бясьпекі пад эгідай Лігі Нацыяў. У Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе пасьля падзеньня імпэрыяў Раманавых, Габсбургаў, Гагенцольлернаў, а таксама Асманскай імпэрыі, вядома, утварыўся вакуўм улады. Але ненадоўга. Старыя заходнеэўрапейскія імпэрыі хуценька адхапілі ласыя кавалачкі, што засталіся на Блізкім Усходзе пасьля асманскага панаваньня. Да 1922 г. бальшавікі зноў сабралі ў адно землі былой царскай імпэрыі. А да 1936 г. Нямеччына ўжо цьвёрда стала на шлях рэваншызму.
Каб адшукаць часы сапраўднай доўгатрывалай апалярнасьці, трэба заглыбіцца ў куды як больш далёкую гісторыю – ажно ў IX–X стст.
На тыя часы рэшткі старажытнай Рымскай імпэрыі – Рым і Бізантыя – ужо прамінулі пік сваёй магутнасьці. На Захадзе першыя ролі разьмяркоўваліся паміж папам, які стаяў на чале Хрысьціянскай Царквы, і нашчадкамі Карла Вялікага, якія ў 843 г. падзялілі ягоную імпэрыю паводле Вэрдэнскай дамовы.

Да каранаваньня ў 962 г. Ота II Вялікага рэальных прэтэндэнтаў на тытул імпэратара не было, дый той быў проста нямецкі прынц, які так ніколі і ня спраўдзіў сваіх амбіцыяў валадарыць над Італіяй. Між тым поўнач Бізантыйскай імпэрыі ахапіла паўстаньне баўгараў.
У 750 г. Абу аль-Абас заснаваў Абасыдзкі халіфат, але да 900 г. ён прайшоў кропку зэніту і ў сярэдзіне X ст. імкліва набліжаўся да заняпаду. У Кітаі таксама ўзьнікла часовае безуладзьдзе паміж дынастыямі Тан і Сун. Абедзьве гэтыя імпэрыі мелі казачна багатыя сталіцы: Багдад і Чанган (Ch'ang-an), – але ні тая, ні другая ўсур'ёз не імкнуліся пашыраць свае абсягі. Слабасьць старых імпэрыяў дазволіла расквітнець новым, не такім вялікім дзяржавам. Калі ў 740 г. племя хазараў прыняла юдаізм, Хазарскае ханства запоўніла эўразійскі вакуўм улады ад Касьпійскага да Чорнага мора. У Кіеве, куды не магла дацягнуцца Бізантыя, княгіня Вольга, навярнуўшыся ў 957 г. на праваслаўе (так у аўтара. – **Перакл.**), заклала падмурак будучай Расейскай імпэрыі (sic! – **Перакл.**). Калі Абасыдзкі халіфат страціў уладу над Малой Азіяй, сэльджукі – продкі асманскіх туркаў – утварылі Румскі султанат. У Афрыцы існавала міні-імпэрыя ў Гане, у Цэнтральнай Амэрыцы – цывілізацыя мая. Паміж усімі імі амаль або зусім не было ніякіх сувязяў. Гэты стан – поўная супрацьлегласьць глябалізацыі: сьвет, падзелены на разьяднаныя, засяроджаныя ў саміх сабе цывілізацыі.
Адна з рысаў той эпохі, якая вызначалася адсутнасьцю моцнай сьвецкай палітыкі, палягала ў тым, што рэлігійныя пытаньні часта выклікалі сур'ёзныя канфлікты. Сапраўды, рэлігійныя інстытуты не аднойчы вызначалі палітыку. У VIII–XIX стст. Бізантыю разрывалі спрэчкі пра месца абразоў у багаслужбах. У XI ст. папа прымусіў імпэратара Сьвятой Рымскай імпэрыі Генрыха IV падпарадкавацца ў справе прызначэньня біскупаў. У Хрысьціянскай Царкве вялікі ўплыў набылі новыя манаскія законы, асабліва клюнійскі закон – першы закон, які цэнтралізаваў кіраваньне кляштарамі. У мусульманскім сьвеце сапраўдная ўлада належала духоўнікам (улеме). Калі ўзяць пад увагу гэткую атмасфэру, робіцца зразумела, чаму тая эпоха ў выніку прывяла да крыжовых паходаў – нечуваных раней «сьвятарных войнаў». Першую зь іх хрысьціянская Эўропа распачала ў 1095 г.

І аднак тая «вайна цывілізацыяў» шмат у чым яшчэ раз пацьвердзіла, што апалярны сьвет безабаронны перад вайсковымі набегамі больш адсталых народаў на буйныя гарады. У IX ст. вікінгі раз за разам нападалі на заходнеэўрапейскія месты – згадаць хоць бы Нант у 842 г. і Сэвільлю ў 844 г. Адзін франскі летапісец у вусьцішы пісаў, што «бясконцы паток вікінгаў» ірвецца далей на поўдзень. Бізантыя ў 860 г. таксама ляжала разрабаваная набегамі Русі – зародку будучай Расеі. Бізантыйскі патрыярх роспачна наракаў, што гэтае «жорсткае барбарскае племя ня ведае літасьці», што яны «як бурапеннае мора… нішчаць усё, нічога не шкадуюць». Так выглядала эпоха безуладзьдзя.

Таму ня дзіва, што будучыня была за невялікімі абароназдольнымі палітычнымі адзінкамі. Напрыклад, Вэнэцыянская рэспубліка, па сутнасьці, горад-дзяржава, у 840 г. ужо вяла самастойную замежную палітыку, а створаная ў 886 г. Ангельшчына Альфрэда Вялікага стала першым прататыпам нацыянальнай дзяржавы ў эўрапейскай гісторыі.

БЕЗ
ЗВЫШДЗЯРЖАВЫ
Ці можа
сёньня
апалярны
сьвет
ператварыцца
ў нешта
падобнае да
часоў
караля
Альфрэда?
Так, толькі
зь
некаторымі
істотнымі – і
небясьпечнымі
–
адрозьненьнямі.

Вядома, можна ўявіць, што прызнаныя сусьветныя лідэры: ЗША, Эўропа, Кітай – адступяць да сваіх рэгіянальных сфэраў

уплыву. Але як наконт узрослых прэтэнзіяў на ўладу з боку наднацыянальных структураў, створаных пры актыўным удзеле ЗША пасьля Другой сусьветнай вайны? ААН, МВФ, Сусьветны банк, Сусьветная гандлёвая арганізацыя (у мінулым Генэральнае пагадненьне па мытных тарыфах і гандлі) – кожны зь іх уважае сябе ў пэўным сэнсе прадстаўніком «міжнароднай супольнасьці». Ці сапраўды іх імкненьне да гегемоніі ў сьвеце карэнным чынам адрозьніваецца ад духу раньняга сярэднявечча?

Але і прэтэнзіі на ўладараньне над усім сьветам былі неад'емнай часткай рыторыкі той эпохі. Іх выказвалі ўсе тагачасныя імпэрыі. Некаторыя, ня ведаючы пра існаваньне іншых цывілізацыяў, магчыма, нават і верылі, што так яно і ёсьць. Аднак у рэчаіснасьці не было ні адзінага Хрысьціянскага сьвету, ні ўсёабдымнага Царства Нябёснага. У рэчаіснасьці была палітычная раздробленасьць. Тое ж самае можна сказаць і пра нашы дні. Вызначальная рыса нашага часу – пераход улады не вышэй, да наднацыянальных структураў, а ніжэй. Канец дзяржаўнай манаполіі на сродкі прымусу і развал сыстэмы дзяржаўнага кантролю над каналамі камунікацыі азначаў, што чалавецтва ўступіла ў эру ня толькі інтэграцыі, але і дэзінтэграцыі.

Так, свабодны паток інфармацыі і сродкаў вытворчасьці павялічвае магутнасьць транснацыянальных карпарацыяў і недзяржаўных арганізацыяў (а таксама місіянэраў усіх веравызнаньняў). Але свабодны паток сродкаў зьнішчэньня павялічвае магутнасьць арганізаванай злачыннасьці і тэрарыстычных груповак. Здаецца, яны могуць дзейнічаць, дзе толькі пажадаюць – ад Гамбургу да сэктару Газа. Сілы ж міжнароднай супольнасьці, наадварот, распасьціраюцца далёка не на ўвесь сьвет. Яны амаль не выходзяць за межы некалькіх стратэгічна важных гарадоў, прыкладам, Кабулу і Прыштыны. Карацей, улада над сьветам насамрэч належыць не дзяржаўным дзеячам, а «законьнікам» і «вікінгам» нашых часоў.

Што мы маем у выніку? Заняпад імпэрыяў. Рэлігійнае адраджэньне. Пачаткі безуладзьдзя. У пэрспэктыве – хаваньне за ўмацаваныя гарадзкія муры. Сьвет без звышдзяржавы, магчыма, неўзабаве зноў пабачыць усе гэтыя праявы змрочнага раньняга сярэднявечча. Бяда ў тым, што сёньня гэта нашмат больш небясьпечна, чым у IX ст.

Насельніцтва Зямлі значна ўзрасло – прыкладна ў 20 разоў, а значыць, канфлікты паміж «плямёнамі», ня здольнымі суіснаваць у адзіным сьвеце, пачасьцяцца. Разьвіцьцё тэхналёгіяў зьмяніла тып вытворчасьці: чалавечае грамадзтва залежыць ужо ня толькі ад запасаў пітной вады і ад ураджаю, але і ад здабычы нафты і газу. А мы ведаем, што яны не бясконцыя. А яшчэ разьвіцьцё тэхналёгіяў удасканаліла сродкі зьнішчэньня – цяпер горад можна ня проста разрабаваць, а сьцерці з твару зямлі.

За больш як два дзесяцігодзьдзі дзякуючы глябалізацыі – інтэграцыі сусьветных рынкаў тавараў, капіталу і рабочай сілы – ува ўсім сьвеце павысіўся ўзровень жыцьця. Выключэньне складаюць толькі тыя краіны, якія тыранія ці грамадзянскія войны адгарадзілі ад гэтага працэсу. Рух ад глябалізацыі ў адваротным кірунку – а вяртаньне сярэднявечча пэўна да гэтага прывядзе – бясспрэчна, азначаў бы эканамічны застой або нават дэпрэсію. Пасьля таго як другога 11 верасьня будуць разбураныя, скажам, Х'юстан ці Чыкага, ЗША, спрабуючы абараніцца, абавязкова ператворацца ў менш адкрытае грамадзтва, не такое гасьціннае да іншаземцаў, якія хацелі б працаваць, весьці бізнэс у Амэрыцы або проста наведаць краіну. Між тым з ростам мусульманскіх анкляваў у Эўропе пранікненьне ісламскіх экстрэмістаў у Эўразьвяз набудзе незваротны характар. У выніку скрайне абвострыцца супрацьстаяньне паміж берагамі Атлянтыкі за Блізкі Ўсход. У Кітаі эканамічны каляпс прывядзе да крызы камуністычнай сыстэмы, вызваліць цэнтрабежныя сілы, што ў мінулым падрывалі магутнасьць кітайскіх імпэрыяў. Заходнія інвэстары стацяць усё і вырашаць, што лепей ніжэйшыя прыбыткі ў сваёй краіне, чым рызыка дэфолту за мяжой.

Калі б вярнуліся змрочныя часы раньняга сярэднявечча, найгорш прыйшлося б ускрайкам аслабелых вялікіх дзяржаваў. Самыя багатыя ў сьвеце партовыя гарады – ад Нью-Ёрку да Ратэрдаму і Шанхаю – сталіся б мэтай рабаўнікоў і піратаў. Між тым як Захад ліхаманкава кінуўся ўзмацняць бясьпеку ў аэрапортах, тэрарысты зь лёгкасьцю маглі б зьнішчыць судаходзтва, падрываючы танкеры, авіяносцы, пасажырскія ляйнэры. Лякальныя ядравыя войны спустошылі б шмат якія рэгіёны – пачынаючы ад Карэйскай паўвыспы і Кашміру і сканчаючы магчымай катастрофай на Блізкім Усходзе. У

Лацінскай Амэрыцы даведзеныя да галечы гаротнікі шукалі б суцяшэньня ў хрысьціянскай веры, імпартаванай прапаведнікамі-місіянэрамі з ЗША. У Афрыцы працягвалі б лютаваць паморкі – СНІД і малярыя. Нешматлікія незбанкрутавалыя авіякампаніі проста адмовяцца ад палётаў у большасьць гарадоў на гэтых кантынэнтах: каму захочацца ляцець туды са сваіх бясьпечных, узмоцнена ахоўваных гаваняў?

З гэтых прычынаў пэрспэктыва апалярнага сьвету павінна пужаць нас непараўнальна больш, чым у свой час нашчадкаў Карла Вялікага. Калі Злучаныя Штаты адмовяцца ад гегемоніі ў сьвеце – бо іх рэпутацыю ўва ўласных вачох заплямяць дробныя няўдачы на ўзьмежжы імпэрыі – хай тады крытыкі (свае і замежныя) ня робяць выгляду, нібыта адкрываюць новую эру суладзьдзя ў шматпалярным сьвеце або вяртаюць нас да добрых старых часоў «балянсу сілаў».

Асьцярожна з жаданьнямі. Альтэрнатывай аднапалярнасьці будзе зусім не шматпалярнасьць, а апалярнасьць – сусьветны вакуўм улады. І ад гэтага бязладзьдзя (калісьці мы яго ўжо праходзілі) выйграюць куды як больш небясьпечныя сілы, чым вялікія дзяржавы-супернікі.

Пераклаў з амэрыканскай Алесь Брынеўскі

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

эсэістыка [image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Іян Бурума Ісламская дэмакратыя для Іраку?

Ці сапраўды магчымая «ісламская дэмакратыя»? Можа гэта нешта бессэнсоўнае, накшталт, скажам, «жыдоўскай навукі», альбо супярэчлівае, накшталт «народнай дэмакратыі», што існавала за камуністамі? Ад адказу на гэтае пытаньне

ІЯН БУРУМА амэрыканскі палітычны камэнтатар. Яго апошняя кніжка «Аксыдэнталізм: Захад вачамі ягоных ворагаў» (Occidentalism: The West in the Eyes of Its Enemies. – New York: Carnegie Council Books for Breakfast/ Merrill House, 2004) была напісаная разам з Авішаем Маргалітам. Гэты артыкул быў

залежыць будучыня Іраку, бо найбольшай папулярнасьцю й павагай у гэтай зруйнаванай краіне карыстаецца вялікі аятала Алі аль-Сыстані, шыіцкі клерык, што адмаўляецца змагацца за дзяржаўныя пасады, але абвяшчае, што падтрымлівае ідэю ісламскае дэмакратыі.	упершыню апублікаваны ў «The New York Times Review of Books» (5.12.2004).

Аятала настойвае на тым, што ірацкі ўстаноўчы сход павінен быць абраны на простых выбарах, і «любы Асноўны закон, распрацаваны гэтым сходам, мусіць быць зацьверджаны на агульнанацыянальным рэфэрэндуме». Ён толькі мімаходзь спасылаецца на кур'анічнае права як аснову для заканатворчасьці. Гэтаксама ж зацята аль-Сістані супраціўляецца ўсякім спробам перанесьці ўсеагульныя выбары зь меркаваньняў бясьпекі, асабліва ў суніцкіх раёнах. У сярэдзіне кастрычніка ён выдаў фэтву, што загадвае ўсім мужчынам і жанчынам узяць удзел у выбарах, паставіўшы выбары ў адзін шэраг з такім падставовым рэлігійным абавязкам, як пост падчас месяца рамазану. Паводле словаў аяталы, у абавязак шыітаў таксама ўваходзіць абарона сунітаў і хрысьціянаў. І хаця ён выступае супраць пляну даць курдам

(якія складаюць ад 15 да 20 адсоткаў насельніцтва краіны) права вэта пры прыняцьці канстытуцыі, ён не адкідае курдзкіх спадзяваньняў на захаваньне нейкай аўтаноміі пры новым урадзе. Усе гэтыя прыгожыя словы, вядома, яшчэ павінны атрымаць сваё пацьвярджэньне на практыцы. Але як для шыіцкага клерыка, які нарадзіўся ў Іране, гэта адметныя словы, і таму варта ставіцца да іх сур'ёзна.

Нягледзячы на нядаўні ўздым кансэрватыўна настроеных хрысьціянскіх актывістаў у ЗША, у заходнім сьвеце прынята лічыць, што пры дэмакратыі царква павінна быць аддзелена ад дзяржавы. Іслам, як мы часьцяком чуем, асабліва несумяшчальны з дэмакратыяй, бо ў мусульманскіх краінах дзяржава ніколі так і ня выблыталася з клерыкальнага павуціньня. Праўда, Ірак прынята ўважаць за адмысловы выпадак, бо ён збольшага быў сьвецкай краінай. Насамрэч, абодва гэтыя цьверджаньні занадта агульныя. Духавенства рэдка калі кіравала мусульманамі. Паміж сьвецкай і духовай уладай на Блізкім Усходзе зазвычай існаваў падзел. І яшчэ зусім нядаўна да рэлігійных меншасьцяў, напрыклад, юдэяў, у мусульманскім сьвеце ставіліся больш талерантна, чымся ў хрысьціянскіх краінах. Але, як і на ўсім сьвеце, калі сьвецкая ўлада робіцца нясьцерпна рэпрэсіўнай, рэлігія часьцяком становіцца адзінай базай для арганізацыі супраціву. Такім прыкладам была Польшча за часоў камуністычнага кіраваньня, дзе менавіта Касьцёл быў аплотам іншадумства. За Садама Хусэйна падобную ролю пачалі адыграваць мячэты. Палітычны іслам быў шляхам для барацьбы зь сьвецкімі баасістамі, а Алі аль-Сыстані быў галоўным выразьнікам шыіцкай грамадзкай думкі. У нечым падобную ролю меў за часоў камунізму Папа рымскі.

Праўда, нэакансэрватыўнае атачэньне прэзыдэнта Буша дагэтуль аддавала перавагу сьвецкаму шляху пабудовы дэмакратыі ў Іраку. У першыя дні вайны заступнік міністра абароны Пол Вулфавіц ня раз згадваў пра Турэччыну як «пасьпяховую мадэль для іншых краінаў мусульманскага сьвету», а адміністрацыя Буша зьвязвала свае надзеі зь сьвецкімі выгнанцамі, кшталту Ахмада Чалабі, а не шыіцкімі муламі, якія эміграваліў Лёндан ці Тэгеран. Гэты кірунак мысьленьня цалкам супадаў з поглядамі іншага фаварыта Бушавай адміністрацыі, Бэрнарда Льюіса, прынстанскага

навукоўца, які цьвердзіць, што Кемаль Ататурк намацаў у Турэччыне правільны шлях: каб ажыццявіць мадэрнізацыю, неабходна гвалтам ачысьціць палітыку ад рэлігійных аўтарытэтаў. Ататурк у 1917 годзе абвесьціў, што адным махам зьменіць жыцьцё турэцкага грамадзтва. Менавіта гэта ён і зрабіў у 1923 годзе. З жанчын пазрывалі чадры, пазачынялі ісламскія школы ды забаранілі брацтвы дэрвішаў. У новым грамадзтве, падпарадкаваным «прынцыпам навукі, ведаў і цывілізацыі», было нават забаронена насіць турэцкую фэску. Падобныя рэвалюцыі адбываліся ці, прынамсі, задумваліся і ў іншых краінах. У 1860-х пасьля Рэстаўрацыі Мэйдзі ў Японіі ў імя цывілізацыі і асьветы руйнаваліся будысцкія храмы. Студэнцкае паўстаньне 4 траўня 1919 году ў Кітаі было спробай замяніць канфуцыянскую традыцыю і рэлігійныя «прымхі» на «пані Навуку і пані Дэмакратыю». У Пэрсіі 1920-х Рэза-шах Пагляві спрабаваў мадэрнізаваць краіну (якую ён пасьля пераймяную ў Іран), зьнішчаючы мячэты, забіваючы ці арыштоўваючы сьвятароў ды забараняючы насіць чадры. А панарабізм раньніх баасістаў, некаторыя зь якіх былі сырыйскімі хрысьціянамі, наагул быў сьвецкім рухам, створаным на ўзор пангерманскага нацыяналізму.
На жаль, з усяго гэтага мадэрнізацыйнага імпэту нараджалася не дэмакратыя, а мілітарызм, абсалютная манархія, фашызм і разнавіднасьці сталінізму. Рэлігійная рэвалюцыя, што блукае сёньня па мусульманскім сьвеце, была, да пэўнай меры, рэакцыяй на гэты правал сучаснай сьвецкай палітыкі. Але ўсё адно многія аналітыкі, што спэцыялізуюцца на Блізкім Усходзе, блізкія да Бушавай адміністрацыі, накшталт Дэніэла Пайпса, бачаць сьвецкага аўтакрата, кшталту Ататурка ці Чан Кай-шы, найлепшым варыянтам для Іраку, бо выбары ў кароткатэрміновай пэрспэктыве прывядуць да ўлады «хамэйнісцкіх мулаў». Нэакансэрватары не адзіныя ў сваім недаверы да клерыкаў. Гэты недавер расколваў гэтаксама і левую антыкамуністычную апазыцыю ў Польшчы. Некаторым дысыдэнтам было цяжка падтрымаць сьвятароў супраць камісараў. Як аднойчы зазначыў адзін з апошніх апалягетаў тамтэйшага камуністычнага рэжыму Ежы Урбан, выбар палягаў паміж намі і чорнай Маткай Боскай Чэнстахоўскай. Але ці заўжды даводзіцца выбіраць адно з двух? Ці выбар у Іраку сапраўды палягае паміж Ататуркам і Хамэйні?

Летапіс ісламскай дэмакратыі ад зараджэньня і да сёньняшняга дня не напісаны. У Іране пэўны варыянт дэмакратыі існуе пад кантролем рэлігійнай рады. Мабыць, Турэччына найшчыльней наблізілася да эўрапейскай мадэлі, якую мы ведаем. Яна да пэўнай меры грунтуецца на рэлігійных каштоўнасьцях, ня будучы тэакратыяй. Але нават многія эўрапейцы не давяраюць турэцкай дэмакратыі, а некаторыя мусульмане лічаць яе грахоўнай.

Ідэя, што сучасная дэмакратыя павінна быць сьвецкай у сваім этасе, карэніцца ў эўрапейскай гісторыі. Рух Асьветніцтва, асабліва ў Францыі, часткова вырас з нападак на аўтарытэт царквы. Палітычнае мусіла падпадаць пад кампэтэнцыю розуму, а не тэалёгіі. Быць сучасным чалавекам азначала адмовіцца ад «забабонаў» рэлігіі і паверыць у навуку. На думку Вальтэра (як і многіх іншых), недастаткова паставіць закасьнелую рэлігію на сваё месца; трэба «вымесьці гэтае сьмецьце прэч». Вера ў навуку як сродак вырашэньня ўсіх праблемаў чалавецтва сама ператварылася ў нейкі від забабонаў. Навуковы сацыялізм, у стылі Сталіна ды Мао, напрыклад, прывёў да сэрыі вар'яцкіх экспэрымэнтаў, якія спрычыніліся да сьмерці мільёнаў людзей.

Вядома, ня ўсе рацыяналісты кідаліся ў такія крайнасьці. Шмат хто з тыповых мысьляроў эпохі Асьветніцтва, напрыклад Джон Лок, былі перакананыя, што палітычная сыстэма, заснаваная на асьвечаным эгаізьме, ня выжыве без трывалай апоры на рэлігійную маральнасьць. Тая адмена антыклерыкалізму, што натхняла сталіністаў і іншых прыхільнікаў аўтарытарызму, у большай ступені ёсьць прадуктам Французскай рэвалюцыі, чымся самога агульнага працэсу разьвіцьця ідэі дэмакратыі. На самай справе, антыклерыкалізм у шмат большай ступені, чымся гісторыя рэлігійнага фанатызму, дае нам шматлікія прыклады найбольш крывавых палітычных паразаў на Блізкім Усходзе: насэрызм у Эгіпце, баасізм у Сырыі і Іраку, шахскі рэжым у Іране. Гэтыя рэжымы кіраваліся сьвецкімі элітамі, якія ўважалі рэлігію тым, што затрымала разьвіцьцё іх краю ці давяло яго да каляніяльнай залежнасьці. Той факт, што шэраг рэфарматараў-прыхільнікаў цьвёрдай рукі, накшталт таго ж Насэра, неаднаразова былі аб'ектам замахаў з боку рэлігійных фанатыкаў, паказвае тую прорву, што існавала паміж сьвецкімі «прагрэсіўнымі» элітамі і кіраваным імі народам. Там, дзе

арганізаваная рэлігія разбураецца, яе месца займае нешта горшае, зазвычай – квазірэлігія ці культ асобы, чым і карыстаюцца дыктатары. Калі ж яе выціскаюць на маргінэс, як гэта зьдзеялася ў Эгіпце і іншых краінах Блізкага Ўсходу, то справа заканчваецца рэлігійнымі паўстаньнямі.
Мы не сьцьвярджаем, што мусульманскае духавенства па сваёй прыродзе схільнае да дэмакратыі. Але шэраг дасьледнікаў Блізкага Ўсходу, сярод іх Рычард Баліт, аўтар кніжкі «The Case for Islamo-Christian Civilization», давялі, што рэлігія цягам многіх стагодзьдзяў сапраўды стрымлівала і абмяжоўвала тыранію ў мусульманскім сьвеце. Разбурэньне традыцыйных мусульманскіх інстытутаў, як то рэлігійных школаў і мячэтаў, у імя мадэрнізацыі пакідае па сабе сацыяльную пустэчу, у якой урэшце й разьвіваецца крайняя адмена палітычнага ісламу. Аятала Хамэйні дзеяў не як традыцыйны шыіцкі клерык, але як сучасны рэвалюцыянэр, што захапіў уладу і стаў палітычным аўтакратам. І ў вачах многіх вернікаў ягоная сьвецкая дыктатура ў Іране падарвала ягоны аўтарытэт рэлігійнага лідэра, бо мулы не павінны дзейнічаць у стылі палітыкаў.
Асама бэн Ладэн – гэта сьвятар-аматар, які лепш знаецца на трансфэрах у швайцарскіх банках і маніпуляцыях СМІ, чымся на мудрагелістасьцях ісламу. Няпроста знайсьці хаця б аднаго сур'ёзнага мусульманскага клерыка ці дасьледніка, што паважаў бы гэтага чалавека.
Варта крыху паразважаць наконт таго, як сам Захад даў сабе рады з рэлігіяй. Аддзяленьне царквы ад дзяржавы сапраўды было неабходнай умовай дзеля забесьпячэньня дэмакратычнага разьвіцьця Эўропы і Злучаных Штатаў, але яно ніколі ня мела абсалютнага характару. Брытанскі канстытуцыйны лад гэтаксама ўлучае ў сябе арганізаваную рэлігію: манарх зьяўляецца абаронцам англіканскага веравызнаньня. Мо' гэта і ня больш як фармальнасьць, але і ў кантынэнтальнай эўрапейскай палітыцы хрысьціянска-дэмакратычныя партыі паранейшаму вядуць рэй на палітычнай сцэне. Першая падобная партыя, Антырэвалюцыйная партыя, была заснаваная ў 1879 годзе колішнім кальвінісцкім пастарам зь Нідэрляндаў Абрагамам Койпэрам. Ён паставіў задачу вярнуць Бога (не царкву) на месца абсалютнага сувэрэна ў людзкіх справах. Маўляў, дэмакратычныя дзяржаўныя інстытуты могуць трывала існаваць толькі тады, калі сьвецкі ўрад цьвёрда абапіраецца на

хрысьціянскую веру. Ён быў пераканаы ў гэтым, у гэтым пераканаыя дагэтуль сучасныя хрысьціянскія дэмакраты.
Я ў гэта ня веру. Агностыку заўжды складана адстойваць у рэлігійных справах важнасьць існаваньня арганізаванай рэлігіі, але я сьцьвярджаю ня тое, што больш людзей павінна трымацца рэлігіі ці што дэмакратыя ня здатная выжыць бяз Бога, але што голас вернікаў таксама павінен быць пачуты. Найважнейшай умовай існаваньня дзейснай дэмакратыі зьяўляецца ўдзел людзей у яе функцыянаваньні. Калі рэлігійныя структуры могуць забясьпечыць неабходны кансэнсус пры гульні па агульных правілах, дык неабходна іх ангажаваць у дэмакратычны працэс. Заснаваная на шарыяце шыіцкая тэакратыя, нават падтрымліваная бальшынёй, ніколі ня будзе дэмакратыяй. Пра эфэктыўную дэмакратыю можна гаварыць толькі тады, калі выражаюцца і ўлічваюцца правы і інтарэсы розных этнічных і рэлігійных групаў.
Вядома, гэта ўзьнёслыя пляны, але, зважаючы на змрачнаватыя прэцэдэнты сьвецкай палітыкі на Блізкім Усходзе ды за яго межамі, можна зразумець, чаму некаторыя выбітныя экспэрты ў галіне ісламазнаўства аспрэчваюць мэтазгоднасьць разьвязаньня ірацкага пытаньня паводле ататуркаўскага варыянту. Руэл Марк Герэхт, супрацоўнік «American Enterprise Institute for Public Policy Research» і колішні аналітык ЦРУ, цьвердзіць, што пабожныя пасьлядоўнікі Сыстані ня толькі найлепшая, але і адзіная надзея дэмакратыі. На думку Герэхта, «Іранскае паходжаньне Сыстані і ягоная сям'я, што жыве ў Ісламскай Рэспубліцы, напэўна гарантуюць, што ён як найлепш адчувае тую небясьпеку, якая зыходзіць ад пастак клерыкальнай дыктатуры», а «ў справах дэмакратызацыі Іраку Сыстані можа зноў стаць адным з найбольш эфэктыўных хаўрусьнікаў Амэрыкі». Ноаг Фэльдман, прафэсар права Нью-Ёрскага ўнівэрсытэту, гэтаксама горача даводзіць, што ісламская дэмакратыя ў Іраку магчымая, дэмакратыя, што гарантуе людзям ня толькі магчымасьць галасаваць, але і магчымасьць «галасаваць за законы, якія грунтуюцца на ісламскіх пераканаьнях, ідэалах і каштоўнасьцях, за дзяржаву, якая зможа падтрымаць іслам і забесьпячыць фінансаваньне для рэлігійных установаў і сыстэмы адукацыі».
Мажліва, погляды прававерных шыітаў на правы жанчын і іншыя сацыяльныя пытаньні не падзяляюцца бальшынёй

выбарцаў у Злучаных Штатах, але тыя самыя прававерныя шыіты дэкляруюць сваё імкненьне забясьпечыць народны сувэрэнітэт, заснаваны на выбарах. Пытаньне толькі, ці Сыстані і ягоныя пасьлядоўнікі адстойваюць гэтую пазыцыю, бо прадстаўляюць большасьць насельніцтва Іраку і выбары ўсё адно скончацца на іх карысьць, а не на карысьць суніцкай меншасьці, ці яны ў прынцыпе імкнуцца да стварэньня выбарчай сыстэмы. Мы не даведаемся адказу на гэтае пытаньне, пакуль гэта ня высьветліцца на практыцы – то бок пакуль адная ці іншая група не прайграе на выбарах і ня будзе вымушаная пагадзіцца быць кіраванай альтэрнатыўнай групай. Сыстані шмат зрабіў для таго, каб стварыць аб'яднаную шыіцкую кааліцыю, але шыітам яшчэ далёка да адзінства. Кааліцыя паміж Чаалабі і радыкальным шыіцкім клерыкам Муктабам Аль-Садрам можа перацягнуць да сябе галасы пэўнай колькасьці выбарцаў-шыітаў.

У студзені каля 200 палітычных групаў возьмуць удзел у змаганьні за 275 месцаў у нацыянальным парлямэнце. Мяркуецца, што, як і ў Эўропе, гэтыя партыі сфармуюць сетку кааліцый (многія зь якіх, бясспрэчна, будуць збудаваныя паводле рэлігійнага прынцыпу) і будуць супрацоўнічаць, каб зацьвердзіць прэм'ер-міністра і пастаянную канстытуцыю. Як мяркуецца, выбары паўнавартаснага ўраду адбудуцца пры канцы 2005 году. І, асобна ад мясцовых выбараў правінцыйных кіраўнікоў, курды ў паўночных курдзкіх рэгіёнах пры канцы студзеня абяруць свой асобны парлямэнт.

Усё гэта выглядае заблытана, але ня больш заблытана за сытуацыю ў Інданэзіі, якая мае самае шматлікае мусульманскае насельніцтва ў сьвеце. Тры месяцы таму група ірацкіх палітычных прадстаўнікоў наведала Інданэзію, каб паназіраць за працэсам дэмакратычных выбараў у краіне. Акіф Халік Ібрагім зь пераважна суніцкай партыі Ірацкіх незалежных дэмакратаў зазначыў: «Найважнейшым для нас урокам было тое, што ня варта палохацца складанасьці і цяжкасьці задачы – бо вырашыць яе магчыма». Магдзі Джабэр Магдзі, дэлегат ад Ірацкай камуністычнай партыі, заявіў агенцыі Франс-прэс, што, як і ў Інданэзіі, у Іраку існуе сьціжма рэлігійных і этнічных групаў і важна «пасьпяхова кіраваць гэтай разнастайнасьцю». Ён зазначыў, што «чым больш дэмакратычна вы імі кіруеце, там больш вы можаце быць упэўненымі ў тым, што расколу краіны

не адбудзецца».
Нялёгкім быў пераход Інданэзіі да дэмакратыі пасьля многіх гадоў сьвецкай дыктатуры, ува ўмовах якой палітычны ісламізм прыгнятаўся, як і ў Іраку. Аднак вынікам стала ўсталяваньне не фундамэнталісцкага ісламскага рэжыму, а дэмакратычнай сыстэмы, хай сабе і з шэрагам заганаў. Пры ёй ісламісцкім партыям даводзіцца змагацца за галасы выбарцаў, як і ўсім астатнім партыям.
Вядома, інданэзійскія мусульмане розьняцца ад арабаў. Іхныя рэлігійныя звычаі менш пурытанскія. У іхнай традыцыі адсутнічае фанатызм. Жанчыны тамака карыстаюцца больш высокім грамадзкім статусам. Але тамтэйшая палітыка можа быць ня менш брутальнай, нягледзячы на частую рыторыку пра талерантнасьць і кансэнсус. Прэзыдэнт Сухарта, што ў 1965 годзе захапіў уладу ў выніку крывавага путчу, прыдушыў палітычны ісламізм, змусіўшы ісламскія партыі зьліцца ў адным прадстаўнічым органе, у які былі ўведзеныя і немусульмане. Усё гэта называлася «Аб'яднаная партыя разьвіцьця».
Афіцыйнай ідэалёгіяй быў зусім не ісламізм, а *панчасіла* (Pancasila), распрацаваная Сухартавым папярэднікам, Сукарна, у якасьці дзяржаўнай рэлігіі, што мела стаць агульнай маральнай асновай нацыянальнага адзінства. Панчасіла – гэта санскрыцкі тэрмін, у які ўваходзіць пяць прынцыпаў: вера ў вярхоўную істоту, справядлівае і цывілізаванае чалавецтва, адзінства Інданэзіі, дэмакратыя і сацыяльная справядлівасьць для ўсіх інданэзійцаў. Гучыць досыць прыстойна, скажаце вы, адно што крыху няшчыра, бо дэмакратыі за Сухартам не было. Аднак мусульмане, змушаныя аддаваць дзяржаўнай ідэалёгіі першынство перад ісламам, адчулі сябе абкрадзенымі і пазбаўленымі сваёй рэлігійнай ідэнтычнасьці. У Джакарце выбухнулі беспарадкі, пачаліся напады на кітайцаў і хрысьціянаў, нехта ўзарваў стары будысцкі храм у Барабадуры. Ня звыкшы мякка ставіцца нават да мірных праяваў нязгоды, Сухарта жорстка задушыў забурэньні. Афіцыйныя мусульманскія арганізацыі пастанавілі пагадзіцца з панчасілай. Радыкальны ісламізм, пашыраны і фінансаваны вагабістамі з Саудаўскай Арабіі, пачаў прывабліваць усё больш інданэзійцаў з той самай прычыны, зь якой ён прыцягваў іракцаў за часоў Садама Хусэйна: калі ўся палітычная апазыцыя зьнішчаная аўтакратычным рэжымам, мячэт становіцца адзіным прытулкам

палітыкі. Пасьля эканамічнага крызісу, што прывёў да падзеньня дыктатуры Сухарты, хаатычнае нараджэньне новай дэмакратыі стварыла прастору для больш свабоднай дзейнасьці радыкалаў, што заклікалі да заснаваньня ісламскай дзяржавы. Сьвецкія палітыкі адмовіліся крытыкаваць ісламістаў, баючыся абвінавачаньняў у антыісламскасьці, а памяркоўныя мусульмане спрабавалі іх ігнараваць. Гэтае ігнараваньне стала далей немагчымым пасьля таго, як група «Джэмаа Ісламія» забіла больш за 200 чалавек, падклаўшы бомбы на дыскатэцы ў Балі. Інданэзійцам давялося прызнаць, што і яны сутыкнуліся з праблемай ісламісцкага тэрарызму.

Вы, вядома, можаце зрабіць з гэтага выснову, што Сухарта меў рацыю. Мо' ягоны рэжым і быў жорсткім і карумпаваным, але, прынамсі, ён трымаў ісламістаў у загоне. Дэмакратыя ж прывяла да тэрору. Але гэта будзе аблудная выснова. Ня толькі таму, што Сухартавы аўтарытарныя мэтады ў значнай меры спрычыніліся да нараджэньня рэлігійнага экстрэмізму, але таму, што дэмакратыя паказала сябе лепшым лекам – бо памяркоўныя мусульмане, якія па-ранейшаму складаюць бальшыню насельніцтва Інданэзіі, жахнуліся крываваму пагрому, учыненаму тэрарыстамі, і яўна не аддадуць свае галасы ніводнай зьвязанай зь імі партыі. Гэта прымусіла ісламісцкія партыі публічна адрачыся экстрэмістаў.

Ці ў Іраку будзе так, як было ў Інданэзіі? Ці дазволіць дэмакратыя вырашыць праблему адрознасьці паміж арабамі і курдамі, шыітамі і сунітамі, вернікамі і атэістамі без застасаваньня гвалту? У прынцыпе, можна было б сказаць, што так. Але ў іракцаў ёсьць праблемы, зь якімі не сутыкаліся інданэзійцы. Ім даводзіцца будаваць дэмакратычныя інстытуты пад зьненавіднай іншаземнай акупацыяй.

Сапраўды вельмі складана будаваць дэмакратыю, будучы вучнямі замежных настаўнікаў, што прыбылі на танках і бамбавіках. Дарма што іншаземныя акупанты абвяшчаюць, што таксама жадаюць дэмакратызацыі Іраку, любы чалавек і любая партыя, западозраныя ў сувязях з акупантамі, тут жа дыскрэдытуюцца. Чым больш гэтыя чужынцы настойваюць на прынцыпах сьвецкасьці, тым больш мясцовае насельніцтва паварочваецца тварам да радыкальнага ісламізму. І чым больш гвалту чыняць ісламісты, тым меншая верагоднасьць таго, што іракцы змогуць прагаласаваць у бясьпецы. Гэта асабліва

датычыць так званага суніцкага трыкутніка на поўнач і захад ад Багдаду. Надта добра міністру абароны ЗША Дональду Рамсфэльду і кіраўніцтву шыітаў ды курдаў цьвердзіць, што, маўляў, усё-ткі лепш правесьці выбары, нават калі многія людзі ня возьмуць у іх удзелу, чымся наагул іх не праводзіць. «Дасканалых выбараў у сьвеце не бывае», – заявіў Саад Джавад Кандыль у інтэрвію газэце «The Boston Globe». Кандыль займае высокую пасаду ў Найвышэйшай радзе ісламскай рэвалюцыі, асноўнай шыіцкай партыі. «Калі некаторыя меншасьці ня могуць удзельнічаць зь меркаваньняў бясьпекі, дык гэта яшчэ не прычына, каб касаваць рашэньне большасьці». Анягож, акурат гэта і ёсьць прычынай. Бо, калі суніты не прагаласуюць, ірацкая дэмакратыя не спрацуе, таму што бяз згоды гэтай меншасьці большасьць ніколі ня зможа кіраваць краінай у міры.

У дэмакратычнай краіне, дзе суіснуюць шэраг веравызнаньняў і канфэсіяў, бываюць і іншыя праблемы. Фактычна немагчымым становіцца існаваньне дзьвюхпартыйнай сыстэмы. Да таго ж у шматпартыйнай сыстэме малыя партыі могуць мець зашмат уплыву, як мы гэта назіраем у Ізраілі. Большасьць ізраільцянаў – прыхільнікі сьвецкай дзяржавы, але драбнюткія артадаксальныя партыі часам вырашаюць лёсы ўрадаў. Магчыма, раньнія сіяністы – амаль спрэс сьвецкія, сацыялістычныя кібуцнікі, зашмат саступак зрабілі рэлігійным сілам, дазволіўшы ім, між іншага, вызначаць нормы ў галіне шлюбу. Баяліся, што калі не пайсьці на такі гешэфт, ультраартадоксы не прызнаюць дзяржавы Ізраіль. Але бацькі-заснавальнікі Ізраілю не змаглі прадбачыць, што аўтаномія ў духовых справах прывядзе да такіх аплявухаў у сьвецкай палітыцы.

Гэта праўда, што вернікі ў Эўропе, Злучаных Штатах ці яшчэ дзе часьцяком робяць тое, што загадваюць ім ксяндзы ці мулы. Да нядаўняга часу многія людзі ў краінах, дзе існавалі каталіцкія ці пратэстанцкія партыі, чынілі акурат гэтак. Але, прынамсі, яны галасавалі і прымалі тым самым дэмакратычную працэдуру, ім удавалася жыць разам і не хапаць пры гэтым адзін аднаго за горла. Калі шыіты і суніты патрапяць рабіць гэтаксама ў будучым Іраку, дык няхай бы сабе так і было. Але сьпярша яны павінны атрымаць магчымасьць удзельнічаць у выбарах і застацца пры гэтым жывымі. У гэтым і палягае

праблема, а не ў рэлігіі як такой. Адказ на яе павінна даць іншаземная акупацыя, якая зрабіла дэмакратыю магчымай, але цяпер, ужо самой сваёй прысутнасьцю, можа паспрыяць яе разбурэньню.
Пераклаў з амэрыканскай Сяргей Богдан

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к № 1 (35) - 2005

[image]

[image]

[image]

1 [image] [image] 2005
"да Зьместу"

[image] [image] [image]

СЯРГЕЙ ДУБАВЕЦ
публіцыст, выдавец, вядучы праграмы «Вострая брама» беларускай рэдакцыі радыё «Свабода».

Сяргей Дубавец
Праект Беларусь

Праект Беларусь паўстаў у XIX ст. як частка агульнаэўрапейскага працэсу стварэньня сучасных нацыяў.

Сёньняшні сьвет, у якім Беларусь прызнаная і як дзяржава, і як нацыя, выглядае завершаным. Цэмэнт схапіўся, прынамсі, на цяперашнім гістарычным этапе. Праблемы нацыянальнага станаўленьня ў цэнтры Эўропы – хутчэй маргінальныя, а сацыяльныя, палітычныя ды іншыя аспэкты «нацыянальнага пытаньня» і ўвогуле ўспрымаюцца як анахранізм. Жыва і актуальна выглядае толькі адзін бок нацыянальнага праекту – этычны. Напэўна, тады, у XIX ст., бачылася па-іншаму. Тым ня менш, этычны аспэкт прысутнічаў, а магчыма, быў вызначальны і ў тыя часы. Словам, зірнем на гісторыю стварэньня і ажыцьцяўленьня нацыянальнага праекту Беларусь

гэтым сёньняшнім, этычным вокам.
У XIX ст. край нашых продкаў разьвітваўся са сваёй ранейшай 500-гадовай гісторыяй існаваньня ў выглядзе Вялікага Княства Літоўскага і ўваходзіў у новую гісторыю як частка Расейскае імпэрыі. Дакладней, не ўваходзіў сам, а быў гвалтам далучаны і гвалтам жа перарабляўся, перакручваўся, відазьмяняўся на расейскі лад. «Чаго ня зробіць расейскі штых, тое зробіць расейская школа», – казаў прызначаны ў сталіцу краю Вільню новы начальнік, генэрал-губэрнатар граф Мураўёў. «Вы ідзяце змагацца з ворагамі, але памятайце, што яны браты», – настаўляў сваіх салдат імпэратар Аляксандар I. «Ты ж, братскою стрелой пронзенный, Судеб свершая приговор, Ты пал, орел одноплеменный, На очистительный костер!» – сьпяваў Ф. Цютчаў.
Уявіце сябе «з другога боку барыкадаў», з боку нашчадкаў ВКЛ, і паспрабуйце зразумець пачуцьці і лёгіку, закладзеныя ў пералічаных цытатах. Наўрад ці вам гэта ўдасца. Прычым, адчуеце вы не неразуменьне, а пратэст і – раптоўную прагу самасьцьверджаньня. Вось той штуршок, які прымусіць вас напружана думаць над сваім нацыянальным праектам, над новай формулай самаідэнтыфікацыі. Новай, бо вы разумееце, што прыйшлі новыя часы і новыя рэаліі, у якіх ані ВКЛ, ані толькі што падзеленая на часткі Рэч Паспалітая ня могуць быць пуцяводнай зоркай. Трэба ўбачыць сябе і свой край у новым сьвеце – адпаведнымі яму.
Зь верхатуры нашага часу мы бачым, што гэта быў сымбіёз польскамоўнага краёвага патрыятызму і расейскамоўнага «западноруссизма», якія шукалі карані сваіх пачуцьцяў у беларускамоўнай сялянскай культуры і старажытных актах з гісторыі бацькаўшчыны. Яны не пачуваліся палякамі або расейцамі і ў сваім краі ня бачылі працягу Польшчы або Расеі, таму шукалі доказаў самадастатковасьці свайго краю і сябе саміх.
Ім замінала праблема назвы. Іхныя слаўныя продкі жылі ў незалежнай краіне – Вялікім Княстве Літоўскім. ВКЛ у эўрапейскім кантэксьце выглядала паўнавартаснай дзяржавай. Яго вайскаводцы не аднойчы перамагалі ў лёсавызначальных бітвах, яго прафэсура рабіла адкрыцьці ў астраноміі, ягоныя вынаходнікі друкавалі кнігі, рабілі ашаламляльныя праекты ў будаўніцтве субмарынаў і ракетнае зброі, капалі каналы,

ягоныя палітыкі праводзілі аграрныя рэформы і складалі найбольш лібэральныя ў тагачасным сьвеце законы. Галоўным прынцыпам у тых законах была талеранцыя: міжэтнічная, міжканфэсійная, сацыяльная. Дастаткова сказаць, што каля 10 адсоткаў насельніцтва ў ВКЛ складала шляхта. Гэта значыць, што кожны дзясяты быў носьбітам адказнасьці за сваю краіну і ўплываў на яе лёс, складаў, сёньняшняй мовай, маральную большасьць грамадзтва. Уласна гэтыя 10 адсоткаў і рабілі гісторыю – і тады, і пасьля, у XIX ст., калі паўставаў праект Беларусь.

Чаму перастала існаваць іхнае слаўнае ВКЛ? Натуральна, таму што страціла незалежнасьць. Нібыта перад пагрозай замежнае агрэсіі ВКЛ стала фэдэратыўнай часткай Рэчы Паспалітае – «рэспублікі абодвух народаў» – разам з Польшчай. А паколькі Польшча ў гэтым саюзе дамінавала (польскі кароль быў «па сумяшчальніцтве» вялікім князем літоўскім), дык найбагацейшая шляхта ВКЛ яшчэ напрыканцы XVII ст. пачала імкліва палянізавацца – як зь меркаваньняў эканомікі, так і зь меркаваньняў прэстыжу. Сьледам за магнатамі пераходзілі на «каралеўскую мову» і шарачкі – шараговая шляхта. Страціўшы сваю беларускую мову, якая ў Вялікім Княстве Літоўскім была афіцыйнай, наша дваранства такім чынам касмапалітызавалася і цяпер думала адно пра сваю спадчынную маёмасьць. Вось чаму, калі тры суседнія імпэрыі – Аўстрыя, Прусія і Расея дзялілі міжсобку тую Рэч Паспалітую абодвух народаў, найбагацейшая шляхта думала толькі пра свае землі, скарбы і капіталы. Незалежніцкі запал застаўся хіба ў тых, каму губляць, апроч свае спадчыннае дваранскае годнасьці, не было чаго. Вось гэтыя і падымалі адно за адным паўстаньні на землях, што мусілі адысьці да Расеі. 1794, 1831, 1863. А Расея адно за адным гэтыя паўстаньні душыла, навадняючы край сваёй адміністрацыяй і сваімі парадкамі.

Зразумела, што маральная большасьць (нашчадкі тых 10 адсоткаў) увесь час рэпрадукуецца, і ў маладых галовах ды гарачых сэрцах зноў і зноў нараджаюцца ідэі краёвага патрыятызму ды жаданьне вярнуць спадчынную маёмасьць. Тым часам расейская адміністрацыя пазбаўляе дваранства краю ня толькі маёмасьці, але й спадчыннае годнасьці. Шляхту-аднадворцаў (самы масавы атрад і апірышча патрыятызму) спачатку перастаюць лічыць за дваранаў, а пасьля й наагул

пераводзяць у лік сялянаў. Няцяжка ўявіць сабе іхныя пачуцьці. Яны абражаныя, яны хто пяром, хто штыхом пратэстуюць. Яны ствараюць падпольныя студэнцкія гурткі, яны пішуць адозвы да сялянаў, яны партызаняць, яны кідаюць бомбу ў расейскага цара. А іх сотнямі высылаюць на катаргу ў Сібір, іх вешаюць і расстрэльваюць на гарадзкіх пляцах, іх схіляюць да эміграцыі. А ў дадатак ім афіцыйна забараняюць карыстацца беларускай мовай і самім словам «Беларусь».

Інакш кажучы, у краіне адбываецца «зачыстка» маральнае большасьці. Дакладней, падмена яе прывезеным з Расеі адміністрацыйным рэсурсам. Характарыстыку тых, хто прыехаў, дае сучасьніца падзеяў Н. Ланская ў сваёй кнізе «Обрусители» (СПб, 1887):

Некалькі гадоў таму заходні край быў цэнтрам, куды сьцякалася вялікае мноства людзей вялікарускага паходжаньня пераважна і праваслаўнага вызнаньня абавязкова. У той час край уяўляў сабою арэну, дзе, нічым не рызыкуючы, можна было тысячу разоў вылучыцца, выйсьці, што называецца, у людзі і пасьля, супакоіўшыся на ляўрах, вымавіць з спакойным сумленьнем: мы абрусілі. Сюды імкнуліся ўсе тыя, хто быў чымсьці не задаволены ў сябе ўдома: кожны, каго абышлі чынам, месцам ці ўзнагародай, чый не прынялі ці вярнулі праект, чый маёнтак, у выніку новых парадкаў, прыйшоў у заняпад, а ўзяцца за справу не было ні ўменьня, ні сілы – усё гэта сьпяшалася ў заходні край. Тутака сьцякаліся людзі ўсялякіх прафэсій, узростаў і станаў: маладыя, старыя, аматары пажыць і тыя, што пражыліся дазваньня, расчараваныя ў каханьні, падманутыя ў жыцьці і што самі падманвалі, – усе пнуліся сюды зь ліхаманкавай пасьпешлівасьцю. Калі было многа званых, было многа і абраных. Гэта быў банкет, на які ішлі ўсе тыя, каму не было чаго губляць, у каго нічога не засталося за душой удома. Тутака можна было толькі выйграць, тамака ўжо не было чаго прайграваць. Гэта была штогадзінная эміграцыя. Стымул, што іх вабіў, быў такі, што мог разварушыць самага абыякавага і нерухомага чалавека, і насамрэч: абыякавыя і нерухомыя, за малымі выняткамі, ператвараліся тутака ў заўзятых зьдзірцаў (исправных приобретателей)… Акрамя таго, чалавек, які ехаў у гэты правінцыйны край на службу, часта лічыў гэта з свайго боку вычынам, які ня можа акупіць аніякая ўзнагарода; такой ахвярай, якую ацаніць у дастатковай меры мог, натуральна,

толькі той, хто яе прыносіў. І хаця збольшага ў ахвяру прыносілася напаўпісьменнасьць, а то і зусім невуцтва, вольны час, які не было куды падзець, пустая кішэня, якую трэба было напхаць... а зрэдку і не зусім бязгрэшнае мінулае – тым ня менш іншыя лічылі сябе дабрадзеямі quand ткте... Знаходлівым і сьмелым людзям тут быў разгон; тут можна было стацца памешчыкам без аніводнае капейкі; не купіўшы лесу, выгадна прадаць яго, зрабіць якую-любя ўгоду, назвацца чыім заўгодна імем...

Атэстатаў аніякіх не патрабавалася: дастаткова было прыехаць з Расеі і заявіць сябе праваслаўным, каб атрымаць права на такія льготы, правы і перавагі, якія ператвараліся ў сапраўдны рог дастатку. Можна таму ўявіць, якая колькасьць рознае навалачы запаланіла гэтыя бядотныя 9 губэрняў! Які кантынгент ілжы, подласьці, усялякіх падманаў, подкупаў, фальшу і маральнае распусты прынесла з сабой гэтая праваслаўная армія згаладалых і сасьмяглых, гальлівых і нецярплівых! Нібы саранча, кінуліся яны на гатовыя месцы, сьпяшаючыся захапіць усю тую прастору, ачышчаную для іх гвалтам; цырымоніцца не было патрэбы, і пад выглядам абрусеньня і прапаганды праваслаўя гэтыя заваёўнікі перасьледавалі такія мэты, якія ня мелі нічога супольнага ні з рэлігіяй, ні з маральнасьцю, ні нават з палітыкай сапраўднага абрусеньня...

Апісаная хваля «обрусителей» была закліканая замяніць сабою ўвесь без выключэньня «бюджэтны» апарат – ад губэрнатара да вясковага настаўніка. Агульная колькасьць такога роду прыежджых складала ня менш за паўмільёна чалавек. А каб як сьлед зразумець, куды яны ехалі, дазволю сабе яшчэ адну цытату, гэтым разам – з запіскі начальніка Віленскае навучальнае акругі І. Карнілава:

Нягледзячы на запрашэньні і выклікі праз апекуноў і праз газэты, доўгі час не было ахвотных займаць месцы ў Заходнім краі, – скардзіцца Карнілаў і тлумачыць: *Служба ў Заходнім краі вымагае ад расейца большае працы, энэргіі і такту, чымся ў цэнтральных губэрнях. Самое жыцьцё ў павятовым горадзе ці бедным мястэчку, удалечыні ад усяго роднага, сярод людзей, чужых вераю і перакананьнямі, а вельмі часта проста варожых, мала цешыць. Па-за службай жыцьцё расейскага чыноўніка, поўнае неспакою і непрыемнасьцяў, абмяжоўваецца вузкімі*

рамкамі сямейнага альбо таварыскага кола.
Словам, нашэсьце расейскага адміністрацыйнага рэсурсу адбывалася нібы само па сабе, а нацыянальная ідэя сьпялілася сама па сабе. Гэта былі два радыкальна варожыя лягеры. Пры сутыкненьні адбываўся выбух. Але, уяўляючы цяпер грамадзкую атмасфэру ў тагачаснай Беларусі, вернемся да нацыянальнага праекту.
За аснову яго была абраная беларушчына – мова і звычаёвая культура тагачаснага сялянства і зьбяднелае шляхты. Інакш кажучы, тых, хто не палянізаваўся, не зьбіраўся і русіфікавацца. Гаворка ідзе пра нацыянальныя адметнасьці, якія гатовыя стаць матэрыялам для нацыянальнага праекту, але самі сабою нічога ня робяць. Бо гэта як частка прыроды, як дзікі куст, які можа высечы захопнік, акультурыць садоўнік, апісаць батанік. З захопнікамі мы ўжо пазнаёміліся, цяпер – чарга садоўнікаў і батанікаў.
Стваральнікі праекту далёка не заўсёды карысталіся беларушчынай. Пачынальнікі, студэнты Віленскага ўнівэрсытэту пачатку XIX ст., аб'яднаныя ў тайныя таварыствы філяматаў і філярэтаў, выхадцы зь беларускае глыбінкі Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Антон Адынец ды іншыя, пісалі па-польску, відаць, таму, што марылі пра літаратурную кар'еру, а беларуская мова тады магла пакінуць іх у шыхтах літаратурных маргіналаў. Тым ня менш, менавіта Міцкевіч у сваёй лекцыі ў Калеж дэ Франс назваў беларускую мову самай чыстай і з усіх славянскіх найменш зьмененай. Ян Чачот сабраў і выдаў некалькі кніг беларускіх народных песень, а Антон Адынец намаўляў Арцёма Вярыгу-Дарэўскага пісаць не па-польску, а па-беларуску, што той і рабіў.
Уласна, гэта і быў самы пачатак нацыянальнага праекту. Пачынальнікі ўяўлялі яго не такім, якім ён выглядае сёньня – што Літва, Беларусь і Ўкраіна стануць асобнымі дзяржавамі, дастаткова адчужанымі міжсобку. Што Вільня – колішняя сталіца ВКЛ – апынецца за візавай мяжой. Што ў Беларусі будзе дзьве дзяржаўныя мовы – беларуская і расейская (а чаму тады яшчэ й ня польская?). Што праваслаўная царква стане дзяржаўнай. Словам, што будуць страчаныя найважнейшыя і найбольш любыя іхнаму сэрцу традыцыі Вялікага Княства: незалежнасьць, адзінства краю і талеранцыя. Тым ня менш, асновы будучае беларускае адметнасьці ў новым сьвеце і

беларускае дзяржаўнасьці заклалі менавіта яны – філяматы і філярэты.
Важна зразумець матывы стварэньня і характар таго першапачатковага праекту Беларусі.
Пасьля падзелаў Рэчы Паспалітае вобраз самаідэнтычнасьці нашых продкаў перастаў існаваць як сацыяльны або палітычны чыньнік. Таму нацыянальнае нараджалася як этычнае. Рамантыкі-пачынальнікі яшчэ памяталі ідылію, але былі расчараваныя найвышэйшымі элітамі, якія спачатку палянізаваліся, а пасьля зь вялікімі капіталамі ўцякалі на Захад. Таму форма новае ідэнтычнасьці была абраная сялянская, «незаплямленая», чыстая. Але паколькі творцамі праекту было дваранства, дык і напаўненьне ён атрымаў не «народніцкае», а шляхецкае – з ідэямі супраціву расейскае анэксіі, русіфікацыі і рабаваньню сядзібаў. Гэтак ад хлапаманства філяматаў, ад захапленьня фальклёрам Чачота, ад лекцыяў Міцкевіча справа дайшла да ідыліі Дуніна-Марцінкевіча. Ідэя сацыяльнага міру на беларускіх землях і была тым праектам, сялянскім паводле формы і шляхецкім паводле зьместу.
Менскі драматург Дунін-Марцінкевіч – бадай, першы, хто робіць літаратурную кар'еру па-беларуску. Разам зь ім на гэтай ніве пачынаюць працаваць яшчэ адзін мянчук Янка Лучына і віленскі юрыст Францішак Багушэвіч, які ўрэшце і піша базавы маніфэст беларускае нацыянальнае ідэі. Менавіта зь ягонае формулы Беларусі на пачатку наступнага, XX ст., адбудзецца сапраўдны бум новага праекту – падхопленага і пашыранага ўжо новым пакаленьнем. Але гэта па-ранейшаму будзе пакаленьне нашчадкаў тых 10 адсоткаў, зьбяднелага дваранства ВКЛ, той маральнае большасьці, якую праз усё XIX ст. расейскай адміністрацыі так і не ўдалося вынішчыць дазваньня. І вось, нібы з рога ўсяго многа, – газэты, кнігі, тэатры, партыі, школы, бажніцы...
Шляхецкую крыўду і прагу супраціву яны па-ранейшаму апраналі ў сялянскую сьвітку, пісалі пра гараваньне да крывавага поту і нішчымную зямельку. Хоць усё гэта была фікцыя. Насамрэч гэта быў плач шляхты па сваёй спадчыннай годнасьці і спадчыннай маёмасьці. Ім трэба быў ужо ня проста вобраз ідыліі. Ім патрэбная была незалежная свая краіна, дзе яны маглі б вярнуць гістарычную справядлівасьць і дзе іхныя

ўнукі ніколі не напішуць пра «ўбогі край», як пішуць яны самі, настойліва пратэстуючы такім чынам супраць расейскае акупацыі.
Трэба зразумець іхны глыбокі этычны пасыл. Яны, натуральна, ведалі расейскую культуру і саму Расею, але ў Расеі іх душа не адгукалася на слова «радзіма». Урэшце, як і ў Польшчы. І ня толькі з фармальных прыкметаў – краявід, мэнтальнасьць, мова. Падзел зьмяшчаўся значна глыбей – у іхным, назавем яго так, сарматызьме і той бясконца любаснай для іхнае душы этыцы збройнага земляўласьніка, прамяні якой даходзілі да іх ад іхных сярэднявечных продкаў і краналі сэрца.
Паспрабуем каротка рэканструяваць гэты вобраз. Сярэднявечны беларускі арыстакрат, незалежна ад маёмаснага становішча і канфэсіі, уяўляў сябе рыцарам Хрыста, які бароніць веру. А таму гэта быў чалавек збройны, які браў у рукі шаблю яшчэ ў дзяцінстве. У тыя часы толькі шляхта мела права насіць зброю, за што ёй даваўся выключны прывілей – толькі яна бараніла сваю дзяржаву, праліваючы кроў. З гэтага вынікала адмысловая сыстэма выхаваньня хлопчыкаў. Беларуская шляхта сьцьвярджала пра сваё паходжаньне наўпрост ад сарматаў, качавых іранскіх плямёнаў Прычарнамор'я. На мяжы XVII і XVIII стст. сарматызм стаў зброяй супраць касмапалітызму ў культуры, то бок супраць вонкавых уплываў. Беларуская шляхта бясконца ваявала. Коштам свае рыцарскае крыві наша арыстакратыя аплачвала свае правы на вольнасьць і рэспубліканскі лад. Калі ў Францыі кароль Людовік XIV мог сказаць: «Дзяржава – гэта я!», дык у нас гэта з поўным правам мог сказаць кожны шляхціц. І тыя, абраныя шляхтаю, каралі былі вартыя свайго рыцарства... Для старавечнага беларуса было б недарэчнасьцю пагаліць вусы, надзець панталёны і парык, як гэта было на Захадзе. У нас для стварэньня адметнасьці ўжываліся самыя надзвычайныя фантазіі і кампіляцыі з каўкаскіх, пэрсідзкіх, турэцкіх матываў. Адныя слуцкія паясы чаго вартыя!.. Яшчэ адным складнікам ідэалёгіі беларускае арыстакратыі была зямля. Высакародны земляўласьнік – ідэал рыцара! Пачуцьцё годнасьці было неаддзельным ад зямлі. Тыя, што пралівалі кроў за сваю зямлю, умелі яе й цаніць, і гаспадарыць на ёй. Родавае гняздо, маярат быў каштоўнасьцю выключнай. За яго трымаліся да апошняга, яго багомілі, рамантызавалі. Зямля продкаў – у

літаральным, вузкім сэнсе… Панятак безьзямельнае шляхты зьявіўся вельмі позна, толькі ў XVIII ст., у выніку ўсё тых жа войнаў. Баючыся пазбыцца свайго шляхецтва, гэтыя бедакі змушалі дзяцей вучыць на памяць усю сваю генэалёгію, каб не прапасьці… Наступнай адметнасьцю арыстакратыі была яе высокая адукаванасьць. Прынамсі, кожны шляхціц, нават шарачок, быў пісьменны і ведаў лаціну… Арыстакратыя заўсёды знаходзіла між сабою агульную мову, не зважаючы на розьніцу вызнаньняў. Аднак паміж мужчынамі-арыстакратамі, нягледзячы на ўсё іхнае братаньне, існавала складаная сыстэма гіерархіі й адпаведнага этыкету. Перад кім здымаць шапку, каму ціснуць руку, а каму цалаваць, каму ківаць, а перад кім складацца да зямлі – гэта была мудрагелістая навука. Пагатоў, трэба было дакладна ведаць тытулы, званьні, заслугі. Гэта вывучалася ў паходах і на соймах. Памылковае прывітаньне было абразаю… Істотным складнікам беларускага арыстакратычнага мэнталітэту было падкрэсьлена паважлівае стаўленьне да кабет, мала падобнае да куртуазнае культуры Заходняе Эўропы, пагатоў да расейскага дамастрою. У нашых «сарматаў» усё выходзіла натуральна. Шляхціц, які вяртаўся з татарскага палону ці з паходу на швэдаў, быў зусім не гатовы да сэрэнадаў альбо букетаў. Не вучылі куртуазнаму абыходжаньню ані ў сям'і, ані ў школах. А вось ліставаньне ўхвалялася. Нашая арыстакратыя пакінула немалую эпісталярную любоўную спадчыну… Жанчыну (бабцю, маці, жонку) блізу што багомілі, раўнуючы іхны цнатлівы вобраз зь Дзевай Марыяй. Менавіта жанчыны перахоўвалі старыя звычаі ды сямейныя паданьні. Ва ўмовах, калі большасьць мужчынаў непазьбежна гінула ў росквіце сілаў на войнах, на жанчыну лягаў увесь цяжар клопату за дом і за дзяцей. Каб у сьвет пайшло чарговае пакаленьне арыстакратаў, высакародных земляўласьнікаў, якія будуць бараніць сваю дзяржаву й сваю зямлю.

За стагодзьдзі вобраз уласнае ідэнтычнасьці дасягнуў дасканаласьці. І тых, што прыйшлі ў праект на пачатку XX ст., гэты вобраз злучаў, нібы нейкая таемная повязь. Таемная, бо яны не маглі казаць пра свае маёмасныя і тытульныя правы народу, які б папросту не зразумеў іх. А якраз народ быў галоўным носьбітам той культуры, зь якой яны меркавалі зрабіць сваю краіну. Парадокс паміж крыўдаю дваранiна і

хлапаманіяй быў закладзены ў праект яшчэ філяматамі і філярэтамі, а затым падтрыманы наступнікамі. А прычынаю парадоксу была прысутнасьць трэцяга чыньніка – каляніяльнае адміністрацыі зь яе русіфікатарскай палітыкай, якая аднолькава варожа ставілася як да шляхецкае годнасьці, так і да беларушчыны сялянства. Пачатак ХХ ст. паставіў нашых адраджэнцаў перад адсутнасьцю выбару. Магчыма, у душы яны хацелі мець сваю зусім нармальную, «буржуазную» Беларусь. Але, каб схіліць на свой бок народныя масы ў атмасфэры гарачага дыханьня расейскіх рэвалюцыйных закалотаў, ім заставалася толькі адно – сацыялізм.

І тады яны пачынаюць уласную тугу і нядолю абяртаць у формы нядолі сялянскае. Плач, плач і плач гучыць са старонак газэт і з тэатральнае сцэны. Аб цяжкай долі мужыка, аб убогай і беднай роднай старонцы, аб роднай мове і аб усёй Беларусі. Дысанансам чуваць галасы нэафітаў зь сялянства ці Максіма Багдановіча, які вырас і жыве недзе ў Расеі. Маўляў, ды што ж вы плачаце, калі трэба адстойваць свае правы, калі такая прыгажэнная ў нас краіна, калі такая гарманічная і прыгожая мова і ўся наша фантастычная Беларусь. Не, яны проста нэафіты, і таму не разумеюць, што насамрэч хаваецца за нашым плачам...

Іншы раз нэафіты – найбольш таленавітыя зь іх – разумелі, што пад лічынаю камунізму ў Беларусь пракрадаецца ня што іншае, як старая знаёмая русіфікацыя. Калі старэйшыя ідэолягі прымалі гэта як дадзенасьць, дык для маладзейшых гэта было адкрыцьцё. Вось як апісвае яго філёзаф новае, але яшчэ дасавецкае хвалі Ігнат Абдзіраловіч (Канчэўскі):

Усход не прызнаваў нас як беларусаў, а вымагаў ад нас прыняцьця свайго ўсходняга выгляду, які, па ўсходняму разуменьню, быў абавязковым. «Славянские ручьи солются в русском море» – вось як падгрунтоўвалася абавязковасьць абмаскаліцца. З гэтага вынікае гвалт і ўціск нашае індывідуальнасьці, з гэтага – гвалтоўнае жаданьне адняць наш твар. Яны не ўцямлялі, што разам зь беларушчынай мы трацім і лепшую частку чалавечнасьці.

Адначасова з гэтым пісаўся пасаж Максіма Гарэцкага ў аповесьці «Дзьве душы», дзе аўтар гаворыць вуснамі сваёй гераіні:

– Прыгожы матыў «Інтэрнацыяналу», але пакуль ён не пабуджае

ў маёй душы ўяўленьня гора або радасьці абы-якой «інтэрнацыянальнай» грамады людзей, пакуль такой грамады сярод нацый на зямным клубку я ня відзела й ня знаю – патуль мне больш чаго кажаць матыў нашай мужыцкай беларускай марсэльезы, з матывам каторай мне ўяўляецца бясконцы, цярнёвы, крывавы шлях к інтэрнацыяналу майго няшчаснага народу...

Памаўчаўшы і трошку спакайней, але зь яшчэ вялікшай тугой у голасе дзяўчына казала далей:

– Праўда, мне і з тым, і з тым матывам аднолькава ўяўляецца тое трагічнае і нялепае для нас, адраджоных беларусаў, што чужыя для нас людзі, не заўважаючы на сабе яшчэ ня скінутай імі сваёй нацыянальнай прапітанасьці, прыйшлі да нас з інтэрнацыяналам толькі на вуснах, зь яго толькі фікцыяй у сваіх мазгох, і з фанатычнай безьміласэрнасьцю ўзяліся рабіць зь беларускай нацыі толькі гной на градкі для ўзрашчываньня сваёй фікцыі інтэрнацыяналу. О, будзь яны прокляты! – узварушоным голасам, з горам крыкнула яна. – Яны хочуць зрабіць адзнакі сваёй нацыянальнасьці інтэрнацыяналам для нас, – дык дзякуй за ласку... Можа, трапім увайсьці ў інтэрнацыянал як роўныя з усімі, бяз гэтай дадатковай формы разьвіцьця!

Аднак гэтыя сумневы маладых інтэлектуалаў не атрымалі якога-небудзь пашырэньня. Што да сялянскіх масаў, дык яны, ясная рэч, хутчэй купляюцца на гораснае суперажываньне, чымся на заклікі да барацьбы. Зрэшты, чалавек увогуле больш цэніць спагаду, чым заклікі.

Такім чынам, рэкрутаваныя ў праект шырокія сялянскія масы прынялі яго беларускую форму, зразумеўшы ягоны зьмест як крыўду і супраціў не шляхецкія, а пралетарскія. Праз закалоты рэвалюцыі і грамадзянскае вайны адбываецца імклівая пралетарызацыя першапачатковага праекту. У беларусаў ужо нямала ўласных палітыкаў, якія трымаюць нос па ветры і робяць стаўкі. Калі становіцца зразумела, што стварыць уласную і зусім незалежную краіну, а галоўнае – вырваць яе ў бальшавікоў – ім ня хопіць сілы, тады яны пачынаюць саветызаваць праект, падладжваць яго пад новыя савецкія парадкі. Для масаў, якія атрымліваюць нацыянальную адукацыю ў гэты час, акцэнт плачу і скаргі мусіць быць зьменены на іншы, пазытыўны. Такім акцэнтам становіцца

камунізм.
Гэта ня лёзунг, а новы характар усяго праекту. Беларусь паміж Першай і Другой сусьветнымі войнамі падзеленая на Ўсходнюю – БССР – і Заходнюю – што далучаная да буржуазнае Польшчы. Але характар беларушчыны зьмяняецца і там, і там. У чым сутнасьць? У БССР у 1920-я гады праводзіцца так званая беларусізацыя. За ёй, хоць і не татальна, стаяць усё тыя ж нашчадкі шляхты, маральнае большасьці. Наўрад ці яны паверылі ў рэальнасьць савецкага нацыянальнага адраджэньня. Яны думаюць перахітрыць гэтую чарговую акупацыю і нават скарыстацца зь яе. Усё ж такі самастойная БССР са сваімі органамі ўлады, сыстэмай адукацыі і гэтай вось беларусізацыяй – бліжэй да ажыцьцяўленьня праекту, чым раней. Зь іншага боку, ці падтрымаюць маскоўскія таварышы наша нацыянальнае адраджэньне, калі яно па сутнасьці ня будзе камуністычным і прамаскоўскім? Зразумела, не. Таму дзеля будучых дывідэндаў можна і паступіцца, правесьці знак роўнасьці паміж беларушчынай і камунізмам.
Так яны думаюць, тым часам наваствораныя формы дзяржаўнага існаваньня напаўняюцца масамі, вядома ж, пралетарскага паходжаньня. Масам падабаецца думаць пра сьветлую будучыню, і патрэбу беларусізавацца яны калі і ўспрымаюць, дык толькі праз гэткую прызму: беларушчына – гэта камунізм.
Падобную палітыку, толькі са сваімі матывамі, праводзіць падпольны беларускі актыў у Заходняй Беларусі, пад Польшчай. Урэшце, ім, можа, і прасьцей было б арганізаваць нацыянальна-вызваленчы рух у чыстым выглядзе, але... Хто б гэты рух фундаваў? А Масква гатовая даваць грошы толькі пад камуністычную дзейнасьць – хай сабе і ў беларускай абгортцы. І потым яна, Масква, разам зь Менскам, назасылала ў Заходнюю Беларусь масу сваіх агітатараў, змагацца зь якімі, ды яшчэ ў падпольлі, няма сілаў. А яшчэ гэтае магутнае дыханьне шчасьлівае Краіны Саветаў пад бокам, якое аж заварожвае простага заходнебеларускага селяніна... Урэшце, народ і краіна рана ці позна мусяць быць узьяднаныя, а тут і сьляпому відаць, што ўзьяднаньне адбудзецца не пад Польшчай. Словам, заходнебеларускія адраджэнцы, хто лёгка, а хто зь цяжкім сэрцам, уплятаюць у праект новую чырвоную нітку – камунізм.
У выніку на Крэсах Усходніх нараджаецца новае вызначэньне:

беларус – значыць, бальшавік.
Можа быць, хітрасьць нашых праектантаў і спрацавала б некалі, і дала б нейкі іншы плён, калі б хоць аднаму зь іх удалося перажыць гады 1930-я. Паляваньне пачалося з раскулачваньня, пасьля высылаліся ў ГУЛАГ і расстрэльваліся цэлыя акадэмічныя інстытуты. За адну толькі ноч НКУС у Менску паставіла да сьценкі дваццаць паэтаў. Гэта рэкорд – у іншыя дні расстрэльвалі па пяць–сем. Быў дазваньня прачасаны ўвесь дзяржаўны апарат. Гэта ў сталіцы і абласьцях, «на месцах» нават не складалі пратаколаў, нібы выконвалі і перавыконвалі пляны «нарыхтовак». Тлустую кропку паставілі ў 1939-м, у далучанай да БССР Заходняй Беларусі. Там у эшалёны інтэлігенцыю заганялі аблавамі…
Што яны маглі сказаць на допытах? Што яны невінаватыя? Што яны будавалі камунізм? Што іхнае паходжаньне – не дваранскае, ня дробнабуржуазнае? Што яны ня марылі пра сваю асобную краіну?.. Мабыць жа, і казалі такое, толькі не было ім веры.
У 1930-я гады праект Беларусь радыкальна зьмяніў сваіх носьбітаў. Тыя, хто прыдумаў яго, нашчадкі шляхты, маральнае большасьці, 10 адсоткаў, якія ведалі таямніцу, глыбока ў сэрцах хавалі памяць пра сарматызм і крыўду сваіх продкаў на адабраную годнасьць і маёмасьць, перасталі існаваць. Усе сьведкі ранейшага «беззаганнага зачацьця» былі забітыя, пайшлі на катаргу, зьехалі ў беззваротную эміграцыю. Засталіся тыя, для каго адпраўной формулай праекту была «беларус – значыць, бальшавік». Ім належала пасьля вайны наноў перапісаць праект Беларусь.
І яны перапісалі ўсю гісторыю краіны. Маўляў, зьявілася на сьвет Беларусь дзякуючы пралетарскай рэвалюцыі, а датуль не было нічога, апроч цяжкае долі мужыка, каўтуна і лапцей. Маўляў, толькі за саветамі і ў братняй сям'і народаў беларусы набылі сваю дзяржаўнасьць і магчымасьць разьвіваць сваю індустрыю, калгасы і культуру. Новы праект моцна патыхаў пралетарскім духам, самапрыніжэньнем перад вялікай расейшчынай і абсалютным гістарычна-прававым нігілізмам. Ён пустаслоўна ўзьвялічваў тых хлопаў, мужыкоў ды пралетароў, у разьліку на якіх ствараўся калісьці філяматамі, Каліноўскім ды Янкам Купалам, і апошнімі словамі паносіў любыя прыкметы арыстакратызму, дваранства, чыстае красы і

нацыянальнае тоеснасьці. Камунізм стаў стрыжнем нацыянальнае ідэі, а саветызм – галоўнай адзнакай беларускага народу. Далей уся сыстэма выхаваньня, адукацыі і дзяржаўнае ідэалёгіі раскручвала толькі гэты вобраз: беларус – значыць, бальшавік. І ў такім выглядзе праект Беларусь у масавай сьвядомасьці дачыкільгаў да нашых дзён.
Ёсьць, натуральна, і іншыя прачытаньні. Са зьнішчэньнем тых 10 адсоткаў насельніцтва ня зьніклі сьведчаньні іхнае дзейнасьці. Што дазваляе нам зразумець іх, як, зрэшты, і тое, што хлапаманства па-ранейшаму спрацоўвае, асабліва пры сёньняшнім палітычным рэжыме. Праўда, мы ўжо разумеем і тое, што нацыянальны праект мусіць быць дужы сам па сабе і абапірацца на арыстакратыю грамадзтва, а не на сацыяльную большасьць. Прынамсі, такім шляхам ідуць суседнія зь Беларусьсю краіны, нацыянальныя праекты якіх пачыналіся адначасова з нашым.
Што да будучыні беларускага нацыянальнага праекту, дык тут магчымыя два варыянты разьвіцьця – актыўны і пасіўны. Першы магла б ажыцьцявіць дзяржава і моцная нацыянальная эліта, другі ажыцьцяўляецца сам.
Першы – гэта суд над камунізмам, накшталт Нюрнбэрскага працэсу ў Нямеччыне.
Нюрнбэрг для немцаў стаў працэсам хірургічным. А менавіта – на месца нацыянал-сацыялісцкага стрыжня ў нямецкую сьвядомасьць быў ужыўлены стрыжань пакаяньня. Кожны немец адчуў сябе асабіста вінаватым. І тая вінаватасьць перадаецца з пакаленьня ў пакаленьне. Можна безь перабольшаньня сказаць, што ніхто так не асуджаў немцаў, як яны асуджалі сябе самі. Гэта і было праўдзівае пакаяньне, якое адначасова вызваліла, ачысьціла душу, дазволіла з галавой заняцца сваёй краінай – абноўленай Нямеччынай.
У беларусаў замест свайго Нюрнбэргу і пакаяньня засталіся сотні расстрэльных ямаў НКУС па ўсёй краіне, стагнацыя і крыўда на немцаў, маўляў, мы, пераможцы, жывём горш за пераможаных. Беларусы ахвотна эмігруюць у Нямеччыну, адваротнага працэсу няма і ня можа быць. Беларусы, нават тыя, што прымаюць ідэю суду над камунізмам, часьцяком рашуча адмаўляюць ідэю пакаяньня. А перад кім гэта і за што мы павінны каяцца? Ды не перад кім. Перад кім каяліся немцы? Гаворка ідзе пра хірургічны працэс – пра замену таго стрыжня

нацыянальнае тоеснасьці – камунізму, – які замінае нам жыць ня горш за пераможаных. У гэтым сэнсе беларусам, можа быць, як нікому, патрэбны другі Нюрнбэрг. У Беларусі, як нідзе, складаюцца сёньня перадумовы для такога суду. Вяртаньне савецкіх парадкаў, рэпрэсіі людзей за іхныя палітычныя пераканаьні, непавага да прыватнае ўласнасьці і свабоды слова. Досьвед Нямеччыны паказаў, што выдаленьне пухліны «бальшавік» з самаідэнтыфікацыйнага слова «беларус» і пераход да этыкі пакаяньня – ці ня самы прадуктыўны для нацыі і краіны шлях.

Аднак для такога суду спатрэбілася б вялікая палітычная воля і дзяржавы, і элітаў нацыі.

Што да пасіўнага варыянту, дык ён выглядае так. Сёньня нельга сказаць, што беларускі нацыянальны праект ажыцьцявіўся ў гэткай ступені, як у суседніх краінах. Адначасова сам час стварэньня і ажыцьцяўленьня такіх праектаў незваротна мінуў. Той сьвет, у якім існуе і зь якога вылучаецца сваёй нацыянальнай недавершанасьцю Беларусь, жыве ўжо іншымі клопатамі, куды кожны прыйшоў з тым, з чым прыйшоў. Тут ніхто ня будзе аспрэчваць патрэбнасьці культуры, а адсутнасьць нацыянальнае адметнасьці народу, які названы і прызнаны як такі, успрымаецца хіба як мавэтон. Не сакрэт, што большасьць людзей, якія езьдзяць на сучасных машынах, цьмяна ўяўляюць сабе ўсе асаблівасьці будовы рухавіка, а тыя, што карыстаюцца Інтэрнэтам, могуць нічога ня ведаць пра элемэнтарныя законы перадачы току. У сучасным сьвеце, у якім існуе Беларусь, нацыянальныя праекты спакваля пераходзяць у катэгорыю такіх вось асаблівасьцяў будовы, прынцыпаў работы і элемэнтарных законаў. Гэтым займаецца вузкае кола спэцыялістаў. Што да шырокіх масаў народу, дык для іх актуальным застаецца этычны аспэкт праблемы. Але і тут мы маем справу са зьмененым сьветам. Проста кажучы, адмаўленьне ад свае мовы і культуры, ад свае ідэнтычнасьці можа быць параўнанае з узроўнем асабістае гігіены ці грамадзкае санітарыі. Нездарма абсалютная большасьць беларусаў, карыстаючыся ў жыцьці вулічным варыянтам расейскае мовы, інтуітыўна называюць у апытаньнях саміх сябе беларусамі, а сваёй роднай мовай – беларускую. Інтуітыўна, бо насуперак ідэалёгіі і палітыцы цяперашняга палітычнага рэжыму, яны выбіраюць эўрапейскі тып цывілізацыі, дзе ня

быць сабою сёньня і незразумела, і непрыстойна.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

АЛЕСЬ АРКУШ

Алесь Аркуш Маё Жодзіна

ПЕРШЫ САМВЫДАЎ

Свой першы самвыдаў я зрабіў у Жодзіне. На дварэ стаяў 1983 год.

Вярнуўшыся з войска, я падаўся ў наргас. Як большасьць студэнтаў-жодзінцаў, езьдзіў на заняткі электрычкай. На першым курсе БДІНГ набыў просьценькую, самую танную друкарку «Москва» і вечарамі «перастукваў» сваю паэзію (на той час друкарку можна было мець ужо без рэгістрацыі ў органах). На пачатку 1980-х я належаў да кола маладых паэтаў, якія гуртаваліся вакол часопісу «Рабочая смена» (неўзабаве ён стаў «Парусом», а затым і зусім зьнік). Алеся Аркуша яшчэ не было, а Аляксандар Козік пісаў па-расейску. Сярод іншых «рабочасьменаўцаў» наперш згадваецца Вера Лойка, цяперашняя жонка вядомага паэта Леаніда Галубовіча. Яна, дарэчы, і дала мне адрас «вельмі таленавітага» хлопца зь вёскі Вароніна, зь якім я меў надзвычай інтэнсіўнае ліставаньне.

Было гэта, праўда, пазьней – у 1986 годзе. Сама ж Вера пазнаёмілася зь «беларускім Рубцовым» толькі праз год у Маскве ў літінстытуце – у Белакаменнай яны й пабраліся шлюбам. У 1986-м у паветры ўжо лунаў дух «вызваленьня». У 1983-м сытуацыя была іншая.

Мая першая публікацыя ў «Рабочей смене» рыхтавалася вельмі марудна. Зьявілася яна ў верасьнёўскім нумары за 1983 год. Пісаў я пераважна вэрлібры пад уплывам менскага расейскамоўнага паэта Валер'я Ліпневіча. Стаміўшыся чакаць «вялікага» дэбюту (дагэтуль мяне друкавалі толькі шматтыражкі БелАЗу «Белорусский автозаводец» і наргасу «Экономист»), я вырашыў самастойна «выдаць» свой першы зборнік паэзіі. Называўся ён «Дыхания». Наклад рабіўся на друкарцы з дапамогай капіркі. Збрашуравала саматужныя зборнічкі знаёмая маёй маці ў белазаўскай друкарні. Вядома, таемна.

Сёньня той зборнік чытаю з усьмешкай, хаця вытокі паэзіі Алеся Аркуша ў ім добра прасочваюцца. Падставы для тае амбіцыі былі слабаваценькія, але набыты «скарынаўскі» досьвед ня зьнік бясьсьледна. Напрыканцы 1980-х у Наваполацку амаль у такі ж спосаб я пачаў выдаваць літаратурны альманах «Ксэракс Беларускі».

ПОШУК
ВЫТОКАЎ
У 1993 годзе
мне
закарцела
адшукаць
свае
жодзінскія
вытокі. Я
напісаў эсэ
«Мой
нязьдзейсьнены
Ёкнапатофа».
Тэкст гэты,
праявіўшы
нечуваную
талеранцыю,
надрукаваў

орган Жодзінскага гарадзкога Савету народных дэпутатаў «Жодзінскія навіны». Сёньня наўрад ці нешта падобнае магло б зьявіцца на старонках тае газэты. Варта прывесьці невялікі твор цалкам:

Калі час ад часу я наяжджаю ў Жодынь (так называла горад майго дзяцінства мая родная бабуля, якая амаль усё жыцьцё пражыла ў вёсцы Арлова, што за дванаццаць кілямэтраў ад сёньняшняй белазаўскай агароджы), я кожны раз па-іншаму згадваю свае дзіцячыя і юначыя гады. Праўда, у маіх успамінах заўсёды адсутнічаюць шчымлівыя настальгічныя ноткі.

Я не ідэалізую свайго дзяцінства. Хапала ў ім рознага, пэўна, як у дзяцінстве любога чалавека. Аднак чагосьці прыкметна-ўрбаністычнага ў ім не было ані каліва. Мае бацькі жылі і жывуць цяпер у самай старой і даволі аддаленай ад цэнтру гораду частцы Жодыня, як яе называюць жодыньцы, – пасёлку ДРЭС. Мусіць, калі б я стаў празаікам, я абавязкова напісаў бы кнігу пра жыцьцё гэтай населенай кропкі. Штосьці сярэдняе паміж гумарам Шукшына і сур'ёзнасьцю Фолкнэра (памятаеце ягоны ўяўны гарадок Ёкнапатофа?). Калярытных герояў на ДРЭСе знайшлося б на добры тузін аповесьцяў… Аднак я стаў паэтам. Чаму? На гэтае пытаньне не адкажа ніхто. На ўсё воля божая. Але нейкія пазасьвядомыя вытокі майго паэтычнага нараджэньня можна прасачыць.

Напрыканцы 1980-х у беларускую літаратуру нарэшце прыйшлі выхаванцы гораду. Яны ўпарта падкрэсьлівалі сваю «гарадзковасьць». У паэзіі і прозе пачаў прабівацца кволы парастак беларускай урбаністычнай літаратуры. Зьявіліся вершы пра тэлевежу, мікрараёны, бітум, гарадзкую вуліцу. Гэта не было «бурапенства» будаўнікоў сьветлага заўтра, як некалі ў «маладнякоўцаў» 1920-х гадоў. Гарадчукі 1980-х спрабавалі выштукаваць сваю адмысловую эстэтыку, эстэтыку асфальту й бэтону. Яны шукалі прыгажосьць на тлумных гарадзкіх вуліцах. Яны разумелі, што горад – іх наканаванасьць, ад яго нікуды ня дзецца. Таму трэба творча «ператраўляць» яго, прыстасаваць для паўнакроўнага жыцьця. Літаратары, гараджане другога-трэцяга пакаленьня, пачалі ствараць сваю плынь. І хаця па ўсіх біяграфічных анкетах паэт Алесь Аркуш лічыўся «прадуктам гораду», аднак літаратурныя крытыкі ніколі яго не далучалі да «ўрбаністаў». Ну які гэта ўрбанізм?

Над балотам захад сонца.
Пасярод, нібыта рана,
Багны дрогкае акенца
Чырванее. За парканам
З трысьнягу, аеру, хлуду
Цішыня – як погляд Бога,
Быццам там чакаюць цудаў
Ці даўно няма нікога.

Гэтак сама Аркуша нельга занесьці ў вясковыя «традыцыяналісты». Няма ў яго вершаў пра касцоў, аратых, росныя раніцы. Ягоныя вершы задужа ідэалістычныя. Сапраўды, маё дзяцінства нельга назваць ані вясковым, ані гарадзкім. Самота ціхага пасёлку прызвычаіла мяне да кнігі, да ідэалістычнага сузіраньня, да адзіноты. Любімым месцам баўленьня часу была навакольная прырода – рэчка Пліса, возера Судабаль, лясы ў ваколіцы Зялёнага бору (нездарма пазьней блізу тых лясоў пабудавалі сваё лецішча мае бацькі). Менавіта там я адчуваў душэўную разьняволенасьць, знаходзіў паразуменьне з навакольным сьветам. Мусіць, у тыя хвіліны душэўнага разьняволеньня і нарадзіўся паэт Алесь Аркуш. Але далейшы мой лёс не дае падставаў для падобнага меркаваньня. Так было ў дзяцінстве, калі я мог не зьвяртаць увагі на горад Жодынь, ігнараваць яго прысутнасьць. Дарослым юнаком абстрагавацца ад яго існаваньня было немагчыма. Родны горад

быў задужа рацыяналістычным, як мэліярацыйная канава, у яго не было культурных традыцый. Час сузіраньня скончыўся, прыйшла пара дзеяць, зьдзяйсьняць задуманае, жыць так, як я лічыў найбольш патрэбным, а ня так, як прымушала плынь жыцьцёвых падзеяў. І таму Жодынь проста выпхнуў за свае межы паэта Алеся Аркуша (дарэчы, мой літаратурны псэўданім зьявіўся, напэўна, дзеля таго, каб схавацца ад сумнай будзёншчыны, пазбавіць уяўнага паэта Аркуша ад непажаданых сутыкненьняў з жорсткай таталітарнай навакольнай рэчаіснасьцю).

Козік даў Аркушу шанец на нонканфармізм. Ён пазбавіў апошняга ад усяго руціннага і бруднага. Праўда, Аркуш ня быў сьляпым, і таму ў яго паэзіі столькі надрыву і расчараваньняў. Аркушу ня трэба было прыстасоўвацца да хцівага жыцьця. Яму ня трэба было думаць пра ганарары. Ён проста пісаў вершы. Сёньня хтосьці іх называе філязафічнымі, хтосьці эстэцкімі. Ён аказаўся вышэйшым за падзел на вёску і горад.

Жодынь Аркуша выпхнуў, падабраў Полацак. Пераезд у Полацак стаўся чарговым нонканфармісцкім крокам да творчай і духоўнай незалежнасьці. Старажытны, легендарны Полацак не сустракае паэтаў пірагамі з сочывам, але ён абавязкова непрыкметна «прышчэпіць» чалавеку пачуцьцё патрэбнасьці ягонага творчага самараскрыцьця. Ён мудры – Полацак. Ён заўсёды прыцягвае да сябе патрэбных людзей, і ня толькі зь беларускіх земляў – але і з Польшчы, Нямеччыны, Галяндыі, Францыі, Швэцыі.

Раней «варагі» рабіліся выкладчыкамі ў Полацкай езуіцкай акадэміі, адначасова працуючы на карысьць усёй Полацкай зямлі. Гэтак было, і гэтак зноў робіцца. Полацак дазволіў Алесю Аркушу заснаваць выдавецкую суполку «Полацкае ляда», выдаваць кнігі і андэграўндны альманах «Ксэракс Беларускі», дазволіў стварыць альтэрнатыўнае Саюзу пісьменьнікаў Беларусі Таварыства вольных літаратараў, у якое ўвайшлі пісьменьнікі з усёй рэспублікі. Сёе-тое пакрысе зьдзяйсьняецца зь яго задумаў. І, дзякуй Богу, цяпер гэта ня лічыцца злачынствам, і КДБ, напэўна, ужо за ім ня сочыць. Бо паэт існуе ня толькі, каб пісаць вершы, але і для таго, каб матэрыялізаваць свае, на першы погляд, вар'яцкія ўяўленьні аб годнасьці, волі, справядлівасьці. Ня кожнаму гэта зразумела. Нехта зноў згадае ідэалізм. Сапраўды, дух – нешта ідэальнае,

асабліва высокі дух. Пры слове «дух» я заўсёды згадваю аблокі. Жодынь, са сваёй караценькай, у большай частцы ідэалягічнай, гісторыяй, пакуль не разумее сэнсу дальнабачнай палітыкі вялікага Полацку. Ён яшчэ не ўсьведамляе сябе як штосьці цэльнае, са сваімі інтарэсамі і сваёю годнасьцю. Гораду без нацыянальных традыцый яшчэ доўга прыйдзецца пазбаўляцца путаў былога таталітарызму, «вытраўляць» правінцыйнае таўро. Яшчэ ня хутка зьявяцца тут друкарні, нацыянальны тэатар, літаратурнае жыцьцё.

Але ўжо трэба пра гэта марыць. Недзе тут сёньня нараджаецца новы паэт, які застанецца на сваёй малой радзіме.

Вось такое крыху наіўнае эсэ. Але яго высновы і сёньня гучаць актуальна.

МАСТАКОЎСКАЕ
АСЯРОДЗЬДЗЕ

У Жодзіне
1970–1980-х
гадоў я ня
меў ніякага
літаратурнага
асяродзьдзя.
Гэта мяне
прыгнятала.
Затое вакол
было шмат
мастакоў –
мой
стрыечны
брат Сяргей
Казлоўскі
(ён стаў
архітэктарам),
браты
Андруковічы,
браты
Ступаковы,
Толя Чычын,
Уладзімер
Гладкевіч (у
традыцыйных

джонленанаўскіх (круглых) акулярах), Праскуракоў Юры Фёдаравіч, сябры звалі яго Юфам, паводле першых літараў імя і імя па бацьку, бо быў ён старэйшы за іх усіх. Гэтыя хлопцы-аматары маляваньня, за выключэньнем Чычына і Гладкевіча, жылі на ДРЭСе. Пэрыядычна жодзінскія мастакі рабілі выставы ў фае кінатэатру «Юность». Я перад кінасэансам зь цікавасьцю разглядаў іх карціны. Зь

некаторымі
мастакамі-
студэнтамі
амаль
штодзень
езьдзіў
электрычкай
у Менск на
заняткі.
Існавала
стракатая
студэнцкая
электрычкаўская
сябрына. У
дарозе быў
час і
пагаманіць, і
ў карты
згуляць, і
піва выпіць,
і канспэкт
пачытаць.
Мне было
цікава з
мастакамі.
Пад іх
уплывам
пачаў
хадзіць на
выставы ў
менскі
Палац
мастацтва.
Спадабаліся:
Мікалай
Селяшчук,
Валеры
Славук,
Уладзімер
Савіч.

Пазьней у
выставачных
залях
зьявіўся
нефігуратыўны,
авангардны
жывапіс, але
мне па-
ранейшаму
падабаўся
Селяшчук.
Неяк
выпадкова
даведаўся,
што разам
зь
Селешчуком
у тэатралцы
вучыўся
Праскуракоў,
ён нават зь
Міколам
жыў у
адным
студэнцкім
пакоі. Пачаў
распытваць
пра
любімага
мастака.
Даведаўся,
што
Селяшчук
быў
упартым і
працавітым
шкаляром,
любіў
мастацтва
прыбалтыйскіх

рэспублік,
штолета
туды
езьдзіў. У
красавіку
1985 году я
патрапіў у
яго
майстэрню
разам зь
сябрамі
чырваназьменаўскага
літаб'яднаньня
«Крыніцы»,
якім
кіравала
Раіса
Баравікова.
Былі Шніп,
Славамір
Адамовіч,
Дзьмітрук…
Амаль усе
карціны,
якія
паказваў
Мікола,
аказаліся
знаёмыя па
выставах.
Запомнілася,
як Селяшчук
апавядаў
пра пакуту
першага
мазка
пэндзлем:
спачатку ён
доўга хадзіў
вакол

чыстага
палатна,
баяўся
парушыць
яго
цнатлівасьць,
усялякім
чынам
адцягваў
гэтую
хвіліну – піў
гарбату,
думаў,
нешта
згадваў –
рыхтаваўся,
як спартовец
перад
заліковай
спробай…

У траўні таго ж году адбылася цудоўная выстава групоўкі Селяшчук–Савіч–Славук–Тоўсьцік–Альшэўскі–Янушкевіч–Ксяндзоў. Я быў у захапленьні. Ад Праскуракова даведаўся, што Славук мае жодзінскія сувязі. Выстава ягоных працаў была арганізавана ў Жодзінскім палітэхнікуме, у якім я вучыўся да войска. Сёньняшняя клясыка беларускай графікі вісела без нагляду на сьценах пашарпаных калідораў. Да таго ж бацькі Славука на той час жылі ў пасёлку Зялёны Бор, куды мастаку зь Менску трэба было дабірацца праз Жодзіна. Яшчэ большыя сувязі з маім родным горадам меў Ксяндзоў. З 1963 году ён там жыў, вучыўся ў СШ № 2 і № 4, пачаў маляваць у студыі Алеся Марачкіна, які ў той час таксама жыў у Жодзіне і выкладаў маляваньне ў СШ № 4. Але гэта былі людзі зусім іншага пакаленьня, зусім зь іншага раёну гораду – мне не знаёмыя. З Марачкіным я пазнаёмлюся пазьней – у Полацку, на адкрыцьці яго пэрсанальнай выставы ў тагачаснай гарадзкой мастацкай галерэі, якая месьцілася ў Богаяўленскім саборы. А з Ксяндзовым толькі пазалетась – на прэзэнтацыі ў полацкай мастацкай галерэі выставы «Майстар і майстры (Гаўрыла

Вашчанка і вучні)».
«Дрэсаўская» мастацкая «рунь» мела свайго «гуру» – Анатоля Шыбікіна, настаўніка маляваньня нашай СШ № 1. Мастак-аматар, вайсковец-адстаўнік, ён штолета наладжваў для сваіх вучняў-студыйцаў пленэры-выправы. Неяк мастацкая сябрына на чале зь дзядзькам Анатолем пару тыдняў жыла на хутары майго дзеда. Вядома, тое адбылося не без удзелу стрыечнага брата Сяргея. Мае знаёмцы-мастакі былі ўсе расейскамоўныя, нацпытаньне сярод нас не закраналася нават у прыватных размовах, прынамсі, я такога ня памятаю. Гэта ў другой палове 1980-х (у Жодзіне мяне тады ўжо не было) хваля нацабуджэньня дасягнула тамтэйшага мастацкага асяродку. Прынамсі, браты Андруковічы, Канстанцін і Мікалай, сталі сябрамі суполкі мастакоў «Пагоня».
Лёсы «дрэсаўскай багемы» склаліся па-рознаму. У Наваполацак, яшчэ раней за мяне, пераехаў Коля Ступакоў (у тэатралцы ён вучыўся ў адной групе з Адамам Глёбусам). Зрабіў некалькі росьпісаў і мазаічных пано на будынках нафтаграду. У мастацкім жыцьці Полаччыны практычна ня ўдзельнічаў, неўзабаве мастацтва закінуў увогуле. Не хапіла амбіцыяў? Глёбус казаў мне, што Коля быў хлопцам здольным і арыгінальным.
На адной з калектыўных выставаў у Палацы мастацтва я набыў карціну Селешчука «Дзяўчына з Палесься», якая і сёньня ўпрыгожвае маю полацкую кватэру. Патраціў амаль палову грошай, зароблены у будатрадзе.

БЕЛАРУСКІ
ВУПРАЖНЫ

Неяк
атрымаў
журналісцкае
заданьне ў
«Рабочей
смене»:
напісаць пра
жодзінскі
конезавод
«Зарэчча».
Знаходзіцца
ён побач з

пасёлкам ДРЭС: перайшоў масток праз Плісу – і да канторы гаспадаркі рукой дастаць. Сустрэў мяне адзін з сэлекцыянэраў беларускага вупражнога каня Ўладзімер Гладэнка. Ён адказаў на мае пытаньні і падараваў сваю кнігу «Белорусская лошадь» (Менск, 1976). Кніга пачынаецца з апісаньня паходжаньня тутэйшых коней:

Паводле хронік XII–XIII стст. у Полацку, Тураве, Менску, Берасьці адбіралі найбольш моцных буланых («палавыя коні») для фармаваньня конных палкоў («харугваў»)… Мэтадам народнай сэлекцыі выведзены абарыгенныя коні (лясны, палескі, беларускі), якія адпавядалі гаспадарчым патрэбам чалавека… У беларускіх коней чэрап карацейшы, але шырэйшы, чым у коней мангольскага кораня… За апошнія 100 гадоў конь (беларускі вупражны. – **Аўт.**) *выводзіўся мэтадам складанага вытворніцкага скрыжоўваньня жарабцоў заводзкіх пародаў з абарыгеннымі*

лясного тыпу маткамі і наступным разьвядзеньнем помесяў «у сабе»…

Пасьля сустрэчы з Гладэнкам мы з братам Віктарам наладзілі фатасэсію для беларускіх вупражных. Нядаўна тыя нэгатывы і здымкі я адшукаў. Цікавы матэрыял. Мой артыкул пра коней у «Рабочей смене» зарэзалі, затое надрукавалі ў «Чырвонай змене».

Беларускі вупражны конь. «БелАЗ». Ёсьць тут пэўная пераемнасьць. Прынамсі, у слове «беларускі» і ў прызначэньні – «перавозіць цяжкія грузы».

КАРЫСНЫ
ВЫКАПЕНЬ

У другой
палове ХХ
стагодзьдзя
Жодзіна
імкліва
ўварвалася ў
«эліту»
беларускіх
гарадоў.
Адбылося
гэта
дзякуючы
будаўніцтву
Беларускага
аўтамабільнага
заводу. На
лёс
невялічкага
мястэчка
паўплывалі
дзьве
акалічнасьці:
яго
месцазнаходжаньне
– на шляху з
Масквы ў
Эўропу – і
тутэйшыя

балоты зь іх
багатымі
радовішчамі
торфу.
Спачатку ў
Жодзіне
зьявілася
чыгуначная
станцыя,
затым, з
улікам
транспартных
выгодаў і
навакольных
пакладаў
торфу,
электрастанцыя
на беразе
ракі Плісы,
затым –
завод
тарфянога
машынабудаваньня
«Торфмаш»,
які
неўзабаве і
ператварыўся
ў БелАЗ. Усе
гэтыя этапы
станаўленьня
Жодзіна
шчыльна
пераплеценыя
зь лёсам
маёй сям'і:
мой дзед,
Антон Козік,
быў
начальнікам
чыгуначнай

станцыі
(прызначаны
ў 1938
годзе), мае
бацькі амаль
палову
жыцьця
аддалі
працы на
Жодзінскай
ЦЭЦ, а я сам
нейкі час
працаваў у
канструктарскім
аддзеле
БелАЗу. У
Жодзіне
ёсьць помнік
жодзінскаму
самаскіду.
Лічу, варта
жодзінцам
ушанаваць і
галоўны
беларускі
карысны
выкапень –
торф.
Дзякуючы
яму, няхай
сабе і
ўскосна,
Жодзіна
дасягнула
росквіту.
Сымбалічна,
што імя ракі
Плісы, на
берагох якой
стаіць мой

горад
дзяцінства,
мае балцкі
корань і
перакладаецца
як «балота».
Акрамя
Плісы
шанавалі
мы,
дрэсаўскія
падлеткі, і
возера
Судабаль, на
якім днямі
прападалі з
вудамі – тут
цудоўна
лавіліся
карасі. У
прыбярэжных
хмызох
хавалі
чаўны,
грузілі на іх
свае ровары,
на якіх
дабіраліся
да возера
(ад дому
кілямэтры
чатыры), і
амаль на
цэлы дзень
сплывалі ў
бяскрайнія
аеравыя
«джунглі».
Возера
няўхільна

зарастала,
глыбіня
вады ў ім
ледзь
дасягала
паўмэтру –
далей твань.
У 1980-х з
Судабалі
пачалі
здабываць
сапрапэлі,
якія
выкарыстоўваюцца
ў сельскай
гаспадарцы
ў якасьці
ўгнаеньня і
дамешку ў
корм
жывёле, –
вялізны
земснарад
пампаваў
тую твань па
трубах на
адмысловыя
пляцы для
сушэньня. А
неўзабаве
беларускія
газэты
пачалі
пісаць пра
цудадзейныя
мэдычныя
якасьці
судабальскай
гразі.
Высьветлілася,

што
Судабаль –
адзінае
возера ў
Беларусі,
якое
адпавядае
ўсім 33
пунктам
мэдычных
патрабаваньняў
да лекавых
сапрапэляў.
Гразь з
майго
возера
пачалі
цыстэрнамі
вазіць у
Менск у
гразелячэбніцы.
Вось такія
яны –
балоты ў
ваколіцах
Жодзіна.

Жодзінская ЦЭЦ (за маім дзяцінствам яна называлася Смалявіцкая ДРЭС) першапачаткова працавала на торфе. Яго вазілі цеплавозы па вузкакалейках з навакольных торфапрадпрыемстваў. Аднойчы мне пашчасьціла пракаціцца па торфачыгунцы. Адзін месяц лета я звычайна праводзіў у піянерскім лягеры «Чайка», які належаў СмалДРЭСу. Месьціцца ён на беразе Плісы за некалькі кілямэтраў ад гораду. Ці ня самае запамінальнае ўражаньне тых гадоў – вандроўка на возера Пясочнае. Да пасёлку Зялёны Бор дабіраліся «дрэсаўскім» цягнічком на адмысловых адкрытых плятформах, прыстасаваных для перавозкі людзей. Некалькі гадоў таму на падобным цеплавозіку мне ладзілі экскурсію ў польскую частку Белавескай пушчы. (Гайнаўская калейка засталася яшчэ ад

пачатку XX стагодзьдзя – ёй немцы вывозілі лес з пушчы.) Тады і згадалася мая дзіцячая вандроўка на Пясочнае.

У 1980-я жодзінская электрастанцыя перайшла на мазут і газ, вузкакалейку на Зялёны Бор разабралі. Шкада! Сёньня можна было б прыстасаваць яе для турыстычных патрэбаў. І ня толькі… Зважаючы на апошнія паліўна-энэргетычныя канфлікты з Расеяй і прагнозы на сусьветную нафтавую нішчымніцу напрыканцы нашага стагодзьдзя, варта было б вузкакалейкі аднавіць. Ну не «БелАЗамі» ж вазіць торф на электрастанцыі і хімічныя прадпрыемствы!

ЖОДЗІНСКІ
МІТ
Доўгі час
гісторыя
гораду
майго
дзяцінства
пачынала
сваё
летазьлічэньне
з 1963 году,
калі
гарадзкому
пасёлку
Жодзіна быў
нададзены
статус
гораду
абласнога
падпарадкаваньня.
За апошнія
пяць гадоў
беларускія
гісторыкі і
краязнаўцы,
добра
папрацаваўшы
ў архівах,
выявілі
больш

шляхетны радавод гораду. Вынікам гэтай працы стала выданьне кнігі г. І. Аніскевіч «Жодино: история и современность» (Менск, 2003). Сёньняшні міт Жодзіна «прывязаны» да клясычнага полацкага. Па-першае, прызнана, што адпачатку гэта было крывіцкае паселішча, бо ў X–XIII стст. землі па берагох Плісы ўваходзілі ў склад Полацкага княства. Па-другое, канчаткова замацавана ў мясцовай краязнаўчай

літаратуры,
што назва
гораду
паходзіць ад
назвы
рачулкі
Жодзінка,
якая ўпадае
ў Плісу.

Таксама дакумэнтальна пацьверджана, што мястэчка на сутоку Жодзінкі і Плісы заснаваў князь Багуслаў Радзівіл. З клясычнай гарадзкой структурай плянаваньня: у цэнтры – рынкавы пляц з царквой і крамамі, ад якога разыходзяцца вуліцы.
Упершыню ў пісьмовых крыніцах Жодзіна згадваецца ў інвэнтары маёнтку Смалявічы за 1643 год пад назвай Багуслава Поле. Трэба меркаваць, што паўстала яно на месцы ранейшага невялікага селішча з назваю Жодынь (або Жодзін), з часам старая назва перамагла новую. Яго месца адшукаў гісторык і археоляг Міхась Ткачоў, які ў 1960-х гадох жыў у Жодзіне і выкладаў гісторыю ў СШ № 3. У 1970-х ён правёў некалькі археалягічных дасьледаваньняў у межах гораду і выявіў сьляды селішча эпохі раньняга жалеза на высокім правым беразе Плісы – амаль на тэрыторыі СмалДРЭС. А пры ўпадзеньні Жодзінкі ў Плісу знайшліся рэшткі селішча часоў Полацкага княства. У невялікім культурным пласьце, ад 30 да 50 сантымэтраў, траплялася кераміка XI–XIII стст. Усе пералічаныя тут мясьціны – прастора майго дзяцінства. А на сутоку Жодзінкі і Плісы я любіў лавіць рыбу.
Дачыненьне да Жодзіна мае яшчэ адзін вядомы гісторык і археоляг – Мікалай Крывальцэвіч. Ён выхоўваўся ў Жодзінскай школе-інтэрнаце.
Каб замацавацца ў беларускай старажытнай гісторыі, жодзінцы плянуюць усталяваць помнік заснавальніку гораду – князю Багуславу Радзівілу.

ЖОДЗІНСКІЯ
АМБІЦЫІ
У
караценькай
біяграфіі

для сайту
«litara.net» я
назваў
Жодзіна,
месца
свайго
нараджэньня,
самым
амбітным
горадам
Беларусі.
Падстава
для гэткага
сьцьверджаньня
сур'ёзная:
Жодзіна
выпускае на
канвэеры
самыя
вялікія
аўтамабілі
на нашым
кантынэнце.
З кнігі
Аніскевіч я
даведаўся,
што ў
Жодзіне ў
1991 годзе
быў сабраны
самы вялікі
на той час у
сьвеце (!)
кар'ерны
самаскід
«БелАЗ»
грузападымальнасьцю
280 тонаў, а
цяпер
канструктары

аўтазаводу
працуюць
над 300-
тоньнікам.
Ці не праява
амбіцыяў!
Бо ўласна
для Беларусі
такія
самаскіды
не
патрэбныя –
мы ня маем
вялікіх
кар’ерных
распрацовак
каштоўных
выкапняў.
Над
праектамі
падобных
аўтагігантаў
сёньня
працуюць
толькі
аўтамабільныя
канцэрны
ЗША і
Японіі.
Вялікагрузныя
самаскіды
амаль як
касьмічныя
караблі, яны
пад завязку
напічканыя
электронікай.
І каштуюць
адпаведна –
мільёны

даляраў.

Торф стаўся толькі штуршком да развою Жодзіна. На ім былі зароблены першыя дывідэнды: атрыманы ўласныя кіляваты электраэнэргіі, ад торфапрадпрыемстваў паступілі замовы на вытворчасьць торфаздабывальнай тэхнікі і абсталяваньня. У выніку зьявіліся працоўныя месцы – і моладзь з навакольных вёсак масава пацягнулася ў былое мястэчка. Жодзінскі праект у 1960-х пачаў шукаць свой уласны шлях. Хто мог падумаць, што ім стане вытворчасьць кар'ерных самаскідаў і аэрадромных цягачоў?

ПАХ
ЛЯДАНУ Ў
БІБЛІЯТЭЦЫ
Жодзіна
ніколі не
было
цэнтрам
культурнага
і духоўнага
жыцьця
беларускага
краю.
Багуслава
Поле за
часамі
Радзівілаў –
гэта невякае
паселішча з
двума
вадзянымі
млынамі,
дзьвюма
драўлянымі
цэрквамі,
сядзібамі
рамесьнікаў
ды
некалькімі
корчмамі.

На сярэдзіну XX стагодзьдзя ў Жодзіне «ад старыны» захавалася толькі драўляная Міхайлаўская царква, якая была разбураная ў 1962 годзе. Старое царковішча зь велічнымі стогадовымі ліпамі было маім любімым месцам у горадзе. Сёньня ад тых ліп амаль нічога не засталося. Ужо дарослым я даведаўся, што ахрышчаны я быў у доме настаяцеля Сьвята-Міхайлаўскай царквы. Вядома,

таемна. У 1966-м у папоўскім доме зрабілі дзіцячую бібліятэку. Менавіта яна стала маёй першай бібліятэкай, якую і сёньня я згадваю з удзячнасьцю. Скрыпучыя масьнічыны, кніжныя паліцы, на якіх дазвалялі самому выбіраць кнігі, дзіўны прыемны пах (сёньня я разумею – гэта «спадчынны» пах васковых сьвечак і кадзільнага лядану).

ВЯДОМЫЯ ЖОДЗІНЦЫ

Жодзіна дала Беларусі шмат вядомых людзей. Літаратурай і выдаўцом стаў Уладзімер Сіўчыкаў, мастакамі – Мікалай Канстанцін Андруковічы, Уладзімер Гладкевіч, архітэктарамі – Сяргей Казлоўскі[1] і Аляксандар Трухін[2]. Сяргей Казлоўскі[1] – начальнікам

Сярод вядомых жодзінцаў асобнае месца займае Дзмітрый Сямёнаў, які ў 1990 годзе ў сямнаццацігадовым узросце выдатна адагнаў самалёт у Стакгольм. Студэнт жодзінскага палітэхнікуму набыў білет на рэйс Менск–Мурманск і дапамогай муляжа гранаты РГ-42 апынуўся ў сталіцы Швецыі. Хлопец, відавочна, быў надзвычай амбітны. Пра яго пісалі газэты. Зарабіўшы сабе скандальнае імя, Дзіма стаў мастаком і, пасьля непрацяглага турэмнага зьняволеньня (Швэцыя выдала СССР тэрарыста з умовай несуворага пакараньня непаўналетняга), скіраваўся на Захад за прыгодамі пэндзлем.

[2] Аляксандар Трухін – аўтар праекту царквы ў гонар абраза Маці Божай Менскай (Менск, Чыжоўка, асьвячоная ў 2000 г.) і шэрагу іншых праектаў праваслаўных культавых будынкаў, дыплямант нацыянальных архітэктурных фэстываляў у 2000 і 2003 гг.

Жыцьцяпіс, 2004

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

Мінулыя (1’2000)

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
эсэістыка [image]2005
Пачатак • Навіны • Форум • Пошук • Аўтары • Цалкам • Іншае

адцураўся
мовы нашай
беларускай,
але варта
прызнаць,
што
беларускамоўны
літаратар
мае, мякка
кажучы,
нашмат
меншую
аўдыторыю,
чым ягоны
расейскамоўны
калега.
Мяркую,
што па-
беларуску
пішуць
альбо з
прычыны
моўнага
патрыятызму,
альбо калі
хочацца ролі
вялікай, хай
сабе і ў
малой
літаратуры, г.
зн. з
прычыны
ўсведамлення
сціпласці
эвентуальнай
місіі ў
суседняй
літаратуры.

Калі амбіцыі лічацца задаволенымі? Калі ёсць *прызнанне* ў

вузкіх колах спецыялістаў і/ці *вядомасць* у шырокіх колах грамадства (пры ўмове, што амбіцыі наогул магчыма задаволіць). Вядомасць я б параўнала з ярлыком на працоўным стале камп'ютара: карцінка ёсць, але за ёй пустэча. Зразумела ж, прасцей дасягнуць вядомасці, прынамсі, пры яе «гадаванні» талент арганізатара важнейшы за талент літаратара.

У часы панавання СМІ літаратурны працэс мае ўсе магчымасці для ўцягвання ў сябе чытачоў і нечытачоў (нават насуперак іх жаданню), і таму паспяховы піяршчык сам ёсць крыніцай інфармацыі пра сябе: можна самавольна і беспакарана запісацца ў сэкс-сімвалы тысячагоддзя ці найвыбітнейшыя беларускія пісьменнікі (дарэчы, у айчыннай літаратуры больш-менш паспяхова піярыліся ці піярацца – у алфавітным парадку – З. Вішнёў, Адам Глобус, А. Курэйчык, с. Патаранскі).

Гэткае «самагенераванне» звестак – наша даўняя традыцыя: досыць часта самае важкае слова пра твор і ўдзел аўтара ў літаратурным працэсе кажуць не крытыкі, а самі аўтары. Яны паведамляюць калялітаратурнай грамадскасці пра ўсе алюзіі-паралелізмы (а раптам не здагадаюцца, не заўважаць інтэлектуальных высілкаў), адзначаюць сваіх настаўнікаў у літаратуры, каб павярхоўныя крытыкі кінуліся шукаць прыхаваныя адсылкі да «гуру».

Чаму журналісты ці крытыкі *паўтараюць* за аўтарам? Ад жадання схавацца за чыёсьці меркаванне, нават меркаванне зацікаўленай асобы? У міні-рэцэнзіях часта змяшчаюць кавалак анатацыі. Анатацыі, у якой пры жаданні можна прыпісаць сабе Нобелеўскую прэмію за 1981 год. Перабольшваю, але літаратура ў нас амбітная.

Пакуль расейскія літаратуразнаўцы і крытыкі абураюцца наплывам няякаснай літаратуры, у нас падчас публічных дыскусій з гонарам адзначаецца, што беларуская літаратура не заплямі́ла сябе бульварным чытвом. Смага – нішто, імідж – усё! Тут варта згадаць Сяргея Кавалёва, які 15 гадоў таму ў кнізе «Партрэт шкла» заўважыў: «Усе, або амаль усе, творы (беларускай літаратуры – **Аўт.**) аўтаматычна заносяцца ў спіс высокага, сапраўднага мастацтва». Гм, чым беларуская літаратура заўжды адзначалася, дык гэта *стабільнасцю іміджу*. Напісаныя за апошнія дзесяцігоддзі творы ў жанрах масавай літаратуры выявіліся бясшкоднымі для іміджу нацыянальнай літаратуры, бо засталіся неразрэкламаванымі – а таму

незаўважанымі?
А што трэба зрабіць, каб заўважылі? Каб прачыталі твор? Каб запомнілі аўтара? Ёсць выбар: чакаць ці змагацца. Як змагацца? Згуртавацца і напісаць маніфест! Балюча ўспрымаецца найперш абыякавасць старэйшых калег, якія больш ахвотна і палка адгукаюцца не столькі на творы, колькі на магчымую «бойку пакаленняў». Нагадвае ксенафобію: дастаткова намёку на непавагу, крывога позірку, каб справакаваць неадэкватную рэакцыю. Так што маніфест – вялікая спакуса: творы напішуцца пазней, магчыма, не рэвалюцыйныя, але будзе ўжо немалы набытак – імя і «сапсаваная» рэпутацыя, з якімі цікавасць выклічуць любыя тэксты. Такі вось курс паскоранага развіцця для маладога літаратара.
Самае цікавае, што калі б мае раўналеткі пісалі маніфест і трэба было б выдумаць папрокі папярэднікам (а для нас гэта якраз і ёсць пакаленне «Тутэйшых», якое я шчыра люблю), мы маглі б запазычыць фрагменты з Маніхвэсту «Тутэйшых»: «Яны (папярэднікі, «прыкарытныя» – **Аўт.**) прагледзелі, як сканала мова ў вуснах народу».
Кожнае новае пакаленне прыходзіць з жаданнем стварыць новую літаратуру, з крытыкай тых, хто быў да яго (хай сабе не заўсёды публічна агучанай). «Яны натужна і назольна спекулююць на сваім вясковым паходжанні», – было адзначана ў Маніхвэсце «Тутэйшых». А мы маглі б лёгка дапісаць – на гарадскім паходжанні, Чарнобылі, палітыцы, багацці, беднасці, эротыцы, эрудыцыі… Можна працягваць бясконца і падкрэсліваць патрэбнае.
Але рэвалюцыянеры чарговай генерацыі не ведаюць, што праз якое дзесяцігоддзе ці нават раней, апынуўшыся ў асяроддзі людзей, супраць чыёй пазіцыі некалі паўставалі, яны (калі яны не закончаныя цынікі) будуць звязаныя па руках і нагах «матчынай мовай», павагай да старэйшых таварышаў, якія «так шмат зрабілі для літаратуры», і ўласным клопатам. І аднойчы з іх вуснаў пачуецца пафаснае: «Наша родная літаратура…» Сіла традыцыі мацнейшая за зямное прыцягненне.
Ды што там казаць… Нават сярод маіх раўналеткаў ёсць прыхільнікі «антыкварнай» рыторыкі наконт роднай мовы і не менш роднай літаратуры («Радзіма–Маці–Беларусь»), хаця відавочна, што гэта неперспектыўны, неактуальны і – што самае важнае – нядзейсны шлях папулярызацыі беларушчыны.

Але папулярызацыя ў нашым кантэксце непарыўна звязаная з ахвяраваннем. Лепей мець рэпутацыю аўтара кволых філасафічных аповесцяў, чым стваральніка бліскучых дамскіх раманаў. Усё-ткі сапраўдны поспех для сучаснага беларускага пісьменніка – патрапіць у школьную праграму, каб мець гарантыю, што творы будуць прачытаныя. Вось і выбіраюць некаторыя мастакі важныя тэмы (звычайна пафасна-патрыятычныя, адраджэнскія), нават не маючы дастатковага таленту для іх раскрыцця. Мяркую, праз амбітнасць пісьменнікаў мы маем надзвычай мала беларускамоўных твораў у жанрах масавай літаратуры (мне нагадаюць, што ёсць і матэрыяльны фактар, маўляў, калі б замовілі, дык і напісалі б. Не адмаўляю, але і не перабольшваю яго значэнне). Гэта так лагічна – напісаць твор, які пры пэўных умовах можа займець зайздросны лёс. А свядома аддаваць час і талент на забаўку? Не па-беларуску...

А як суаднесці амбіцыі і ўзрост, амбіцыі і час? Пазнаёміўшыся больш падрабязна з гісторыяй еўрапейскіх (у тым ліку беларускіх) літаратурных суполак, я заўважыла, што надзвычай рэдка літаратурны гурток аб'ядноўвае раўналеткаў, адно дэмаграфічнае пакаленне. З моладдзю ўсё відавочна: разам уваходзяць у літаратуру, прыцягваюць увагу, ствараюць сабе творчае асяроддзе. А што робяць у нібыта моладзевых суполках людзі сталыя? Не ведаю. І нават само слова «амбіцыі» міжволі звязваю з людзьмі маладымі, якія могуць марыць, адарваўшыся ад зямлі. Хаця, магчыма, тут я раблю тую ж памылку, што і крытык Сяргей Грышкевіч, – не паверыў паэту Анатолю Дэбішу, што каханню падуладныя ўсе ўзросты.

І ўсё ж... Калі аўтар у 20 гадоў піша рамантычна-агрэсіўны маніфест, спляжыўшы беларускую літаратуру, на яго можна глядзець паблажліва і спадзявацца на хуткае перавыхаванне пад настойлівым уплывам старэйшых калег. А калі ў 50 гадоў? Пішучы дыпломную працу пра «Тутэйшых», я адчувала сябе няўтульна ў шкуры нібыта суддзі. Яны, маладыя і амбітныя, ставілі сабе задачу-максімум, прынамсі, на словах. А цяпер, амаль праз 20 гадоў, як ацаніць зробленае? Што можна сказаць пра чалавека, які тады быў «зоркай» і пры іншых паводзінах мог адыграць важную ролю ў гісторыі краіны, але спраўдзіўся ў амплуа асацыяльнага элемента? Як паставіцца да кнігі, якую тагачасная крытыка называла надзвычай таленавітай, але мела

шэраг прэтэнзій, выправіўшы якія аўтар мог бы з поўным правам лічыцца геніяльным? А цяпер высвятляецца, што аўтар больш нічога і не напісаў, і што *толькі чалавечыя слабасці мацнейшыя за чалавечыя амбіцыі*...

Напэўна, можна было б сказаць папярэднікам: «Чаму вы не зрабілі болей? Чаму мы прыходзім у літаратуру, шмат у чым паўтараючы вашыя лёсы? Чаму нічога кардынальна не змянілася для літаратуры і ў літаратуры?» І стрымлівае толькі правіла забароны з сінергетыкі: нічога нельга змяніць тады і там, дзе нічога нельга змяніць. І амбіцыі тут бездапаможныя...

* * *

Дзень добры, Алесь Барысавіч [Козік]!

Мне было вельмі прыемна атрымаць ад вас такі разгорнуты адказ на мой артыкул. Але з некаторымі пунктамі я не згодная, таму таксама адказваю. У нашых тэкстах моцна адчуваецца прыналежнасць да розных пакаленняў (так і павінна быць). На гэтыя адрозненні ва ўспрыманні, дасведчанасці і поглядах цікава паглядзець збоку (нібыта збоку).

Калі вы кажаце пра тое, што бел. мову ведаеце лепей за рускую, то гэта наяўны факт. У мяне з мовамі тое самае. Але я пішу, хутчэй, пра той момант, калі творца, выхаваны ў расейскамоўным асяроддзі, вырашае звярнуцца да беларускай мовы. Дарэчы, у гутарцы са мной У. Сіўчыкаў падкрэсліваў якраз той факт, што ён нарадзіўся і вырас у расейскамоўным горадзе. А вы ж былі суседзямі. І, відаць, таксама прайшлі этап выбару мовы.

Калі я кажу пра ўсведамленне сціплай ролі ў суседняй літаратуры, то маю на ўвазе яшчэ і надзею на больш-менш заўважную ролю ў літаратуры айчыннай (беларускамоўнай). Гэта і ёсць згаданае вамі жаданне «недзе прысутнічаць». Я прызнаю, што сама вінаватая ў дрэнным фармуляванні сваіх думак.

Вы пішаце пра колішнюю магчымасць ездзіць у санаторыі літфонду. А для мяне і майго пакалення гэта так далёка, як гісторыя ВКЛ.

Вы вельмі правільна адзначаеце неабходнасць нараджэння ў тыя часы таварыства «Тутэйшыя». Я цяпер прасочваю гісторыю еўрапейскіх суполак XX стагоддзя, і ў 80 % выпадкаў іх узнікненне было выклікана пэўнымі гістарычнымі падзеямі.

Але пачатак стагоддзя быў гістарычна больш насычаным, адсюль і тагачасная, магчыма, зайздросная для нас заўзятасць у літпрацэсе.
Наконт масавай літаратуры. Нядаўна ў нейкай газеце («АиФ», здаецца) прачытала інтэрвію з прадзюсарам В. Тадароўскім, які зазначыў: «Кінематографы, якія адмовіліся забаўляць гледача, загінулі». І прывёў прыклад – сітуацыю ў Італіі. Я мяркую, што гэтае сцверджанне вельмі актуальнае і для літаратуры. Вы маглі заўважыць, што, імкнучыся папярэдзіць такія папрокі, я ў артыкуле пісала «жанры масавай літаратуры», а не «масавая літаратура». Увесну, на штогадовым свяце ў Вязынцы, якое ладзіць наш факультэт, я правяла апытанне сярод студэнтаў і выкладчыкаў на тэму «Якіх твораў вам не хапае ў беларускай літаратуры?». Адказ атрымаўся такім: бракуе інтэлектуальных твораў у жанрах масавай літаратуры.
Згаданы вамі Акунін усё ж мае дачыненне да культурнага дыскурсу, як Чхарцішвілі. Падобнай дваістасці (тут можна і У. Эка згадаць) вымагае час. Але ў нас іншая сітуацыя. Шмат ужо пісалі пра тое, што беларускамоўны жаночы раман сваім статусам быў бы вышэйшы за расейскамоўны з прычыны, так бы мовіць, элітарнасці мовы.
Вы пішаце, што трагедыя Сыса-чалавека не мае дачынення да Сыса-паэта. Так, згодная, але яна мае дачыненне да тэмы «Беларускія амбіцыі».
Мушу напісаць крамольную рэч: пра «Тутэйшых» ведаюць яны самі і старэйшыя за іх пакаленні з калялітаратурнай грамадскасці. Бо для астатняй Беларусі іх проста не было, яны прайшлі незаўважанымі. НІХТО з маіх аднакурснікаў не ведаў пра іх (на што я спачатку крыўдзілася), я доўга тлумачыла, хто яны і калі ўтварыліся. Гэта, аднак, не значыць, што там няма чаго даследаваць, як спрабавалі мяне пераканаць некаторыя старэйшыя калегі. Але тое, што я збіралася даследаваць, трэба было вымываць, як залаты пясок. Пра «Тутэйшых» публікацый у друку менеў, чым пра ТВЛ ці «Бум-Бам-Літ». Таму я і была вымушана збіраць прыватныя сведчанні.
Дазволю сабе нелірычнае адхіленне. 11 верасня 2001 г., калі адбыліся вядомыя падзеі ў Амерыцы, я была на стажыроўцы ў Польшчы і не мела доступу да тэлебачання. І ўвесь гэты жах прайшоў міма мяне. Я не разумела, чаму мама, калі я патэлефанавала дадому, пачала казаць пра трагедыю ў

Амерыцы. Мой аднакласнік у гэты час у Нью-Ёрку пралазіў на ачэпленую тэрыторыю (турыст-экстрэмал) і шпацыраваў па шчыкалатку ў попеле. Дык вось, у яго таксама не ўзнікла ўражання эпахальнасці падзеі.
Адсюль жахлівая выснова: мала зрабіць – трэба разрэкламаваць, абвясціць усім пра зробленае. І не адзін раз замацаваць эфект. Несправядліва? Так.
Для літаратурнага працэсу рэкламай ёсць, вядома ж, не расцяжка над праспектам, а падручнік, манаграфія, якоесь грунтоўнае выданне, пажадана саліднага аўтара. І таму для пераважнай большасці студэнтаў філфаку Сыс – ніхто. Я, напрыклад, ведаю пра яго паводле ўспамінаў ягоных сучаснікаў. Аднойчы на канферэнцыі пасля майго выступу маладыя выкладчыцы пачалі прыгадваць розныя гісторыі пра яго, а вось студэнткі слухалі і даклад, і ўспаміны як абсалютна новую інфармацыю.
Так, у нас чытаюцца лекцыі па сучаснай літаратуры, але ў іх немагчыма закрануць усю літаратуру. Паводле вас Сыс скача вышэй за ўсіх, але для студэнтаў Сыс – гэта прозвішча праз коску ў аглядавай лекцыі. Пра яго няма грунтоўнага даследавання, якое б яго ўзнясло і назаўжды «прапісала» ў літпрацэсе. Сыс – гэта вусная гісторыя. Я разумею г. Вінярскага з «Беларускага кнігазбору», якому не падабалася, што пра пакаленне «Тутэйшых» піша чалавек, які не належаў да самога пакалення, таму што я ніколі не ацаню Сыса так высока, як гэта можа зрабіць ягоны колішні паплечнік. А вы самі адзначалі, што ніхто не піша ўспамінаў пра «Тутэйшых». Затое дзённікі многія вялі і захавалі, але ці будуць калі-небудзь друкаваць, не ведаю. Спадзяюся, што сваёй кніжкай я што-небудзь зрушыла ў гэтым кірунку.
Вы мяне папракнулі, што як літкрытык я мушу ўсведамляць, што ў сваім часе яны былі найлепшымі. І, здавалася б, справядлівы папрок. Але часам я не магу пазбавіцца адчування, што, напісаўшы дысертацыю і выдаўшы паводле яе кнігу, літаратурны працэс ствараю я. Выцягну з пылу маргінальныя суполкі (фон для «Тутэйшых»), сябры якіх ужо самі забыліся пра свой удзел у іх.
А калі пра нейкую падзею ці асобу, хай сабе і вартую, не напісана нічога грунтоўнага, то яны знікнуць у нетрах гісторыі са смерцю сваіх сучаснікаў.

А з Сысом я пазнаёмілася. На жаль. Адна карысць ад знаёмства – апавяданне напісала.
Ух, як вы мяне сваім лістом зачапілі. Даруйце залішнюю эмацыйнасць. Усё-ткі ніколі не бывае зашмат такіх вось абменаў думкамі. Так хочацца крытыкі… І так хочацца рэагаваць на крытыку. Я вам вельмі ўдзячная за такую магчымасць.
А.Б.

* * *

Прывітаньне, Аксана!
Як ні дзіўна будзе для цябе, але я з большасьцю тваіх думак, выкладзеных у гэтым лісьце, пагаджуся. Літаратура сапраўды жыве папулярызацыяй, крытычным прачытаньнем тэкстаў, агучваньнем аўтарскіх думак (некаторыя зь іх шукаюцца між радкоў), пабудовай адмысловых мітаў, кантэкстаў, дыскурсаў. Напрыклад, хто б сёньня ведаў розных Сяргеяў Бабровых і Васіліяў Каменскіх, калі б расейскімі літаратуразнаўцамі ня быў створаны міт пра расейскі футурызм, калі б ня постаць Маякоўскага, для якой трэба было стварыць адпаведны ляндшафт. І хто сёньня чытае Маякоўскага? У сэнсе – захапляецца, любіць, фанацее. Бадай, толькі Зьміцер Вайцюшкевіч. Але міту Маякоўскага і міту расейскага футурызму жыцьцё гарантавана на доўгія гады – мільёны людзей прачытаюць вершы Ул. М. у школе, тысячы на філфаках, выйдуць новыя манаграфіі, біяграфічныя нарысы, літаратуразнаўчыя дасьледаваньні. Сам міт ужо стаўся аб'ектам дасьледаваньня.
Пра Сыса ня ведаюць таму, што літаратуразнаўцы не стварылі міту Сыса. Усе папярэднія спробы (гл. нумары «Крыніцы», «Маладосці» і г. д.) выявіліся няўдалымі. Мне падаецца, што «Тутэйшыя» і ёсьць тло для Сыса (як футурызм для Маякоўскага). Гэта яго жыцьцёвая і творчая прастора, яго ідэалёгія і спадзяваньне, яго рэвалюцыя і любоў. Як толькі «Тутэйшыя» разваліліся, Сыс згубіў практычна ўсё – прастору, у якой жыў, у якой быў маторам, завадатарам; надзею; творчую жарсьць (сьведкам якой я быў асабіста), цягу да літаратуры, разуменьне свайго месца. Ён стаў нікому не патрэбны. Гэтая яго асабістая трагедыя таксама ёсьць часткаю міту Сыса.
Але рэч яшчэ ў тым, што міт Сыса, якім ён мусіць быць (пратэст

супраць заняволенасьці грамадзтва – стварэньне «Тутэйшых» – рэвалюцыйны развой (самвыдат, выступы на мітынгах, удзел у дэманстрацыях) – крах «Тутэйшых» – крах паэта), – гэта частка міту дэмакратычнай Беларусі. Ён паўстане, калі Беларусь пачне ствараць сваю праўдзівую найноўшую гісторыю.
Посьпеху!
P. S. Што датычыцца масавай літаратуры. Насамрэч ужо багата аўтараў, якія спрабуюць штосьці падобнае пісаць (напрыклад, той самы Конеў). Тут трэба ўздымаць пытаньне не пра аўтараў, а пра выдаўцоў. Трэба, каб зьявіўся новы Логвінаў, які б вырашыў зрабіць бізнэс на беларускай масавай літаратуры. Чаму ён не зьяўляецца? Напэўна, таму, што эканамічныя варункі неспрыяльныя. Калі б на белмасліце можна было зарабіць, дык і Глёбус, і Сіўчыкаў даўно б гэтую нішу занялі.
A. A.
23.10.2004

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к № 1 (35) - 2005

[image]

[image]

[image]

[image]2005

паэмыка • эналітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Кірыла Пазьняк Амбіцыі ў беларускай палітыцы – нясьціпласьць розуму?

КІРЫЛА ПАЗЬНЯК
журналіст, намесьнік галоўнага рэдактара інтэрнэт-газэты «Белорусские новости».

Амбіцыі ёсьць ува ўсіх нас – у пісьменьнікаў, якія пішуць не іначай як шэдэўр, у вахцёраў, якія ўладараць на прахадной, нібыта каля эдэмскай брамы, у бацькоў, якія гадуюць вундэркіндаў, у дзяцей, якія як мага хутчэй хочуць стаць дарослымі, у камбайнэра, які хоча намалаціць болей за ўсіх у краіне збожжа і атрымаць на «Дажынках» аўто, у мужчыны, які калекцыянуе жанчын у сваім ложку...

Але ж болей за ўсіх амбіцыяў – у тых, хто круціцца ў палітыцы. Бо гэтыя людзі ўжо прыходзяць туды празь нейкія амбіцыі, а ўжо там у іх зьяўляюцца новыя – так бы мовіць, вытворныя. Дый, зрэшты, без амбіцыяў палітыкаў увогуле не бывае. І нават ня проста без амбіцыяў, а безь вялікіх амбіцыяў.

Што ж такое амбіцыі наагул? Гэта – моцнае жаданьне дамагчыся нейкай канчатковай мэты празь незадаволенасьць сваім месцам у сьвеце. Амбіцыі таго альбо іншага чалавека могуць успрымацца астатнімі як нешта пазытыўнае, як стымул асобы да эвалюцыі, удасканаленьня, як частка сэнсу жыцьця. Але паводле слоўнікаў, амбіцыі – гэта і пачуцьцё годнасьці, і

славалюбства, і фанабэрыя, і пыхлівасьць, і ганарыстасьць. Разам з тым нярэдка амбіцыі ацэньваюцца звонку як нядобрая якасьць чалавека. Гэта калі ў яго ёсьць жаданьне дасягнуць нейкіх вынікаў, чаго б гэта ні каштавала, калі амбітны чалавек дзейнічае паводле прынцыпу «мэта апраўдвае сродкі».
Для яго любая сытуацыя не падаецца безнадзейнай і беспэрспэктыўнай, хаця палітыка – гэта мастацтва мажлівага. Амбітнік не заўважае, як ягонае памкненьне ператвараецца ў празьмернае і надзвычайнае. Тады амбіцыя робіцца нездаровай – ажно да ідэі фікс.
Паводле псыхолягаў, хваравітая амбіцыя – тая, пры якой чалавек зацыклены на вынік. Тады ён пачынае нерэалістычна ацэньваць і свае мажлівасьці, і навакольныя варункі. Таму заўсёды трэба сваю амбіцыю тэставаць. Для палітыкаў гэткай праверкай ёсьць выбары. Але толькі ў тым выпадку, калі іхны вынік аб'ектыўны. Калі ж маюць месца фальсыфікацыі, гэта азначае, што вынік дасягаецца любой цаной. То бок амбіцыя сталася нездаровай.
Як сьведчыць сусьветная гісторыя, часьцяком палітычная кар'ера дыктатараў, якія былі зашораныя ўладнымі амбіцыямі і не маглі сысьці ў пару, канчаецца фіяска. Сьвежыя прыклады – Мілошавіч і Хусэйн.
Беларуская палітыка многім падаецца сумнай і нецікавай. Яна сапраўды малавідовішчная, за выключэньнем хіба што прамоваў прэзыдэнта. Славалюбства робіць чалавека гаваркім, як казаў Артур Шапэнгаўэр. Прычына ж цягамотнасьці беларускай палітыкі палягае ў тым, што яна сама сабою амбіцыя, прычым надта складаная ў ажыцьцяўленьні. Як, зрэшты, і паўнавартасная незалежная дзяржава Беларусь. І ўсе беларускія палітыкі, якія б прарасейскія настроі яны не спавядалі, дзейнічаюць паводле гэтай амбіцыі, натуральна, аздабляючы яе ў той ці іншай ступені сваімі амбіцыйкамі. Гаворка ідзе пра тых палітыкаў, якія працуюць тут і цяпер. Бо ў мінулым стагодзьдзі ёсьць нямала прыкладаў, калі для тутэйшых палітыкаў кіраваньне Беларусьсю не было мэтай. Маю на ўвазе, напрыклад, Юзафа Пілсудзкага, які зрабіўся начальнікам Польшчы.
Яшчэ можна згадаць кіраўніка Камуністычнай партыі БССР Пятра Машэрава, які меў амбіцыі атрымаць высокія партфэлі ў Маскве. Пры канцы 1970-х заходнія аналітыкі сталі казаць пра

тое, што кіраўнік савецкай Беларусі ёсьць галоўным прэтэндэнтам на пасаду старшыні Кабінэту міністраў СССР, а далей – і генэральнага сакратара КПСС. Цікава, што апошнім часам заходнія аналітыкі называюць ягоную дачку Натальлю Машэраву адной з найверагоднейшых прэтэндэнтак на пасаду прэзыдэнта нашай краіны на выбарах 2006 г.: нібыта ейную пэрсаналію можа падтрымаць Крэмль, які шукае альтэрнатыўнага Лукашэнку, але прарасейскага палітыка ў Беларусі.

Дарэчы, Натальля Машэрава, як і многія гісторыкі ды палітолягі, лічыць, што аўтамабільная катастрофа, у якой загінуў у 1980 г. ейны бацька, была зладжаная адмыслова, каб не дапусьціць ягоных пярэбараў зь Менску ў Маскву.

Ад часу аварыі да правядзеньня пленуму ЦК КПСС, на якім Машэраў нібыта мусіў заняць замест Касыгіна пасаду прэм'ер-міністра Савецкага Саюзу, заставалася два тыдні. І нібыта Машэрава «заказала» адна з намэнклятурных груповак уплыву на чале з Брэжневым, які зайздросьціў папулярнасьці беларускага кіраўніка і баяўся канкурэнцыі зь ягонага боку.

У якасьці пацьвярджэньня прыхільнікі гэтай вэрсіі адзначаюць адзін эпізод незадоўга да аўтакатастрофы, у якой загінуў Машэраў. Яму прысвоілі званьне Героя сацыялістычнай працы, але адпаведны мэдаль уручылі толькі праз паўгоду. Прычым не ў Крамлі ў прысутнасьці чальцоў і кандыдатаў у Палітбюро, а сьціпла ў залі прыёмаў ЦК Кампартыі Беларусі.

Зрэшты, гіпотэза аб палітычным забойстве можа быць проста галоўным мітам, якіх гэтак багата вакол постаці Пятра Машэрава. Ня выключана, што тая аўтакатастрофа была проста выпадковай. Яшчэ ёсьць вэрсія, што гэта было мафійнае забойства, арганізаванае міністрам унутраных справаў СССР і сябрам Брэжнева Шчолакавым. Быццам бы матывам для забойства Машэрава стаў скандал на берасьцейскай мытні. На ёй была затрыманая кантрабанда – брыльянты, якія належалі дачцэ Брэжнева Галіне. Машэраву патэлефанавалі з Масквы з просьбай утрэсьці інцыдэнт, але той заўпарціўся. І гэтым падпісаў сабе вырак…

У свой час, як лічаць многія аналітыкі, крамлёўскую амбіцыю меў і Аляксандар Лукашэнка. Але з сыходам з прэзыдэнцкай пасады ў Расеі Ельцына і прыходам да ўлады «піцерскіх» на чале з Пуціным, яна перайшла ў статус нязбыўнай мары.

Зрэшты, у беларускага прэзыдэнта процьма іншых амбіцыяў, зь якіх ён цешыцца і падсілкоўваецца.
Калі Лукашэнка спрэс ува ўсіх сваіх працяглых публічных прамовах банальна заяўляе пра высакародную мэту свайго прэзыдэнцтва – рабіць усё дзеля шчасьця народу, я яму веру. Кажу без усялякай іроніі.
Натуральна, пасада прэзыдэнта дае яму мноства асабістых маральных і мэркантыльных выгодаў – ад уладалюбнай асалоды да густоўнага баўленьня часу. Прыкладам, ну ці езьдзіў бы ён дырэктарам саўгасу коўзацца на горных лыжах у Аўстрыю, ці гуляў бы ў хакей з Паўлам Бурэ, ці сказаў бы яму хто камплімэнт пра тое, што «вы трохі вышэйшы за Бога», як гэта зрабіў нядаўна адзін з абласных начальнікаў?
Але ўсім гэтым Лукашэнка абавязаны выпадковаму выбару беларусаў у 1994 г. Зь першых дзён прэзыдэнцтва і дагэтуль ён імкнуўся зьняпраўдзіць народную прымаўку, якую ў якасьці эпіграфу ў артыкуле, прысьвечаным вынікам выбараў-1994, дала адна рэспубліканская газэта: «Няма горш пана, чым пан з хама».
Гэта – адна з найгалоўнейшых амбіцыяў Лукашэнкі і як палітыка, і як чалавека. Нездарма на прэс-канфэрэнцыі ў гадавіну дзесяцігодзьдзя свайго прэзыдэнцтва ён настойліва пытаўся ў журналістаў іхнай думкі, ці зьмяніўся ён за гэты час. І нездарма яму патрэбныя менавіта элегантныя перамогі. Прычым да канца жыцьця, бо адстаўка будзе значыць паразу. Генры Шоў казаў, што славалюбства як галодны страўнік: яно не падпарадкоўваецца аніякім законам, апрача свайго апэтыту. Адсюль і рэфэрэндум па пытаньні аб праве балятавацца на прэзыдэнта яшчэ як мінімум адзін раз на выбарах у 2006 г. і аб скасаваньні канстытуцыйнай нормы, што адзін чалавек ня можа стаяць на чале дзяржавы болей за два разы.
Паводле ж самога Лукашэнкі гэта для яго не амбіцыя, а фобія: «Я заўсёды з дрыжыкамі думаю: барані Бог, я дзесьці аступлюся ці зраблю дрэнна, што можа нэгатыўна адбіцца на лёсе майго народу, і ён у зьвязку з гэтым скажа: мы цябе абралі, а ты так нас ашукаў. Вось гэта для мяне жудасная думка».
Лукашэнку спынілі ў ягоных крамлёўскіх амбіцыях, хаця сам ён ня мог не адчуваць небясьпекі ператварыцца ў губэрнатара Беларусі. Але ж па ўсім відаць: яму карцела і карціць быць лідэрам сусьветнага маштабу, а ня толькі прэзыдэнтам

невялічкай краіны, хай сабе і ў цэнтры Эўропы. Адгэтуль і ягоныя заўсёдныя палітычныя апэляцыі да мінуўшчыны Савецкага Саюзу як звышдзяржавы, адгэтуль – і супрацьстаяньне са Злучанымі Штатамі Амэрыкі, Эўразьвязам і нават з усёй заходняй цывілізацыяй, якая, паводле Лукашэнкі, чужацкая для беларусаў.

Адзін з пастулятаў найноўшай ідэалёгіі беларускай дзяржавы палягае ў тым, што мы ёсьць пупам нейкай усходнеславянскай, усходнеэўрапейскай цывілізацыі. Паводле беларускага прэзыдэнта,

дзякуючы сваім нацыянальным якасьцям, а менавіта талерантнасьці, памяркоўнасьці, непасьпешлівасьці, абачлівасьці, а таксама гістарычнаму досьведу (беларусы як фарпост Расеі ў выніку кантактаў з Захадам здаўна выпрацавалі імунітэт супраць іншацывілізацыйнага ўплыву), беларускі народ не дае завабіць сябе прыгожай дэмагогіяй пра лібэральныя каштоўнасьці. Па сутнасьці, ува ўсходнеславянскім (калі ўлічыць пражываньне на нашай прасторы і іншых народаў – усходнеэўрапейскім) сьвеце мы засталіся адзінай краінай, якая адкрыта спавядае вернасьць нашым традыцыйным цывілізацыйным каштоўнасьцям. Усё гэта дазваляе казаць, што часам, лёсам, сытуацыяй Беларусь вылучылася на, мабыць, вялікую ролю духоўнага лідэра ўсходнеэўрапейскай цывілізацыі.

Лукашэнку замала быць прэзыдэнтам-функцыяй. Ён ужо ўвайшоў у гісторыю, ягонае імя ўжо дакладна будзе ў беларускіх энцыкляпэдыях і школьных падручніках, а таксама на вулічных шыльдах. Калі, натуральна, будзе існаваць незалежная Беларусь. Інакш грош цана ўсяму ягонаму кіраваньню.

Лукашэнка хоча займацца глябальнымі рэчамі – у тым ліку і ўзьдзеяньнем на мэнталітэт нацыі. На тое і спатрэбілася ідэалёгія. Прычым ейныя асновы прыдумаў ён сам:

Адна справа – асабістая перакананасьць кіраўніка дзяржавы ў неабходнасьці дзяржаўнай ідэалёгіі. Іншае – наяўнасьць вучоных, пісьменьнікаў, журналістаў, творчых і таленавітых асобаў, гатовых не па прымусе ствараць ідэалягічны грунт незалежнай беларускай дзяржавы.

Шмат разоў спрабавалі дзеля гэтых мэтаў задзейнічаць нашую армію дактароў і кандыдатаў навук, навуковыя ўстановы і ВНУ. Прапановаў (аформленых нават у выглядзе салідных

манаграфіяў) было нямала. Але зводзіліся яны да дзьвюх, умоўна кажучы, формулаў: «давайце зробім як на Захадзе» альбо «давайце вернемся да савецкай практыкі».
Цалкам няздольным аказаўся і наш ідэалягічны штаб – Адміністрацыя прэзыдэнта. Нарады, даручэньні, аўтарскія калектывы, справаздачы – і нічога на выхадзе. Той самы фармалізм. І ў гэтых умовах кіраўніку дзяржавы давялося браць усё на сябе і, ідучы ад жыцьця, а не ад тэорыі, закладаць у фундамэнт беларускай незалежнай дзяржавы ідэі, народжаныя і выпакутаваныя нашым народам. Відаць, была свая лёгіка ў тым, што якраз першы прэзыдэнт вастрэй і дакладней успрымаў выпакутаваныя грамадзтвам ідэі і спадзевы людзей.
Больш за тое: «Па сутнасьці, першым маніфэстам беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі стала ў сярэдзіне 1990-х мая перадвыбарная праграма, хаця там толькі схематычна і намёкам былі пазначаныя будучыя ідэалягічныя асновы нашага грамадзтва».
Славалюбства – нясьціпласьць розуму, як казаў Дэвэнант. Лукашэнка наагул шмат за што бярэцца сам і не давярае іншым. А потым кажа, што прэзыдэнцкая праца – ня цукар: «Прэзыдэнцтва ў Беларусі – гэта ня царства. І прэзыдэнт – ня цар, які пануе, ён сноўдае па студэнцкіх аўдыторыях, палёх, фэрмах. Прэзыдэнцтва – надта цяжкая праца, самая складаная ў нашай дзяржаве». То бок Лукашэнка трымаецца за прэзыдэнцкае крэсла як самаахвярны місіянэр.
Многія ягоныя амбіцыі – Крэмль, ідэалёгія, супрацьстаяньне з Захадам – паўставалі і паўстаюць ад таго, што ў тымчасовай беларускай палітыцы яму сумна. У лягеры апазыцыі ён ня бачыць супернікаў, хаця там багата палітыкаў з сваімі немалымі амбіцыямі. І яны з году ў год, нягледзячы на шматлікія паразы, толькі мацнеюць. Бо, як казаў Оскар Ўайльд, амбіцыі – гэта апошні прытулак няўдачнікаў.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[illegible] (9’2000)

[image]

A R C H E

П а ч а т а к **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

эсэістыка [image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image] **ВІКТАР ЛЕАНЕНЯ**

Віктар Леаненя Герадотава мора (нататкі мэліяратара)

НАСТАЛЬГІЯ
Той, хто нарадзіўся ў 1970–1980-я гады мінулага стагодзьдзя, ужо ня меў магчымасьці палюбавацца адвечнымі прыроднымі ляндшафтамі Беларусі. Зьніклі, і магчыма назаўсёды, вялікія абшары

натуральных
лугоў і
сенажацяў.
Руслы
многіх
малых і
нават
сярэдніх рэк
(Случ, Лань,
напрыклад)
адрэгуляваны,
іх справілі
ды
паглыбілі
экскаватарамі.
У вакольлі
вёсак людзі
бачаць
толькі
асушаныя
лугі,
засеяныя
цімафееўкай
ды
аўсяніцай.
Яны спрэс
аднаколерныя
– зялёныя, у
адрозьненьне
ад былых
натуральных,
што
красавалі
шматколерным
мнагаквецьцем.
Мой
старэйшы
брат Міця,
шчыры
селянін,

крывіцца:
«Што за сена
цяпер?
Зямлёй
патыхае,
малако
нясмачнае.
А былое
сена
духмянае, як
мёд…»

Па лугох і балотах прайшлася мэліярацыя.
Заходняя Эўропа, што за Одэрам, раней за нас забылася на краявіды з натуральнымі лугамі ды балотамі: мэліярацыя (паляпшэньне) земляў там адбылася значна раней. На тое была важкая прычына: высокімі тэмпамі расло насельніцтва, шчыльнасьць яго ў XX стагодзьдзі дасягнула неверагодных для Беларусі лічбаў. Так, у Нямеччыне паміж Одэрам і Эльбай – ажно пяцьсот–тысяча. Дзеля параўнаньня, у нас усяго сорак пяць – шэсьцьдзясят, а ў некаторых раёнах Палесься ды на Расоншчыне – усяго дзевяць–пятнаццаць.
Чалавеку карміцца трэба, дык ён і шырыць палі ў меру патрэбы. На правым польскім беразе ракі Одэр каровы пасьвяцца на паплавох, а нямецкая левабярэжная пойма абвалавана ад ракі яшчэ ў XVI–XVII стагодзьдзях, тут знаходзіцца так званы «германскі агарод» (бачыў яго ў 1984 годзе).
Там, дзе жыве густа народу, паляпшэньне земляў (мэліярацыя) адбываецца само сабой: тут сьсякуць болей лесу на дровы ды дзеля будаўніцтва, там каменьне з поля вывезуць, яшчэ дзе канаву пракапаюць. Каровы, коні, авечкі, сьвіньні зьядуць маладыя парасткі дрэваў. Прыклад ужо наш: самы густанаселены цэнтар краіны – Слуцак–Клецак–Нясьвіж. Дзе вы тут хмыз сярод поля пабачыце? Тут нават пні на лесасеках карчаваліся на дровы. А на Віцебшчыне хмыз наступае на палі хутчэй, чым мэліяратары яго карчуюць, бо народу ў два разы менш жыве.
Нашыя продкі-крывічы ды дрыгавічы як прыйшлі на цяперашняе месца ды распладзіліся, дык земляробствам ратаваліся ад бяскорміцы. Яны найперш і заняліся культурна-

тэхнічнай мэліярацыяй: секлі лес на пагорках, палілі яго. Глеба ўзбагачалася, збожжавыя давалі добры ўраджай. Іншаземныя вандроўнікі сярэднявечча пісалі ў дзёньніках: жыта расло такое высокае, што калосьсе сягала коньніку да плячэй. Праз тры-чатыры гады давалі адпачынак полю ды выпальвалі новую дзялку лесу – ляда.

А вы думалі – адкуль узяліся цяперашнія палі? Гэта нашыя продкі іх стваралі ажно да канца XIX стагодзьдзя, каб мы маглі цяпер хлеб з маслам есьці. У XVII стагодзьдзі нас, беларусаў (да маскоўскага «патопу»), налічвалася ўсяго тры мільёны чалавек, а на пачатку XX-га ўжо прырасло да дзесяці мільёнаў. Таму ўвесь час і адваёўвалі людзі палеткі ў лясоў ды балотаў. Думаецца, што зь цягам часу прагрэс у вытворчасьці харчаваньня дасягне новых вышыняў, дык многія сёньняшнія палі зноў ператворацца ў лугі ды бары, а мэліярацыйныя канавы заплывуць глеем. Такі працэс у Беларусі ўжо ідзе. У нас супроць Эўропы залішак сельгасугодзьдзяў у разьлік на чалавека – цэлы гектар. Дык гэтулькі і ня трэба. У апошнія гады малапрадуктыўныя ворыўныя землі перадаюцца лясгасам. Толькі на Віцебшчыне яны атрымалі каля трохсот тысяч гектараў.

Аматары паляваньня ды эколягі-самавукі надта мэліяратараў пляжылі[1], а багатаму жыцьцю Эўропы – зайздросьцілі. Аднак яек дзікіх качак ды іх мяса, назьбіраных на балотах журавінаў мала для смакаты. Дык дзеля наедку нечым выпадае і ахвяраваць – шкадуй не шкадуй…

НАД РАКОЙ АРЭСАЙ

Усе навучэнцы беларусіх школ у 1950-я гады ды й пазьней старанна штудыявалі паэму нашага клясыка Янкі Купалы «Над ракой Арэсай». У тым ліку і я. Хлапчуком я ўпершыню і ўведаў з паэмы словы «мэліярацыя», «мэліяратар».

Сваю паэму клясык напісаў у 1933 годзе – на падставе сьвежых падзеяў, якія адбываліся на Любаншчыне (цяпер Салігорскі раён). Там за тры гады, пачынаючы з 1929 году, было асушана паўтары тысячы гектараў балотаў, былыя багны засявалі, побач вырасьлі новыя селішчы.

Савецкая ўлада замахнулася на любанскія балоты і з

[1] У ЗША мэліярацыяй ды ірыгацыяй (арашэньнем) займаюцца дасюль вайскоўцы – інжынэрны корпус карабінэраў, якому

палітычных мэтаў: па-першае, хацела паказаць на яскравым прыкладзе перавагу сацыялізму, маўляў, новай уладаканьня перашкодаў, нават спрадвечную багну адолее. Па-другое, мэліярацыя балотаў адцягвала шмат людзей.

Да ведама: тарфяныя глебы паводле ўтрыманьня азоту ў два разы багацейшыя за ўкраінскія чарназёмы. Дадай фосфару ды калію – ураджаю не абярэшся. Дагэтуль жа мясцовыя сяляне біліся грудцамі на пясчаных выспах і сядзелі бяз хлеба:

Пад шум бесканечны
Бярозаў і соснаў
Сахой недарэчнай
Аруць пясок млосны.

Тады на першы плян выйшла праблема калектывізацыі, якая ў Беларусі ішла цяжка. «Перашкоды» былі паўсюль, нават у кіраўніцтве рэспублікі: наш наркам земляробства Прышчэпаў быў адданым прыхільнікам хутароў і культурных аднаасобных гаспадарак (яго, канечне, зьнялі з пасады ды ўпяклі ў ГУЛАГ)…

Было вырашана: акрамя саўгасаў «Сосны» ды «Загалеке» стварыць яшчэ камуну «Арэса»[2]. Сюды накіравалі звольненых у запас кавалерыстаў і стралкоў Самарскай, Фрунзэнскай і Чангарскай дывізіяў. Пад’ехала нямала ўкраінцаў, пастаўшых ад голаду. Узначаліў камуну вайсковец, камуніст Натан Эмануілавіч Модзін. Камуна атабарылася на пагорку ў Забалацьці. Жылі камунары ў вайсковых намётах, ежу такі ў вайсковых жа катлах (харч бясплатна выдзяляла савецкая ўлада).

скрадзеным заканьня Грамадзянскай вайны даручылі важную, адказную працу. Дык і цяпер мэліяратары носяць вайсковую форму з пагонамі, а важныя чыноўнікі маюць генэральскія званьні. Асобная форма ў мэліяратараў некаторых зўрынейскіх краінаў. У нас такой нагоды ад ўдзячаны жулікі лесьнікі ды чыгуначнікі. Несправядліва, бо цяпер палова пасяўных плошчаў у Беларусі разьмешчана на мэліяраваных

«Хлопцы-звадыякі, дзядзькі барадатыя» з рыдлёўкамі ўсяк ім ды піламі пачалі наступ на спрадвечнае балота:

Рыюць людзі тонкі торф
У вадзе па пахі…

І гэта было праўдай. Тэхнікі ня выдзелілі аніякай. Сродкамі для капаньня каналаў былі: рыдлёўкі кіеўская, чарнобыльская, польская, саўкі-шуфлі (шуфель цягнуў за вяроўку адзін чалавек, другі налягаў на драўлянае дзяржальна). Па восі каналу капалася траншэя паўмэтру глыбінёй. Пасьля, пачынаючы ад вусьця, уздоўж яе ставіліся тры брыгады землякопаў: першая здымала дзёран, куп'ё і капала неглыбокую траншэю, другая яе паглыбляла да палавіннай глыбіні, трэцяя даводзіла канаву да поўнай глыбіні. Па магчымасьці вада з траншэі адлівалася, але часьцей за ўсе працаваць даводзілася па пояс у вадзе. Норма на дзень – сем–чатырнаццаць кубамэтраў грунту.

Пні карчавалі ручной вяровачнай карчавалкай тыпу «КР-1»-ці коннай тыпу «Геркулес-100». Першую абслугоўвалі два чалавекі, а конную – аж чатыры–шэсьць. Вось і ўся мэханізацыя.

Толькі ў канцы 1930-х гадоў зьявіліся канавакапальнікі «КВ-2», «КВ-3», якія навешваліся на трактар ЧТЗ, ды паравыя экскаватары. Але ўсё адно працавалі найперш землякопы.

Асабліва цяжка давялося камунарам капаць «магістраль»-магістральны канал глыбінёй да двух мэтраў. Ад яго пракопваліся калектары глыбінёй да паўтара мэтру – тыпу было лягчэй. А вось «стрэлкі»-асушальнікі першым мэліяратарам здаваліся дзіцячай гульнёй – іх глыбіня была ўсяго ад паўмэтру да васьмідзесяці сантымэтраў. Пасьля пракопкі балота сушэла і заворвалася…

землях – куды болей, чым у той жа Нямеччыне.

2. У канцы 1921 годзе ўва Ўсходняй Беларусі згодна з дэкрэтам савецкай улады пачалі стварацца мэліярацыйныя таварыствы, да 1930 году іх налічвалася 1120, яны аб'ядноўвалі 25 тысяч сялянскіх гаспадарак. Да вайны два–тры таварыствы пасьпелі асушыць 270 тысяч гектараў балотаў. Уладзімір Ульянаў–Ленін

– першых мэліяратараў. 19 сьнежня 1924 году адбылося

Праца землякопаў у балоце была страшэнна цяжкай, на ўсе вытрымлівалі. Узбунтаваліся чангарцы. Яны скардзіліся:

Ды як жа так?
Працуй, працуй,
Адно багно.

Ў дрыгве начуй.
Ні табе сон,
Ні ў час яда,
Сячэ камар,
Сьмярдзіць вада…

Вядома ж, пітная. У экспэдыцыях па палескіх балотах нямала я працадзіў яе праз сваё цела… Балотная вада сапраўды сьмярдзіць серавадародам.

Іх папракалі:

А што ж вы мо хацелі б…
Каб на стале бліноў і сала
Гара высокая ляжала?

Хоць штодзень цяжкая праца, але прырода патрабуе свайго. А ў камуне – ніводнай жанчыны. Зноў незадавальненьне. Прыйшлося нават сход зьбіраць. Вырашылі, каб працы не спыняць, па чарзе ехаць дамоў ці куды зручней ды шукаць нявестаў, а ў каго жонка дома – дык прывезьці яе сюды.

Для камуны нашай новай
Жанчын трэба, ну і ўсё тут.

І навезьлі дзявок і кабет, хатаў набудавалі, балазе паравы тартак наладзілі, а пры ім – паравы млын запусьцілі, менскія ўлады дапамаглі. Пабудавалі школку, садок-ясьлі, займелі электрычнасьць…

ў, на ўсе ўзнагароджаньне беларускім Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу (праіснаваў 9 гадоў: 1924–1933) мэліярацыйных таварыстваў «Васількі» і «Астрэні» на Магілёўшчыне. Яны праклалі каналы даўжынёй дзевяць і чатырнаццаць вёрстаў і назвалі іх імем Леніна і Чарвякова.

У 1930 годзе камунары засеялі першыя трыста гектараў асушаных балотаў… Да саўгасу «Сосны», дзе праходзіла чыгунка, пабудавалі сем кілямэтраў вузкакалейкі.

Саўгас «Сосны» асушыў Марына балота, саўгас «Загальле» асушыў балоты на той бок Арэсы. Замахнуліся ажно на сорак тысяч гектараў. «Так на край балотны ішоў сацыялізм» (Янка Купала)[3].

Сеялі на асушаных тарфяніках бульбу, збожжавыя, каноплі, але найболей – шматгадовыя травы, – для коньніцы Чырвонага войска шмат сена патрабавалася. Ударнікам прысвойвалі званьне «мэліяратар».

У тыя ж 1930-я гады былі асушаны вялікія тарфяныя масівы (каля тысячы гектараў кожны) і на Полаччыне: «Палата», «Нача», «Бязьдзедавічы» ды іншыя меншыя[4]. Ізноў жа асноўнымі культурамі сталіся травы ды каноплі. Тыя ж лугі кармілі коні Чырвонага войска, якое месьціласяў памежжы з Польшчай у Ветрыне, у Спас-гарадку, у Беставічах, Баравусе-1 ды Баравусе-3 пад Полацкам. Функцыянавалі асушальныя сыстэмы і пасьля вайны, ды ў канцы 1950-х заняпалі, бо коньніцу ў савецкім войску зьліквідавалі. Нацкай сыстэмы зарасла беразьняком, а вось іншым пашанцавала: іх рэканструявалі ў 1970-я гады.

А што ў Заходняй Беларусі, якая знаходзілася ў складзе Польшчы? Працуючы на геадэзічных вышуканьнях, я ня раз сустракаў рэшткі мэліярацыйных сыстэмаў былых хутароў і памешчыкаў. А потым атрымаў і дакумэнтальны доказ. Так, у архіве браслаўскага каморніка мне патрапілі ў рукі тапаграфічныя пляны ды падоўжныя профілі каналаў, якія тут называліся «равамі». Кожны роў насіў імя ўладальніка зямлі. Іншы раз равы пракладваліся па землях розных гаспадароў, дык і кожны ўчастак называўся яго «назьвіскам»: Лаўрынчыка Яна, Янчука Альфонса, Прусака Нічыпара і інш. Ува ўсходняй савецкай Беларусі каналы проста нумараваліся: А-1, А-2 і г. д. – гаспадароў ужо загналі ў калгасы, саўгасы, камуны і гулагі.

Вось перада мной плян асушэньня (дрэнажу) зямельнага масіву «Пакульня» Браслаўскага павету Віленскага ваяводзтва пад

[3] Асушэньне зямель у Беларусі вядуцца з XVII стагодзьдзя, але тыя праходзілася бо[illegible] земляк[illegible]

Найперш асушаліся прылеглыя да сядзібы землі пад паркавыя ансамблі (шпалерыклад, у пясьвітку), пракладваліся радкія каналы на перавільготненых лугох ды лясох. Кравалі

Відзамі. Яго плошча 166 гектараў і 76 сотак. Землі рабочыя суглiністыя, пераўвільготненыя. Па нізінах між пагорамі і пракладзены каналы-равы.

На Шаркаўшчынскай гліністай раўніне мэліярацыя вялася так. Капаліся равы глыбінёй адзін мэтар (ці з хвосьцікам), а да іх праз дваццаць-пяцьдзясят мэтраў пракладвалі «стрэлкі», асушальнікі глыбінёй да пяцідзесяці сантымэтраў, каб у кароткі тэрмін вада магла зьбегчы ў іх з пасеваў, якія інакш маглі загінуць на перанасычанай вадой гліне. А гліна там неверагодна «тлустая». У 1960-я гады давялося назіраць, як на фэрму падвозілі кармы ўвосень… на санях, бо на колы вазоў столькі наліпала гліны, што конь не цягнуў.

Польскае войска таксама мела вялікую коньніцу. Шмат сена патрабавалася і з таго боку мяжы. Дык залезьлі мэліяратары і тут у балоты: у пойме ракі Поня ў Докшыцкім раёне, пад Браславам ды Глыбокім, на Піншчыне.

Арэскія камунары ня ведалі пра заходнебеларускіх мэліяратараў, дык з суворым гумарам пагражалі прыйсьці на дапамогу асушыць балоты пад Пінскам «зь вінтоўкамі» (Янка Купала).

ГЕРАДОТАВА МОРА

Мэліярацыйны фонд Беларусі складае больш за дзесяць мільёнаў гектараў (палова тэрыторыі). Балотамі занята дваццаць тры адсоткі тэрыторыі краіны. Палесьсе (наагул) гэта нізінная забалочаная раўніна ледавіковага паходжаньня. Плошча беларускай часткі Палесься ў басэйне Прыпяці складае шэсьць мільёнаў гектараў (крыху большая частка знаходзіцца ўва Ўкраіне). У гонар грэцкага географа Герадота Палесьсе называюць Герадотавым морам, быццам той першым расказаў пра яго сьвету да пачатку новай эры, заплыўшы сюды Дняпром з Чорнага мора. Сапраўды, пасьля адступленьня апошняга ледавіка (каля васьмі тысяч гадоў таму) на нашым Палесьсі разьлілося прэснае мора.

работамі нанятыя ангельскія спэцыялісты-дрэнэры, а потым галяндцы ды немцы. У сярэдзіне XIX стагодзьдзя ўжо і нашыя адмыслоўцы мелі званьне «інжынэр-дрэнэр», якое ўвяла царская Расея. На землях Горы-Горацкага зямельнага інстытуту (цяпер БСГА) яны заклалі ў 1854–1856 гадох танчарны дрэнаж. Ён функцыянаваў яшчэ ў 1970 годзе, калі я вупыўся ў Акадэміі на інжынэра-гідратэхніка. Сам дрэнаж у

На Прыпяцкім Палесьсі, як сьцьвярджаюць геолягі, у
даледавіковы пэрыяд існавала глыбокая, да трыццаці
катлавіна. Яна ўтварылася ў выніку апусканьня геа
пластоў (апускаюцца яны і цяпер) пры гораўтварэнні
Карпатаў. Катлавіну затапілі воды талага ледавіка,
чаго ўтварылася велізарнае возера, бы мора, – аж да
Клецку, у якое ўпадаў нават Дняпро, а з правага па
боку – рэкі з Карпат. Рэкі несьлі багата наносаў, як
дно ледавіковага возера. Яны ўтварылі цяперашні
паверхневы слой Палесься.

Доўгі час Палескае возера ня мела сьцёку на ўсход:
перагарадзіла Мазырскае ўзвышша. Ня хутка вада
праз яго ход. Дык лішкі вады з возера выліваліся на
праз даліну цяперашняе ракі Славечны, а таксама на
даліну Бугу ў Віслу.

Прамыла вада ход праз Мазырскае ўзвышша – і зьбегла праз
Дняпро ў Чорнае мора. Ды ня ўся і не адразу. У нізкіх месцах
яна засталася на тысячагодзьдзі, глыбіня мелкаводзьдзя –
мэтар-паўтара, а дзе і болей. Вада добра прагравалася,
разьвівалася багатая водная расьліннасьць, адміраючы, яна
адкладалася на дно. У анаэробных умовах яна ўтварала
арганічнае рэчыва – торф. Адзін мілімэтар торфу,
сьцьвярджаюць вучоныя, утвараецца за год. Дык мэтар яго
адкладаецца за тысячагодзьдзе. Так што князь Тур,
Рагвалод дый ці ня сам Усяслаў маглі бачыць блакітныя
аскепкі палескага Герадотавага мора.

Затарфаваныя нізіны перамяжаюцца зь невысокімі
ледавіковымі пясчанымі выспамі. Адна з найбуйнейшых –
сярод Лунінецкіх балотаў у раёне вёскі Чырвоная Воля, дзе мне
давялося працаваць.

Калі глянеш на зрэз торфу на адхоне сьвежаадкапанага каналу,
дык убачыш рэшткі расьлінаў. У ніжэйшых слаях гэта сітняк
(трысьнёг), вышэй – асака, белы мох сфагнум, а наверсе і
гіпнавы мох. Сярод іх ляжаць ствалы спарахнелых дрэваў:
жоўтыя на зрэзе – сосны, цямнейшыя – елкі, шэрыя – вольхі.

Ухілы мясцовасьці на Палесьсі вельмі нязначныя – усяго да

мінулага
ўзьнікнуць
а Сожу і
ўдзевяці
стагоддзя
дасягнуў
эры. Ён
будаўніцтве
Сафіі. Цяпер
зь яго
крынічка на
беразе
Дзьвіны.
Можа, таму і
сьценах
храму
расколіны,
тысячагадовай
дрэнаж
працуе?
дрэнаж мелі
Полацкай
езуіцкай
акадэміі,
сёньня

пяці сантымэтраў на сто мэтраў. Дык вада надта павольна
сьцякае ў рэкі, насычаючы торф.

Да 1940 года ў Беларусі асушана 270 тысяч гектараў балот.
У 1961 годзе мелиораторы Палесья асушылі 564 тысячы
гектараў, і вораг зноў адступіў. Ужо ў 1976 годзе ў
выніку Вялікага Кастрычніка асушаны 2,3 мільёна
гектараў балот.

Найлепшыя іх выклікаюць правыя прыточкі Прыпяці, што цякуць
з Карпатаў.

Упершыню я пабачыў паводку на Палесьсі вясной 1959 году, калі ехаў з вакацыяў у пінскую вучэльню. Цягнік Баранавічы–Пінск ужо ў раёне Ганцавічаў ішоў, быццам пасярод мора, паабапал чыгуначнага насыпу стаяла вада да мэтру глыбінёй. Рэдкія акружаныя вадой вёскі выглядалі жудасна. Зайцы, балотныя пацукі, мышы сядзелі на насыпе і не ўцякалі ад грукату цягніка: не было куды дзецца. Так і «плыў» наш пасажырскі цягнік сярод воднай стыхіі аж да Лунінца. Мяне, жыхара слуцкіх сухадолаў, відовішча ўражвала.

Палескі край здавён багаты на драўніну. На пясчаных выспах ды сухадолах расьлі карабельныя сосны, дубы, грабы, на прыдатных месцах балотаў – елкі, бярозы, вольхі. А ў Эўропе лясоў бракавала, яна ахвотна купляла беларускую драўніну (і купляе цяпер). Дык нашыя магнаты капалі лесасплаўныя каналы (заадно асушаючы прылеглую мясцовасьць), каб даставіць лес на захад. Адным зь першых (у 1770 годзе) быў пракапаны канал Бона пад Кобрынем – даўжыня яго 20 кілямэтраў. У 1770–1784 гадох пракапаны Агінскі канал даўжынёй 54 кілямэтры (злучыў басэйны рэк Прыпяці і Нёману). У 1775 годзе пачаў будавацца Днепра-Бускі (Каралеўскі) канал даўжынёй 196 кілямэтраў – з сыстэмай шлюзаў для падняцьця суднаў на водападзел. Агінскі канал (бачыў яго ў 1960 годзе) месцамі быў мацаваны дубовымі палямі.

Аднак сапраўдная эпапэя па асваеньні палескіх багацьцяў надарылася ў канцы XIX стагодзьдзя падчас экспэдыцыі царскага генэрала Жылінскага. Яна доўжылася 25 гадоў – з

1873-га да 1898-га году – і скончылася агромністым па тым часе асушэньнем, у першую чаргу лясоў ды сенажацяў. Быў ахоплены абшар ад Мазыра да Пінску. Пад кіраўніцтвам Яна Радзікоўскага пракладзена чатыры з паловай тысячы кілямэтраў каналаў, выкапана пры гэтым больш за пятнаццаць мільёнаў кубамэтраў зямлі, практычна рукамі землякопаў, найперш беларускіх. Ды пасярод багны.

Кошт асушэньня балотаў толькі ў Менскай губэрні склаў паўтара мільёна рублёў. Дзяржаўны скарб атрымаў прыбытку чатыры мільёны рублёў. Асноўны прыбытак даў лес. Зімой уздоўж каналаў, а летам па вадзе каналаў бярвёны дастаўляліся да рэк ці да чыгункі, адкуль і перапраўляліся ў Эўропу.

Канцэсіі на высечку лесу выдаваліся найперш расейцам, дык многія зь іх, узяўшы банкаўскую пазыку, праз колькі гадоў рабіліся багатырамі. Нажытыя імі капіталы, аднак, не заставаліся ў Беларусі, а вывозіліся ў Расею, дык наш край мала што і атрымаў з уласнага «кландайку».

Дваццаціпяцігадовая эпапэя па асушэньні палескіх балотаў яшчэ чакае свайго дасьледчыка. На капаньні каналаў адначасова працавала некалькі дзясяткаў тысяч землякопаў. Людзі жылі ў часовых бараках пасярод балотаў, харчаваліся абы-як, працавалі ад цямна да цямна, нярэдка па пояс у вадзе, хварэлі, паміралі… Колькі надарылася трагедый, няспраўджаных надзеяў разжыцца «на канавах». Цяжка нават уявіць нечалавечыя намаганьні землякопаў-беларусаў, іх неразгаданую цярплівасьць і самаахвярнасьць, каб хоць як зарабіць для сям'і грошай.

Дзейны Сакалоўскі канал шырынёй шэсьць мэтраў я бачыў у 1959 годзе ў Лунінецкім раёне ля вёскі Велута, калі праходзіў вытворчую практыку. Брыдучы па балотах зь нівэлірам ці тэадэлітам, даводзілася ня раз пераадольваць і меншыя каналы Жылінскага-Радзікоўскага амаль стогадовай даўніны. Яны зарасьлі водарасьцямі, але ў вясновую паводку яшчэ скідвалі воды ў рэкі Цна, Сьмердзь…

…Пад канец Другой сусьветнай вайны інжынэры ды тэхнікі-

гідратэхнікі адгукаліся з фронту на заклік ураду БССР. Прафэсія рэдкая – а трэба было аднаўляць паўразбураныя мэліярацыйныя сыстэмы на плошчы больш за 200 тысяч гектараў. У 1950-я гады прыбылі з Узбэкістану першыя экскаватары-драглайны зь ёмістасьцю каўша чвэрць кубамэтру, вусенічныя бульдозэры з Расеі. Узнаўленчыя работы найперш вяліся над той самай ракой Арэсай, пад Пінскам, Гомелем ды Берасьцем.

Народ у глыбіні Палесься гараваў. Хлеба ды бульбы зь пясчаных выспаў сярод балотаў не наясіся. Бездарожжа. Улетку 1959 году давялося дабірацца зь Пінску праз Лунінец да вёскі Велута – везьлі геадэзічныя інструмэнты на «газончыку». На дзьвесьце кілямэтраў затрацілі амаль два дні. Колы машыны прабуксоўвалі ў сухім пяску, як у сьнезе, вада закіпала ў радыятары, – ехалі на першай-другой перадачы. Буксавалі ў калюгах на гацях.

У вёсцы Велута ледзьве знайшлі хату з харчамі, – многія сем'і проста ня мелі хлеба, яго ў крамы не завозілі. Толькі для рабочых чыгункі ў краме «ОРСу» яго выдавалі па сьпісах. У такой сям'і і атабарыліся з Сашам Кавалевічам. Зранку гаспадыня гатавала боршч з буракоў, запраўлены… сушанымі гаркаватымі ўюнамі. Тыя ўюны – гэтая рыба амаль без касьцей – плоймай вадзілася ў паўзаросłых канавах Жылінскага, там яе і лавілі.

На абед (мы хадзілі мераць балоты цэлы дзень) гаспадыня давала пляшку малака, гурок ды лусту хлеба. Болей ня мела чым абдарыць. Сьвіньні не трымала. Ад такой кармёжкі мы ледзьве ногі цягалі па балоце. Такой галечы я ня бачыў, жывучы ў палявой частцы Беларусі.

А вы кажаце: нашто палезьлі балоты палескія асушаць? Каб людзей накарміць, дарогі ды масты збудаваць, шляхі ў сьвет людзям адчыніць. Дваццаты ж век за палову пераваліў, а пасярод Герадотавага мора жылі палешукі, як і век таму.

Асушэньне палескіх балотаў пачалося адкрытымі канавамі[5]. Іх капалі ўжо экскаватары, кавальеры раўнялі бульдозэрамі, адно складанасьцяў хапала, найперш дапякала бездарожжа ды

[5] Праз

бяскорміца. Недзе з 1967 году Масква ўзяла ў свае рукі справу асушэньня палескіх балотаў, мерылася адтуль вывозіць мяса ды масла. Былі створаны Галоўпалесьсеводбуд, спецінстытут Саюзгіправадгас – усе ў Пінску, – якія падпарадкоўваліся непасрэдна Маскве, работы фінансаваліся з бюджэту Саюзу. Хто плаціць – той і музыку замаўляе, таму крамлёўскія кіраўнікі ня надта прыслухоўваліся да беларускіх вучоных, зважалі адно на плян ды тэмпы работаў. Дзевяць трэстаў меў Глаўк, вёў работы ў Берасьцейскай і Гомельскай абласьцях цалкам, а таксама часткова ў Магілёўскай ды Менскай. Галоўным чынам, перайшлі на асушэньне закрытым дрэнажом, балазе тарфянікі не глыбокія – мэтар-паўтара.

Толькі за дваццаць гадоў – да 1987 году – Галоўпалесьсеводбуд асушыў мільён гектараў палескіх забалочаных земляў. Былі пабудаваны шэсьць новых жывёлагадоўчых саўгасаў і сучаснымі пасёлкамі, фэрмамі, дарогамі: «Парахонскі», «Маладзельчыцы», «Беражцы», «Адраджэньне», «Ясенева», «Мэліяратар Палесься», а таксама буйныя вадасховішчы (Чырвоная Слабада, Любань, Лактышы і інш.) з запасам вады 240 мільёнаў кубамэтраў. Праведзены супроцьпаводкавыя абвалаваньні земляў у пойме рэк Гарыні, Ствігі, Львы. Удзельная вага асушаных земляў складае: у Берасьцейскай вобласьці – 45%, у Гомельскай – 33%. Пракладзена каля чатырох тысяч кілямэтраў дарог зь цьвёрдым пакрыцьцём. Да 1990 году мэліяравана ад чвэрці да паловы балотаў у кожным палескім раёне. Былі прадугледжаны і вялізныя плошчы прыродныя заказьнікі, – гэта міт, што ўсе палескія балоты загінулі.

Вядома, не ўдалося пазьбегнуць памылак у гэткай грандыёзнай справе. Найперш давялося сутыкнуцца з дэградацыяй асушаных тарфянікаў (зьмяншэньне таўшчыні тарфянога слою) пры выкарыстаньні іх пад прапашныя культуры. Расьцягнулася акупнасьць работ, у засушлівыя гады пасевам на многіх аб’ектах не хапае вільгаці, зьменшылася прастора для расьсяленьня дзікіх жывёлаў і птушак. А найбольшая праблема – усю гэтую гаспадарку трэба даглядаць, аднаўляць, эксплюатаваць і г. д. Грошай на гэта ў дзяржавы няма. Шмат што прыходзіць у занядбаньне.

ручыстымі
с
самацечныя
асушальныя
сыстэмы.
Таму,
беларускіх
дасьведы
ў
мэліяратыўнікі
па
магістральным
каналам
самацёкам.
На Палесьсі
вельмі малы
ўхіл
мясцовасьці,
і высокія
наводкі рэк
не заўседы
даваў
магчымасьць
наўдаваць
самацечныя
мэліяратыўныя
сыстэмы.
Таму
будаваліся і
польдэрныя
сыстэмы,
базуючыся
на досьведзе
Галяндыі, ці
не траціна
тэрыторыі
якой ляжыць
ніжэй за
ўзровень
мора.
Участкі, якія

У ПАГОНІ ЗА МАРАЙ

Мы, вясковыя хлапчукі, першы раз электрычную іскру ўбачылі пры паказе кінафільмаў у пасьляваенныя гады. Электрычны ток выпрацоўваў маленькі бэнзінавы рухавічок з дынамай.

У 1957 годзе старшыня нашага калгасу Забудзька, хахол і былы партызан, выцыганіў недзе ў вайскоўцаў перасоўную дызэльэлектрычную ўстаноўку ды правёў у вёску правады па слупках. Сьвятло давалі, пачынаючы з восені, гадзіны на тры-чатыры вечарамі.

Мае мары скіраваліся ў бок электрычнасьці: каб яна зазьзяла паўсюдна ў нашых цёмных вясковых хатах, на вуліцах.

Я ўжо ўведаў з кніжак ды кіно пра гідрастанцыі і падумваў, што іх можна збудаваць на недалёкіх рэчках – Морачы, Лань. Вось жа будзе сьвятла!

Накіраваны сваёй марай, я паступіў вучыцца ў Пінскі гідратэхнікум на спэцыяльнасьць «будаўніцтва сельскіх ГЭС і гідрамэліярацыя». Ведаў, што ў Беларусі збудавана ці будуецца шмат малых ГЭС. Напрыклад, Богінская ГЭС пад Браславам, Гомельская ГЭС пад Полацкам (вёска так называецца пад Полацкам – Гомля), Клясьціцкая ГЭС у Расонскім раёне, ГЭС «Дружба народаў» у памежжы з Латвіяй ды іншыя. Нават у Полацку на рацэ Палата вада круціла генэратар (паблізу цяперашняй кавярні «Адпачынак», плаціну гэтую зьнесла паводка).

На дадатак у назьве спэцыяльнасьці – «гідрамэліярацыя» – я ўвагі не зьвярнуў і памыліўся. Бо ў канцы 1950-х урад СССР забараніў далейшае будаўніцтва малых ГЭС у Беларусі. Узводзілі іх на Дняпры (Канеўская, Кіеўская), на Волзе, на чарзе была Сібір. Ад таго часу Беларусь сталася залежная ў электразабесьпячэньні ад Расеі. Дзівіла потым, чаму на Дняпры ўкраінскім можна ГЭС будаваць, а на беларускім – нельга? Ці на тым самым Нёмане, на той самай Дзьвіне? На ёй у вусьці, у 1970–1980-я гады былі ж пабудаваныя Рыская ды Плявіньская

асушаюцца, абгароджваюцца дамбамі, абараняючы ад затапленьня паводкай, ды вада з магістральнага каналу перакідваецца ў раку помпавай станцыяй. Кошт польдэрных дусмаў, што Лань. Вось высокі, – як пры будаўніцтве, так і пры эксплюатацыі. Таму і будаваліся яны ў выключных выпадках.

ГЭС, на чарзе стаяла Даўгаўпілская…

Але вернемся ў Пінск. Так, нас вучылі будаваць малыя гідрастанцыі дый мэліярацыі надавалі нямала часу. Урэшце і давялося працаваць у сфэры мэліярацыі. Мара не збылася.

Малыя ГЭС амаль усе спынілі працу ў канцы 1960-х. Але ж цяпер яны амаль усе адноўлены і даюць танную электраэнэргію. Нават заплянавана будаўніцтва ГЭС на Дзьвіне пад Полацкам (ля вёскі Лучна), на Нёмане, на Дняпры. Час усё расстаўляе на сваё месца.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]

эсэістыка [image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ

стваральнік сайтаў www.sivier.net і www.epolotsk.com.

Сяргей Шыдлоўскі Полацкія амбіцыі

Сябры выпрабоўваюцца ў шчасьці. Соладка было любіць Полацак шэрых скрыўленых парканаў, дзівосы якога адкрываліся толькі абраным. Цяпер Полацак, аблашчаны ўладай і бізнэсам, Полацак пасьля «эўрарамонту»,

Полацак з
палацамі-
базарамі і
цэрквамі,
што
аднаўляюцца
на складкі
бізнэсоўцаў,
пакідае ў
старых
крывіцкіх
патрыётаў
дваістае
ўражаньне.
Інтэлігенцыі
цяжка
канкураваць
у любові да
гораду з
уладай.
Гэтаксама як
і складаць
яму
вершаваныя
прысьвячэньні,
– сёньня з
большым
маральным
правам
гэтым
займаецца
сам полацкі
мэр-
будаўнік
Уладзімер
Тачыла.

Ёсьць спакуса, паводле нямецкай культуралягічнай традыцыі, супрацьпаставіць на прыкладзе сёньняшняга Полацку духоўную культуру матэрыяльнай цывілізацыі, вершаваныя зборніку ТВЛ

ды «Полоцкой ветви» брукаваным ходнікам, зробленым у горадзе наконадні Дажынак. Але брукаванка, ліхтары ды газоны ўтвараюць з айчыннай гарадзкой паэзіяй настолькі арганічны і шчыльны сымбіёз, што падзяліць іх на сучасным этапе няма як.

Шматлікія полацкія фэсты апошніх гадоў не прамінулі дарма. Колішнія вяскоўцы набываюць густ да гарадзкога жыцьця. Бабулькі новай фармацыі насуперак сваёй клептаманскай звычцы выкопваць туліпаны з гарадзкіх кветнікаў пачалі прывозіць расаду кветак з уласных лецішчаў і высаджваць яе ў гарадзкіх дварох. Гэта не ідылія, гэта сучасны Полацак, у пад'ездах якога ўжо можна сустрэць фіранкі і рэпрадукцыі карцін.

У горад вярнулася тое, на чым ён адпачатку паўставаў, – амбіцыі і грошы. У гістарычных раёнах гораду неяк раптоўна вуліцы апанавалі новыя асабнякі, прыватныя ўладаньні за высокімі платамі. У горад вярнуліся гаспадары.

Полацкая старажытнасьць у модзе. Але яна запатрабаваная не як гісторыя, а ў выглядзе антычнасьці – абстрактных уяўленьняў аб мінулым без гістарычнай дакладнасьці, без прывязкі да факту, калі нараджаюцца крамы з адвольнымі назвамі кшталту «Замкавая», «Стралецкая» ці рэстарацыя «Манастырскі пагрэбок» (дарэчы, гатуюць там добра, сьцьвярджаю гэта на падставе досьведу правядзеньня ў ім уласнага вясельля).

Магчыма, для абазнанага турыстычнага вока сучасны Полацак выглядае сьціпла. Але ня варта рабіць хуткіх высноваў. Гэта той выпадак, калі старая форма цяжарная новым зьместам. Сымбалем такой мэтамарфозы бачыцца запалоцкая сядзіба Алеся Аркуша і Тацяны Козік, новая легенда Полацку. Гэта вясковы драўляны дамок, за парогам якога сьцены і столь самым непасрэдным чароўным чынам рассоўваюцца ўшыркі, нібыта законы эстэтыкі здольныя адмяняць фізычныя законы, выяўляючы чацьвёртае вымярэньне – прастору мастацкай духовай працы.

Статус Полацку зьмяняўся неаднойчы, але амбіцыі палачанаў ніколі ня ведалі дэвальвацыі. Полацак нагадвае зорку, якая згарэла процьму часу таму, аднак сьвеціць нам дасюль, – «згарэлі» палітычныя падставы полацкай велічы, але засталося нешта нематэрыяльнае і дзейснае – сьвет духоўнай працы.

* * *

Полацак – гэта рынкі, цэрквы, універсытэт, прамзона. Менавіта ў такім парадку. Горад з купецкімі амбіцыямі.
Шмат грошай – шмат згрызотаў, адсюль цэрквы. Гандляры з размаітых базараў ня хочуць, каб іх дзеці стаялі ў ралетах, адсюль універсытэт. Прамзона ж – як паплаўкі бясьпекі па бартох старога чаўна – полацкага купецкага карабельчыка, які асталяваўся ў выглядзе герба на прыватных гарадзкіх маршрутках.
Калі гэты карабельчык урэшце зловіць у ветразі спадарожны ветрык турыстычных зацікаўленьняў, прамзона Наваполацку з калюмнамі закураных комінаў «Паліміру» ды «Нафтану» зробіцца архітэктурна-ляндшафтным запаведнікам індустрыйнай эпохі. Бэтонныя парканы, абкручаныя калючым дротам, будуць раскалупвацца на сувэніры. Сымболіку перакрыжаваных сярпа й молата гіды пачнуць выводзіць з дэвізу мясцовых анарха-пралетароідаў: «Касі й забівай».
Падчас адмысловых фэстаў на вялікія сьвяты па гарадзкой радыёсетцы будзе ўключацца трывожная сырэна, перарываная настальгічным спавяшчэньнем хрыпатага дыктара: «Гаварыт Штаб грамданскай абароны, гаварыт Штаб грамданскай абароны, адбыўся выкід небясьпечных рэчываў, просім саблюдаць спакойствія...» Для большага падабенства над горадам у той момант расьцярушаць серавадародны спрэй.
Так, Полацак – гэта рынкі, цэрквы і ўнівэрсытэт з прамзонай.
Але Полацак – гэта й вакзал, перакрыжаваньне на старым шляху «з вараг у грэкі». Палачане раскіданыя па сьвеце, і цяпер, каб даведацца аб сапраўдных вымерах полацкай амбітнасьці, трэба выправіцца, скажам, у маскоўскі Крэмль. Маскву будавалі палачане.
Задужа амбітная заява? Усё пазнаецца ў параўнаньні. Палачанка Рагнеда не захацела пабрацца шлюбам з «рабынічам» Уладзімерам, полацкі князь Усяслаў Чарадзей збудаваў велічную Сафію – сымбаль дзяржаўнасьці, – палачанін Францішак Скарына, перакладчык і першадрукар біблійных тэкстаў на старабеларускай мове, зьмясьціў свой партрэт у кнізе Сьвятога пісаньня, сучасны мэр Полацку Ўладзімер Тачыла марыць аб конным помніку Ўсяславу...
Ці ёсьць у Беларусі больш амбітны за Полацак горад? Хіба

Наваполацак. Ачольнік наваполацкай мэрыі Аляксандар Камароў, дзелячыся сваімі плянамі з студэнтамі Полацкага ўнівэрсытэту, паабяцаў паставіць на цэнтральным пляцы гораду шматмэтровую статую арханёла Міхаіла і збудаваць у ягоны гонар царкву. Такая ўвага гэтаму арханёлу тлумачыцца тым, што Міхаіл зьяўляецца, паводле афіцыйных крыніцаў, нябесным апекуном Нафтаграду. Акрамя таго, горад набудзе неўзабаве шэсьць фантанаў з разарыем, боўлінг і помнік вандроўнаму музыканту... І пабудуе аквапарк…

* * *

Днём палачане – гандляры, таксоўшчыкі, сьлесары, студэнты, увечары ж ці раніцой мужчынская частка Полацку перакідаецца ў рыбароў.

Самая ўнівэрсальная амбіцыя прыдзьвінскіх мальцаў – рыба. «Хрыстос хадзіў па вадзе аднойчы, а мы палову году ходзім», – жартуюць аматары зімовай рыбалкі. «Каб здохла ваша рыба», – уздыхаюць маладыя гаспадыні, разносячы за сьвяточным сталом гарачую бульбу. Але ты не бульбаша выбірала, сястрычка, ты ўпадабала бляск крывіцкіх вачэй, у якіх калючы яджгур паляўнічага заціну і загадкавая летуценнасьць – мары пра Вялікую Рыбу, дзьвінскага сама.

На бязрыб'і ідуць шашлыкі, яны пахнуць цыбуляй і любошчамі. Дранікі? Дранікі, насьледак зборніка «Кухня народаў СССР», прэзэнтуюць арэал лапцяў ды кухоннага палітыканства. Для даведкі: марскі народ Полацку здавён насіў скураны абутак. Бульба паводле супастаўленьня ўкладзеных сродкаў з вынікам – тамагочы айчынных лецішчаў. Славай нацыянальнага прадукту яна абавязаная знанаму меху, зь якім на карку беларусы штурмавалі саюзныя здраўніцы ды сталічныя інтэрнаты. Заплечнік з бульбай для беларуса на чужыне – аналяг мяшэчка роднай зямлі, попел Кляаса. У меру зьмяншэньня аб'ёму карняплодаў настальгія павялічваецца. Працягласьць перабываньня беларуса на чужыне, такім чынам, наўпрост абумоўлена памерам ягонага бульбянога меха. Лёхі запрыгоньваюць, вызваляе рыбалка.

Апошні буйны ўлоў – пятнаццацісантымэтровы шчупак – быў выцягнуты мной у сямігадовым веку. Паплавок губляецца ў рабаціньні, а падсьвядомасьць тым часам выкладае белым вапняком на супрацьлеглым беразе Дзьвіны КРЫЎЯ, не

раўнуючы як той HOLLYWOOD.
Большасьць тых, з кім дзелішся праектам, дэманструючы прыдзьвінскі краявід з балькона, сьмяюцца, але сустракаюцца і патэнцыйныя інвэстары, якія ўдакладняюць: чаму? Дык жа Полацак існуе, каб перамагаць. Полацак – для ілюмінацый, каранацый, трыюмфатараў. Гэта пляцы і сцэны. Дарма шукаць у Полацку лёхі-сховы-лябірынты. Тут гісторыя выходзіць навонкі, тут дзеецца відовішча, спэктакль, за кулісамі – уся Беларусь.
На гэтай зямлі (не ў Этыёпіі жывём) харчовае пытаньне вырашылася тысячы гадоў таму. Голад іншага кшталту гоніць сучасьніка на рыбалку. Магчыма, яна дае ілюзію вызваленьня з дратоў сучасных сродкаў масавай дэзінфармацыі. Магчыма, гэта досьвед чыстай перамогі. Рыбалка робіць мажлівым полацка-каліфарнійскі, браканьерска-хакерскі ідэалягічны сымбіёз, лучыць амбіцыі Васючэнкі й Барбрука, КРЫЎЮ і HOLLYWOOD.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

эсэістыка [image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

АЛЬБІНА СЕМЯНЧУК

Вывучае праблемы гістарычнай нарацыі і культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім XIV–XVI ст.

Альбіна Семянчук
Расія, камунізм і свет

21 кастрычніка 2004 г. у Сенатарскай зале «Colegium Novum» Ягелонскага універсітэта (Кракаў) адбылася сустрэча з амерыканскім гісторыкам, палітолагам, прафесарам Гарвардскага універсітэта, былым дарадцам прэзідэнта

Рональда
Рэйгана па
савецкіх і
ўсходнееўрапейскіх
справах
Рычардам
Пайпсам.
Нават для
Кракава,
распешчанага
рознымі
культурна-
інтэлектуальнымі
імпрэзамі,
гэтая падзея
выходзіла
па-за рамкі
штодзённага
універсітэцкага
жыцця.
«Rzeczpospolita»
на наступны
дзень
прысвяціла
цэлую
старонку
размове з
прафесарам
Пайпсам.

Навуковая зацікаўленасць Р. Пайпса Расіяй і Савецкім Саюзам, на першы погляд, не вынікае непасрэдна з акалічнасцяў ягонага жыцця: ён нарадзіўся ў 1923 г. у Цешыне на польска-чэшскай мяжы, а гімназію скончыў перад Другой сусветнай вайной у Варшаве. У інтэрв'ю газеце ён расказаў пра сваю даўнюю мару аб тым, што калі дажыве да 80 гадоў, дык абавязкова напіша ўспаміны. Маючы 81 год, Р. Пайпс надрукаваў аўтабіяграфію пад назвай «Vixi». У ёй аўтар прызнаецца, што ён вельмі шчаслівы чалавек.
Не звязаны з Расіяй генетычна, прафесар Пайпс «як чалавек,

народжаны ў суседняй з Расіяй дзяржаве, быў пазбаўлены рамантычных ілюзій на тэму гэтай вялікай краіны». Тое, як Расія трактавала землі, захопленыя ёю ў канцы XVIII ст. (у адрозненне ад Аўстра-Венгрыі або Прусіі), прымусіла Р. Пайпса задумацца аб сутнасці гэтай дзяржавы. У неагатычнай зале, сярод партрэтаў заснавальнікаў Кракаўскай акадэміі Казіміра Вялікага, Ядвігі і Ягайлы пэндзля Яна Матэйкі, сярод выяваў рэктараў і славутых выпускнікоў гэтай навучальнай установы ад Мікалая Каперніка да Яна Паўла II натуральна гучалі Пайпсавы словы аб фундаментальных каштоўнасцях заходнееўрапейскай цывілізацыі, якія былі невядомыя нашым усходнім суседзям у Расійскай імперыі. Лекцыя была прысвечана расійскаму кансерватызму, аб якім цяпер Р. Пайпс піша кнігу пад назвай «Расійскі кансерватызм і яго крытыкі». У ёй ён хоча знайсці адказ на пытанне, чаму палітычныя інстытуцыі і ментальнасць у Расіі фармаваліся інакш, чым на Захадзе. Чаму Расіі так цяжка пераняць заходнюю мадэль, тым часам як многія азіяцкія краіны, значна больш аддаленыя ад Еўропы, паспяхова зрабілі тое? «Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны гэтага, – мяркуе аўтар, – ляжаць у псіхалагічным складзе насельніцтва, узмоцненым яго гістарычным мінулым». Думкі, выказаныя падчас лекцыі, перагукаюцца са зместам не толькі будучай кнігі аб расійскім кансерватызме, але і зборніка яго ранейшых артыкулаў, перакладзеных і выдадзеных па-польску прафесарам Ягелонскага універсітэта Анджэем Новакам у 2002 г. пад назвай «Rosja, komunizm i świat». Сутнасць расійскай дзяржаўнасці застаецца нязменнай на працягу ўсёй яе гісторыі. Панаванне Івана Грознага мала чым адрозніваецца ад эпохі Сталіна, а сучасная Расія, калі не зменіць свайго таталітарнага характару, мае шанцы стацца «дэмакратыяй» узору Мікалая II. Існуюць яшчэ інстытуцыянальныя перашкоды для мадэрнізацыі Расіі, перш за ўсё спознены і кароткатэрміновы досвед з прыватнай уласнасцю. Адсутнасць прыватнай уласнасці на зямлю наклала глыбокі адбітак на расійскую гісторыю. Адпаведна не было і праўных падставаў для шанавання чужой маёмасці, пад якой разумеецца не толькі матэрыяльная ўласнасць, але і духоўная, якую ў Расіі не навучыліся шанаваць дагэтуль: «Урад, які абапіраецца на прымус, мусіць дэманстраваць грамадству сваю магутнасць. Адзін з магчымых спосабаў – тэрытарыяльная

экспансія». Гэтая думка Р. Пайпса перагукаецца з тэзай польскага гісторыка Фелікса Канечнага, выказанай ім яшчэ на пачатку XX ст.: «Жыццё ў Расійскай імперыі заўсёды цякло шырока, не паглыбляючыся. Дзве акалічнасці – цывілізацыйная мешаніна і даступнасць велізарных абшараў – прывялі да таго, што развіццё грамадства тут ішло іншым шляхам, чым на Захадзе».

Гэты «іншы шлях для Расіі» ёсць яшчэ адным стэрэатыпам мыслення сучаснага расійца, які цесна звязаны з яго тугой па магутнасці Расійскай імперыі і які перашкаджае канструктыўна працаваць у кірунку мадэрнізацыі краіны. Каланіяльная спадчына Расіі ўвесь час цягне яе назад, адсюль жаданне вярнуць ва ўлонне «імперыі» Беларусь і Украіну. У інтэрв'ю «Rzeczypospolitej» на пытанне: «Ці не пагражае абуджэнне мараў аб расійскай магутнасці Беларусі і Украіне?», Р. Пайпс адказаў: «Дзякуючы Лукашэнку, яна (Расія. – **Аўт.**) не мае вялікіх праблем з Беларуссю. Аднак расіяне не могуць пагадзіцца са стратаю Украіны».

Падчас лекцыі ў Ягелонскім універсітэце два пытанні публікі былі наконт Беларусі (толькі што адбыліся рэферэндум і парламенцкія выбары). Першае тычылася сітуацыі ў Беларусі, на што Р. Пайпс коратка і песімістычна адказаў, што тут слабая інтэлігенцыя, затое моцнае аўтакратычнае кіраўніцтва. Я запыталася ў прафесара Пайпса, у чым слабасць беларускай інтэлігенцыі ў параўнанні, скажам, з расійскай ці ўкраінскай? Зноў жа коратка ён адказаў, што мы не маем дысідэнтаў. Жывую рэакцыю Р. Пайпса выклікалі пытанні, звязаныя з Чачэніяй і Каўказскім рэгіёнам у цэлым. Погляд на іракскую праблему ў яго далёка не супадае з поглядам афіцыйнага Вашынгтона. Тут, як, дарэчы, і ў выпадку з Расіяй, ён усе спадзяванні ўскладае на культурнае развіццё самога насельніцтва, якое з дапамогай Захаду павінна засвоіць падставовыя каштоўнасці і прынцыпы прававога грамадства. Думаю, гэта датычыць і ўсёй постсавецкай тэрыторыі, у тым ліку Беларусі.

[image]
[image]

№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]

[image]2005

"да Зыкасту"

паэмыка • аналітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

«Народ бяз нас, як бараны расьсеяныя»
Гутарка з Алесем Пушкіным

— Вяртаньне ў Бобр – гэта сьвядомы выбар ці так склаліся абставіны? Не шкадуеш?

— Новы век пачаўся для мяне вяртаньнем «на кругі свая» – я ізноў жыву ў Бабры, адкуль выехаў у 1978 годзе ў Менск, у трынаццацігадовым узросьце, паступіўшы ў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве. Я – на сваёй малой радзіме, дзе катаўся з горак на лыжах, зьбіраў ягады, хадзіў за каровамі на пашы, маляваў віды рэчкі Бобр, зьбіраў грыбы, сушыў з бацькам сена і зьбіраў улетку каларадзкіх жукоў на бульбяных палетках… І зноў я раблю тое самае – толькі тату ўжо восемдзесят гадоў і ён ледзь-ледзь

варушыць тое сена, а мама ўжо й не пераходзіць хату і ня ходзіць даіць сваю карову. Ізноў пішу натурморты і віды Бабра, зрэдку іх набываюць, ізноў зьбіраю суніцы ў Крывушы, ды й жукі ў нас з жонкай на пасадках нашае бульбы не пераводзяцца…

Ды новае ў Новым Веку якраз і ёсьць тое, што па-новаму бачыцца і адчуваецца ўсё да болю знаёмае, звыклае з маленства: атачэньне, прырода, розныя рэчы; гэтае новае – ува ўсьвядомленым, добраахвотным *выбары* пражыць сваё жыцьцё Тут. Толькі Тут, выпіць гэты *кубак* жыцьця зь Любоўю, цярпеньнем і Верай, зь цьвёрда вызначанымі абставінамі жыцьця, людзьмі, якія сталі беспаваротна роднымі і назаўсёды, назаўсёды – *да канца*… Што б ні прынёс *лёс* – разьдзяліць усё і пражыць са сваім народам, зямлёй, дзе пахаваны прапрадзеды, дзяды, дзе жыве народжаны ў 1924 годзе мой бацька Мікалай і дзе ў 2004 годзе нарадзіўся і запісаны ў сельсавеце на беларускай мове ягоны ўнучак Міколка, мой сын…

Ці шкадую я? Ці раб я абставінаў? Я цудоўна ўсьведамляю, што ад чалавека вельмі шмат залежыць у пляне пабудовы свайго *лёсу*, месца жыхарства, прафэсійнай арыентацыі ці пераарыентацыі на працягу жыцьця. Чалавек – каваль свайго жыцьця. І будучы сёлета ў Празе, сустракаючыся з палітуцекачамі, якія зрабілі свой выбар – жыць не на Бацькаўшчыне, я ў думках прымерваў іх стан да свайго лёсу – мажлівага вулічнага мастака на Вугальным Тргу ў Старой Празе. І выходзіла цалкам рэальная асоба: мастачок-уцякач зь Беларусі, які малюе партрэты і прадае карцінкі! Ён мог бы быць! Але ніколі ня будзе такога Пушкіна. І нават калі ўявіць, што дадзена адмашка: ату іх, беларускамоўных – вось яны, тэрарысты, вось яны, хто «мешают нашему поступательному, динамическому развитию, кто потрясает нашу стабильность и спокойную жизнь взрывами в минском метро и в братских российских посольствах», – усё роўна я застануся тут, каб прыняць гэты бязглузды вал зьнішчэньня і нянавісьці да ўсяго беларускага, самабытнага, нашага з боку вартых жалю нелюдзяў. Госпадзе! – ды ня ведаюць, што твораць, – хоць і прыкрываюцца мітрапалітамі, крыжамі, дамамі міласэрнасьці ды вызалачанымі цыбулінамі азіяцкіх храмаў.

— Як ставяцца твае землякі да тваёй дзейнасьці мастака?

— Мае землякі, хоць і жывуць шмат гадоў са мной побач, а некаторыя вучыліся да 5-й клясы са мной у школцы (далей я вучыўся ў Менску), дагэтуль зь недаверам ставяцца да мяне як да *мастака*. Гэта я бачу па тым, што чамусьці шмат якія мае аднавяскоўцы, сьпітыя маладыя людзі, якія дзесяцігодзьдзямі так і не набылі прафэсіі муляра ці аўтасьлесара, дрэваапрацоўшчыка ці будаўніка – як я люблю гэтыя прафэсіі! – просяць у мяне пры сустрэчы грошы на выпіўку. Хоць ведаюць, што я жыву ў гэткай хаце, як і яны, ня маю машыны, хаджу па ваду да крыніцы… На маё пытаньне, чаму яны ў *мяне* просяць на выпіўку, яны адводзяць вочы. Я чытаю ў тых вачах наступнае: гэта ж толькі прыкрыцьцё, што ты мастак (які дурны карцінкі будзе купляць за такія грошы, калі такое цяжкое жыцьцё навокал – на абутак, на харчы не стае?!), а насамрэч табе ж даюць грошы (у цілівізары казалі, што Амэрыка 40 мільёнаў даляраў пасьля «Акту аб дэмакратыі ў Беларусі» дае апазыцыянэрам), каб падбухторваў народ супраць Лукашэнкі. Таму можна й папрасіць у Пушкіна на выпіўку – бо калі дасьць, значыць, так і ёсьць – незароблены грошы!

Яшчэ мяне дзівіць біцьцё ў грудзі і гарачыя запэўніваньні, што «за цябе мы ўсе пойдзем, толькі скажы!». Я наіўна ім тлумачу, што ў дэпутаты я не зьбіраюся, вось люблю гультайнічаць і маляваць карцінкі. Яны чамусьці ня вераць. А мой былы аднаклясьнік, шафёр Мішка Марцінкевіч, кажа, што, маўляў, усё адно зваліш калі-небудзь – у Штаты ці куды яшчэ…

Бабулькі, што вельмі мяне любілі, калі я ў 1995–1998 гадах расьпісваў царкву, казалі мне ў 1999-м, пасьля тачкі з гноем для Лукашэнкі, такія словы: «Каб цябе так на той сьвет вазілі, як ты нашаму прэзыдэнту гной вазіў!» А з мамай, якая ўвечары сядзіць на лавачцы і чакае карову з пашы, перасталі сядзець і абыходзілі, не вітаючыся. А пасьля, як гэтую царкву пачалі паказваць па розных TV-каналах ды ў газэтах пісаць (яе не асьвячаюць дагэтуль, хоць і прывялі ў «богоугодный» выгляд, зафарбавалі часткі «Суднага Дня»), дык і ўвогуле паглядаюць на мяне, калі прыйду ў царкву, як на правакатара, глядзяць-сочаць. Ёсьць за маёй сьпінай нехта з камэрамі ды фотаапаратамі ці не?

Адзін мой сусед, што шчыра й добразычліва здароўкаецца са мной штодзень, стары дзядзька Жора Б., дык сфармуляваў свае адносіны да мастака сваім родным (зяць потым мне

пераказваў, вось таму й стала мне вядома гэтая шчырасьць!) наступным чынам: ай, каб ужо пасадзілі гэтага Пушкіна, дый ня выпусьцілі!..

І тым ня менш – я іх люблю, гэтых вялікіх, сапсутых калгасамі, хлусьнёй і сэлекцыяй Подласьці дзяцей, гэтых дзядзек і цётак, бо ўсё ж яны ЖЫВЫЯ, жывейшыя за гэтых халодных, ветлівых, разумных, прыгожых і рацыянальных замежнікаў – біяробатаў з усьмешкамі, пустымі вачыма і белазубымі амэрыканскімі смайламі! Бо я ж не выбіраў, што мяне Бог нарадзіў у сям'і электрыка і рабочай леспрамгасу. Тут мне і несьці маё дзіўнае гэтае *пакліканьне*, на якое нездаўменна паціскаюць плячыма мае сябры-інтэлектуалы, гарадзкія адраджэнцы-культуролягі, паэты і творцы, рэжысэры і «змагары»-краёўцы, былыя суседзі, што ўладкаваліся выгадна – ці ў прымы ў Менск, ці ў «мянтоўку», а сёй-той і прадпрымальнікам стаў, крамамі валодае.

— Што прымусіла цябе зрабіць свае першыя палітычныя пэрформансы?

— Страта пачуцьця страху пасьля войска (Алесь Пушкін удзельнічаў у савецкай інтэрвэнцыі ў Аўганістан. – **Рэд.**) і паездкі ў Вільню ў 1987–1988 гадах. Я там упершыню ўбачыў поўныя вулкі і плошчы людзей з нацыянальнай літоўскай сымболікай. І мне было 22–23 гады.

— Як ты ўспрыняў вестку пра тое, што Славамір Адамовіч папрасіў палітычнага прытулку ў Нарвэгіі? І як увогуле ставішся да палітычнай эміграцыі?

— Вельмі балюча ўспрыняў. Ён Паэт, і ня проста «пиит роз, аквамарина и женских ножек», а чалавек, які сьвядома прымерваў ляўровы вянок (ці цярновы) Каліноўскага і Купалы. І яму нельга было рацыянальна, суха пералічваць свае «геройствы», адседкі, зашыванье роту і прасіць палітычнага прытулку ў Нарвэгіі, ці дзе б там ні было, бо ў яго ёсьць ягоны народ. Народ гэты без такіх асобаў, як бараны расьсеяныя: «Порази пастыря – и овцы рассеятся…» Госпадзь паразіў, адабраўшы глузды ў свайго, *народнага* паэта. На гэтым тле жыцьцё выразна прадэманстравала значнасьць *старых*: Брыля, Барадуліна, Станкевіча.

Цяпер Славамірава жыцьцё ў тупіку: а) блізкага, роднага побач нікога няма! б) творчасьць ягоная – гэта літаратурны эксгібіцыянізм, так бы я назваў ягоныя нарысы ў «Нашай Ніве»;

в) веры ў Бога, Беларусь, сяброў у яго, паэта, – не стае! г) стаць вядомым нарвэскім, швэдзкім паэтам, літаратарам (фэномэн Уладзімера Набокава) – позна і нерэальна: бо не напіша на гэтых мовах так, як на беларускай.
Адзінае выйсьце – пакаяньне, вяртаньне ў Будслаўе да маці – разводзіць кветкі і «на стрэл» не падыходзіць да літаратурнай беларускай тусоўкі! Досыць шасьці кніжак паэзіі, уключна з «Плавільшчыкамі расы», каб патрапіць у гісторыю беларускага пісьменства.
Палітычная эміграцыя мае пад сабой грунт толькі пры наступных умовах: а) пагроза фізычнага зьнішчэньня (як у выпадку зь Зянонам Пазьняком; тым, хто ня верыць у сур'ёзнасьць прычынаў эміграцыі Пазьняка, прывяду прыклады з найноўшай гісторыі: сьмерць Вячаслава Чарнавіла, нядаўняе атручэньне Віктара Юшчанкі, лёс Джахара Дудаева); б) часовы пэрыяд эміграцыі з абавязковым вяртаньнем дадому (дарэчы, сп. Зянону можна было б ужо і прыехаць у свае Суботнікі, купіць там хату за 200–300 даляраў дый пісаць свае кніжкі, седзячы ў роднай хаце, робячы фатаздымкі туманоў дый складаючы белыя вершы, дасылаючы іх таму ж Барысу Пятровічу ў «Дзеяслоў»).
— Ці зьнікае ў людзей, з тваіх уласных назіраньняў, цікавасьць да мастацтва, у прыватнасьці, выяўленчага?
— Зьнікае. І зьнікае да ўсіх відаў мастацтва, апрача кінэматографу, тэатру (уключна з опэрай, балетам), рок-музыкі, эстрады, архітэктуры. Асабліва церпяць літаратура і выяўленчае мастацтва.
Адышлі ў нябыт часы Гогаля ды Пушкіна, Талстоя ды Байрана, Маякоўскага ды Дзям'яна Беднага! Нават Пастэрнака ды Салжаніцына!
— Што табе падабаецца ў сучасным выяўленчым мастацтве Беларусі?
— Мне падабаецца простая, традыцыйная постаць *мастака, грамадзяніна, настаўніка*, у рэшце рэшт, – бацькі, сем'яніна і верніка – Гаўрыіла Харытонавіча Вашчанкі.
— А ў беларускай літаратуры?
— У беларускай літаратуры мне падабаецца цяпер Альгерд Бахарэвіч і, ня ўвесь, а часткова, Юры Станкевіч зь яго раманам «Любіць ноч – права пацукоў». Яшчэ – кавалкамі, сур'ёзнымі рэчамі – Андрэй Хадановіч («Верш на Свабоду», «Тры каралі»,

некалькі лімэрыкаў). Падабаюцца яго пераклады. Я цяпер ілюструю ягоную кнігу «Разам з пылам. Калекцыя перакладаў». У кнізе сабраныя сто вершаваных перакладаў зь сямі моваў сьвету, зробленыя ў 1996–2003 гадах.

— Як бы ты падрахаваў свае сёньняшнія творчыя дасягненьні?

— Калі сур'ёзна, дык мае творчыя дасягненьні наступныя:

а) Упершыню з 1516 году ў старажытным мястэчку Бобр, паміж пушчаў-балот беларускай зямлі, жыве прафэсійны мастак, які ўжо 33 гады малюе і жыве з гэтага маляваньня ў хатцы на беразе ракі з жонкай Янінай і сынам Міколкам. Такога тут яшчэ не было.

б) Расьпісаў і адрэстаўраваў наступныя хрысьціянскія бажніцы: Катэдральны касьцёл Дзевы Марыі ў Магілёве; царкву ў мястэчку Бобр у гонар Сьв. Міколы; капліцу Сьв. Яна-Хрысьціцеля ў Менску, у Серабранцы; касьцёл Сьв. Мацьвея ў Раўбічах; касьцёл Сьв. Архангела Міхаіла ў вёсцы Міхалішкі, што на Астравеччыне.

в) Зрабіў некалькі гучных пэрформансаў, за якія двойчы асуджаны.

г) Зрабіў некалькі запамінальных выставаў, якія, спадзяюся, надоўга застануцца ў памяці людзей зь Менску, Віцебску, Магілёва, Воршы, Вялейкі, Браслава, Слоніму, Масквы, Прагі.

д) Меў у Віцебску першую прыватную галерэю сучаснага мастацтва «Ў Пушкіна», дзе дзейнічала лябараторыя экспэрымэнту, жывога мастацкага працэсу пэрыяду «культпрасьвету» 1991–1995 гадоў.

е) Паставіў некалькі спэктакляў на сцэне Беларускага нацыянальнага акадэмічнага тэатру імя Якуба Коласа ў Віцебску ў якасьці мастака-сцэнографа і афарміцеля. Працаваў з рэжысэрамі Валерам Масьлюком (1994 год) і Антонам Грышкевічам (1997–1999 гады).

ж) Афарміў некалькі кніжак сучасных беларускіх паэтаў: Міраславы Лукшы (1994 год) і Людмілы Сіманёнак (1997 год).

з) Стаў бацькам беларускіх татуяваньняў. Першым зрабіў сабе бел. tattoo.

і) Урэшце, напісаў некалькі станкавых карцінаў, якія сталі шырока вядомымі і часта рэпрадукаваліся: «Эпітафія дзеду», «Белая Панна», «Сьвяты Мікулаш над Прагай» (растыражавана ў Празе).

— Пра якую мастацкую акцыю ты марыш?
— Зьняць фільм пра Беларусь і беларусаў, як Эмір Кустурыца, але больш стылёва, з большым пачуцьцём густу, меры, шарму і вытанчанасьці. Не выпадкова я згадаў Эміра Кустурыцу, бо гэты гумар цяпер проста неабходны, як паветра, у нашай застрашанай, таталітарнай Беларусі, якая нагадвае «небольшой колхоз». І вось у гэтай «кустурыцаўскай» Беларусі ролю цыганскага барона будзе весела граць самі ведаеце хто! (*Съмяецца.*)
Гутарыў Алесь Аркуш
11–12 кастрычніка 2004, Бобр

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image] [image] [image] 2005

"да Заістэ"

паэзія • эналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Андрэй Хадановіч
З цыклу «Неба над Бэрлінам»

ДРАЙВ

Тут магла быць халяўная рыфма «кайф»,
але наш драйвэр *гаворыць прозаю.*
Я разумею прыкладна трэйцюю частку,
таму застаецца радыё.

У бэрлінскім FM-е цесна:
дваццаць чатыры гадзіны джазу
і дваццаць чатыры – клясыкі.

Моцарт добра адпавядае
рухам нашага кіроўцы.
Усё віртуозна
і па-нямецку дакладна,
нібы спэцыяльна прыдумана
для вялікага слаламу ў дарожным корку:
трапіў –
цяпер адкаркоўвай,
і ён адкаркоўвае
ў рэ міноры,

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

Першая кніга лірыкі Андрэя Хадановіча выйшла ў 2001 годзе ў кіеўскім выдавецтве «Факт» на ўкраінскай мове. Пазалетась у выдавецтве «Логвінаў» выйшаў друкам яго першы беларускамоўны зборнік «Старыя вершы», а летась тамсама – другі («Лісты з-пад коўдры»).

мажор!

Зусім іншае джаз.
Цябе ахоплівае паніка.
Табе здаецца, што Оскар Пітэрсан
грае апошні раз у жыцьці.
Прынамсі, тваім.
Бо кіроўца,
зачараваны чарговаю сынкопай,
вось-вось ня ўпішацца ў паварот,
і тады пачнецца сапраўдны джаз,
музыка для тоўстых рэаніматараў,
якія доўга ня змогуць сьцяміць,
што здарылася:
ці то дзьверцы заклініла,
ці то цябе пераклініла,
ці ўва ўсім вінаваты драйвэр,
каторы
у аўтамабільным заторы
дачакаўся свайго саторы.

СУХІ ЗАКОН

«Пара па пабах!» –
гучыць немілагучна,
асабліва гэтае «па-па»,
нібы намякае на разьвітаньне,
а вечар яшчэ толькі пачынаецца.

З табой іранічны іранец,
крыху затурканы турак,
два расьсеяныя расейцы,
вугорац,
чарнагорац,
шатляндзкі горац
і твая сяброўка,

у якой сёньня сухі закон.

Некалі ўва Ўкраіне
гасьцінныя гаспадары
спакавалі табе ў дарогу сухі паёк,
у які ўваходзіла пляшка гарэлкі,
пляшка віна
і, чамусь, палка кілбасы,
прычым нават кілбаса там не была сухой,
што ўжо казаць пра віно,
ружовае й дэсэртнае,
як салодкая мара.

Ваш аўтобус тады зламаўся
і тры гадзіны прастаяў у Бярдзічаве,
дзе кожная афіцыянтка ведае,
хто такі Джозэф Конрад
і дзе вянчаўся Бальзак.
Але ты вытрымаў
усе тосты за Эвэліну Ганскую
і «Вока цемры»,
хоць уваччу раз-пораз
згушчалася цемра,
і цябе хістала,
як верталёт пад музыку Вагнэра,
і ты разумеў,
што апакаліпсіс – менавіта сёньня.

Сёньня вы ў Бэрліне,
дзе дождж і немцы,
як напісала твая сяброўка,
у якой сухі закон;
хоць ты не губляеш надзеі,
што хутка ён зьменіцца паўсухім,
а калі пашанцуе, то й паўсалодкім.
Цябе ж адразу ахапіла гарачка,
белая й нефільтраваная,
жывая.

Weissbier –

трэйці нямецкі выраз,
які ты навучыўся вымаўляць без памылак.
Раней былі «хендэ хох!» і «ніхт шысэн!»,
калі ты гуляў у вайнушку,
але маленькім партызанам не налівалі піва,
і вам заставалася адно пускаць пад адхон цягнікі.
(Зрэшты, арганізатар «Літаратурнага Экспрэсу»
сёньня падазрона на цябе пазіраў.
Мо ў цябе яшчэ ўсё наперадзе?)

З табой іранічны іранец,
крыху затурканы турак
і рэшта паэтаў.
Шкада, адсутнічае фін-інспэктар,
таму кожны сам за сябе.

Тваіх кішэнных
хапае роўна на шэсьць кухляў Weissbier
і адзін палітнекарэктны верш,
таксама белы і нефільтраваны.

ПРАГНОЗ
НАДВОР'Я

Едучы ў гатэльным ліфце,
дазнаешся шмат цікавага.
Не, не пра тое, ці шмат паверхаў,
гледзячы на кнопкі;
і не пра ўласнае сьвінства,
гледзячы ў люстэрка;
і нават не пра ход чэмпіянату Эўропы па футболе,
што фіксуецца ў адмысловай табліцы.

Гатэльны ліфт насамрэч –
маленькі філіял бэрлінскай абсэрваторыі,
і кожнага ранку
ты чытаеш апошнія зводкі

зь нямецкага атмасфэрнага фронту,
каб выйсьці ў горад
і на ўласнай скуры пераканацца,
што прагнозы – рэч няўдзячная,
а мокрая кашуля – бліжэйшая да цела.

Штось ня так,
штось ня так з гэтым небам,
ад якога не ратуюць
ні хованкі ў найбліжэйшай краме,
ні парасон, прынагодна куплены
ў гэтай краме,
ні алькаголь, прынагодна куплены
на радзіме.

Вядома ж, можна цэлы дзень
праседзець у гатэлі,
але й адтуль адкрываецца відаль
на бэрлінскае неба
зь яго перыстымі аблокамі,
кучавымі хмарамі
і пералётнымі анёламі
«Люфтганзы».

І нават схаваўшыся
у Музэі кіно на Патсдамскім пляцы,
ты маеш усе шанцы
пабачыць найлепшыя кавалкі
неба над Бэрлінам.

УНТЭР ДЭН ЛІНДЭН

Васілю Сёмуху

Ліпа цьвіла першы дзень.
Цікава, што сказаў бы на гэта клясык?
Пагатоў, суседнія ліпы цьвілі таксама.

Усе бяз вынятку.
Менавіта ў іхных шатах і пачаўся ліпень,
а календар адно засьведчыў – 1.07.

Першага ліпеня я апынуўся
пад ліпамі на аднайменнай вуліцы –
і адразу ж натрапіў на квартэт.
Так, слова гонару, ніякіх баек.
Вядома ж, людзі.
Усе чатыры акардэаністы
зь фірмовымі «Вэльтмайстарамі».
(Я бачыў такія ў Музэі музычных інструмэнтаў.)
Усе ў шэрых гальштуках і мэлянхалічным настроі.
Усе ў шэраг на адной лавачцы,
хоць, як тут ні сядай, відаць, што прафэсіяналы.

Але ж ня граюць. Ці то адпачываюць,
ці то й не зьбіраліся граць,
пасаджаныя тут зь нейкай іншаю мэтай –
відаць, аздабляць і без таго шыкоўны краявід.
Чатыры рарытэтныя акардэоны –
і так досыць, і так клёва, чаго ж табе яшчэ?
З музыкай быў бы перабор
і нэрвы проста ня вытрымалі б.
Як і песень салаўя,
што не патрабуе беларускага перакладу,
колькі ні сьвішчы «цёх-цёх-цёх-цёх!»
замест арыгінальнага «тандарадэй!».

Не хапала тут толькі мілоснай песьні,
love story *васьмісотгадовай даўніны,*
калі хлопцы й дзяўчаткі і блізка ня чулі
пра сэксуальную рэвалюцыю,
але пасьпяхова зьдзяйсьнялі злачынствы,
адзінымі сьведкамі якіх
заставаліся нямецкія нахтыгалі!
Вось толькі паказаньняў іхных
не зразумеў бы ніводны суд,
хоць «цёх-цёх-цёх-цёх!» скажы,
хоць «тандарадэй!».

Мая чачэрская бабуля
не чытала Вальтэра фон дэр Фагельвайдэ,
але штолета выпраўляла мяне пад ліпы
зьбіраць квецень на ліпавую гарбату.
І я караскаўся на дрэвы
і набіваў пакеты зялёнаю панацэяй,
не шкадуючы ні натхненьня, ні часу.
Зрэшты, ня толькі на гэта.
Дый чаго шкадаваць,
калі губляючы, толькі набываеш,
калі даўно змоўк апошні акардэон,
а ўвушшу гудзе «цёх-цёх-цёх-цёх!»,
зразумелае безь перакладу.

І цяпер згадваю
усё, што некалі сарваў, спакаваў і засушыў,
і зноў не шкада страчанага часу,
бо такі знайшоў, –
і квецень на Унтэр дэн Ліндэн
нагадвае ня толькі смак даўномінулай гарбаты.
Вось яно, простае чалавечае шчасьце,
і хай толькі хто-небудзь,
хай толькі які подзеўбень
паспрабуе назваць яго ліпавым!

чэрвень–ліпень 2004, Бэрлін–Менск

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image] [image]2005

"да Зместу"

паэмыка • эналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Юрась Барысевіч Сусьвет Слова

Ад іншых біялягічных відаў чалавецтва адрозьніваецца найперш тым, што ня мае агульнае мовы: кожны народ і некаторыя асобныя людзі (мастакі, навукоўцы, шыфравальнікі) ствараюць уласныя знакавыя сыстэмы. Радыюс

ЮРАСЬ БАРЫСЕВІЧ (нар. у 1966 г. у Менску) – філёзаф, мастак, перакладчык, аўтар кніг «Цела і тэкст» і «Alter Nemo». Сярод апошніх публікацыяў – эсэ «Быць і выглядаць» («Дзеяслоў». № 11) і «Аўтар як суаўтар» («Тэксты». № 1).

чалавечага
голасу
параўнальна
невялікі, і
гэта сталася
прычынаю
вынаходзтва
музычных
інструмэнтаў
(а потым і
радыё), якія
мусілі
ўзмацніць
альбо
падмяніць
жывы голас.
Тэлеграфаваць
патрэбную
вестку
нашым
продкам
дапамагалі
таксама
вогнішчы на
вяршынях
пагоркаў,
сонечныя
«зайчыкі»,
пункцірныя
слупы дыму
ці пылу.

Найбольш дасканалы спосаб перадачы зрокавых знакаў – гэта малюнкавае пісьмо. Усе графічныя віды пісьма паходзяць ад піктаграмаў. Ад іх жа паходзяць кіно й кампутарныя гульні. Вядома, што піктаграфіяй цікавіўся Ленін: у Цэнтральным партыйным архіве пры ЦК КПСС захоўваўся піктаграфічны ліст правадыра бальшавікоў, напісаны на бяросьце. Найбольш верагодная вэрсія ягонае расшыфроўкі такая: шасьцёра таварышаў прагаладаліся пасьля паляваньня на мядзьведзя

(пэрсаніфікаваны вобраз царскае Расеі?) і просяць чорнабародага чалавека вярнуцца на явачную кватэру ля возера й пакарміць іх.
На працягу амаль усёй гісторыі валоданьне пісьменнасьцю было прывілеем сьвятароў, і таму яно было зьнітаванае з магічнымі ці рэлігійнымі практыкамі. Як і ў сучасных шыфравальных сыстэмах, пісьмо служыла не для адкрыцьця, а для закрыцьця сьвятарных таемных ведаў ад чужынцаў і прафанаў. Стаўленьне да ўсялякага пісьмовага тэксту як да скарбу (а да ўменьня чытаць і пісаць – як да магічнага мастацтва) трывала ў народзе ажно да вынаходзтва кнігадрукаваньня і нават даўжэй – да абвяшчэньня свабоды друку.
Сёньня магію пісьма й чытаньня адчуваюць хіба мастакі. Традыцыйны альфабэт пакрысе страчвае цэнтральнае месца ў камунікацыйным шкілеце культуры. І адзін з прыкладаў таго – эзатэрычныя авангардныя практыкі, у якіх літаратура адмаўляецца ад сваіх трывіяльных словаў ці саміх літараў, спадзеючыся знайсьці больш выразныя і ёмістыя знакі. Літаратар ці мастак (у авангардыстаў гэта адно і тое ж) ператвараецца ў жраца, які мусіць тлумачыць аўдыторыі, што такое ён напісаў, бо сама яна прачытаць гэтыя мудрагелістыя тэксты ня ў стане.
Шмат цікавага досьведу ў гэтым пляне назапасіў французскі летрызм. Пачынальнік «гіпэрграфічнае прозы» («мэтапрозы», «звышпісьма») Ізідор Ізу ў 1950 годзе апублікаваў «Эсэ пра вызначэньне, эвалюцыю і татальны пераварот прозы і раману», дзе прапанаваў замяніць вычарпаныя сродкі эўрапейскае літаратуры новымі альбо добра забытымі сыстэмамі пісьма: піктаграмамі, ідэяграмамі, сьцягамі, рэбусамі, крыжаванкамі, стэнаграфічнымі значкамі, шыфрамі, гіерогліфамі і г. д. Летрысты замяняюць некаторыя словы ў фразе малюнкамі, складаюць тэкставыя каляжы, скарыстоўваюць шрыфты розных колераў, ствараюць трохмерныя тэксты (рэльефы, скульптуры, архітэктуру), здымаюць фільмы, дзе кадры адпавядаюць літарам, словам ці фразам. Тэкст можа мець электрычныя якасьці (электрараман), розныя пахі (фумараман), хаваць у сабе разнастайныя рэчы альбо інсэктаў і жывёлаў (заапроза). Скарыстоўваюцца празрыстыя старонкі, сымпатычны атрамант, шматслойны (геалягічны) друк.

Кожны летрыст імкнецца стварыць свае сыстэмы пісьма. Літары ў гэтых тэкстах часта гэтак маленькія, гэтак вялікія альбо гэтак перакручаныя, што прачытаць іх звычайным зрокам немагчыма (часам такія старонкі чаргуюцца са звычайнымі – каб непадрыхтаваны чытач мог хоць нешта зразумець). У некаторых выпадках органы пачуцьцяў чытача мусяць падмяняць адно аднаго: напрыклад, ілюстрацыі трэба ўспрымаць ня зрокам, але носам, а з дапамогаю вачэй паспрабаваць пачуць музычны твор, схаваны ў літарах. Экспэрымэнтальная літаратура зь яе напаўабстрактнымі тэкстамі мае нашмат больш глыбокія карані, чым літаратура рэалістычная, гісторыя якой вымяраецца некалькімі стагодзьдзямі. Дый першыя мастакі, што малявалі на сьценах пячораў і костках, былі абстракцыяністамі: выявы жывёлаў зьявіліся значна пазьней. Дарэчы, калі самім жывёлам – малпам ці сланам – даюць пэндзлі й фарбы, яны таксама малююць не партрэты знаёмых, а нешта такое ж загадкавае, як гіерогліфы, якімі пішуць вецер і дождж.

Трэба пераадолець самазакаханы антрапацэнтрызм жыхароў «галяктыкі Гутэнбэрга» – пераадолець уяўленьне, што толькі чалавек можа быць чытачом. Хіба нам адным штосьці гавораць зоркі над галавою, пахі кветак, дзіўныя плямы на сьценах пячораў альбо тэлеэкранах? Чалавечая мова – толькі адно з адгалінаваньняў мовы сусьветнай, побач з мовамі зьвяроў і кампутараў, сонечных зацьменьняў і землятрусаў. Усё, што мы спазнаем і прамаўляем, мы, магчыма, папросту *перакладаем* зь якой-небудзь іншае, нечалавечае мовы.

Грамадзкія казюркі – пчолы, тэрміты, мурашы – скарыстоўваюць у якасьці пісьмовае паперы ежу. Усе жыхары тэрмітніку – лічынкі, рабочыя, жаўнеры, каралева – уяўляюць сабой, так бы мовіць, агульны стрававод. Усялякі, нават найменшы драбок ежы ніколі не ператраўляецца індывідуальна. У выглядзе адрыжкі, поту ці іншых экскрэмэнтаў ежа перадаецца, нібы эстафэта, ад аднаго тэрміта да іншых сотні разоў. А разам зь ёю перадаюцца хімічныя рэчывы, якія кіруюць літаральна ўсім грамадзкім жыцьцём: заклікаюць даглядаць дзятву, карміць начальства, бараніць дзяржаву ад варожага нашэсьця. Мова пахаў мае нават свой сынтакс: спалучэньне розных фэрамонаў азначае іншую інфармацыю, чым кожны зь іх паасобку.

Шмат у якіх жывёлаў камунікацыя, як і ў людзей, адбываецца праз жэсты, акустычныя сыгналы, узоры на скуры. Напрыклад, сабакі маюць каля трыццаці розных «словаў»: па-рознаму афарбаваныя скавытаньне, гаўканьне, віск. Маўленьне жывёлаў аднаго віду, што жывуць у розных рэгіёнах, крыху адрозьніваецца. Гэта яшчэ ня розныя мовы, але розныя дыялекты.

Жывёлы не разумнейшыя за нас, але гэта значыць, што й не дурнейшыя. Маскоўскі авангардыст Алег Кулік рэклямуе сябе як новага Ісуса Хрыста – ахвярнага Збаўцу, пасланага нябёсамі ўжо ня толькі людзям, але і нашым сваякам – жывёлам ды інсэктам. Падчас пэрформансу «Сабака Паўлава» голы мастак быў укрыжаваны на лябараторным абсталяваньні акадэміка Паўлава, дзе калісьці былі закатаваныя сотні сабак. Здараецца, на выставах Кулік кусае гледачоў за ногі, але найбольш уславіла яго акцыя ў Нью-Ёрку, дзе ён месяц, не разгінаючыся, пражыў у клетцы для хатніх жывёлаў. Кулік распрацоўвае тэорыю гэтак званай *заафрэніі*, спрабуе сфармуляваць свайго кшталту Найноўшы Запавет, сутнасьць якога – абуджэньне ў людзях першабытнае жывёльнае вітальнасьці. У кожным з нас, сапраўды, сьпіць жывёліна, але, спадзяюся, і ў кожнай жывёліне сьпіць чалавек ці нейкая іншая разумная істота. (Здараецца, чалавек сьпіць і ў самім чалавеку.)

У адрозьненьне ад жывёлаў, чалавек ня мае адмысловых органаў для зносінаў з суродзічамі. Рука не была створаная для пісаньня, і рот ня быў створаны для маўленьня. Акурат адсутнасьць натуральнага органу камунікацыі прымусіла чалавека вынаходзіць разнастайныя спосабы зносінаў з супляменьнікамі – акустычныя, графічныя, электронныя, і канца гэтаму пошуку паразуменьня не відаць.

Сусьветныя камунікацыі ўжо існуюць, а вось сусьветную культуру ўявіць сабе пакуль цяжка. Напрыклад, ёсьць нямецкамоўная літаратура, гішпанскамоўная і г. д., але сусьветнае літаратуры няма. Пераклады толькі часткова вырашаюць праблему паразуменьня паміж народамі (альбо паміж пакаленьнямі). Сусьветнае гісторыі таксама пакуль няма: у кожнай краіне падзеі мінуўшчыны бачацца і выкладаюцца ў школах інакш, чым за мяжою. *Сусьветная нацыя* зьявіцца тады, калі высокія тэхналёгіі дазволяць нам дакладна разумець іншамоўныя тэксты і жэсты. Гэта значыць, калі кожны чалавек

паводле аб'ёму памяці й сьмеласьці ўяўленьня будзе роўны ўсяму чалавечаму роду. Дый жывёльнаму царству таксама. Колькасьць жывых моваў і дыялектаў на плянэце паступова скарачаецца пад ціскам некалькіх найбуйнейшых – найлепш распрацаваных і найбольш канкурэнтаздольных. Можа нават падацца, што ўрэшце на Зямлі застанецца адна супольная мова (ангельская, эспэранта ці нейкая новая – супольная для людзей, кампутараў і жывёлаў). Хутчэй за ўсё, гэтак ня будзе: акуляры ці завушніцы, падлучаныя да Інтэрнэту, будуць сынхронна перакладаць нам пачутыя ці прачытаныя думкі зь «вялікай» мовы на тую ці іншую мясцовую. І тады лякальныя мовы перастануць вымірaць. Больш за тое, адродзяцца некаторыя з тых, што ўжо даўно выйшлі з ужытку. Развою нацыянальных моваў будуць пагражаць ня столькі інтэрнацыянальныя, колькі індывідуальныя: кожны зможа стварыць сабе новую мову для ўласнага карыстаньня. Вынаходзтва друкаваных кніг у свой час стварыла ўмовы для *нацыяналізацыі літаратуры*; кампутар падрыхтаваў яе *прыватызацыю*. Ценкая паверхня акуляраў ці старонак самой кнігі дазволіць нам зьмяняць на свой густ шрыфты, імёны герояў, фасон іхнае вопраткі на ілюстрацыях. Па сутнасьці, кожны чытач будзе рабіць уласнае перавыданьне ўпадабанага твору. Трэба будзе толькі спачатку запоўніць анкету (родная мова, узровень адукацыі, настрой і г. д.), каб кніга атрымалася максымальна цікавая і зразумелая. Зрэшты, праблему адаптацыі тэксту можна вырашыць і інакш: перад чытаньнем зьмяніць пол, тэмпэрамэнт, колькасьць вачэй да таго стану, на які разьлічваў аўтар, калі ўяўляў сабе ідэальнага чытача. Мэтаю *інфармацыйнае рэвалюцыі* зьяўляецца стварэньне ўнівэрсальнага чалавека, які будзе безь вялікіх праблемаў мяняць прафэсію, грамадзянства, мову, пол, век і нават прыналежнасьць да свайго біялягічнага віду. Паступова зьявяцца новыя формы жыцьця: электрамагнітная, сьветлавая, этэрная і г. д. Правадамі і радыёхвалямі будуць трансьлявацца ня толькі тэксты, але й самі людзі. Зноў актуальнаю будзе ўспрымацца перасьцярога вэтэрана партызанскага руху ў камунікацыях Францішка Багушэвіча: «Не пакідайце жывога этэру, каб ня ўмёрлі!»

Звонку, напэўна, ужо падаецца, што плянэта пакрываецца інфармацыйнымі каналамі, нібыта цьвільлю. Хутчэй, гэта

кокан, у якім высьпявае чалавек-сусьвет, злучаны праз камунікацыйныя сеткі з усімі існуючымі тэкстамі.
«Няма нічога па-за тэкстам» (Жак Дэрыда). Валянцін Акудовіч у эсэ «Архіпэляг Беларусь» параўноўвае нацыю зь бібліятэкаю (наборам тэкстаў). Галілей меркаваў, што «кніга прыроды» напісаная на лічбавай мове матэматыкі. Хімікі разглядаюць рэчавы сьвет як тэкст, які можна перапісаць нейкай сотняю літараў (паводле элемэнтаў табліцы Мендзялеева), а генэтыкі пішуць партрэты жывых істотаў з дапамогаю чатырох «літараў» (нуклеатыдаў) ці двух дзясяткаў «складоў» (амінакісьлінаў). Псыхафізіёлягі спадзяюцца расшыфраваць нутраную мову чалавечых мазгоў (яна, пэўна, падобная да кампутарных моваў) – авалодаць нэўроннымі кодамі, зь якіх складаюцца нашыя эмоцыі, лад мысьленьня, асаблівасьці асобы. Найвялікшая таямніца быцьця – хто, каму і пра што піша колерамі рэчаў, кроплямі дажджу, «альфабэтам» элемэнтарных часьцінак квантавае фізыкі.
«Выбух камунікацыі» пачаўся не з вынаходзтва пісьма альбо ўтаймаваньня электрычнасьці, а на 15 мільярдаў гадоў раней – зь Вялікага Выбуху, у якім нарадзілася рэчаіснасьць. Кнігі й жэсты, пахавая камунікацыя мурашоў, хімічныя рэакцыі, грукат рэчаў – гэта ўсё водгульле першае ноты, зь якой пачаўся «ўвесь гэты джаз» (як і бальшыня нашых словаў, яна, хутчэй за ўсё, была выпадковая, ніякага асаблівага сэнсу аўтар у яе не ўкладаў).
Пры канцы нашага сьвету ўсе мовы й падзеі, мабыць, зноў зьліюцца ў адну выніковую ноту, але наўрад ці тую самую, што нарадзіла нас. Кожны сусьвет гучыць па-свойму, хоць, здараецца, і паўтарае які-небудзь з папярэдніх, як могуць паўтарацца словы ў тэксьце. І ня толькі мы тут жывём у рэху нечага слова: з кожнае нашае думкі таксама дзесьці пачынаецца новы сусьвет.
P. S. Прапаноўваючы гэты тэкст для публікацыі ў нумары часопісу, прысьвечаным беларускім амбіцыям, аўтар зыходзіў зь меркаваньня, што добрыя амбіцыі павінны яднаць ня толькі беларусаў і нават ня толькі людзей.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]2005

паэзія • проза • эсэ • аналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image] **МІЛЕНКА ЕРГАВІЧ**

Міленка Ергавіч Асаг

Ня памятаю, калі гэта было. Дзіва, што я наагул яшчэ нешта памятаю ў гэткім веку. Таму больш не пытайся ў мяне, калі, калі, калі... Адкуль я ведаю, калі!? І чаму табе гэтак важна, калі гэта было? Галоўнае, што было. А можа й гэта не галоўнае. Галоўнае,

што гэта
добрая
гісторыя і
што яе
апавядаюць,
колькі я
сябе
памятаю, а
гэта ўжо,
дзякаваць
Богу,
дзевяносты
год. Можа
быць, яе
апавядалі і
раней, але я
пра гэта ня
ведаю і ня
стаў бы табе
хлусіць, калі
ня ведаю.
Значыцца,
магу я і
схлусіць,
было б гэта
ня першы,
ня соты раз,
я, здаецца, у
жыцьці
больш
хлусіў, чым
казаў
праўду, але
хіба б ты
мяне стаў
слухаць,
калі б
наперад
ведаў, што я
табе нешта

Была ў аднаго дуброўніцкага гандляра адзіная дачка, што звалася Мара. Яна прыйшла на сьвет, так бы мовіць, у апошні момант, маці нарадзіла яе ў сорак тры, калі ўжо больш ніхто не спадзяваўся, што ў доме Івеціча нехта яшчэ можа нарадзіць. Стары Шымун, так зваўся той гандляр, у першую хвіліну ня надта і ўзрадаваўся, што яму Вінка, а так звалася ягоная жонка, нарадзіла на сьвет дзіця жаночага полу. Загасьне ягоны род, зьвядзецца ягонае імя, ня будзе больш Івецічаў, як бы іх ніколі й не было на сьвеце. Але праз тры месяцы, калі дзіцятка першы раз усьміхнулася тату, Шымунава жаданьне павярнулася, прапаў усялякі гнеў, і ўжо сваю Мару ён не аддаў бы й за сто сыноў. Так ужо звычайна бывае з б*а*цькамі. Яны хацелі б сыноў, хацелі б пасылаць іх на вайну, каб тыя не вярталіся, і яны шчасьлівыя, калі ў іх нараджаюцца сыны. Але шчасьце тое трывае каротка. Сапраўдная і доўгая бацькава любоў пачынаецца з дачкою.

Дзяўчынцы споўнілася пяць гадоў, Шымун глядзеў на яе, як на Бога, і зоркі б ёй зь неба здымаў, калі б мог, але Горад не пераставаў гудзець пра тое, як хутка загасьне Івецічава імя і што ўжо й самога Шымуна ня варта званаць Івецічам. Хутка ён памрэ, дык лепш ужо прызвычаіцца, што няма ўжо й племя ягонага. Пахавалі са злосьці імя, перш чым памёр той, хто яго носіць. Людзі любяць такія рэчы, як любяць і пахаваньні. Нідзе, як толькі на пахаваньні, ты не адчуваеш сябе жывым, і ніколі табе тваё імя не здаецца такім вялікім і важным, хоць бы ты й быў апошнім бедаком зь сям'і найбяднейшых сіротаў, як калі зьнікне нейкае з шанаваных імёнаў.

Даходзілі да яго гэткія словы, бо яны й прамаўляліся, каб дайшлі да таго, каму ад іх найбольш забаліць, а Шымун цярпеў, не адказваў і не зважаў, і толькі ў душы ягонай зьбіралася лютасьць. Бо ведаеш, Івецічы здаўна жылі па-за гарадзкімі мурамі, і колькі б ні расло іхнае багацьце, іх не пускалі ў Горад і не давалі ім адчуць сябе панамі. Была ў гэтым варажнеча, але было яшчэ й нешта іншае. Сем'і, якія мелі добрую славу і моц, але жылі па-за мурамі, некалі былі найлепшай вайсковай сілай Дуброўніцкай Рэспублікі. Іхная лютасьць бараніла муры ад заваёўнікаў. Магчыма, дубраўчане ўрэшце і дамовіліся б з туркамі, але зноў жа, быў патрэбны

нехта, пра каго б ведалі, што яму няцяжка было б загінуць. На халеру дыпляматычная дамова, калі перад тым ня ўпала ніводная мёртвая галава? Як нічога не былі б вартыя і замірэньні, калі б яны не падпісваліся крывёю. Кожнай дзяржаве заўсёды былі неабходныя шаленцы, якія ў любы момант гатовыя кінуцца ў бітву. Як тыя нэгры, што цяпер бегаюць на сто мэтраў. Нізкі старт, а пасьля гоп – і ў магілу. У Івеціча сьмерць была ў крыві. У крыві іхнай была тая пчаліная лютасьць, якая за ўсе лютасьці найбольшая: пчала ведае, што мае толькі адно джала і што памрэ, як толькі ўджаліць. Таму й беражэ сябе да таго імгненьня, калі няма больш ратунку для яе і ейнага роду. Ну дык вось, так Шымун Івеціч гуляў з малой Марай па Страдуне, з аднаго канца Гораду ў другі, а тады ішоў у вялікі прыгожы дом на Пілах, а ў доме тым разьвейвалася ягоная пчаліная лютасьць.

У царкве падсьмейваліся, калі яго бачылі, а сьвятар казаў, як Бог стварыў жанчыну, каб яна маўчала і клалася пад мужчыну, калі ёй гэтак загадаюць. І яшчэ казаў, што жанчына ня мае свайго твару, бо жаночы твар – д'яблаў твар, а пабожная і прыстойная жанчына мусіць мець твар свайго мужа. Вернікі пагаджаліся са сьвятаром. Пагаджаліся бабы з чорнымі хусткамі замест галоваў. Пагаджаліся і манашкі, мабыць, упэўненыя, што замест сваіх носяць Божыя твары. І Шымун перастаў хадзіць на імшу дый Вінцы сваёй забараніў калі-небудзь пераступаць царкоўны парог. Ня ведаю, што гэта былі за часы, але, мабыць, было тое даўно, бо сьвятары больш такіх рэчаў ня кажуць.

Шымун глядзеў на расьпяцьце над ложкам, і ў нейкі момант яму падалося, што і Расьпяты падсьмейваецца гэтак сама, як падсьмейвалася паства ў царкве. Або яму падалося не зусім гэта, а нешта іншае. Што б там ні было, ён зьняў расьпяцьце са сьцяны і паклаў яго ў шафу на накрухмаленыя белыя прасьціны. Вінка гаварыла яму, каб ён гэтага не рабіў, а ён ёй сказаў, што калі яна яшчэ вымавіць хоць слова, ён возьме сякеру і пасячэ крыж на дровы. Жонка моўчкі глядзела на яго. Яе не абыходзіла ні прозьвішча, ні тое, што гасьне Шымунаў род. Жанчынам да такога ніколі не было справы. І калі ты мяне спытаеш, я скажу табе, што іхная праўда. Імя – прычына зла, крыві і вайны, дык і лепей было б, каб усе мы былі без імёнаў. Няшчасная жанчына жагналася, калі мяняла пасьцель і

даставала з-пад крыжа прасьціну. Калі яна разгортвала яе, дык замест аднаго зьяўляліся абрысы дванаццаці расьпятых. Дванаццаці зусім аднолькавых, і хто ведае які зь іх сапраўдны. Для беднай Вінкі гэта было важней за любыя імёны.
І тады Шымун Івеціч адной ночы пайшоў на Жыдоўскую вуліцу, да нейкага Салямона Леві, які ня быў рабін, але ведаў усё тое, што мусяць ведаць рабіны, і сказаў яму, што ён і ягоная сям'я хочуць стаць юдэямі, дык што для гэтага трэба зрабіць. Леві адказаў яму, тут усё проста, калі слушна ўсё зразумееш. Калі на пачатку ведаеш, што будзе ў канцы, тады спакойна пройдзеш адразу на канец і зробіш апошнюю рэч. «А што апошняе?» – пытаўся ў яго Шымун. «Апошняе – гэта тое, што ты падпаліш гэты дом і ўсе жыдоўскія дамы ў Горадзе. Перад тым яшчэ можаш толькі перарэзаць горлы ўсім сынам Абрагамавым». «Дык значыць, ты ня прымеш мяне сярод сваіх?» – не зразумеў Шымун. «Гэта неістотна, – сказаў яму Салямон Леві, – бо гэта ня будзе значыць нічога, апрача таго, што і тваё горла будзе перарэзанае, і твой дом будзе спалены. А таму ідзі з божым мірам дадому, і калі ты добры чалавек, дык не кажы нікому, што ты быў у мяне. Бо ўжо калі ты толькі скажаш, нашто сюды прыходзіў, гэтага будзе дастаткова, каб усе мы згарэлі, як сьвечкі».
Але Салямону Леві д'ябал ня даў спакою, і таму пры канцы ён усё ж запытаўся ў Шымуна Івеціча, чаму той пажадаў стаць юдэем. Калі той патлумачыў яму, што хацеў зрабіць гэта дзеля дачкі, якую любіць больш за Бога і за свой род, працяг якога ён хоча перанесьці на яе, Салямон Леві дастаў з крэдэнса апэльсін і падаў яму. Гэта быў самы вялікі апэльсін, які Шымун бачыў у жыцьці. Апэльсін з Партугаліі. «Занясі гэта свайму дзіцяці, – сказаў Салямон, – і хай шчасьціць Бог табе і тваёй сям'і». Вочы ў яго былі поўныя сьлёзаў.
Шымун ішоў праз Горад, у якім не было больш ні жывой душы. Змрок, у якім сьвяціліся толькі дзьве рэчы: поўня і апэльсін у Шымунавай руцэ. Ён ведаў, што для яго ў Дуброўніку больш няма месца. Няма, калі ён ня хоча цярпець сорам або ад сораму некага забіць. Таму ён прадасьць дом і з жонкай ды дзіцем ад'едзе туды, дзе яго ня ведаюць. У Трыест або ў Вэнэцыю? Не, ён зробіць тое, чаго яшчэ ніхто не рабіў. Ён пойдзе ў Босьнію, пад султанаву ўладу і пад турэцкія звычаі. Калі ягоныя продкі гінулі за Горад і біліся з туркамі, дык Шымуну належыць жыць

сярод іх. Чаму? Бо дарма было праліваць кроў за айчыну. І мусіла зьявіцца на сьвет дзяўчынка, каб Шымун гэта зразумеў. Калі б нарадзіўся сын, ён памёр бы сьмерцю героя за тое, чаго не існуе.

У Біхач прыйшоў ён зь мехам дукатаў у адной і дзіцем у другой руцэ. Няшчасная Вінка цэлымі днямі плакала і маліла яго, каб не ісьці. Казала, што туркі пасадзяць іх на кол. Яго на кол, а яе хто ведае на што... Добра, яна ня так сказала, гэта я ўжо сам дадаў. Кожны да гэтай гісторыі нешта дадаваў, дык, мабыць, магу і я. А калі састарэеш, дык хто пра што, а ты толькі аб гэтых рэчах... Пакуль я мог, дык яны мяне гэтулькі не цікавілі. Але ты прыйшоў па тое, каб я табе распавядаў не аб гэтым, а аб прыгожай Мары, якая яшчэ не была прыгожай Марай. Дзеці заўсёды прыгожыя, можа, таму ў іх тую прыгажосьць ніколі не заўважаюць. Бальшыня збрыдчэе, пакуль вырасьце. І таму пра тых, хто не збрыдчэў, у народнай песьні кажуць, што яны засталіся прыгожыя. Прыгожыя, як дзеці.

Ішлі яны так празь біхацкую чаршыю[1], Вінка два крокі за Шымунам, уталопіўшы вочы ў брук і абамлеўшы адцэнтар. Людзі глядзяць на іх і ня могуць паверыць сваім вачам. Апранутыя паводле хрысьціянскіх звычаяў, з усяго відаць, без жытла і безь нікога свайго, зьявіліся незнаёмцы. У тыя часы гэта здаралася нячаста. Ці, праўду кажучы, не здаралася ніколі. Хто б ні прыходзіў з чужыны, добра ведаў, што ён робіць і чаму прыйшоў. Або гандляр, або францускі падарожнік, краёнамі й лайдак, або нехта зь нейкай дзяржаўнай місіі. Але ніхто не прыходзіў з жонкай і дзіцем. У тыя часы не было турыстаў, нават гэтакага, калі ўзваліш сабе на сьпіну жонку і дзяцей і ідзеш бадзяцца там, дзе чорт хамуты ня вешае, – быў, ідзе й цешышся, і адпачываеш! А было й небясьпечна. Калі ў нейкую басьнійскую чаршыю і прыходзіў нехта незнаёмы з жонкай і дзецьмі, дык тады напэўна можна было сказаць, што гэта нейкі мухаджыр, уцякач, што яго выгналі з роднага дому. Турэцкае царства ўжо некалькі стагодзьдзяў памяншалася, як тая кашуля, што садзіцца кожны раз, як яе мыеш, дык і ня дзіва было, што прыходзілі мухаджыры. Ну, але было дзіўна, што вось гэтыя мухаджыры не былі турэцкай веры! Людзі ў чаршыі ня ведалі, што й падумаць пра гэта. А тады, мабыць, зразумелі, што ня іхная справа – думаць пра такія рэчы. Пра гэта ёсьць каму думаць. Каму? Ды ўладам, братка ты мой.

[1] *Чаршыя* – цэнтар мусульманскага горада, або тыя часы вуліца або плошчы і чаму краёнамі й міністэрствамі; гандлёвыя кварталы. – **Тут і далей** заўсёды **жонка і дніка**.

«Я хацеў бы тут пасяліцца з жонкай і дзіцем», – сказаў Шымун турку, які глядзеў на яго спадылба і пастукваў люлькай аб стол. Стол быў канцылярскі, венскі, з чаго можна было меркаваць, што турак той быў не старых законаў і звычаяў і што ад яго нечага можна было спадзявацца. «А што ты тут будзеш рабіць?» – спытаўся ён у Шымуна, памаўчаўшы роўна гэтулькі, каб хрысьціяніну зрабілася непрыемна. «Мне было нядобра там, дзе я быў», – адказаў ён яму. «І ты думаеш, што якраз тут табе будзе добра?» – засьмяяўся турак тым сьмехам, які не прыносіць радасьці, а, хутчэй, гучыць як пагроза. «Мне паўсюль будзе лепш, чым там, дзе я быў», – сказаў Шымун. Турак паглядзеў на яго так, як разумны глядзіць на дурня. Пасьля крыху памаўчаў, угледзеўся ў нейкую мушку на стале, а калі яна адляцела, прамовіў: «Калі так, дык заставайся! Ніхто не кране ні цябе, ні тваю сям'ю!»

Што меў у галаве той ага[2] або паша[3] ці хто ён там яшчэ быў, што пусьціў дубраўчаніна ў чаршыю, гэта ніколі ніхто не даведаецца. Але вядома, што гэтым ён не купляў сабе ні дабрыню, ні штосьці іншае, за што плаціцца дукатамі. Ён даў Шымуну дазвол пасяліцца так, як пасяліўся б і любы іншы турак. І ў канцы не падаў яму рукі і нават больш на яго не паглядзеў. Кажуць, што праз шэсьць месяцаў той турак зьехаў. Ня вытрымала ягоная душа, дык і падняў на сябе руку. Хто ведае, ці то праўда або нехта за доўгі час дадаў нешта сваё да гэтай гісторыі.

[2] *Ага* – высокі турэцкі цывільны і вайсковы ранг.

[3] *Паша* – высокі турэцкі цывільны і вайсковы ранг.

Дык вось, так Шымун Івеціч пасяліўся ў варожым царстве. На галаву надзеў фэску, чорную, што насілі хрысьціяне, апрануўся па-турэцку і ў адно імгненьне зрабіўся некім іншым. Лёгка зрабіцца некім іншым, калі цябе ніхто не прымушае. А Шымуна ніхто не прымушаў. Калі прымусам не назваць тое, як яму ў Дуброўніку казалі, што яму з гэтай сікухай згасьне радавое імя. У Біхачу яму нічога такога сказаць не маглі, бо ніхто ня ведаў, хто такі Шымун Івеціч. А калі б і ведаў, гэта было б неістотна. Каму якая справа да таго, што згасьне род, які і так у чаршыі нічога ня значыць.

Шымун дазволіў Мары гуляць з турэцкімі дзецьмі. Вінцы гэта не падабалася. Баялася маці, што дзеці будуць цкаваць малую

за тое, што яна іншай веры. А што дзецям да той веры! Быццам бы хоць адно дзіця на сьвеце напраўду ведае, якой яно веры. Але й маці трэба зразумець. Ейны страх большы за ўсялякую любоў і страшнейшы за найстрашнейшае злачынства. Толькі найгоршы крывасмок і маці ведаюць меру зла на зямлі. Крывасмок таму, што чыніць зло, а маці таму, што баіцца зла. Але бацька разьлічваў, што дачка застанецца жыць сярод гэтага сьвету, дык хай чым раней да яго прызвычайваецца. Зрэшты, якая карысьць была яму ў жыцьці ад таго, што ён бачыў у турках чорта чорнага і хадзіў супраць іх ваяваць? Яго так вучылі з маленства, а цяпер ён бачыць, якая карысьць была з той навукі. Таму хай дзіця сяброе, хай знаходзіць прыяцеляў, гэта спатрэбіцца ў жыцьці, а калі прыйдзе час ісьці замуж, ён знойдзе ёй хлопца ейнай веры, але такога, каб ведаў тое, што сёньня ведае яна: што няма лепшае чаршыі за гэтую і лепшых людзей за тых, зь якімі ты рос. Застаўшыся і без свайго гораду, і без сваіх людзей, Шымун не хацеў, каб тое самае здарылася і з Марай. Апрача таго, Біхач яму падабаўся, дый людзі іншай веры былі яму дарагія.

Бог ведае, што насамрэч парабілася ў галаве Шымуна Івеціча, каб ён усё так перавярнуў і палюбіў тое, што было створанае для нянавісьці. Туркі былі пасланыя на гэты сьвет, каб хрысьціянам было каго ненавідзець, каб у нас не папсавалася кроў і ня страцілася вера. Каб нас гэткіх Бог ня выплюнуў са сваіх вуснаў. Што, табе дзіўна, што і я сёньня гэтак думаю? Ці проста пытаешся ў мяне? Э, ды ты проста насьміхаешся зь мяне, хоць ведаеш, што непрыгожа сьмяяцца са старога чалавека. Можа, цяпер усё зьмянілася, можа, цяпер і сорамна ненавідзець суседа, хай ён будзе турак, кітаец або нэгр, але калі зьмянілася, дык толькі ўчора або заўчора. А нянавісьць да туркаў стагодзьдзямі рабіла нас людзьмі, як і туркаў рабіла людзьмі нянавісьць да нас. І кожнага чалавека на зямным шары, і раней – пакуль не даведаліся, што зямля круглая, – чалавека стагодзьдзямі рабіла чалавекам нянавісьць да іншага. Ты цяпер мне кажаш, што тая нянавісьць зьнікла? Добра, можа, і зьнікла, але яна зрабіла нас людзьмі. Апошні раз, калі мы не ненавідзелі, мы былі яшчэ не людзьмі, а малпамі. Як толькі мы адны адным далі імёны і як толькі мы пачалі ў нешта верыць, гэта значыць, як толькі мы ачалавечыліся, мы пачалі

ненавідзець. А тады ў нейкі дзень раптам перасталі! Ну й халера зь ім, сынку, што перасталі! Толькі што да Шымуна Івеціча, дык я дакладна скажу, што ён перастаў ненавідзець туркаў. Таму што ў яго ў галаве адбылося нешта, што не адбылося ў іншых. Або таму, што нянавісьць да сваіх пераважыла ў Шымуна нянавісьць да туркаў. Ён перастаў ненавідзець туркаў, бо гэткай вялікай любоўю любіў Мару. Вось так, калі ты можаш мяне зразумець. А іншыя ненавідзелі надалей, бо ў іх у галаве нічога не адбылося. Можа, ненавідзяць і цяпер. Але не паказваюць гэтага, бо, мабыць, непрыстойна пра гэта казаць. Як непрыстойна пернуць, калі табе хочацца пернуць. Ну але дастаткова, каб зноў пачалася вайна і каб геройства зноў сталася важнейшым за прыстойнасьць, і тады пабачыш, ці зьнікла нянавісьць, якая зрабіла чалавека чалавекам.

Мары споўнілася толькі дзесяць гадоў, калі прыгажосьць дарослай жанчыны ўжо азначылася ў ейным твары і ў ейным целе. Чаршыя са зьдзіўленьнем глядзела на яе. Хаджа Ісмэт Салкан, добры чалавек і прыяцель, зь якім Шымун найчасьцей бавіў вечары (Шымун пад ракію і сыр, а Ісмэт толькі пад сыр), адным летнім вечарам сказаў яму, каб крыху прыгледзеў за дзіцем. «А што, братка, прыглядаць?» – не зразумеў Шымун, бо ён адзіны бачыў Мару не мужчынскімі, а бацькавымі вачмі. «Бо я толькі гляну на яе, і ўжо я зграшыў перад Алагам», – апусьціў галаву Ісмэт. «Дык тады й не глядзі на яе, дурню стары!» – сказаў Шымун і абняў яго. Ісмэтава прызнаньне, замест таго, каб абразіць і ўгнявіць яго, падалося яму камплімэнтам. Дзівак быў Шымун Івеціч. Або дзівакі ўсе мы, бо не такія, як быў ён.

Аднойчы наведаць сваякоў у Біхач прыехаў трэбінскі бэг[4], малады газія[5] Алі-паша. Высокі, відны, ну проста як герой з народнай песьні, праехаў Алі праз чаршыю на рудым кані, дзіўнай жывёліне, якую наш сьвет, прызвычаіўшыся жыць і мець справу з дробнымі, нязграбнымі і сумнавокімі басьнійскімі клячамі, ня мог сабе і ўявіць. Але конь пашы выглядаў так, як бы цяпер нехта праехаў празь Біхач на фэрары. З той толькі розьніцай, што на нас фэрары не глядзеў бы з вышыні, а конь на людзей, міма якіх ён праходзіў, глядзеў якраз так, з вышыні. Нібыта ведаў, наколькі ён лепшы і больш

[4] *Бэг* – турэцкі тлумач, вышэйшага рангу.

[5] *Газія* – герой войнаў зь няверцымі.

каштоўны за тых людзей. А можа і сапраўды ведаў. Чалавек ані не ўяўляе, што можа ведаць і адчуваць жывёла.

Ну, ты цяпер думаеш, што я проста так, ад няма чаго рабіць, каб зацягнуць гісторыю і падражніць твае нэрвы, згадваю, як конь Алі-пашы глядзеў на чаршыю? Бачыш, тут ты памыліўся! Калі б конь глядзеў іначай, можа й не было б гэтай гісторыі. А менавіта не было нікога, хто б не заўважыў розьніцы паміж канём і ягоным гаспадаром і хто б гэтую розьніцу не залічыў на карысьць гаспадару. Алі прыязна ўсьміхаўся і гэтак, сёньня б сказалі – натуральна, вітаўся з кожным, чый позірк ён сустракаў, і адказваў кожнаму, хто вітаўся зь ім. А як толькі бачыў, што нехта глядзіць на яго скоса, ён засмучаўся, як і належыць засмучацца кожнаму госьцю перад непрыязнасьцю гаспадара.

Галоўнае, што позірк Алі-пашы быў на адным роўні з позіркам сьвету, міма якога ён праяжджаў. Гэта б і не заўважылі, калі б ягоны конь не ўзіраўся ў вышыні. І не разышлася б гаворка пра бэга, які і з вышыні конскага сядла ўмее быць роўны з кожным чалавекам. А калі ты роўны зь людзьмі, дык тады ты большы за самога сябе.

У гэткага Алі ўмомант закахалася кожная кабета ў біхацкай чаршыі. Можа, закахаўся хто й сярод мужчынаў, але не прызнаваўся. За сем дзён, якія Алі-паша заставаўся ў Біхачы, горад перажываў нешта такое, што ягоная гісторыя яшчэ ня памятала. Панурыя цяжкія твары зазьзялі перад мужчынскай прыгажосьцю, усе пачалі думаць, як заўтра апрануцца, ці ў іх чыстыя кашулі і гладка паголеныя бароды, а кабеты пад парандзой пачалі так бліскаць вачмі, што здавалася, быццам надыходзіць навальніца. У нейкім сэнсе і надышла. Толькі што гэтую навальніцу ніхто не згадае злым словам, хоць з-за яе за мінулыя сто гадоў праліта больш сьлёзаў, чым з-за ўсіх трагедыяў, што выпалі Босьніі. Але ня ўсякая сьляза ад няшчасьця. Ёсьць сьлёзы, якія праліваюць толькі шчасьлівыя вочы.

Паводле звычаю, газія мае аб'ехаць чаршыю на кані ў той дзень, калі зьявіцца ў горадзе. Каб народ ведаў, хто прыехаў. Ды каб самлелі ад страху тыя, хто мае прычыны для страху. І

каб сварліўцы і людзі безь ніякіх прычынаў радаваліся іхнаму страху. Але ні ў кога не было прычынаў баяцца Алі. Таму ніхто асабліва й не зьдзівіўся, калі ён і назаўтра праехаў праз чаршыю. Але калі ён і на трэці дзень паявіўся на кані, людзі пачалі задумляцца, што за гэтым стаіць. На чацьверты дзень зразумелі, што сьветлы Алі-паша закахаўся ў нейкую прыгожую біхачанку. Бо чаго б ён інакш езьдзіў і прыгожа глядзеў на цэлы сьвет? Калі кажу прыгожа, значыць прыгожа. Так, як глядзяць толькі тыя, каму сэрца праясьніць зрок і замуціць розум.

Эх, колькі ў Біхачы было бацькаў, якія ў тыя ночы не маглі заснуць і адно малілі вялікага Алага, каб іхная дачка была абраньніцай Алі! Добрыя малілі яго, бо ім здавалася, што Алі-паша створаны з прыгожае душы, а злыя і сквапныя малілі Алага, бо ведалі, што Алі-паша надта багаты. Гэткім здавалася, што яму належыць Герцэгавіна ды яшчэ чвэрць Босьніі і што празь яго і самі яны ператворацца ў бэгаў і газіяў. Яны думалі, што з-за даччынай прыгажосьці і зяцевага багацьця ім печаныя перапёлкі будуць самі ў рот залятаць. Ды што яны, разам з тым, ад заўтра нялюбым суседзям будуць дамаскай шабляй сячы галовы.

Але марныя былі малітвы і злых і добрых. Закахаўся Алі ў адзіную, якая на яго нават не паглядзела, у адзіную, чый бацька кожную ноч спакойна спаў, у адзіную, у якую ня можна было закахацца. Прыгожай Мары не было тады яшчэ й адзінаццаці гадоў, таму яна й ня ведала розьніцы ў мужчынскіх позірках. Глядзела яна на газію на кані, як мядзьведзь глядзіць на заход сонца. Бачыла прыгажосьць, але не разумела яе сэнс. І не было ў яе ані ў думцы, што гэтая прыгажосьць магла належаць ёй.

Наступнай вясною Алі зноў сем разоў праехаў празь Біхач. Зноў зьзяла чаршыя, і зноў бацькі не маглі заснуць. Але гэтым разам ня спалі толькі злыя. Добрыя ведалі, што газія ня ў іхную дачку закахаўся, і лёгка з гэтым зьмірыліся. Добры чалавек ніколі ня будзе няшчасны з-за змарнаванай нагоды. Шчасьце нельга наклікаць, яму проста трэба аддацца. Як спакойнай рацэ безь віроў і хваляў. Тыя, хто спрабаваў наклікаць шчасьце, заўсёды замест таго накліквалі няшчасьце. Танулі ні за што ні пра што,

а пасьля ўсе казалі – як яны маглі ў такой рацэ ўтапіцца, бо не было за іх лепшых плыўцоў. Так было ў тыя часы, і так дальбог бывае й цяпер.

Сем гадоў кожнай вясною Алі-паша прыяжджаў у Біхач і сем дзён праяжджаў праз чаршыю. Тым часам павыходзілі замуж усе гарадзкія дзяўчаты, падрасьлі новыя, а каханьне расло, нібыта мора, калі ў яго ўліваецца новая рака. Гэта немагчыма, бо ня можа быць, каб на сьвеце зьявілася рака, якой не было. У прыродзе пануе парадак, але сярод людзей парадку няма. Ты вось думаеш, што людзкі непарадак у зьле, забойствах і войнах? Ды дзе там! Усё гэта бывае і сярод скалаў і камянёў. Кожнае зло – частка прыроднага парадку. Адзіны сапраўдны непарадак – у каханьні. А Алі-паша, як ты ўжо ведаеш паўгадзіны, сьмяротна закахаўся ў прыгожую Мару. У дзесяцігадовае дзіця. І так ён сем гадоў адведваў гэтае дзіця, пакуль на пятую вясну Мара сама ў яго не закахалася.

Звычайна яны проста стаялі і глядзелі адно на аднаго. Гадзінамі. І так, што ніколі адно да аднаго не дакрануцца і не прамовяць ні слова. Ні ён ня меў, што сказаць, ні яна ня ведала, што б яму сказала. Ён быў турэцкі бэг, а яна чужынка, ды яшчэ й хрысьціянка. Але калі б і не было гэтак, што б у тыя часы двое закаханых маглі сказаць адно аднаму? Словы прыйшлі значна пазьней, з багацьцем і камфортам. Раней толькі глядзелі і маўчалі. Бясконца доўга.

Ясная справа, некалі прыйшоў час, калі ўсім стала вядома, як яны глядзяць адно на аднаго, і па чаршыі пайшла пагалоска, што Алі-паша страціў розум і закахаўся ў прыгожую дубраўчанку. Але замест таго, каб чаршыя адрэагавала на гэта зь нянавісьцю, як бывала звычайна, калі падманваліся калектыўныя жаданьні і надзеі, у людзей нібыта камень з сэрца звалiўся. Добрыя бацькі проста былі добрыя, таму ім нічыё каханьне не магло зашкодзіць, а злым палегчала, бо Алі закахаўся не ў суседаву дачку, а значыць у канкурэнтку, а ў дачку Шымуна Івеціча, які ніяк ня быў ім перашкодай, бо хоць і жыў зь імі ў адной чаршыі і дыхаў адным паветрам, але існаваў у зусім іншым сьвеце.

І вядома ж, аднойчы і да яго дайшлі чуткі пра тое, што Мара і

Алі-паша глядзяць адно на аднаго цэлымі днямі. Ён думаў, што людзі хлусяць і ад няма чаго рабіць нагаворваюць на ягоную дачку. А нагаворы ня маюць сэнсу, калі толькі не зусім неверагодныя. У Мары ён ні пра што не пытаўся, не казаў нічога і жонцы Вінцы. Калі яму некалі і прыйшло ў галаву, што ў нагаворах магло быць і крыху праўды, Шымун ведаў, што ні ад пытаньняў, ні ад вялікіх размоваў у гэтых справах няма вялікай карысьці. Будзе тое, што мае быць, і нічога тут чалавек зьмяніць ня можа.

На восьмую вясну Алі-паша толькі аднойчы праехаў праз чаршыю. І тое толькі дзеля таго, што мусіў праехаць праз чаршыю, каб завітаць у дом Шымуна Івеціча. Той адчыніў яму браму, пусьціў у свой дом, і госьцеў конь чатыры гадзіны спакойна стаяў пасярод двара і з вышыні глядзеў на людзей, якія зіркалі з-за кожнага рага, зьбіраліся і шапталіся ў цікаўнасьці: пра што ж гавораць у Шымунавым доме? Ужо надыходзіў вечар, калі Алі-паша ўрэшце выйшаў на двор. Упершыню яго пабачылі змрочнага, ён ні на кога не паглядзеў, ні з кім не разьвітаўся, а толькі сеў на свайго каня і паехаў зь Біхача.

Шымун Івеціч не аддаў Алі-пашу сваю дачку. Аднак і не адмовіў яму. Сказаў яму, хай сам спытаецца ў Мары, і калі яна хоча пайсьці за яго, бацька яе адпусьціць і справіць пасаг. «Як жа я ў яе спытаюся, калі мы зь ёй ніколі й слова не прамовілі?» – казаў Алі-паша. «Ня ведаю, – адказаў яму Шымун, – але іншага выбару ня маеш». І так пайшоў Алі-паша ў пакой да прыгожай Мары, і зноў яны стаялі і глядзелі, і язык у яго нібыта на вузел завязаўся.

І тады яна ўрэшце прамовіла: «Калі б ты папрасіў мяне за жонку, я б не пайшла за цябе. А калі б ажаніўся з другою, я б атруцілася». «Чаму?» – пытаецца ён у яе. «Таму», – кажа яна. «Чаму», – зноў спытаўся ён. «Таму», – паўтарыла яна.

І гэта ўсё. Яшчэ нейкі час яны моўчкі глядзелі адно на аднаго, і тады Алі-паша пайшоў. Больш яны ня бачыліся, але заўсёды ведалі адно пра аднаго. Як ведалі? Ану цябе з тваімі пытаньнямі! Цудоўна ведалі, як закаханыя ведаюць адно пра аднаго. Вось так і ведалі. Можна было б сказаць, што ні Мара,

ні Алі больш ні аб чым у жыцьці ня ведалі столькі, колькі ведалі адно пра аднаго. А калі б засталіся разам, калі б хоць толькі раз абняліся, значна менш у жыцьці ведалі б адно пра аднаго. Адных абдымкаў было б дастаткова, каб Мара саступіла, каб зламалася і пайшла за Алі. Хто ведае, якім бы быў для яе ў жыцьці Алі і ці кахаў бы яе заўсёды так, як кахаў, пакуль да яе не дакрануўся. Ніколі ня ведаеш, у што чалавека можа ператварыць жанімства. Адных зробіць лепшымі, чым былі, а другія стануць горшыя за найгоршых. Тут ніякага правіла няма. Растопіцца жарсьць у чалавеку, як той кавалак лёду, які ўпадзе ў афіцыянта і загрукае па летняй тэрасе. Пратрывае яшчэ некалькі сэкундаў і ператворыцца ў ваду і ў нішто.

Але ведаў і ён, што варта яе толькі абняць – і ўсё будзе вырашана. І прыгожая Мара будзе ягоная. Чаму ён гэтага не зрабіў? Таму што ён быў бэг, а ў тыя часы гэта нешта значыла. А можа й таму, што ён хацеў узяць Мару, толькі калі яна сама за яго пойдзе, такая, як яна ёсьць. Такая, якая была, пакуль ён на яе глядзеў. Вялікая розьніца – глядзець на нешта здалёк і трымаць тое самае ў руках. Усё, што трымаеш у руках, становіцца часткаю цябе. Ня лепшае і ня горшае, чым ты сам. А Мара для Алі была нечым большым і важнейшым, чым ён быў для самога сябе.

Паміж іх дваіх было нешта большае за ўсе нашыя каханьні. Тое, пра існаваньне чаго мы ведаем і без чаго малыя жыцьці ня мелі б асаблівага сэнсу. Нешта накшталт неба над намі. Уяві сабе, што няма неба і што калі глянеш угару, дык пабачыш толькі пустку і больш нічога! Жыць бы не захацелася. Дык вось, Мара і Алі – як тое неба. Яна не хацела пайсьці за яго, але забіла б сябе, калі б ён пабраўся з другою. Гэты зарок быў большы за жыцьцё. Таму пра яго так доўга апавядаюць, таму легенда пра Алі-пашу і прыгожую Мару перадаецца з пакаленьня ў пакаленьне і таму над імі праліта больш сьлёзаў, чым над усімі басьнійскімі няшчасьцямі разам.

Так плачаш толькі над нечым, чаго ты ня варты, што большае за цябе, і на што спадзяешся, як няверні спадзяюцца на Бога. Іхны Бог большы за Бога вернікаў. Большая ягоная сіла і

сьвятлейшы ягоны пасад. Таму Бог любіць нявернікаў. І таму жарсьць большая за веру.

Ёсьць сто простых зямных прычынаў, зь якіх прыгожая Мара магла адмовіць Алі-пашу. Я добра ведаю, што бальшыня зь іх табе ўжо прыйшла ў галаву і ты гатовы пра іх запытацца. Але прашу цябе, не пытайся! Бо я за ўсе твае прычыны зломанага шэлега ня дам. Яны абражаюць мяне як чалавека. Абражаюць легенду, зь якой я створаны. Усе людзі створаныя зь нейкіх легендаў. Бальшыня створаная з гераічных легендаў. Таму бальшыня такая злая. Мая легенда і легенда маіх людзей – не гераічная, хоць Алі-паша і быў герой, а ў прыгожай Мары было яшчэ больш геройства, чым у яго. Але іхная адвага была не ад гэтага сьвету. Як і я сам больш не ад гэтага сьвету. Калі б быў, даўно б звар'яцеў ад усяго, што ведаю і што са мною за гэтыя дзевяноста гадоў здарылася.

Табе цікава, чаму Шымун Івеціч не хацеў даць Алі-пашу руку сваёй дачкі? Э, гэтак бы ты абходнай дарогай прыйшоў да таго, што я прызнаю сто тваіх дробных зямных прычынаў. Ты сам мусіў зразумець з гісторыі, чаму ён ня мог гэтага зрабіць. А калі ты не зразумеў, дык не вінаваты ні я, ні мая гісторыя. Усе, хто яе ведае, разумеюць Шымунавы прычыны, але ніхто табе пра іх ня скажа. Бо гэта тая частка гісторыі, якая мае сэнс, пакуль ня будзе прамоўленая. А калі прамовіцца, дык зьнікне ўся чароўнасьць. І я б табе зараз мог сказаць: калі б ты прасіў мяне, я б не пайшоў за цябе, а калі б ты ажаніўся, я б атруціўся. І думай сам, што я хацеў гэтым сказаць.

Калі я гэтак гляджу на сваё жыцьцё, калі гляджу назад, бо на жыцьцё толькі назад і можна глядзець, мне ўсё здаецца, што я б быў шчасьлівейшы, калі б учыніў тое, што й прыгожая Мара. Прынамсі, пра мяне б расказвалі і пасьля таго, як мяне ня стане. І нічога б я ня страціў, ніводнай радасьці. Бо калі й была радасьць, яна заўсёды канчалася сумам. Мёртвыя мы, браце мой, так што мярцьвейшых і не бывае.

І я сам ніколі не ажаніўся, дык можа таму гэтая гісторыя датычыць мяне больш, чым каго іншага. Калі б быў я на дваццаць гадоў маладзейшы, я б ня бачыў тут ніякай сувязі. Або ты б не пагадзіўся, што тут ёсьць нейкая сувязь. Я б баяўся.

А так я ўжо занадта стары на любыя страхі. А тым больш на страхі, якія б датычылі мяне й маёй рэпутацыі. Пытаешся, якой рэпутацыі? Э, і гэтага я табе не скажу! Але не таму, каб не сапсаваць гісторыі, а таму што табе ня трэба пра гэта ведаць. Сёньня ўжо больш нікому, нават мне самому, няма справы да таго, чаму я не ажаніўся. Скажу табе толькі, што мае прычыны не такія вялікія, як Марыны. Яны значна меншыя, бо я ня маю за іх ніякіх заслуг. Проста я гэткі нарадзіўся. Або такім мяне зрабіла жыцьцё. Наконт гэтага ёсьць розныя тэорыі. Наконт чаго? Ды наконт таго, чалавека. Калі б ты лепш слухаў і менш пытаўся, можа, і зразумеў бы, пра што я кажу.

Некалі, яшчэ ў сярэднявеччы, існавала найстрашнейшае і наймацнейшае з усіх каханьняў. Яно бывала паміж рыцарам і дамай. Яны жылі разам, спалі ў адным ложку, але ніколі не дакраналіся адно да аднаго. Паміж іх на сярэдзіне ложка ляжаў меч. Той меч быў мяжою, якую нельга было перайсьці. Меў той меч і сваё імя. Ён зваўся Асаг. Ён ляжаў зь ягонага левага і зь ейнага правага боку, каб тыя бакі ніколі не злучыліся.

Даўно я чуў тую легенду, але й дагэтуль не зразумеў. Не разумею яе й цяпер. Чаму яны гэтак рабілі, хоць і ня мусілі? Ну, скажы мне, ты ж усё ведаеш! Эх, бачыш, у маім жыцьці было нешта падобнае да таго мяча, і я ня меў ніякага выбару. Таму я рады, што існавалі Мара і Алі. Яны мелі выбар, а ты здохні, калі ня ведаеш, чаму Мара зрабіла менавіта гэткі выбар. Здохні, калі думаеш, што гэта быў Асаг.

Гурбэт

Маё імя Мустафа. Я з тых, на каго табе лепш не глядзець. І калі сярод такіх ёсьць найгоршы, дык я той і ёсьць. Калі ў Тэшні жанчына зацяжарыць, ёй забараняюць праходзіць міма майго дому. Калі яна гляне на мяне, кажуць, дзіця будзе брыдкае, як ніхто зь ягонага роду. Гэткага звычаю трымаюцца і нашы кабеты, і хрысьціянкі. А калі я быў малы, сваёй маці да калена, яна звычайна гладзіла мяне па галаве і казала: «Мой Мустафа,

цябе добры Алаг стварыў ад зайздрасьці. Такога, каб толькі ён сам мог глядзець і яму не зрабілася б блага». І яшчэ яна казала, які гэта шчасьлівы знак, бо Бог заўсёды хавае ад чалавечага вока найлепшае з таго, што стварыў. А як можа быць добрым тое, што брыдкае, гэтага маці ня ведала. Заўсёды ёсьць нешта, што ведае ўвесь сьвет і чаго ня ведаюць маці. Калі б ведалі, чалавечы род бы спыніўся. Але ня мне пра гэта казаць. Лепш далей казаць толькі пра сябе, а не пра іншых. Маё імя Мустафа. Але я на яго не адгукаюся. Калі мне заманецца самога сябе паклікаць, я шапну Гурбэт. Чужаніца.

І тата мой быў Мустафа. Калі я нарадзіўся, у яго пыталіся, як будзе звацца малое. Так, як завецца той, хто яго стварыў. Людзі пераглядаліся, маўляў, ці Мустафа зусім здурнеў або занадта праняўся вялікім гонарам, каб даваць дзіцяці імя Творцы. А тату майму Творца ня быў і ў галаве, бо думаў ён толькі пра сябе самога. Пакарае цябе за гэта добры Алаг, казалі яму браты, старая бабка дзіву давалася, а дзед сядзеў на сваёй тэрасе, курыў люльку і прапускаў міма сябе ўсякае дабро і ўсякае ліха. Было гэта да таго, як я нарадзіўся. І тады мяне назвалі Мустафа. І яшчэ ўсе былі шчасьлівыя, што тату майму не прыйшло ў галаву нешта горшае. Бо калі б прыйшло, ён бы гэтак і зрабіў. Былі такія часы, калі ў Босьніі панавала бядота, а вялікім паном і сто прыслужнікаў не давалі рады дагадзіць.

Людзі нараджаюцца бяз твару. Што мужчына, што жанчына – усе аднолькавыя, калі ім шэсьць месяцаў. Нават ня ведаеш, да каго падобны – да бацькі або да маці. Каля году не відаць нічога. А калі мой тата пабачыў, дык склаў рукі, як складаюць хрысьціяне, калі стануць перад царквой, але не казаў нічога. Толькі што позірк ягоны, калі ішоў вуліцай, быў апушчаны долу, ён не глядзеў у неба, як раней, і чакаў, пакуль вулічны натоўп зьнясе тое, што стаіць у яго на дарозе, але толькі ўзьнімаў вочы да дахаў найбольшых дамоў. Як мінаў час і па мне ўсё больш было відаць, які я ёсьць, вочы ягоныя апускаліся ўсё ніжэй, пакуль не спыняліся на шчыліне паміж камянямі ў бруку. «Мустафа-бэг, – клікалі яго з крамы, – ці расьце нашчадак?» А пакуль ён азіраўся, каб паглядзець, хто кліча, не было нікога. Ці той, хто пытаўся пра мяне, пасьпяваў схавацца, ці мой тата чуў галасы, якіх не было.

Мне было сем, калі ён пайшоў з дому. Ніякі я ня бэг, ня мой гэта маёнтак, не мая жонка і не маё дзіця. Нікога свайго ў мяне няма. Каля рэчкі, далёка за горадам, зь вербалозу склаў сабе лагво. Хадзіў па сёлах ад дому да дому і прасіў міласьціну. Маці раз-пораз хадзіла па яго, казала, каб вярнуўся, маліла яго ўсім на сьвеце, але ён не хацеў. Яна казала яму: вярніся, сына ніколі ня мусіш бачыць. А ён казаў, што ня мае сына і што скончыць у пекле кожны бацька, які ня хоча бачыць сваё дзіця. І так яна адыходзіла, плачучы, але пасьля вярталася зноў. І ўсё пачыналася спачатку. Кахала яго так, як жонка кахае свайго мужа, ніколі не жадаючы яму зла і праклінаючы не яго, калі надыдзе найгоршае, а свайго роднага бацьку, які ёй гэткага мужа знайшоў. Як восень ператваралася ў зіму і як пачыналася летняя сьпёка, калі высыхалі ўсе крыніцы і не было адкуль вады напіцца, гэтак і мая маці Сэна ішла, каб вярнуць бацьку дахаты. Аднойчы яна сказала яму: ды зусім ён не такі, як ты думаеш, дзіцёнак як і ўсе іншыя. А ён толькі паглядзеў на яе, гэтак тужліва, як сабака глядзіць на нагу, якую яму адарвала пастка на лісаў, і нічога не сказаў. Не сказаў нават, што ня мае сына і што скончыць у пекле кожны бацька, які адвернецца ад свайго дзіцяці.

Было тое на Ільлю, калі тату майго двое прынесьлі дахаты і паклалі на падлогу галавою на ўсход. Мне было дванаццаць гадоў, і я сеў каля яго. Ён ляжаў спакойна, пальцы на левай руцэ ў яго былі сагнутыя і здранцьвелыя, як у сокала перад тым, як ён схопіць зайца. Я спрабаваў іх выпрастаць, але лягчэй было б зламаць дубовую калоду, чым разагнуць нябожчыку пальцы. Я падумаў: як жа мой тата ў труну з такой рукою, як жа яго рукі ад сэрца спусьцяць у яму, як ён перад Богам пакажацца з такой пагрозьлівай рукою?

Пасьля мяне адсунулі ўбок. Нябожчыка трэба было падрыхтаваць да пахаваньня. Пакуль зь яго скідалі лахманы, з доўгіх калматых валасоў і з барады павылазіла гнюсота. Чорныя вошы, а былі іх дзясяткі, бегалі па драўлянай падлозе. Яны ня ведалі, куды падзецца, выгнанцы сярод чужога сьвету. Народжаныя ў ягоных валасох і барадзе, тыя вошы і вошы, з чыіх яек яны вылупіліся, і яшчэ старэйшыя былі адзінымі жывымі стварэньнямі, якія са сьмерцю майго таты Мустафы

нешта страцілі. А забіў яго я, бо я такі, які я ёсьць, меншы за тых вошаў.

Мяне завуць Мустафа, але ад часу, як пахавалі бацьку, я – Гурбэт. Чужаніца. З дому я больш не выходжу, каб не сурочыць нечае дзіця, калі на мяне паглядзіць, а стаю ля акна, а людзі хай пільнуюцца і не пускаюць сваіх дзяцей у Гурбэтаў завулак.

Калі мне надакучыць глядзець на сьвет, які не праходзіць, я іду ў сад за домам і чакаю, дзе якая ружа пачне цьвісьці. Я саджу іх сваімі рукамі, па дзьве-тры кожны год. У мяне ўсякая прымаецца, а ў іншых не, і таму мая маці Сэна хвалілася перад суседкамі. Яны ня верылі, а калі першы раз прыйшлі ў сад, у іх проста вочы загарэліся. Дзьве сотні чырвоных ружаў, быццам нехта полымем заліў брук і ён палае, пакуль не падзьме вецер і не расьцярушыць пялёсткі па ўсім мястэчку. Кажуць: вось і восень надышла, паразьдзімала Гурбэту ружы. Маткам гэта знак, што могуць пачынаць плесьці дзецям швэдры на зіму. Вось і ад мяне карысьць.

У канцы саду ёсьць крыніца жывой вады, якая і ў найгоршыя засухі не перасыхала. Калі дзед майго дзеда Сэлім бэг Пашаліч будаваў дом, яму казалі, каб не забудаваў крыніцу, бо грэх. А ён ім сказаў, што гэта ягоная вада, дык у ягоным садзе і застанецца, а як некалі ў мястэчку запануе такая смага, што вады ня будзе ні ў воднай, як толькі ў ягонай, крыніцы, дык тады гэта будзе знак, што не ягоная была праўда і што вада ўсіхная і Божая. Тады ўсе будуць піць з той крыніцы, а ён будзе ў пекле, бо ўзяў тое, што не ягонае. Ніколі такой засухі не было, а ці Сэлім трапіў у пекла – ня мне гадаць.

Але ад той вады Гурбэтавы ружы такія румяныя і ад той вады ўвосень пялёсткамі румяніцца ўвесь Тэшань. Бог даў мне твар, на які іншыя ня могуць глядзець, але даў мне ваду, якую яны ня маюць. Таму я заўсёды кажу, што мая страта ня большая за мой набытак. Чуючы гэткія мае словы, маці звычайна кажа, што варта мне толькі стаць на дыбачкі, і мая галава ўжо будзе ў раі. Ня ведаю, што яна гэтым хоча сказаць, ці яна ўжо недзе гэта чула, можа, гэтак ужо стагодзьдзямі казалі, а толькі я ня чуў, але ўсё адно мне бывае прыемна. Пекла яна ніколі ня згадвае.

Дзесяць дзён таму памёр наш сусед Мэнсур Абаза. І да пяцідзесяці не дажыў, а колькі я яго ведаў, цэлы дзень ён толькі і сядзеў на сваім зэдліку, схіліўшыся над катлом, які стаяў у яго паміж нагамі. Ён быў сірата, а яшчэ горшым сіротам напраўляў катлы. Столькі працаваў, што нікому не пасьпяваў паглядзець у вочы. Кажуць, што толькі калі памёр, дык пабачылі, якога колеру меў вочы. Я быў да яго добры. Дабягу звычайна праз завулак да ягонай крамкі, і ён заўсёды мяне ласкава сустрэне. Тое, што ён пабачыць мой твар, я не баяўся. Мэнсур Абаза нікому не глядзеў у твар.

Па ім засталася нерухомая жонка. Яе спаралізавала падчас родаў, і ад той пары яна не адчувала ні рук, ні ног. Гэтак дваццаць зь нечым гадоў. Ён яе пераварочваў і пераадзяваў, ён яе карміў і паіў, каб толькі Зумра ня мусіла гэтага рабіць. А Зумру я да пэўнага дня ў жыцьці і ня бачыў. Такая была дамова паміж мною і ейным татам. Ня памятаю, калі мы гэтак дамовіліся, але ведаю, што ў той дамове мы не прамовілі ніводнага слова. Мне было паабяцана, што Зумра ніколі ня спусьціцца ў крамку, пакуль я там, і ніколі ня пройдзе каля майго акна, калі я ў ім стаю. Яна звычайна хадзіла па ваду кожную раніцу а восьмай, а я выходзіў да акна на пятнаццаць хвілінаў пазьней. Я заставаўся там роўна пятнаццаць хвілінаў, бо пасьля дваццаці Зумра вярталася дадому. Так яно было аж да аднаго дня.

Пасьля Мэнсуравых паховінаў яна прыйшла да маёй маці і сказала: тата, хай над ім Алаг зьлітуецца, ад нас адышоў, а нас дзьве засталося, і мы ня ведаем, як і што далей рабіць. Міласьціну прасіць грэх, ды мы б яе і не прынялі. Але ёсьць нешта, што як бы і ня міласьціна, але нам бы дапамагло. Далёка мне цяпер, цёця Сэна, да крыніцы, калі таты больш няма... Сказала гэтак і расплакалася. Маці яе суцяшала, казала, што каля нас яны з голаду не памруць, што хай возьме пару дукатаў і не прымае іх за міласьціну, а толькі тым нам зробіць паслугу, бо гарэць нам у пекле, калі нашыя блізкія суседзі побач з такім багацьцем будуць галадаць.

Я слухаў з-за дзьвярэй і ведаў, што нешта тут нядобра, бо маці згадала пекла. Першы раз у яе гэтае слова зьляцела з вуснаў. А

хто яго ў гэтым доме вымавіць, той сваёю слабасьцю або ганарыстасьцю накліча вялікае няшчасьце. Або проймецца вялікім гонарам, як нябожчык тата Мустафа, і тады ўпадзе нізка, так што ніжэй няма куды. Але не таму мая Сэна згадала пра пекла. Проста яна была гатовая запрапанаваць усё, апрача таго, што яна не магла даць. Ваду з нашай крыніцы. Калі яна гэта ў яго забярэ, што Гурбэту застанецца ад жыцьця?

Зумра пайшла і, не атрымаўшы тое, аб чым прасіла, не прыняла тое, што ёй давалі. Я маўчаў і рабіў выгляд, што нічога ня чуў. Чакаў, пакуль маці сама мне скажа. Але так я мог чакаць да сканчэньня сьвету, а яна б маўчала і насіла свой грэх з сабою. Тады я сказаў ёй, каб не хвалявалася, я дам тое, што не магла даць яна. Хай Зумра ходзіць да маёй крыніцы па ваду. І ружам ад гэтага нічога ня станецца, і ў мяне карона з галавы не ўпадзе, калі я штодня па паўгадзіны буду ад іх далей.

Тут бы ўсё шчасьліва і скончылася, калі б я застаўся там, дзе мне месца. І калі б я думаў, што абяцаньні паміж двума людзьмі застануцца дзейнымі і пасьля таго, як адзін зь іх пераселіцца ў іншы сьвет. А я абяцаў нябожчыку Мэнсуру Абазу, і ён абяцаў мне, што ні Зумра мяне, ні я яе ніколі не пабачу. Кажуць, што такой прыгажуні ў Тэшні ніколі не было, хай яна й сто разоў будзе дачкою катляра. Але што ёй, калі яна носіць знак маці, якая зьнерухомела, калі яе нарадзіла. Гэтага баіцца кожны, хто б да яе заляцаўся, хоць аб такіх знаках у Кур'ане нічога не напісана і хоць у мястэчку поўна хлопцаў, якім да Кнігі ня больш справы, чым да леташняга сьнегу. Калі яе родная маці засталася нерухомая, як толькі прынесла яе на сьвет, дык што станецца з тым, хто Зумру пацалуе? Але ўсё гэта было ня важна для абяцаньня, якое мы зь нябожчыкам Мэнсурам далі адзін аднаму. Ён ведаў, як я не хачу пакутаваць ад Зумрынай прыгажосьці, а я ведаў, як ён ня хоча, каб Зумра мерала сваё няшчасьце з маім.

Таму мы ніколі ня бачылі адно аднаго. Так бы яно й было, калі б не ўмяшаліся ружы.

Першы раз, калі Зумра мелася прыйсьці па ваду, мне карцела даведацца, што яна пра іх скажа і ці захоча нейкую зь іх

панюхаць. Я ўявіў сабе, як яна ідзе ад адной да другой, як бярэ іх у далоні, дзівіцца ім і нюхае. І так кожную зь дзьвюхсот ружаў. Але я не зазірнуў у сад.

І таму ў тую самую ноч я прысьніў Зумру сярод маіх кветак. Я ясна яе бачыў. Яна была такая прыгожая, як пра яе казалі, яна гуляла паміж ружаў са збаном на галаве, пакуль збан не ператварыўся ў... Але лепш мне пра гэта не казаць, бо як толькі чалавек пра свае сны нешта скажа, хоць бы й самому сабе, адразу ператворыцца ў дурня. У снох сьвет не такі, як ёсьць на яве, але гэтаму было б лёгка даць рады. Цяжка тое, што ў снох і Мустафа ўжо больш не Гурбэт.

Наступнай раніцай я ведаў, калі Зумра спусьціцца ў мой сад. Я бачыў, як яна перад люстэркам навязвае хустку. Я бачыў, як яна абувае чаравікі, ідзе ў матчын пакой і кажа, што хутка вернецца. Кажу, што бачыў яе, а сам нічога ня бачыў. І лепш бы так яно й засталося. Я сеў на лаве, склаўшы ногі пад сябе, паклаў на калені Кнігу, зладзіў усё так, каб не хацелася ўставаць. Калі я так сяджу з Кнігай, дык заўсёды клічу маці, каб прынесла вады, калі мне захочацца піць. Але калі, водзячы пальцам з правай на левую старонку за словамі Прарока, я пабачыў, як Зумра спускаецца ў сад, я груба, нібы кавальскі мех, загарнуў Кнігу, саскочыў з лавы і падбег да акна.

Калі вока – гэта мора, дык я зірнуў толькі адной кропляй. Але і той кроплі было зашмат. Зумра плыла паміж ружамі, іх бутоны схіляліся да яе, але яна ні краёчкам не краналася ніводнай. Як вецер нахіляў кветкі, гэтак яна ад іх і ўцякала. Каб толькі не параніць іхных пялёсткаў. Ці то дзеля іхнае прыгажосьці, ці то дзеля таго, каб я не забараніў ёй прыходзіць да маёй крыніцы – я так ніколі й не даведаюся. А мне б хацелася, каб дзеля другога. Меншы тады б мяне браў страх.

Маё імя Мустафа. Я з тых, на каго табе лепш не глядзець. Калі мне заманецца самога сябе паклікаць, я вымаўлю Гурбэт. Чужаніца. Пад гэтым імем мяне ведаюць тыя, хто ніколі мяне ня бачыў. Гэтае імя было маім гонарам. Ні панскім, ні Богам дадзеным, ні створаным з чужых страхаў. Я быў Гурбэт, і ад гэтага мне не было цяжка. Аж да таго дня, калі я толькі адной кропляй вока зазірнуў у сад, дзе да крыніцы спускалася Зумра.

Пасьля таго я за ёй праліў абодва мае моры, і Гурбэт – больш не маё імя, а імя майго няшчасьця. А гэта, праўду мовіўшы, тое самае.

Гляджу я на яе і цяпер, як яна спускаецца да крыніцы, і малю міласэрнага Бога, каб яна азірнулася і паглядзела на мяне. Мне ня важна, што яна пабачыць, бо ня можа быць, каб яна ня ўбачыла мяне такога, як я на яе гляджу, а не такога, якім я ёсьць для ўсіх іншых людзей. Я малю Бога, каб яна азірнулася і тым самым учыніла грэх. А маліць Бога за чужы грэх, вядома, горш за ўсе грахі. Горш за тое, калі бацька не глядзіць на сваё дзіця. Я ведаю, што гэта так, але не магу іначай.

Я стаю ля акна і шапчу: Зумра мая! А яна ідзе сярод ружаў, і я ведаю, што яна не азірнецца. І хоць бы я яе голасна паклікаў, хоць бы засьпяваў, яна ўсё адно спусьціцца да крыніцы і не паглядзіць на мяне. Маё імя Мустафа, Чужаніца я ў тым месцы, у якім нарадзіўся. Я саджу ружы, а калі па мястэчку разьляцяцца іхныя пялёсткі, маткі будуць плесьці дзецям швэдры на зіму. Па гэтым бы мяне памятаў сьвет, калі б я не ўзганарыўся і не паглядзеў, ці падабаюцца Зумры мае ружы. Цяпер я малю Бога, каб Ён растаптаў тыя словы, якія засталіся непрамоўленыя паміж мною і ейным нябожчыкам бацькам. І ведаю, што не растопча і што я гэтак і буду стаяць, пакуль ня высахне крыніца ў маім садзе або пакуль у доме нябожчыка Мэнсура Абазы будзе патрэбная вада, каб наталіць смагу.

З харвацкай мовы пераклаў Сяргей Шупа паводле: Miljenko Jergović. Inšallah, madona, inšallah. – Zagreb: Durieux, 2004.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]2005

"да Зместу"

ідэалогія • эканоміка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Уладзімер Ракіцкі Накіды алавіком з блякноту для маляваньня

НА ІЛЬЛЮ Жабрак Ларывон таго ранку першым заняў месца каля брамы і пільна сачыў за кожным, хто рухаўся ў напрамку да манастыра, здаля прыцэньваючы, хто падасьць, а хто не.

УЛАДЗІМЕР РАКІЦКІ нарадзіўся на Пружаншчыне. Мастак-рэстаўратар. Аднаўляе фрэскі XII стагодзьдзя ў полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве.

І трэба ж так: у той момант, калі на дарозе паказалася купка людзей і заставалася ім зусім мала да брамы, якраз у той самы момант з другога боку дарогі зь яблыні сарваўся сьпелы яблык. Ён так гучна ляпнуўся аб зямлю, што ў ранішняй цішы было нават чуваць, як ён пракаціўся трохі да лужыны. Нейкі момант Ларывон нават ня ведаў, што й парадзіць. Зрабіўшы некалькі крокаў да лужыны, ён спыніўся, аглядаючыся на людзей, але раптам шпарка пабег, ухапіў яблык і подбегам назад – на сваё месца да кійка, што пакінуў ля брамы. І пасьпеў-такі. Ларывон сагнуўся нізка-нізка і працягнуў да людзей свае рукі. На адной далоні ляжалі пакамечаныя грашовыя паперкі, а на другой вялікі сьпелы яблык.

2.08.1996

ПОЛАЦКІ ШАРМ

Вясна. У
суботні
сонечны
ранак усе
высыпалі на
вуліцу –
прыбіраюць,
мятуць,
беляць і
грабуць.
Аднекуль з
гораду сюды
на
Замчышча,
да бальніцы,
даносіцца
музыка.
Хударлявая
малодка з
купкі кабет,
што зьбіралі
прэлае
лісьце,
стрэльнуўшы
вочкамі,

вітае сваю
каляжанку:

— Лия Яковлевна, привет!
Тая ў белым халаце, які аніяк быў ня ў стане ахапіць яе формы і трымаўся толькі на адным гузіку, несучы ў адной руцэ вядро з вапнаю, а ў другой белы венік, не спыняючы свайго павольнага калыханьня ўздоўж белай сьцяны і не аглядаючыся, але каб усе пачулі, амаль што прасьпявала працяжна і гучна:
— Ша-ло-м!
Усё яшчэ больш ажыло, запішчала, зашчабятала.
24.04.2004, 9:51, Полацак

ПЕЎНІК

Стралец падняў тры пальцы.
Жыд падняў два.
Стралец плюнуў яму ў твар.
Жыд выцер бараду.
Стралец падняў тры пальцы.
Жыд падняў два.
Стралец даў яму поўху.
Жыд падняў тры пальцы.

Аляізіюс Бэртран «Вялікая вольнасьць» (1364)
І трэба ехаць, і ня хочацца, і мляўкасьць, і радасьць, калі выходзіў з брамы. Зноў усё кідаеш і не ўяўляеш, як зьменіцца ўсё па вяртаньні, і ня ведаеш, з чым вернешся і што цябе чакае ў дарозе.
Я стаяў першым каля самага акенца. Тоўстая касірка, якой адной толькі й хапала месца ў каморцы, спала, абхапіўшы рукамі касу. І на ўсіх, хто сядзеў у залі, найшла вясновая дрымота. Не ўтрымацца – вочы так і зьліпаюцца. Толькі пеўнік малады пракрычаў, седзячы ў кошыку.
— Вы будете последним на Минск? – запытаўся ўжо сіваваты гарадзкі чалавек.
— Хто тут на Мінск? – падляцеў нейкі чалавек. – Паехалі на машыне, па той жа цане, што й аўтобус.
— Нет, все не влезем, нас пятеро, и потом, мы в командировке, нам билеты нужны, – адказаў гарадзкі.
Тут падышлі і астатнія. Сталі даставаць грошы й пытаць цану

білета, бо пскоўскі аўтобус даражэйшы, але ідзе хутчэй, бо прыпыняецца толькі ў Лепелі. Тут зноў пракрычаў пеўнік, хрыплавата, задзірыста, і цішыню залі парушыла сварка.
— Ты жлоб! Чего это мы будем стоять все! Возьми деньги и купи всем билеты!
— Да нет, Любовь Абрамовна, я не хочу считать и рассчитываться потом с каждым.
— Ах, ты не хочешь! Тогда я куплю. И если ты стоишь впереди, то стань теперь за мной, потому что я буду всем покупать. Жлоб!
І Любоў Абрамаўна пачала за маёй сьпінай лічыць грошы, што ёй насыпалі ў прыгаршч. Любоў Абрамаўна была ў вязаным тоўстым трыко, паверх куртка, а на плечы была накінута яшчэ квацістая хустка, сашчэпленая вялікаю брошкаю на грудзях. Доўга яна лічыла грошы: і раз, і два, потым скінула хустку, тады куртку, і пры гэтым увесь час упіралася ў мае плечы сваімі грудзямі і локцямі. Было відаць, што яна ня проста Любоў Абрамаўна, а начальніца, бо, распрануўшыся нарэшце, яна заявіла:
— Кстати! Ты рамку починил? Имей в виду, что со следующей зарплаты вычту за неё, – гучна, патэтычна, на ўсю залю прагаварыла яна невядома каму.
— Ну, что? – гэта Любоў Абрамаўна зьвярталася ўжо да мяне. – Где же тот автобус, почему его нету?
Слова «не-е-т-у» яна выгаворвала надзіва працяжна і мэлядычна.
— Спросите ещё раз. Может, он не вышел из Пскова? Так чего мы тут стоим?
Аўтобуса не было. Спазьняўся. Стаялі моўчкі. Спалі.
— А какой сегодня день недели? – раптам запыталася, зноў жа невядома ў каго, Любоў Абрамаўна.
— Заўтра будзе першага мая, – адказаў я. І зноў доўгае дрымотнае чаканьне.
— Аўтобус! – пракрычаў нехта. – Аўтобус прыйшоў!
Прачнулася і касірка.
— Спросите у неё, почему она не даёт билетов, уже автобус пришёл.
— Яна гаворыць, што ня бачыла яго.
— Как это не видела, все говорят, что автобус пришёл!
— А яна гаворыць, што калі ёй прынясуць паперку, вось толькі

тады для яе аўтобус прыйшоў.
— Тогда спросите, сколько будет стоить один билет до Минска.
— Яна сказала, што білет да Мінску будзе каштаваць сямсот дзьве тысячы васямсот беларускіх рублёў.
І Любоў Абрамаўна зноў пачала пералічваць грошы.
— Послушайте, – схапіла яна мяне за руку, – сколько это будет – восемьсот на два...
І ў трэці раз недзе на вакзале пракукарэкаў пеўнік...
30.04.1996, Полацак

ЦЯГНІК № 623

Ад стада адбіўшыся, птушка адна
Квіліць і квіліць сярод бела радна.

Я. Купала «Першы сьнег»

— А, няма ні да каго ні зьвярнуцца, ні пагаварыць! Таму і п'ю.
— Ня піў бы ты такую гадасьць, а калі захацеў пагаварыць, то сам з сабой пагаварыў бы. Я заўсёды гавару з сабой. Іншы раз і пасваруся нават.
— А я тожа гавару. Я з Богам гавару! Чаму так, пытаю: вып'еш, а закусіць няма чым? Вот быў у сястры, шурын памёр, дык дала яна мне міску капусты і халоднага з бульбай. Дык калі гэта было, з самага ранку было! А цяпер я і авечку зьеў бы. Вот так пагавару, пасваруся зь ім, а потым нічога, неяк адлягае.
— Усё ж ня піў бы ты гэтага адзікалону – дзірка ў жываце будзе, і памрэш скора, а яшчэ ж малады.
— А ў мяне ўжо была дзірка. На во, глядзі, зашылі. У лягеры я быў, там добрую апэрацыю зрабілі.
— Дык ты што, сядзеў?
— А як жа, пяць год.
— І за што гэта, божачка?
— За што, за што? Мяса краў. Рабіў на мясакамбінаце, краў і кідаў за плот мяса. От і пайнялі і пасадзілі. Там і піць навучыўся ўсякае.
— Ты б ужо, як моцна захацеў, то беленькай выпіў бы і клёцкай заеў. Так смачней, ведаеш, з душамі.
— О, калі я на камбінаце быў, то прыходзіш на работу, дастаеш галаву з катла, на стол яе, з сольлю… І ўся брыгада сядае, і пакуль не зьямо, не падымаліся. Ці любіш ты вушы, храсточкі

такія?
— Ой, дзеці мае так улюбілі ногі, што ажно б'юцца з-за іх. Тая «мне», гэтая сабе. Дык дзе ж іх узяць – нагі ўсяго чатыры! Вось зараз закалола, то вазіла ў горад старэйшай. Ну, ня пі, ня пі ты гэта зельле, дурань!
— Ты ня бойся, баба. Гэта каб табе даць, так цябе адразу б скруціла, а мне ўжо нічога, прывык, і маці прывыкла. Ужо не крычыць на мяне і не глядзіць у мой бок. Жывём так неяк. Праўда, пайшоў я ў грыбы аднаго разу. Адвязаў сабаку і пайшоў. І так многа на лугу гэтых сыраежак было, што я ажно два кашы нарэзаў, а сабака недзе лётаў. Тады прылятае пастух. Крычыць, рукамі махае: «Засуджу, сволач! Пойдзеш туды, адкуль прыйшоў!» А што? А тое, што мой сабака трох авечак зарэзаў. Ён-то злы, халера, і галодны, аднаго разу на карову кінуўся на карак, дык ледзь адагнаў, і добра тады аддубасіў.
— А, божачка! І нашто ж ты яго трымаеш такога? Ці карміў бы ўжо.
— А авечкі-то былі прадсядацеля! Прыяжджае ён на машыне пад вечар, пад самую маю хату, і кажа, каб плаціў яму адзінаццаць тысяч, а то ў суд падасьць. А дзе ж мне ўзяць такія грошы!? Так што паслаў я яго і сказаў, што не давядзеш, чый то быў сабака. На другі дзень з участковым міліцыянэрам прыяжджае. Бяруць майго сабаку на экспэрымэнт, вядуць да авечак і спускаюць. А ён тыцнуўся да іх і лататы дахаты.
— А, божачкі, то на карову кідаўся, а то ад авечак уцёк!
— Баба ты, баба. Я зранку яму сонных таблетак даў, дык ён бы п'яны быў, таму і пабег дадому. Вот і я, як дайду да дому, ужо так наемся! А то можа ў цябе што ёсьць, пашукай там у сваёй сумцы?
24.01.1992

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к № 1 (35) - 2005

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]2005

[image] [image] [image]

Вітальд
Вірпша
Сьмецьце

ВІТАЛЬД ВІРПША (Witold Wirpsza, 1918–1985) – польскі пісьменьнік. Нарадзіўся ў Адэсе, ад 1960 г. жыў у Заходнім Бэрліне. Паэт, крытык, перакладчык (у тым ліку «Доктара Фаўстуса» Томаса Мана). Ад 1972 г. ягоныя творы былі забароненыя ў Польшчы за выдадзеную на Захадзе кнігу

Сядзеў у сваім пакоі,
Пішучы верш пра вельмі ўзьнёслыя справы,
І раптам заўважыў праз акно,
Што ў сад заходзяць
Два тыпы, выгляд якіх
Падаўся мне падазроным:
Былі брудныя
І мелі схіленыя галовы.

Я ўжо зьбіраўся адчыніць акно
І крыкнуць на іх
Ня вельмі прыязна.

Але тады пабачыў,
Як яны ўжо вярталіся.
Цягнулі скрыні са сьмецьцем,
Каб яго ссыпаць
У грузавік, што стаяў трохі воддаль.
Усё маё сьмецьце
За апошнія два тыдні.

Старэйшы зь іх угледзеў мяне ў акне,

Пасьміхнуўся.

Тады,
Ня вельмі разумеючы,
Ці ўстыджаны я, ці толькі зьбянтэжаны,
Я вярнуўся
Да свайго вершу пра вельмі ўзьнёслыя эпосіны.

1955

Пераклаў з польскай Руслан Равяка

«Паляча, хто ты?». Найбольш знакамітыя творы – аповесьць «Апэрсіны на дроце» (1964), кніга эсэ «Гульня сэнсаў» (1965), зборнік апавяданьняў і п’есаў «Забойца» (1966). Па-за межамі Польшчы друкаваўся збольшага ў падпольных выданьнях.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (35) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]

«Ваенная хітрасць» сп. Дракахруста выклікала ў мяне мала пазітыўных пачуццяў. Але што спосаб, у які ён адрэагаваў на крытыку, што выказаныя ім новыя тэзісы падаліся вартымі ўвагі.

Каб палеміка не ператваралася ў дэзінфармацыю, лічу неабходным зрабіць наступныя ўдакладненні:

1. Наўрад ці хто лепш за мяне ведае мову маіх штодзённых зносінаў. Спекуляцыі на гэты конт (і пра варожае стаўленне да расейскае мовы таксама) недарэчныя, падмена ўжытага падчас апытання выразу «штодзённыя зносіны» «штодзённым побытам» яшчэ больш небяспечная для навуковае рэпутацыі сп. Дракахруста. Мае штодзённыя зносіны – збольшага праца, а не задушэўныя размовы з сябрамі-аднадумцамі і пісанне артыкулаў у «ARCHE». Што да жадання гаварыць па-беларуску часцей… Як адказаць на пытанне «Ці вы ўжываеце каньяк у штодзённым харчаванні»?
2. Я далёкі ад думкі, быццам расейскамоўнае жыхарства Беларусі «*складаецца з ненавіснікаў беларушчыны і людзей, якія хочуць да яе* (відаць, маецца на ўвазе беларушчына. – **Аўт.**) *далучыцца*», і нічога падобнага не сцвярджаў. Гэта толькі крайнія пазіцыі, хаця і не рарытэтныя, як здаецца сп. Дракахрусту. Моўнае пытанне лёгка абуджае эмоцыі – прыкладам гэтаму ягоныя ўласныя разважанні.
3. Пад «асіміляцыяй уласнабеларускае расейскамоўнае стыхіі» я разумею прыцягненне да працы на беларускамоўную аўдыторыю (у тым ліку і праз пераклады) творчаактыўных людзей, якія гэтую стыхію ўтвараюць. Мне шкада, што фармулёўка выявілася лішне правакацыйнай.
4. На мой погляд, сп. Дракахруст не абгрунтоўвае сцверджанняў, якія я «экстрагаваў» з ягонага тэксту, але будуе на іхнай падставе сваю логіку, ужываючы іх як аксіёмы.
5. Пачытаўшы мае артыкулы, сп. Дракахруст мог пераканацца, што я лічу беспадстаўнай і шкоднай палітычную рэпрэзентацыю беларускамоўных «ад імя самае маладое, дынамічнае, праеўрапейскае, антылукашэнкаўскае часткі грамадства».
Апанент палемізуе не са мною, а са сваімі ўяўленнямі пра мяне. Ён дакладна ведае, як я сябе паводжу, як размаўляю, што я маю на ўвазе. Грунтам здагадак з’яўляюцца не мае словы, а нешта, зачэрпанае з нялюбай сп. Дракахрусту «платонаўскай прасторы ідэяў». Тэкст жа, прысвечаны акурат блізкай праблематыцы (Зразумела і понятно. ARCHE. 2004. № 4), застаўся непрачытаным.
Можа, сапраўды, пісанні шаноўнага сацыёлага маюць на мэце ваенную хітрасць і выпрацоўку больш-менш цывілізаванага парадку ваенных дзеянняў? Мне, чалавеку двухмоўнаму, якому

нечужая што беларуская, што расейская культура, даражэйшы мір (не магу ж я ваяваць сам з сабою), і даводзіцца бачыць у інтэлектуальных выбрыках і палемічным нельсанізме асаблівага кшталту непаразуменне.
Як яшчэ тлумачыць пасаж пра «вынайдзеныя сп. Жукоўскім моўныя прыхільнасьці»? Прыемна быць вынаходнікам, але няўжо для *сацыёлага* ёсць нешта новае ў тым, што ў чалавека могуць быць прыхільнасці? Ці з'яўляецца маім вынаходствам таксама прыхільнасць да пэўнага надвор'я, ежы, спосабаў баўлення часу, палітычных лозунгаў, колераў, музычных жанраў? Бягу афармляць патэнт.
Што незвычайнага ў тым, што не ўсе прыхільнасці чалавек у стане рэалізаваць у поўнай меры? Чэхаў любіў спаржу, але не мог сабе дазволіць яе на кожны дзень. Мой аднакурснік вельмі паважаў «Camel», але грошай хапала на адзін тыдзень у месяц, потым даводзілася смаліць «Беламор», які ён паважаў значна менш. Не бачу сенсацыі ў тым, што хочацца болей карыстацца пэўнай мовай, але няма магчымасці. Што засталося б сацыёлагам, калі б усе нашы прыхільнасці былі прадвызначаныя загадзя, а паводзіны вызначаліся спрадвеку зададзенай нормай? Бедакі мусілі б шукаць іншага хлеба, калі ўсё без таго зразумела.
Значна дакладнейшай за слова «норма» мне падаецца іншая фармулёўка майго апанента: прымус калектыўных уяўленняў. Больш праўды, але застаецца ананімнасць прымусу, нібытная аб'ектыўнасць з'явы. Колькі стагоддзяў таму ў Еўропе не было месца для атэістаў. Калектыўныя ўяўленні пазначалі іх як выродкаў, якія не маюць права на існаванне. Паступова атэіст з кандыдата на вогнішча ператварыўся ў шараговую з'яву. Колісь яўрэйскае жыхарства Беларусі гаварыла амаль выключна на ідыш, а сёння гэта музейная з'ява.
Калектыўныя ўяўленні маюць уласцівасць змяняцца, бо ствараюць іх людзі, і не апошнім сродкам фармавання любае сп. Дракахрусту «нормы» з'яўляецца гвалт, і не толькі дзяржаўны. Паказальныя ў гэтым плане беспаспяховыя спробы замовіць беларускую песню на беларускіх жа FM-станцыях (Наша Ніва. 2004. 19 лістапада). Усё гэта, на мой погляд, відавочна і, маю такую думку, апісана ў таго самага Дзюркгайма.
Сюрпрызам сталася хваравітая рэакцыя сп. Дракахруста на

«асіміляцыю ўласнабеларускае расейскамоўнае стыхіі». Заўзятар расейскамоўнае культуры павінен быў прыйсці ў стан захаплення, бо прапанаванае – чыстая жэнеўская канвенцыя: змаганне змаганнем, але культурныя каштоўнасці служаць усім. Падскочыць павінны былі б адданыя заўзятары беларушчыны, якім прапануецца прыгледзецца да расейскамоўных калег, пашукаць у іх вартае і выкарыстаць у беларускамоўнай культурнай прасторы.
Артыкулы на тэму расейска-беларускіх моўна-культурных дачыненняў пад прымусам калектыўных уяўленняў чытаюцца ў нас метадам ключавых словаў: сэнсу сказаў, тым больш абзацаў, ніхто не дашукваецца. Сп. Дракахруст пачуў слова «асіміляцыя», гукнуў «Ты сказаў!!!», ускочыў на белага каня і чым хутчэй ткнуў дзідай ненавіснага супарата. Уласнаручна намаляваны ім плакатны вобраз прагнага нацыяналіста-беларусіфікатара Жукоўскага нашмат больш кідкі ды адназначна варожы, чым тое, што можна выцягнуць з маіх тэкстаў, і апанент у ваярскім запале заатакаваў уласны твор. Нешта мне падказвае, што ягонае ваярства пакуль гэтым і абмяжуецца. Ён у згаданай вайне не на перадавой і не ў штабе. Кажучы па-расейску: *так, погулять вышел, о конвенциях всяких побалагурить*.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/5/25**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 1 (35) - 2005**

[image]

[image]

[image]

рэцэнзіі
"да Зміцера"

[image]-[image]2005

рэцэнзіі

[image]	[image]	[image]	**ДЗМІТРЫЙ ПЛАКС**
		Дзмітрый Плакс Эстэтыка ў чатыры хады*	нарадзіўся ў 1970 г. у Менску. Жыве і працуе ў Стакгольме.
		Sven-Olov Wallenstein. *BILDSTRIDER, föreläsningar om estetisk teori.* – AlfabetaAnamma, Göteborg, 2001. КОЛЬКІ СЛОВАЎ НА ЎСТУП	Апошняя публікацыя – артыкул «Тэкст у кантэксьце» ў зборніку «TEXST», выдадзеным летась Вышэйшай мастацкай школай Констфак у Стакгольме.

Свен-Улаф Валенштайн – адзін з найбольш вядомых філосафаў і тэарэтыкаў мастацтва ў сучаснай Швецыі. На працягу шасці гадоў ён працаваў выкладчыкам тэорыі мастацтваў у дзвюх буйных вышэйшых мастацкіх навучальных установах Швецыі – школе Валанд у Гётэборгу і школе Констфак у Стакгольме. Адзінаццаць лекцый, прачытаных у гэтых установах, і склалі рэцэнзаваную кнігу. Яна была падрыхтаваная да друку рэтраспектыўна, гэта значыць, што аўтар, які ў гэтым выпадку

* Скарочаны варыянт артыкула.

іграе яшчэ і ролю ўкладальніка, сутыкнуўся з першай праблемай ужо на этапе працы з матэрыялам. Часавая аберацыя, якая амаль непазбежна ўзнікае пры такім падыходзе, жартуе з аўтарам-укладальнікам. Тыдні і месяцы разважанняў, якія аддзялялі першую лекцыю ад, скажам, шостай пераўтвараюцца ў часавай перспектыве ў хвіліны і секунды. Адсюль і відавочная небяспека: часовае лёгка падаецца вечным, важнае – другасным.

Неабходнасць аб'яднаць разнастайныя і разнародныя часткі ў адзіны і цэласны кантэкст і да таго ж зрабіць гэта заднім днём, зрабіла пачатковую працу над кнігай, па словах самога аўтара, нечым, што нагадвае «суцішальную кашулю». Адсюль відавочная адсутнасць нейкай вышэйшай сістэматызацыі або агульнай канцэпцыі ў зборніку лекцый падаецца свядомым аўтарскім рашэннем. Ёсць асацыятыўны ланцуг, які звязвае ўсе адзінаццаць раздзелаў – і гэтага досыць.

Такім чынам, кнігу трэба чытаць як зборнік незалежных адзін ад аднаго артыкулаў. Аднак яе агульная, калі не аргументацыя, то звышзадача (прадставіць асноўныя адпраўныя пункты тэорыі эстэтыкі), дазваляе спалучыць тэксты кнігі ў чатыры больш-менш відавочныя групы ў адпаведнасці з закранутай тэматыкай:

ГІСТОРЫЯ ЭСТЭТЫКІ

Гэта самая вялікая група артыкулаў. Яна апісвае спробу класічнай эстэтычнай тэорыі акрэсліць асаблівы, канкрэтны эстэтычны дослед (гэтак званае

«эстэтычнае
перажыванне»),
а таксама
закранае
класічнае
пытанне,
што –
Мастацтва
або
Філасофія –
можа
прэтэндаваць
на
валоданне
вышэйшай
Праўдай.

Гэтае пытанне – хто валодае праўдай аб свеце і мае права казаць яе – мабыць, першае пытанне, сфармуляванае ў найпершых вядомых нам тэкстах, якія называюцца цяпер «філасофскімі» (сам тэрмін быў прыдуманы пазней). Ужо ў дасакратавай грэцкай філасофіі прэзентуецца новы спосаб пазнання быцця і крытыкуецца старая, міфалагічная мадэль тлумачэння свету. Геракліт пісаў, што Гамера трэба выкінуць, а Парменід, хаця і не адмаўляўся ад паэзіі, крытыкаваў падманлівы характар мовы і заклікаў звярнуцца да чыстага мыслення.
Платон, заснавальнік філасофіі як паняцця, адкрывае гэты курс лекцый. Выбар менавіта Платона абумоўлены яшчэ і тым, што сам грэцкі філосаф надаваў дастаткова ўвагі – як напісана ў дзесятай кнізе «Дзяржавы» – «старой сварцы паміж філасофіяй і вершам».
Валенштайн спачатку канцэнтруецца на найбольш вядомым адмаўленні Платонам мастацтва – тэксце з дзесятай кнігі «Дзяржавы». Такі пачатак – рызыкоўны ўчынак з боку філосафа – гэты тэкст Платона мае незлічоную колькасць каментароў, і знайсці нешта новае ў яго тлумачэнні амаль немагчыма. Валенштайн, аднак, і не спрабуе прыдумаць новыя тлумачэнні. Замест гэтага ён прапануе новы падыход да самога тэксту і падзяляе яго на чатыры ўзроўні. Такі падзел не закладзены ў

Платона і таму гвалтоўны ў дачыненні да тэксту, але ён робіць аналіз і аргументацыю Валенштайна неспадзяванымі.
Анталагічная перспектыва. Важным у анталогіі Платона называе Валенштайн паняцце імітацыі, *мімесіса*. У дачыненні да мастацкага твора, (які ёсць толькі падабенствам рэчы), такі «міметычны» падыход азначае татальнае знішчэнне ягонага значэння. Сапраўды, у Платона сама рэч мае міметычныя стасункі да таго, што на самай справе існуе – рэчы толькі адбіткі, «іконы» (*эйкон*) ідэй (*ідэа*, або *эйдос* – тэрмін Платона, які абазначае яшчэ і «выгляд», «форма»). Мастацтва адсюль – адбітак адбітка і таму не мае ніякіх правоў на праўду. Філасофія – ахоўніца праўды, мастацтва – злодзей, які спрабуе выдаць сябе за тое, чым на самай справе не ёсць.
Генеалагічная перспектыва. Пад генеалагічнай перспектывай Валенштайн разумее іерархію, якую будуе Платон у той частцы свайго вучэння, якая прысвечана пачуццёваму існаванню. Пытанне «што?», якое разглядаецца ў анталагічнай перспектыве (выгляд супраць сутнасці), пераўтвараецца ў генеалагічнай перспектыве ў пытанне «хто?». Гэта значыць – анталагічнае пытанне «што ёсць праўда, справядлівасць, любоў?» робіцца пытаннем улады – «хто сапраўды справядлівы, праўдзівы, шчыры ў любові?». Іншымі словамі – хто мае права вызначаць, выяўляць, акрэсліваць, што ёсць праўда, а што не? Пераход ад мастацтва да мастака не абяцае апошняму нічога добрага. Мастак прэзентуецца як парадны прыклад брахуна, які ўсімі сіламі спрабуе выдаць сябе за кагосьці іншага і абвяшчае свае фальшывыя правы на валоданне праўдай.
Прагматычная перспектыва. Прагматычную перспектыву ўтвараюць аргументы Платона, што «неэтычныя» выявы багоў, якія сустракаюцца ў выяўленчым мастацтве, вядуць да маральнага разлажэння ў грамадстве і падрываюць поды дзяржавы. Тут, гаворыць Валенштайн, мы бачым прагматычны падыход да мастацтва – той самы, вядомы кожнаму з нас з пытання «якую карысць мае мастацтва?». Да гэтага трэба дадаць і «навучальную перспектыву» – Платон, як вядома, лічыў, што адукацыя існуе дзеля таго, каб стварыць баланс паміж рознымі часткамі душы. Мастацтва гэты баланс парушае, бо не звяртаецца да вышэйшай часткі душы, дзе знаходзяцца арыфметычныя веды, а цалкам канцэнтруецца на фантазійнай частцы, якая любіць ашукваць.

Эратычная перспектыва. Платонава ідэя прыгажосці заўседы нясе эратычны зарад. Сапраўдная прыгажосць паводле Платона – гэта, перш за ўсё, прыгажосць чалавечага цела (маладога мужчыны, падлетка). Мастацтва ж робіць толькі адбітак, «рэпрезентацыю» цела і тым абражае яго. Мастацтва яшчэ раз уступае ў канфлікт з сапраўднай ідэяй. Платон адзначае, што мастак калібру Гамера здольны прымусіць нас адчуваць гарачае жаданне (*эрас*), але мы павінны паступаць як закаханыя, чыё каханне дэструкцыйнае паводле сваёй сутнасці, а менавіта – сказаць рашучае «не!» аб'екту кахання і адвярнуцца ад яго. Мы павінны супрацьстаяць мастацкаму эрасу, хай бы нам і давялося дзеля гэтага стаць глухімі і сляпымі…

На ўсіх гэтых чатырох узроўнях Платон паўстае ненавіснікам мастацтва, чыя філасофія з самага пачатку, ab ovo, не ўспрымае мастацтва і змагаецца з ім.

Паэтыка Арыстоцеля супрацьстаіць Платонаваму адмаўленню мастацтва, а погляды Плаціна бліжэйшыя да платонаўскіх, хаця іх разуменне мастацтва ўсё ж у значнай ступені адрозніваецца. Плацін якраз і завяршае класічную антычную традыцыю.

Наступны цікавы фрагмент кнігі – аналіз паняцця суб'екта. Тое, што мы пад ім разумеем (цэнтральны суб'ект і апазіцыйныя ў дачыненні да яго аб'екты), не зусім адпавядае антычнаму і сярэднявечнаму ўяўленню, дзе «суб'ект» не меў цэнтральнай ролі і не быў адпраўным пунктам для даследавання чалавека, ягонай душы, пачуццяў, успрымання і ўнутранага жыцця. Толькі ў Дэкарта з'яўляецца пытанне аб суб'екце як «адзінцы», якая нясе ў сабе ўвесь комплекс вышэйзгаданых праблем. «Лінія Дэкарта» ідзе проста ў сучаснасць да нашых філасофскіх дэбатаў аб адносінах суб'екта да «іншага».

Але толькі Кант даў нам тое, што можна назваць «сучасным паняццем мастацтва», гэта значыць – *эстэтычнае* паняцце, якое так строга было акрэслена ўпершыню. Таму далей разглядаецца ўзнікненне тэрміна «эстэтыка» – ад Платона, які лічыў, што *аістэзіс* можа весці выключна да фальшывых ведаў (*докса*), праз Канта, з яго цэнтральнай у гэтай галіне працай «Крытыка здольнасці суджэння», і да рамантыкаў, якія былі пачынальнікамі «эстэтычнай навізны».

У «Крытыцы здольнасці суджэння» Кант зрабіў сістэматычны і ўсебаковы аналіз адрознення паміж Прыгожым і Ўзвышаным.

Апошняе паняцце стала адным з цэнтральных у сучаснай тэорыі эстэтыкі – згадаем хаця б «Узвышанае і авангард» Ліятара.
Разгляд гісторыі эстэтыкі завяршаецца філасофіяй Ніцшэ. Нічога ў гісторыі філасофіі не стаіць так блізка да сучаснага мастака з яго змаганнем з самім сабою, светам, праўдай (у тым ліку і праўдай аб сабе самім), мастацтвам і гэтак далей, як велічнае вар'яцтва «Ecce Homo». «Радыкальная мабільнасць мастацтва» распушчае суб'екты і аб'екты, падрывае тэорыю, форму, дыскурс, нават сама сябе… У адным з апошніх лістоў, напісаных Ніцшэ, калі хвароба яшчэ не зусім ахапіла яго, пісьменнік распадаецца на мноства ідэнтычнасцяў. Моцны струмень пісьма захапляе і кідае чытача з месца на месца, з асобы на асобу. Валенштайн цытуе фразу: «…alle Namen der Geschichte, das bin ich» – «…усе імёны ў гісторыі – гэта я». Нічога не нагадвае?..

МАДЭРНІЗМ І АВАНГАРД

Наступны праблемны вузел – узаемаадносіны паміж мадэрнізмам, авангардам і тэхналогіяй сёння, калі прэтэнзія філасофскай эстэтыкі акрэсліць мастацтва ставіцца пад сумненне навукова-тэхнічным прагрэсам, урбанізацыяй, глабалізацыяй і

палітычнымі
рэвалюцыямі.
(Сам
«мадэрнізм»
– тэрмін у
найвышэйшай
ступені
неадназначны.
Як апісаць
стыль, які
спалучае
прымітывізм
з яго
падкрэсленым
адмаўленнем
мадэрну ў
форме
рацыяналізму
сучаснага
грамадства і
футурыстычную
эстэтыку,
якая вітае
паскарэнне
развіцця
грамадства
аж да
татальнага
нігілізму?)

Валенштайн прымае трохузроўневую мадэль Маршала Бермана, у якой *мадэрнізацыя* інфраструктуры і эканомікі грамадства выклікае да жыцця *мадэрнасць* (у тым ліку мадэрную культуру), а розныя *мадэрнізмы* з'яўляюцца толькі мастацкай рэакцыяй на *мадэрнізацыю* або тэматызацыямі *мадэрнасці*. *Мадэрнізмы* не абавязкова маюць нешта стылёва супольнае, бо найчасцей належаць да дыяметральна супрацьлеглых стылёвых і ідэалагічных канцэпцый, але складаюць адзіную дыялектычна знітаваную сукупнасць. Мадэрнізм перажыў эвалюцыю сваіх «тэхналогіяў» – ад

легендарнага вокліча Поля Дэлароша, калі той упершыню ўбачыў вынаходку Дагера: «З сённяшняга дня жывапіс памёр!», праз Вальтэра Беньяміна і Эрнста Юнгера да Барыса Гройса. Для разумення гэтай эвалюцыі важна ўлічваць палітычны аспект.

Валенштайн не дае адказу на пытанне, ці паняцці мадэрнізму і авангарду роўнавялікія, ці паміж імі існуюць грунтоўныя адрозненні. Пасля разгляду тэорый і канцэпцый авангарду Мацея Калінэску, Клемента Грынберга, Хала Фостэра, Пітэра Бюргера ён канстатуе, што сённяшні авангард значна адрозніваецца ад авангарду пачатку мінулага стагоддзя. Сённяшнія авангардысты сутыкнуліся з выклікам знайсці новыя мастацкія сітуацыі, новыя формы вытворчасці і новыя тэхналогіі ўспрымання, якія не былі б банальным паўтарэннем мінулага досведу.

СУЧАСНАСЦЬ

Сучасныя тэарэтычныя дыспуты адлюстраваныя ў частцы, якая прысвечана пазіцыі візуальнага вобраза, вобразатвора, выявы ў сучасным працэсе – ад фенаменалогіі з яе верай у «натуральны свет», праз паглыблены і сканцэнтраваны разгляд цела і паняцця

«ўвагі»
Мерло-
Панці,
аб’яднанне
падыходаў і
паняццяў
фенаменалогіі
і
псіхааналітыкі
ў Ліятара і
Лакана і да
«радыкальна
канструктывісцкага»
аналізу кіно
Дэлёзам.

Тут мы зноў сутыкаемся з платонаўскім пытаннем аб анталагічным статусе візуальнага вобраза – праблемы класічнай эстэтыкі паўстаюць на новым узроўні.
Агляд узаемаадносін фенаменалогіі і візуальнага вобраза пачынаецца з Гусерля. Згодна з ім, чалавек не «сцвярджае» аб’екты і рэчы. Гэта не значыць, што мы ствараем гэтыя рэчы, але так мы ўспрымаем складаную ўзаемасувязь паміж пасіўнымі і актыўнымі элементамі рэчаснасці.
Лагічным падаецца пераход ад Гусерля да Мерло-Панці, праца якога пачынаецца прыкладна з таго, чым заканчваецца праца Гусерля – з пытання аб магчымай «дэтрансцэндэнтацыі», зыходнымі пунктамі якой могуць быць тыя «цьмяныя» сферы, якія нібы хаваюцца ад філасофскай рэфлексіі – цела, час, сацыяльнае жыццё. Ліятар, назваўшы Мерло-Панці «даверлівым» філосафам, у пэўным сэнсе вярнуўся да фенаменалагічнай традыцыі. У сваёй вядомай кнізе «Дыскурс. Фігура» ён высунуў ідэі «фігуральнага», «матрыцы». «Немагчыма чытаць – разумець – карціну», – кажа Ліятар і вядзе нас далей да «лібідальных здарэнняў» у іх паліморфнай, пульсуючай матрыцы…
Тэорыя візуальнага Жака Лакана з яе апісаннем канстытуцыі суб’екта ў сферы ўяўнага паклала пачатак новай традыцыі, якая разыходзіцца з фенаменалогіяй. Сувязь паміж позіркам, візуальным полем і канстытуцыйнай роляй полу ставіць перад

намі новыя пытанні – як, напрыклад, нараджаецца суб'ект, здольны бачыць і цялесна жадаць? Як позірк «суб'ектывізуецца» і робіцца ўжо хутчэй аб'ектам даследавання псіхааналізу (вуаерызм)? І ўвогуле – у якім сэнсе позірк можа быць аб'ектам?..

Лакан канцэнтруецца на карціне, экране, якія амаль згодна з Фрэйдам закліканыя сублімаваць – мастацтва існуе дзеля таго, каб дапамагаць, быць медыумам для суб'екта, якога раздзіраюць канфлікты, у яго дачыненні з Іншым, чый позірк мы не можам вытрымаць без дапамогі экрана, які дазваляе нам эстэтызаваць грубую праўду жадання і нават на кароткі час выйсці са сферы жадання Іншага.

ПЕРСПЕКТЫВЫ

Валенштайн не прагназуе развіццё мастацтва, а хутчэй разглядае адну яго спецыфічную галіну, «мастацтва месца», дзе мастацкі твор прывязаны да спецыфічнай, канкрэтнай прасторы. Прыгоды месца і прасторы ў сувязі з прыгодамі мастацкага твору – далёка не банальны

сюжэт,
асабліва
калі
прыняць
распаўсюджаны
сёння пункт
гледжання,
што сам наш
свет ужо
пераўтварыўся
з месца ў
карцінку, а
фізічная
прастора
стала ў
нашым
успрыманні
прастораю
імагінарнай.

Як жа функцыянуе мастацкі твор, калі ён выходзіць за дзверы музеяў і галерэй і акупуе грамадскія месцы, або пераапрацоўвае нейкую дадзеную сацыяльную сітуацыю? Пытанне гэтае само сабою не новае – авангард з дня свайго нараджэння (якім бы днём мы яго ні лічылі) спрабуе вызваліцца ад інстытуалізацыі і захапіць новыя прасторы, новыя (часцей за ўсё – гарадскія) сцэны. Новыя тэхналогіі, «электронныя супольнасці», якія змяняюць чалавечае ўспрыманне навакольнага «краявіду» і надаюць віртуальнай рэчаіснасці параметры фізічнай, таксама ставяць гэтае пытанне з большай вастрынёй.
Для аналізу працэсу трансфармацыі грамадскай, або «публічнай», прасторы ўжываецца паняцце «манумента». Аб'ект і твор – тое, што Фуко аднойчы і назваў «манументам» у апазіцыі да «архіва» – напэўна, не захаваюць свайго былога статусу. Для большасці з нас мастацкі твор у публічным месцы па-ранейшаму «скульптура на плошчы», а гэта значыць, што наша фізічная сутнасць, цела, знаходзіцца ў прасторы мастацкага твора. Але манумент як частка гістарычнай семіётыкі адыходзіць на нашых вачах у мінулае, бо

нацыянальная дзяржава перастае быць пануючым тыпам сацыяльнай арганізацыі на прасторах Еўропы. (Перавытворчасць манументаў, якія закліканы ілюстраваць нацыянальна-гістарычную ідэалогію дзяржавы, назіралася ў некаторых краінах Еўропы ўжо ў канцы XIX стагоддзя. Жыхарам былога Савецкага Саюзу гэткае становішча таксама добра вядомае.)
Заўтрашняе мастацтва будзе менш прывязана да канкрэтнага месца, а сам мастак будзе падобны да качэўніка, вольнага захапіць любую прастору – музейную, грамадскую, віртуальную. Але гэта наступіць толькі заўтра.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/5/25
[image]